*Уладзіслаў Рубанаў*

# СВЕТЛЫ РУЧАЙ ЛЮБВІ



*Уладзіслаў Рубанаў*

# СВЕТЛЫ РУЧАЙ ЛЮБВІ

Аповесці

МІНСК
«МАСТАЦКАЯ ЛІТАРАТУРА»
1990

ББК84 Бел7
Р 82

Рэцэнзент Фёдар Яфімаў

Мастак М. С. Будавей

Герой повести «Вихрь» Михаил споткнулся — и суд его наказал. Людям, даже родному отцу, любимой девушке, трудно поверить, что юноша не преступник, а жертва случая... Любовь, честь, справедливость — именно эти светлые чувства в труднейших испытаниях выпрямляли человеческую душу, ими живут и герои повестей Владислава Рубанова.

Р $\frac{4702120201-027}{М 302(03)-90}$ 25—90

ISBN 5-340-00439-2

© Выдавецтва «Мастацкая літаратура», 1990

# КРЫНІЦА...



# ВІХОР

## Частка першая

Яны ішлі на шашу.

Дарогу нечакана перабег табун дзікоў. Спружынаю закруціўшы хвост, бокам, бліскаючы дробненькім, масляна-рудым, бы казельчык, вокам, першы перамахнуў сякач, услед пасыпаліся рабенькія, гнуткія, бы ўюны, парасяты; падштурхоўваючы іх пад азадкі і рохкаючы, пераваліласяся праз каляіны вíслапузая, худая, як дошка, свіння, і на пясчаным гарбяку засталіся глыбокія канаўкі ад цяжкіх, набрынялых саскоў.

«Цыц!..» — Грышка аж папяросу выпусціў. Лісаветка спалохана і неяк па-дзявочы прытворна ўчапілася за яго руку. «Колькі іх!..» — сказала шэптам. Грышка прыслухоўваўся, як храбусцелі пад капытамі дзікоў сушняк, яловыя і сасновыя шышкі.

На шашы гулі-стагналі машыны. Стомлены гарачынёю, ціха стаяў абапал дарогі спелы, сівы ў камлях і бледна-зялёны ўверсе, сасоннік — увесь разам трохі вялы, як чалавек пасля хваробы. І неба над ім было як выцвілае, дзіўнае нейкае, светлаватае, аж празрыстае, радаснае, і той жа час са схаванай, быццам патаемна-глыбокаю журбою.

Людзі ў гэтай навакольнай акрасе не былі яркія, яны як бы раствараліся ў ёй. Грышка быў апрануты ў новы цёмны касцюм з цененькай жоўтаю прадольнаю ніткаю; на нагах яшчэ не старыя чаравікі, перад дарогаю начышчаныя, і на іх добра відаць пыл. Лісаветка, можа б, была ярчэйшая, калі б у апошнюю хвіліну не змяніла жоўтай блузкі, у якой не аказалася гузіка, на карычневую з матузкамі; туфлі, як і Грышкавы чаравікі, былі густа запудраны пылам.

Лісаветка глядзела ўперад, на шашу, а Грышка круціў галавою на бакі, акурат дапаў да грыбоў.

Не, яны, Лісаветка з Грышкам, не пасварыліся, і

гаварыць пра што ім было не на адзін кош. Так яны хавалі сваё хваляванне.

Асфальт быў чорны, над ім кружыліся шэрыя сухія стракозы. Удалечыні, можа, пад самаю Дабранкаю, шаша збягалася на шыла, самы кончык якога патанаў у ліловаї смузе. Парэнчы моста на фоне алешніку былі ярка-белыя, і здавалася, што гэта не мост цераз канаву, а сядзіць гіганцкая мятлушка-капусніца. Сонца пераваліла на правы бок шашы і сачылася, як пыл, скрозь худую ігліцу высокіх, суровых сосен.

Неўзабаве там, дзе шаша сыходзілася на шыла, зачарнела кропка — быццам на шыла гэтае нанізалі муху ці мураша, які ўсё яшчэ змагаўся за жыццё. Потым заблішчала белае ў тоненькім чырвоным вяночку, як мухамор: набліжаўся «Ікарус».

Грышка сядзеў на камені. Лісаветка стаяла, прыхінуўшыся плячом да абгарэлай знізу сасны. Грышка ўстаў, і яны ўзышлі з-пад лізерта на асфальт. Грышка прыпадняў картуз і зноў ёмка насадзіў яго на макаўку, акурат думаў, што «Ікарус», прамчаўшыся, узвіруе вецер і сарве картуз з галавы.

«Ікарус» і праўда пёр, бы і не думаў спыняцца. Во і мосцік застаўся ззаду, павіслі на парэнчах касмылі сіняга дыму. Але метраў за пяцьдзесят ад прыпынку ён раптам як падавіўся: кэрхнуў, стаў рэзка тармазіць — запахла паленаю гумаю. Грышкавы і Лісаветчыны вочы разбягаліся, шныпарылі па вокнах...

Аўтобус спыніўся тады, калі сэрцы ў абаіх ужо ледзь не апалі. Можа б, яны ў такім здранцвенні не змаглі і з месца скрануцца, калі б не былі бацькамі. Лісаветка мітнулася бегчы, а Грышка, прысядаючы, пайшоў хуткаю хадою. Дзверы ў аўтобусе расчыніліся, і з іх выскачыў Міша, загарэлы, аж смуглы, паставіў на пясчаную броўку шашы чамаданчык — маленькі, як дзве цагліны, з акутымі па ражках, бліскучымі, як чайная лыжка, каўпачкамі.

Лісаветка павісла ў Мішы на шыі: «Сыночак мой любенькі, даражэнькі!..» — ён стаяў, апусціўшы рукі, як бы даваў маці выліць з сябе ўсю ласку. Лісаветка цалавала Мішу ў твар, шыю, валасы за вухам і не адчувала, што шчокі ў сына калючыя, бы яловыя шышкі.

Грышка падышоў і неяк здалёку падаў сыну руку, адчуў: сынава рука касцістая і такая ж цвёрдая, як яго.

«Ну што, пойдзем?» — Міша махнуў чамаданчыкам. У другой руцэ ён трымаў вязаны светла-шэры джэмпер, і Лісаветка ўзяла яго і павесіла сабе на сугіб локця.

Міша ішоў апусціўшы галаву, спустошаныя кароткаю ды мітуслівaю сустрэчаю, не знаходзілі слоў і Грышка з Лісаветкаю. Лісаветка ішла паперадзе, тады Міша, крыху ззаду тупаў Грышка. Міша быў коратка падстрыжаны, на шыі пасля брытвы бялелася скура, як надрэзаная на барвічку мясціна; кашуля на плячах напіналася, і пад ёю хадзіла гнуткае, мускулістае, натрэніраванае цела. Міша быў вышэйшы за маці галавы на паўтары.

«Як там Ленка? Даўно не пісала мне...» — сказаў Міша. «Калі-та? На тым тыдні, у чацвер, нам пісьмо было ад яе. Ну, піша, працуе, многа палучаюць. Жыве ў бараку, печачка ў пакоі...» — Лісаветка спяшалася нагаварыць як болей Мішу, акурат не хацела, каб ён шмат распытваў пра Ленку.

Між імі была тая няёмкасць, што зазвычай бывае між роднымі людзьмі, якія даўно не бачыліся і адзін з якіх правініўся, на сорам астатнім, але ад гэтага не стаў чужэйшы, а наўпярок, выклікаў яшчэ большую шкадобу.

Гравійка, што дэўшнікі пачалі насыпаць з боку шашы, кончылася, ногі ступілі на пясок.

«Во бачыш, дзікі прабеглі»,— паказаў трохі спагадзя Грышка сляды на пяску. «Многа дзікоў?» — спытаў Міша, прыпыняючыся і разглядаючы сляды дзікоў. «Хапае. Хоць і б'юць іх. Нават мы з маткаю ўзімку папробвалі дзічыны. Смачная, ліха яе! Толькі для маіх зубоў цвердаватая».— «А дзе ўзялі? Ці ты ўжо браканьерам стаў?» — усміхнуўся Міша. «Ды не! У глінішча забухаўся і звіхнуў сабе пазванок. Занесла яміну снегам, а яны ішлі цераз поле калгасны сад шарудзіць, і адзін падсвінак... Дзеці ў шышкі хадзілі і агледзелі. Сабраліся мужчыны — Ляксей Чубатчышын, я... Выцягнулі на вяроўках. Пазванілі ў міліцыю, там спыталі, ці вялікі, і кажуць, іспользуйця самі. Во што...»

Абмінулі магільнік; засталіся ззаду канчанскія хаты. Міша баяўся глянуць на вокны: з кожнага, здавалася, за ім сочаць позіркі — і цікаўныя, і дакорлівыя адначасна. Што скажаш, не са славаю вяртаецца ў родную хату, а з няславаю, якую людзі заўсягды

асуджалі. Думаў ён, як шмат передумаў за апошні год, звіхнуцца можна.

Грэблі новай Міша не бачыў: яна была цяпер высокая, роўная, чыстая, як бубен; абапал не стаялі, як раней улетку, зялёныя тугія лужыны, вада мела прамы ход у балотца праз бетонную трубу.

Ад хаты сваёй, якая адкрылася вачам зразу, калі павярнулі на грэблю, разанула незнаёмаю сонечнай светласцю. Ажно разгубіўся Міша: «Што такое?..» Ды тут жа ўсё разгадаў: на гародзе, пад ліпамі, у лісце якіх ужо густа ўплялася жаўцізна, стаяў высокі новы зруб, ён свяціўся, блішчаў, бы велікоднае яйка; а кроквы, з прыбітым на іх жардзём, вельмі ўжо нагадвалі хоць і старэчую, шчарбатую, але вясёлую, прыветлівую ўсмешку.

Грышка пераняў сынаў позірк, сказаў дужым галасам, процi якога не запярэчыць нават сам бог: «Да восені накрыць і зафрантоніць трэба. Шыферу сабес выпісаў...»

Старая хата побач з новым зрубам таксама журыцца не хацела: Грышка падмаладзіў яе, прыбіў новыя разьбяныя ліштвы, якія сам выпілаваў, пафарбаваў у белы колер; паднавіў франтон; ашаляваў вуглы; палісаднік абгарадзіў штыкетнікам, у шчыліны якога павыткнуліся жоўтыя галоўкі вяргіняў, сагнуліся, як у паклоне.

Тры гады Міша не быў дома. Цэлы свет змяніўся за гэты час. Толькі маці і бацька, здаецца, ранейшыя, можа, трохі паспакайнелі і вочы як быццам не такія вясёлыя і бойкія.

У дзірцы каля вушака Лісаветка ўзяла ключ, адамкнула дзверы. У сенцах на запыленым акне зашумелі мухі. «А каб вас пранцы!..— махнула Лісаветка дзвюма рукамі.— Толечкі ж труціла. Халеру нічым не вытруціш».

У хаце было змрачнавата: пад вокнамі ў палісадніку стаялі ядраныя кусты бэзу — разрасліся. Мішу зразу як бы скавала цеснага хаты, так і глядзі, плячом разваліш вугал печы ці зрушыш нагою стол.

«Есці будзеш?» — спытала Лісаветка ў Мішы, адно дзеля таго каб папярэдзіць, што яна пойдзе на кухню і будзе накрываць стол. «Канечне, будзе!» — сказаў Грышка не то з радасцю, не то злуючыся на жонку за

бязглуздае пытанне, а то і зусім, мабыць, з ліслівым жаданнем дагадзіць сыну.

Міша сеў за стол у чыстай палове хаты; перакідваў з месца на месца газеты, разгортваў, пустым позіркам вадзіў па старонках. Грышка павесіў на ласіны рог картуз, прычасаўся перад трумо; уздыхнуў, сеў на крэсла да стала, выпрастаў ногі і затрос імі — так заўсягды рабіў, калі хваляваўся ды збіраўся сказаць нешта важнае, можа, нават непрыемнае сумоўніку і доўга выбіраў словы, з якіх пачаць.

Міша сабраў газеты ў стос, памацаў кішэні штаноў і папрасіў попелку. Грышка схадзіў у веранду і прынёс літую медную талерачку з выпуклым дзіком на дне, яе ўважылі Грышку на дзень ангела яшчэ ў «Сельгастэхніцы», сам над ёю дыміў калі, а часцей ставіў гасцям. Міша вытрас з пачкі дзве папяросіны, Грышка ўзяў адну і стаў церушыць яе, адчуваючы, што пальцы яго нягнуткія, як бы драўляныя: нервы, нервачкі здаюць...

Сын і бацька прыкурылі ад адной запалкі. І раптам пасля першай глыбокай зацяжкі, як бывала ў маладосці пасля першай чаркі, ад Грышкі адкацілася здранцвеласць, і радасць ад сустрэчы з сынам дала нарэшце сабе волю, акурат увайшла з вуліцы разам з сонцам, што павярнула на акно і рассеяла змрок хаты і няпэўнасць між дзвюма блізкімі душамі.

«Бачыў, адгрукаў даміну?» — «З кім рубіў?» — стрымана спытаў Міша: яму было, канечне, усё роўна — з кім, але не хацеў крыўдзіць бацьку няўвагаю і на яго словы адказваць зняважлівым маўчаннем. «То з Ляксеем тым жа, то сам болей цюкаў. Я тады неўзабаве як ад цябе прыехаў і ўзяўся. Ета такое дзела, што чалавеку заўсягды трэба свой куток мець. Цяпер многія хлопцы дык харошыя кватэры ў райцэнтры папалучалі. А Валодзька Шапялёў, той у Мінску, хваліўся, кватэру палучыў...» — «Як ён там?» — раптам ні з таго ні з сяго пацікавіўся Міша. «Ат! — сказаў Грышка чамусьці з нутраною радасцю.— Мабыць, не вельмі яму тама... Нешта ён ні рыба ні мяса, як я паглядзеў... Тлее, бы кнот».

Міша смачна зацягнуўся, і Грышка ўбачыў, як каля вачэй у яго дробнымі маршчынкамі пасеклася скура, а ўжо праз імгненне адчуў, быццам кожная маршчынка, як той дроцік, стала калоць у сэрца: шчым-

лівы, нейкі пусты халадок запоўніў грудзі, і забалелі знутры вочы, акурат іх засыпаў пяском вецер.

Міша маўчаў. Бачыў Грышка, сыну ёсцека што сказаць, але, мабыць, не хоча пакуль выстаўляцца ці не мае жадання зноў «брацца за сваё», і гэтая кароткая стрыманасць як мёдам памазала Грышку на душы; гэта была новая ў сына струнка, якая прымусіла здрыгануцца зняверанае Грышкава сэрца, напоўніла яго хоць і маленькай, ды ўсё-такі надзеяй.

Кухню на лета абсталявалі там, дзе раней была кладоўка: Грышка прарэзаў у сцяне на гарод акно; паставілі газпліту, стол, мяшкі з мукою, бочкі, кадушку з салам, іншае лам'ё перанеслі ў адрынку, якую Грышка таксама падладзіў, замасціў, нарабіў у кутах паліц.

Міша сеў на крэсла, што стаяла каля балеі з вадою, апынуўся як бы ў нішы, якая халадзіла яму спіну. Ад пахаў, што падымаліся ад талерак і місак, у яго закружылася галава і падкаціўся пад грудзі даўкі камяк, ледзь пракаўтнуў сліну. Маці паставіла каля Мішы сподак і чарку. Палажыла на талерку бліны: Міша іх любіў змалку.

«Хлеба няма,— сказаў Грышка,— даўно не завозілі ў краму... Звонім-звонім — кажуць, неперспекціўная дзярэўня, Малінаўка ваша... Добра, хоць прыпынак зрабілі, а то раней не было — свішчы аўтобусу ўслед. Адмучыўся і я, калі ў горадзе рабіў... Але дос пра беды! — Грышка наліў у чаркі малінавай настойкі.— Ну, давайце за прыезд, за сустрэчу!..» — Грышка сказаў, аж прыкра стала, чуллівым голасам, які гатовы быў сарвацца на плач.

Міша адным рыўком кульнуў чарку ў рот, прытуліў да носа кулак, быццам не сабе, а каму чужому даваў панюхаць, які ён цяжкі і цвёрды і чым пахне. Але, мабыць, адсоваў кулакі — хопіць.

«Ды не крывіся ты! — пажартаваў Грышка.— Адны вітаміны!»

Міша трымаў у руцэ відэлец і не ведаў, у што яго ўдзяўбнуць. У вялікай белай талерцы ляжалі брусочкі кумпяка, звёнцы самаробнай каўбасы; у шкляным слоіку паблісквала тлушчам свіная тушонка. З паліванай глінянай міскі пнулі жоўтыя галоўкі марынаваныя барвічкі, наверсе плаваў алей з цёмным і даўгенькім, як чоўнік, лаўровым лістом. Міша быў пацягнуў-

ся відэльцам да іх, але ўбачыў яшчэ талерку з салёнымі грыбамі і накалоў таўсты, круглы, як колца, груздзік. Груздзік захрумсцеў на зубах. «Смачныя! — пахваліў Міша грыбы.— Тваё старанне? — глянуў на бацьку, падчапіў яшчэ адзін груздзік, беленькі, чысты, атулены празрыстаю студзяністасцю.— Як сёлета грыбы?» — «Ды сёлета няўрод».— «Во летась было грыбоў дык грыбоў! — сказала Лісаветка; яна нароўні з мужчынамі выпіла, і вочы яе блішчалі не толькі ад радасці.— Бацька ў перадавікі выбіўся...» — «А кінь ты!» — Грышка незалюбіў, што Лісаветка рвецца выткнуць яго. Дурное дзела пахвала: нішто не псуе так чалавека, не завязвае яму вочы, як гэта «во ён», «во ён». Робіш — табе добра, і ўся пахвала.

Лісаветка асеклася, але па агеньчыках у вачах было відаць: яна край хоча пахваліцца, што Грышку «заснялі на самую вялікую Дошку».

Міша еў, аж нос угінаўся, на скронях варушыліся кароткія валасы і дробна, як сняжынкі, бліскалі. Грышка трохі ўкусіў і ўжо наеўся, нехаця, марудна жаваў кавалачак цвёрдае каўбасы. Гаворка разладзілася, вялася з тою несвабодаю і стрыманасцю, якія быццам і цікаўнасці не замінаюць, і дазваляюць апускаць непрыемныя падрабязнасці. І ўсё-ткі Лісаветцы цюкнула, што іменна цяпер, захмялелай, ёй самая латва сказаць Мішу пра Ленку; і яна не задумваючыся расказала, што Ленка нешта круціла-муціла там і замуж збіралася, а «палучыла хвіндос пад нос — панесла ад некага». Па гэтым «ад некага» Міша зразумеў, што сястра нагуляла дзіця, і аж зубамі скрыпнуў: чорт, няхай бы ўжо ён адзін быў такі нягеглы, а то і сястра ў гарачай вадзе купаная. І той жа, крыўдзіцель, шустрачок нейкі. Залавіў бы яго Міша ў лапы — запомніў бы навекі, круцель!

«А-а, як цяперашнія мужыкі — п'яніцы, дык хай лепш без яго,— сказала Лісаветка без ноткі журбы ў голасе.— Народзіцца, выгадуем. Прывязе нам...» — «Выгадуем-то выгадуем...— Грышка ўздыхнуў: слабы зусім стаў, ад настойкі ап'янеў, водзіць галаву, усяродку пячэ, быццам там агонь гарыць. Ён папрасіў у Лісаветкі чаго-небудзь кіслага. Яна падала кампоту.— Ну, а як жа ты, што думаеш рабіць?» — нарэшце спытаў, зачапіў набалелае Грышка, млявою рукою ловячы на талерцы слізкі груздзік.

Лісаветка, якая пачала ўжо прыбіраць са стала посуд, раптам крутнулася да Грышкі, нахілілася: «Ты ўжо зразу... «што рабіць»! Дай ты чалавеку апомніцца. Не воўк твая работа — не збяжыць у лес. Хай пагуляе чалавек».— «На гулях далёка не заедзеш».— Грышка баяўся, каб і Міша не накінуўся на яго, не стаў яму пярэчыць. Не, Міша маўчаў. «Малайцом! Дзяржыцца...» — пахваліў яго Грышка, адчуваючы на душы радасць.

На вуліцы сцямнела. Уключылі святло. Знадворку на акно лягла цёмная сінь, пералівалася, блішчала; у ёй мярэжыліся твары людзей, посуд на стале; маленькай, чахлай цыбулінаю рдзела лямпачка.

«Што, пойдзем на двор пакурым?» — сказаў Міша і ўстаў з-за стала. Маці за вячэру не падзякаваў, не было прывычкі з маленства.

На двары пад хатаю ляжалі складзеныя калодкі — на шалёўку; трэба адвезці ў Дабранку на пілараму і напіліць. Цягнуць няма як, хутка дажджы прарвуць неба, і калодкі разбрыняюць. Яны селі на калодкі. Закурылі. З будкі вылез Босы, глядзеў на Мішу і віляў хвастом. Няўжо пазнаў, халера?

«Мабыць, у райцэнтр паеду шукаць работу...» — сказаў няўпэўнена Міша, помнячы, што бацька чакае адказу на сваё пытанне. «А чаму ў раён? Цяпер да нас у калгас добры старшыня прыбіўся. Ягорыч, во што...» — «Сам жа казаў, хлопцы добра ўладкоўваюцца...» — «Я казаў пра другое. Пра кватэры я казаў. А ў цябе хата ёсць».

Міша засмяяўся, адхіліўся, каб убачыць з-за пуні зруб. Убачыў адно вугал і крайнюю крокву: на ёй ад святла месіка і зорак бліскалі кропелькі смалы, як іней усё роўна.

«Я што, ваўкоў у ёй ганяць буду?» — спытаў.

Грышка ледзь не выпаліў, што трэба жаніцца ды сям'ю ладзіць, але стрываў і ў думках пахваліў сябе: Міша мог бы псіхануць, пачуўшы пра сям'ю. «Лепш дзяцей»,— усміхнуўся Грышка. «Ай, бацька!..— ужо з адчаем сказаў Міша.— Абрыдлі мне гэтыя натацыі, у пячонках сядзяць. Давай лепей заўтра на рыбу адскочым, а там будзе відаць...» — «Не, ліха матары!..— затраслося ў Грышкі ў грудзях.— Пупавінаю не змог, дык дзягаю прывяжу да зямлі, стрыгунка такога! Быць не можа».

Тонкі, зеленаваты, як скібачка аблупленага казляка, вытткнуўся краем з-за вільчыка пуні месік, і крытая шыферам страха пабялела, бы яе акрылі скацеркаю. Цемра на дварэ пабегла хавацца ў закуткі, шмыгнула пад веранду, у пустую сабачую будку. А ў самой верандзе тым часам Лісаветка, прыцінаючы ў душы дрыготку, даўно забытую радасць, сцяліла сыну пасцель. На стары сяннік палажыла матрац, акрыла новаю прасцінаю, дастала з куфра пуховую падушку і коўдру, якія берагла Ленцы на пасаг — цяпер не трэба ўжо. Няхай павылежваецца хлопчык — так іншы раз расчуленая Лісаветка называла Мішу.

Грышка лёг спаць у хаце, на ложку, што каля печы, Лісаветка — на тым, што пры акне, якраз напроці. Здавалася б, гаварыць ім не нагаварыцца, але — не: перакінуліся словам-двума, і маўчок. Грышка, праўда, яшчэ выкурыў папяросу, павярнуўся спінаю да печы і роўненька, ціха засоп. Знаць, супакоілася ягонае сэрца; можа, маленькая трывога яшчэ і жыла ў ім, але Грышка справіўся, зладзіў з ёю хутка, не даў разрасціся.

Ад пеўневага крыку звычайна прачынаюцца людзі выпадковыя ў вёсцы, а сталых вяскоўцаў гэты пярэгалас не кранае; затое калі вясковы дзядзька або цётка паедзе да сваіх дзяцей у горад, то праз усю ноч будзе пакутаваць ад стукату таварных вагонаў на станцыі або злякацца на кожную сірэну легкавіка.

Грышка ніколі ў жыцці не купляў будзільнікаў; навошта яны, калі ў ягонай галаве свой адмысловы будзільнічак працуе: трэба прачнуцца ў тры гадзіны ночы, звечара падумаў, а роўна ў тры гадзіны — лып вачыма і прачнуўся. Грышка спярша аж баяўся гэтае свае дзіўнасці, але аднаго разу спытаў у доктара, дык ён як пачаў распавядаць пра ўсякія «старажавыя цэнтры», нервы, псіхіку, што затлуміў Грышку галаву яшчэ болей.

...Грышка прахапіўся. Глянуў на акно: шэрае ўжо, недзе далёка, яшчэ пад зямлёю, устае сонца, спяшаецца ў помач людзям. Лісаветка спіць. Хвіліны дзве Грышка паляжаў з адкрытымі вачыма, адхінуў коўдру. Выйшаў у прыдзелак; выключальнік шчоўкнуў у цішыні дужа звонка. Ходзікі на сцяне-перабіўцы паказвалі блізка на чацвёртую. Акурат. Грышка пазяхнуў. І кот, саскочыўшы з печы і выгнуўшы спіну, вы-

скаліў дробныя вострыя зубы, глядзеў на гаспадара з чалавечаю ўважлівасцю, як хацеў пра нешта запытацца ці аб нечым папрасіць.

Зашамацела ў верандзе, дзугнулі на падлогу ногі. «Міша...» Так і ёсць: адчыняюцца дзверы, заходзіць Міша. Жмурыцца ад святла, вочы ў яго падпухлі, але бліскучыя, ажно свецяцца бялкі, і твар не свежы, сонны. «Блага спаў,— кажа Міша,— на мяккім не прывык...» — «На новым месцы заўсёды...— Грышка абуваў боты.— Ну, што, трэба чарвей капаць?» — «Цёмна ж».— «У мяне ліхтарык ёсць. Можа, выпаўзняў знойдзем, яны толькі ў цемнаце вылазяць...»

«Лажыцеся вы ды спіце, рыбакі! — сонным голасам, у якім чулася і абурэнне, сказала Лісаветка і без злосці зацягнула: Во-о-оечкі, бязлюддзе і бязлюддзе!..»

Грышка кіўнуў на спальню галавою: глядзіце, не разумее баба, што з ахвотаю, а не прымусам яны ўсталі так рана.

На двары было свежа. Ядраны халадок зразу ахапіў Мішу з галавы да пятак; але не ядавіты ён, адчуў Міша, гэты халадок, а мятны, прыемны, свойскі, як летная вадзічка ў Сажы. І пахне хораша — яблыкамі і яшчэ нечым тугім і духмяным.

Грышка ўзяў у куце каля пуні лапату, зняў з частаколіны шырокую, як патэльня, бляшанку з-пад салакі. «Пойдзем на пагон, тама ў трэсках заадно і гнаевікоў накапаем». Выйшлі на гарод. Першы мяжою бег сабака, чмыхаў носам і бойка віляў хвастом-мяцёлкаю. Панураны, счарнелы, ужо асуджаны пад касу, стаяў бульбоўнік. Міша плікаў сабе пад ногі ліхтарыкам: на мокрыя мысы кірзавых ботаў наліплі жоўтыя крупкі пырніку.

Тугі, духмяны пах пагусцеў, стаў патыхаць у нос, як з бочкі. «Во! — здагадаўся Міша.— Зруб пахне...» Зруб стаяў у паўзмроку сіняватым ікластым прывідам, быццам дагістарычны дыназаўр вылез і зрывае з ліпы лісце. Міша зябка перасмыкнуў плячыма: ці ад таго, што недарэчна падумалася пра дыназаўра, ці, можа, ад халадку, што смялей браўся за шчокі, шыю, вушы. Заказытаў у носе дым: за спінаю ў Мішы закурыў бацька. Рэдзенькі дымок паплыў над бульбоўнікам лёгкай, празрыстай стужачкаю; а на пагоне каля балотца ляжаў цэлы пласт белага, шчытнага, бы лямец,

туману: здаецца, зачапі яго нагою, і ён увесь затузаецца.

На кароценькай пажухлай сашчыпанай гусямі і качкамі траве ляжалі расінкі — сухія, цьмяныя, бы кропелькі парафіну. «Во туды,— паказаў Грышка на цёмны астравок — бадзяк быў высокі, стаяў сцяною, на верхавінках пазавязваліся ў клубочкі сухія кветкі.— Цішэй толькі, не ўкаліся.— Грышка прысеў на дыбкі.— Свяці...» — Лапатаю, нагамі Грышка расхінаў пруткія, цвёрдыя сцябліны, да болю ў вачах углядаўся на зямлю.

«Во ён!..» — не ўтрываў, аж крыкнуў Міша. Бліскучы таўсты, бы аловак, выпаўзень шыўся ў траву. Міша спрытна падчапіў яго пальцам, скінуў у бляшанку, падсыпаў зямлі. «Адзін вокунь ёсць!» —загарэўся і Грышка. «А донкі цэлыя?» — «Цэлыя. Ператрасаў нядаўна...» Іменна перад Мішавым вяртаннем, іменна дзеля яго, Мішы, Грышка пераглядаў рыбацкае прычындалле, але цяпер чамусьці не хацелася гэтым хваліцца.

«І велік мой на хаду?» — «А як жа. Ніхто не чапаў. Я толькі разы два ланцуг салідолам змазваў...»

Выпаўзні круціліся ў бляшанцы, плаўна падымаліся ўгору, лезлі на сценкі — шукалі выйсця. Міша сухой бадылінаю перакрываў ім ход. «Хопіць,— сказаў Грышка.— Цяпер чарвякоў...» Непадалёку ляжалі трэскі: летась па восені Грышка тут карыў, часаў хлысты, высякаў у бёрнах чашкі. «Дай я»,— Міша ўзяў у бацькі лапату. Адгарнуў з краю трэскі. Грышка свяціў. На свежай чорнай зямлі заварушыліся, выцягваючыся ў нітку, рудыя чарвякі-гнаевікі, падобныя на выпаўзняў, але маленькія, дробныя, акурат іх дзеткі. «Ну дос, пайшлі... А то на ранішні жор спознімся»,— сказаў Грышка: задубела спіна, ледзь разагнуўся.

Яны ішлі мяжою, і за імі, апусціўшы хвост, нехаця плёўся Босы: не ўдалося яму пагойсаць уволю, трэба вяртацца дахаты; а туды, куды збіраюцца гаспадар з сынам, яго не возьмуць: там заказнік, што на сабачай мове азначае «нельга!». Босы, канечне, да пары да часу церпіць здзек, от калі-небудзь сарвецца з ланцуга, махне на ўсе гаспадаровы забароны хвастом і праврвецца ў той таямнічы, недаступны заказнік: тады будзе тарараму ды страху зайцам і дзікам.

Сумку з ядою сабралі вобміг. Грышка адрэзаў брусок сала, паклалі з пяток салёных гуркоў, пару цыбулін, круцялёк каўбасы, хлеба. На беразе, як і ў лузе на касьбе, есца добра, гэта Грышка ведае, а цяпер вось, у такую рань, есці зусім не хочацца, колам не ўваб'еш. Але ж рукам ды нагам падмацунак патрэбен, і Грышка ў такіх выпадках (кароў на ранкі трэба гнаць ці ў грыбы ісці) выпівае сырое яйка. Латва: сябе мучыць не трэба — глык, і гатова, і «калёрый» тых, што рукі-ногі просяць, хапае. Міша, праўда, на булку з малаком насеў: Лісаветка вячэрынку знарок пакінула на стале ў гарлачы. «Міша малады,— падумаў Грышка.— Яму давай і давай у нутро, як той вутцы».

Босага Грышка навязаў на ланцуг, пакруціў за вуха, але той, пакрыўджаны, палез пад веранду і лапы схаваў: усе, ідзіце, зладзеі,— вартаўніка няма.

Круцілі педалямі без супынку: сцежка паўз дарогу была гладкая, адно там-сям лучалі пад колы карані ды палкі. «Глядзі, тут будзе пень,— папярэдзіў Грышка: ехаў першы.— І знаю ж, а ўсё роўна не-не дый скаблянуся аб яго».

Вароты ў Дом рыбака былі расчыненыя, і туды вялі дзве белыя вузкія, як вяроўкі, палосы. «Нехта ўжо прыскакаў»,— сказаў Грышка з рэўнасцю ў голасе: што яны не першыя. Каля ганка стаялі два веласіпеды, на іх цьмяна блішчала раса. «Няхай і нашы тута стаяць, адмыкаць хату не будзем,— сказаў Грышка.— Сумку возьмем з сабою... Бяры. Пайду вудзільны з-пад даху дастану».

На беразе Сажа гарэла цяпельца. Каля яго варушыліся дзве постаці: агонь асвятляў іх то спераду, то са спіны, але здалёк не пазнаць было — што за людзі. Дый, зрэшты, якая розніца — хто, факт (і гэта сапсавала Грышку настрой ушчэнт), што рыбакі атабарыліся каля Арэхавага Куста, куды меціў і Грышка: абрывы, кусты, асака... Рыба такія месцы любіць.

«Хто там?» — спытаў у бацькі Міша, зыбаючы вудзільнамі. «Зараз пабачым...»

І каля цяпла, мабыць, ужо згледзелі іх, бо перасталі варушыцца: прысеўшы, застылі нерухома, як валуны. «Го-о-о!.. Во тута хто разбойнічае»,— засмяяўся Грышка метраў за дзесяць ад цяпла: пазнаў Марчанка і яго сына. «А што б ты думаў? Каля бабы, як ты, спіну грэць буду,— Марчанок быў у фуфайцы, у шэрым

брылі, вочы ў яго гарэлі, як два жаркія вуглі.— Пару вакушкоў ужо хапанулі! Пакажы, Стась...»

Хлопец адкінуў хапак альховага веցця, і на траве чырвоныя, як медныя пласціны, заблішчалі два вялікія, па лапцю, акуні.

«Добрыя,— пахваліў Грышка.— Зараз і мы расставім донкі...» — «На што спаймалі?» — спытаў Міша ў хлопца, які старанна ўкрываў рыбу веццем. «На сіклу адзін, а длугі на піськіжа».— «У нас выпаўзні...» — «Наўлад ці возьмецца што, малеча абскубае выпаўзня».— «Паспрабуем!» — Міша крэкнуў і сагнуўся разбіраць снасці.

«Няхай тама хлопцы ставяць вудкі, а мы пакуль...» — Марчанок выцягнуў з арэхавага куста паўлітровы слоік, у якім нешта мутнаватае боўталася. «Учора мы вячэралі, так сказаць...— Грышка адвярнуў нос.— З сынам».— «А-а, ета твой той!..» — здагадаўся Марчанок, гэтым той укалоўшы Грышку ў самае сэрца: усе ведаюць пра Мішу. Марчанок зняў са слоіка капронавае вечка. «Атруту ету піць... Ну яе!» — са злосцю сказаў Грышка. «А вось і не атрута! Ета ў мяне лякарства, горла прамочваць... бярозавік. Ячменем заквасіў, чэснае слова! — засмяяўся Марчанок, і і было не зразумела, жартуе ён ці праўду гаворыць.— Не дзяцінься, Грыша, ты ж не на рабоце!..» — «Чаму так? — не згадзіўся Грышка.— Дом жа рыбака па-ранейшаму на мне, і ключы ў кішэні...» — «Ну, глядзі! Я ўжо знаю, цябе не перапрэш,— нечакана хутка адступіўся Марчанок.— Калі будзе добра клявацъ, дык я заначую...» — Ён наліў у маленькую блакітную, бліскучую кружачку, выпіў. Грышка дастаў з сумкі салёныя гуркі; запахла кропам.

«Бяры кісленькае. Начуй, мне што... Ключы няхай потым хлопец прывязе».— «А можа, смагу прагоніш? — Марчанок страсянуў слоікам. Грышка закруціў галавою.— Я на цябе крыўды не нашу,— з нейкаю апраметнаю шчырасцю сказаў Марчанок,— я не злапомны, як другія. Ну, не пусціў дык не пусціў. Ты-та ўсё па правілах рабіў...»

Грышка тады, як не пусціў Марчанка ў Дом рыбака, хоць і апраўдваў сябе, сваю цвёрдасць, але яшчэ доўга насіў у душы нейкую брыдкую каламуць: вось быццам узяў ён ды напаскудзіў чалавеку — ні за што. На чалавечую душу, думаў ён не адзін раз, і так хапае

ўсякай атруты, хвароб, дык навошта яшчэ і сваёй мярзоты падліваць. Тым болей што месяцы праз два ўсё змянілася, як кажуць, стала на сваё месца. А як і чаму, няхай распавядае сам Марчанок:

«Правілы правіламі, але крыўда мяне заела. Не злосць, Мацвеевіч, а крыўда...— Марчанок ледзь не плакаў.— Чалавек я граматны... сем класаў у мяне цвёрдых. Любыя задачкі ў школе як арэхі во,— паказаў пальцам угору, на арэхавы куст,— шчоўкаў. Падумаў: ета я так не спушчу... на злосць чалавек не мае права, а на крыўду мае. Паеду ў раён, ядроны корань, і раскажу! Зайшоў у райвыканком. Прыняў мяне чалавек... такі прадставіцельны, пад гальштукам. «Што ў вас?» Я і расказаў, як ты мяне загрудкі браў, ну й астатняе... Мне было ўсё адно, ты там быў ці хто іншы. Я і не называў цябе,— гаварыў сторaж. Дзве гадзіны... можа, трохі меней, пасядзелі мы з ім у кабінеце. «Добра,— кажа ў канцы,— разбярэмся і рэзультат вам паведамім». Я, папраўдзе, струхнуў, думаю, можа, наламаў дроў, што цяпер за жыццё не расхлябаюся... страх за жыццё ў нас са сталінскіх часоў сядзіць. Не-а! Праз месяц недзе вызываюць і кажуць... асабіста мне: «Ідзіце, Пётр Данілавіч, у Дом рыбака і лавіце рыбу». Я чалавек граматны, мяне за рубель дваццаць не возьмеш!..— Гонар, да якога падмешвалася і пыха, зноў, як і тады, каля Дома рыбака, пачаў распіраць Марчанка.— Я табе скажу, на сваім трэба настойваць... да канца! Іначай толькі аплявухі і будзеш хапаць».

Грышка моўчкі слухаў Марчанка, раз-пораз ківаў галавою: не таму, што ва ўсім згаджаўся з Марчанком, а таму, каб засяродзіцца на сваіх думках. Ён, Грышка, зразу ўведаў пра вэрхал, які падняў Марчанок. Выклікалі яго ў раён, не ўшчувалі, не лаялі, не папракалі, а толькі сказалі, каб у Дом рыбака «пускаў усіх, хто туды захоча». Грышка спярша здзівіўся, канечне, адале зразумеў, што нейкі там «упраўляючы з вобласці злоўжываў службовым становішчам». Потым дачуўся Грышка, што і Міротнікаву далі трохі па шапцы — аб'явілі вымову... Дзіва што, круцель такі!

Грышка перш трохі пабойваўся, што клопату яму прыбавіцца, трэба будзе ноч і дзень тырчаць у тым доме, аж не: раз гараджане-грыбнікі папрасіліся, другі раз маладая парачка пад выглядам рыбакоў на двое

сутак зашылася, ды Марчанок во самы часты госць. Аднаго і боязна, што калі-небудзь папяросу незатушаную кіне на дыван, і тады ўжо яму, Грышку, нездабраваць, гэта — факт.

«Эх, зараз бы пляшачку!» — стукнуў далонямі Марчанок, паварушыў палкаю дровы ў цяпельцы — іскры падняліся ўгору звілістымі аранжавымі шнуркамі. «Часта ж ты на рыбу ходзіш»,— сказаў Грышка так, каб расцвяліць Марчанка і паслухаць, што ён скажа. «Хвароба мая, разумееш? І часу ў мяне цяпер во пасюлечка»,— паказаў на горла. «А ты што?» — «З трактара мяне папёрлі... Ускорасці пасля таго як скардзіцца ездзіў. Сам я вінаваты: абярнуўся ў кювет, ледзь не раздушыла...— Марчанок нечакана асекся: мабыць, жаль да самога сябе сціснуў яму сэрца.— А мо і адпомсцілі — хто знае?»

Каля Сажа пад абрывам бліскаў ліхтарык: Міша са Стасем ставілі донкі. Плюхала пад нагамі вада. Хлопцы глуха, як пад зямлёю, гаманілі. Кацілася над цемнавата-шкляною паверхняю Сажа пара, хавала далёкі бераг. За Лысай гарою светлаю гіганцкаю сыраежкаю азарылася неба, дыхала, сачылася ружовым колерам. Счахала цяпельца, хутка на змену яго кволай ірванай зыркасці прыйдзе роўнае, шырокае і вечнае святло ад сонца. Няма чалавека на зямлі, у якога б не заныла сэрца ад сустрэчы з гэтымі цнатлівымі, раннімі промнямі, якія мякка, пяшчотна кладуцца, дробяцца ў расу, на зямлю, усю такую даверлівую, шчырую і мірную, як далонь маці пад шчакою соннага дзіця.

Мужчыны нейкі час маўчалі. Марчанок, хоць і балбатун, ведаў у гаворцы лад і чакаў цяпер, калі Грышка пачне ў яго пытаць, а Грышка думаў, ці варта наогул лезці да Марчанка, сыпаць на рану соль. І Грышка не спытаў, ці працуе цяпер Марчанок, а той — во! — аж пакрыўдзіўся, што Грышка такі абыякавы, бо ледзь трываў, каб не рассыпацца пахвальбою.

«Я, брат, цяпер начальнік! — сказаў нарэшце Марчанок, калі адчуў, што маўчанне здоўжылася, а Грышка сядзіць скамянелы і не рыпаецца.— Большы, чым ты... Да мяне ўсе, як адзін: «Данілавіч, Данілавіч...» Во дажыўся Марчанок! На пілараме я!..— ледзь не крыкнуў Марчанок, каб уразіць Грышку. А Грышку і праўда аж цяплом пракаціла паміж лапатак: апош-

нія дні адно і думаў, як завезці ды папіліць калодкі. Калі трохі астыў, падумаў: «На лаўца і звер бяжыць». «Хо-о! — узрадаваўся ён.— Дык я жыву!.. Мне якраз дошкі на франтон трэба».

Марчанок закапыліў нос, пахмыкаў: моў, не так усё проста, думаеш, я кінуся зразу табе насустрач, да начальніка падходчык трэба, патанцаваць каля яго, унізіцца, і то не ўсягды дабром канчаецца... Сам жа, Грышка, дарагі, муштраваў мяне. Праўду казалі нашы дзяды: не плюй у калодзеж... «Ну, прывозь, будзем глядзець»,— ужо без пыхі сказаў Марчанок, і Грышка падумаў, што пашэнціла, без валакіты папілуе яму калодкі Марчанок: папілуе-то папілуе, але і няпэўнасць нейкая, макулінка неспакою засталіся ў душы, з якіх уначы няйначай вырасце аж чарада трывог.

Міша караскаўся на абрыў, хапаючыся рукамі за цвёрдыя, сухія камякі глею, тонкія жоўтыя каліўцы лазы. На беразе на траве дрыгаўся акунь. Міша падняў яго, прынёс да цяпельца. «Во!» — кінуў пад ногі бацьку акуня. «Пайшло дзела! — засмяяўся Марчанок.— Паплюй на яго». Міша нечакана і праўда ўзяў у рукі акуня і тры разы фукнуў на яго, ды яшчэ і слоўцамі абагрэў: «Лавіся, рыбка, вялікая і малая!»

Ужо свяціла сонца, рассеялася над Сажом пара. Падняліся з дубоў, закружылі над лугам чароды шпакоў, узляталі так высока ў неба, што здавалася, быццам гэта не чарада птушак, а нехта сыпнуў жменю маку. У лазовым кусце вяла гуў-дундзеў вялізны паласаты шэршань: то садзіўся на лісціну, то поўз па жоўтым атожылку і ўсё чыкаў сваімі сківіцамі-клюшнямі — збіраў «зязюліны слінкі». На мелкаводдзі ўсхадзіліся, плёскалі яльцы і верхаводка.

Грышку ўжо было не да рыбы. Сядзеў на беразе, сусліў папяросу, тады-сяды паглядваў на Мішу, які, бы зацугляны, бегаў каля донак, але пакуль, акрамя акуня, болей нічога не спаймаў. Так і абеду прычакалі. Сонца стаяла яркае, высокае, чыстае, і Сож ажно зіхацеў ад бліскавак; хваль не было, бо не было ветру, а знаць, і клёў будзе паршывы: не любіць рыба ціхай спякотнай пагоды, забіваецца пад карчы, у ямы і ляжыць там нерухома, разморная; ёй ці дожджычак падавай, як тым грыбам, ці то вецер, ледзь не шквальны, калі вудачку закінуць цяжка: заносіць кручок на бераг. Усё жывое звязана нябачнымі ніцямі, думаў

Грышка, урастае адно ў адно, раствараецца, як малако ў вадзе.

Марчанок з сынам пакінулі свае донкі і пайшлі дахаты абедаць, а калі напраўду — Марчанок проста захацеў «атаварыцца»; надвячоркам, сказалі, вернуцца і «з кожнай донкі здымуць па шчупаку». Цяпельца патухла, вецер раздзімаў попел — і вуголле ярылася, мяняла колер.

«А гары яна гарам, рыба!» — падумаў Грышка і загадаў Мішу, каб зматваў вудкі: няма часу сядзець бесталку, трэба дзела дзелаць. Міша згадзіўся з бацькам, здаецца, неахвотна, бо, мабыць, не адвёў яшчэ душы, і моўчкі стаў выцягваць донкі; з адною прыйшоў ёрш-насар — даўгарылы, зеленавата-светлы, як гурок, а вочы вялікія, матава-сінія, бы чарнічыны.

* * *

Два дні Міша не знаходзіў сабе месца, брындаў па гародзе, схадзіў на пагон, да сажалкі, у балотца — як у Малінаўцы кажуць, туляўся, бы сабака ад мух. Бацька з маці нічога яму не гаварылі: мабыць, ім хапіла той размовы ў першы вечар, як прыехаў. На трэці дзень Міша заявіў, што паедзе ў раён брацца на ваенны ўлік, а заадно і работы пашукае, у «Сельгастэхніцы» якой ці пээмка. Зноў жа, ні бацькі, ні маці і словам не абмовіліся, каб стаць пярок сыну, памяняць яго намысел. Маці адно сказала: «Хлеба купі там свежага. Што ета стала з нашаю крамай?» Тут і бацька разышоўся: «І праўда. Я ўжо казаў магазіншчыцы, Райцы, што ета не дзела, дык яна толькі лыбіцца: пры чым тута я? А пры тым, галубка, што званіць трэба, рупіцца. «Не, я за яе вазьмуся! — зняцяйкі ўзвіўся бацькаў голас: можа, у бацькі ўжо так накапілася злосці, што ён захацеў вымесціць яе на магазіншчыцы, хоць на яе і было за што абурацца, і людзі абураліся: скаліць зубы дырэктару райпа, і ўся яе заслуга.— Марчанок вунь ні на што не паглядзеў! А тут... Касцам, трактарыстам-матарыстам трэба на луг, у поле ехаць, а ў магазіне хоць шаром пакаці! Дажылася вёсачка!..»

Міша ўзяў капронавую сетку. Быў у новых джынсах, сіняй пpыталенай кашулі з пагончыкамі і накладнымі нагруднымі кішэнямі; абуў вастраносыя туфлі з высокім жоўтым, бы мыла, абцасам.

Пагоду перавярнула: як назло, стала рыбалоўнаю — неба заслалася шызай каламуццю, а над лесам ляжала таўстым звіткам, пагрозліва налівалася тугою сінню хмара — нешта яе прывязала, не давала зрушыцца. Можа, чакала, пакуль Міша ўправіцца, з'ездзіць у раён.

Міша ішоў на шашу той жа дарогаю, па якой некалькі дзён таму вярнуўся дахаты; ён доўга быў у разлуцы і цяпер адчуваў, што ні сёння, ні заўтра не зможа куды-небудзь далёка збегчы, уцячы, проста ў яго пакуль не хопіць сілы; а пачні яго жывасілам, прымусам цягнуць, ён будзе рвацца, рыдаць, стагнаць, грызці зубамі зямлю, але не паддасца. Нішто не скарае так чалавека, як туга па тым святым і кроўным, на чым вырас, што ўвабраў у сябе з дзіцячых гадоў. Дзе ўжо думаць пра гонар нейкі, самалюбства ці тое прыгожае, рамантычнае жыццё, і Міша нават дзівіўся цяпер, што некалі рваўся на геолага, у далёкі свет, у тайгу, стэп, горы... Ой, пустая, ветраная галава, што ты думала і куды глядзелі твае вочы?

Мішу падабрала бартавая машына. У кузаве сядзелі мужчыны і жанчыны — гандляры, лесарубы ці касцы. Міша не стаў углядацца, прытуліўся да задняга борта, так і даехаў да горада, праўдзівей, да гары, за якою ўжо віднеліся забудовы. І тут машына нечакана затармазіла. Ляпнулі дзверы — вылез шафёр. Міша ўстаў: што такое? Каля машыны стаялі два міліцыянеры, адзетыя ў скураныя курткі і сінія галіфэ, на галовах жоўтыя шлемы; крыху воддаль, пад раскірэчанаю дуплістаю вярбою, стаяў жоўты матацыкл з каляскаю. Даішнікі!

«Чаму возіце людзей у кузаве?» — пачуў Міша як бы знаёмы голас. Шафёр — малады яшчэ хлопец з рыжыміваласамі і белымі рэдзенькімі вусікамі — стаў апраўдвацца, тараторыць, што вязе сваіх людзей, калгаснікаў, папрасіліся хто на базар купляць парасё, хто ў бальніцу. Міліцыянеры не хацелі слухаць, гразілі штрафам, дзіркаю ў талоне, і чымся болей яны гаварылі, тым шчырэй прыслухоўваўся да іх галасоў Міша: адзін з іх быў надта ж знаёмы, рэзаў вушы. «Ха! Васіль Мурашкоў!..— Міша саскочыў на зямлю.— Во раз'еўся — не пазнаць!» Міша падышоў да міліцыянераў і з усяго маху стукнуў Васіля па плячы. Той аж пахіснуўся, уставіў вочы, а яго сябар кінуўся да Мішы,

сцяў за рукі, аж тыя затрашчалі: няйнакш палічыў, што Міша напаў на іх. Шафёр таксама няўцямна, як прыгаломшаны, плюскаў вачыма і глядзеў то на Мішу, то на міліцыянераў.

Васіль нарэшце расшалопаў: «Во дык сустрэча! Ну здароў, друг!..— расчулена абняў Мішу і крутнуўся з ім два разы.— Мне бацька твой неяк гаварыў, што хутка прыйдзеш. Не чакаў, друг, не чакаў...— Васіль ледзь не плакаў ад радасці, глядзеў на Мішу, як на дзіва, мабыць, хацеў параўнаць яго цяперашняга з тым, што навечна ўпісаўся ў яго памяць басаногім хлапчуком.— Я, друг, без цябе страдаў увесь час...»

Васілёў сябар, міліцыянер, зноў павярнуўся да шафёра, расшпіліў руды бліскучы планшэт. «Адпусці ты яго,— папрасіў Міша.— І мяне ж ён вёз...» — «Не-не,— закруціў галавою Васіль.— Карай, Паша, па ўсіх стацыях. Парадак ёсць парадак. Як кажуць, ты мне друг, а ісціна даражэй. Ты куды зараз?» — «У ваенкамат. І работу шукаць...» — «Да нас не хочаш?» — «Пакуль не»,— Міша кісла, сумна пасміхнуўся. «Ну тады едзь, спраўляй свае дзялы, а пасля падыдзі да мяне ў кабінет, пагаворым. На дзвярах убачыш: «Начальнік ДАІ». Туды і стукайся».

Будынак ваенкамата быў старадаўні, цагляны, з вузкімі цьмянымі вокнамі, стаяў у зарасніку бэзу, язміну і белых ружаў. Ад весніц да самых дзвярэй абапал цэментовай дарожкі стаялі шчыты — воіны ў касках, выпіскі са статутаў; каля ганка ярка цвілі клумбы, падобныя на вялізныя святочныя пірагі.

За акенцам, выразаным у таўстым шкле, сядзеў прапаршчык. Узяў у Мішы ваенны білет, разгарнуў, лёгенька свіснуў; паставіў штампік, спытаў, дзе Міша будзе працаваць. «І гэты як бацька»,— незадаволена падумаў Міша, але сказаў стрымана, што яшчэ «не прыстроіўся». «Уладкуешся — паведамі»,— папярэдзіў прапаршчык і аддаў ваенны білет.

У горадзе не было аўтобусаў, і Міша пайшоў да «Сельгастэхнікі» пехатою, лічы, на самы канец горада; там і пэмка. Міша ішоў няспешна і бачыў, што горад разбудаваўся, пасвятлеў ад высокіх шматпавярховых дамоў; пашырэла цэнтральная плошча, каля помніка Леніну рдзелі ў лёгкіх плеценых кашах свежыя кветкі.

Спыніўся каля прахадной «Сельгастэхнікі» — бе-

лай цаглянай будачкі з вялікім закратаваным акном. Адчыніў дзверы. На крэсле ў куце сядзеў стары ў зімовай шапцы і чытаў газету. «Мне трэба галоўны інжынер ці хто з начальнікаў»,— сказаў Міша. «А вы з рэдакцыі?» — «Не. На працу».— «Усе на савяшчанні. Будуць пасля абеду».

Міша не вельмі засмуціўся: ужо прывучыў сябе, што любая дробязь — не такая простая штука, мае свае зашчапкі і замочкі, да якіх трэба падбіраць ключыкі. Што рабіць? Пацёгся зноў на цэнтр горада: пабудзе на старых, знаёмых мясцінах, загляне ва універмаг. А можа, зразу шпарыць да Васіля? Не, паадно, яго не будзе яшчэ, а па-другое, усё-ткі трэба праясніць з работаю.

Міша ішоў цэнтральнаю вуліцаю, і позірк яго перакідваўся то на адзін бок, дзе стаялі ў густой зелені драўляныя будынiны, то на другі, дзе выстраіліся ў шчытны рад магазіны, аптэка, Дом быту, пошта... І раптам Міша ўбачыў партрэт... бацькаў партрэт і яшчэ многа-многа партрэтаў, аж два рады на высокай мураванай белай сцяне. Міша падышоў бліжэй: бацькаў партрэт быў вялікі і, здаецца, навейшы за астатнія; сам бацька нейкі дзіўны на гэтым здымку — быццам смяротная туга засела ў вачах, а твар чысты, белы, як з гіпсу, і кашуля белая, гальштук звісае чорнай палосачкаю. Мабыць, у не надта вясёлы момант шчоўкнуў фатограф бацьку. Сум, туга ў вачах... А можа, і не толькі туга? Міша ўглядаўся ў вочы бацьку: здаецца, і дакорам колюць... Яго, Мішу. А быў бы зараз побач бацька, яшчэ і галавою паківаў бы. У Мішы скура зашэрхла: быццам і праўда стаяў ззаду бацька і глядзеў на яго, сына. Міша агледзеўся, але нікога за спінаю не было, адно па тратуары ішлі-спяшаліся людзі, яны былі занятыя сабою і блізка не зважалі на Мішу: у кожнага свой рупесак, свая радасць, свая маленькая трагедыя.

Мішу стала цяжка на душы, і на вочы быццам наплыў змрок. Дрэвы, яшчэ свежыя, зялёныя ў лісці, здаліся яму чорнымі, акурат абсмажаныя. Неба ў прасветліны між дамамі было прыкра-жаўтаватым, быццам ён глядзеў на яго праз шкельца з разбітай бутэлькі. Паднялася вышэй, адарвалася ад лесу чорная вузкая, бы вяроўка, хмара, усё роўна як накручвалася на шыю і душыла. Міша ўздыхнуў: здаецца, такі ад-

чай яшчэ ніколі не браў. А было ж усякай усячыны: другі на яго месцы, можа б, ужо здурнеў бы ад перажыванняў. А Міша ніколі не шманаў, яго і не радавалі поспехі, і не засмучалі няўдачы, «праколы», як ён іх пазней стаў называць. Са школы ён такі, помніцца, Шапялёў Іван Лукіч гаварыў: «Пруцікаву ці двойка, ці пяцёрка — яму ўсё роўна». Дык адкуль тады адчай? Няўжо ён, Міша, так рана апынуўся ў тупіку? Ці, можа, гэта хвілінная слабасць? Слабасць, душэўная, яна ў кожнага бывае... І яго ўжо аднаго разу абяззбройвала, брала пад абладу. З паўгода назад. Ён хацеў нават кінуцца з шостага паверха, дзе яны, дысцыплінарнікі, нарошчвалі сцены. Дурань, канечне, ён, але што зробіш. Чалавек не халодная цагліна, а жывая, крохкая душа. А калі жывая, то і павінна не толькі смяяцца, але і плакаць, пакутаваць. Плакацца, вядома, трэба як менш, не да твару гэта мужчыну, але не заўсёды можна ўзяць сябе ў рукі. Розум часам бывае бяссільны перад душою, розум загадвае, а душа сваё робіць — і хоць страляй яе! І вось цяпер, здаецца, яна зноў паказвала сваю настырнасць, якую Міша не мог скруціць, закілзаць.

Ён глянуў апошні раз на бацькаў партрэт, і той холадна бліснуў шклом, як слязою, і Міша ледзь не ўпаў — самлелі ногі,— акурат ступіў на слабенькі лядок-верхаводку. Дзіўна, але Міша не ішоў, а сунуўся, быццам і праўда чуў пад сабою лёд. Што з ім? Ён заскрыпеў зубамі — ад злосці за сваю бездапаможнасць. Адчай заўсёды абрушваецца на чалавека, калі ён зняцяйкі адкрывае ў сабе новую загану, якая дабавіць пакут.

З левага боку, крыху воддаль ад тратуара, у кустах бэзу стаяў шкляны павільёнчык, у ім прадавалі піва. Міша звярнуў туды. У расчыненыя напята дзверы ўбачыў, што каля прылаўка таўкуцца мужчыны. Прадаўшчыца была тая ж самая, што і тры гады назад, паўнатварая, чарнявая, з залатымі завушніцамі і ярка напамаджанымі вуснамі, якія то збіраліся ў трубачку, то расцягваліся нібыта ва ўсмешцы.

Піва было нясвежае, кіславатае, на дне калыхаліся не то крошкі хлеба, не то муць, але яно расслабіла Мішу галаву, яна лёгка закружылася і акурат перавярнула свет з ценявога боку на светлы. Кудысьці сплыла чорная вузкая, бы вяроўка, хмара, неба заіс-

крылася кароценькімі зыркімі, як іголачкі, сонечнымі промнямі, і лісце на таполях зальснілася тонкаю чыстаю слюдою. Ад ног адкацілася млявасць, і яны цвёрда ступалі па тратуары.

Хлебны магазін быў у «падвальчыку» — нізкім цагляным будыначку, у якім раней, помніць Міша, дзве таўстыя цёткі ў белых халатах прадавалі вэнджаную рыбу — тараны — і чорныя бліскучыя кольцы тоненькіх, як палец, каўбасак. Міша купіў чатыры булкі чорнага хлеба, ён быў мяккі, аж дыхаў і цяплом, і пахам. І гэты пах быў не такі, да якога прывык Мішаў нос і сам Міша за час адлучкі, а нейкі шчымлівы, свойскі, ці што, так пахла і поле, і дарога ад шашы, і бацькава дворышча, і балотца — уся малінаўская зямля...

Падышоў да аўтастанцыі, яе называлі «шпакоўняю», бо ў франтоне была дзірка, куды лseparaталі ластаўкі. Міша сеў на лаўку; задуменна і зацята, бы статуя, глядзеў на аўтобусы, на людзей, што мітусіліся ў сваім як быццам самым галоўным у жыцці клопаце. Успомнілася школа, тыя два апошнія гады, як ездзіў у райцэнтр — у дзевяты і дзесяты класы. Пасля ўрокаў вясёлым цыганскім табарам яны, вясковыя, ішлі да аўтастанцыі, лавілі спадарожныя машыны, прасіліся ў аўтобусы. Дзіўная пара, усё з яе помніцца: і прыцемкі, якімі бег на шашу і якія, здавалася, цісну- лі на павекі, і тыя ж уцёкі ў «партызаны», якія пахлі дымам вогнішча і тугою бацькаваю дзягаю, і халодным піражком, купленым у станцыйным буфеце... І канечне ж, каханне, першае, школьнае, яно ва ўсіх бывае, і ў Мішы было, толькі бесталковае і маларадаснае, як і ўсё ў ім. У дзевятым класе ён закахаўся ў старэйшую за сябе дзяўчыну з Дабранкі, імя ў яе было Марыя, Маруся, але яе ўсе звалі Муся. Яна другі год хадзіла ў дзесяты клас, вучылася слаба, часта прапускала ўрокі, нават Мішу было няёмка за яе. Муся была вельмі зграбная, з роўнымі таўставатымі нагамі нейкай чыстай, смятанкавай жаўцізны; у яе быў востры роўненькі носік, усыпаны дробнымі вяснушкамі (толькі вясною), карыя, як у Ленкі, вочы, але нежывыя, з пастаянным сумам ці пустатою. Муся садзілася на лаўку, закідвала нагу на нагу, і тады на лытцы быў добра відаць чорненькі пушок; гэты пушок цёплаю лёгкасцю напаўняў Мішаву душу, і яна

рвалася некуды ўвысь. У такія хвіліны Міша не мог глядзець на Мусю, хоць іншыя хлопцы, і Васіль Муранкоў, не сароменіся падлазіць да яе і шчыпаць за бок. У Мішы ад рэўнасці і злосці сціскаліся зубы, але, баючыся выдаць сябе, не чапаў хлопцаў; толькі дзенебудзь на выгане, калі бараліся, лаўчыў заламаць руку ці нагу таму, хто вельмі ўжо дапякаў Мусі. Муся, здаецца, была абыякавая да Мішы, толькі аднаго разу, калі ён падсобіў ёй несці з цэнтра горада пакунак з мыцельным парашком, сказала, што ў яго, Мішы, «красівыя вочы». Міша так і не зразумеў, што гэта было: насмешка, падзяка або Муся хацела паказаць, што і ёй у ім нешта падабаецца?

Неўзабаве Муся зацяжарала, ад каго, ніхто не ведаў, і зусім кінула школу. Болей Міша яе не бачыў, хоць і насіўся колькі разоў на кані ў тую Дабранку: мабыць, з'ехала ў свет, далей ад ганьбы.

Гэтыя сцэны з мінулага яркаю, выразнаю плёнкаю перакруціліся ў памяці, і Міша адчуў сябе зусім бадзёрым, бесклапотным, гатовым на «вялікія подзвігі». Ён пакпяваў на недакурак і кінуў яго ў сметніцу; размахваючы сеткаю з хлебам, пайшоў у міліцыю.

На ганку стаялі два мужчыны з бледнымі зморшчанымі тварамі і нешта ўголас даказвалі адзін аднаму. Міша прайшоў па калідоры, чытаючы на дзвярах шыльдачкі. Звярнуў улева, у неглыбокі цесны калідорчык, і прама перад сабою ўбачыў на абабітых дэрмацінам дзвярах рудую шыльдачку, на якой жоўтымі літарамі было напісана: «Начальнік ДАІ Муранкоў В. А.» Міша грабянуў рукою валасы і пастукаў у дзверы, але дэрмацін заглушыў гукі.

Васіль сядзеў за сталом, пісаў. Кабінет быў прасторны, светлы, шырокія вокны з жоўтымі шторамі; у куце стаяў сейф, каля дзвярэй скураная канапа і за ёю некалькі крэслаў у рад. На стале ў круглай і празрыстай, як медуза, крышталёвай попелцы дымілася цыгарэта.

Васіль кіўнуў Мішу, каб садзіўся, а сам, не адрываючы вачэй ад паперы, пісаў. Міша сеў на канапу, адваліўся на спінку. Васіль коса зіркнуў на яго: маўляў, пачакай, я зараз. Націснуў кнопку на падобным да магнітафона апараце, які стаяў на тумбачцы пад правую руку, і сказаў: «Лейтэнант Аўраменка!»

Адчыніліся дзверы, і страявым крокам зайшоў ужо

знаёмы Мішу міліцыянер-даішнік. Васіль аддаў яму паперу, той выйшаў, і Васіль зашчоўкнуў за ім дзверы. «Зараз кавы пап'ём...» — Васіль падышоў да сейфа, а Міша ўстаў і з нейкаю сухою ўтрапёнасцю пачаў разглядаць на сцяне карту дарог раёна, стэнды з фатаграфіямі аварый: скурожаныя машыны, зваленыя слупы з абрыўкамі правадоў, праломы ў парэнчах мастоў, накрытыя прасцінамі трупы людзей...

Калі Міша, можа, хвіліны праз дзве, скасіў вочы на стол, то ўбачыў на ім маленькую жоўценькую, бы груша, кававарку і здзівіўся, што Васіль не паставіў бутэлькі: за такую сустрэчу нейкаю каваю адбаярваецца. Васіль як прачытаў усё роўна Мішавы думкі: «Другім разам чаго-небудзь мацнейшага возьмем, а цяпер кавы: работа ёсць работа, і наогул я... Сяджу да паўночы, носам кляваць пачну — вып'ю кавы, і ў галаве пасвятлее... Імпартная кававарка! У разетку ўключыў — за мінуту і гатова. У ГДР купіў, як з жонкаю на экскурсію ездзілі...» — Васіль наразаў таўстую бледна-ружовую вільготную каўбасу, намазваў на хлеб масла і клаў наверх па два скрылікі — рабіў бутэрброды. Васіль увіхаўся жвава, па-заліхвацку байкака, рухі ў яго былі рэзкія, дакладныя — факт, дасканалая вайсковая вывучка. Наогул Васіль быў чалавекам з тых, што задаволены і жыццём, і работаю — не толькі ў сэнсе грошай, якія нярэдка таксама прымушаюць людзей трымацца свайго месца, а і ў маральным сэнсе: работа не вісела над ім абузаю, не псавала яму настрою, ён не ішоў, а бег на яе раніцаю, з нецярплівасцю, нават з дрыжліваю бадзёрасцю чакаючы, як пачне аддаваць загады, штрафаваць вінаватых. А калі ўлічыць яшчэ, што Васіль меў адменнае здароўе, сям'ю — жонку, якая ганарылася мужам, што ён у яе міліцыянер, не толькі на людзях, каб надаць сабе аўтарытэту, але і ў душы, што не так ужо часта бывае ў сучасных сем'ях,— і двое маленькіх дзетак, то наогул Васіля з поўным правам можна было аднесці да рэспектабельных людзей нашага даволі сумбурнага часу.

Ставячыся з грэблівасцю да п'яніц, лайдакоў, ветрагонаў, усіх няўдачнікаў, Васіль, аднак, ліслівіў перад Мішам, шануючы і з расчуленасцю ўспамінаючы дзяцінства і сваё з Мішам дружбацтва, таму ў душы яго не было і кроплі якой-небудзь пагарды. «Ну, што

з работаю?» — спытаў Васіль, адпіўшы маленькі глыток кавы. «Ды нідзе я не быў!» — сказаў Міша з раздражненнем, але не таму, што не трапіў да начальства «Сельгастэхнікі», а таму, што сам цяпер ужо быў у няпэўнасці і не ведаў, што рабіць. «Я ж прапаноўваю: ідзі да нас...»

Міша зноў кісла ўсміхнуўся, і тужлівасцю абвалакло душу, стала шкада самога сябе: няўдалы ён нейкі, нідзе не хапаюць яго з рукамі і нагамі. «Не возьмуць...» — «Гледзячы кім»,— Васіль, адкусваючы бутэрброд, замармытаў, як кот. «На пасаду «куды пашлюць»?» — «А што? Пакуль. А там... Трэба на любой рабоце самаадданасць. Каб яе ўбачыла начальства, і ты пайшоў...»

Не, Міша прыніжацца не прывык, не ўмеў: не было ў яго душы ні выхаванасці, каб перанесці незаслужаную крыўду, ні дальнабачнасці і ўмення закілзаць свой нораў дзеля таго, каб захаваць на будучыя вялікія справы. Міша жыў імгненнем, быў з тых людзей, у якіх валуны думак-перажыванняў, жыццёвых варыянтаў былі ўсе ззаду і не заміналі свабодна ісці ўперад. Бо звычайна людзі, якія глядзяць далей свайго носа, дзеля нейкай дробязнай выгады, столькі наваротваюць перад сабою ўсякіх валуноў-перашкод, што толькі ногі ламаюць ды неўрозы нажываюць, а як акажацца, выгада і сотай долі намаганняў не вартая была.

У кабінеце на падаконніку расла пакаёвая пальма; лісце яе тонкімі стрэлкамі веерам разбягалася ад асновы чаранка, і Міша, гледзячы на яе прыжмуранымі вачыма, падумаў, што і перад ім цяпер ляжыць столькі ж дарог-сцежак, і ўсе з адной кропкі (ад яго) у розныя канцы. Калі б не гэтае нутраное пярэчанне, бяспомачнасць, што зарадзілася перад бацькавым партрэтам, ён безаглядна і нават з радасцю ўжо абабег бы палову гэтых сцежак-дарожак.

«Бацька настойвае, каб я там... у калгасе. Старшыня, кажа, харошы».— «Тож дзела! Ягорыч і праўда ў нас кацірусцца. Якая розніца, з чаго пачынаць? Галоўнае: трудзіцца ў поце ліца, як гаворыць мой начальнік...» — «Ты, Васіль, канечне, мяне здзівіў»,— раптам ні з таго ні з сяго сказаў Міша, і ў голасе ў яго чулася колкасць. Не, Міша не хацеў дапячы Васіля іменна за тое, што не прывеціў як след ды яшчэ павучае, проста з ім у хвіліны слабасці бываюць такія мо-

ынты, што ад злосці на сябе хочацца іншым гаварыць ölкасці, словы, якія прыніжаюць. Гэта не прыносіла му асалоды, наўпярок, раздражняла і самога, але ён ыбіваўся з дурною ўпартасцю, каб яго неўзлюбілі, а то і ўзненавідзелі — і не спачувалі. На чорта яму гэае спачуванне! Не мамчын ён сынок.

Васіль, хоць і ведаў Мішу, яго звіхі, расцаніў ягоны выпад як крыўду перш за ўсё і зразумеў, што размову трэба завязваць, інакш яна выкіруе на спрэчку, пасля якой настрой надоўга будзе сапсаваны, а знаць, і работа не будзе клеіцца. А каб Міша часам не падумаў, што ён, Васіль, заганарыўся і не разнёс па Малінаўцы, што Васіль Муранкоў надта «ставіцца», задзірае нос, сказаў Мішу, што дасць каманду падкінуць яго дахаты. Гэта была не толькі сяброўская прыязнасць, але і шыкаванне — часцінка той душэўнай асалоды, якую прыносіла яму работа.

Міша згадзіўся: няхай вязуць. Пацісnуў Васілю руку, без каліва запабягання перад ім і тым болей віnаватасці; ён развітваўся з сябрам, пачуцці да якога мелі тую выразную і шчырую акрасу, якая выяўляецца ўсімі сваімі адценнямі толькі пры поўным даверы і з вока на вока.

Васіль правёў Мішу да ганка. Лейтэнант Аўраменка сядзеў на матацыкле і чакаў; з выхлапной трубы пульсаваў рудаваты дымок. Міша сеў на задняе сядзенне, сетку з хлебам паставіў на калені. «Інтэлігент!» — хмыкнуў Міша, глянуўшы ўслед Васілю, які павярнуўся ўжо спінаю.

Аўраменка гнаў матацыкл хутка. Вецер свістаў так, быццам за вухам цягнулі тоненькія звінючыя правадкі; на спіне ў Мішы ўставала дыбаром, аж напіналася пад пахамі, кашуля — як не раз'язджалася па швах.

«Стой-ка!» — крыкнуў Міша, калі параўняліся з маленькім магазінчыкам, які стаяў на гары і чамусьці называўся «Блакітны Дунай», хоць вокнамі глядзеў на Сож, а да Дуная было нашмат далей, чымся да Кіева. Аўраменка рэзка затармазіў. Міша пакараскаўся па гары. Магазін быў адчынены. За прылаўкам стаяла маладзенькая тоненькая дзяўчынка з чорнымі сумнымі, як у Мусі, вачыма; Міша ўжо прымеціў, што чорныя вочы заўсягды ці то калючыя, ці то сумныя. Міша купіў «бомбу» — семісотграмовую бутэльку партвейна

і пачак пячэння; успомніў пра маці і папрасіў яшчэ шакаладку.

Зноў Аўраменка гнаў матацыкл на шалёнай скорасці. Каля будачкі, што стаяла збоч шашы ў рэдкім высокім бярэзніку, у які калісь Міша з бацькам хадзіў рэзаць ababкі, Міша папрасіў спыніцца: «Перадыхнём трохі...» Звярнулі да будачкі; пад стрэшкаю стаяў маленькі круглы, падрапаны нажамі столік і вакол яго вузенькія, на адну дошку, лаўкі. «Будзеш? — Міша трымаў адкрытую бутэльку. Аўраменка сутаргава закруціў галавою.— А я вып'ю, назло ворагам, як кажуць... Расстроіўся я вельмі. Ні ў дугу не варты». Аўраменка ўсміхнуўся і панурыў вочы, калі Міша паднёс рыльца бутэлькі да губ. Трохі спагадзя Аўраменка сказаў: «Навошта ты гадасць гэту?» І ў голасе, здалося, было шчырае спачуванне.

...Такога пераляку ў Пруцікавай хаце, мабыць, не было ад той пары, калі прыйшло пісьмо з часці. Лісаветка, якая палівала вазоны з кветкамі, убачыла ў акно, як да хаты падкаціў міліцэйскі матацыкл, і Міша сядзеў на ім хоць і з сеткаю хлеба, але ці не падпіты: твар чырвоны, валасы раскудлачаныя. Лісаветка кінулася да Грышкі — ён драмаў у верандзе,— затармасіла яго: «А божачка!..» Грышка падхапіўся і, як звар'яцелы, тупа глядзеў на жонку: «Што?..» — «Зноў!.. Во-о-ой, галованька мая!..» — Апусцілася перад ложкам на калені і ўткнулася тварам у матрац. Грышка сядзеў бледны, як мыла, і лыпаў вачыма, вусны яго дрыжалі.

На двары затупалі нагамі. Грышка адхінуў жонку і выбег з веранды. Міша быў вясёлы, смяяўся і гаварыў як з меха сыпаў, а нехта яму адказваў стрыманым мужчынскім баском. У Грышкі сэрца адарвалася, калі адчыніў дзверы і ўбачыў у сенцах міліцыянера. «З дастаўкаю надам! — Міша ўсміхаўся, зіркаў на бацьку, і ніводнай колькі-небудзь трывожнай кропачкі не было ў ягоных вачах.— Во дажыўся! Ха!..» — Паставіў сетку з хлебам на стол. «Сядайце...» — Грышка зразу паказаў міліцыянеру на табурэт; не, гэта не было падлашчванне, а проста звычайная гасціннасць да чалавека (няхай міністр, няхай смаркаты неслух), які зайшоў у хату. «Ды не ж, ацец! Я сваю місію існолніў. Да пабачэння!..» — І пайшоў з хаты.

Лісаветка стаяла на парозе, яе чорныя, як слівы,

вочы былі нерухомыя і круглыя і ад заселага ў іх страху ўжо не калючыя, а тупыя і злосныя. І толькі праз мінуту-дзве ў хаце ўжо ўсе смяяліся, хоць і не было ў смеху звычайнай раскаванасці: надта вялікі быў пераполах, каб ад яго так хутка атрэсціся. «Добра, што хлеба не забыў купіць»,— пахваліла сына Лісаветка і памацала пальцамі скарынку. Міша аддаў маці шаладку. «А табе, бацька, ніякага гасцінца»,— сказаў непасрэдным голасам.

Грышка, бачачы, што сын на падпітку, ахвочы на словы, з тайным спадзяваннем чакаў, калі той пачне гаварыць «дзела». Ужо такі закон, што для чалавека, які вырас на зямлі і які ад роду не ведаў іншых клопатаў і дбання, чым зямля, чым карпець на ёй да поту і крыві, адзінаю меркаю дабрачыннасці, чалавечай годнасці была праца, яе вялікасць Праца. Шкада, канечне, што дваццаты век многія каштоўнасці памяняў, а праўдзівей, памяняў саміх людзей, якія бачаць іншы раз латву ў тым, што раней асуджалася: нічога не рабіць і многа зарабляць.

Міша быў далёкі ад бацькавых думак, ён смяяўся, як дзіця, нават браўся расказваць анекдот, і Грышка зразумеў, што Міша добра выпіў, і гэта раззлавала ўшчэнт, замуціла вочы: апошнім часам ён блага пачуваўся, мабыць, яго знясілілі клопаты, нагрузка на галаву і нервы.

«Што ў цябе з работаю?» — спытаў ён як мага мякчэй, але Міша не быў бы Мішам, калі б не адчуў бацькавай настырнасці. «Бацька, адстань! — раптам сказаў ён скрозь сцятыя зубы.— Не лезь мне ў душу, ты мяне знаеш...»

«Ах ты, шчанюк!..— у Грышкі закіпела ўсяродку.— Яшчэ мне гразіцца будзе!..— Грышка ажно затросся ад злосці, залапаў рукамі каля пояса — хацеў выцягнуць дзягу, ды ўспомніў, што яна засталася ў новых штанах, якія надзяваў сустракаць Мішу.— Ды я цябе!..» — кінуўся з кулакамі на Мішу, падступіўся, збялелы, задыхаў яму ў твар. Міша стаяў нерухома і думаў: ударыць бацька ці не ўдарыць. Лепей бы не біў, іначай Міша не ручаецца за сябе, можа здарыцца страшнае, непапраўнае: не саўладае і ўдарыць бацьку ў адказ. Падыме руку на святое, тады ўсё — гамон, *смерць*. Ніякай літасці яму не будзе. Люстэрка можна выцерці, няможна выцерці ад бруду душу.

Падбегла Лісаветка, стала між Грышкам і сынам, развяла іх рукамі: «Акыш, пеўні!..— і адзін і другі лёгка падаліся. Грышка сеў на табурэт, абхапіў галаву рукамі — між пальцаў павылезлі сівыя касмылі. Горка было на душы, хоць атручвай ёю мух замест мухамора: зразумеў, можа, упершыню, што зломлены, здаўся, гэты яго падскок да сына — ад бяссілля.

«І я добранькі...» — падумаў Міша, раз на бацьку руку мог падняць (ад аўтара: як у бацькі не павінна быць да сына зайздрасці, так у сына да бацькі — нянавісці).

* * *

Планы свае на дзень вясковыя людзі намячаюць увечары, а даюць ім рух з самага рання, жывучы па адвечным сялянскім законе: хто рана ўстаў, той не празяваў.

Грышка выбраўся да Ляксея Чубатчышына, як кажуць, на цёмнай зары. Яшчэ не выганялі кароў. У канцы вёскі над вуліцаю вісеў ліловы туман: яго прасвечвалі першыя промні сонца, якое ўставала з-за алешніку. На асверы калодзежа, адзінага ў Малінаўцы, блішчаў мокры цэбар. У дрэвах, у траве, у прыцішаных хатах — ва ўсім адчувалася мяккасць, лагода, заспакоенасць, і толькі ў Грышкавай душы была вольная воля турбоце: такая натура ў яго — думаць над кожнаю макулінкаю. Ці будзе дома Ляксей, можа, на нарад ужо засвістаў, а то зусім укусіць яго камар і не захоча везці калодкі на пілараму.

Мінаючы, глянуў на Чубатчышыну хату: стаіць асунутая, паніклая, як стары абабак, і ў вокнах няма жывога бляску — без чалавека і хата памірае. Узімку, акурат лютаўскімі маразамі, не стала Чубатчыхі; рассеяла па зямлі сваіх дачок і памерла. Грышка хадзіў капаць ёй магілу. Зямля была цвёрдая, што камень, дзяўбеш ломам — іскры ляцяць. Даўно не было такіх марозных снежных — сумёты ўроўні з частаколам — зім, можа, ад той пары, калі Грышка ездзіў на Палессе паводку ўціхамірваць.

Шкадаваў Грышка Чубатчыху... Яно ўвогуле шкада любога чалавека, які памірае, але разам з Чубатчыхаю, адчуваў Грышка, адыходзіла нешта балючае і важнае, без чаго іх Малінаўка станавілася бяднейшаю, сцірала свае аблічча.

Ляксея, хоць ён і не сын быў, а толькі зяць Чубатчыхі, усе звалі Ляксей Чубатчышын; і жыў ён на адным двары з Чубатчыхаю, толькі хаты, канечне, не параўнаеш.

Ляксей быў дома. Снедаў: мачаў у патэльню скручаным у трубку дранікам. Пахла цыбуляю і падпаленым тлушчам. Грышка павітаўся, Ляксей затрос непрычасанаю галавою. Мар'я, жонка Ляксеева, высокая сутулая кабета, увішна арудавала ў печы вілкамі: водбліскі полымя скакалі па яе твары, і рысы яго станавіліся яшчэ болей сухімі, жорсткімі, забранзавелымі. Мар'я, аднак, як і Ляксей, была лёгкая не толькі на нозі, але і на язык.

«Рана ж ты прыйшоў, мілёнак,— засмяялася яна.— Бачыш, мой жа дома яшчэ...» — «Дык я магу пайсці,— Ляксей адсунуў патэльню: зразумеў жончын жарт.— Дзесяць, дзевяць, восем, сем... пяць... два, адзін — і на вуліцы. Любіцеся».— «Старым не да глупства,— сказаў Грышка ходкае ў Малінаўцы выслоўе.— У мяне сур'ёзнае дзела».— «Выкручвайся, выкручвайся»,— пасмейваўся Ляксей. «Не, праўда, Ляксей»,— Грышку сёння, хоць забі, не хацелася жартаваць, бо думалася: жартачкамі і Ляксея настроіць так, што той несур'ёзна паставіцца да просьбы. З Ляксеем Чубатчышыным заўсягды дамаўляцца і проста, і нялёгка. Проста, бо ён ужо калі паабяцаў, сваё слова шануе. Нялёгка, бо Ляксей амаль не піў гарэлкі, а браць грошы ў сваіх людзей не вельмі добра гэта; і бясплатна не хочацца ж рабіць, бензін паліць і ўсё такое: недахват будзе — старшыня вылічыць грошы, і атрымаецца, што зрабіў людзям ласку ды ўдабавак і паплаціўся, капейку сваю ўнёс. Але малінаўцы прызвычаіліся да Ляксея: хто пяцёрку суване проста ў кішэнь, і Ляксей тады яе ўжо не вымае, хто наогул Мар'і аддае плату, маўляў, усё роўна ж Ляксей не п'е і навошта яму грошы.

«Звазі, звазі»,— падказала Мар'я, калі Ляксей задумаўся, зноў павесіў нос над патэльняю. «Во, палюбоўніку, дык зразу і едзь! — Жарт ніколі не пакідаў Ляксея — шчаслівы чалавек! — Добра, дзесяць, дзевяць, восем, сем... пяць... два, адзін — гадзіны ў чатыры буду каля цябе».

Ляксей, як і сказаў, роўна ў чатыры пад'ехаў да Грышкавай хаты. Грышка шырока расчыніў вароты,

і Ляксей загнаў прычэп на двор, нідзе не чырхануў нават па частаколіне. Міша стаяў каля пуні, баяўся глянуць у вочы бацьку, але з зайздрасцю глядзеў на трактар — на высокую шкляную кабіну, бліскучы прамакутны перадок з дзвюма ўтопленымі фарамі, чорныя тугія колы з тонкімі, як запалкі, саскамі на бакавіне; выскачыў з кабіны Ляксей, піхнуў дзверцы, і яны мякка шчоўкнулі, бы ў легкавіку.

«Ну што? Дзесяць, дзевяць, восем, сем... пяць... два, адзін — грузіць будзем!» — Ляксей адлічваў ад дзесяці спярша па парадку, потым па аднаму яму вядомай логіцы пераскокваў.

Адчынілі бакавы борт. Міша стаў пад камлі, Грышка на танейшыя канцы, а Ляксей падхопліваў калодкі на сярэдзіне.

«Дзесяць, дзевяць... узялі!..» — чырванеў ад натугі Ляксей і моршчыў лоб.

Пагрузілі хутка — упарыліся. У Грышкі на скронях узмакрэлі валасы, у Мішы выступіў пот на верхняй губе.

Грышка сеў у кабіну. Міша ехаў на прычэпе, на калодках — уссеў вярхом, як на каня. Задняе шкло ў кабіне было запыленае, нехта намаляваў на ім бусла — даўгая дзюба і даўгія, як палкі, ногі,— але Міша ўсё роўна бачыў, як рулюе Ляксей, лёгка, лічы, адным пальцам. Ехалі шашою, абапал стаялі сосны, з густымі сінімі галінамі, і Мішу здавалася, што ён не на калодках сядзіць, а ляціць на крылах, бы тая птушка бусел, намаляваная на шкле. Калі марыш, дык заўсёды здаецца, што некуды ляціш. Міша ўяўляў сябе за рулём, і такім прыемным, пранізлівым, тугім цяплом захліствала яму грудзі... Што за рамантыка недзе ў далёкім краі, сярод чужых яму камянёў ці пяску? Дурата нейкая, глытнуў ён ужо такой рамантыкі. Во яна тут, рамантыка, свая, блізкая, зразумелая, сярод гэтых дзябёлых сосен, пад блакітным, такім высокім, недасяжным небам. І бацька, бацька, факт, ад радасці заскача! Няхай хоць пад старасць парадуецца сыну, а то ўсё не тое, дык другое. Во і тыдзень назад — скандал, успамінаць сорамна...

«Чорт з ім, пайду да старшыні прасіцца на трактар!..»

Кіламетраў праз пяць звярнулі з шашы — на пясчаную дарогу. На сінім указальніку з белым канцом-

стрэлкаю было напісана: «Дабранка — 1 км». Натужна завыў матор, з трубы папёр ужо не сіні, а чорны дым. «О конік! — падумаў Міша.— Гэта не Белазоры...» — Успомніў Глубку і спахмурнеў: няма Белазорага, як і няма, лічы, ужо коней у Малінаўцы. А раней быў цэлы табун, і канюшня была, і яе таемнае пахкае нутро, куды цягнула Мішу як магнітам. Эха-хо, лепей не ўспамінаць: столькі прыгод-злыгод было з тою канюшняю. Праз дзверы, вокны, дах — куды толькі не ўлазіў Міша. Сорамна цяпер за тыя несур'ёзныя, блазенскія вывіхі, але што зробіш: аж дасюль вее ад іх незразумелаю хвалюючаю, салодкаю радасцю і тугою...

Трактар траскатаў на ўсё наваколле, ажно страляла ў вушах, і Міша не чуў, што і на піލараме звініць-спявае цыркулярка. Піларaму Міша бачыў упершыню, хоць і гойсаў калісь па Дабранцы, з Мусяю сустрэчы шукаў,— дашчаны высокі будынак, падобны на збожжаток у іх калгасе. Вакол горы апілак, па іх парасла зялёная ў пояс лебяда і драсён з вузенькім чырвоным, як перац, лісцем. У апілках грэбліся рудыя куры, і сярод іх чырвоны, як агонь, певень, а ногі ў іх, і кіпці на нагах, і апілкі былі жоўтыя. Пахла смалою і нечым вострым, як воцатам, ці што.

З будынка выскачыў Марчанок — у фуфайцы, белай ад пылу, і белым саламяным брылі — начальнік! І вейкі ў яго белыя, як у муцэ. Замахаў рукамі — засакаталі, разляцеліся, напалохаўшыся, куры. З кабіны вылез бацька, падаў Марчанку руку. Не чуваць было, пра што яны гаварылі. Ляксей аб'ехаў будынак, спыніў трактар перад расчыненымі дзвярыма. «Скідайце!» — даў каманду Марчанок.

Скідаць — не грузіць; скінулі калодкі мінут якіх за «дзесяць, дзевяць...». Міша зазірнуў у сярэдзіну будынка: дзве рэйкі, колы з захватамі-зубцамі і роўненька пастаўленыя адна каля адной круглыя чорныя пілы, нечым падобныя на спелы сланечнік. Калодка кладзецца між колаў, яны памалу коцяцца — калодка ўпіраецца ў пілы, што звіняць, як прапелеры, і каля іх закручваецца тоненькая спружынка. Міша помніць, як яны будавалі хату, ужо гадоў пятнаццаць таму, а можа, і болей. Тады піларамы яшчэ не было, і мужчыны пілавалі дошкі ўручную. Ставілі высокую, гарбатую, бы вярблюд, сталюгу, на яе клалі калодку; адзін

мужчына залазіў наверх, другі стаяў унізе, пад сталюгаю, і цягалі даўжэзную з крывымі зуб'ямі пілу. Пілу заціскала, пасоўвалася яна марудна і гнала толькі адзін след; а тут зразу ўся калодка распілоўвасцца на дошкі.

«Ну што, расчот цяпер ці як парэжаш?» — спытаў Грышка ў Марчанка. Той ад здзіўлення падняў свае чорныя, бы абпаленыя каласы, бровы. І Міша з Ляксеем пераглянуліся: Марчанок, падобна, чагосьці не разумеў ці нечым быў незадаволены.

«Плата само сабой,— сказаў Марчанок, сагнуўся і стаў вадзіць пальцамі па рудаватых кольцах на зрэзе калодкі.— Не пашкодзіла б і горла прапаласкаць... ад пылу горка, пастой у гэтым пекле».— «Во ты чорт! — Грышка ажно вылаяўся.— Саўсім здурэла башка... Забыў хоць квасу якога!» — «То-та ж! — цмокнуў языком Марчанок, зняў капялюш і строс з яго пыл; валасы на галаве былі рабыя, акурат нехта сыпнуў на іх жменю проса.— Не падмажаш — не паедзеш. Я трактарыстам быў, дык чарка штодня перападала, а цяпер...— Марчанок заважнічаў і цыркнуў слінаю.— Трактарыстаў многа, а я адзін... на ўсю акругу цар, бог і воінскі начальнік! І ўсе ідуць да мяне на паклон: Данілавіч, Данілавіч...»

Грышка задумаўся. Нямала пажыў ён на свеце, і дзіўная карусель круцілася ў яго перад вачыма. Раней, помніць, людзі праглі нейкай далёкай, высокай мяжы, якую не толькі пераступіць, але і пабачыць нельга было, жылі светлымі, чыстымі памкненнямі, а цяпер у іх сталі ўжо такія цвярозыя галовы, што кроку не зробяць без выгады. І паважаюць таго, ад каго можна нешта мець: трактарыста, шафёра, лесніка... Як паважаюць? Паказваюць, што паважаюць, а зачы бэсцяць: хапуга, скнара. А калісь, даўным-даўно, у іх Малінаўцы настаўнік быў, Карнееў... Ідзе па вуліцы — за кіламетр шапку здымалі: «Добры дзень!» Цёмныя, непісьменныя людзі да навукі цягнуліся. Цяпер адукаваны свет — карусель перавярнулася. Гавораць адно, а робяць другое. Калі ўжо ў вочы праўду пачнуць рэзаць, нечысць усякую вымятаць без аглядкі?

Грышка выняў з кішэні грошы: «Адскоч, сын, у краму, вазьмі там што...» — «А калі ўжо не браў з сабою, то не трэба,— сказаў Марчанок.— Што ганяць хлопца, я ж не алкаголік. Табе і так парэжу. Заўтра

адвечара прыязджай».— «Ета як я пагляджу яшчэ,— сказаў нібыта пакрыўджаным голасам Ляксей.— Як прывёз, дык ужо не патрэбен, на задні план адышоў, так?» — «Ну, вы прама ўсе такія ганаровыя, што не ўладзіш вам: аднаму то, другому ета! Пазахапілі ўладу!» — Грышка сказаў без падкусу, са смяшком: чамусьці быў упэўнены, што нікога сваім ушчуваннем не зачэпіць. А там хто яго ведае: сёння чалавек адзін, а заўтра не з той нагі ўстаў, і ўжо да яго не падладзішся. «А што ж ты хацеў? Мы — гаспадары!» — Ляксея распірала ад прытворнай пыхі, а Марчанок, здаецца, ці не ўсур'ёз паківаў Грышку пальцам: «Глядзі другі раз у мяне, такую тваю качалку!..»

Міша моўчкі глядзеў на мужчын, і тое, што яны строілі з сябе бог ведае каго, зусім яго не злавала, ён пасміхаўся ў душы, і, можа, нават задаволенасць тузалася ў яго бліскучых прыжмураных і трохі сумнаватых вачах. Малінавае, садзілася ў цёмна-сінюю, як не чорную імглу сонца. Спакой і лагода, якія бываюць толькі пасля ціхага дня ўвечары, сыходзілі на зямлю. Адтуль, дзе бялеліся шыфернымі дахамі кароўнікі, далятала песня — спявала жанчына: мабыць, збіраліся на вячэрнюю дойку даяркі; а неўзабаве загула апаратура — па шкляных сасудах пайшло малако, пабегла, як ручаінка, што заўсёды шукае вялікую раку...

І песню, і гэты знаблівы гул расшкуматала трасканне трактара — Ляксей завёў матор. Абманлівым, на імгненне і толькі ў нейкай маленькай мясцінцы бывае спакой на зямлі, а наяве дзень і ноч яна дрыжыць ад грукату, стукату і вібрацыі жалезных мускулаў.

* * *

Кантора калгаса была ў суседняй вёсцы, за чатыры кіламетры, і Міша паехаў туды на веласіпедзе. Ведаў, што кантора каля клуба, і здзівіўся, калі ўбачыў, як шмат што змянілася: кантора — ужо не старая хата, а фінскі домік. Яны, гэтыя фінскія домікі, увайшлі цяпер у моду: іх будуюць пад усякія канторы і людзям на жыллё. Яны, мабыць, зручныя, утульныя, бо чуў Міша не раз, што некаторыя кідаюць гарады і просяцца ў вёску дзеля жылля, дзеля гэтых домікаў. Так ці не так, не Мішу ламаць галаву, і без гэтага трашчыць ад думак.

Каля канторы, укругавую, раслі чэзлыя ліпы і клёнікі — яшчэ не ўвабраліся ў сілу. Міша ўбачыў іх, калі ішоў па шырокай цэментовай дарожцы да ганка. Адчыніў дзверы і апынуўся ў невялікай прадаўгаватай зале — прыёмнай: яна была пустая. І ў кабінеце нікога не было, абапал стала шмат крэслаў і ніводнага чалавека. Міша хацеў ужо зачыніць дзверы, як нечакана пачуў храпенне. Здаецца, тут, у кабінеце. І праўда, нехта хроп: дужа цягнуў у сябе паветра, а выпускаў з бульканнем, акурат выліваў з бутэлькі ваду.

На канапе — убачыў Міша — спаў мужчына. Пад галавою ляжалі таўстыя папкі, ногі ў шкарпэтках пакладзены на пярочную спінку канапы. Старшыня? Прыгадалася — бацька апавядаў: круглы твар з даўгім носам, лысаваты, і жывот тырчыць, «бытта пад кашулю засунулі мяшок зерня». Міша пастаяў у парозе трохі, паскроб патыліцу: мабыць, не трэба будзіць старшыні, усё роўна няўдала прыйшоў; але толькі ён павярнуўся, як пачуў: «Хто там? Заходзьце...— Мужчына падняўся, крэхнуў, апусціў долкі ногі, стаў шукаць імі туфлі (яны стаялі пад канапаю).— Да мяне? Э-эх!..— Смачна пазяхнуў, развёў рукамі, яшчэ болей вылузнуўшы жывот.— Што хочам? Смялей, смялей, салдат!..»

Міша зняцяйкі ажно здрыгануўся, пачуўшы «салдат». Старшыня быццам ведаў, хто перад ім, і пасміхаўся; і Міша зразу адчуў, як на лбе пачалі вырастаць рожкі, гатовыя даць бой самаму агрэсіўнаму працаўніку. Але наяршыўся ён дарма: старшыня — новы чалавек — не ведаў зусім Мішы і чаго ён прыйшоў, проста ў яго была прывычка ўсіх маладых хлопцаў называць салдатамі. Міша гэта хутка зразумеў. Старшыня падаў яму пухлую руку: «Ягорыч»; пасадзіў каля стала на крэсла і распытаў, хто ды што; абрадаваўся, пачуўшы ад Мішы, што ён, Міша, сын Грышкі Пруцікава. «Пра вас тут легенды ходзяць»,—засмяяўся Ягорыч, але не з'едліва, а так, быццам ставіў бацьку і сына ў рад калі не герояў, то людзей, цікавасць да якіх вырасла не на голым месцы. Ягорыч Мішу спадабаўся, у ягоных вачах была мяккасць, паблажлівасць, а ў тонкіх вуснах, якія час ад часу ўпарта, аж бялелі, падціналіся, не было і макулінкі наўмыснай начальніцкай непрыступнасці. Ягорыч, мабыць, з учарашняга

не галіўся, і па ўсім падбароддзі ў яго бліскала, бы металёвыя апілкі, шчаціна.

«Рэсурсы нам патрэбны, салдат! — з нейкаю летуценнаю адлучанасцю прамовіў Ягорыч, гледзячы ў акно.— Цяпер во так! — шарахнуў далонню па таўстой у белых палосках (незагарэла скура) шыі.— Жыта трэба ўхапіць, пакуль дажджы не хлынулі. Бульба сёлета будзе — закачайся!..— Летуценнасць не сыходзіла з Ягорычавага твару, і Мішу трохі прыкра стала, што гэты занядбаны здаравяк мае такую слабую, бабскую душу.— Не тое што ў бацькі твайго — грыбы...— Глянуў на Мішу, ці зачапіў за жывое, і доўга смяяўся: у яго былі жоўтыя моцныя зубы.— Можа, ад восені пойдуць, а цяпер няма.— Голас у Ягорыча дзіўна мяняўся: з вясёлага, як быццам бесклапотнага, рэзка пераходзіў на дзелавы і сур'ёзны.— Стаіць яго апаратура нядзвіжыма...»

Міша ведае, і бацька яму скардзіўся, што агрэгат пакуль толкам не прыдаўся: у яго, каб запусціць, трэба шмат грыбоў засыпаць, а ўхаластую ганяць мала выгады, і псуецца апарат хутка. Во і стаіць, асуджаны, пад паветкаю, акурат грыб раскіслы пад елкаю. Такімі, бачыў Міша, малююць у «Вожыку» закінутыя гультаямі камбайны, сеялкі-веялкі.

«Грыбы грыбамі,— Ягорыч адсунуў ад сябе папку з паперамі, узяўся абедзвюма рукамі за край стала, акурат збіраўся выступаць.— Як кажуць у народзе: калі добры кусман хлеба, дык і грыб патрэба. Нам хлеб... хлеб найперш патрэбен! — Ягорыч сціснуў свой вялікі цёмны, бы чыгун, кулак і варсануў ім у паветра, быццам адным штыхам хацеў расправіцца, струшчыць усё, што замінала яго расціць. Вочкі яго ў друзлых складках скуры глядзелі порстка і з незразумелым Мішу адчаем.— Свой! Каб ні ў якой заморскай сволачы не прасіць, не клянчыць. А то бачыш, салдат, чуць што: яны — эмбарга. У-ух! — Ягорыч зноў варсануў у паветра кулаком, і на няголеных шчоках у яго падняліся тугія хвалькі.— Во і ў нас перабоі ў магазіне з хлебам, хаця тут... абібокі!»

Міша глядзеў на Ягорыча не то са здзіўленнем, не то з захапленнем, за якое было не тое што сорамна, а проста няёмка — не за сябе, якраз за Ягорыча, узбуджанасць якога межавала болей з дзіцячым капрызам, чымся з непасрэднасцю дарослага чалавека. «Лад-

на! — Міша раптам адчуў сябе зусім вольна з Ягорычам, якога бачыў першы раз, і нават дазволіў сабе стукнуць кулаком па краі стала, каб лепш паказаць сваю рашучасць.— Так і быць! Давайце трактар, буду ўціраць заморскай сволачы нос».

Ягорыч тузануўся ад смеху, аж закалыхаўся, задрыжаў жывот; ціхенька сам сабе пасмяяўся, пакруціў галавою, як бы ўзважваючы кожнае слова; валасы разбэрсаліся, апалі каля вушэй, і на цемі агалілася гладкая бліскучая і жоўтая, як блін, лысіна. «Э, не-е, салдат!.. Трактара я табе не дам».— «Не разумею»,— Міша адчуў, як на лбе ў яго зноў засвярбела: мабыць, пачалі адрастаць рожкі. «Зразу я табе, Пруцікаў, трактар не даверу,— голас у Ягорыча стаў сур'ёзным, ні макулінкі смеху; пухліны павек з ружовымі плямкамі амаль закрылі вочы, толькі падрыгвалі вейкі, быццам нехта раз-пораз паколваў Ягорычу ў спіну іголкаю.— Пабудзь пакуль якім змазчыкам-прывязчыкам, а там будзе відаць, салдат. Трэба зарэкамендаваць сябе».

Міша з'едліва хмыкнуў, думаючы з адчаем, якi неймавернаю воляю яму ўдавалася скручваць, што ўсе чамусьці заганяюць яго ў самы зад, тупік, каб адтуль ён выкараскваўся, выграбаўся, як з нары, ды яшчэ па карку атрымліваў. А ў яго змалку дзікі страх перад цеснатою: здаецца, загані ў яе, і ён звар'яцее. Не, каб зразу як чалавека ўважыць, даць яму тое, што душа просіць. Мішу, канечне, падводзіла яго максімалісцкая логіка; ён не хацеў разумець простага жыццёвага правіла — што павага ад людзей, «чэсць і хвала» не даюцца, а заслугоўваюцца. Яму здавалася, што ён можа ўсё, што ён ледзь не пуп зямлі. А які ён пуп, калі нават пупавіну ад зямлі адрэзаў. Але гэтае самаўзвышэнне, якім бы голасам яно ні вымаўлялася, было пустым гукам для астатніх; яно не толькі не падвышала Мішаў аўтарытэт, а наўпярок, падмывала і той, які ў яго быў ад роду (калі ён увогуле быў). Міша гэта зразу адчуў, яго выхадкі, асабліва апошні год, пасеялі ў людзях недавер — малінаўцы ніколі не зводзілі чалавека на нішто.

«Гляджу,— Міша сказаў з прыкраю дрыготкаю ў голасе,— я ўсім вам косткаю ў горле стаў».— «Не ведаю, як усім, а я не хачу ў свой гарод казла пускаць. Казёл капустку любіць: хрумсь-хрумсь»,— Ягорыч засмяяўся, і Міша ўжо не мог трываць. «Ды пайшлі вы

усе!..» — Міша рэзка ўстаў з-за стала, можа, з хвіліну пастаяў, перабіраючы пальцамі, уздыхнуў і рвануўся на выхад. Калі б Ягорыч не сказаў яму ўслед некалькі слоў, то, факт, Мішу ён бы ў вочы болей не ўбачыў. Але Ягорыч, хоць і чалавек малады яшчэ, але воўк біты, шмат перажыў і шмат пабачыў, нават смерці цэлыя сем гадзін у вочы глядзеў і людзей разумець навучыўся. Ён пэўна не мог сказаць: ці гэта была набытая якасць, ці то ад матухны-прыроды ўзяў ён уменне разумець чалавечую псіхалогію. Іменна гэтае разуменне прымусіла яго забыцца не толькі на амбіцыю начальніка, але і на ўласны гонар саліднага (у параўнанні з Мішам) чалавека і падштурхнула «выстраліць» услед Мішу тыя некалькі слоў: «Падумай толькі, салдат! Не спяшайся. Заўтра-паслязаўтра падумай, і тады мне скажаш». І — пацэліў акурат: Мішу не магло не кальнуць, што сам старшыня не стаў у позу і не махнуў на яго рукою, а як бы нават унізіўся, ці што, пашкадаваў, што не ўдалося ўгаварыць яго, Мішу.

Мабыць, у гэтай слоўнай пачцівасці да Ягорыча чытача зацікавіў найболей штрых: Ягорыч «смерці цэлыя сем гадзін у вочы глядзеў». У вайну Ягорыч быў зусім малое дзіця, мала што помніць. Смерць прыйшла па яго ў мірны час, замахнулася касою над ім, калі краскі яго жыцця былі, як кажуць, у самым цвеце. На марфлоце ён служыў, і аднаго дня (яны выйшлі на заданне) развар'яваўся шторм на дзесяць балаў, і іх вартавы катэр перакуліўся. Ягорыч, тады проста Павел-Паша-Паха, аж сем гадзін прабоўтаўся ў марской вадзе на абломку мачты, пакуль яго, амаль бясцямнага, падабрала выратавальнае судна. Перажытае з усёю бязлітаснасцю прайшлося па яго маладым і дужым паляшуцкім арганізме: з галавы пасыпаліся касмыллём валасы, цукровы дыябет пачаў наліваць цела вадою, а надзей на сям'ю і цікавасці да жанчын не засталося аніякіх. І толькі да сэрца,-здаецца, ледзяная вада не дабралася, яно не заскарузла ў адчайнай самоце і зняверанасці, жыло па законах дабра і справядлівасці, як на вадзе, так і на сушы шукала выйсця да шчырасці.

Тры гады магнітафона ніхто не ўключаў, прастаяў нерухома. Тады, як ішоў на службу, Міша запакаваў яго ў кардонную скрыню і паставіў на шафу. І маці ска-

зала: «Няхай цябе чакае, чапаць не будзем». І да магнітафона ніхто не дакранаўся пальцам: скрыня ўрасла ў газеты, часопісы, якія закідвалі таксама на шафу. Цяпер, калі вярнуўся засмучаны ад старшыні, Міша ўспомніў пра магнітафон. Зняў яго з шафы. Распакаваў скрыню: магнітафон быў як новенькі, на панелі аніводнай пылінкі. І касеты былі цэлыя, ляжалі ёмкія, як абоймы, у поліэтыленавым пакеце. Міша не забыў, што на якой запісана. Захапленне замежнымі ансамблямі, якое спярша асляпляла, дурманіла, даводзіла да шалу, здаецца, прайшло, абрыдлі ўсе гэтыя «лэд зэпеліны», «пінк флойды», «бі джысы»... Ападаюць плялёсткі, і застаецца насенне — аснова ўсяго. Так і ў захапленнях.

Міша націснуў кнопку, з панелі пстрыкнула стрэшка; Міша ўзяў касету з запісамі «Песняроў», палажыў яе пад стрэшку і зноў утапіў у панель. Ён любіў «Песняроў», хоць ніколі на сцэне іх не бачыў, толькі па тэлевізары ды на карцінках.

Магнітафон зашыпеў; песні яшчэ не было чуваць, адно шорганне касы — звонкае, пругкае, з падсвістам: жых! жых! жых! А потым зразу, на высокім узлёце рвануў голас Мулявіна: «Касіў Ясь канюшыну!..» — і Міша адчыніў акно: заматлялася фіранка, з сухім шэлестам саслізнула са стала газета. Голас вырваўся на вуліцу і разлёгся на ўсе бакі, паляцеў да балотца, на шашу, да фермы, павіс над усёю Малінаўкаю і над зямлёю.

За алешнікам на полі стракатала, бы цвыркун у садзе на ссохлай яблыні, касілка: касілі цімафееўку, звозілі яе да фермы, на ток, дзе пераціралі на муку і гранулявалі.

Стукнулі ў сенцах дзверы: вярнулася з работы маці, прыйшла на абед. Хустка ў яе зялёная ад пылу травяной мукі, і рукі зялёныя па самыя локці, і бялкі вачэй, здаецца, зеленаватыя. Села каля стала, з сумам і любасцю глядзела на сына. Нешта сказала, ды магнітафон заглушыў яе голас. Міша злаваў на самога сябе: «Чорт, павіс у паветры, як падлётак: і лятаць не ўмею, і падаць боязна... Ужо абрыдла ацірацца без дзела. Усе разумныя, а мяне за рубель дваццаць хочуць узяць, крылы за спінаю зноў завязаць. Не на таго нарваліся!..»

Ці ты Ясь, ці ты не-е-е...
Спадабаўся ты мне! —

узвіўся голас Мулявіна пад бойкі стук барабана.

Міша выключыў магнітафон: няёмка было перад маці. «Што, мама?» — спытаў ён. «Стамілася... А ты хадзіў да Ягорыча?» — «Хадзіў, ды што толку».— «А чаму?» — «Не ўзяў».— «Куды не ўзяў?» — «Трактара не даў»,— сказаў Міша, адчуўшы, што, можа, упершыню расчуліўся голас. Перад маці. Але ён даў сабе шпоры, як калісь Белазораму, і стаў дзёрзкім і самаўпэўненым.— Хлапчука знайшлі! Упрошваюць...» — «Паслухай-ка, Міша,— маці звярнулася да яго мякка, ласкава, як да малога дзіця, і душа ў Мішы запрацівілася яшчэ болей.— Мы ўжо два дні без цехніка... Слесара Саньку... ета адзін тута ў зяці да Вольгі Чаранчышынай прыстаў, міліцыя забрала. Кажуць, за самагонку — гнаў...» — «Змазчыкам...» — успомніў Міша Ягорыча і скрывіўся. «Дык, можа, ты на яго месца, га? Палучаў ён добра... Сто пяцьдзесят, сто шэсцьдзесят». У Мішы на шчоках заварушыліся жаўлакі, ён шумна соп носам. «А што, пакуль...— Голас у маці быў нязвыкла пакорны, без пранізлівай задзірыстасці.— І бацька не будзе супраціў...»

Бацька! Міша тузануў плячыма, увесь час, як пасварыліся, ён адчуваў маўклівую бацькаву зацятасць, якая ціснула, прыгнятала і скруціць якую нішто не магло. І не скруціць: Міша зразумеў гэта яшчэ тады, калі бацька прыязджаў у часць на суд. Міша быў упэўнены толькі ў адным, чаго не мог ні адмесці, ні падзяліць напалам,— што бацька хоча, каб у сына было ўсё добра. Чалавек на зямлі не вечны, калісьці і яму сыграе жалобная музыка, і, мабыць, так хочацца, каб у яго быў наступнік, які без крыўды і зла панёс бы далей тое, дзеля чаго біўся, што расціў у сабе, што няньчыў і бярог. Бацька яго, ужо не раз задумваўся Міша, чалавек, канечне, звычайны, як усе, і ўсё-такі ёсць у ім нешта такое закасцянелае, чаго не ўламаеш, не пахіснеш і што іншы раз карціць назваць калі не самадурствам, то незразумелай упартасцю. А там хто яго ведае, можа, Міша і памыляецца? Колькі ўжо такога было: у нечым упэўнены, а праз год які толькі здзіўляешся: як мог не разумець такой простай штукі? Дык, можа, хоць раз у жыцці паслухаць, што хоча бацька, чаго дамагаецца? Рызыкнуць, плюнуць на ўсё,

на гонар, на самалюбства, і паслухаць. Не паступацца ледзь-ледзь, у пакутлівым сумненні: «Што я раблю, скараюся?..» — а прыняць параду безаглядна, з радасцю, нават з удзячнасцю. О, як цяжка даецца зусім маленькая здрада сабе, сваёй упартасці і таму, што хоць і злуе, але грэе душу: я — бог.

«Падумаю,— сказаў Міша.— Што бацька скажа...»

Надвечар вярнуўся з раёна бацька — вазіў здаваць грыбы. Мабыць, у яго ўсё зладзілася: быў вясёлы, вачэй не хаваў, глядзеў адкрыта. І Міша падумаў: мусіць, бацька ўжо забыўся на спрэчку. І праўда: колькі можна зацінацца?

Выпалілі лазню, памыліся. Селі вячэраць. Здаецца, такой паразумеласці, лагоды, адкрытых размоў у сям'і Пруцікаў даўно не было: быццам Міша тармазіў усё добрае, а цяпер, згадзіўшыся ісці ў калгас, даў яму волю вольную. На каленях у Грышкі скруціўся кот, ціха вёў курну.

Назаўтра ўранні Міша зноў пайшоў да Ягорыча. Ягорыч быў як сонны, вочы стаялі нерухома. Але сустрэў Мішу з радасцю, пасадзіў за стол, на якім ляжаў аркушык напалову спісанай паперы і стаяў у літровым слоіку букет ліловых астраў. Не даслухаўшы Мішу, Ягорыч падхапіўся і сціснуў руку: «Во гэта голас! Гэта бравы салдат!.. Герой!» Падышоў да шафкі, адсунуў шкло, узяў некалькі кніжак і даў Мішу. Бліснуў чырвонымі, стомленымі вачыма: «Хоць цябе і вучылі ў школе, на, асвяжы ў памяці. Тэхніка, як і чалавек, таксама развіваецца. Праўда, га? — Ягорыч узяў Мішу за плечы і страсянуў: — Памром, а хлеба дадзім!»

Міша зняцяйкі пачырванеў, як школьнік, заціснуў пад пахаю кнігі і выйшаў. А Ягорыч зняў туфлі і лёг на канапу. Да нарады яшчэ дваццаць мінут, і можна перакімарыць.

* * *

...Круціўся барабан і, распалены, здаецца, намотваў на сябе паветра, з натугаю гудзелі электрамахавікі прэса. Міша ўжо абгледзеў увесь агрэгат: шустры, як вавёрка, ён калісь гойсаў-лазіў па дрэвах, пароў сарачыныя гнёзды, а цяпер, з манціроўкаю, ключамі ў кішэні, скакаў са шнэка на транспарцёр, з помпы на

драбілку. Жанчыны, што стаялі ўнізе, ківалі галовамі, ушчувалі Лісаветку: «Супакой ты сына!..»

Неба над полем, дзе расла цімафееўка, было сіняе, ледзь прымглёнае малочнаю бледнасцю над алешнікам; там траскатала касілка і раўлі трактары. Ад гэтай траскатні і натужнага гуду барабана звінела ў галаве — з непрывычкі. Міша нічога не чуў, толькі бачыў, як разяўляюць рот жанчыны, як маці ўстрывожана косіцца на яго. Міша падміргнуў ёй; ён сядзіць на мосціку каля дэзатара і адвёрткаю рэгулюе язычок зашчэпкі — сапсаваўся і адскоквае. Міша яго адхіляе ўверх, а ён шчоўк уніз, як той жук-дрывасек, калі пакладзеш яго на спіну. Міша вывінціў шурупчыкі, зверху і знізу: так і ёсць, злізалася пласцінка — на сярэдзіне бліскучая выемка. Міша выграб з кішэні вінцікі-шпунцікі; знайшоў запасную пласцінку, новую, сіняватую, яшчэ літаркі на ёй відаць, уставіў на месца старой; завінціў шурупчыкі; клац уверх — язычок і застаўся тырчаць.

Пад'ехаў на трактары Ляксей Чубатчышын, махнуў Мішу рукою — каб злазіў. Міша саскочыў на зямлю. Яна дрыжыць пад нагамі, быццам Міша стаіць на грохаце веялкі і хоча прасеяць, вытрасці з сябе ўсе свае дурасці. Каля бетонкі трава вялая, жоўта-рыжая: яе падсмаліў барабан,— а далей, дзе не вытаптана, зялёная, але сухая, як з паперы. Ляксей матора не заглушаў, і трава гнецца, белая, як прылізваецца ўсё роўна каровіным языком.

Ляксей чакае, пакуль жанчыны ўскінуць на транспарцёр рэшткі травы, што засталася з мінулага разу; ён адвёў Мішу далёка ўбок, і яны закурылі. Твар у Мішы чырвоны, аж гарыць, вышэй брыва блішчыць плямка салідолу, абрысамі падобная на белае, празрыстае воблака, што павісла ў іх над галавою. «Ну як? — пытае Ляксей і хітра жмурыць вочы.— Не шкадуеш, што пайшоў?» — «Ды ты што?» — з Ляксеем усе былі на «ты»: мабыць, з жартаўнікамі заўсёды проста. «Не думаеш: дзесяць, дзевяць, восем, сем... пяць... два, адзін — і ў кусты?» — «Не. Цвёрда, не. Падабаецца мне. Столькі новага. Мудроная машына»,— Міша з нейкаю апраметнаю зачараванасцю, якую нельга было схаваць у душы, павярнуўся да агрэгата: жалезная махіна, напружваючы жалезныя мускулы, стагнала, гула, жэрла свежую, яшчэ расяную, траву, высушва-

ла яе ў гарачым нутры-страўніку, здрабняла і перацірала на муку; каля адборшчыка стаяла маці з дзвюма жанчынамі; яны падстаўлялі рудыя хрусткія папяровыя мяшкі, у якія сыпаліся цвёрдыя, тугія, як боб, «патрончыкі» — гранулы; мяшкі завязвалі белым бліскучым шпагатам і адносілі ўбок. Мяшкі і сам агрэгат дыхалі цяплом, у холад на іх можна было грэцца, як на печы.

Ляксей кінуў на зямлю недакурак, плюнуў на яго. «Разатры, так не пайдзёць»,— са смяшком сказаў Міша. Ляксей пакруціўся абцасам на недакурку, ляпнуў Мішу па плячы і пайшоў да трактара. Даў задні ход, вывернуў пярэднія колы трактара і падагнаў прычэп пад самы транспарцёр; прычэп стаў павольна хіліцца набок. І зноў, але ўжо на кароценькае-кароценькае імгненне, Мішаву душу абкруціла маркота, блізкая да той, што цíснула тады, як ехалі на пілараму.

Яду Міша браў з сабою; перакусіў што дый, пакуль агрэгат выключаны стаіць, агледзеў яго «суставы», як Міша называе ўсякія каробкі і вузлы; дзе скрыпіць, хрыпіць ды кашляе — масліца, салідольчыку пульсануў. Стамляўся. Увечары гулі рукі-ногі, галава; спаў як забіты, але сны ўсё роўна сніліся, адзін сон — увесь час: нібыта ён, Міша, ляціць на парашуце, дзьме вецер і хітае парашут. Міша глядзіць уверх, а над ім не купал парашута, а верхавіна ліпы, тоненькая, во-во зломіцца, і Міша грымнецца разам з ёю на зямлю... З той пары, як хацеў кінуцца з рыштаванняў, яму надакучае адзін і той жа сон. Раніцаю не мог разляпіць вачэй, але перасільваў сябе, адганяў млявасць, бо, пакуль прыйдуць жанчыны, яму трэба наладзіць, настроіць агрэгат, уверыцца, што спраўна-ўпраўна ўсё. Міша нават злаваў на сябе за сваю зацятасць, бо ўвесь час асуджаў яе ў бацьку. Што бацька... У яго грыбаварня, каля яе з заплюшчанымі вачыма хадзіць можна. Потайкі Міша пасміхаўся з бацькі: скажы таму, што яго «машына-цуд» прымітыў, злаваць пачне, мацюка краянуць можа. Але і радасці было, што нарэшце ён узяў верх над бацькам.

Два разы ўжо Ягорыч прыязджаў; праверкі не ўчыняў, чалавек Ягорыч далікатны, але пытаўся, ці па ім работа, ці спраўляецца, можа, інжынера падаслаць. Міша ўсміхаўся, што сам пакуль разбіраецца. Міша заўсягды быў такі: не любіў, калі яго шкадава-

лі, яму спачувалі; ён жыў імгненнем, гэтыя імгненні прыносілі радасць; радасць прыходзіць і тады, калі, засмучаны, думаеш, што будзе з табою заўтра і пасля-заўтра,— Міша такой радасці ніколі не спытваў, ён быў абдзелены прыродаю, і таму яшчэ болей здзіўляла яго энергія, гэта была энергія шчырасці.

Пачатак восені выдаўся сухім, было цёпла, як у чэрвені. На ліпах пажаўцела толькі некалькі лісцін — здавалася, нейкі штукар павесіў там бліскучыя яблыкі. Уся вёска густа пахла яблыкамі, як трохі пазней яна запахне пранізліва-гаркавым водарам капусты. Вёска болей, чымся горад, жыве аднастайнасцю, яе дні распісаны ўладнаю рукою прыроды. Гараджан, асабліва ўлетку, прырода трывожыць толькі адным: можна загарацъ ці не.

«Сёлета і восень не дасць улову, не будзе радовак, таўстух і курачак,— засмуціўся Грышка Пруцікаў.— На апенькі ўся спадзёўка, можа, перад замаразкамі адскочуць...» Грышка зажыў цяпер новым жыццём, і ўсё тут па законе, бо і ў хвіліны тугі ён не сумняваўся, што перакруціцца карусель на лепшы бок, быць не можа, і што Міша абразуміцца, і што будуць унукі... Ленка акурат на Дзень шахцёра падарунак паднесла: хлопчыка нарадзіла, мацака, чатыры дзвесце. «Дзед я, законны дзед!..» — куражыўся Грышка і перад Лісаветкаю, і, седзячы на лавачцы, перад мужчынамі.

Грыбоў насілі мала, «машыну-цуд» ела ржа, і яна плакала крывавымі слязамі-кроплямі, асабліва з начы. Грышка бачыў гэта, калі прыходзіў уранні з тапаром у руках да зруба. Калі хтосьці нёс грыбы, ішоў, прымаў, увечары варыў іх на цяпле ў катлах. Міша дняваў і начаваў каля агрэгата, Лісаветка насіла яму «тармазкі» — яду.

З Грышкам так ужо бывала ў маладосці: калі шчасце знаходзіла яго, доўгачаканае, сапраўднае, ім самім выпакутаванае і здабытае, яго ахопліваў раптам ні з таго ні з сяго, абкручваў ледзяною вяроўкаю жах: што нешта перашкодзіць нацешыцца ім, гэтым шчасцем, чорнае крыло роспачы змахне адным разам, як баба фартухом пыл з табурэта. Але ішлі дні, жах развейваўся, забываўся, і шчасце не рэзка, як думалася, а

памалу сплывала, станавілася звычайнаю будзённаю радасцю, а то і зусім счахала, як вуголле тое ў цяпельцы. І Грышка адно здзіўляўся, за што было перажываць, а потым зусім са скрухаю думаў: «Мабыць, нервы селі, бы тыя Мішавы цеплавыя рэле, што ездзіў мяняць у раён...» Падумаць, аж не верыцца: Грышка сынавымі словамі загаварыў! А што Міша? Хлопец — хоць куды! І там, на Глубцы, не кожны б кінуўся ратаваць каня...

«...а-а-а!..» — пракалоў Малінаўку сполашны крык. Крычалі каля фермы, на таку. Грышка глянуў з вышыні лёсак і ўбачыў дым — чорны, густы. Так гарэлі ў вайну падбітыя ім нямецкія танкі. Пот праняў воб-міг Грышку, і па шчоках з-пад шапкі скаціліся буйныя, бы гарошыны, кроплі, бліснулі зорачкамі на плячах: лейтэнант! Грышка кумельгам зляцеў з лёсак і патрухаў вуліцаю да фермы. Завыў, становячыся на заднія лапы і напінаючы ланцуг, Босы.

Гарэў агрэгат вітаміннай мукі. Там Міша, там Лісаветка, там жанчыны... Дым віраваў і клубіўся пад самае неба, аж туды, дзе ляталі вастракрылыя ластаўкі, і зноў Грышку падумалася пра вайну, і апала нешта ўсярэдку, і замуціліся вочы... Хваравітая, стрэсеная нечаканасцю душа зноў малявала яму той чорны ядавіты грыб, што нядаўна бачыў у тэлевізары і калісь у кіно ў клубе. А калі б гэта і праўда быў ён... Што рабіць і куды кінуцца? Крышка! І яму, і Мішу, і Лісаветцы, і ластаўкам... Усю Малінаўку ў бочку — і крышка. Ногі ў Грышкі аслабелі, сталі як лазіны, але ён бег, сэрца ледзь не разрывала грудзей; не заўважаў, што з двароў высыпаюць дзеці і бягуць за ім, як кураняты за квактухаю.

Ластаўкі ў небе рабіліся то чорныя, то белыя — куляліся, і Грышка бачыў то іх спінкі, то крыльцы спадыспаду. Дзіўна проста, чаму ў такую хвіліну позірк яго чапляўся за ластавак.

Агрэгат быў спавіты полымем з аднаго краю; з трубы дымасоса вырываўся то белы, то цёмна-сіні дым. Мітусіліся бабы, крычалі, галасілі, як здурнелыя. Воддаль стаяў трактар з нагружаным прычэпам. Агонь быў чырвоны, а твар у Мішы белы, вочы цёмныя, шырока адкрытыя, як не вылузнуцца з-пад ілба, бы тыя

спелыя арэхі з чашачак. Міша, з вогнетушыльнікам у руках, гробся па лесвіцы да барабана. Стаў, раскірэчыўшы ногі, і з вогнетушыльніка, як з аўтамата, белаю спіцаю свістануў у полымя струмень. Заклубілася белая пара, ахутала Мішу, як воўнаю. Полымя не спадала, ірвалася, аж бялела, да Мішы — акурат на яго дзьмуў вецер. Ліць на барабан нельга — ашпарыць параю. Прыгнуўся, стаў падбіваць полымя знізу, адсякаць яго ад трансфарматара.

Прыляцеў на «уазіку» Ягорыч: Ляксей збегаў на ферму ў чырвоны куток, пазваніў у кантору.

«Склады!.. Склады засланяйце!..» — крычаў ён, разводзячы шырока рукі, як займаў усё роўна бычка ў загоне.

Ад фермы беглі даяркі — былі на дзённай дойцы, неслі вёдры, бліскучыя бітоны з вадою.

Міша нічога не чуў і не бачыў: полымя трашчала і гуло, як з фарсункі, пякло рукі і твар, сцягвала скуру, як сшывала іголкаю; і мазгі прапякала, пранізвала адна думка: не даць усхліпнуцца паліўнаму баку. Інакш усё. Канец. Перарваўся струмень у вогнетушыльніку, зашыпелі сінія пырскі. «Амбец!..» — скрыпнуў Міша зубамі і з ярасцю трасянуў вогнетушыльнік: зноў захлястаў струмень.

«Ваду, ваду сюды!..» — Грышка, засланяючыся рукою, стаяў унізе, гатовы ў кожнае імгненне падскочыць і сцягнуць за калышыну сына. Хапіў з рук даяркі вядро і шухнуў яго ўверх, на полымя; другое вядро плесканулна Мішу. Міша аблізнуў вусны. Чырвоны, бы той распалены снарад над акопамі на Вісле, што апёк Грышку грудзі, праляцеў над галавою вогнетушыльнік, і Грышка сцяўся ажно, затуліў далонямі вочы і не бачыў, як вогнетушыльнік пузырыўся на траве белаю пенаю, як храпа ў Белазорага на Глубцы.

«На Мішу, на Мішу ліце!» — крычаў Грышка як звар'яцелы. Міша скінуў з сябе пінжак, махаў ім — збіваў полымя. Прамаслены пінжак зразу зацьмеўся, потым усхліпнуў агнём — сіненькім, празрыстым, як над сухім спіртам. Пот выступіў на твары ў Мішы і вобміг выпарыўся, зашэрхла скура. Міша скочыў, зачапіўся рукамі за востры край транспарцёра. Вісеў, дрыгаючы нагамі, як над безданню,— лопалася на пальцах скура і агаляліся белыя, бы шпагат, сухажыліны.

І раптам па вачах драпнулі вострыя кіпці, услед сыпнула жоўтымі апілкамі, з-пад якіх разляцеліся ва ўсе бакі рудыя куры і чырвоныя пеўні, зрабіліся маленькія і чорныя, бы ластаўкі: разарвала цеплагенератар, і на Мішу хлестанулі вогненныя стужкі бензіну, спавілі па твары, руках і нагах. Міша скаціўся на зямлю, закрычаў як рэзаны. Грышка разгубіўся, а потым упаў на сына, абламваючы аб бетонку ногці, драў і гарнуў пясок. Ляксей выліў на іх вядро вады, хрыпеў: «Дзесяць... сем... пяць... адзін...» З Грышкі ішла пара, а з Мішы — дым; твар у Мішы быў чорны як вугаль, адзенне тлела — Міша стагнаў, курчыўся, як бяроста на агні. Збялелая, упала, не дабегшы да іх, Лісаветка, і бабы лілі ваду ўжо на яе.

Раўла сірэнаю, імчала ад шашы чырвоная, бы груда цэглы, пажарная машына, і белы пыл за ёю падымаўся дугою высока, як дым, асядаў на сосны на магільніку, бяліў вярхушкі.

«Ура-а-а!!!» — як ідыёт, закрычаў Ягорыч; ён стаяў, як і раней, распасцёршы рукі, між агрэгатам і складамі, быццам хацеў пераступіць дарогу полымю.

Пажарныя брандспойты ўдарылі з шалёнаю, цвёрдаю сілаю — чорны дым адарваўся ад агрэгата і паплыў у бок фермы; з агрэгата паваліла густая белая, як пыл, пара.

Падляцела лёгкая, бы чаіца, «хуткая дапамога» — заскрыпелі тармазы. Мішу паклалі на насілкі, аднеслі ў машыну, і «хуткая», бліскаючы сіняю мігалкаю, ірванула з месца. Засталася маладзенькая дзяўчына ў белым халаце і блакітных туфлях-лодачках, мабыць, медсястра; прысела каля Лісаветкі, дрыготкімі рукамі ўстаўляла іголку ў шпрыц. Лісаветка хрыпела, і сінія, мала не чорныя вусны яе дрыжалі. Грышка стаяў над ёю знямелы і аглушаны. Неяк па-жаночы захліпіста войкаў Ягорыч: можа, і яго лізнула полымя, а можа, і так чаго.

Калі трохі суматоха апала, прыехалі на матацыкле Васіль Муранкоў і лейтэнант у ваеннай форме, інспектар Дзяржпажнагляду Самусеў — невысокі таўсты бялявы, бы колас, дзяцюк. Твар у Васіля быў строгі, бровы аселі на вочы. Ён кіўком пальца падазваў да сябе Ляксея, нешта ў яго спытаў; Ляксей закруціў галавою. Потым яны ўдвух пайшлі да трактара.

«Іскрагасільнік стаіць,— сказаў Васіль Самусеву,

вярнуўшыся.— Ану дыхні!» — Васіль нахіліўся да Ляксея. «Ды ён не п'е ў нас!» — сказаў Ягорыч і са злосцю штурхануў Васіля. «Ведаю, але закон, закон, Ягорыч! Для акта...— І панюхаў у Ляксея каля рота. Убачыў згорбленага Грышку, падышоў.— Міша моцна абгарэў? Вечна ён улезе! — З надрыўным адчаем выдыхнуў Васіль, падбадзёрыў Грышку: — Не паражывайце, дзядзька, усё будзе добра».

«Лёгка табе...» — падумаў Грышка, гледзячы ўслед жанчынам, якія пад рукі павялі дахаты Лісаветку; у Лісаветкі гнуліся, падломваліся ногі.

«І сетка пнеўматранспартных камунікацый спраўная,— сказаў Самусеў: пакуль Васіль размаўляў з Грышкам, ён «абнюхаў» агрэгат.— Мабыць, травяны пыл загарэўся...» — «А тэмпературнае рэле што паказвае?» — спытаў Васіль. «Норму паказвае — семсот».— «Ну дык пры чым тут пыл? Часткі, якія труцца, добра змазаны?» — «Масла капае...» — «Во!» — «Мо ўсёткі іскра з трактара?» — «Ты што? Ідзі сам правер.— Васіль і блізка не дапускаў, што прычынаю пажару мог паслужыць недагляд па ягонай, даішнай, лініі.—Ануча якая ці палка разам з травою трапіла ў барабан...» — «Трэба расследаваць.— І Самусеву не хацелася браць на сябе віну.— Можа, і пад суд каго...»

«Ч-чор-рт!.. Зноў пад суд!..» — абамлеў Грышка. Васіль павярнуўся, узяў Грышку пад локаць. «Я ж зваў яго да сябе ў міліцыю — не захацеў. А думаеце, так проста да нас уладкавацца? Пайшоў бы, і нічога такога не было б»,— гаварыў Васіль, і Грышку гэта яшчэ болей растраўляла: што цяпер рассусольваць...

З-за лесу падымалася чорная, як сажа, хмара, а можа, дым туды сплыў і цяпер кудлаціцца, не хоча раставаць. Не, усё-ткі, відаць, хмара, бо паветра пасвяжэла як быццам. А можа, яно здаецца такім пасля пажару. Як бы ні было, не пашкодзіў бы дождж — жыта зжалі. А траву можна падаваць у агрэгат і мокрую. Вось толькі трэба хутчэй яго наладзіць, але — ужо без Мішы. Будуць шукаць другога рэманцёра.

Міша, мабыць, сваё адрэманцёрыў, самога трэба рамантаваць. Ён усё жыццё быў як агонь, гарэў, во і згарэў. Міша ніколі не мудраваў, ён быў адкрыты, шчыры хлопец; ён ніколі не спатыкаўся, каб спыніцца і падумаць; у яго не было на дарозе тых камоў-валуноў, што сеюць сабе пад ногі хітруны-прайдохі; ён лёгка

ішоў па жыцці і лёгка пайшоў на рызыку, нават бліз-ка не думаючы, на што ідзе; ён дыхаў, а значыць, ішоў. Таго, хто часта спатыкаецца, называюць у наш час рацыяналістам — у яго шлях да рызыкі цяжкі і пакутлівы, бо галава шлях прадаўжае нярэдка да бясконцасці, а сэрца скарачае да імгнення. Толькі на імгненнях можна праверыць чалавечую сутнасць — на імгненнях, з якіх складаецца вечнасць. І ніколі не трэба чалавека на сметнік — так яшчэ Грышку думалася, калі ён сядзеў у Оршы на вакзале на лавачцы пад бэзам...

* * *

Як бывае ў цішыні, раптам ні з таго ні з сяго ўсхопіцца вецер, закруціць-завіхурыць, падніме ўвысь апалае сухое лісце і панясе яго з шэлестам і бязвольнаю асуджанасцю над зямлёю. Так і ў бальніцы, дзе з самай раніцы стаяла цішыня, калі не лічыць рэдкага рыпу маснічын пад нагою нянечкі ці медсястры ды нечакана едкага бразгату шпрыца на дно металічнае скрыначкі, раптам перад абедам прашыўся ў палаты шумок. Застукалі дзверы, загаманілі хворыя і дактары, калідор напоўніўся крокамі, шорганнем растоптаных бальнічных тапак.

Нехта сказаў, што прывезлі моцна абгарэлага маладога хлопца. Ліда пачула пра гэта ад прачкі, Сямёнаўны, далёкай сваячкі, якая кожны дзень прыходзіла па некалькі разоў у іх палату, бо ў ёй ляжала і яе родная сястра Люба. Маладзейшая гадоў на пятнаццаць, але змарнелая ад пароку сэрца, яна выглядала калі не старэйшаю, то, ва ўсякім выпадку, равесніцаю Сямёнаўны; ляжала ў ложку нерухома, і Сямёнаўна прыходзіла яе павярнуць на другі бок.

Ліда была «хадзячая» хворая, у яе балела галава — спераду, пад ілбом: нахіляешся чытаць ці пісаць, і тады акурат цяжкія гарачыя свінцовыя шарыкі падкочваюцца да вачэй, ціснуць, аж сыплюцца слёзы. «Падазрэнне на двухбаковы вострык гаймарыт», — сказаў ёй урач. Хто ведае, можа, дзе і прахапіла скразняком: у друкарні раённай газеты, дзе Ліда працуе наборшчыцаю, фортачкі заўсёды адчыненыя і дзверы ляп ды ляп; стаіць цяжкі дух фарбы, пахне вокісам свінцу, у нос лезе папяровы пыл, круціць, як бураўчыкамі.

Ліда выйшла ў калідор. У самым канцы, каля стала, ужо сабраўся натоўп. Ліда пачула голас Вані, вясёлага хлопца з суседняй палаты, ад якога толькі і чуеш: бу-бу-бу. Ваня ўлучаў момант, каб курнуць, і за гэта на яго сварыліся медсёстры і нянечкі. І цяпер з шырокага рукава ягонай выцвілай сіняй байкавай куртачкі сачыўся дым, падымаўся над галавою і плыў у прачыненую фортачку на двор. За акном імжэў дробны дождж, ліпнуў да шкла, як пыл, і паветра за шклом здавалася густым, шызаватым, як усё роўна бальніца стаяла ў тумане. З гадзіну таму схавалася сонца, і калі б не Ваневы анекдоты, у калідоры, мусіць, было б змрочна.

Як у полі не трэба лавіць ветру, так у бальніцы — шукаць радасці; людзі растрывожаныя, задуменныя, розум іх малюе свет у цёмных фарбах. Сабою валодаць цяжка нават здароваму чалавеку, а ў хворага заўсягды настрой прыгнечаны, і прасвятленне ў ім — як рэдкая ўзнагарода толькі натурам моцным, мужным, валявым ці, наўпярок, як вынік пустой безалабернасці, лёгкага слізгання думак па звілінах мазгоў.

«Гарыць — бяжы! — крычаў Ваня і смяяўся.— А ён...» — Ваня робіць у рамонтна-будаўнічым упраўленні мулярам і яшчэ прыляпіўся інструктарам фізкультуры ў дзіцяча-спартыўнай школе; таму не дзіўна, што ён стараецца ўкруціць у сваю гаворку спартыўныя слоўцы.

Ваню ніхто не падтрымаў — ніхто не смяецца. А таўсты мужчына, які ўвесь час ходзіць у расшпіленай куртцы і мармыча пад нос нейкую песеньку, сказаў з філасофскай шматзначнасцю: «Затое ордэн чалавеку дадуць».— «Дагоняць і перагоняць»,— зноў няпэўна сказаў Ваня. «Яму ўжо не ордэн, а крыж трэба»,— сіплым, нейкім чужым голасам прамовіў высокі сівы стары, са светлымі, як шклянымі, вачыма. Ліда не ведае, з якою хваробаю ляжыць гэты стары, але ходзяць чуткі, што ён варажбіт; і нават тут, у бальніцы, займаецца варажбою, водзіць у ванную бабак на шэпты. І праўда, неяк Ліда паткнулася ў ванную памыць рукі і ўбачыла там старога і жанчыну. Жанчына сядзела на нізенькай шырокай сіняй тахце амаль голая, а стары, схіліўшыся, грэбаў па яе спіне рукамі; спіна ў жанчыны была белая-белая, а рукі старога чорныя, як у вязёнках. Нянечкі і медсёстры ганяюць ста-

рога, гразяцца выпісаць яго, і ён хаваецца ад іх, але сваёй варажбы не кідае, кажа: памагае выганяць хваробы. Можа, дні два назад Сямёнаўна цішком падбівала і Ліду схадзіць да старога на шэпты. Ліда хоць і не ўмела настырацца, абсмяяла Сямёнаўну: «Вы што, Сямёнаўна, з глузду з'ехалі?..» Сямёнаўна раззлавалася, сказала сярдзіта: «Замуж табе, дзеўка, трэба — дзе і хваробы твае дзенуцца!»

«Шэсцьдзесят працэнтаў»,— сказаў Ваня. І Ліда чула, што ў хлопца «абгарэла шэсцьдзесят працэнтаў скуры». Лідзе не спадабалася такая вольная гаворка: чалавек, можа, ледзь трывае ці зусім ляжыць без памяці, і яна пайшла да сябе ў палату, міжволі прыслухоўваючыся да тых дзвярэй з драпінаю-стрэлкай у ніжнім левым рагу, за якімі гаманілі ўрачы — ратавалі хлопца.

Ліда села на ложак, глядзела на букет кветак на стале, і ў вачах у яе пачынала трапятаць, разрастацца і шугаць полымя. Яна двойчы ўжо бачыла вялікія пажары: як гарэў лес і дзве хаты ў суседняй вёсцы. Полымя бязлітаснае, злое, яно жарэ жывое і нежывое без разбору і наганяе жудасці сваім выццём.

Зайшла Сямёнаўна і сказала, што хлопец ратаваў «нейкую калхозную цехніку» і абгарэў. «З-за нейкага жалеззя!..» — жахнулася Ліда. Ёй, чыстаму, крохкаму дзіцяці прыроды, было неўпрыцям у гэтую хвіліну, што самым дарагім у свеце — жыццём — чалавек расплачваецца часам дзеля нейкай халоднай крупіцы; і тут цана не ў крупіцы, а ў тым, што яна, гэтая крупіца, можа высвеціць у чалавеку.

Мінула два дні. «Радзіва» — так усе ў палаце празвалі Сямёнаўну — прынесла вестку, што хлопца адратавалі; ён адплюшчыў вочы, папрасіў піць, але, бедны, увесь у бінтах, спавіты, бы тое немаўля, толькі вочы ды рот адкрытыя. Ён адзін у палаце, і каля яго дзень і ноч дзяжураць медсёстры. Ужо прыязджалі бацька і маці, але іх не пусцілі да сына, сказалі, можа, праз тыдзень пусцяць.

У Ліды была дзіўная натура: яна перажывала за ўсіх, не толькі за людзей, але і за кожную кузурку, чарвяка, мураша, і за хлопца цяпер перажывала, можа, не меней, чымся яго бацькі. Ёй хацелася хоць адным вокам глянуць, каб упэўніцца, што ён і праўда

жывы, і застаецца адно чакаць, пакуль зажывуць болькі. І яна ўпрасіла Сямёнаўну, каб тая прачыніла дзверы ў палату да хлопца. Сямёнаўна схадзіла ў сваю бакоўку, прынесла чыстыя прасціны і кіўнула Лідзе галавою. Наўмысна шырэй расчыніла дзверы ў палату і павольна іх зачыніла. Ліда паспела ўбачыць ложак і на ім белы таўсты скрутак — у яе захаланула грудзі, ударыла ў скроні кроў, і яна лёцьма кінулася ў сваю палату. Легла на ложак тварам у падушку, і з вачэй у яе цяклі цёплыя слёзы, быццам балела не таму хлопцу, а ёй. Чужы боль успрымаць як свой дадзена не кожнаму, гэта, можа, толькі чалавек-выкапень здольны на такое. Ну, які з яе, Ліды, выкапень? Хіба што і розніць яе ад астатніх, дык гэта тое, што яна вырасла на глухім, дзікім хутары, можа, адзіным у раёне на той час. Цяпер і яго, таго хутара, ужо няма — знеслі, як бацькі пераехалі ў Рэмідоўшчыну — вялікае перспектыўнае сяло; адно засталіся стаяць, як вечныя сведкі памяці, гіганты-клёны ды яшчэ не перасох калодзеж, з якога бралі ваду, пілі самі і палівалі грады.

Можа, праз тыдзень Ліда ўбачыла маці абгарэлага хлопца (яна ўжо ведала, што яго завуць Міша і што ён з Малінаўкі, каторая каля шашы, як ехаць на Крычаў) — здзівілася, што гэта была маладжавая з твару жанчына, падобная на цыганку: чарнявая, твар смуглы, вялікія лупатыя чорныя вочы. І калі б не гумавыя боцікі на нагах ды не хустка на галаве, яна смела сышла б за гарадскую. І скаванасці ў ёй няма, рухі зграбныя, гаворка складная, нават трохі нахабнаватая. Жанчына Лідзе спадабалася, давер зразу пасеяўся да яе ў душы, быццам яны былі родныя з ёю ці, ва ўсякім разе, знаёмыя.

Жанчына прыязджала праз дзень, а то і кожны дзень. Дактары дазвалялі ёй сядзець каля сына моўчкі; ён ляжаў нерухома, час ад часу разам з дыханнем вырываўся стогн: мабыць, хлопец хацеў павярушыцца, і тады боль сцінаў яго.

Аднаго дня надвечар Ліда пайшла ў прыбальнічны саснячок і нарвала кветак. Яна доўга сумнявалася, думала, пакуль асмелілася зайсці з букетам у палату да Мішы. Ён не варухнуўся; яна, асцярожна ступаючы, падышла да стала і паставіла кветкі ў слоік з вадою, які прынесла з дому Сямёнаўна. Толькі пазней, калі трохі ачуўся, Міша сказаў ёй, што бачыў яе з кветка-

мі, але не мог і слова прамовіць. І яна, Ліда, помніць, як глянула зблізку на Мішу: толькі і ўбачыла ў вузенькае акенца між бінтоў маленькія сінія, бы таблеткі тазепаму, якія давалі ёй нанач, мутнаватыя вочы і сухія скусаныя да крыві вусны; яе аж стрэсла знянцяйкі: што вочы ў Мішы сінія, а не чорныя, як у маці. Ліда нават засумнявалася: «Можа, тая рухавая смуглая жанчына не маці, а так хто?..» Не, усё-такі маці, бо ніхто іншы з такім спачуваннем не будзе глядзець на чалавека.

Мішу Ліда прыглянулася зразу, і калі яе доўга не было, хваравітая рэўнасць, ці што, тлуміла яму галаву. Можа, боль, сум, туга, што заўсёды не прымала яго душа, падфарбавалі тое першае ўражанне ад Ліды. Але яе рахманасць, амаль дзіцячая мяккасць, сарамлівая і як бы вінаватая ўсмешка гаючай цеплынёю аблівая і як бы вінаватая ўсмешка гаючай цеплынёю абвалаклі збалелую душу. Людзям заўсёды імпануе ў іншых тое, што не маюць самі, хоць дай яго ім, і яно не прынясе ім шчасця.

Ліда бачыла, што Міша радуецца ёй, што ў яго мутных спакутаваных вачах наліваюцца, бы ягады сокам, жывыя іскрынкі; яна доўга не магла глядзець на гэтыя іскрынкі: яны былі гарэзлівыя, свавольныя, бы чорцікі. Яна чырванела і не магла падняць вачэй. Гэты хваравіты сорам — яе пакута і бяда; яна ўжо шмат у жыцці страціла з-за гэтага сораму: не паступіла ў інстытут — ведала ж білет, але так расхвалявалася, што двух слоў не магла звязаць; нажыла хваробу — цягне з фортачкі, а яна не асмеліцца яе зачыніць; не пайшла ні на адно са спатканняў, якія прызначалі ёй хлопцы,— думала, гэта жах якая распуста; і колькі яшчэ ўсякіх дробных казусаў з-за гэтае сарамлівасці. Не тупая і не дзікая яна: і вучоба ёй лёгка давалася, і размову з людзьмі завязаць умее, але... Але не можа даць сваёй душы волю — безаглядную, шырокую, каб «аж пела і плясала». А душа ж у яе чуйная, уражлівая, глыбокая, і ўсяму яе багаццю патрэбна нейкае выйсце, «рэалізацыя», як часта гаворыць начальніца — брыгадзір друкарні. Іменна «рэалізацыя» пачуццяў.

Мішу было цяжка, пры ім трэба сядзець, яго трэба даглядаць, і з Лідзінай душы нястрымна палілася дабрата і ласка. Яна самахоць, з нейкай нават дзіўнай смеласцю сядзела каля Мішы, змочвала яму вадою вусны, гладзіла бінт на галаве, грудзях, руках... «Ба-

ліць?» — пыталася. Міша ледзь прыкметна качаў па падушцы галавою, варушыліся яго засмяглыя вусны.

Ліда блізка пазнаёмілася і з Мішавай маці, якая сказала ёй на развітанне проста, як сваёй дачцэ: «Ты ўжо глядзі яго, дзевачка любая», і дала ёй шклянку смуроды. Прыязджаў разы два і Мішаў бацька — маўклівы, можа, трохі пануры, але з добрым позіркам вачэй мужчына.

Ласка лечыць не горш за лекі; святлела на дварэ паветра, акурат зусім некуды ўлятучвалася, лісце на дрэвах смялей бралася жаўцізною, яснеў позірк і ў Мішы, святлела яго абпаленая скура: усё меней і меней на яго накручвалі бінтоў, і ўсё болей ды болей жвавеў Міша. Ён быў, як убачыла Ліда, да пары Ваню: не змаўкаў ні на хвіліну. На яго сварыліся ўрачы, ён даваў слова не балбатаць і тут жа забываўся.

Ліду выпісалі раней, чымся Мішу: яму яшчэ доўга ляжаць. Яна прыйшла да яго пераапранутая ўжо, з сумкаю ў руках. Твар у яе быў сумны, куточкі вуснаў апусціліся, і здавалася, яна во-во заплача, бы тое дзіця, якому толькі што выгаварылі. «Ужо ўсё?» — спытаў Міша. Яму не хацелася расставацца з Лідаю. Ён глядзеў на яе з тугою і безабароннаю, дзіцячаю адкрытасцю. «Я буду да цябе прыязджаць...— Голас у Ліды стаў зусім тоненькі — ад таго, што яна глытала слёзы, не давала ім волі.— Выздараўлівай...» — «Прыходзь... Я буду цябе чакаць...» — На Мішу, знерваванага болем, накацілася чуллівасць, і ён, бы дзяўчына, засаромеўся. «Ну да пабачэння, Міша...» — Ліда падала яму руку. Міша ўстаў з ложка, узяў Лідзіну руку — яна была халодная-халодная. «Дзякуй табе, Ліда... за ўсё».— Міша зноў сеў на ложак, а Ліда пайшла, незадаволеная сабою і сваім развітаннем, душу крэмзаў дакор, быццам яны з Мішам нешта не дагаварылі. Ужо з двара яна глянула на акно палаты, але Мішы не было відаць — ён, мабыць, лёг на ложак — і гэта яшчэ болей атуліла душу змрокам.

Дзьмуў вецер, гарнуў ёй пад ногі лісце — барвовае і жоўтае; ад слабасці і мільгання ў вачах у Ліды закружылася галава, і перад вачыма зноў, як і тады, у першы дзень, калі прывезлі абгарэлага Мішу, заскакала полымя, абдало цяплом. Ліда спынілася і заплюшчыла вочы: такое адчуванне, што зыбаецца зямля і

ты, як на палубе, разам з ёю, з дрэвамі і травою, дамамі і бальніцаю... «Міша!..» — здаецца, крыкнула ўсё ў ёй, і крыкнула ўся зямля, і з высокіх таполяў узнялася чарада галак і рассыпалася ў паветры...

Якраз у гэты час да хаты Грышкі Пруцікава падкаціў на «уазіку» старшыня калгаса Ягорыч. Вылез і чамусьці доўга стаяў каля «уазіка», атрэпваў са штаноў і плашча пыл, запляміўся слядамі сваіх рук. Потым шырокім крокам пасігаў у двор. У сенцах дзверы адчыніў без стуку, а ў хатнія пастукаў. Пачуў з хаты: «Можна!»

За сталом сядзеў Грышка і чытаў газету. На носе ў яго віселі акуляры. Убачыўшы Ягорыча, Грышка падняў іх на лоб, яны спаўзлі, і ён падняў іх зноў.

«Добры дзень, Мацвеевіч!»

Грышка ўстаў, паціснуў Ягорычу руку.

«Усё-такі не выдзяржаў я, Мацвеевіч...» — «Што такое?» — «А-ах! — сekануў рукою паветра старшыня.— Душа баліць... Я вінаваты, што сын твой у бяду папаў... Як ён там, салдат?» — «Ды папраўляецца ўжо, бінты здымаюць яму...» — «Чорт! — вылаяўся Ягорыч.— Даў бы яму трактар тады, і не было б нічога...» — «Не перажывай, Ягорыч... На трактары саўсім, можа б, галаву скруціў. Гарачы ён у мяне, круці не круці, во што...» — «Не-не, ты ўжо даруй мне, Мацвеевіч. А пасля і перад Мішам павінюся. І ў пажары ён не вінаваты — разабраліся... Неаднародная па вільготнасці трава. Ён тут ні пры чым. Во явіцца, змаху даю машыну. Рэсурс!»

Мяккі халадок расплыўся па Грышкавых грудзях, Грышка не мог схаваць радасці, заварушыўся, як стары верабей на цёплым сонцы. Што ні кажы, а чалавек гэты Ягорыч. Носіцца як чорт па палях, вёсках, «рэсурсы» ўсё шукае. А сябе зусім не глядзіць, занядбаў, можна сказаць, і асабняка не будуе, як тыя, што да яго былі, сталуецца ў старой Даркі. Можа, і дарма ён так ірвецца, бач, нават жонкі знайсці сабе не можа, а ў гадах ужо. І кашулі няма каму памыць, не паесць толкам. Тож не жыццё... Ківаў галавою не толькі Грышка, здзіўляліся і людзі новаму старшыні, катарыя нават асуджалі — опусцень, пусташтанік, гаварылі. Грышка не згаджаўся з імі: за сабою, сваёй мордаю і дурань глядзець зможа, а за калгаснае, усіхнае,

так сказаць... На гэта совісць трэба, з малых гадоў каб чалавеку ўбівалі ў галаву, што ад мазаля ўсё дабро на свеце, ды яшчэ ад справядлівасці.

Не ведаў, канечне, Грышка, як і ніхто накуль у Малінаўцы не ведаў пра Ягорыча. А быў ён родам з-пад Брэста, з цягавітай сялянскай сям'і. Да вайны — голад, які загнаў бацьку ў Сібір на заработкі, пасля вайны таксама галадуха, якая звяла малодшую сястру ў магілу. Бацька быў у палоне, гэта азмрочыла яму пасляваеннае жыццё — сталінскі загад пад нумарам 270 аб'яўляў палонных здраднікамі: яго не прынялі ў партыю, знялі з брыгадзіраў; ён запіў і без пары памёр. Засталося ў маці чэцвера дзяцей-малалетак. І Ягорыч (тады проста Пашка) пасля сямі класаў пайшоў у калгас. З сумнага на радаснае мала што мянялася, затое часта мянялася дзяржальна ў руках: каса, вілы, сякера, лапата... А потым пайшоў служыць — на флот. Камандаванне закідала маці граматамі і падзякамі, «за воспитание сына». І, можа, далей жыццё вырулiла б на светлую дарогу, каб не той трагічны выпадак у моры... У вёску да маці не вярнуўся, паехаў з сябрам па службе на Магілёўшчыну. Працаваў кінамеханікам, круціў па вёсках кіно — пра каханне і пра шпіёнаў, дзе таксама былі любоўныя сцэны. Пакутліва было пераносіць штодзённы напамін пра сваю далікатную загану — кінуў кіноўства і ўладкаваўся на аўтабазу слесарам. Вечары былі вольныя, чытаў без разбору кнігі, заглушаў глыбокую, як мора, тугу. І менавіта ад яе, тугі, ратуючыся, паступіў завочна ў Горацкую сельгасакадэмію.

Дык вось Грышка пра гэта не ведаў, але ўсё роўна павага да Ягорыча зарадзілася неяк адразу, і з кожнаю сустрэчаю яна расла, як бурт з бульбаю, да якога адна за адною падыходзяць капальніцы. І цяпер Грышку, расчуленаму прыходам старшыні, захацелася пагаварыць.

«Во, бачыш,— зашамацеў ён газетаю.— Усё пра той замах на папу рымскага пішуць... Калі-та, у маі ў яго стралялі? Ага, у маі летась... Дажыліся, сукіны дзеці!» — «У мафіі нічога святога няма,— сказаў Ягорыч.— І на чорта замахнуцца... Палітыканства, бізнес! Пляваць на гуманізм! Мы косткаю ў горле, таму і замешваюць у гэта пакушэнне. Але нас не скрышыць, стаялі і будзем стаяць! Так, Мацвеевіч?» — Ягорыч

разышоўся, аж твар пачырванеў. І ў Грышкі, які быў зачах, дух падняўся: «Малайцом Ягорыч!»

Ягорыч развітаўся, пайшоў, а Грышка яшчэ доўга сядзеў, глядзеў у акно і думаў. І чаму гэта ў свеце спакою няма? Хто там ведае, можа, і ён, Грышка, вінавы ў гэтым, можа, у вайну ён не забіў якраз таго фашыста, які нарадзіў сына, а той цяпер баламуціць ясны свет. Новыя фашыстоўцы нейкія аб'явіліся, Гітлера зноў, бачыце, падымаюць на шчыт, верзяёй ягонай размахваюць: «Майн кампф», «Майн кампф»... Не, дудкі, не дадзім, каб новы Гітлер пайшоў вайною!

Змяркалася. Жоўтае сонца ляжала на небасхіле, як спелы гарбуз, такое маленькае, што, здавалася, можна падысці і ўзяць яго на рукі, як дзіця, прытуліцца шчакою.

* * *

Акно было цёмнае. Знутры на яго падала святло ад лямпы, што стаяла на стале, а знадворку клалася густая, шчытная, бы коўдра, цемната. Акно толькі блішчала, а на вуліцы праз яго нічога не было відаць. Грышка сядзеў за сталом, унурыўшыся ў акно. Перад ім ляжаў аркуш паперы і шарыкавая ручка — тоненькая, бы ножка ў апенькі. Цёмна было не толькі на вуліцы, але і на душы ў Грышкі. Зноў няшчасце з Мішам: пажар... Гэтыя дні, як Міша ў бальніцы, Грышка ажно стогне: цяжкая, бы ношка сырой травы, прыгнечанасць абвалілася на яго. І Лісаветка не ходзіць на працу: не можа трываць на тым месцы, каля агрэгата, дзе абгарэў Міша, галосіць.

Галава ў Грышкі была пустая, як порхаўка, нічога не лезла ў яе, ён хадзіў бы непрыкаяны. І хто ведае, ці хутка прыйшла б яму гэтая думка і наогул ці прыйшла б яна, калі б не бяда; ён наважыўся нарэшце напісаць у вобласць: у магазіне перабоі з хлебам, шыламмылам, усякай драбязою, што трэба пад руку на кожны дзень. Яму ўжо абрыдла выгаворваць магазіншчыцы, Райцы,— хвацкая маладзіца, юрлівая, разводзіць рукамі: «А што я зраблю? Жалуйцеся на райпо...» Тое, што Райка спакойна пачувалася, Грышку яшчэ болей злавала. Ён скурыў не адну папяросу з мужчынамі, абураўся, ды ім хоць у лоб страляй, рагочуць, падколачкі сыплюць, а Ляксей Чубатчышын, той

ажно заходзіцца ад смеху: «Ты ў нас, Грыша, пенсіянер, табе няма чаго рабіць, ты і накатай цыдуліну, а мы падпішамся, ха-ха!..»

Грышка пасля такіх слоў крутнецца «на сто восемдзесят» і пойдзе: «Ну і ліха вас бяры!..» На хвіліну яму і праўда смяхоццем здасца ягоны клопат. А ляжа спаць — круцяцца ў галаве думкі, неадчэпныя, ліпкія: «Трэба пісаць! Трэба — раз словы не даходзяць, лопаюць, як тыя бурбалкі...»

Грышка сядзеў за сталом, курыў, уздыхаў. Лісаветка на кухні стукала-грукала: ставіла ў печ на заўтра свінням бульбу. На сцяне каля стала шаптаў рэпрадуктар, Грышка падняўся і выключыў яго зусім. Ён дакурыў папяросу, прыдушыў недакурак у попелцы акурат на дзічыным лычы. Узяў ручку, прыціснуў далонню аркуш і вывеў два словы: «Дарагія таварышы!» — літары атрымаліся крывыя: пальцы былі непаслухмяныя. Дзе яны будуць слухацца, калі прывыклі да цяжкага і таўстога. Папяроса, дык ёю ж арудаваць не трэба: зашчаміў між пальцаў, і яна нячутна там сядзіць, лыпае чырвоным вочкам. Грышка падумаў крыху і закрэсліў напісаныя два словы: не з трыбуны ён гаворыць дый, прызнацца, адзін толькі раз і гаварыў з яе, як перад Міротнікавым апраўдваўся. Можа, проста, без звароту напісаць: «Скарга ад...»

«Мучаешся?..» — Падышла Лісаветка, пад вачыма ў яе чорныя кругі і твар уражвае сваёй нерухомасцю; стала ў Грышкі за спінаю.

«Не лезь ты...— адхіліўся да яе Грышка.— Я, знаеш... дзела праварачаю»,— фанабэрыстасць раптам узыграла зноў, як і тады, калі атрымаў ордэн, але смяяўся і кпіў ён не з жонкі, а з сябе: і праўда, узяўся за гуж... А што, цяпер да скаргаў уважліва ставяцца. Нейкі Марчанок вунь п'яніца і той дабіўся свайго. Грышка з яшчэ большаю зацятасцю схіліўся над паперaю. Словы самі паліліся, як проса з дзіравага мяшка, рассыпаліся ў няроўныя радкі, якія ўсё болей крывелі, згіналіся ў дугу, аж пакуль ад паловы аркуша не спаўзлі ў правы ніжні ражок. Стоп! Грышка палажыў ручку, выцер далонню лоб; перачытаў напісанае і міжволі ўсміхнуўся, першы раз за апошнія дні. Склалася пісьмо гладкае і бойкае, хоць і аздаблівалі яго толькі тры кропкі і адна коска. І асабліва Грышку ўсцешылі словы, якія, думалася, зразу ўскалыхнуць

усю вобласць: «у вёску нашу рэдка завозяць тавары першай неабходнасці». Тут — факт! — не адмахнешся, не прапусціш міма вушэй — так сцебануць, што заскачуць лес і горы.

Грышка акуратна насліпіў брылёк канверта, прыціснуў далонню, бы цаглінаю, да стала, падпісаў адрас. Калі адсылаць, сёння ці заўтра? Каб усё-ткі давесці справу да канца і выпусташыць душу, даць ёй палёгку, трэба ўкінуць канверт у паштовую скрынку сёння. Зараз жа.

Паштовая скрынка вісела на электрычным слупе каля хаты Людкі, малодшай Чубатчышынай дачкі, якая разносіла пошту. Людка жыла за грэбляю, у першай хаце на правую руку. І Грышка ўпоцемках папёрся туды. Ліхтары на слупах не гарэлі, іх паразбівалі з рагатак дзеці, як толькі павесілі. Зорак у небе не было, і адзінаю кропкаю святла была папяроса ў Грышкавых зубах.

Аслабелымі нагамі падышоў да слупа. Пальцы адчулі халодны метал, намацалі, прыпаднялі стрэшку; Грышка ўсунуў канверт у шчыліну, на імгненне заплюшчыў вочы — і апусціў яго. У цемнаце, у цішы канверт гулка бомкнуў на дно скрынкі, быццам у ім быў не ліст паперы, а ўвесь цяжар Грышкавых пакут і перажыванняў, быццам сэрца адарвалася ў грудзях і ўпала разам з тым канвертам.

І дзень, і два, і тры Грышка думаў пра пісьмо, сумняваўся, можа, не трэба пасылаць было, адчайваўся; а потым забыў на яго, і толькі ў самыя спакойныя хвіліны, якіх выпадала зусім мала, успамінаў пра пісьмо. Трывога за дзяцей — як у Мішы, як там Ленка з малым,— грыбаварня, новая хата забіралі яго ўсяго, аж па кончыкі вушэй, і ў кругавароце дзён дробныя даўнішнія клопаты адпадалі, ляцелі далёка ў небыццё, як птушкі ў вырай, пра які ўсе гавораць, але мала хто думае, дзе ён, той вырай.

Бачачы, што Грышка нудзіцца, бурклівы стаў, Лісаветка сказала неяк надвечар: «Ідзі ты, Грышка, тыя карчамяжыны высечы — толку з іх... Канём з-за іх нельга праехаць, лішнюю баразну бульбы пасадзіць...» — «Можа, заўтра?» — «Заўтра заўтрашняе будзе! Трэба сянні».

Пакруціў Грышка галавою: з бабаю лепей не заядацца, калі не гадзіць ва ўсім, то хоць бы выгляд

рабіць, што слухаешся. Узяў у кладоўцы тапор, пайшоў на гарод. Падышоў да яблыні, што стаяла бліжэй да град. Ствол таўсты, як гарлач. Голы амаль увесь, дзе-нідзе кара як налепленая. Галіны пасохлі, з аднаго боку нібыта зелянкавасцю аддаюць. Пахітаў Грышка яблыню — цвёрда стаіць. Уздыхнуў, на другую глянуў, на тую, што на плот узваліла сваё галінне, бы стомлены чалавек прыхінуўся. І зноў уздыхнуў Грышка, узяў ямчэй тапор, замахнуўся і... апусціў, у руцэ павіс, як плётка. Не падымалася рука — дзед і бацька садзілі гэтыя яблыні, палівалі-даглядалі, і Грышка, шчанюком малым яшчэ быў, яблыкі з іх грыз.

На гарод выйшла Лісаветка, стала рукі ў бокі; падпяразаная фартухом, на галаве сіняя хустка, і неба такое ж сіняе, незахмаранае. «Ну што ты цацкаешся з імі, як дзіцёнак?» — «Адыдзі ты, баба!..» — злосць раптам апаліла Грышку грудзі, адным узрывам выплеснулася з яго.

У Лісаветкі вочы на лоб палезлі: «Чаго йта ён?..» І гонар жа не прыдавіш каленам — не мяшок з грануламі; страшная штука, бабскі гонар, прэ, бы цеста з дзежкі: «Што, маё слова не закон?» Але сумела скруціць сябе Лісаветка: надта ж раз'ятрана гыркнуў на яе Грышка. Нешта, мабыць, дужа балючае кальнула яго, не камар, канечне. Пашкадавала мужыка: яна заўсягды такая была, і за гэта ласку мела, ніколі сінякоў не насіла, як другія бабы. Што натурыцца, як той карове бадлівай, свой жа чалавек, мужычок родненькі.

Лісаветка завярнула ў двор, і ўсмешка з яе вуснаў не на Грышку пала, а на глухую сцяну хаты — тая, здаецца, аж пасвятлела. І Грышка засвяціў, толькі не ўсмешкаю, а тапаром — у лазню; так засадзіў у бярно, што ледзь вырваў.

* * *

...Якраз перад выхаднымі, у пятніцу раніцаю, па вуліцы прапыліла аўталаўка — сіняя «будка»: паехала ў магазін тавары. І, як заўсягды, жанчыны, гукаючы адна адну, з сумкамі ў руках пабеглі да магазіна, можа, што людскае прывезлі.

Грышка быў на двары, каля новай хаты — асаджваў вокны. Доўга глядзеў услед аўталаўцы, тапор вы-

слізнуў з рук і ўпаў на трэскі. Грышка злез з лёсак на зямлю, яго рукі былі ад смалы чорныя, быццам толькі што палупіў кош казлякоў. Зразу бліснула маланкаю ў вачах пісьмо, праясніла думкі. Насцярожвала адно тое, што аўталаўка прыехала ўранні, а не пасля абеду, як звычайна.

Ён бачыў, як выйшла з хаты Лісаветка ў новай кофце і ўтрух пабегла ў магазін. Рукі ў Грышкі дрыжалі: тапор выслізваўся. Грышка ўдзяўбнуў яго ў «лісіцу» — у калодку з прораззю, у якую зашчэмліваў жардзіну, калі часаў. Сам выйшаў на вуліцу, сеў на лавачку і закурыў. Скрозь лісце бэзу прабівалася сонца, зайчыкамі скакала па твары, і Грышка раз-пораз выціраў пот.

Ён выкурыў, можа, тры папяросы, калі ўбачыў, што ад магазіна (стаяў далей ад вуліцы, чымся хаты) вырулiла аўталаўка. Праехала міма яго, і ў кабіне Грышка ўбачыў, акрамя шафёра, мужчыну ў шляпе — здаецца, незнаёмы, а можа, Грышка яго ведаў, ды проста не пазнаў.

Грышка сядзеў і чакаў Лісаветку. З пралёту нарэшце паказалася адна, другая жанчына, затым вываліў цэлы натоўп, у ім, бачыў Грышка, мільгала сіняя Лісаветчына хустка. Жанчыны былі ўстрывожаныя, размахвалі рукамі, сакаталі, бы ў ягадах. «Што за чорт?..» — Грышка паціснуў плячыма і пайшоў у двор, схаваўся за хатаю: не хацеў мазоліць жанчынам вочы.

Лісаветка моцна стукнула весніцамі.

«Ну што?» — спытаў Грышка зразу. «Пісанне тваё!.. — сказала Лісаветка.— Хвіндос пад нос!» Грышка, з памярцвелым тварам, глядзеў на жонку. Яна не смяялася — знаць, нешта сур'ёзнае.

Лісаветка паставіла на ганак сумку. «Зачыніла Райка краму, кажа, пакуль нічога не будзе прадаваць...» — «Можа, куды спяшыць?» — Грышка не столькі жонцы, колькі сабе хацеў праясніць, у чым загвоздка тут, чаму Райка ўзяла пад замок тавары. «Не, бытта... Сказалі ёй так, кажа...»

«Што за фокусы? — Грышка адчуваў, як цёплая хваля накочваецца на яго, грэе грудзі, спіну, шыецца да ног.— Няўжо намарозіў нешта?..»

Пакуль Грышка з Лісаветкаю стаялі на двары і турлычалі, што ды як, па вуліцы прамчаўся «казёл» і



*Лісавета павісла ў Мішы на шыі: «Сыночак мой любенькі, даражэнькі!..» — ён стаяў, апусціўшы рукі, як бы даваў маці выліць з сябе ўсю ласку.*

(«Віхор»)

таксама завярнуў да магазіна. «Нешта заварушыліся!..» — першая, кароценькая, тоненькая, бы дроцік, радасная думка кальнула Грышку ў сэрца.

А каля магазіна тым часам разыгрывалася цэлая камедыя.

З «казла» вылез старшыня райпа Дуктаў (гэта Міротнікаў, яго намеснік, сядзеў у кабіне аўталаўкі і знарок прыкрыўся ад Грышкі шляпаю) і дзядзька з мятлою, падпяразаны белым фартухом, у кірзавых ботах. Дуктаў пайшоў у магазін, а дзядзька стаў падмятаць пляц каля магазіна: на траве валяліся цукерачныя абгорткі, трэскі, кавалкі цэглы, бітае шкло; за вуглом, дзе ляжала плазам старая шына з «беларуса», было густа насыпана белых, сініх і ружовых шляпачак з бутэлек. Дзядзька нагортваў кучу смецця і рукамі адносіў яго за магазін у яму, вакол якой сцяною стаяла піжма, свяціла ў неба жоўтым сонцам сваіх тугіх галовак.

А Дуктаў, зачыніўшыся ў магазіне на кручок, гаварыў Райцы, не саромеючыся раз-пораз дакранацца да яе круглага мяккага пляча: «Я пазваню табе і скажу, калі адчыняць магазін... А пакедава раскладзі ўсё па паліцы — хлеб, масла, каўбасу, скрыні з марожанай рыбаю пастаў збоку на прылавак...» Распарадзіўшыся, ён выйшаў з магазіна з крыху асалавелымі вачыма і лёгкаю чырванню на шчоках; выняў з кішэні флакончык адэкалону і непрыметна патрос ім каля ганка, кропля трапіла на шкельца з бутэлькі, заблішчала, як расінка. «Паехалі!» — гукнуў дзядзьку з мятлою. Шафёр не вылазіў з «уазіка», драмаў, адваліўшы галаву на спінку сядзення; з рота ў яго выцякала сліна і капала на руку, на гадзіннік. Дуктаў ледзьве растармасіў шафёра.

Грышка, каб неяк адагнаць, прыглушыць назойлівыя думкі, сабраўся сысці з двара, адкасіць сена трохі. Яны пайшлі з Лісаветкаю на балота: Грышка з касою на плячы і асялком у кішэні, Лісаветка ўзяла граблі і вяроўку. І калі б яны не пайшлі ў сена, то другі акт камедыі Грышка паглядзеў бы пэўна, а не ён, дык Лісаветка, якая расказаць магла б яшчэ цікавей, чымся было напраўду.

Недзе пасля абеду, калі Грышка, выкасіўшы некалькі лапікаў, сядзеў пад альховым кустом на купіне і дыміў папяросаю, а Лісаветка разбівала граблямі пакосы, па Малінаўцы разнёсся кліч: «Каўбасу і маражаную рыбу даюць!»

Магазіна было не пазнаць: чысціня і на прылаўках усяго поўна, аж гнуцца. Райка, падмаляваная, свеціцца ўся, бы навагодняя ёлка. Можа, чалавек пяцьшэсць адпусціла, і тыя, з цікаўнасці, яшчэ не адышліся, стаялі каля магазіна і, бы сарокі, сакаталі — «столькі ўсяго навезлі!» — калі падкаціў «казёл». Дуктаў першы выскачыў з яго, шырокім узмахам левай рукі (у правай была папка) паказаў на расчыненыя дзверы магазіна: «Калі ласка!» Людзі ў чарзе ўжо глядзелі не на прылаўкі, а на гасцей: на высокага чарнявага мужчыну ў акулярах і жанчыну ў светлым касцюме з дэпутацкім значком на борціку; райпоўца Дуктава яны ўсе ведалі і мала зважалі на яго.

«Вот, калі ласка, глядзіце!..» — Дуктаў распіхваў людзей, каб лепей было відаць, што на прылаўках. Мужчына пакруціў улева-ўправа галавою, жанчына спытала ў чаргі: «Ну як, жыхары Малінаўкі, вы задаволены сваім магазінам, таварамі ў ім?»

Людзі падумалі, што трэба скардзіцца на Райку, а яна запомніць, хто нагаварваў, тады не патыкайся да яе ў выхадны ці познім часам нешта пільнае купіць; прамаўчалі.

«Усё ясна,— сказаў мужчына ў акулярах.— Плёткар, склочнік напісаў. Няма чаго рабіць чалавеку!» — раззлаваўся ён, падштурхнуў пальцам акуляры, якія ўжо спаўзлі яму на дзюбачку тонкага, з сухою гарбінкаю носа. Дастаў з кішэні блакнот, нешта памеціў у ім. Дуктаў падсунуў яму стос папер на папцы, і мужчына пачаў распісвацца ў іх; потым аддаў ручку жанчыне, і яна распісалася на кожнай паперцы (гэта заняло ў яе хвілін пяць).

«У вас і пахі!..— пацягнуў доўгім носам мужчына, як выйшлі на ганак.— Цуд!»

Госці селі ў «казла» і паехалі.

...Як уведаў Грышка пра іх прыезд, кідаўся, бегаў, скакаў, лётаў, але шукай-свішчы ветру ў полі. Нічога не дабіўся. Супакоіўся і чакаў, што будзе далей з таварамі і што за птушка прыляціць яму ў адказ. Адказ павінен быць, раз камісія з праверкаю прыязджала.

Як выдавалася вольная хвіліна, Грышка ішоў у балота, сушыў, зграбаў сена, каб кучней было. Хоць радасць і падагравала сілы, але ўсё роўна шкадаваў, што няма Мішы, няма памочніка, тады, на Глубцы, ён быў яшчэ пацанёнкам, але цягавіты ўжо... Як ён там у бальніцы, сын? Заўчора Лісаветка ездзіла да яго, казала, бытта нейкая дзяўчына глядзіць яго. Што яна можа наглядзець, калі сама хворая? Можа, Лісаветка і натрындзела яму, Грышку, каб не перажываў вельмі: баба і ёсць баба, язык як памяло, абы плямкнуць верхняй губою аб ніжнюю. І чорт ведае што бабе можа здацца. «Іш, загнула,— Грышка пакруціў галавою,— можа, пажэняцца!..»

Прыпякала сонца. Не давалі аддухі вялікія рыжыя, што шэршні, авадні, кружылі вакол Грышкі, адзін сослепу стукнуўся ў грабільна, упаў на сена. На лісці вольхі выступілі празрыстыя, сіняватыя кропелькі. У глыбіні балота буркавала турлачка: ці то ззывала да кучы свой вывадак, ці проста заводзіла песню. Прыгожая птушка, зграбная, быстрая, а голасу не мае, яе песні Грышка не любіў: тугу наганяюць на сэрца.

Грышка ўзяў з-пад альховага куста бітончык з вадою, папіў. Вада пралілася і халоднай жылкаю смыкнула па грудзях. Ён сагнуўся, каб паставіць бітончык зноў у цянёк, і адно цяпер убачыў усыпаны ягадамі атожылак смуроды — сагнуўся і вылез з куста. Ягады былі чорныя, буйныя, як вішні. Грышка адарваў некалькі і ўкінуў у рот — пырснуў кіславата-салодкі сок. «Трэба сказаць Лісаветцы, каб набрала і адвезла Мішу — вітаміны...» — падумаў ён і яшчэ раз глянуў на альховы куст, з якім пабраталася чорная смурода. З задняга боку куст прасвечвала сонца, і ў яго промнях ягады ззялі бы вялізныя барвовыя кроплі.

* * *

Канец снежня нарэшце прынёс зіму і мароз; на кусце бэзу ляжыць снег. Свеціць сонца, і снег пераліваецца мільёнамі фіялетавых пацерак. Па вуліцы праехаў воз з сенам; сена, хоць і сухое, нязвыкла зялёнае ў гэтай белізне і мёртвай сцішанасці. Сена павезла з сабою ўсе забытыя ад лета пахі: пахі травы і кветак. Зімою жывых кветак у вёсцы не знойдзеш, толькі — мёртвыя, з паперы і прапарафіненай марлі.

Лісаветка стаіць перад акном, і святло з яго кладзецца ёй на твар, белымі кропачкамі (маленечкія вокны) скача ў яе задуменных, бліскучых, жывых вачах. Пра кветкі Лісаветцы думаецца не так сабе: з гадзіну назад яна выправіла ў Рэмідоўшчыну сватоў. Міша сам павёз іх на машыне (Ягорыч дазволіў) — Грышку і Ляксея Чубатчышына.

Лісаветка стаяла ўсё яшчэ перад акном, а машына са сватамі пад'язджала да Рэмідоўшчыны. Адсюль, з узгорка, была відаць уся вёска — шырокая вуліца і два рукавы-адросткі, бы клюшні ў рака. За вёскаю звіліста, як пацеркі на нітцы, цямнеюцца кусты: недзе там хліпае пад снегам невялікая рачулка — бяжыць у Сож. На зіму рачулка замярзае, яе заносіць снегам, і адно куцы фіялетавы хмызняк, што расце па берагах, апрымечвае яе.

Міша за рулём, ён зрэдку сам сабе ўсміхаецца ці, можа, жмурыцца ад чыстай белізны снегу, і тады знявечаная левая шчака крывіць яму рот, а знізу левага вока адкрываецца бялок. Грышка з Ляксеем стаяць на кузаве: «Двум весялей і каб на ветры пасвяжэлі галовы». У іх ад марозу чырвоныя насы і вясёлыя вочы. Ляксей пра нешта апавядае, і ў яго бліскаюць зубы, а Грышка моўчкі хітае галавою.

Пару дзён валіў снег, і хаты стаяць сцішаныя, укрытыя таўстою белаю коўдраю, з-пад якой там-сям асцярожна ўецца ружаваты дым — паляць грубкі.

«Дзе тута Барысёнак жыве?» — спытаў з кузава Ляксей, як толькі ўехалі ў вёску і перастрэлі на дарозе жанчыну, абкручаную ў таўстую шэрую пуховую хустку, жанчына ішла з вёдрамі па ваду. Толькі слова пачуў ад яе Грышка — і абамлеў, падкасіліся ногі: «Любка Гранцішына!..»

«Далей... Будзе пошта налева, а тады дзве хаты — і ён... зялёныя вароты»,— тлумачыла жанчына і пільна ўглядалася на кузава, спрабуючы адгадаць, што за людзі і навошта ім спатрэбіўся ўзімку бакеншчык: звычайна яго шукаюць улетку, калі па Сажы пачынаюць хадзіць катэры, баржы, маторныя лодкі. Не хацелася Грышку, каб Любка пазнала яго, затуліўся ў каўнер кажуха, шапку ніжэй на вочы насунуў, адзін нос, чырвоны, як морквіна, тырчыць. Во, ліха! Трэба ж акурат на дарозе патрапілася. Даведаецца, звяне зусім баба: пераживаць будзе — чаму, Грышка і сам

не ведаў, адно ледзь цеплілася ў ім думка, што, мо;ка, калі прыблукаў бы ён да Любкі, а цяпер — ужо не. Адрэзана яму туды дарога: апошнюю, самую патаемную надзейку забраў у Любкі.

Усё-такі Любка пазнала Грышку, як ні круці, дужа доўга глядзела ўслед машыне, нават хустку расхінула: мабыць, хацела ўверыцца, ці стане машына каля Барысёнка.

Грышка Рэмідоўшчыну збольшага ведаў, а людзей, што ў ёй жылі, канечне, усіх не ведаў: ну, Любку само сабою, ды яшчэ чалавек шэсць-сем — тых, з якімі недзе сутыкаўся, ці далёкіх сваякоў па лініі маці, продкі якой аднекуль з гэтых краёў.

Па вуліцы Міша вёў машыну асцярожна, аглядаўся на бакі. Проці хаты з зялёнымі варотамі яму пастукалі кулаком па кабіне. Ён спыніўся. Грышка і Ляксей злезлі з кузава. Грышка ўзяў з кабіны напакаваную сумку, Ляксей абвязаўся даўгім белым ручніком з вышытымі па канцах чырвонымі пеўнямі.

У Барысёнка хата не тое што ў Любкі, скляпаная «ў лапу», на высокім падмурку, крытая шыферам; веранда, сенцы, паветка, сад. Цэлы маёнтак: адразу відаць, што Барысёнак будаваўся няспешна, трывала, на вякі. Як у горадзе прывыклі ацэньваць чалавека па вонкавым шыку, адзенні, так у вёсцы — па двары. Іменна па ім, па двары, Грышка сам сабе зазначыў, што Барысёнак чалавек, не які-небудзь замухрышка, гультай, а *гаспадар*, і з ім няблага будзе парадніцца.

Госці-сваты зайшлі ў хату, прынеслі з сабою зябкі холад, а ў душы весялосць, жарты і крыху натужную зухаватасць. Іх тут чакалі: усюды — зразу кінулася ў вочы — было прыбрана, падмецена; нідзе нічога лішняга, зіхацяць люстры, вазы, мэбля. І пах у хаце ўрачысты, лёгкі, свежы. Іх сустрэў гаспадар — Антонавіч, высокі лысаваты мужчына, валасы каля макаўкі ў яго тырчаць, як рожкі; быў ён у сіняй кашулі, у цёмных штанах; твар чыста пагалены, аж свеціцца, але ўсё роўна відаць, што брытва па ім не часта ходзіць.

«О-о! — усклікнуў ён, быццам госці ў доме аб'явіліся зусім нечакана.— Хто да нас! Заходзьце, госцейкі, заходзьце...»

«Ну дык што вы тута нам прыбераглі?» — спытаў Ляксей, смела ступаючы ў другую палову хаты. Пасярод вялікай залы стаяў накрыты стол, каля якога (але

не за ім) сядзелі маці з дачкою. Яны абедзве пачырванелі, асабліва Ліда, усталі насустрач гасцям. Міша з Лідаю пераміргнуліся.

Гаспадыню звалі Тацяна, а па пашпарце — Тацяна Іванаўна; яе цёмныя валасы былі гладка прычасаныя і адкрывалі каля вушэй, на шыі белую скуру, якая нязвыкла рознілася ад загарэлага да чарнаты твару.

«Ну праходзьце, людзі добрыя, садзіцеся...— Тацяна паказала на канапу, крэслы каля стала.— На машыне прыехалі? — спытала яна, каб не даць патухнуць гаворцы.— Мы і чакалі вас каля абеду...» — «Жаніх нас раней цягнуў,— Ляксей страсянуў за плячо Мішу.— У дзесяць, дзевяць, восем... Так ці не? Дачакацца не мог... І я зараз бачу, чаго ён так ляцеў!»

Лідаю і праўда можна было залюбавацца. Яна была ў ружовым плацці з белым каўнерыкам. Валасы распусціла, ляжалі хвалямі на плячах. Бровы і вейкі былі трошкі падмаляваныя. Ліда, мабыць, пахудзела за апошнія дні, бо нават Мішу, які бачыў яе шмат разоў, вочы здзівілі сваёй велічынёю і нейкай сумнай нерухомасцю.

«Сядайце, сядайце, дарагія сваты!..» — Антонавіч узяў Грышку пад локаць і правёў да канапы. Пстрыкнуў кнопкаю тэлевізара, які стаяў на ножках у куце, побач з буфетам цёмнага дрэва; і ў тэлевізары, і ў буфеце блішчала шкло.

Грышка з «такой місіяй» прыйшоў да людзей першы раз і ніяк не мог скруціць у сабе не то скаванасць, не то страх. Куды яму раўняцца з Ляксеем, лапатуном, які, здаецца, ці не быў сватам боскай міласцю: ён паспеў ужо і Антонавічу нешта дзелавое сказаць, і Тацяну, якая пачала ўвіхацца з талеркамі, шчыпнуць за бок, і Лідзе кінуць слоўца, пасля якога ў яе вугольчыкамі загарэліся кончыкі вушэй. Можа, баяўся Грышка, не хацеў, каб Барысёнкам часам не падумалася, што Міша не варты, нечым горшы за іх дачку. Шыла ў мяшку не схаваеш: ведаюць жа, што Міша і ў дысбаце быў, і ўсё сваё жыццё на злом галавы лётае; во абгарэў — з твару не змыеш. Хоць тут, праўда, ён за дзела паплаціўся, але ўжо калі з лысінкаю, дык што б ні зрабіў, людзі благое падшываюць, нярэдка жорсткаю ніткаю: «Гэты сваёй смерцю не памрэ». Душа ветраная, затое не подлая. Другі, ніцак які-небудзь, носіць у сабе дрэнь усякую, карпее, пыхціць, усё выгаду шу-

кае. А Міша без аглядкі і заглядкі жыве. Сям'ю заўсягды во, канечне, патыліцу пачухае, бо не толькі за сябе ўжо рупіцца трэба.

Расселіся вакол стала. Ліда ўключыла ў верандзе электрафон: круцілася пласцінка — музыка была ціхая, лёгкая, не рэзала вушэй. І людзі за сталом не маглі прыцяць галасоў, асабліва Ляксей: сват — яму і карты ў рукі. Ён нават чарку прыгубіў, і гарэлка падагрэла яго болей, чымся астатніх,— круціўся, бы тая пласцінка на чорным крузе электрафона; па адзін бок ад яго сядзелі Міша з Лідаю, па другі — Тацяна. Ён быў самы непаседа за сталом, і гэта добра: усім тады лягчэй, калі хто-небудзь возьме ў застоллі рэй весці. Можа б, другім разам Ляксею дапамог Міша, але сёння ён быў сур'ёзны і ціхі, на знявечанай левай шчацэ выступіла тонкая ліловасць: Міша, мабыць, вельмі хваляваўся.

«Я за свайго Кузьму дзе хочаш вазьму,— рассыпаўся Ляксей прыгаворкамі перад Тацянаю,— а ты са сваёю Марынкай яшчэ паходзіш па рынку... дзесяць, дзевяць, восем, сем — дзён!» — «У кірмашны дзень прадам за любую цану!» — Тацяна таксама развесялілася, не гублялася перад Ляксеем і адказвала ўпапад. Грышку ажно ў паясніцу кальнула: ці не намякае і сваццуя на тое, пра што нядаўна ён сам думаў,— быццам Міша жаніх бракованы. А можа, яму, Грышку, адно думаецца так: рана, яна заўсягды баліць, і з ёю трэба зміpацца, а не вярэдзіць. Лепей песню... песню зацягнуць, каб душа ўпрысядкі пайшла і ўсе думкі змрочныя растрэсліся. «Давай, Ляксей, песню рванём, як калісь!» — папрасіў ён. І Ляксей тут жа, ківаючыся, завёў:

Дзяўчына мая заручоная,
Чаго ты сядзіш засмучоная?
Чаго ты сядзіш, чаго нудзіш?
Скажы мне праўду, каго ты любіш?

Неяк разам, суладна песню падхапілі і Грышка, і Тацяна. А Ліда з Мішам усталі з-за стала і пайшлі ў веранду. На вокнах у верандзе віселі блакітныя цюлевыя гардзіны. На дварэ ўжо ссутоньвалася, чыстая, празрыстая сінь разлілася па вёсцы; і снег быў сіні, толькі глыбокія сляды на ім цёмныя. Бледна, тонка блішчала шкло ў машыне, два серабрыстыя шнуркі

ззялі на капоце, бы раскатаныя заручальныя пярсцёнкі.

«Глядзі, нашы з табою дарогі! — нечакана расчуленым, новым для самога голасам сказаў Міша, не адыходзіў ад акна.— Роўныя, светлыя і побач».— «Дурненькі мой»,— усміхнулася Ліда; падышла, пагладзіла Мішу па галаве, пакудлаціла валасы. Як даўно хацелася ёй сказаць гэтае «мой», і колькі дзявочага трапятання было ў ім. «Нешта дзіўнае дзеецца на душы»,— сказаў Міша і рэзка павярнуўся да Ліды. Вочы ў яе былі цёмныя, глыбокія, бы тыя сляды на снезе: той і розніцы, што ад іх веяла не холадам, а цёплай мройнасцю. Міша адчуў, як напружыліся ў Ліды пальцы на руках, а ў вачах заскакалі незразумелыя мяккія кропачкі. Гэтыя кропачкі ён бачыў у Лідзіных вачах упершыню. Яны яго і здзівілі, і напалохалі, і ён стаў адразу бязвольны, абыякавы да ўсяго.

«Ты будзеш мяне слухаць?» — спытала Ліда: яна ўжо мела на яго права. «Буду. Я кожнае тваё словачка буду лавіць во гэтымі лапухамі»,— паказаў на вушы: пасля раптоўнага ўпадку яму зноў захацелася жартаваць. Дзіўна мяняўся яго настрой!

Ліда скрывілася: навошта ганьбаваць сябе?

«Міша, я сур'ёзна пытаюся...» — «А я сур'ёзна адказваю».— «Праўда? — Яна не верыла, што наравістая Мішава натура можа быць такою пакладлівою.— Ты будзеш сур'ёзным?» — «Мы будзем з табою заадно...»

Яна, паднімаючыся на пальчыках, пацягнулася да яго вуснамі, і праз імгненне, калі б глянуў з вуліцы праз цёмнае шкло і падсінены цюль, можна было б падумаць, што ў верандзе стаіць адзін чалавек.

У хаце, як і раней, не змаўкалі галасы.

«Ну дык калі?» — пыталася ва ўсіх, а найперш, мабыць, у самой сябе Тацяна. «Недзе там пасля каляд...» — прапаноўваў Грышка, а Ляксей таўхаў яго пад локаць: «Раней!» Хто ведае, якія думкі круціліся ў ягонай ці не першы раз захмялелай галаве; можа, Ліда сваёй красою так яго стрэсла, што ўсе думкі пра Мішу, яго вартасці разляцеліся ва ўсе бакі.

«Давайце ў другую суботу пасля каляд»,— сказала Тацяна і паглядзела на мужыка, ці згодны ён.

«Э-эх, каб на конях!..— сціснуў кулак Ляксей.— Дзесяць, дзевяць... І толькі снег з-пад капытоў!» —

«А мы дужа громкае вяселле дзелаць не будзем»,— сказаў Грышка. «Во-во,— згадзіўся Антонавіч, і гэта — было відаць — не спадабалася яго жонцы.— А то часам з вялікага грому няма дажджу».

«Ну, давайце, сваты, закляпаем сватанне,— сказаў Ляксей і наліў усім у чаркі, акрамя сябе.— Дзесяць, дзевяць, восем, сем.... пяць... два, адзін — па конях!..»

У цемнаце на вуліцы галёкалі, смяяліся дзеці. Яны прачулі, што да Барысёнкаў прыехалі сватацца, і, можа, якая цікавінка перападзе: у вёсцы вочы не вельмі памазоліш...

* * *

З начы пайшоў дождж не дождж, а густая цёплая імжа сыпалася з неба бесперастанку. Калі Валодзька Шапялёў выйшаў з дому, на тратуарах блішчалі, як блюда, маленькія лужыны: снегу як і не было. Леташняя трава паўз тратуар агалілася, чыста абмытая, жаўцела, быццам і не была зіму пад снегам, быццам і не быў цяпер пачатак красавіка. Набрынялі, выткнулі з лускавінак зялёныя клейкія дзюбікі пупышкі на каштанах.

Валодзька спусціўся па прыступках з пагорка, на якім раней стаялі прыватныя драўляныя хаты, а цяпер падняўся новы мікраараён, перасек наўскасы вуліцу. На прыпынку было, як заўсёды раніцаю, шмат людзей. Валодзька закурыў. Курыць ён пачаў нядаўна, можа, года паўтара назад; курыць, як і піць, людзі пачынаюць не проста так, і не заўсёды ад свавольства, на гэта бываюць часам сур'ёзныя прычыны. Пад нагамі ў Валодзькі даў трэшчыну адзін з падмуркаў, на якіх, кажуць, стаіць чалавек; здароўе, сям'я, работа. І калі здароўе пакуль яшчэ не запальвала сігналу трывогі, а на рабоце можна было сцярпецца, то ў сям'і спакою не было; не, не тое што Валодзька шукаў лагоднай зацішы для розуму і душы, якраз наўпярок: ён хацеў гарэць, тварыць да бясцямнасці, але яму не ўдавалася, і, здаецца, не ён адзін у гэтым быў вінаваты.

Цяжка сказаць, ці таму, што жонка з'ездзіла адна на курорты, але ўсё збаламуцілася ў сям'і. Не знізваючы з караляў прычын і гэтую зусім не цьмяную і не апошнюю пацерку, Валодзька ўсё часцей і часцей задумваўся, што з самага пачатку ў іх адносінах з

жонкаю было надта шмат калючак, якія вельмі марудна прыціраліся; а не прыцёршыся, яны ўвесь час мулялі, іскрылі і запальвалі то спрэчку, то абурэнне, то папрок.

З курортаў жонка прыехала загарэлая, пасвяжэлая і нават як бы памаладзелая; калі яна смяялася, яе белыя, як мармур, зубы проста асляплялі: ну хоць на рэкламу ў часопіс «Здароўе»! Здавалася б, засумаваўшы па сям'і, Наташы, яна хоць нейкі час будзе рахманая, спакойная і вытрыманая. Не, адразу папрокі: на мэблі пыл, падлога брудная, халадзільнік аброс лёдам, гара бутэлек. Пра тыя свае заказы і не ўспомніла, а ён жа, Валодзька, таіў думку, што ўзрадуе яе грыбамі, асабліва сушанымі барвічкамі. «Ну хіба так трэба сустракаць мужа пасля доўгай разлукі?» — дзівіўся Валодзька, сплёўваючы пасля цыгаркі сліну. І што павінна быць важнейшае: ён сам, яго настрой ці гэты пыл на мэблі? Валодзька нават падумаў, што жонка калі не тут, у Мінску, то на поўдні пэўна завяла палюбоўніка; так адно падумаў, але верыць не хацеў, бо, калі б гэта была праўда і была ўпэўненасць у ёй, то, не задумваючыся, падаў бы заяву на развод; і не таму, што быў ашалелы раўнівец і вельмі кахаў жонку ці, прынамсі, да бяспамяцтва даражыў ёю, а таму, што жыць з жанчынаю, якая нясе ў дом, дзе расце дзіця, дзяўчынка, бруд, распусту, не змог бы. Проста б не змог, бо, калі б працягваў з ёю жыць, дарога да роспачы, надлому была б прамая. Але так ці не так, няпрошана выяўлялася тое, што іх караблі з вялікаю нацяжкаю плылі паралельным курсам, а то, мабыць, і зусім ужо адвярнулі насы-кілі адзін ад другога, чаго пакуль не відаць было, але час, пройдзеная адлегласць немінуча пакажуць, што яны аддаляюцца; усё ў тым, з якою хуткасцю яны з жонкаю будуць плыць да тых пунктаў, калі туман недаверу, непрыязнасці і, можа, нянавісці схавае іх; шкада было аднаго: што між імі ў хісткай, маленькай, з нізенькімі бартамі лодачцы будзе плыць дачка, крычаць у адчаі і прасіцца то на мацерын, то на бацькаў карабель.

Валодзька пра ўсё гэта спакойна думаць не мог, як не мог ён зміріцца і з тым, што пад уплывам жонкі, яе няўступчывасці, а можа, і так чаго, можа, і горад тут вінаваты, акружэнне, пачынае страчваць свой воблік; тое, што раней было важным, цяпер здавалася

яму звычайным і нікчэмным. Што гэта: бязволле, інертнасць, лянота душы ці проста прыстасавальніцтва? І тое, і другое — страшна! Трэба нешта думаць і браць сябе ў рукі, скручваць у жгут, інакш пагібель, перш духоўная, а ўслед, магчыма, і фізічная. За рукі, за ногі, за душу, за сэрца — чалавека ўвесь час цягне на заняпад, і самае лёгкае аддацца, як кажуць, на волю лёсу, а значыць, і сцерці сябе як асобу; асоба — гэта змаганне: і з сабою, і з тым, куды з салодкім рабалепствам заводзяць цябе чалавечыя слабасці.

І на рабоце, на рэдактарскай пасадзе кінастудыі, цяжка было быць прынцыповым і пастаянным: цэлы феерверк думак, ідэй, і ўсе «геніяльныя», «арыгінальныя», адна другой «лепшыя».

Учора пазваніў старшы рэдактар камітэта Блакітнюк, амаль Валодзькаў равеснік, на два гады раней скончыў інстытут. Валодзьку ён падабаўся: просты, вясковы хлопец, у голасе ніколі і блізка няма настойлівасці або начальніцкай афіцыйнасці, у абалонку якой, бывае, адразу атульваюць сябе маладыя сучасныя людзі.

«Віншую, Уладзімір бацькавіч!»

Што за жарты? Можа, прэмію якую далі: напісаў жа некалькі сцэнарыяў дакументальных фільмаў. Але што наперад радавацца ці выяўляць сваю нястрыманасць і паказваць, што ў ім, як і ва ўсіх, не дрэмле славалюбства,— Валодзька маўчаў.

«Пра тваіх землякоў ужо фільмы здымаюць!..» — Блакітнюк гаварыў, як зазвычай, шчыра, адкрыта, без падвоху, але з жартам.

«Пра каго ж гэта? Пра якіх землякоў?» — адна за другою палезлі ў галаву, закружылі яе думкі.

«Вось заявачка перада мною... Чытаю: «Схватка»... у дужках аб подзвігу камсамольца калгаса... такога-та, такога-та... твайго раёна, Пруцікава Міхаіла Рыгоравіча. Ёсць такі?»

Валодзька адчуў, як галаву трохі вышэй броваў сціснуў тугі мяккі, як папруга, абруч, застукала ў грудзях сэрца. Гэта ўжо не жарт, а лухта нейкая. Пра Мішу Пруцікава... фільм... Аб подзвігу? Можа, наадварот, як адмоўны персанаж выступаць будзе?

«Ты не жартуеш?» — перапытаў Валодзька.

«Якія могуць быць жарты? Яшчэ раз віншую!» — І палажыў трубку.

Валодзька адсунуў ад сябе папку са сцэнарыем, кінуў на стол аловак і ўзяўся рукамі за галаву, быццам хацеў садраць гэты ненавісны абруч, які пачаў сціснаць усё часцей і тужэй. Дык што ж гэта робіцца на белым свеце? Ну, пісаў неяк бацька, што Міша Пруцікаў вярнуўся, у калгас пайшоў працаваць... А што далей? На «острые ощущения» ён заўсёды быў хваткі, можа, яшчэ нешта адчыбучыў. Але ж во — «аб подзвігу»... Можа, з іхняй Ленкай зблыталі, яна на БАМе?

Ну і жыццё! Кінакарціна. Валодзька не пераставаў здзіўляцца і сумнявацца яшчэ болей у тым, што пачуў ад старшага рэдактара. Цікава: хто ж гэта падаў заяўку, і не на студыю, а зразу ў камітэт? Валодзька пазваніў Блакітнюку: «А хто сцэнарый будзе пісаць?» Блакітнюк ціха, як не шэптам сказаў: «Ды сынок... аднаго тут нашага мэтра...» — І назваў прозвішча. Валодзька ажно фыркнуў: чытаў ён некалькі сцэнарыяў гэтага сынка: бездапаможнасць поўная, прымітыў. Адно і піша, каб зарабіць капейку. Бацька на пасадзе — падцягваюць сцэнарый: што рэдактар падправіць, што потым рэжысёр... І загуло-паехала! Грошы ў кішэні, на цітрах: «Аўтар сцэнарыя імярэк», а на праглядзе ўсе хваляць.

Валодзька быў у няпэўнасці і разбітасці, сэрца разрывалася ад незадаволенасці, на душы было чорна, як у валёнку, і ён паныла глядзеў у акно: на цагляную змрочную сцяну барака, які стаяў у адным двары са студыяй; на голую, без аніводнай лісцінкі таполю, верхавіна якой была так высока, што і тры баракі яе не дасталі б, калі паставіў бы іх адзін на адзін. Як яна толькі ацалела, таполя гэтая, калі зусім блізка ад яе будавалі дванаццаціпавярховую махіну?

Шкада, што з кабінетнага тэлефона нельга напрамую выйсці на Малінаўку, пазваніць бацьку, спытаць пра Мішу. Трэба чакаць абеду: дырэктар узяўся за дысцыпліну, загадаў сядзець «ад званка да званка». Валодзька быў не проці дысцыпліны, але яго заўсёды абуралі бюракратычныя выхадкі; хлопец жывога тэмпераменту, ён хацеў, каб усё ў жыцці было па-жывому, па-чалавечы, без кайданаў недаверу і зламыснасці.

Падчас абеду ён схадзіў на пошту і пазваніў у вёску; бацькі дома не было, трубку падняла маці. І праўда: Міша Пруцікаў абгарэў, тушачы пажар, яшчэ ўвосень — ратаваў калгасны агрэгат.

На абед Валодзька не пайшоў, папіў кавы ў цесным ціхім кафетэрыі пры гастраноме; не мог адкараскацца ад думак пра Мішу, сцэнарый. Што можа напісаць той сынок пра Мішу, іх Маліпаўку, якую з роду не бачыў? Ён вырас у горадзе, сярод камяніц, яго ногі, абутыя, хадзілі па асфальце, а не, босыя, па пяску, па расе, па ігліцы і шышках. Толькі сапсуе сцэнарый, і тады зноў будуць «дацягваць». І чаму бог не пайшоў насустрач Валодзьку — бяры пішы пра Сож, выган, сажалку, дарогі, не вылазячы з кабінета. Валодзька з кабінета, канечне, вылез бы, паехаў бы ў Малінаўку, пагаварыў з Мішам, з дзядзькам Грышам; потым з'здзіў бы яшчэ раз са здымачнай групай.

Але — сынок... Валодзька ўжо ведаў, як цяжка што-небудзь даказваць таму, хто вышэй цябе — «мэтр». Бацька гэтага сынка лічыўся акурат «мэтрам», вопытным кіношнікам, і хіба ён згодзіцца, каб памяняць аўтара сцэнарыя. І ўсё-такі Валодзька адважыўся паспытаць шчасця. Параіўся з Блакітнюком; той нечакана ўхапіўся за ідэю, нават паабяцаў «празандзіраваць глебу».

...Падышоў тралейбус. Валодзька ледзь убіўся ў яго, дзвярыма заціснула «дыпламат». Горад, горад... Хутчэй бы ўжо збудавалі метро. Валодзька сышоў на прыпынку «Абсерваторыя», далей пайшоў нетаропкай хадою: час яшчэ быў. На вуліцы, на свежым паветры, у патоку мітусні і напаўсоннай засяроджанасці людзей яму спакайней думалася.

Пяць мінут на дзесятую пазваніў Блакітнюк: «Мэтр» дае аўдыенцыю». Валодзька схіліўся над сцэнарыем пра тэхніку бяспекі на чыгуначнай станцыі, але сэнс таго, што чытаў, не ўлаўліваў... Загарнуў папку, звязаў матузкі і кінуў яе ў шуфляду.

Паехаў у камітэт. Сакратар-машыністка, высокая маладая дзяўчына з дзіўным нерухомым позіркам светлых, як у галкі, вачэй дазволіла яму зайсці да «мэтра». Валодзька, павітаўшыся, зразу адрапартаваў, чаму хоча пісаць іменна гэты сцэнарый. Прычына і праўда была важкая, тым болей, як кажуць, «на карысць справе», гэта разумеў і «мэтр». Ён доўга ўздыхаў і панура глядзеў у акно: нічога пэўнага не мог сказаць, круціў-муціў, намякаў; нарэшце ў канцы гэ-

тай непрыемнай, напятай гаворкі ён, не гледзячы Валодзьку ў вочы, выціснуў з сябе, і словы даліся яму зусім не проста: «Пагавары з сынам, ён у мяне хлопец башкавіты, павінен зразумець...»

Як Валодзька ненавідзеў, не прымаў ніводнаю клетачкаю гэтыя бюракратычныя выкруты, гэтыя лапці інтрыг, якія плятуць, каб нячутна ступаць у іх па душах людзей! Коціцца магутнае кола, і паспрабуй спыні яго, звярні з дарогі, хоць зубамі грызні — іскры пасыплюцца, а яно будзе ісці сваім ходам. Але ж і саступаць не хочацца, і Валодзька адчуў, што гаворкі з сынам яму не мінаваць.

* * *

Снег застаўся толькі ў нізінах, густых ельніках ды пад завалінамі хат з ценявога боку; снег — адна назва, а было гэта месіва: снегу, зямлі, бруду і смецця. Затое ўсюды блішчалі лужыны: на двары, на дарогах, на ўзмежках поля. На пагоне каля алешніку крохкі празрысты лядок скаваў старую, жоўтую, бы салома, асаку і счарнелы на вугаль падбел-матачнік. Каля лужын хадзілі ўжо гракі, хрыпата «краа-краакалі», паднімалі ногі, каб стрэсці гразь.

Неба пакуль было маўклівае — густое і шэрае, нізка прыпадала да зямлі, над якою пластаўся туман. Хто ведае: заўтра, паслязаўтра, а можа, і сёння яно абзавецца трапятліваю, свежаю і журліва-звонкаю, бы той ручай на дарозе, песняю жаўрука. Жаўрука заўсёды перш пачуеш, а потым убачыш.

Па дарозе ад шашы, абмінаючы лужыны і перасігваючы ручаі, ішла дзяўчына. У адной руцэ яна несла вялікі чамадан, а на другой дзіця. Дзіця — хлопчык — было апранута ў чорнае мутонавае футра, на галаве жоўтая вязаная шапачка з мяккім бубончыкам.

Адтуль жа, з шашы, ехала акурат машына і падабрала маладую маці з сынам. «Чыя ты?» — спытаў шафёр, пажылы мужчына, цемнатвары, акуратна паголены; вакол шыі ў яго быў абкручаны зялёны махеравы шалік. «Грышкі Пруцікава»,— адказала дзяўчына, папраўляючы ў сына ў роце пустышку. Шафёр быў з Дабранкі і ведаў Грышку Пруцікава. Не то са здзіўленнем, не то з радасцю працягла паглядзеў на дзяў-

чыну — і праўда: яна кропачка ў кропачку падобна на Грышкаву жонку, Лісаветку.

Шафёр прывёз у кабіне Пруцікавым радасць. Першая выбегла з двара Лісаветка. Кінулася абдымаць, цалаваць унука: «А-авоечкі!.. Што ж ты не напісала, калі сустракаць?..» Хлопчык быў смуглы, з чорнымі вочкамі, боўтаў галоўкаю, ніжняя тоўсценькая губка адвісла, і з яе нітачкаю сцякала празрыстая сліна. Лісаветка працягнула яму рукі, і ён ахвотна пахіліўся да яе. «Ручны, бамавец!..» — засмяялася Лісаветка.

Грышка пацалаваўся з дачкою і з унукам; з твару ў Грышкі не сыходзіла ўсмешка, нейкая вымучаная, як бы стрыножаная, ці што,— скубла душу тая даўняя туга, што і там на беразе, пры гасцях, выкрасала жаль.

Прыбеглі і Міша з Лідаю, ім тут блізка, цераз двор.

Хлопчыка звалі Сярожа. Яго пасадзілі на канапу каля акна, побач села Лісаветка, астатнія хто дзе; любаваліся, глядзелі на Сярожу; ён трос ручкамі, кугакаў пяшчотным, тоненькім галаском, як бы зусім слабенькім, ці што. «Цемечка нешта дужа вялікае...» — памацаўшы галоўку, сказала Лісаветка. «Зарасце!..» — падбадзёрыў Грышка, звёў на нішто жончыны словы.

Ленка пахудзела, уцягнуліся шчокі, на шыі залеглі глыбокія, бы шнуркі, маршчыны. Грышка, украдне паглядваючы на дачку, сцінаўся ад жалю, што ўсё болей і болей падступаў да сэрца, падвясельваў сябе: «Нічога, тута ў нас яна паправіцца хутка... Канечне, клопату хапіла з малым». А Ленка сама не журылася: «Если бы не Сережка, я никогда бы не бросила БАМ, друзей!» — сакатала з Лідаю. Міша сядзеў моўчкі, хаваючы далонню левую шчаку.

Пабеглі дні, як вада ў ручаях. Лісаветка паіла ўнука малаком; дастала з пограба кампоты, варэнне. Люляла Сярожу і прыгаворвала: «Улетку свежанькія ягады будзем есці, праўда, унучак?» Хлопчык пажвавеў, ужо дзябёленька трымаў галаву, на рукі стаў цубкі, смяяліся вочкі. Ленка днямі адсыпалася на печы: «Намёрзлась, теперь нужно отогреваться».

Лісаветка ўпотайкі, нават з жаночаю рэўнасцю паглядала на дачку, якая ўсё жыццё была «Ленка-лялька», а цяпер стала дужаю маладою жанчынаю, і сумавала па сваёй маладосці, па цыганскіх табарах, кастрах, песнях, дзе волі было столькі, колькі ветру... Нічога не скажаш, зух была дзеўка — каблукі на хаду

адрывала! Ды што зробіш: жыццё праходзіць, застаюцца ўспаміны, якія часцей засмучаюць, чымся радуюць.

Прайшла і вясна. Песні шпакоў і жаўранкаў патанулі ў дзяркатым крыку птушанят — прасілі есці; адвечны клопат бацькоў — карміць дзяцей.

Сям'я ў Пруцікавых цяпер была вялікая, і яшчэ чакаўся прыбытак: хадзіла цяжарнаю Ліда. Яна і засталася за няньку, з Сярожам, астатнія выбраліся ў маліну. Грыбоў, па прыметах, будзе мала, а маліна «падурэла» — гнуліся атожылкі. Не так сабе, выходзіць, і вёску назвалі Малінаўкаю. Вушлыя былі дзяды нашы, назвы бралі не з паветра, а з мясцовых прымет. Многа маліны — знаць, Малінаўка, растуць імхі — Доўгі Мох, умельцы жывуць — Кавалі, далёка вёска ад свету белага, ад дарог — Пацяраеўка; тая ж Дабранка — людзей, мусіць, добрых шмат у ёй.

Дарога выбегла на пагон: з аднаго боку сядзібы, з другога трава-мурава, тырчаць ружовыя калмаценькія свечкі трыпутніку, цвіце белымі мякішамі дзяцеліна; потым дарога звярнула да калгаснага саду, адсекла яго ад жытнёвага поля. Жыта ўжо адкрасавала, хіталася важкімі, тугімі, як з парафіну, каласамі; сцябліны знізу таўстыя, сіняватыя, вышэй зеляненюць, а каля самага коласа жаўцець пачынаюць ужо, неяк мякка, па-хлебнаму блішчаць. Гэты бляск і гэты іх звон мірсціўся Грышку ў далёкім Данбасе ўвесь час; і з Лісаветкаю ён зразу сышоўся, мабыць, таму, што ў яе імені пачулася яму гэтая навечна заведзеная ў душы музыка жытнёвага поля, патомнымі кампазітарамі якой былі яго продкі.

Грышка ішоў з пустымі рукамі, ён за «павадыра», паказаць, дзе бачыў нечапаныя кусты маліны. І Босы нарэшце сарваўся з ланцуга, вылузнуў галаву з ашыйніка: мабыць, занудзіўся на прывязі і пахудзеў; ён вішчаў, скакаў, прынюхваўся да купін і слупкоў загароды, якою абнесены сад. Грышка маніў-маніў — дзе там!

Грышка адарваў некалькі каласоў, расцёр на далоні, высыпаліся буйныя зялёныя зярняты. «Добрае пражмо было б»,— падумаў ён, прыпамінаючы сваё дзяцінства, аднаасобніцкае жыццё, калі іх, пастушкоў, толькі і выручала ўночы цяпельца ды пукі салодкага пахучага пражма. Грышка перасыпаў зярняты з

далоні на далонь, падзьмухаў на іх і высыпаў у рот, пажаваў. Зразу стала соладка-соладка ў роце, бы ад маліны той, і на душы як хто памазаў мёдам.

Паперадзе ішла яго сям'я — зляцеліся да гнязда птушкі! — Лісаветка, сын, дачка. Яны ішлі па той зямлі, па якой хадзілі дзяды і прадзеды, ходзіць ён сам. «Міша, Міша, бляха-муха!..— жмурыліся ў Грышкі вочы, секлася вакол іх старая, пажоўклая скура.— Кажуць, кіно пра яго будуць здымаць, ажно з Мінска... Малады шафёр, пасля арміі застаўся ў вёсцы, пажар, і ўсё такое проччае...»

Звярнулі з дарогі на сцежку — да балота. Грышка, ідучы апошнім, бачыў, як за Мішам, расхінуўшыся, каласы зноў сплята́ліся, навісалі над сцежкаю, і Міша, здавалася, быў у іх палоне. Босы абагнаў усіх, быў ужо недзе ў балоце. Зняцяйкі, ажно ўсе пераглянуліся, заяхкаў.

«Ці не на вожыка напаў?» — сказаў Міша, трымаючы ў руцэ паўлітровы слоік. «Наўрад,— сказаў Грышка.— Дужа заядліва».

Босы, здавалася, спярша быў зусім блізенька, у кустах, а праз хвіліну яго брэх стаў цішэць, змяніўся гулам.

«Не, мабыць, дзікоў узяў на рэмус,— цвёрда сказаў Грышка.— Тута іх... Ляжалі ў кустах».— «Паглядзець бы»,— сказаў Міша. «Пайшлі».— «О-ой, ды кіньце вы дзяцініцца!» — незадаволена сказала Лісаветка, як і тады, калі збіраліся раненька на рыбу. «Мы хутка»,— кінуў Міша.

І праўда, метраў праз дзвесце пад ялінамі яны ўбачылі свежыя рыцвіны — гайно дзікоў. Грышка, капырзнуўшы ботам копчык чарназёму каля ладнай, бы пасляваенны акоп, яміны, пакруціў галавою: «Сякач ляжаў».

Босага доўга не было. Міша хадзіў яго шукаць, зваў, свістаў. Грышка сядзеў на паваленай сухой алешыне, і грудзі яму распірала трывога: каб чаго не прыключылася. Яго настрой міжволі перадаўся астатнім — і не стала смеху ды перагукаў. Хоць і апрануўся Грышка «па-балотнаму», цела пяклі камары. Яны былі вялікія, рыжыя, даўганогія, Грышка, па нейкай дзіўнай логіцы сваёй, называе іх ад самай вайны «фашысцкай сволаччу»; уелася ў косці яму вайна, не забываецца

аніяк і часта напамінае пра сябе нават тым, што да яе і духу не мае: дзікова гайно — акоп, вось камары...

Варочаліся назад ужо не сцежкаю цераз жыта — далёка адышліся,— а лесам, абагнулі поле краем. Яны зразу вачам сваім не паверылі: на дарозе ляжаў Босы. Мабыць, стаміўся, бегаючы за дзікамі, лёг і адхакваецца. Але ж галава не падымаецца і вочы заплюшчаны, толькі вейкі трасуцца. Падбеглі Грышка з Мішам — і селі: жывот у Босага распораты і кішкі вываліліся, у пяску, мухі зялёныя поўзаюць па іх. Нос у Босага сухі, толькі ноздры ў глыбіні яшчэ вільготныя, варушацца. Міша зразу ш-шах з сябе кашулю, разадраў і давай кішкі назад у жывот запіхваць. Босы не падымаўся, толькі слаба-слаба скуголіў, павіскваў, бы той камар, напіўшыся крыві.

Лісаветка з Ленкаю ў слёзы, зашморгалі насамі.

«Ідзіце, ідзіце дахаты! Нюні распусцілі,— сказаў сярдзітым голасам Грышка.— Сярожа там ужо з крыку, мабыць, парываецца».

І яны пайшлі, узяўшыся за рукі і гучна хліпаючы.

«Панясём?» — спытаў Міша. «Не датрывае...» — Грышка далонню гладзіў сабаку па спіне, ледзь кранаўся. І макулінкі сумнення не было: Босага параніў дзік. Сякач, ліха матары, шчоўкнуў ікламі — і кішкі вон. Дзіва што: іклы ў секачоў па цэлай пядзі, сагнутыя, бы серп,— бачыў Грышка, як Мішу ішлі сустракаць. Шкада Босага, вельмі шкада: добры быў сабака, разумны, двор глядзеў, гаспадара, не збродаваў, як другія шаўкі.

Яны сядзелі, бацька з сынам, над сабакам, як над нябожчыкам, і маўчалі. Сабака паміраў. У іх на вачах... Тарганууся апошні раз, выдыхнуў з сябе паветра і астываць пачаў, поўсць на загрыўку натапырылася. Бяда, калі ўжо прырода нішчыць самую сябе.

Рукамі, крывым, бы ікол, жоўтым сасновым сукам выграблі яму пад елкаю, услалі яе чарнічнікам і пахавалі Босага. З яловых шышак на магілцы крыж вылажылі. І ўжо як на дарогу выйшлі, яшчэ раз азірнуўся Грышка, быццам віну сваю там, пад елкаю, забыўся.

Прапаў Босы, і разладзілася сям'я Пруцікавых, ходзяць усе — месца сабе не знаходзяць, асабліва Грышка з Мішам. Лісаветка таксама, канечне, перажывала, але не так глыбока і доўга. Праз колькі дзён

яна ўжо смяялася. А Міша па-ранейшаму пануры. Баючыся, каб з сынам чаго не здарылася, яна асцярожна падступілася да яго і сказала: «Я бацьку ўжо два гады трублю, каб выкарчаваў ссохлыя яблыні на гародзе, а ён — «пасля ды пасля». Можа, Мішутка, ты возьмешся?»

Мішу ўжо самому карцела заняцца чым каля хаты, ён зразу і згадзіўся. Узяў у кладоўцы тапор, лапату, і вочы ў яго павесялелі.

«Ну што, дарагуша, аджыла сваё?» — сказаў ціха Міша, стоячы перад яблыняю і дакурваючы цыгарэту. Стукнуў абухам па ствале — што косць: задрыжалі галіны, колькі лісцін з іх упала, адна чыркнула Мішу па носе — заказытала.

Можа, на метр ад ствала Міша ўдзяўбнуў лапату, нагою ціснуў — лапата ўперлася ў карэнне. Эге-е... Міша стаў адкопваць зямлю ўкруг яблыні; дзе карэнне тонкае, перасякаў лапатаю, таўстое пакідаў пад тапор. Міша вельмі хутка ўвапрэў: не так проста, аказваецца, выкарчаваць яблыню: гадамі расла, і корань-цэнтравік глыбокенька зашыўся ў зямлю і, мабыць, яшчэ не згніў, як астатнія, што гарод аплялі. Дзіва што ў бацькі рукі апускаюцца. Хістаецца яблыня, як былка тая ад ветру, а стаіць, трымаецца. Прыгнуў яе Міша, сekанyў тапаром па напятым корані — і хруснуў ён, разадраўся, і яблыня лёгка ўпала; корань быў ружаваты, як малінавым настоем прапітаны, а ўсярэдзіне руды шнурок — калупнуў Міша ногцем: гніль.

Міша сеў на ствол яблыні, закурыў. Далёка выдыхнуў ад сябе дым, тыльным бокам далоні пацёр нос. Стала маркотна на душы, і самому не зразумела — ад чаго. Мабыць, кожнаму робіцца пагана, калі дрэва губіць?

Яшчэ тры яблыні адужаў, зваліў, а болей не змог. І пляваўся, і па гародзе бегаў, і думаў, бацьку скажа: «Ідзі ды сам карчуй!» — але астудзіўся і цвёрда паставіў сабе: што яшчэ заўтра з раніцы, перад работаю, разміначкай займецца.

А як ужо ад весніц глянуў на гарод, дык не паверыў ажно: голым і пустым ён здаўся яму; і новая хата з лазняю як бы пасірацелі. «Фу ты, чорт!..» —вылаяўся Міша і пайшоў у двор з нейкаю важнаю, рашучаю і новаю думкаю ў галаве.

## Частка другая

Вуліца перасякала праспект пад прамым вуглом, і Валодзька ішоў па ёй, ішоў няспешна, у роздуме. Мінуў стаянку таксі з даўгім хвастом чаргі; каля ларка выпіў маленькі куфальчык квасу. Вуліца была нешырокая, а пасярэдзіне яшчэ пралягала ліпавая алея. Неяк утульна, спакойна было на гэтай вуліцы, і на душы ў Валодзькі сама сабою ўціхамірвалася бура, што абрынулася пасля сваркі з жонкаю. Дзівачка! Лезе куды яе не просяць, нават у дробязі, іншы раз чыста мужчынскія. Ён купіў насуперак яе волі скураны пінжак: перайшоўшы працаваць у кіно, стараўся модна апранацца, гэта была адзіная магчымасць пазбегнуць асуджэння самай прыдзірлівай і яршыстай публікі — мяшчан.

За вуглом дома, на скрыжаванні вулачкі і праспекта, тугім парывам на Валодзьку ўпаў вецер, слізгануў па крысе скуранога пінжака. Верхавіны ліп нервова затрэслі чубамі, і Валодзька зноў падумаў, як добра яму ішлося па зацішнай вулачцы. Вялізныя вокны ў доме напроці, размаляваныя кружкамі каўбасы, бутэлькамі малака і шклянкамі соку, булачкамі, піражным і пячэннем, верхняй палавінаю адлюстроўвалі белае бясхмарнае неба, а ніжняй — рухомую шчытную людскую раку на тратуары.

Гэты дом з вялізнымі вокнамі, як і рэстаран, каля якога дамовіўся Валодзька сустрэцца з сынам «мэтра», былі пабудаваны пасля вайны. Іх будавалі палонныя немцы — на фасадзе ўсякія выкрунтасы, высечкі, плітачкі, а калоны ўвенчаныя выгнутымі палазкамі гіганцкага лісця адуванчыка.

Валодзька сынка ні разу не бачыў, але адразу пазнаў яго. Ён стаяў, прысланіўшыся спінаю да сцяны і трымаючы кончыкі пальцаў у кішэні штаноў. Непадалёк, на падстрыжаным газоне, ляжаў шэры, як воўк, таўсты сабака і, ашчаперыўшы лапамі, грыз бутэрброд з каўбасою. Не праглынуў, зараза, а пакрысе адкусваў, як бы смакуючы. «Інтэлігентны сабака»,— усміхнуўся Валодзька.

Сынок быў у джынсавым касцюме, калі можна назваць касцюмам пацёртыя, вынашаныя, з белымі ніткамі па рубцах, штаны і ў кароценькай куртцы на

заклёпках, з-пад якой віднелася сіняя кашуля ў дробную клетачку. На цемі ў яго свіціліся рэдкія, з саламяна-жоўтым адценнем валасы, канцы якіх былі прылізаны каля правага вуха. Вялікія, трохі выпуклыя вочы былі поўныя спакою, санлівыя, ці што.

— Добры дзень! — падышоў Валодзька.— Вы мяне чакаеце?

Сынок пазяхнуў і кіўнуў галавою. Валодзька падаў руку, назваў сваё імя. Сынок як бы між іншым буркнуў: «Эдзік». Індык важны... Валодзька ўжо даўно прымеціў гэтую асаблівасць напышлівых і недалёкіх людзей — лічыць сябе калі не богам, то нейкім бажаством пэўна, хоць, калі характарызаваць іх гэтым прывабным для іх словам, то лепей за ўсё тут стасуецца *убоства*.

— Пойдзем пасядзім? — прапанаваў Валодзька, ведаючы, што без рэстарана з гэтым тыпчыкам гаворкі не атрымаецца. Эдзік моўчкі пайшоў за ім. Яны селі за столік, на якім у шкляной вазе стаяла сасновая галінка. Валодзька выняў з кішэні пачку «Арбіты». Эдзік таксама закурыў з Валодзькавай пачкі, прыпаліў сваёй запальнічкаю, пусціў дым з шумам, з асалодаю.

— Дык ты, стары, значыць...— пазяхнуў.— Хочаш, гэта самае, каб я табе...— Зрабіў зацяжку, зноў з асалодаю выпусціў дым.

— Не быў бы з маёй вёскі хлопец, не ведаў бы яго — не было б ніякіх пытанняў! — з запалам, як заўсёды, калі наперадзе было шмат непраясненага, сказаў Валодзька.

— Я це нарысую так... Адным словам, ты не запораш гэтую справу?

— Вопыт у мяне ўжо ёсць, я рабіў некалькі сцэнарыяў...

— Гэта няважна. Я це нарысую так... Што, калі мой будзе сцэнарый — фільму гарантаваны поспех...— Эдзік сядзеў у вольнай позе, абапёршыся локцем на спінку крэсла і далёка выпрастаўшы пад стол ногі ў рудавата-чорных замшавых туфлях.

— Ужо ж і я пастараюся!

— Гэта што ты будзеш старацца... Я це нарысую так... У кіно старанні часам нічога не значаць.

Ісціны Эдзік не адкрываў, Валодзька сам ведаў, што часам зусім слабому фільму на праглядзе пляска-

лі ў ладкі, а таленавіты, незвычайны, адметны разнасілі ў пух і прах. Усё залежала ад таго, хто сцэнарыст, рэжысёр, аператар, па чыёй рэкамендацыі здымаўся фільм.

Падышла афіцыянтка ў сіняй сукенцы і белым, лёгкім, як з папяровай сурвэткі, фартушку. Валодзька сказаў ёй, што прынесці, папрасіў адкрыць бутэльку мінералкі. Наліў Эдзіку і сабе ў шырокенькія зеленаватыя фужэры — на сценкі аселі драбнюткія белыя, як ртуць, пузыркі. Эдзік па кропельцы адпіваў мінералку, не мігаючы глядзеў на Валодзьку. Канечне, ён ставіў сябе куды вышэй за Валодзьку, гэтая фанабэрыстасць не з'явілася цяпер, ён прыйшоў з ёю, у яго душы змалку сядзела пагарда да вясковых людзей, іх звычак, адзення, мовы. Ён быў з таго кола заскарузлых мяшчан, якім няма чым надаць сабе вартасці, акрамя як тым, што яны — «гарадскія», а таму і носьбіты сапраўднай культуры і маюць права звысоку глядзець на выхадца з вёскі, няхай ён будзе талент, нават геній. Такіх людзей Валодзька называў *тармазамі вечары*, ён абураўся імі, адчуваў, што і жонка яго недзе блізка каля іх, цынічная да ўсяго зямнога; і цяпер ён мог бы паслаць далёка-далёка гэтага спешчанага фанфарона, калі б не трэба было выпрошваць у яго аўтарства на сцэнарый. Загнаны ў кут, ён раптам з пранізлівай яснасцю зразумеў: што толькі суіснаванне, дыпламатычнасць, кампрамісы могуць выратаваць яго, пакуль ён зноў адчуе сілу.

Афіцыянтка прынесла цёмны пузаты графінчык, салату. Эдзік узяў графінчык, доўга трымаў яго над чаркамі не наліваючы.

— Калі шчыра, я не стаўлю ніякіх славалюбных мэт,— сказаў Валодзька.— Мая душа проста адчула патрэбу напісаць іменна гэты сцэнарый.

— У кіно без славалюбных мэт няма чаго рабіць. Запішы сабе на лбе.

— Дык я ж ніякі не прафесіянал, я раблю для душы, як кажуць.

Эдзік хвацка счысціў відэльцам з нажа маянэз.

— Я це нарысую... Башні тут прывабныя. Можна выганяць толькі так!.. Дарэчы, у цябе не знойдзецца пазычыць мне чырвончык?

Валодзька выняў з кішэні партманет, раскрыў.

— Дзесятка якраз ёсць,— аддаў паперку Эдзіку.

Той не схаваў яе ў кішэню, а палажыў на рог стала — як прыклеіў. Гэтым ён паказваў, што на падачкі не ласы, не нейкі там пабірушка, проста яму на нешта спатрэбіліся грошы і не хапае дзесяткі.

— Я це нарысую...— Вочы ў Эдзіка зацягнуліся туманнаю млявасцю.— У кіно пасрэднасці можна хадзіць у геніях, купацца ў грашах, і наадварот...

— Ды мяне гэта не цікавіць зусім! — Валодзька адчуў, што яго пачынае нерваваць Эдзікава занудлівасць.

— А ты паслухай разумнага чалавека! Спатрэбіцца... Я це нарысую... Трэба стварыць вакол сябе ажыятаж. Геній! Кінуць на гэта ўсе сродкі. Засталбіў, што называецца, сябе, і тады ніхто цябе і тваё не зверне. Не зробіш гэта своечасова, вышэй генія ў прызнанні, і то няшчырым, сваіх сяброў не па-ды-меш-ся.

— На ўсякія такія мудраванні патрэбны, відаць, здольнасці.

— Лагічна мысліш... Я це нарысую. Здольнасці большыя, чым творчыя. Трэба, гаварыў адзін, бачыць каналы, у якія закідваць вудачку, каб выцягваць рыбак удачы і поспеху.

— Я тут зусім кепскі рыбак! — шчыра, і не толькі з горыччу, але і з гонарам сказаў Валодзька.

— Вучыся! Ламай сябе, сваю вясковую псіхалогію... Я яе нарысую. Дарэчы, ты бачыў мой фільм «Дарогі-алеі»?

— Пра выпускнікоў медвучылішча? Бачыў.

— Ну як?

— Глядзяцца белыя халацікі, толькі сцэна, у якой дзяўчаты, узяўшыся за рукі, бягуць насустрач парывам ветру, на мой погляд, банальная.

— Слухай... Я це нарысую. Напішы пра яго водгук у газету. Здаецца, табе не супрацьпаказана крытычнае пяро.

— Раскрытыкаваць? — затаіў усмешку Валодзька.

— Ну, дзеля гэтага я цябе не прасіў бы! І так з кукішамі ў кішэні многія каля мяне ходзяць. Я це нарысую так... Распішы, каб усе ахнулі! Шэдэўр!

Валодзька адчуваў, што Эдзік зацягвае і зацягвае яго ў гнілую багну сваіх выкрунтасаў, пошлых інтрыг; яму рабілася не па сабе, сціналася душа, і, каб даць ёй палёгку, ён больш не спрачаўся з Эдзікам, моўчкі слухаў, ківаў галавою, а думаў пра іншае, ужо пра

сваё: як будзе пісаць сцэнарый, як сустрэнуцца з Мішам Пруцікавым.

Яны выйшлі з рэстарана. Да іх тут жа падбег той вішэры, як воўк, таўсты «інтэлігентны» сабака, які, відаць, увесь час дзяжурыў тут, каля рэстарана; у сабачых вачах сядзела такая галодная туга, быццам і праўда цэлы тыдзень у яго не было ў роце расіны. Эдзік тупнуў нагою: «У-у, звяруга!»

Развіталіся яны суха, хоць Эдзік доўга і не выпускаў Валодзькавай рукі: «Я це нарысую, стары... Сцэнарый — твой! Дару! Я це нарысую...»

Дамоў ісці не хацелася, хоць ужо цямнела, і Валодзька пайшоў уніз, да Свіслачы: рэчка, вада заўсёды яго лагодзілі. На праспекце не было такой мітусні, шуму, гулу, як удзень: некалі трэба адпачываць і гораду, канечне, не глуха, мёртва засынаць, тыя нешматлікія машыны, адзінокія пешаходы, ляск тарнякоў праз усю ноч няхай будуць яму ціхамірным сном.

Раней такога не было, гэта апошнім часам Валодзька заўважыў, што яго не цягне дамоў пасля работы; нават дачка не выклікае таго жадання хутчэй бегчы, якое было яшчэ год назад. І часта ён бязмэтна блукаў па вуліцах, сядзеў на лаўцы ў скверы, зімою (калі хопа) заходзіў у фае кінатэатраў, студэнцкія інтэрнаты. Там ён губляўся сярод людзей, забываўся на жонку, адтавала душа, сплывала з яе жуда, і ён цёплымі вачыма глядзеў на свет, на аранжавыя ў святле ліхтароў ліпы, блакітны роўны снег, на бліскучыя лужыны з абернутымі ў іх дамамі, і нават на жанчын, сярод якіх, ведаў, не сумняваўся, ёсць і такія капрызулі, як яго жонка, і капрызлівасць — не самае горшае водгулле іх мінулага жыцця.

Колькі разоў яму навязвалася думка завесці сабе жанчыну, як кажуць, «на старане», добрую, памяркоўную, спагадлівую, і ў ласцы ды пяшчоце з ёю тапіць усе жыццёвыя няўдачы. Але настойліва адганяў гэтую думку: не тое што баяўся кінуць лішнюю жменю гразі ў і так ужо ўскаламучаны сямейны калодзеж, а проста не хацеў на душу сваю садзіць яшчэ адну пякучую больку. Развядуцца, тады іншы каленкор. Тады ён, канечне, улічыць свае пралікі ў жаніцьбе. Вонкавая прыгажосць жанчыны, ці толькі яго аднаго яна абпальвала? Часта чуеш: прыгожая жанчына — сапсаваная жанчына, сапсавана іменна фальшам, муж-

чынскім. І з такою — няхай мужык хоць ангел! — жыцця не будзе. Ёй насілі і яе на руках насілі, а тут трэба самой насіць дзяцей, сумкі, цяжар хатніх клопатаў. Як яны баяцца гэтага, як уцякаюць, пераступаючы нават крайнюю мяжу жорсткасці. Валодзьку проста скалануў адзін выпадак, яго расказаў на кінастудыі Эдзік тады, калі здымалі фільм. Валодзька не хацеў гэты выпадак успамінаць, намагаўся выкрасліць яго з памяці назаўсёды, але ён часта, хваравітаўражліва паўставаў перад ім проці яго волі. Адна маладзенькая сімпатычная навучэнка медвучылішча зацяжарала. Адразу аборт нешта перашкодзіла ёй зрабіць, пасля было позна. Хадзіла, уціскалася так, што ні сяброўкі, ні на рабоце не маглі заўважыць. Прыйшоў тэрмін раджаць. Уначы пачалося... Яна ў інтэрнаце ў пакоі, пад коўдраю. Сяброўкі пачулі стогн: «Што з табою, Света?» — «Так, нешта жывот баліць... Мабыць, халвы аб'елася».— «Можа, святло ўключыць, «хуткую» выклікаць?» — «Не трэба...» Праз нейкі час зноў стогны, воханне, дзіўнае пакрэхтванне. Уключылі святло. Дык яна ўжо нарадзіла, уся ў крыві і амаль непрытомная, торкае голкаю немаўлю ў галоўку — цемечка шукае... І гэта — будучы медык, прадстаўнік самай гуманнай прафесіі!

Душэўная непрытульнасць упершыню зарадзіла ў Валодзькі думку, што горад, мабыць, не прыняў яго ў сваю імклівую плынь, не растварыў яго ў ёй дарэшты. Ён і тырчыць, як вітка на быстраку — усім відаць яе горасная адзінота, і тое, што яна, нахіленая, уся дрыжыць-хістаецца. Але ж чаму тады і вёска, як падумае пра яе, не выклікае ў душы вялікай радасці, трапятання. Хіба што на хвіліну? У горадзе выратоўваюць вуліцы, натоўпы. А ў вёсцы куды дзенешся? Забярэшся, як мядзведзь, у глушэчу, у маліннік і будзеш там сядзець?

Гэтая раздвоенасць пачуцця паласавала Валодзькаву душу. Абмінуўшы помнік Янку Купалу, клумбы з бела-фіялетавымі талерачкамі астраў, ён выйшаў да Свіслачы. На бетонным бар'еры набярэжнай сядзелі белыя чайкі з шызымі крыламі і чырвонымі кручкаватымі дзюбамі; яны зусім блізка падпусцілі яго да сябе, былі спакойныя, надзьмутыя, мабыць, абначыліся тут, насупраць скверыка. Каля моста на чорнай вадзе плавала чарада дзікіх качак. На мосце стаялі дзяўчат-

кі-школьніцы, шчыпалі булачку і кідалі качкам. Тыя з кэрханнем, адна перад адною шырокімі дзюбамі лавілі на вадзе кавалачкі булкі. «У маім дзяцінстве было б неверагодным дзівам карміць з рук дзікіх качак»,— падумаў Валодзька. Успомніўшы дзяцінства, траву і птушак, сярод якіх яно кулялася, бегала, скакала, ён адчуў, што ўхапіў нітачку радасці, і зразумеў: трэба ісці за ёю, куды яна прывядзе.

* * *

Уначы Грышка блага спаў, а можа, і зусім не спаў: ляжаў з адкрытымі вачыма ці ў паўсне, усё роўна перад ім стаяў Босы, адданы, шчыры, як ніхто на свеце, самаахвярны, і вочы добрыя, разумныя, як у чалавека. Раніцаю Грышка не сказаў нікому пра свае жаласныя сны; але і другую ноч карціна паўтарылася. Сярод ночы Грышка ўстаў з ложка, падышоў да акна: што за насланнё, ці не з глузду з'ехаў ён з гэтым сабакам? Не, здаецца, не, бо галава ясная, усё разумее, хоць ён і не спіць другую ноч і за акном усё бачыцца яму як ёсць: куст каліны з цяжкімі гронкамі ягад, кожная ягада прасвечваецца месяцам, і ўнутры яе відаць цёмная костачка; пацямнелы ад расы штыкетнік, белая, як стружка, сцежачка па той бок...

І яго раптам апаліла здагадка: абы-як, чэрства, не па-чалавечы ён абышоўся з Босым! І праўда, як сабаку прыкапалі, і ўсё на гэтым. А ён жа, Босы, служыў яму колькі, верай і праўдаю, не здрадзіў ні разу, цярпеў, хоць Грышка часам і несправядлівы да яго быў. Жыццё аднаго разу, лічы, выратаваў Грышку. Алешыну таўстую на Глубцы валіў. Падкляваў яе з усіх бакоў, як той бабёр абгрыз усё роўна. Алешына стаяла-стаяла, а тады неяк хвіцнулася ўбок — Грышка хацеў адскочыць, зачапіўся за ламачыну і ўпаў. Алешына і накрыла яго, добра што адно нагу прыціснула. Мяккая зямля, дык не пераламала нагі, а так бы... Пацеў-пацеў Грышка, крахтаў — алешыны не адсунеш, не бульдозер. Босы падбег, панюхаў алешыну, поўсць на загрыўку ўздыбіў, забурчаў. Падбег да Грышкі, лізнуў яго ў твар. У Грышкі ажно сляза выкацілася. Трохі ачуўшыся, стаў думаць, як выбавіцца з пасткі. Уся бяда, што на жывот ён упаў, не перагнешся надта, каб адгрэбці зямлю каля нагі. Як мог, наколькі яго старыя

косці дазволілі, пераламаўся, стаў ногцямі драпаць зямлю. І Босы тады як завішчыць, як заскача — і давай зубамі ды лапамі зямлю рваць. Праз якое паўгадзіны, адчуў Грышка, паслабела нага, ён і выцягнуў яе з-пад алешыны. Паманіў Босага, ашчаперыў дзвюма рукамі ягоную галаву і пацалаваў у брудны нос. Во што было...

Яшчэ нацямку падхапіўся Грышка, пайшоў пад павець. Выбраў пару лаўчэйшых аполкаў, што засталіся ад шалёвін, прайшоўся па іх тапаром. Палажыўшы на вярстак, рубанкам шаргануў — забялеліся. Усталі ў хаце — застукала, забразгала. Лісаветка выйшла карову даіць. Грышка ўжо нарэзаў роўненькіх метровых дошчачак.

— Што надумаўся? — спытала Лісаветка сонным голасам, падсоўваючы пад хустку валасы на патыліцы.

— Не скажу,— буркнуў Грышка, схмурыўшы бровы.— Міша там устаў?

— Ці ж я ведаю! — кінула Лісаветка незадаволена: не спадабалася, што мужык утаіў ад яе, не сказаў, што сабраўся рабіць.— Схадзі паглядзі.

«Што маладых турбаваць?» — падумаў ён. Сеў на вярстак, ногі падагнуў на пярочкі, што злучалі наўскасы ножкі. Закурыў: дым і валасы ў прыцьмеласці раніцы былі белыя, як пакулле,— і тое і другое лёгенька варушылася; і кольцы стружак вецер качаў па двары. «Забава малому» — усміхнуўся сам сабе.

У пуні біліся ў вядро струмені малака, пакрыквала Лісаветка: мабыць, неспакойна (збіла ўчора на пашы рог) стаяла карова, у шчыліны дзвярэй раз-пораз вырывалася пара ад яе дыхання.

Грышка затушыў недакурак, узяў малаток, цвікі.

Міша вынырнуў з-за пуні, у майцы, з цыгарэтаю ў роце: пачуў, што бацька грукае, і прыйшоў.

— Грыбаварню новую? — усміхнуўся Міша.

— Труну раблю,— сказаў Грышка ціхім голасам.

— Ты што, бацька, таго? — Міша ляпнуў сабе далонню па галаве.— Зрух па фазе?

— Босаму.

— Каму-каму? — Міша застыў ад нечаканасці, дробненька заморгаў вейкамі (гэта пасля пажару ў яго так), быццам іх таксама варушыў вецер.

— Што чуеш... Прыкапалі мы яго з табою абы-як... А ён жа таксама жывая душа. Дзярэ мяне, бы кіпця-

мі, боль грудзі... Дзве ночы ўжо. Спаць не магу... Чалавек не заўсёды чалавек, а сабака — заўсёды не толькі сабака...

Міша ўзяў дошчачку, прыжмурыўся, змераў вокам, ці роўная. Грышка палажыў на вярстак яшчэ дзве абгабляваныя дошчачкі.

— Глядзі і гэтыя, а то ў мяне ўжо зенкі не свецяць. Калі роўныя, трымай, а я...

Міша шчытна сціснуў на верстаку адну каля аднае дошчачкі, Грышка палажыў перак іх вузкую планачку і пачаў забіваць у яе цвікі; потым другую прыбіў на другім канцы.

— Дно гатова,— сказаў Грышка.

Потым збілі бакавіны, вечка. Труна нечым падобная на свіное карыта, толькі вышэйшая, сумна свяціла на верстаку, і Грышка з Мішам адводзілі ад яе вочы, быццам зрабілі яны нешта вельмі бессаромнае.

— Паснедаўшы, пайду ў лес,— сказаў Грышка, але ў хату не пайшоў. Зноў сеў на вярстак і курыў, курыў, пакуль не прыйшла Лісаветка ды не таўханула ў плечы: «Снедаць ідзі, гаркотнік!..»

Называецца, паснедаў Грышка, толькі за сталом і пасядзеў-панудзеў: не лезла нічога ў рот, падпёрла нешта пад грудзіну, як ужо было не раз.

Узяў лапату, малаток, пару цвікоў. Труну на плячо і пайшоў да лесу. Хто бачыў яго з двара, дзівіўся: куды гэта Пруцікаў выправіўся і з чым? Ці не карыта панёс, але ж не барозавік у чэрвені ставіць. Гадалі, меркавалі дый тут жа забываліся, бо свой пільны клопат вісеў на носе і забіраў пад абладу думкі.

Грышка мінуў поле, да лесу набліжаўся, і змрочная туга клалася яму на душу ўсё цяжэй і цяжэй, быццам зямлю хто сыпаў наверх ці ўзваліў тую алешыну, што нагу прыдавіла.

Пясок пад елкаю падсох, стаў белы, сівенькі, акурат попел. Разгроб яго рукамі Грышка, адгарнуў ад сабакі — асцярожна, не кранаючыся поўсці, быццам не Босы гэта быў, а нейкая дагістарычная жывёліна, а ён не Грышка Пруцікаў з Маліна́ўкі, а вучоны з якой важнай акадэміі. Узяў Грышка ўжо адублага сабаку за халодныя, тонкія, як цапкі, ногі, палажыў на чарнічнік. У ямцы на дне жвавенька караскаліся два невялікія бліскучыя чорныя, бы семкі, жучкі.

Грышка лапатаю пашырыў і паглыбіў ямку, каб

труна ўлезла, тады ўжо ўзяў сабаку спадпізу і акуратна палажыў яго ў труну; убачыў на жываце ў таго рудога мураша, змёў далонню. Забіў цвікамі вечка і апусціў труну ў ямку. З хвіліну, можа, пастаяў над ёю ў скрусе, кінуў туды прыгаршчамі пяску, а тады ўзяў лапату. Шах! шах! — лезла ў пясок лапата з кожным разам глыбеей і глыбей. Спярша пясок запаўняў прамежкі з бакоў, потым вечка стаў засыпаць, з аднаго краю, з другога. Схавалася пад зямлёю труна, быццам некуды глыбока-глыбока праваліласяся. Але ж зямля не вада, яна ўсё ў сабе трымае, помніць...

Насыпаў Грышка гарбячок зямлі, абгладзіў, размазаў кулаком на твары слязу і пайшоў з лесу. Дзіўная рэч: ішоў з пахавання, а на душы калі не светла, то, факт, было вальней, чым усе гэтыя дні, асабліва па дарозе ў лес. Быццам неймаверна важны справунак здзейсніў Грышка, ад якога ўсё жыццё яму будзе лягчэй дыхацца. Ён саступіў з дарогі, да бярозы падышоў, прытуліўся шорсткай шчакою да цвёрдай парэпанай кары і доўга так стаяў, усхваляваны, расслаблена-бездапаможны... Госпадзі!.. Што за сіла звязвае яго з усім жывым, сабакам, рыбкаю, канём, во гэтай каструбаватай бярозаю? Адарві адно ад другога — адзічэе, душа счэзне, сэрца трымцець перастане, цяпла ў свеце паменее. Чым даўжэй капціў Грышка неба, тым даражэйшым станавілася ўсё сваё, вясковае, зямное, чым жыў, дыхаў, на што вачыма глядзеў, што вушамі слухаў і рукамі мацаў... От жа тое самае на чужыне, ды — не тое для цябе, не грэе. Помніцца, іх полк спыніўся ў невялікім мястэчку ў Цюрынгіі. Час адпачыць быў, набрацца сілы перад апошнім, рашаючым боем. Раніцаю, пасля пад'ёму, выйшаў Грышка на ўзлесак... Цуд! Казка! Роўненькі, як дыван, зялёны луг, туманок над ім, а ўдалі рэчка люстэркам бліскае, «зайчыкі» ў вочы пускае... Карціна знаёмая, усё такое, а не сваё, радасці няма, хоць трэсні.

Ледзь адарваўся Грышка ад бярозы, ішоў — кругі ў вачах плылі. Перш чым у хату зайсці, да грыбаварні скіраваў, выкурыў там дзве папяросы і зусім чалавекам сябе адчуў. Не развучыліся яго вусны ўсмешку строіць — усміхнуўся.

* * *

Вярнууся дамоў Валодзька позна. Дзверы былі замкнутыя. Націснуў кнопку званка і адразу адхапіў палец: баяўся, каб не разбудзіць дачку, якая, ведаў, павінна ўжо спаць. За дзвярыма званок не адазваўся. Адключыла, чарговы фокус... Валодзька стаў адмыкаць дзверы ключом — не адмыкаліся, значыць, зашпёртыя на верхні замок, які звонку (калі шчоўкнуць тры разы) не адмыкаецца. Што рабіць? Высадзіць дзверы, як гэта робяць іншыя пры такіх выбрыках жонак? Да такога вар'яцтва Валодзька яшчэ не дайшоў. Валодзька пастукаў у мяккую дэрмацінавую абіўку. Цішыня. Жонка, канечне, пачула, але затаілася.

— Не сарамацься ты перад суседзямі,— сказаў Валодзька, прыхінуўшы твар да вушака.

Жонка абазвалася нечакана, відаць, што яду на спрэчку набрала даўно.

— Ідзі начуй, дзе гуляў!

— Ды не гуляў я. Дзелавая сустрэча.

— Прыдумай што-небудзь новенькае!

Гэта не была рэўнасць, жонка яго, здаецца, ужо даўно не раўнавала, гэта было самадурства, тупое, зацятае, зламыснае, каб паздзекавацца з яго.

— Што, ламацца? Суседзяў трывожыць?

— Няхай чуюць.

Валодзька з суседзямі мала знаўся. Вітаўся добразычліва, адгукаўся на іх рэдкія просьбы, але ніколі не лез у чужое жыццё, не імкнуўся нешта ўведаць ці паслухаць плётку, але і не любіў, калі нехта лез у ягонае — нахабна, проста, часам з нетактоўнай жорсткасцю, як гэта рабілі жончыны сяброўкі, а часам і бацькі.

— У цябе сумленне ёсць? Дванаццаць гадзін ночы...

— Не хачу дачкі будзіць, таму і пускаю.

Шчоўкнуў замок: раз, другі, трэці. Валодзька адчыніў дзверы. Жонка ўжо была на кухні, не ад боязі, канечне, яна шмыгнула туды, проста паказвала сваю абыякавасць да яго.

Якою драбязою атручваюць жыццё людзі, жахаўся Валодзька, на што трацяць сваю энергію. Змізарнелі, маленькімі мэтамі жывуць. Дзікасць! Адкуль яна прыйшла ў прыроду «чалавека разумнага»?

Валодзька зняў туфлі, сунуў ногі ў пантофлі; спаласнуў у ваннай рукі.

— Слухай, Каця, колькі мы будзем мучыцца? — сказаў ён, прыйшоўшы на кухню.— Трэба нешта вырашаць...

Каця сядзела за сталом, глядзела на нізенькую алюмініевую каструльку, у якой варылася кава.

— Я ўжо вырашыла: разводжуся з табою,— сказала з такою непахіснасцю, быццам Валодзька пасля гэтых слоў павінен упасці перад ёю на калені і маліць, адгаворваць. Зразумеўшы, што ўсіх мужчын стрыгуць пад адзін грэбень, жанчыны сталі нахабныя і незалежныя, і жонка яго адна з іх. Пазіцыі яе і яго, за якімі стаяць характары, розум, звычкі, культура, не сумясціш, некаму аднаму трэба здаваць сваю пазіцыю, і калі гэта зробіць той, у каго пазіцыя больш хісткая, нежыццёвая, недалёкая,— сям'я захаваецца.

— Я таксама на гэта настроены,— адказаў Валодзька суровым голасам, які прымусіў жонку крыху запнуцца і шукаць маленькі кампраміс.

— Ты зусім не дапамагаеш мне...

— Ну і нахабніца ж ты. Хіба гэта не помач жонцы, калі мужык нічога абсалютна не патрабуе ад яе? Сам ва ўсім сябе абслугоўвае, варыць есці, мые, прасуе...

— У нас ёсць яшчэ дачка, выхаванне якой ляжыць не толькі на маці, як вядома.

— Я займаюся ёй не менш, чым ты. Ваджу ў сад, а ты забіраеш.

— А калі ты ёй апошнюю кніжку чытаў?

— Учора.

— Якую?

— «Алёнчыны казкі».

— Нешта я не бачыла.

— А дзе ты ўбачыш, калі ў лазні была?

— А пасуду ты памыў? — Жонка не мела ніякай логікі ў сваіх развагах, хапалася за ўсё падрад, каб папракнуць Валодзьку, што ён гультай, а ўсе астатнія мужчыны — працавітыя пчолкі. Каб збэсціць мужа, яна гатова была нават апрыскаць французскімі духамі ванючага казла.

— Не толькі за сабой, але і за табой. Раніцаю ты кінула ўсё і пайшла, а я мыю...

Яны хадзілі, як заўсёды ў спрэчках, па замкнутым крузе: жонка вінавяціла ва ўсіх грахах Валодзьку, а ён бачыў гэтыя грахі ў ёй самой. Калі чалавека не лю-

біш, не ляжыць да яго душа — бачыш у ім толькі благое і самай заблытанай сямейнай праблемаю будзе: каму памыць талерку? Можа, і наіўна, але Валодзька лічыў: калі жанчына гаспадарлівая, яе няма за што папракаць.

— З табою гаварыць мала толку. Заўтра нясём у суд заяву.

З каструлькі паднялася рудая, мутнаватая пена, і жонка выключыла газ.

— Добра,—сказаў Валодзька і павярнуўся да дзвярэй.

— Каву піць будзеш?

— Я і так блага сплю,— сказаў Валодзька і пайшоў у спальню. Адгаворваць жонку не будзе, не той варыянт. Віны сваёй ён не бачыў, не адчуваў ні ў чым, і жыццёвая пазіцыя была не хісткая, калі не лічыць сям'ю. І не здрадзіў ён ні разу жонцы. А нават разу хапіла б, каб ужо сумнявацца, што праўда за табою. Няўжо яна настолькі дурная, каб не разумець, ці гонар ёй засляпіў вочы?

Дзіўныя змяненні бываюць: раней, увярэджаны, Валодзька мог не заснуць праз усю ноч, цяпер жа заснуў хутка і спаў як забіты. Гэта ён зразумеў раніцаю, калі прачнуўся ад тупату жончыных ног,— арганізм, канечне, не дурань, як казаў адзін доктар: ведаючы, што перажыванняў хопіць, вырашыў адпачыць як след, ці што.

— Так, не забудзь пашпарт,— напомніла жонка, каб вярнуцца да ўчарашняй вячэрняй размовы. Вочы ў яе падпухлі, мабыць, позна лягла і не выспалася.

— Я ўжо даўно нашу яго з сабою.

— І пасведчанне аб нараджэнні Наташы пашукай...— Яна не супакойвалася, чаплялася да яго.

Напамін пра Наташу балючымі, гарачымі абцугамі сцяў сэрца: якая незайздросная доля выпала ёй — жыць без бацькі. Не, ён, канечне, не адкінецца ад яе, будзе прыходзіць, прыносіць ёй ласункі, забіраць з садзіка, гуляць, хадзіць у цырк, на стадыён, але потым... потым усё-такі поїдзе ад яе, у свой «дом». Вось і кватэру — радасці было: двухпакаёўка ў Мінску! — давядзецца дзяліць, колькі тлуму будзе.

Валодзька падышоў да даччынога ложка. Наташа спала, роўненька склаўшы далонькі пад шчакою. Белыя валосікі разбэрсаліся, і адна пасмачка ляжала на



*Міша, з вогнетушыльнікам у руках, гробся па лесвіцы да барабана. Стаў, раскірэчыўшы ногі, і з вогнетушыльніка, як з аўтамата, белаю спіцаю свістануў у полымя струмень.*

(«Віхор»)

шчацэ. Валодзька ўзяў гэтую пасмачку і асцярожна паказытаў нос, вочы.

— Уставай, дачушка...

Наташа салодка ўздыхнула, пацягнулася, ажно косточкі хруснулі: так хочацца яшчэ паспаць! Але парадак ёсць парадак, у восем зарадка.

— Адзявайся, доча... Адзенне во на тумбачцы.

Жонка ў ваннай перад люстрам падмалёўвала вусны.

— Хутчэй, мне няма калі! — падспешвала яна, паказваючы, што ёй хочацца хутчэй падаць заяву, а на самай справе чакала, пакуль Валодзька скажа: «А можа, адкладзём?»

— Зараз Наташу завяду...

Наташа адзелася і, не падышоўшы да маці, сказала:

— Я гатова, тата.— Яна была надзіва старанная, ахайная дзяўчынка, яе хвалілі выхавацелькі ў садзе, і Валодзьку заўсёды прыемна было гэта чуць, ён лічыў, што нешта ёй перадалося ад яго.

Валодзька ўзяў дачку за руку, і яны выйшлі на вуліцу. «Якая цудоўная раніца!» — ледзь не ўсклікнуў ён, і чамусьці ўспомнілася вёска. Ён так любіў тады ранкі. Пасля сну выходзіў на гарод, шыбы і як бы шкляны ад густой расы, асабліва яна была відаць на лапках кропу; слухаў посвіст шпакоў, гуд пчол на лілапах. Чаму іменна сёння востра ўспомнілася вёска, малая радзіма, як яе называюць. Можа, зноў-такі, каб даць яму моцы ў жыццёвай крутаверці? А можа, і праўда ён ніколі не бачыў у горадзе такой прыгожай раніцы. Што за неба? За мяккаю ліловаю смугою рознакаляровая посцілка — быццам адна з тых, што ткала калісь бабка Надзёжа (ён помніць, дапамагаў намотваць на цэўкі ніткі, падносіў бёрды, націскаў на панажы): знізу цёмна-сіняя палоска, на краі размываецца, і з гэтай размытасці пачынаецца ўжо чырванаватая, потым жоўтая, зялёная, светла-блакітная, белая...

— Глядзі, доча, якое неба! — не мог стрымаць захаплення Валодзька.

— Як піраміда — кольцамі.

«Во, у яе зусім іншая асацыяцыя...» — падумаў Валодзька і сказаў:

— На маляванні ты намалюй такое неба.

— Такое не бывае!..— Дачка з усмешкаю паглядзела яму ў вочы.

— Як не бывае? Бачыш жа...

— Смяяцца будуць.

— Ну і што? Затое гэта будзе толькі тваё неба.— І падумаў: «І нам, творцам, як няпроста, таксама пад насмешкамі, уколамі скептыкаў, дурняў трэба адстаяць права іменна на с в а ё. Але ведай: няўмека ў чужой працы бачыць недахопы, а майстар — майстэрства».

— Добра, тата, я паспрабую...

Гаркота зноў сціснула Валодзькава сэрца: як жа, мабыць, збедніцца даччын свет, калі яна будзе жыць з адною маці. Была б яшчэ маці як маці, клапатлівая, самаахвярная, не так перажываў бы, а то ж толькі сябе і глядзіць, толькі сабою і займаецца: лазня, дыета, аэробіка — апошняя прыхамаць цывілізаванай жанчыны.

Валодзька вярнуўся ў кватэру. Жонка чакала яго, пад вачыма ў яе ляжалі густыя зеленаватыя цені.

— Ты, бачу я, не спяшыш разводзіцца? — сказала яна, робячы маленькую ўступку.

— З чаго ты ўзяла? Якая розніца, сёння ці заўтра. Зразумела адно, што адносіны мы не наладзім. У нас розныя з табою жыццёвыя пазіцыі.

Тое, што Валодзька не пайшоў на пакору пасля жончынага кампрамісу, хваснула балючым бізуном па яе самалюбстве.

— Ну добра! Будзеш шкадаваць!

— Гледзячы хто...— Валодзька быў спакойны, можа, нават абыякавы: чалавек, як вядома, да ўсяго прывыкае — размоў, хвароб, той жа аэробікі.— Шукай сабе такога, які будзе маліцца на цябе толькі за тое, што ты ёсць, нічога не маючы ўзамен на сваю ласку.

— Горш не будзе! — сказала жонка хоць і з годнасцю, але няўпэўнена: спытай у яе, што цяпер блага, яна не зможа пэўна адказаць.

— Кожны будзе, як казаў мой адзін разведзены сябра, лавіць рыбу на сваёй глыбіні.

— Давай хутчэй! — Жонка дэманстравала сваю нястрыманасць, іменна дэманстравала, а ў душы ёй хацелася як далей адцягнуць той пакутлівы момант, калі трэба класці заяву на стол суда. І гэтае Валодзькава

назіранне пацвердзілася, калі яны ішлі ўжо на прыпынак і ён сказаў:

— Ну што, прамою дарогаю ў суд?

— Ведаеш, мне трэба адпрасіцца на рабоце...

— Пазвані і скажы, што затрымаешся.

У жонкі прапаў увесь яе азарт.

— Не. Разумееш, начальніку званіць...

У Валодзькі з'явілася рашучасць, і ён паехаў з жонкаю на пошту, дзе яна працавала тэлеграфісткаю. У аўтобусе жонка раптам узяла Валодзьку пад ручку, нібыта каб трымацца, але гэта азначала, што яна здае яшчэ адну прыступку сваёй пыхі. Дык што ж рабіць, задумаўся Валодзька, можа, яна абразуміцца? Але наўрад... Колькі ўжо было зарокаў! А жыццё тым часам ідзе па краі прорвы, якую капаюць штодня сваркі, знявагі, крыўды, прыдзіркі. Урэшце прорва можа аказацца такою глыбокаю, што і не выбераешся з яе потым, тады стаў на жыцці кропку. На якім жыцці? Яшчэ такім кароткім і няплённым? Апошнім часам Валодзька адчуў, што гэтая сямейная няпэўнасць выбівае яго з каляіны і ў рабоце: чытае сцэнарый, а ў галаве нічога не застаецца — думкі пра іншае: што рабіць? Выходзіць, жонка не толькі белы свет, але і розум, душу яму завязала. І гэты сцэнарый пра Мішу Пруцікава, можа, апошняя спроба праверыць сябе, сваю сілу і здольнасці, колькі іх яшчэ ў ім засталося.

Жонка пайшла на пошту, а Валодзька спыніўся чакаць яе ў двары. Трохпавярховы будынак пошты стаяў, мабыць, у садзе; ваколраслі магутныя, кражыстыя яблыні і грушы. Яблыкі паспявалі, асветленыя сонцам, яны яркаю жаўцізною кідаліся ў вочы, на іх блішчалі сінія расінкі. Валодзька сеў пад яблыню на лаўку, чамусьці баючыся, каб яму, як таму Ньютану, не ўпаў на галаву яблык: на траве было густа насыпана яблыкаў, мабыць, падалі чарвівыя.

Жонкі доўга не было, але Валодзька сядзеў бяздумны: усё ўжо даўно абдумана, да апошняй макулінкі — і пра тое і пра другое, як кажуць. Ну, дачка — гэта зразумела... Шкада было і бацькоў, будуць перажываць. Але ж не менш ім перажыванняў і ад таго, што бачаць, як сын мучыцца.

Ляпнулі дзверы, на ганак выйшла жонка. Выраз твару ў яе быў рашучы і ганарлівы. Бакавым зрокам Валодзька раптам убачыў, што ў акне на трэцім паверсе

нейкі мужчына крадком выглянуў з-за фіранкі і тут жа хуценька схаваўся. Кіно! Хто гэта: выпадковы чалавек ці, можа, палюбоўнік? Вельмі падобна, што не да начальніка хадзіла раіцца жонка. Але Валодзька падумаў: не трэба праясняць, навошта псаваць сабе нервы. Цяпер ужо ўсё роўна, слоў было даволі, нават лішняга ў запале нагаварыў, незаслужана навінаваціў.

— Пайшлі! — жалезным голасам сказала жонка. Дзяўчынка ты, дзяўчынка, падумаў з горыччу Валодзька, шкада цябе. Колькі легкадумнасці ў тваёй галаве, пяйнакш, хапіла б на цэлы жаночы корпус. Ён ужо не адзін раз задумваўся: адкуль у некаторых жанчын гэтая, модна кажучы, інфантыльнасць? Адукаваныя, начытаныя, пры пасадах... Здавалася б, сур'ёзны погляд павінен быць на жыццё, падзеі, рэчы. Не, з такою лёгкасцю і без аглядкі ідуць на ўсякія непрыстойныя ўчынкі, знаёмствы, здрады, разводы, што нельга не давацца дзіву. Няўжо ўсё толькі ад таго, што мужыкі благія, грубыя, негаспадарлівыя, п'яніцы? Дык жа легкадумнасць, можа, яшчэ большая, і ў тых, чые мужыкі, як кажуць кіношнікі, «стопрацэнтныя ва ўсіх адносінах». Дзе, калі, чаму і што змянілася ў псіхалогіі жанчыны, якая спакон веку аберагала сямейнае цяпельца.

У такім скрушлівым роздуме Валодзька часам як бы пераконваўся: тая жанчына лёгка ператвараецца ў мяшчанку, нават мяшчаначку, якая не ставіць перад сабою ў жыцці высокай мэты, зводзіць яе да вузенькага, абмежаванага «мірка», які бачыцца ёй скрозь трубачку цыгарэты: усё дзеля сябе, дзеля таннага форсу, прыгожага, бестурботнага жыцця. Як зрабіць гэтую шчыліну шырокай, каб хлынула ў яе святло шырокай ракою, ці заканапаціць яе зусім?

* * *

Ночы стамілі Грышку. З раніцы балела галава, увесь дзень пачуваўся млява. Хацелася спаць, але сон не ішоў. А тут у абед прылёг на ложку на верандзе і заснуў, балазе ніхто не дурыў галавы. Лісаветка тырчыць у Мішы, як адвезлі ў бальніцу Ліду, а Ленка з малым некуды гуляць пайшла.

Прахапіўся Грышка ад стуку. Пакуль расшалопаў, што і дзе,— здаецца, нехта тузаў весніцы ў варотах.

Во, гэта ж ён выпускаў парасят, дык запёр весніцы на завалу, а потым парасят, як трохі пачухалі па двары, загнаў у пуньку, а весніцы адперці забыўся. Хто тамака ламаецца? Можа, п'яны хто? Ад Паўлюка Аўгіннінага зачыняюцца ўсе людзі, каб не слухаць яго п'яную балбатню, дык ён, бы той сабака, праз весніцы перакінецца. І не выганіш яго, не адпрэчыш: Паўлюк першы на вёсцы «спец» па кабанах. Баба касы не паспее заплесці, як ён кабана заваліць, абсмаліць, на кавалкі тушу пакроіць, а тым часам у гаспадыні патэльня ўжо сквірчыць на стале. І дзвюх гадзін не прайшло, а Паўлюк з песнямі, з ружжом і торбаю свежыны на плячы ідзе дахаты. Але Грышка з ім варагаваў, не ішоў на прымірэнне, хоць той колькі разоў і вініўся, нават п'яную слязу пускаў,— была ў іх заварушка, была...

Грышка патрухаў глядзець: хто там грукаецца. У акно ўбачыў Людку Чубатчышыну, паштарку. А чаго яна не засоўвае газеты ў паштовую скрынку? Адпёр Грышка весніцы — Людка смяецца:

— Забарыкадзіраваўся ты, дзядзька Грышка, са сваім сямействам — носа не ўткнуць.

— У каго доўгі, той уткне,— пажартаваў Грышка, хоць яму было не да жартаў.— А ты што...— Грышка хацеў спытаць, чаму патрэба такая, у хату ісці, пенсію ж нядаўна атрымаў, але нешта як замкнула рот — бытта боязь ці асцярога якая.

— Зноў вам нейкае саліднае пісьмо... друкаванае,— падала Людка газеты і наверсе канверт, і зноў усмешка да вушэй. Ну і здаравушчая баба! Адным вокам толькі глянь, і адразу відаць: чалавек не ведае хвароб. Твар круглы, цёмны, загарэлы, вочы ясныя, гарадзь, і ў паваротах, рухах столькі дужасці, спрыту, а лыткі — як плахі. Што значыць чалавек усё жыццё — бяжком і бяжком, як і матка яе. Гэта ж чатыры вёскі абыдзі, ну няхай аб'едзь на веласіпедзе, але той веласіпед яна болей у руках водзіць.

Грышка засунуў газеты пад паху, а канверт трымаў у руках і не ведаў, што з ім рабіць. Людка таксама стаяла і не адыходзіла, вопрама глядзела на Грышку, можа, думала, стане пры ёй адкрываць канверт, чытаць, што ў ім хаваецца. Ага, дурня знайшла, такой адно пачапі што на язык — мітульгою разнясе па ўсіх вёсках: «А ў Грышкі Пруцікава зноў...» Лёпалка яшчэ тая...

А пісьмо і праўда было «салідцае», як і тады на Мішу з часці, аддрукаванае на машынцы, з пячаткаю нейкаю. Затрэсліся ў Грышкі калені, але суняў сябе, не даў разыграцца нервам. Убачыўшы, як Грышка нахмурыў твар і завёў на пераноссі бровы, Людка падумала, што на яе раззлаваўся, і пакаціла невясёлая з двара. Дзякуй богу!

Грышка сеў на калодку пад хатаю, доўга не асмельваўся адкрыць канверт, сціраў з твару пот. Нарэшце выняў з канверта паперыну з сінім, як васілёк, гербікам зверху. Упіўся ў яе вачыма: «Копія.

Паважаны таварыш Пруцікаў Рыгор Мацвеевіч!

На Вашу скаргу ад...»

Фу! Грышка апусціў рукі і колькі хвілін сядзеў нерухома, як здранцвелы, а ў галаву на змену трывожным прыходзілі радасныя думкі: усё-ткі адгукнуліся, уважылі. Далей Грышка ўрыўкамі прабег вачыма па лісце: «Камісія праверыла Вашу скаргу... устанавіла... на дзень праверкі аказалася, што ў магазіне... Факты, выкладзеныя ў Вашым пісьме, не пацвердзіліся...»

Грышка ажно з калодкі ўстаў. Дык што ж гэта такое? Як «не пацвердзіліся»? «На дзень праверкі...» Загнулі казе хвост! Ты цяпер ідзі паглядзі. Зноў на прылаўках адзін адэкалон ды шмаццё ўсякае. Бач, як лоўка выкруціліся! Але не-е, браточкі, дуктавы-жлуктавы, я выведу вас на чыстую ваду...

Грышка зноў злажыў ліст па ўжо намечаных рубчыках, засунуў у канверт і пайшоў у хату. Не сказаць каб ён быў упэўнены, што пасля яго скаргі магазін заваляць таварамі, але і такой адпіскі-адмашкі не чакаў. Пыл у вочы, лухта непадмазаная. А столькі валаводзілі!.. Год, лічы...

Увесь астатак дня Грышка быў хмурны, Лісаветка гэта бачыла і не назаляла мужу, нават па ваду на самакаце паехала.

А назаўтра Грышка з раніцы надзеў чыстую блакітную кашулю, новы касцюм, наваксаваў туфлі і паехаў у райцэнтр. Дарога прывычная — колькі ад'ездзіў, як рабіў у «Сельгастэхніцы».

Па вуліцы горада Грышка ішоў невясёлы, з апушчанаю галавою, і вочы яго лавілі то мысы сваіх новых туфляў, то ўсякую драбязу-пацяруху на тратуары. Во нешта круглае, жоўценькае, бы малюпасенькая лі-

січка-пупсік, мільгнула ў вачах... Грышка ў задуменні яшчэ ступіў крокі два, але вярнуўся. У асфальт была ўціснута новенькая капейка. Сотні абцасаў ступалі на яе, адчышчалі, аддрайвалі, бы салдат гузік, але ніхто не сагнуўся, не падняў — атлусцелі, уніжэнне, бачыце... А яна ж, капейка гэтая, таксама грошы. На яе нехта рабіў, кроплю поту праліў, каб зарабіць, няхай сабе і не кроплю, а макулінку, ды ўсё роўна ёсць ёй цана чалавечай працы, нездарма на мазоль падобна, во колькі такіх «капеек» у яго на далоні. Грышка прысеў на кукішкі, цяжка яму было, хрумсцела ў каленях; азірнуўся вакол і калупнуў ногцем капейку. Дзе там — хоць і ногаць жалезны, шкло можна рэзаць. Як уплавілася, урасла. Канечне, сонца смаліла, асфальт размякчваўся, яна і ўехала туды, бы ў воск. А можа, і трыбухан які наступіў на яе, дык яна ў камень уплішчыцца, не тое што ў асфальт. Грышка калупнуў яшчэ раз, але толькі набраў пад ногаць чорнага асфальту. Устаў, галава закружылася... Што рабіць? Вунь чалавек насустрач яму ідзе, метраў пяцьдзесят яшчэ да яго. Можа, у яго ножык ёсць, свой складанец, як на тое, не ўзяў. Але чалавек раптам спыніўся, звярнуў з тратуара і перайшоў на другі бок вуліцы, і ўжо тады Грышка пазнаў Дуктава. Папаўся як муха ў кісель! Той прыпыніўся каля кіёска, купіў газету і, унурыўшыся ў яе, пайшоў далей. «Не хоча сустракацца...— падумаў Грышка.— Я табе яшчэ падсыплю солі...» Паляпаў па кішэні — зазвінелі медзякі. Во, можа, капейкаю... Ён выбраў сярод медзякоў пятак і, прысеўшы, выкалупаў ім капейку. Разам з іншымі медзякамі засунуў яе ў кішэню і пасміхнуўся з несур'ёзнасці сваіх разважанняў ды занятку. Убачыў бы хто — чаго б толькі не прыпісаў.

Райком партыі — белы высокі яшчэ даваенны будынак — стаяў у гушчыні клёнаў, ліп і кустоў бэзу, які ўжо адцвіў і выпрастаў акуратныя «елачкі» маленькіх зялёных струкоў. У праходзе да параднага пад'езда стаялі лаўкі, на якіх сядзелі людзі, мабыць, чакалі свае чаргі на прыём.

Грышка адразу пайшоў на трэці паверх. Пастукаў у прыёмную; спытаў у дзяўчыны-сакратаркі, ці можна да Елавікова. Яна глянула на яго, здалося, здзіўлена, затрымала позірк на планцы ўзнагарод і сказала пачціва: «Калі ласка!» Грышка павярнуў да дзвярэй

направа, прыпамінаючы, што заходзіў сюды, калі атрымліваў ордэн, і ўжо ўзяўся за ручку, але сакратарка спыніла яго: «Не туды». Грышка спярша падумаў, што дзяўчына з яго пацыкаецца, але твар у яе быў сур'ёзны.

— Во сюды, калі ласка...— Дзяўчына шчыра ўсміхнулася і паказала на левыя дзверы. Выйшла з-за стала, узяла Грышку за локаць і падвяла да самых дзвярэй.

У кабінеце за сталом і праўда сядзеў Елавікоў — здалося Грышку, больш пасівелы, пастарэлы. Дзіва што, гады нікога не шкадуюць.

«Во ёлупень! — абурыўся Грышка на сябе.— Сам жа чытаў у раёнцы, што Елавікова абралі першым сакратаром...»

Елавікоў не адрываў вачэй ад папер, а калі ўбачыў Грышку, падняўся яму насустрач. Ён быў у белай кашулі, пінжак вісеў на спінцы крэсла.

— Добры дзень! Добры дзень! — жвава павітаўся ён з Грышкам за руку.— Сядайце, калі ласка, да стала.

Грышка нясмела сеў, не ведаў, куды дзець рукі. Хваляваўся. Праўда, не так, як тады, калі прыходзіў скардзіцца на Родчанку. Тады асабістая бяда ў яго была, цяпер жа як бы і не яго, а ўсіхная. Але ён не ведаў, з чаго пачаць, як сказаць, каб адразу ўразіла яго просьба і каб не падумалася Елавікову, што глупствам займаецца на старасці год чалавек. Ды Елавікова, здаецца, зусім не трывожыла, што зараз скажа яму Грышка, а падобна, ён хацеў проста пагаварыць, быццам не надакучае яму гэтая гаварыльня з дня ў дзень.— Як здароўе, Рыгор Мацвеевіч?

— Якое ўжо ў мяне здароўе! Няма чым хваліцца ў мае гады.

— А на выгляд вы — бравы казак!

— Ну, яшчэ ж паміраць не збіраюся,— усміхнуўся падбадзёраны Грышка. Маладым ці стары, а скажы, што ён здаровы,— чалавек заўсёды радуецца.

— Рана, рана... Спраў у нас багата.

— Хапае! Чортведама з чаго пачаць?

— Пачынаць трэба з сябе.

Грышка падняў вочы на Елавікова: пра каго ён, пра сябе ці пра яго, Грышку. Елавікоў улавіў гэтую яго разгубленасць.

— Так-так, кожны з нас павінен пачаць наводзіць парадак на сваім месцы... А то разбасячыліся!

— Ета правільна. Правільна... І я так думаю. Але, можа, вы гаворыце толькі пра мяне, а я тут ні пры чым, я ўсё жыццё чэсна, з мазаля жыў і ўсё жыццё вінаваты быў... Перад Родчанкам, перад Міротнікавым! Помніце, і да вас прыходзіў? Не зразумелі і вы мяне... «Правільна Родчанка соткі ў вас забраў... Вы — ужо не член калгаса». А што жылле рваў дзеля гэтага калгаса — няшчот?

— Ну, гэта тады было, памылкі...

— Дык увесь час, палучаецца, памылкі!.. Раней памылкі, цяпер памылкі. Начальнікі іх робяць, сабе пузы ды кашалькі набіваюць, асабнякі ставяць, а вінаватыя Грышкі-шышкі... Во што. Іх круцяць, перакручваюць і так і сяк — што б з іх выціснуць? А што з мяне выціснеш, апроч мазаля на далоні? А трасяні любога начальніка...— Грышка ўжо не думаў, дзе ён знаходзіцца, яму ўсё роўна, важна, што гэта, можа, апошні шанец выспаведацца перад чалавекам, які ў нечым можа зразумець яго і, галоўнае, ва ўладзе якога нешта паправіць. Што насіць гэты груз у сабе, што спрачацца на лавачцы з такімі, як сам, што абурацца на Лісаветку, якая топчацца ў задрыпаным фартуху каля печы? Пустое дзела! А слова маё нешта ж значыць, нехта ж павінен пачуць, калі бога няма.

— Калі шчыра,— Елавікоў пераплёў на грудзях рукі, заківаўся ўзад-уперад, пераступаючы з пяткі на насок,— раней я вас не падтрымаў бы, у лепшым выпадку прамаўчаў бы, а хутчэй за ўсё аспрэчыў бы. Бо прызнаваць — значыць самому і дзейнічаць: змагацца, выганяць, здымаць! А цяпер скажу: ёсць праўда ў вашых словах, Мацвеевіч. Рвалі, граблі пад сябе і міністры, і старшыні, і загадчыкі баз... Больш пра ўласную кішэню дбалі. Не дабрабыт людскі турбаваў іх, а цёплае крэсла пад задам страціць баяліся, а таму і рабілі нешта... Крыку ж — на цэлую Еўропу! Не ўсе, канечне, такія, але шмат такіх. Цяпер нам усім трэба пра грамадства думаць, пра народ... таго, хто, як вы кажаце, «жылле рве».

Грышка не верыў таму, што чуў, быццам падмянілі Елавікова, у адну дудку з ім дзьме. А тады, гадоў пятнаццаць назад, ён, Грышка, яму пра Кузьму, а той — пра Дзям'яна: «Вот з вамі, Рыгор Мацвеевіч, і

размаўляй. Нізкая ў вас свядомасць, атрымліваецца: замест таго каб вам, удзельніку вайны, сталаму, заслужанаму чалавеку, быць з намі заадно, выхоўваць масы, вы наракаеце, скардзіцеся: гэта вам не так, тое вам не падабаецца! А што ўжо пра іншых гаварыць?»

— Правільна! — набраўся смеласці, як не стукнуў Грышка па стале, але пабаяўся — яшчэ праломіць.— Рэжце мяне, біце, паліце, але самая чыстая душа ў чалавека простага, у цёмнага, забітага, як раней казалі... у таго, што па зямлі ходзіць. Газеты чытаю, тэлевізар гляджу: аднаму міністру па шапцы далі, другога за рашотку... А ён жа, калі такі, як я, да яго прыходзіў, уга якім святошам браўся, якімі слоўцамі сыпаў. А сам — і аферыст першай маркі, і п'яніца, і бабнік...— Грышка аж запыхаўся бедны.

— Партыя навядзе парадак, разбярэцца з разгільдзяямі. Цвёрда вам кажу, па старой дружбе...

— Навядзе, яшчэ як навядзе! — Грышка акурат прыгразіў некаму.— Толькі і вам у нас у раёне трэба хутчэй брацца... Хопіць тыцкаць пальцам у брыво, трэба праўдзе ў вочы глядзець.

Елавікоў дабрадушна засмяяўся.

— Канечне ж, бярэмся. Бюракратаў, што пазаселі, паўкараніліся, бярэм за кіршэнь. Крэпенька бярэм! Закруціў віхор!..

— Увесь час казалі: бярэмся! А што мянялася? Я нашчот крамы,— Грышка ўдала падлавіў момант, калі сказаць, чаго прыйшоў сюды.

— А што крама? — Елавікоў наморшчыў лоб — склалася гармонікам скура. Вопыт, канечне, браў сваё: з самага пачатку не сумняваўся Елавікоў, што не так сабе, абы языком памянціць, прыйшоў Пруцікаў, часцей за ўсё вядуць у райком людзей крыўда, бяссілле перад валакітчыкамі, калі ўжо выпрабаваны ўсе сродкі, страчаны ўсе надзеі, а справа ні з месца. Трэба хадзіць у райком! Хадзіць, як у свой дом.— Далёка ці зусім няма?

— Столькі ў раёне, маглі б і ведаць,— падкалупнуў Грышка.

— Дзе тут! Каля сарака тысяч гектараў сельгасугоддзяў. Усё, усякі закутак ведаць не будзеш.

— Ага... Дык ёсць, крама ёсць, але от... палучаецца, што як бы і няма яе. Я ўсю праўду вам далажу.

Пісаў я у вобласць, праверка была, але мяне абмінула...

— От жа людзі! — абурыўся Елавікоў, зразумеўшы з першых слоў, што прывяло Грышку Пруцікава.— А чаму перш з намі не параіліся?

— А што раіцца, падумаў... Вы ўсе тута адзін з адным звязаны. Закруціце, замуціце, і толку не даб'ешся.

— Не давяраеце, выходзіць? Дарэмна вы. На скаргі з месц стараемся рэагаваць канкрэтна... Дык што ў вас там з магазінам... э-э, крамаю? — з тонкаю ўсмешкаю на вуснах глянуў на Грышку Елавікоў — чалавек, які любіў гумар і жартаваў усюды: і на рабоце, і нават на трыбуне, не кажучы ўжо пра сям'ю і таварыскія кампаніі.

— А тое, што забываюць часценька на яе, бытта ў яе і людзі не ходзяць. Няхай нас прыгаршчы, як той казаў, але ж і мы курыць хочам,— Грышка ўсміхнуўся, пранікліва глянуў на сакратара райкома.

— Не завозяць прадукты?

— Завозяць гады-наўрады. А перад праверкаю нябось усяго навезлі. Рыбы, каўбасы, масла... хоць на спіну маж!

— Меры мерамі, а спяцоў вочы замазваць хапае! — ужо хмурнеючы не толькі лбом, але і вачыма — хавалася ясная сінь,— сказаў Елавікоў і зняў тэлефонную трубку.— Ды яшчэ колькі такіх! — Крутнуў некалькі разоў катушку.— Аркадзь Фаміч? Елавікоў. Што там у цябе з малінаўскім магазінам? Ага, скардзіцца прыйшлі...

Па твары Елавікова Грышка зразумеў: пык-мык, нічога сказаць не можа Дуктаў, круціцца, як той вуж, калі прышчэміш яму хвост.

— Дык кажуць, што толькі перад праверкаю...— Елавікоў жмурыўся яшчэ больш.— Ну добра. Гадзіны ў чатыры чакаю вас з намеснікам. Так, Міротнікавым...— Палажыў трубку, некалькі імгненняў засяроджана глядзеў перад сабою; падышоў да карты раёна, што вісела на сцяне, змераў пядзяю адлегласць.— І недалёка ж! А як дарога?

— Цяпер хоць бокам каціся. Новы старшыня асфальт палажыў.

— Новы? Малайчына! Не глядзіць, маленькая вёсачка ці вялікае сяло.

— Ягорычам мы давольны... Не дае распусты! Во

трактарысты. Раней што напішуць сабе ў нарад, за тое і плоцяць. А Ягорыч сам правярае пуцёўкі... Спярша бурчэлі, нават мацюгалі, а пасля прывыклі.

— Дысцыпліна ёсць дысцыпліна, у ёй сіла свядомага чалавека...— Елавікоў вярнуўся да стала, пачаў гартаць паперы, але безуважна неяк, абы заняць рукі.— Як, ветэраны вайны, не ў крыўдзе?

Грышку мёдам на сэрца лягло: гэта ж чалавек не забыў і пра іх, удзельнікаў вайны, спытаў, як ім жывецца. Нічога такога, а прыемна, чорт! Часам добрага слова і не хапае людзям, каб мірна жыць. Развучыліся людзі спачуваць, падтрымліваць, шкадаваць адно аднаго. Так і стараецца каторы языком-асцюком укалоць.

— Нам шмат не трэба — трохі павагі, трохі ўвагі,— бадзёрым голасам сказаў Грышка.— І пуцёўкі ў санаторый даюць кожан год... Але я не езджу, кажуць, каб справіцца там з усякімі працэдурамі — туды трэба здаровым ехаць,— засмяяўся лагодна Грышка.— Мы там лішнія людзі, а ў калгасе, слава богу, не лішнія. Умеем, вопытныя, бітыя...

— Малайцы, старая гвардыя! І з крамаю вашаю ўсё будзе добра. І мякенькі хлеб пенсіянерам будзе...— Елавікоў гаварыў суха, упэўнена, быццам хацеў надаць упэўненасці і Грышку.

Грышка ўстаў, недаверліва глянуў на Елавікова, падаў яму руку. Ішоў, турбаваўся, нават пабойваўся, успамінаючы ранейшае, а тут быццам паразуменне з першым сакратаром выйшла. Не сыходзіў Грышка па прыступках з трэцяга паверха, а ляцеў уніз, бы які свавольны калыглуз. Вылецеў на вуліцу — і спыніўся: перад зелянінаю, аблітаю сонцам, яркімі чырвонымі плакатамі, светлым дамком на другім баку вуліцы, каля якога гулялі ў пясочніцы пад стрэшкаю-мухаморам дзеці. Туга раптам сціснула сэрца ў клубочак болю, а туга заўсёды сеяла ў ім сумненні ды расчараванні. Зняверыўшыся за сваё некароткае жыццё, прывыклы, што адусюль яго штурхалі, выпраўджвалі, гналі, ён сумняваўся: ці верыць яму ва ўсё, што пачуў ад Елавікова, ці спраўдзяцца яго надзеі? Гэта ж манер у начальнікаў такі — абяцаць. Людзі ідуць, ідуць, а начальнікі ваду льюць, льюць... І ўсё застаецца як і раней. А што ўжо ён, Грышка, такога несусветнага хоча, дабівацца? «Трохі павагі, трохі ўвагі?» А навошта яму ўсё

гэта, для чаго — каб хто растлумачыў? Толькі для таго, што ён — чалавек і што ў яго душы, як ва ўсіх, жыве і точыць сум і па радасці, і па чужой жаночай ласцы, і па вялікім, проста боскім прызнанні ягоных заслуг, даражэй за якія, часам здавалася яму, няма нічога на свеце... Ёлупень ты, Грышка! Пнешся, пнешся, а дарога-то вядзе не ўверх, а ў зямлю. Жахліва, але так.

Ён пачуў за спінаю шапаток на лаўцы — там, дзе сядзелі два пузатыя дзядзькі: «Во які расчырванелы! Няйначай персанальную выбіў?» Схамянуўся, але не агледзеўся нават Грышка, пайшоў у бок аўтастанцыі.

* * *

Ад Грышкі Пруцікава пайшла ў Малінаўцы мода на «самакатах» ваду вазіць. Лічы, кожны двор займеў самакат гэты: на вёску ўсяго два калодзежы, і паспрабуй кіламетр два вядры пранесці. Іван Лукіч Шапялёў таксама зрабіў сабе вадавозку — схадзіў на трактарны стан, і яго былы вучань, які рабіў кавалёмгазазваршчыкам, сын Паўлюка Аўгіннінага, змайстрачыў яму за гадзіну. Залатыя рукі ў хлопца былі, рабіў санкі, каляскі, качэргі, вілкі, завесы, матыкі... Але чарка загубіла, па бацькавых слядах пайшоў. Таго хвароба не бярэ, а сын... Напіваўся да чорцікаў, да бясцямнасці. У нядзелю не прадавалі гарэлкі. Паехаў па вёсках на матацыкле шукаць. Там няма, там няма... Не вытрымала сэрца — і на дарозе, акурат каля могілак, зваліўся, а матацыкл яшчэ метраў пяцьдзесят бег...

Доўга не мог Іван Лукіч бітона дастаць, але шэфы з Магілёва прыязджалі буракі палоць дый пакінулі пасля сябе бітон у школьнай сталоўцы.

Валодзька ўзяў першы раз у рукі самакат, і адразу адкінула памяць назад: яны, хлапчукі, чаго толькі не рабілі: і самакаты, і канькі, і нават лыжы; гэта пазней на змену ўсё магазіннае прыйшло. А помніцца і са шчымлівасцю радасцю ўспамінаецца якраз тое, саманобнае.

Валодзька начапіў на крук бітон і выруліў з двара. Завярнуў у завулак і ўбачыў, што каля калодзежа нехта ў белай сукенцы стаіць — бы мятлушка пырхае. Бліжэй пад'ехаў — ф'юць! — Ленка Пруцікава ваду бярэ. Даўнавата не бачыў яе: сэрца аж застукала ў

грудзях. Што яму там не месціцца? Ногі хоць і абвялі, але борздка панеслі да калодзежа. Ленка круціць калаўрот ёмка, хвацка, ажно сукенка туга напінаецца на ёй: ногі то вышэй, то ніжэй адкрываюцца — загарэлыя, стройныя. І сама Ленка ўся як спружына, сіла ва ўсім целе адчуваецца.

Валодзька звярнуў, каб пераехаць на другі бок вуліцы,— бітон забразгаў вечкам на калдобінах, Ленка павярнула галаву —і вядро з рук у калодзеж выпала. Засвістала ручка, як бізун у вопытнага рамізніка, закруціўся шалёна калаўрот, не спаймаеш, так дасць у пальцы, што толькі хруснуць, як сучкі. Ленка трымала далонь высока над калаўротам, а сама не зводзіла з Валодзькі вачэй, і думкі круціліся ў галаве з шалёнасцю калаўрота. Засаромелася, відаць, шчокі чырванню наліліся, як памідоры сталі, тугія, сакавітыя.

Валодзька павітаўся. Ленка невідучымі вачыма глядзела і лавіла ручку калаўрота.

— Давай памагу,— сказаў Валодзька і, прыставіўшы да частакола свой самакат, узяўся за ручку.

Вядро чаплялася за выступы, няроўнасці кольцаў, і Валодзька круціў павольна, падпраўляў рукою ланцуг на сярэдзіну калаўрота. Звінелі, пайшлі ў пераляс на вадзе ў глыбіні кроплі, з калодзежа дыхала халадком.

З непрывычкі ледзь выцягнуў няпоўнае вядро, стаў ліць у Ленчын бітон: там было толькі палавіна; вада палілася і міма бітона на зямлю, і на босыя Ленчыны ногі, звужаныя ў пальцах, белыя, бліскучыя, як дзве ёмкія плоткі. Валодзька, сам у красоўках, збянтэжыўся, падняў вышэй вядро. Рукі не слухаліся, служылі як не свае. Ленка трымалася адной рукою за цёмнае дубовае шульца, у замасленым прарэзе якога ляжала вось калаўрота.

— Як БАМ? — спытаў Валодзька, апускаючы вядро ў калодзеж.

— Калі б не малы, яшчэ засталася б,— сказала Ленка, упершыню глянуўшы Валодзьку ў вочы.

— Спадабалася, значыць.

— Моладзі многа,— сказала Ленка такім тонам, каб было зразумела Валодзьку: гэта адна з прычын, якая яе прымусіла завербавацца на БАМ.

— Ведаеш, апошнім часам у мяне самога ёсць жаданне куды-небудзь з'ехаць... «Дороги дальней стре-

ла-а-а...» — хацеў Валодзька напець, ды Ленка засмяялася:

— Шкадаваць не будзеш?

— Калі з табою — не,— няўдалым жартам вырваліся ў Валодзькі словы.

— У мяне ж малы,— сказала Ленка, каб Валодзька часам не падумаў, быццам яна ўтойвае, што ў яе сын. Яна і праўда ўжо не саромелася, што ў яе дзіця без шлюбу, хоць спярша баялася нават паказацца з ім на вуліцу. Бо калі выносіла, кожны, хто праходзіў міма, стараўся падысці да малога, бяскрыўдна, з прыязнасцю зачапіць яго, пагладзіць па галоўцы: «Харошы хлопчык», «Вялікі расці»,— і пацмокаць языком. Хто даваў цукерку ці печанёк, хто зусім браў на рукі і чўкаў, хоць у саміх было такое дзіця і надакучыла ўжо. Такая дабрачыннасць ішла з чалавечых душ ад асаблівай шкадобы да малога дзіцяці наогул, не кажучы ўжо пра дзіця, якое не мае бацькі; гэта адно, а па-другое, такою ласкаю людзі стараліся паказаць, што не асуджаюць Ленку, што разумеюць і прымаюць яе бяду. А што вярэдзіць сэрца дзеўцы, якая ўжо і так пакарана? Цяпер Ленка паводзілася нават трошкі ганарліва і задзірыста, як баючыся знявагі.

— Няхай Міша глядзіць,— жартаўліва сказаў Валодзька, наліваючы бітон.

— У Мішы свой...

— Ужо свой? Я і не ведаў, не гаварыў ніхто...

— Два месяцы хлопчыку.

— А дзе зараз ваш Міша?

— Паехалі з татам да сватоў браць падцёлка... Міша пуню пабудаваў.

— О дае! Гаспадар-а-ар. Малайцом! Мне ён патрэбен...— Валодзька ў душы быў рады, што знайшлася гаворка з Ленкаю, што цяпер яна перакінулася на Мішу.

— Прыходзь надвечар,— запрасіла Ленка.

Валодзька наліў абодва бітоны, і Ленка пакаціла ў адзін бок, а ён у другі. Нешта засела ў Валодзькавай душы, карцела павярнуцца, глянуць услед Ленцы, але трываў, не хацеў расслабляцца перад гаворкаю з Мішам: не сумняваўся, будзе яна няпростаю, цяжкаю, бо Мішу ён трохі ведаў.

Надвечар Валодзька ўбачыў у акно, як патарахцеў

па вуліцы на трактары Пруцікаў Міша. З паўгадзінкі пачакаў і пайшоў да яго.

Міша акурат сядзеў на ганку, курыў. Чорны, як чорт, загарэлы, толькі на твары бледна-ліловыя плямкі — сляды апёкаў. Убачыў Валодзьку, устаў, захваляваўся як быццам. Пацiснулі рукі адзін аднаму. Прыселі на ганак, і Валодзька закурыў. Слова за слова — Валодзька расказаў, чаго прыйшоў. Міша тут жа нахмурыўся, нос адвярнуў:

— Ніякага кіна не трэба.

Але Валодзьку таксама не возьмеш за рубель дваццаць, цяміць тое-сёе ў псіхалогіі.

— Ну, не дзеля фільма, так давай прагуляемся, на пагон, да азерца сходзім... Успомнім, як коней пасвілі, ездзілі на іх.

Міша ўздыхнуў, абцасам раздушыў недакурак. Пайшлі яны гародам у напрамку пагона. Быў ціхі, мяккі вечар, адзін з тых, што бываюць толькі ў чэрвені, калі траскучыя навальнічныя дні змяняюцца яснымі, цёплымі, духмянымі, калі ўсё зялёнае расце дружна, як бы ўзахапкі.

Азерца ляжала спакойнае і роўнае, бы шкло, ад цішыні, што навісла над ім і, здаецца, аж звінела. Ці, можа, гэта звінела ў Валодзькі ў вушах ад таго, што напружваў памяць, узнаўляў у ёй малюнкі дзіцячых гадоў? Тады на месцы азярца была звычайная сажалка, зарослая «пухоўкамі», як яны называлі рагоз. Валодзька бегаў з сябрамі ламаць гэтыя «пухоўкі» — рудыя дзябёлыя таўкачыкі; падсушвалі іх на чарэні, і тады з іх лёгка выскубваўся пух, гэты пух чаплялі адзін аднаму на спіны, у валасы, і ад яго доўга нельга было атрэпацца. Але — было гэта даўно, тады і пагон быў не такі — пыл, пясок ды рыцвіны,— а сапраўдная пожня, якую касілі: што ў калгас, што сабе; на ёй вяліся кучамі чмялі, цяпер іх са свечкаю не знойдзеш, патруціла хімія. Было многа гнёздаў жаўтапузкі — так называлі амялушку, якую Валодзька любіў слухаць пасля таго, як аднаго разу знайшоў у ягадах падлётка і выкарміў яго.

Цяпер замест канавы роўненькі канал з голымі берагамі, пясчаным дном, чыстаю, халоднаю крынічнаю вадою — станеш: ногі імгненна нямеюць, а холад па жылах, здаецца, падымаецца да самых кончыкаў вушэй. Во дзе загартоўка! У такой вадзе не толькі рыба

ці ўюн, а нават звычайны жук-плывунец ці п'яўка ў спячку залягуць. А раней жа ў канаве, сажалцы столькі было карасёў, уюноў — рукамі лавілі. Неяк Валодзька з каробкаю ад процівагаза прыйшоў і начэрпаў, ледзь панёс.

Цячэ, мяняецца не толькі вада, аказваецца...

Яны стаялі на беразе азярца, і Валодзька прыпамінаў, а чым дзяліўся ўслых з Мішам. Міша больш маўчаў, ён не настолькі быў апустошаны цывілізацыяй чалавек, каб хваравіта перажываць за такія дробязі, як жывуць п'яўкі ў азерцы ці не. Ён думаў пра сваё: як адчапіцца ад гэтага Валодзькі з яго «кіном».

— Не, ты скажы, ці страшна табе было? — ужо каторы раз пытаўся той.

Міша маўчаў, як вады ў рот набраў з азерца, і цішыня аглушала. Па небе плыла з-за лесу невялікая круглая папялова-ружаватая хмара. Ад таго, што ішла процi сонца, яна гусцела з кожнаю хвілінаю, і ўсё болей ды болей налівалася ў ёй пагроза кароткага, але дужага, яркага дажджу.

«Ці страшна?..— хмыкаў у душы Міша.— Прычапіўся: раскажы ды раскажы пра пажар...»

— А скажы, ну чаму ты... што цябе штурхнула? — разумеў Валодзька, што пытае казённымі, сухімі словамі, якія, бадай, і незразумелыя да канца Мішу, і ўсё роўна не мог спыніць сябе: яму хацелася пачуць ад Мішы нешта такое, што можна было б потым уставіць у сцэнарый.

— Слухай, Валодзька, не дуры галавы! — Міша сплюнуў пад ногі недакурак.— А то мяне, ведаеш, доўга ўгаворваць не трэба: раз, два — і сыграю ў косці.

— Ну ўсё-такі.

— А я не думаў, што мяне штурхала! Што робіцца, тое і робіцца. Значыць, так трэба.— Міша глянуў незадаволена на Валодзьку. Бляск вады адбіўся ў ягоных вачах, і яны ззялі густым, цёмным бляскам, акурат рудыя гузікі на механізатарскай куртачцы, што вісела наапашкі на ім.

— Ну, подзвіг жа...

— Стукну, чэсна кажу, стукну!

— Ну хіба не подзвіг? — не здаваўся Валодзька.— Другі на тваім месцы, можа, кінуў бы ўсё ды сваю шкуру ратаваць... У агонь бы не палез. Усё-ткі нешта кіравала табою?

— А чаму я павінен быў думаць, што мною кіравала?

— Ну як жа!.. Чалавек так сабе не будзе рызыкаваць жыццём. У імя мэты будзе. Яна ім і кіруе, няхай у падсвядомасці...— Валодзька выводзіў Мішу на правільныя словы.

— Дзіўна мне! Падсвядомасць нейкую прыплёў...

— Добра, няхай не думаў у той момант, як кідаўся тушыць. А тады... ужо ў бальніцы, пра што думаў?

Міша першы раз за гэтую нялёгкую для яго размову ўсміхнуўся, неяк стрымана, суха, акурат баяўся выпусціць усмешку і загнаў яе глыбей у сябе, як заганяюць пад ногаць стрэмку зусім не чуючы болю.

— Пра любоў.

— Да зямлі?

Міша не ўтрываў, звонка рассмяяўся.

— Сур'ёзнае дзела, і давай, браце, па-сур'ёзнаму,— ужо раззлаваўся не на жарт Валодзька.

— З-за вас, сур'ёзных, няма праступу простаму чалавеку. З газеты ўжо прыязджалі, чапляліся... Думаў...— Міша ўздыхнуў.— Думаў! Што не ўратаваў я АВМ — во пра што думаў!..

Ластаўка праляцела нізка над азерцам, чыркнула грудкаю па шкляной вадзе, патрывожыла яе, пусціла ў бакі «стрэлы».

— Усё-ткі ж думаў.

— Думаў!

— А чаму?

— Маць з атцом мяне так выхавалі, разумееш? — Міша дзёрзка паглядзеў у вочы Валодзьку, той ажно сцяўся.— Што робіцца, тое і робіцца.

Цікава, падумаў Валодзька, падмеціўшы, што Міша другі раз паўтарыў фразу: «Што робіцца, тое і робіцца». Калі разабрацца, дык гэта свая філасофія. Тут, канечне, важна: што робіцца. Ва ўсякім разе, гэтая філасофія не адымае натуральнасці чалавечых паводзін, натуральнасці жыцця, яна пазбаўлена фальшу. Бо ёсць жа людзі, якія ідуць і жывуць проці сваёй сутнасці, маскіруючыся, і адно таму, што так загадвае розум. Трыумф розуму — гэта добра, але высокі палёт розуму яшчэ не заўсёды азначае высокі палёт духу. Валодзька, ударыўшыся ў высокія матэрыі, зусім забыўся пра Мішу, які стаяў побач і глядзеў удалеч.

Раптам з таго краю азерца нахапіўся мацнаваты

вецер, пахіліў асаку, прычасаў яе, і яна заблішчала, узялася сівенькаю зыркасцю, як ураз выліняла ўсё роўна. І хмарка ўжо навісла над галовамі, пагнала разам з ветрам рабізну па вадзе, і азерца перастала быць падобным на шкло, а хутчэй на лапік узаранага і пaскароджанага чарназёму. Толькі падумаў так Міша, як пайшоў дождж, зашумеў па вадзе, бы сухі авёс з парванага мяшка.

— Уцякаем? — Валодзька, не вымаючы з рукавоў рук, нацягнуў на галаву джэмпер.

— Зараз пройдзе...

І праўда, хутка дождж пацішэў, злёг вецер, толькі падалі рэдкія кроплі. Азерца зноў стала гладзенькае, бы шкло, і было відаць, як кроплі малявалі на ім кругі. Кропля — і круг. Кропля — і круг... Кругі расплываліся па ціхай вадзе, быццам запісвалі на пласцінку нейкую сваю, незямную, музыку. Музыка гэтая патанала недзе ў глыбіні вады. Во каб агучыць неяк яе, раптам падумалася Валодзьку, які ўсё яшчэ быў у палоне фантазёрства, і на душы ў яго стала незвычайна лёгка і да тужлівасці хораша.

Дождж зусім перастаў, і вецер пабег гуляць кудысь далёка за вёску, у глухі, цёмны лес, аж за Панітоўшчыну.

Зноў стала ціха, але толькі на імгненне. З куста лазы зацокалі ў ваду кроплі; па тоненькіх жалабках асакі пабегла серабрыстая нітка, на закручаных канцах асачын яна «плавілася» і капала ў ваду. Мабыць, каб сагрэцца, хутчэй абсохнуць, ярасна зацыкаталі ў траве конікі. Паднялася і трывожна (як заўсёды) кігікнула кнігаўка, незвычайна белая ў надвячэрнім астуджаным дажджом паветры, у мяккіх промнях залатога сонца. У гэтае гукавое ажыўленне ўнёс сваю траскучую ноту і трактар на бульбяным полі. Гукі змяшаліся, паплылі па наваколлі, і Валодзьку ўжо здавалася, што гэта і ёсць тая музыка, запісаная на ціхай вадзе дажджом, якую так хацелася яму разгадаць, агучыць і якая гэтак лашчыць слых і душу, з такою лёгкаю прастатою, якая можа быць толькі ў сне...

Ён засумаваў у горадзе па такой музыцы, простай, шчырай, натуральнай, там адурылі-аглушылі траскучабарабанныя ўдарнікі і звон струн, усякія джазы і рок-н-ролы; напачатку як быццам і падабалася іх слухаць, нават здавалася, яны ўзбагачаюць душу, а потым, асаб-

ліва як пачала рушыцца сям'я, раздражняла, стамляла, і ад яе хацелася збегчы куды-небудзь у глухую зялёную заціш. І цяпер Валодзька быў у гэтай заціішы і ледзь не фізічна адчуваў, як гаючыя пахі, гукі, колеры ўліваюцца ў яго звярэджаную душу, як любы яму становіцца свет, і сам ён у ім не здаецца абузаю, і час не пакутліва цягнецца, а ляціць на хуткіх крылах імклівай кнігаўкі-чайкі.

Каб гэтую музыку раз і другі (асабліва ў дзяцінстве) паслухала жонка, можа б, і яна змянілася ды задумалася, можа б, і ў яе душы абудзіліся чыстыя, светлыя парыванні, што так неабходныя чалавеку, каб не даць забранзавець душы ў чарапашым панцыры эгаізму, трымаць яе калі не ў вострай чуйнасці да чужога гора, то хоць бы ў чысціні звычайнай прыстойнасці. Але жонкі ў вёску не зацягнуць: нудна там, кажа. Як прыпамінае Валодзька, толькі раз яна і ездзіла з ім у адпачынак да яго бацькоў, недзе на пачатку сумеснага жыцця. Смяяліся потым суседзі, Паўлюк кінуў калючку: «Выкачала нявестка ўсю траву ў Шапялёва на гародзе». Гэта — яна загарала. Не, каб памагчы свякрусе, тую ж бульбу паматычыць, жукоў абабраць. Памкнулася была разам з ім дровы з балота выносіць, але за другім паленам кінула, куст маліны аб'ела і назад дахаты пайшла. Маўчаў бацька, маўчала маці, нічога не гаварылі Валодзьку, але можна было ўявіць, як спачувалі яны ў душы сыну. Ды што зробіш? Так яна выхавалася ў сям'і, дзе маліліся не на кнігі, а на рэчы.

Эх, не хочацца больш кроіць сваю душу сярод такой прыгажосці, лагоды, спакою! Махнуў Валодзька рукою на свае беды, лепей з Мішам размову да толку давесці.

— Ну, дык мы прыедзем да цябе... здымаць,— сказаў ён, як бы сцвярджаючы, але ж відаць было, што і пытае дазволу ў Мішы.

— Не трэба.

— Як не трэба? Усюды ўжо ўсё дамоўлена, узгоднена.

— Глядзі, Валодзька, каб не падвёў цябе,— не то прыгразіў, не то папярэдзіў Міша. Падышоў да вады, зачэрпнуў цэлыя прыгаршчы, выліў на бераг: на пяску затрапятаўся апалонік, наклейваў празрыста-студзяністы хвост на сваё пукатае, як арэх, мяккае серабрыстае брушка.

— Укінь назад, няхай не мучаецца,— сказаў Валодзька, і Міша паглядзеў на яго здзіўленымі вачыма. Узяў апалоніка за хвосцік і асцярожна апусціў у ваду галавою ўніз.

* * *

Зажыў Грышка, што і казаць: куды ні сунуцца, у лес ці ў бес, дык араваю — Міша з Лідаю, Ленка... А то ж было сам усё ды сам, ну Лісаветку калі-нікалі за сабою цягнуў. А калі шанцуе, тады ва ўсім шанцуе. Як пастарэў Грышка, з Глубкі перабраўся ў Максімаўскае балота. Там стаў выбіваць асаку, падалешнік, вятроўнік, бусельнік, адным словам, усё балотнае засілле. Глядзіш, стажкі тры-чатыры і паставіш. Нізіну на сядзібе — край, што ад канавы,— цімафееўкаю засеяў: бульба ўсё роўна, лічы, кожны год вымакае, а калі ўжо дажджы, як летась, то і гаварыць няма чаго. Бульба што, бульбы на такую сям'ю з ліхвою, а яшчэ Мішу даў калгас пяцьдзесят сотак: хоць у футбол гуляй. З сенам — от! — заўсёды загваздка. Хоць бы ў тым балоце, накосіць Грышка капу якую і дрыжыць, баіцца, каб старшыня не даў каманды ў калгас забраць ці... Было аднаго разу, яшчэ пры Родчанку. Стажок Грышка склаў, попаўзнямі прыціснуў, альховымі галінкамі закідаў: няхай, думае, стаіць да маразоў. Вартаўнік калгасны, Паўлюк Аўгіннін, асачыў, увёў Родчанку ў вушы. Той сам на грузавой машыне прыехаў забіраць. Грышка загрудкі: «Ета сена нічэйнае! Яго тута ніхто не косіць, усё роўна прападае...» Родчанка, доўга не думаючы, запалку чырк — і на стажок. Дзве мінуты — і попел вецер развеяў. Попел развеяўся, але не развеялася Грышкава крыўда на Паўлюка: свой жа чалавек, малінавец, а подласць такую... Выслужыцца хацеў, гад! Ды на вайне за такія штучкі я б цябе...

А Ягорыч здзівіў. Свет здзівіў, не тое што Грышку. І гэта ўжо не шанцунак, а цэлае шчасце. Выклікае Грышку ў праўленне ўчора раніцаю: «Як жыццё-быццё, Мацвеевіч?» — «Ды так, жывём — хлеб жуём, як гаворыцца»,— адказвае Грышка. Ягорыч вясёлы, смяецца — шчокі надзімаюцца, як пузыры. Чысты хамячок з жытам за шчокамі! Грэх вялікі, канечне, на душу Грышка ўзяў: старшыню з хамячком параўнаў, але надта ж весела на сэрцы стала. «Сена як вам да-

ецца, Мацвеевіч?» — пад канец Ягорыч пытае. Што гарод гарадзіць, падумаў Грышка і сказаў усю праўду: «Ой, не кажыце, Ягорыч! Убійства! Як ужо мне сена ета даецца...» — «На Тым Баку мы вам, як ветэрану, паўгектара выдзелілі».

Прыляцеў Грышка з канторы, месца сабе не знаходзіць, слова вымавіць не можа. Бачыць Лісаветка: ад радасці. Цвеліцца сваім вострым чорным вокам, як каліна гарaць яе шчокі.

— Што з табою, Грышута?

— Уважыў! Старшыня ўважыў, сена даў!..

— Ха! А я думала, ён цябе на банкет запрасіў!..— пырснула Лісаветка смехам, ды хутка ў жменю яго сабрала, бо глянуў на яе Грышка грозным, як у цара, вокам:

— Ты мне смешачкі кінь! Такое дзела... Во што!

— Дзе далёка? — ужо сур'ёзным голасам спытала Лісаветка: заклапаціла яе, ці трэба ногі біць. На сваё сена, на «працэнты» калгас звычайна машыну не дае.

— На Тым Баку!

— На Тым Баку...— не то перапытала, не то сказала ўжо з ацэнкаю Лісаветка.

Тым Бокам у Малінаўцы называлі луг за Сажом, каб трапіць на яго — трэба пераплываць рэчку.

Закруцілася карусель — нядзелі дачакацца не маглі. Грышка з Мішам узялі косы, «бабы» — Лісаветка з Ленкаю — граблі. Наладавалі харчам сумку, у бітончык налілі халоднай калодзежнай вады. Можна, канечне, і з Сажа папіць, але не той цяпер Сож, і на водмелі, бывае, дна не ўвідзіш — муць. Во табе і самая чыстая рака Еўропы!

Ва ўсіх зубы, вочы блішчаць — настрой, як у цырку. І толькі Ленка — сумная, туга ў вачах плавае.

— Можа, хворая? — спытала ў яе Лісаветка.— Дык заставайся ў хаце з малым, а Ліда няхай пройдзе з намі...

— Не, мама,— сказала Ленка, так і не растлумачыўшы, што з ёю, толькі не была б з цыганскага племені Лісаветка: як тут скеміла, па мужчыну марнее дачка. Шапялёвага гэтага, мабыць, ніяк з галавы не выкіне. Ты глядзі, як яно з малых гадоў усё вядзецца.

Ленка была ў сіняй сукенцы, абсыпанай рудзенькімі кветачкамі з трыма пялёсткамі, і каса на ўсю спіну, хоць ты сена ёю ўвязвай. Нагу ставіць — зямля

дрыжыць, на корань спатыкнулася — іскры пасыпаліся. Ідучы ўслед за дачкою, Лісаветка любавалася ёю, а да сэрца падкочвалася не радасць, а шкадаванне: не зладзіла сям'і Ленка — такая дзеўка! А што, хіба Валодзька Шапялёў благі хлопец? І з твару нябрыдкі, і вучоны... А таксама, кажуць, дрэнна з жонкаю жыве. А дрэнная сям'я — няшчасце большае, чым адзінота. Па сваіх бацьку і маці ведае: грызліся колькі і жылі, той сваё, тая сваё...

Дарога-пятлянка, як не па-гаспадарску кінутая вяроўка, ляжала праз лес. Якая любата прайсціся па халадку, у цяні сосен, удыхаць густую, смалістую духмянасць лясных красак, жывіцы, ягад. Грыбы, грыбны водар як галаву кружыць! Вясковаму чалавеку, канечне, гэтай прыгажосцю няма калі захапляцца, у касавіцу і пагатоў: кожная хвіліна дарагая. Дачнікі як прыязджаюць з Масквы, Ленінграда, Кіева, дык усё цмокаюць языкамі: ах, ох, любата, улонне!..

З лесу выйшлі адразу на вёску, маленькую вёсачку, двароў на пятнаццаць. І назва дзіўная — Самадумка: даўным-даўно, яшчэ пры панах, яе заснавалі людзі па сваёй волі, без дазволу ўлад. А за вёсачкаю — Сож, толькі трэба спусціцца з крутога берага, па шырокім пясчаным рове.

На вадзе прывязаныя ланцугамі да ўкапаных у бераг таўстых слупкоў зыбаліся лодкі. Іх шмат, лічы, кожны двор мае. Але перавозіць цераз Сож звычайна адзін чалавек — аднаногі мужчына-бабыль, яго называюць Штатным, бо калгас наймае яго за плату.

Сонечная, шырокая, імклівая плынь у Сажы, з зеленаватаю падсветкаю. Міша глядзіць і жмурыцца. Яны чакаюць, пакуль прыплыве з таго берага перавозчык. Пра яго ўсякае кажуць: адны — што яму адбіла нагу ў партызанах, другія — што немцам рыбу глушыў, ды шашка выкаўзнулася з рук. А толкам ніхто і не ведае ці, можа, проста не хоча ведаць: загадкі-загадкі, як гэта, лічы, з кожным бывае, хто хоць трохі пажыў на свеце.

Лодка тыцкаецца носам у бераг, напалавіну ўзлазіць на пясок. Перавозчык зарос рудымі, як восеньскі дубовы ліст, валасамі, адны вочы блішчаць, а барада заўсёды акуратна падстрыжаная. Жанчыны ступаюць у лодку, і яна калышацца, як начоўкі на арэлях. Да-

лоні ў перавозчыка шырокія, аблапістыя, грабе вяслом — лодка ляціць, як птушка.

Ленка апусціла за борт руку — вада ўдарыла ў пальцы, туга, як вяроўкаю ўсё роўна.

Па лузе ўжо рассыпаліся касцы, шукаюць свае палосы, галёкаюць, махаюць рукамі.

— Пазнавата выбраліся мы сваім табарам! — пакруціў галавою Грышка.

— Паспе-е-ем!..— супакоіла Лісаветка.— Трэба легкавічку купляць... як людзі. Сеў і паехаў.

Грышка як не пачуў, нахіліўся над галінкаю з завялымі лісцікамі, што тырчала з травы, вырваў яе.

— На-ка, сын, прачытай, без акуляраў не бачу.

На саструганай мецінцы хімічным алоўкам было напісана: «Пруцікаў Р. М.»

— Наша,— сказаў Міша і памахаў рукою маці і Ленцы, якія адсталі і пра нешта між сабою перашэптваліся.

— Дай-ка хустку,— сказаў Грышка Лісаветцы. Тая неахвотна зняла з галавы белую хусцінку. Грышка ўзяў яе, наматаў на граблі.— Ідзі, Міша, на той канец і кіруй мною...

Міша ведае: бацька хоча адвесці «след» з правага боку, з левага Чубатчышын Ляксей ужо адвёў і адкасіў.

Грышка пачакаў, пакуль Міша зайшоў на той канец паласы і паставіў граблі. Цэлячыся на іх, Грышка пайшоў, ледзь соўгаючы па траве нагамі, быццам шукаў упоцемку грыбы: ззаду заставалася сцежачка-след, яна і раздзяляла палосы. Бывае, што трапіцца скваплены сусед, тады ўсчынаецца сварка з-за гэтага «следу»: ты маю траву закасіў, ты маю. Быццам і праўда набярэш сена з таго «следу». Смех...

Адвялі «след». Міша скінуў з сябе кашулю, майку, узяў у рукі касу. Махнуў ёю. Дужае, моцнае ў хлопца цела, вузлы мышцаў так і заварушыліся, бы змеі, пад скураю. Толькі вось сляды апёкаў — як намуліны на скуры, быццам Міша доўга ляжаў на траве і ўстаў.

Косы ўжо звінелі-спявалі на ўсе лады, і ў іх хор далучыліся яшчэ дзве мелодыі — Грышкава і Мішава. Парванай струною дзвынкалі каля вуха злыя, патрывожаныя галодныя чмялі.

Раскідвальніцам пакуль што не было чаго рабіць, і Лісаветка пайшла да гурту баб, якія нешта ажыўле-

на абмяркоўвалі, як потым выявілася: Мар'я Чубатчышына скардзілася, што ў іх на паласе азярына, а камісія і пядзі не набавіла, «ета несправядліва».

Ленка колькі часу панаглядала, як бацька з Мішам косяць: даўжэюць за імі пакосы, высокія, калматыя, бы той мядзведзь у тайзе, на якога напаролася Ленка са сваім кавалерам, калі пайшлі гуляць далёка ад лагера. На скошаным залацістымі шлейкамі блішчаць дарожкі ад ног — акурат сляды ад палазоў узімку. Косы ў руках мужчын ходзяць лёгка, хвацка, але, ведае Ленка, гэта адно так здаецца: цяжэйшай работы, чым касьба, наўрад ці знойдзеш, пасля яе ўсё баліць. На БАМе што ні рабіла — капала, рэйкі, шпалы насіла, раствор мяшала, і стома, здаецца, не вельмі брала яе, а ўзялася аднаго разу за касу, як на хату прайшла пакос — назаўтра ні рукой ні нагой паварушыць не магла.

Успамін пра БАМ яшчэ болей згусціў тугу на сэрцы. Паверыла яна Трышчанку, майстру з іх брыгады, штодня ў каханні кляўся, на каленях стаяў, замуж усё абяцаў узяць, а як дайшло да... адным словам, зацяжарала яна — адразу ў кусты, балазе іх у тайзе хапае. А ён, гэты Трышчанка, прайдзісветам аказаўся, яшчэ адна дзяўчына клюнула на яго салодкія слоўцы, потым раўла, як бялуга тая ў Амуры. Праўда, і ён паплаціўся, вытурылі яго з майстроў, пайшоў ломам мярзлячча дзяўбаць. Ды Ленцы ад гэтага не лягчэй. Куды цяпер, да каго?

Каб не труціць душы бацьку і маці сваёй змаркатнеласцю, Ленка пайшла з вачэй. Дзе-небудзь у ціхім месцы, за кустамі пасядзіць, пагаруе, можа, і праясніцца ў яе на душы. Яна ўзяла з пакосу сцябліну лугавой чымы і, накручваючы на палец яе вусік, падалася да Сажа.

Ужо як бліснула скрозь прыбярэжны лазняк рака, згледзела на беразе чалавека: здаецца, ён лавіў рыбу. Набліжаючыся, думала, куды лепей звярнуць, управа ці налева, і раптам пазнала чалавека, гэта быў Іван Лукіч Шапялёў. Сорамна ўсё-такі абмінаць свайго настаўніка, і яна падышла. Ён не рыбу лавіў, а выграбаў шуфлем з затокі глей і нешта ў ім шукаў.

— О-о, Лена Пруцікава! — абрадаваўся ён.— Можа, скупнуцца хочаш, а я затоку заняў? Тут вада цёплая, што ў лазні...

— Ды не, Іван Лукіч! — зачырванелася Ленка.— Проста гуляю...

— А-а, самы раз, пакуль не накасілі вашыя касцы,— сказаў Іван Лукіч і падняў вышэй на макаўку саламяны брыль. Быў ён у сіняй безрукаўцы, цёмных штанах, калашыны якіх былі закасаныя да калень; на пяску стаялі чаравікі, з іх тырчалі шэрыя шкарпэткі. Па-вясковаму загарэлы, але той жа час і з яснаю далікатнасцю ў твары, якая сведчыла пра яго інтэлігентнасць, а можа, яснасць гэтая ішла ад позірку вачэй — пранікліўвага, адкрытага і лагоднага — і ад думак, што знаходзілі заўсёды нечаканы паварот і гумарыстычнае адценне.

— Там мама засталася...— Ленка сышла на пясок.

— Малайцы, усе разам, як мурашкі! А нам жа, настаўнікам, сена не даюць, дык я во...— паказаў шуфлем на глей.— Прынаду рыбу лавіць шукаю.— Прысеў на кукішкі, стаў рукамі разграбаць фіялетавы глей. Чаго толькі ў ім не было: і тонкія, як ніткі, рудыя чарвякі, і скручаныя ў бараноў рог смаўжы, і зеленаватыя крохкія ракавінкі, і жоўценькія, бліскучыя сліняўкі, якія дрыгалі ножкамі і скакалі, бы конікі ў траве, і нават «скарпіёны» — плоскія, на даўгіх нагах вадзяныя павукі... Але ўся гэтая ўсячына не цікавіла Івана Лукіча, ён ці то не звяртаў на яе ўвагі, ці то кідаў назад у ваду. Шукаў у глеі нешта такое, да чаго трэба пільна прыглядацца.— У нас неяк прывыклі лавіць толькі на дажджавога чарвяка, а людзі на ўсё ўмеюць: хлеб, пярлоўка, гарох, рачынае мяса, птушыныя кішкі... На матыля ловяць. Гэта я матыля і шукаю... Хадзі паглядзі во! — Іван Лукіч і тут, за такім, здавалася б, дробязным заняткам заставаўся настаўнікам. Толькі цяпер Ленка заўважыла на беразе паўлітровы слоік — на дне быццам малінавае варэнне. Яна ступіла яшчэ два крокі, сагнулася: у слоіку варушыліся маленькія ярка-чырвоныя чарвякі з чорнымі галоўкамі і чорнымі ножкамі.

— У спякоту на чарвяка брацца не хоча, а на матыля клюе,— Іван Лукіч ступіў у ваду, паставіўшы тарцом шуфель, пацягнуў яго па дне да сябе.— Гэта Валодзя мой нядаўна прыязджаў... да Мішы вашага, дык параіў мне.

— Во, трэба будзе і сваім сказаць,— падхапіла Ленка.

— Скажы. Міша ж рыбак... А можа, Валодзя з ім падзяліўся ўжо? Казаў, у іх у Мінску ледзь не ўсё Камсамольскае возера выграблі, шукаючы гэтых матылёў. Некаторыя... забулдоны ўсякія, прадаюць, запалкавы карабок — рубель.

Валодзя... Валодзя... Ленка адчула, як прыліло ў душу цяпло, стала ясна ў вачах, і вада, здаецца, у Сажы пасвятлела. А можа, і не таму, што пра Валодзьку гаворка тут была. Можа, сустрэча з настаўнікам падвесяліла Ленку, засланіла сабою ўсе нягоды і маркоты: Іван Лукіч ветлівы, добры, гасцінны, з ім заўсёды і проста, і прыемна. Нездарма ж яна, Ленка, калісь, яшчэ школьніцаю, жарцікі строіла: «Ні ў жысць мяне не возьме ваш Валодзька, а я хоць зараз згодна за яго замуж...» Журба адпала, і Ленцы зноў жартаваць хочацца, сказаць што-небудзь гарэзлівае, але ж не дзіця яна ўжо, і Іван Лукіч не на падпітку, а то б спыталася, ці будзе ён, Іван Лукіч, цяпер сватаць яе сыну. Զароіліся думкі вакол гэтага жарту, і Ленка, каб часам у запале не ляпнуць чаго лішняга, падумала, што лепш пайсці.

— Ну не буду вам замінаць, пайду...

— Што ты, Лена! З табою, наадварот, весела заўсёды.

Ні цені незадаволенасці ці насцярожанасці нейкай не ўбачыла Ленка ў паводзінах, словах Івана Лукіча, наўпярок, прыязнасць, адкрытасць, і гэта яшчэ больш вяртала яе думкі да Валодзькі, да іх сустрэчы каля калодзежа. У яе, канечне, тады сэрца апала, затрапятала, як злоўленая ў сіло сініца, і ажно праз усю ноч стаяў перад вачыма Валодзька, яго пальцы на тонкай восілцы вядра...

Яна ішла каля самай вады і глядзела задуменнымі вачыма на шырокае, круглае, як блінцы, лісце гарлачыкаў: спакойна ляжыць, не варухнецца, як прыліпла ўсё роўна. І думка пра Валодзьку прыліпла да яе гэтаксама, не адагнаць, не адбіцца. Нельга нічога з сабою зрабіць, хоць плач. «Дурніца, дурніца нейкая! Што тут скажаш...» — бэсціла сябе Ленка, адчуваючы, як мутнее яе позірк, быццам яна ўваходзіць у ваду...

* * *

Аўтобус быў маленькі, куртаты, аранжавага колеру, на баку яго — ніжэй вокнаў — белымі, трохі прыпудранымі пылам літарамі напісана: К І Н О. Аўтобус акружылі вясковыя хлапчукі, і Ляксееў Жэнька тут жа правёў пальцам палоску, якая перакрэсліла ўсе літары, выявіўшы ярчэй і белую, і аранжавую фарбы.

Пярэднія дзверы з рыпам, як бы нехаця, расчыніліся, і з аўтобуса па праву гаспадара першы выйшаў Валодзька Шапялёў. За ім барадаты дзяцюк у вузенькіх пакамечаных штанах-дудачках і белай сплюшчанай з брыльком кепцы. Пакуль хлапчукі разглядалі іх, не заўважылі, як выйшлі з аўтобуса астатнія. Нізенькі, круглатвары, як памідор, лысаваценькі мужчына з маленькімі шэрымі вочкамі, якія ўмелі шустра бегаць па баках і імгненна спыняцца, як застываць. Другі чалавек быў ганарыстага выгляду, спакойна-развязны ў рухах, нягледзячы на маладжавы ўзрост, ужо сівы. Хлапчукі адразу і ахрысцілі іх: Памідор і Сівы Дзед. І мы з дазволу хлапчукоў так будзем называць іх, чаргуючы Сівога Дзеда з рэжысёрам, а Памідора — з дырэктарам фільма. Апошні мог бы і не быць, не ехаць у такую далеч, але вельмі любіў вясковыя стравы і не мог перасіліць спакусы іх адведаць, бо як і многія нашы сучаснікі, ужо даўно трапіў пад абладу абжорства. Белая Шапачка, што вылезла з аўтобуса ўслед за Валодзькам Шапялёвым, павінна была здымаць і называлася інакш — апаратарам.

Іван Лукіч Шапялёў ведаў, калі прыедуць кіношнікі, і падрыхтаваўся да сустрэчы. Ён адчыніў шырока вароты, паказваючы, што аўтобус можна загнаць і на двор; павітаўся з кожным за руку — інтэлігент, ён і ёсць інтэлігент, у чыстай светлай кашулі, адпрасаваных штанах (на рэмені), у туфлях па апошняй модзе — з вузенькім носам і на высокім абцасе.

— Заходзьце, таварышы, у хату,— запрасіў ён гасцей, звяртаючыся да Памідора, па інтуіцыі адчуўшы, што гэта — галоўны.

Валодзька першы ступіў за бацькам, паказваючы астатнім, што не трэба марудзіць, муляцца і скоўваць сябе: як кажуць, свае людзі. Госці, праўда, і не думалі таптацца, дружна, як гусяняты, пайшлі ўслед.

— Во памыйцеся з дарогі,— паказаў Іван Лукіч на

рукамыйнік, што віссў на дубовым слупку, які падпіраў невысокую стрэшку; тут жа на табурэце стаяла вядро з вадою, ляжала ў мыльніцы мыла; махровы зялёны ручнік вісеў на рагу сталюгі.

Госці няспешна памыліся, прычасаліся, а Памідор толькі прыгладзіў далонню каля вушэй рэдзенькія цямнявыя валасы.

Валодзька пацалаваўся з маці, яна ставіла на стол талеркі, здаецца, ці не ўпершыню нейк востра, балюча ўбачыў, што ў маці пасівелі валасы, памаршчынеў твар і глыбей пад лоб схаваліся вочы.

— Добры дзень у хату! — загрукалі госці каля парога нагамі.

— Не разувайцеся, не трэба,— сказаў Іван Лукіч.— У нас тут не наразуваешся, сто разоў выйдзеш за дзень з хаты.

Селі за стол — раскладны, таму і даўгі, як састаўленыя два звычайныя сталы.

— Як бываю ў вёсцы, самая лепшая яда мая — тваражок,— сказаў Памідор, зачэрпваючы лыжкаю з вялікай місы тварог; на мезеным пальцы ў яго бліскаў залаты пярсцёнак-пячатка.— Што за цуд, гэты тваражок! А калі яшчэ са смятанкаю ды з мядком...

— Ешце, ешце, такога дабра ў нас хапае,— засмяялася гаспадыня, Марыя Піліпаўна: у яе гладка, да бляску прычасаныя русыя валасы, з якіх вылузнуты маленькія белыя круглыя вушкі.

На стале і праўда была адна смаката. У крышталёвай талерцы залітыя смятанаю свежыя гурочкі. Смажаная курыца з ружоваю падпечанаю скураю, абкладзеная долькамі салёных памідораў і зялёным гарошкам і пасыпаная кропам. Параная бульба, аблітая падсмажанаю на тлушчы зялёнаю цыбулькаю. Роўны веярок скрылікаў паляндвіцы адліваў сіняватым перламутрам, як у маладой ракавінкі. А яшчэ самаробная каўбаска, парэзаная на даўгаватыя палецы, з бліскучаю падсохлаю зверху скуркаю.

Насы гасцей дружна цягнулі ў сябе густыя, апетытныя пахі, якія на нейкі час прымусілі ўсіх за сталом маўчаць.

— Дык мы адразу пасля абеду і пачнём? — нарэшце пачаў дзелавую размову Сівы Дзед, глянуўшы на Валодзьку, які першы палажыў на пусты сподак відэлец. Не хацелася зусім есці, перасыхала ў роце.

— Дзе сёння Міша Пруцікаў, не ведаеце? — спытаў Валодзька ў бацькі і не змог стрымацца, злёгку пачырванеў: пытаў пра Мішу, а думаў пра Ленку.

— Здаецца, з раніцы сілас вазіў... Цяпер, можа, на абедзе, хаця ён на абед рэдка прыязджае.

Белая Шапачка і Сівы Дзед пераглянуліся: сцэна ёсць.

Знадворку, на ніжнім краі рамы раптам паявіліся пальцы, потым высунулася стрыжаная макаўка галавы і цікаўныя насцярожаныя вочы Ляксеева Жэнькі.

«Пайду спытаю ў яго, ён будзе ведаць»,— падумаў Валодзька і ўстаў з-за стала. Выйшаў на двор. За вёскаю трашчалі, раўлі трактары, адтуль далятаў глухі мужчынскі крык.

Каля хаты ні Жэнькі, ні каго іншага з хлапчукоў не было: ага, абманеш ты іх, пачулі, што нехта выйшаў з хаты, і бліснулі куды-небудзь, бы тыя зайцы.

— Эй, Жэнік, хадзі, значок дам! — гукнуў Валодзька, але ніхто не абазваўся, і ён павярнуў у завулак.

Вёска, аплытая крамянай, сакавітай зелянінаю, выглядала як бы прытоенаю і соннаю. Не варухнецца галінка. І ў гэтым спакоі рагачы антэн над хатамі здаліся Валодзьку дзвюма зблізканымі грудкамі вастракрылымі ластаўкамі, што раз-пораз белымі іскрынкамі мільгалі па вуліцы нізка над зямлёю.

Бліжэй, у радзе завулка, стаяла хата дзядзькі Грышкі, а ў яе за глухою сцяною, пад ліпамі,— Мішава. Нейкаю непадуладнаю сілаю Валодзьку пацягнула да ганка старой хаты, карцела, так карцела яму пабачыць Ленку зноў і сорамна было прызнавацца самому сабе, што ўвесь гэты час думкі пра Ленку не-не дый прыходзілі да яго, асабліва пасля жончыных выпадаў. Чорнаю маркотаю глянула на яго сваім вялікім вокам сабачая будка. Звычайна, пачуўшы крокі, з яе вылазіў Босы, віляў хвастом ці насцярожана бурчаў.

Валодзька не ўбачыў на гародзе цётку Лісаветку, яна абвязвала памідоры, а яна яго згледзела і, калі ён зайшоў у хату, падбегла да веранды і прыціснулася вухам да дзвярэй.

Валодзька з прыдзелка пераступіў у чыстую палову хаты. Яму насустрач ішла і прыпынілася акурат каля акна Ленка. Яна была ў лёгкім блакітным плашчы, у тапачках. Яна застыла ад нечаканасці, і Валодзька нейкі міг не мог паварушыцца, не зводзіў з яе вачэй...

«Якая яна прыгожая!..» Нешта гордае і строгае, як у маладой, набрынялай мацярынскаю сілаю аленіхі, і разам з тым пакорлівае, млявае было ў павароце галавы. Чорныя валасы, разабраныя насярэдзіне, шчытна, бы хусткаю, атулялі лоб, скроні, спадалі на шчокі, да самых плячэй, за якімі спляталіся ў таўстую і цвёрдую, як таўкач, касу. Казалі, помніцца Валодзьку, у маладосці такая каса была і ў цёткі Лісаветкі. У Ленчыных вачах убачыў Валодзька і радасць, і тугу, што выбівалася з самых зрэнак. А можа, і не туга гэта, а шкадаванне — што нешта важнае не здзейснілася, прайшло міма, праплыло, як воблака, з якога не ўпала і расінкі дажджу.

Здаецца, упершыню ўбачыў Валодзька, што Ленка — ужо не тая хутканогая, імклівая, «як шабля» (так з усмешкаю называла яе Валодзькава маці), дзяўчына, а — сталая жанчына. Адно дзіўна, што сталасць прыйшла да яе не ў строгай апратцы самаўпэўненасці, а ў лёгкай сукенцы сарамлівасці: як толькі Валодзька затрымаў на ёй позірк, яна густа зардзелася, апусціла вейкі і ногцем сашкрэбвала з цыраты чарнільную плямку.

Валодзька адчуваў, што Ленцы ў глыбіні душы ўсё ж няёмка перад ім: за сябе, за свой няўдалы паварот лёсу, за тое, што гадуе дзіця адна, і з усяго гэтага сам сабою прасіўся на язык прысуд, быццам яна і не вартая лепшай долі, пустая дрындушка, легкадумнасць якой і прывяла да такога фіналу. Можа б, хто іншы і асуджаў Ленку, кпіў з яе, дакараў, толькі не Валодзька, які таксама апынуўся на раздарожжы, калі не сказаць — на мяжы прорвы. Дый, зрэшты, не гэта стрымлівала яго, а тое, што ён спазнаў ужо, на ўласным карку адчуў: вонкавы бок жыцця чалавека не ёсць копія яго душэўных памкненняў, часам на першы погляд шчаслівы чалавек тоіць у сабе, сваёй душы невыказную трагедыю.

— Прывітанне, Лена! — сказаў Валодзька з наўмыснаю лёгкасцю ў голасе, якая заўсёды надавала размове раскаванасць.

— Здрасце! — адказала Ленка, пераплёўшы пальцы апушчаных рук, сарамліва захіталася.

— Адна? — спытаў Валодзька, хоць і зразумеў ужо, што яму, як і першы раз, не пашанцавала: Мішы няма дома.

Ленка кіўнула на спальню, і Валодзька ўбачыў, што на ложку накрытае коўдраю спіць дзіця.

— Мама на гародзе, Міша возіць сілас, а тата павёз у раён здаваць грыбы,— адразу пра ўсіх расказала Ленка, бо ведала, што Валодзька прыйшоў не да яе, і каб не падумаў ён, быццам яна вельмі радая яго прыходу.

— Як жыццё? — Валодзька не знайшоў іншага пытання, акрамя гэтага банальнага, якое страшна не любіў, калі задавалі яму, і раззлаваўся на самога сябе: «Дурань, паспрабуй сам адкажы!» — і каб выручыць Ленку, стаў гаварыць далей: — Памаленьку жывём, скажы... Я таксама кручуся: сям'я-работа, работа-сям'я...

— Каму-каму, а табе скардзіцца!..— здзівілася Ленка, падняўшы чорныя бровы, пад якімі сінела дробнымі жылкамі скура.

— Усё адносна, таварыш Лена...

Ох, як яму карцела разняволіцца, выказаць усё набалелае, надуманае, не ўтаіць і пра заяву на развод... Але стрымліваў гонар: мужчына і плачацца, ды хто — Валодзька Шапялёў. Няўжо і ў яго можа нешта не ладзіцца? Усё ж так гладка, роўна, бы па рэйках, бегла, ішло, каціласся з самага дзяцінства. Якая гэта памылка — думаць, што толькі адзін ты няшчасны!

— Жонка гарадская...— сказала Ленка, як падкусіла.— Сядай, а то я не запрашаю.

— Няма калі. Гэта ж мы ўжо прыехалі Мішу здымаць... А што да жонкі, то якая розніца, адкуль яна. Кажуць: абы чалавек добры быў, так? На жаль, пра гэта мы пачынаем думаць пасля...

— Ты гаворыш так, быццам дрэнна жывеш з жонкаю,— падобна, у голасе Ленкі скрозь іронію прабівалася калі не радасць, то задавальненне, што ён, Валодзька, прамахнуўся ў жаніцьбе. «Во, во як табе, не хацеў мяне браць!» — быццам гаварылі Ленчыны вочы ці, можа, яму адно так здавалася. Ён уздыхнуў: расказваць ці не? Яшчэ разнясе па вёсцы. Завіхурацъ плёткі... Плётак Валодзька баяўся як агню, і ён змаўчаў, не сказаў, што ў яго расклеіліся адносіны з жонкаю, перавёў гаворку на жарт:

— Бог яго ведае, у народзе кажуць: мілыя чубяцца — толькі любяцца.— Але жарт не падсаладзіў гаркоту на душы, сорамна было перад Ленкаю: бясхітрас-

ная дзяўчына, а ён круціць-муціць.— А ты, Лена, чыстая прыгажуня,— каб павініцца за сваю няшчырасць, сказаў Валодзька, разумеючы ўсю недарэчнасць сваіх слоў.

— Прыгажуня, ды ты не паглядзеў,— раптам зусім сур'ёзна, нават з крыўдаю сказала Ленка і з большаю зацятасцю зашкрэбала ногцем па цыраце.

— Яшчэ не позна паглядзець,— напаўжартам, напаўсур'ёзна сказаў Валодзька, і доўга не сыходзіла ўсмешка з яго твару, а вочы глядзелі на Ленку, шукаючы сустрэчы з яе вачыма.

— Гавары, гавары,— аж пачырванела Ленка, гэта Валодзька ўбачыў, але не мог ён пачуць, як застукала пад блакітным плаццем дзявочае сэрца.

— Ну пакуль! — развітаўся ён, адчуваючы, што яму трэба ісці, што ён не можа зараз падаць ніякай надзеі Ленцы.— Няма часу. Прыходзь на здымкі — буду рады...— Ён гаварыў і злаваў на сябе, што словы ў яго нежывыя, не свае, чутыя ад іншых.

Валодзька павярнуўся. Ленка скранулася з месца, але не пайшла праводзіць, а потым з-за фіранкі доўга глядзела Валодзьку ўслед. «А што? І прыйду!» — ад сораму, ад прыхлынутай раптоўнай тугі, упартасці, што не раз густа замешвалася ў ёй, гарачыла яе напаўцыганскую кроў, аж застукала ў патыліцу, а ў вачах запырхалі зноў тыя жоўтыя мятлушкі, што аб'явіліся ўпершыню ў радзільнай палаце...

Закрахтаў на ложку, піснуў Сярожа. З нейкаю хваравітаю апантанасцю кінулася яна да яго, баючыся, каб ён не ўпаў.

* * *

— Так-так, давай, хлопчык,— падштурхваў да трактара, да Мішы Ляксеева Жэньку Сівы Дзед.— Прасіся ў дзядзі на трактар... Во-о-о, так! Усміхайся, жмурся!

Жэнька, загарэлы, з ліловым носам, распатлачанымі белымі, як пух, валасамі, падступаўся да Мішы, але рот бы сашчаміла прышчэпкаю: не мог асмеліцца сказаць слова, баяўся, што Міша турне яго ад трактара. Так яно і было б, калі б гэта было ў звычайны дзень, а не на здымках. Мішу ўгаварылі «даць якому-небудзь мальцу патрымацца за руль», маўляў, цікавасць да

тэхнікі з дзяцінства. Калісь і праўда Міша аціраўся каля трактароў-машын. Што аціраўся, то аціраўся, і не толькі каля тэхнікі, жывую «тэхніку» любіў — коней, пругкіх, гарачых, імклівых, як вецер, як вярхушка полымя, якое рве ў комін неўтаймоўная цяга.

Міша бярэ Жэньку за падпашкі, ставіць у ажно гарачую кабіну. Жэнька ўплятаецца бруднымі рукамі за руль, круціць яго, нахіляючыся то ў адзін бок, то ў другі.

Стракоча кінакамера — Белая Шапачка прысядае, жмурыць незаслоненае акулярам вока — трасуцца вейкі,— перабягае на другі бок, цэліцца камераю ў запыленае шкло кабіны; з галавы спадае белая кепка, падае ў пясок, але аператар не зважае. Кепку падымае Памідор і стукае ёю аб калена — з яе пылу, як з порхаўкі. Рэжысёр падымае ўказальны палец: цы-с-с-с.

— Герой ляпае мальца па плячы! — падказвае Мішу Сівы Дзед.

Міша ўжо ведае, што «герой» — гэта ён. Нехаця, з кіслаю ўсмешкаю Міша штурхае Жэньку ў худы плячук.

— Смялей, натуральней! — зноў крычыць рэжысёр. Мішу ўжо абрыдла, іржою ў пячонкі ўелася гэтая «рысоўка», гульня: паўдня глумяцца. Перш здымалі яго самога за рулём у кабіне — вязе сілас. Вясёлы, радасны, усміхаецца, песенькі высвіствае... Потым, наўпярок, сумнага, паніклага, здымалі на збожжатоку, каля агрэгата вітамінная мукі, які ён ратаваў ад агню. Якраз туды і Ягорыч пад'ехаў, заступіўся за Мішу: «Што трактарыста мне мучыце?» Але ён хацеў сказаць: навошта гэтая паказуха?

І яшчэ чортведама колькі сцэн трэба: сярод аднавяскоўцаў, у сям'і, на возеры... «Ну і гад жа печаны гэты Валодзька! — злаваўся Міша.— Уламаў! Пад'ехаў, задурыў-затлуміў...»

А сонца смаліць, пясок скрозь падэшву пячэ, глядзі, засмярдзіць гума.

. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

Надвечар спякота спала. Лісце на ліпе, яблынях аж пабялела, мяккае стала, бы вата, бы валосікі на галаве ў немаўляці, бы душа беларуса. На пагоне над азерцам павісла рэдкая, белаватая плевуцінка. На ўсім ляжала стомленасць, адно конікі зацята, ядрана цвіркаталі ў

сухой, запыленай траве, і Валодзьку, які слухаў іх, здавалася, што ў яго на зубах трашчыць пясок.

— Хлопцы, ды стаміўся я!.. Якая рыба? — маліўся Міша на двары сваёй хаты.— Адстаньце. Я не магу, калі маю душу няволяць!

— Бяры-бяры,— соваў яму ў рукі вудачку Сівы Дзед.— Чаго бушуеш?

У кароткай сукенцы, якая адкрывала ёй ногі вышэй калень, стаяла крыху воддаль у цяні пад яблыняю Ленка і басаножкаю вадзіла па зямлі. Яна не саромелася кіношнікаў, прывыкла да іх яшчэ на БАМе, сама не раз красавалася перад камераю. Яна чакала, каб Валодзька зноў запрасіў яе ў кампанію. Валодзька паглядаў на яе, але, пакуль упіраўся, не хацеў ісці на рыбу Міша, ён не мог падысці да яе. І толькі Міша махнуў рукою: «Ладна, згода, пажабінякаюся вам яшчэ... Але, запомніце, апошні раз!» — Валодзька тут жа падышоў да Ленкі і, падаўшы руку, запрасіў — бы на танец. Яе чорныя вочы, абведзеныя выразнаю чорнаю рыскаю, былі вялікія, магічныя і незразумелыя.

Міша ўзяў вудачку, і ўсе пайшлі з двара. Белая Шапачка забег наперад, прысеў і пачаў здымаць Мішу на фоне хаты. Якраз у гэты момант на ганак выйшла Ліда з дзіцём на руках — у малога чысты, як месячык, твар, і такім жа, мабыць, ён будзе свяціцца з кадра як дакор грубасці і ўпартасці дарослых.

Валодзька ішоў побач з Ленкаю. Ішлі па завулку, прамою дарогаю на пагон. Валодзька не баяўся, што яго ўбачаць людзі разам з Ленкаю, абы толькі на яе не лёг цень — што прычапілася да жанатага. Людзі на язык лёгкія, раз-два, і панеслася шэраю ваўчыцаю па вёсцы плётка, злаві тады яе за хвост. Гэта ў горадзе чалавек тоне, бы ў віры, і шмат чаго з яго жыцця застаецца тайнаю. Для каго? Смех! Для суседзяў па пляцоўцы ці дзесятка чалавек з работы? Горад, можа, больш за ўсё імпанаваў, прыцягваў, вабіў Валодзьку, што ў ім можна было растварыцца, укрыцца ад стрэл людской зайздрасці, хцівасці, звычайнай разявацкай цікаўнасці. Так, слізгане хто позіркам, нешта ў табе ўгледзеўшы ці падумаўшы, што — знаёмы.

Вёска, з яе ліпучасцю да новага чалавека, цяпер Валодзьку палохала. Дзіўна, бязглузда, неразумна, але так — палохала. І ўсё роўна ён ішоў з Ленкаю, усміхаўся, трохі асцерагаючыся, каб не злякнуцца, як адне-

куль з варот ці з-за вугла пачуецца: «Цілі-цілі цеста, жаніх і нявеста...»

Азерца бліснула, заззяла абернутай крышталёвай талеркаю, у сярэдзіне якой сабраліся ў пучкі жоўтыя, зялёныя і ружаватыя, бы ад запалкі, агеньчыкі — сонца, як тоїі мяч, скакала па няроўным версе альховага балота, як бы выбіраючы лацвейшае месца, дзе апусціцца на абначоўку.

— Рабі ўсё як трэба,— гаварыў Сівы Дзед Мішу, калі яны ўсе гуртам спыніліся на беразе азерца. А камера не пераставала стракатаць-журчэць, цэлячыся выпуклым вокам то на ваду, то на мяккае, нязыркае сонца, то на чубчыкі асакі з парудзелымі вострымі і сагнутымі ў кручкі верхавінкамі.

Міша разматаў жылку, начапіў чарвяка і закінуў вудачку. Удзяўбнуў вудзільна ў мяккі, сыты чарназём.

— Не-не, у руку, у руку бяры вудачку,— Сівы Дзед замахаў крыж-накрыж рукамі: «Адставіць!»

Міша ўздыхнуў, палапаў далонямі па кішэнях — шукаў цыгарэты. І раптам крутнуўся на пятцы, бы юла.

— Не, братва! Баста! Хоць страляйце, больш нічога рабіць не буду. Знайшлі дурня!

Валодзька перапалохаўся, ён ведаў нораў Мішы: пастравіцца — не зрушыш. Чаго добрага, фільм змарнуе. Чым тады апраўдацца? Сам жа набіўся ў сцэнарысты. Сынок яго закляйміць.

— Можна мне замест яго? — Ленка, скрывіўшы маленькую прыгожую галоўку, смеючыся аднымі вачыма, падышла да Сівога Дзеда.— У мяне ўжо вопыт ёсць. З Масквы здымалі...

— Дзяўчынка, адыдзі, калі ласка! — ці то рэжысёр быў вялікі псіхолаг, ці то выпадкова ў яго вырвалася гэтае «дзяўчынка», але ён пацэліў акурат: Ленка пыхнула чырванню, быццам сонца аддало ёй усе свае фарбы, адступілася і апусціла галаву.

— Заработала! — выскаліў ва ўсмешцы белыя, аж но сіняватыя зубы Міша.— Ім палец у рот не кладзі. Людзі цёртыя!

Валодзька зрабіў выгляд, што ўсёй гэтай сцэнкі не бачыў: сагнуўшыся, вырваў з вады белаваты пруцік рагозу з шорсткім, бы «ёршык», верхам, з якога ўжо абляцеў пух. Позірк яго ўпаў на ваду на паплавок — даўгенькі пластмасавы чоўнік.

— Клюнула! — стоена прашаптаў ён.

Міша падбег да вудачкі, на міг забыўшыся, што і рыбная лоўля сёння, як і ўсё іншае, што было,— прыдуманая, бязглуздая. А Белая Шапачка наструнена, як сабака перад дзічынаю, сцярог момант: стаўшы на калена блізка каля вады, у самую твань, ён скрозь асаку здымаў Мішу, як тоїі сутаргава тузануў на сябе вудачку, потым доўга лавіў у паветры ладную трапятлівую рыбіну, аблітую чырванаватым, ясным бляскам сонечнага святла. І ў вачах у аператара гэты міг такім жа ясным сонечным святлом гарэла бязмежнае, разняволенае шчасце. Яму сёння проста шанцавала, ён быў у цудоўным настроі: выпадкова яму ўдалося зняць бусла, які апусціўся ў разлітую салярку, мабыць, зблытаўшы яе з лужынаю вады. З белага стаў чорным, «экзатычным» для гэтых краёў.

— Ёсць кадр! — аж падскочыў Сівы Дзед. Нават Памідор, які ўвесь час спакойна сядзеў на жалезнай зялёнай скрыні і курыў цыгарэту за цыгарэтаю, кідаючы на ваду недакуркі, устаў, адтатурчыў кароценькі загнуты вялікі палец: «О!»

— Та-а-ак, засталася яшчэ адна сцэна: у сям'і,— Сівы Дзед задаволена цёр шыза-ружаватыя, з белымі таўстымі сухажылінамі рукі.— Напомні, Шапялёў, што там у цябе ў сцэнарыі?

— Сям'ёю, з граблямі, віламі, ідуць на луг... сушаць, грабуць сена,— сказаў Валодзька, папрасіўшы прабачэння ў Ленкі і падышоўшы да рэжысёра.

— Ага, успомніў,— сказаў Сівы Дзед, так, што было відаць: ён не забыў, які эпізод у сцэнарыі, а проста намякаў, што сцэнарый не вельмі ўдалы і трэба прыдумаць нешта іншае.— Так-так,— ён глядзеў, не мігаючы, проста ў вочы Валодзьку.— Луг, касьба — гэта ўсё-ткі работа... Рабочыя кадры ў нас ужо ёсць, патрэбны досуг, хобі... сямейныя! Заўтра ж нядзеля.

Валодзька ў душы засмяяўся, і калі б не ведаў, што рэжысёр чалавек гарадскі, то яшчэ і пакпіў бы з яго: «Якія ў вёсцы досугі і хобі? Хадзіць на выстаўкі, у тэатр, на канцэрты, стадыён, у парк? Хобі адно, навек і для ўсіх — работа, работа...»

— Трэба падумаць,— пайшоў на выручку яму Сівы Дзед.— Але на сёння хопіць, наперадзе цэлая ноч, і мы прысвецім яе творчым пакутам і высокаму ўзлёту духу.

О, як яны, кіношнікі, умеюць гаварыць, напышліва і хвацка! Ну проста салаўі красамоўства.

Міша, які чуў гэтую іх размову, з'едліва хмыкнуў сам сабе: «Дудкі вам!» З твару ён быў вясёлы: нарэшце скончылася муштра, перасталі з ім гуляць як з лялькаю.

Валодзька ў гэты міг якраз думаў, як і рэжысёр, што, лёгшы спаць, адзін, у спакоі, перабярэ ў памяці сённяшні дзень, падрабязнасці сцэнарыя і намеціць, што рабіць заўтра, але не ведаў ён, што ніякага сну ў яго не будзе, а будуць зноў перажыванні, якія наўрад ці прысніліся б яму, стомленаму, у гэтую ноч.

* * *

Павярнулася ўсё нечакана, як і кожная хвіліна жыцця тоіць у сабе нечаканасць і нават небяспеку. Дзядзька Грышка запрасіў здымачную групу ў госці, на вячэру.

— Прыходзь і ты, Валодзя,— сказаў асобна яму, Валодзьку. Марыя Піліпаўна чула, як запрашаў Грышка, і толькі ён адышоў, сказала сыну: «Чаго ты пойдзеш?» — «Ну як, мама, чаго? За кампанію. Што падумаюць мае калегі, калі я не пайду...» Не паспелі пагаварыць — прыляцела Лісаветка і пацягнула Валодзьку: кемлівая, бы ліса, жанчына, няўжо яна нешта магла наперад прадчуваць?

Ён з цяжкасцю пазнаваў цётку Лісаветку, дзівіўся: адрасла назад жанчына. Твар падмаляваны, нарумянены, у валасах чырвоная стужка. Сама ў даўгім чорным плацці з вясёлымі белаватымі кветкамі, у светлых туфлях-лодачках. Маладзіца як царыца! А вось дзядзька Грышка ссівеў зусім.

Усе вокны новай — Мішавай — хаты свяціліся, таўстыя слупы святла рэзалі густую цемру, клаліся ў спелы бульбоўнік, на частакол, на чорны ствол ліпы, маладыя бухматалістыя яблыні, і здавалася, што хата апіраецца на зямлю; а то і зусім пойдзе зараз па зямлі, як той лунаход па Месяцы. Неба над хатаю густое, зацягнутае мутнаю малінаваю націткаю, праз якую ледзьве зырчэюць жаўтлявыя дзіцячыя кулачкі зорак, і сярод іх маладая скібачка месяца, цікаўнага, зіркастага, рахманага сузіральніка ўсёй зямлі.

З хаты на вуліцу ляцелі вясёлыя крыкі, крамяны смех, і месяц іх, канечне, не чуў, затое ён падгледзеў, як з дзвярэй на ганак выкаўзнуліся адна за другою дзве постаці — белая і чорная. У белым плацці, і толькі на спіне цёмным — закрывалі валасы,— была Ленка, а побач з ёю Валодзька. Яшчэ перад застоллем Ленка, вылучыўшы момант, з крыўдаю ў голасе сказала Валодзьку: «Твои артисты меня оскорбили...» — «Ды кінь ты! — сказаў Валодзька незадаволена, але тут жа зразумеў, з балючай бязлітаснасцю адчуў, што за гэтай дробязнай Ленчынай крыўдаю тоіцца і нераўнадушша да яго, жаданне паставіць хоць бы ў маленькую залежнасць.— Пагаворым пасля...»

Ноч была халаднаватая. Па нагах шастаў бульбоўнік. Яны ішлі па сцежцы між баразнаў. У канцы агарода пад частаколам былі складзены дровы, пра гэта сказала і вяла туды Валодзьку Ленка. І трывога, і хваляванне, і прызабытая юнацкая зухаватасць — усё разам перапаўняла яго, кіпела ў сэрцы, рабіла нерашучым і нейкім тупавата-бязглуздым.

На акораным сасновым сухастоі матава льсніліся тоненькія, бы дроцікі, палоскі, тупымі гладкімі бычынымі рожкамі выпіралі гузакі. Дровы былі цёплыя, ноч яшчэ не забрала ад іх дзённага цяпла, і Валодзька з Ленкаю сядзелі бы на чарэні печы ў маленстве, калі, адгойсаўшы паўдня на марозе, спяшаешся хутчэй адагрэць анямелыя ногі.

— Давай забудзем пра артыстаў... Ведаеш, Лена, апошнім часам я часцей і часцей успамінаю сваё дзяцінства, юнацкае жыццё тут, у вёсцы, нас з табою...— Ён павярнуў твар да Ленкі: яна глядзела на яго даверліва, з затоенаю нецярплівасцю ў вачах: «Што далей? Што далей?» — Сорамна цяпер прызнавацца, але ты падабалася мне ўжо тады. Асабліва я любіў чамусьціназіраць за табою, калі ты ездзіла на веласіпедзе. Вецер матляў тваe валасы за спінаю, і мне хацелася ўтапіць у іх свой твар. Дзіўна ўсё гэта, праўда? — Не дзіўна было Валодзьку, а прыкра — за сваю незразумелую запозненую чуллівасць і адкрытасць.— Цяпер я аналізую, свядома ўсё то было ці несвядома? Можа, кожны ў юнацкую пару на ўсё і на ўсіх глядзіць добрымі, улюбёнымі вачыма, а пасля ўжо становіцца і злым, і подлым, і зайздрослівым, і нахабным... Я тады іншы раз палохаўся гэтага свайго любавання табою. Ты бы-

ла зусім юная, пяцікласніца, здаецца... У цябе такога не было?

— Тады — не. Пазней, ужо калі ты прыязджаў з Мінска, мне так хацелася, каб ты правёў мяне з танцаў, але ты... не заўважыў мяне. Я і адзявалася модна, каб не здавацца забітаю вескаўчанкаю... джынсы, імпартная кофтачка, туфлі на шпільцы... Чапурылася!

— Ведаеш, гад я, відаць, наўмысна прытупіў, забіў у сабе тыя першыя яркія пачуцці!..

— Я бачыла... Я бачыла, што ты зусім абыякавы да мяне, і жартавала скрозь слёзы, калі Іван Лукіч сватаў мяне да цябе.

— Паверыш ці не,— Валодзька накрыў сваёй далонню Ленчыну руку, якая ляжала на бервяне,— я цяпер шкадую, што не даў развіцца пачуццю да цябе... Куды там: я — у горадзе, студэнт, яна яшчэ школьніца, без адукацыі... Які цынізм! І што перад ім — першае каханне, самая шчырая, самая тонкая чысціня пачуццяў... Я, як і ўсе мае кіношнікі, гавару, мабыць, надта цвяроза, высокімі словамі і, можа, не зусім зразумела, але да гэтага мяне прывучыла маё новае жыццё, у якім я са сваімі «ета» ды «ідзець» быў бы пастаянна мішэнню для іроній і рэплік. Мяне ў душы даварʼяцтва абурае любая фальш, падтасоўка, артысцызм... і тут я разумею Мішу вашага. Сам многае не прымаю ў кіно. Не прымаю, але нічога не магу зрабіць. Не падабаецца мне і мой сцэнарый — шаблонны, сухі, прэсны,— але я не рву яго, па ім здымаюць фільм. Я адчуваю, што ўсё маё яшчэ наперадзе, яно чакае мяне, яно ляжыць недзе ў падсвядомасці мёртвым грузам, зародкам... Ці, можа, гэта толькі так здаецца ад маёй незадаволенасці жыццём? Шчыра кажучы, я разгубіўся...— Захмелены чаркаю наліўкі за сталом, загадкаваю цішынёю вясковай ночы, блізкім Ленчыным дыханнем, усім гэтым месяцава-зоркавым ззяннем, што квола, як скрозь марлю, цадзілася на іх з недасяжнай вышыні, Валодзька разгаварыўся да канца, спавядаўся, ачышчаючы душу ад набалелага і наспрасаванага ў ёй.— Я не хачу таіць нічога і ад цябе... Я нават бацьку з маці нічога не гаварыў, а табе скажу...— Ён, змоўкшы, адчуў, як пахаладзелі Ленчыны пальцы пад яго далонню.— Я разводжуся з жонкаю.

Яе рука тузанулася і выслізнула з-пад ягонай далоні, бы рыбіна, калі яе ловіш у траве. Яна глядзела на

яго шырока адкрытымі, поўнымі жаху вачыма, быццам яе аглушылі. Але навіна гэтая не была для яе вялікай нечаканасцю, Валодзька не мог гэтага не заўважыць. Можа, маці яе, цётка Лісаветка, ужо пранюхала нешта: зямля чуткамі поўніцца, а тым болей што апошнія месяцы ні ён, Валодзька, ні жонка не хавалі свайго разладу. Лёгка расколваецца любы цурбак, нават кражасты, у параўнанні з расколам сям'і. Валодзька ведаў, колькі сілы ён забярэ, як стоміць, знервуе, а можа, і зусім загоніць у якую хваробу, і ўсё роўна наважыўся: рана ці позна трэба ставіць кропку, дык лепш цяпер, пакуль маладзейшы і здароўе моцнае. Але хоць і не быў пакуль Валодзька ў ролі разведзенага, ён добра разумеў, што яму, асабліва на першым часе, не будзе ставаць душэўнай утульнасці, спакою, добрага сну. У гэтым стрэсе патрэбна будзе нейкая апора. А што можа лепей паслужыць апораю, падняць апушчаныя крылы, як не каханне, сапраўднае, першае, хоць і прыглушанае, перацёртае ў жорнах часу? Лепей позна, чым ніколі,— калі народ сачыняў гэтую прымаўку, дык, можа, акурат і меў на ўвазе вяртанне да чыстага і яснага, у чым бы яно ні выяўлялася. Нават травінка з-пад асфальту прабіваецца, калі ў яе ёсць прага жыцця, святла. А ў кахання такая сіла!

Закалыхаўся на пагоне ў нізіне туман, пацягнуў адтуль вільготны ветрык, студзіў гарачую Валодзькаву галаву, цела скрозь лёгкую баваўняную тэніску. Ленка пахілілася да яго бліжэй, зябка сцепанула плячыма, яе востры локаць упёрся Валодзьку ў бок.

— Во не апрануў пінжака, акрылася б,— сказаў ён.

Яна з хвіліну маўчала і сказала зусім спакойным голасам, неяк залішне па-дзелавому:

— Абнімі.

Ён абняў яе за плечы. Так сядзелі доўга. Ужо ў хаце сціхла гамана, толькі на кухні гарэла святло. І над усёю вёскаю стаяла мёртвая, глухая, як у падзямеллі, цішыня. Але — дзіўнае адчуванне: нібыта ад вялікага круглага і тонкага месяца плыла незямная, малочна-туманная музыка, нейкі эфір мройлівасці, быццам нехта закінуў на неба жоўтую пласцінку, і яна грала бясконцую чуллівую песню.

— Мне так добра,— сказала Ленка ўжо летуценным голасам, гледзячы некуды ўдалеч: на пагон, на

балота, спавітае да самага верху белым укладзістым туманам.

«Няўжо ўсё так лёгка і проста можа вырашыцца?» — думаў Валодзька, яго калацілі дрыжыкі, сутарга зводзіла сківіцы — пачні гаварыць, будзеш заікацца. Ён фізічна адчуваў, які ў яго халодны кончык носа. Няўжо Ленка — гэта выратаванне, боская міласць? Няўжо яна верне яго ў той свет, у якім рос і ў якім было так утульна, радасна і бестурботна, нягледзячы на шматлікія дзіцячыя засмучэнні і непаразуменні з дарослымі, бацькам і маці? Ужо адна думка пра гэта рабіла яго шчаслівым, і ён баяўся, што нешта грубае, бязлітаснае, як вастрыё мяча, перашкодзіць яму, не дасць збыцца жаданню, адсячэ яго.

— Гэта будзе нешта незвычайнае,— сказаў Валодзька няпэўным голасам, лунаючы думкамі на самай вяршыні мар.

— Ты пра што? — не зразумела Ленка ці зрабіла выгляд, што не зразумела.

— Я думаю, што будзе, калі мы, няўдачнікі, зладзім наш новы саюз,— сказаў ён наўмысна з пафасам, каб прыдаць словам трохі жартаўлівае адценне — на выпадак, калі Ленка рэзка яму запярэчыць. Яна, можа б, і запярэчыла, калі б сама не жыла гэтаю мараю.

— Папляўкаюць, папляўкаюць людзі языкамі дый змоўкнуць,— Ленка нібыта баялася, каб ён не перадумаў ці не аб'явіў свае словы жартам.— А да каханага я па любым дзярме пайду...— надзіва суха і нечакана сказала яна.

Яны нічога не чулі, а толькі ўбачылі, разам павярнуўшы галовы, постаць — каля частакола: прыгнутую, у фуфайцы. Чалавек, бы злодзей, ціхенька шапацеў па бульбоўніку. Іх ён не бачыў.

«Міша?..» — амаль адначасна мільгнула ў іх галовах. Так, гэта быў Міша. Куды ён? Не на рыбу, хоць і ў ботах, але без вудачкі, без вядзерца.

— Міша, куды ты? — гукнула Ленка. Міша выпраміўся, на імгненне замёр, як воўк, пачуўшы стрэл, а потым ірвануў з месца так, што бульбоўнік, адрываючыся, узлятаў вышэй галавы.

— Стой! — закрычаў Валодзька, зразумеўшы, што Міша ўцякае, хаваецца ад кіношнікаў, і, саскочыўшы з гары дроў, кінуўся наперахапкі.— Стой, пагаворым! Пачакай, ну!..

Дзе там Мішу дагоніш: ён натрэніраваны, што вецер. Паляцеў да балота, і неўзабаве туман праглынуў яго, быццам і не Міша то быў, а нейкая здань.

— Маліце богу, што хоць так даўся вам зняць,— сказала Ленка, смеючыся: зубы ў святле месяца былі белыя-белыя, як прасвечаныя знутры лямпачкаю.

Калашыны ў Валодзькі абрасяніліся і холадам ліплі да ног.

— От ужо натура! — сказаў Валодзька, не то асуджаючы Мішу, не то захапляючыся ім.

— Ён не любіць у нас пахвалы,— сказала Ленка.— Змалку такі шаламшывы. Раскажа вершык — мама яму цукерку. Усё. Болей не дапросішся расказаць.

— Тут пахвала такая — заслужыў... А колькі людзей прагне і чуе пахвалу незаслужана. Хвалі, узнось, захапляйся — дэвіз веку! А сваячок у мяне...— сказаў Валодзька бадзёра, але хутка зразумеў, што перабірае меру, не варта яму ўжо так падганяць падзеі: «Сваячок...» І хоць слова гэтае Ленку аніяк не зачапіла, ён, ведучы яе дахаты, быў маўклівы, стрыманы, у душы нават трохі раздражнёны. Ці будзе трымаць Ленка ў тайне гэтую іх змову? Бо і праўда, навошта адразу пускаць чуткі, можа, яшчэ ўсё задоўжыцца? Трэба з усім разабрацца, усё абдумаць, перагаварыць з бацькамі, якія даўно бачылі, разумелі, адчувалі, што ў сына нешта не клеіцца, і, помніцца, аднаго разу маці няпэўна спытала, так і не пачуўшы ад яго тады адказу: «Ці ты гэта, сын, так усё жыццё і будзеш мучыцца?» Не горад жа і не работу яна мела на ўвазе, на якую часам наракаў ён, а жонку ягоную, але не хапіла смеласці сказаць адкрыта, бо якая маці асмеліцца разбіваць сям'ю, нават самую няўдалую, і чуць потым папрокі.

Памацнеў золакавы ветрык, суха зашумелі лісцем яблыні і ліпы. На ўсходзе пасвятлела неба, малочнаю бледнасцю высвеціла стомленыя зялёныя твары Валодзькі і Ленкі.

* * *

Яны вярталіся з суда як чужыя людзі. Размаўляць калі і хацелася, дык з нястрыманасцю. Жонка вяла за руку дачку — як сімвал сваёй перамогі, сваёй праўды. Наташа, канечне, цяпер не разумела, якое страшнае злачынства перад ёю здзейснілі яе бацькі, яна была

аднолькава радая і яму, бацьку, і маці і ўжо даўно забылася на пытанне суддзі: «Каго ты больш любіш, тату ці маму?» І адказ яе, па-дзіцячы непасрэдны і той жа час дыпламатычны і тонкі ў параўнанні з бязглуздым пытаннем: «І тату, і маму»,— быў імгненны, не скіраваны далей таго моманту, у які ёй не хацелася крыўдзіць ні бацьку, ні маці. Валодзька таксама хацеў забраць сабе дачку, але разумеў, што шанцы ў яго на яе зусім малыя: па-першае, дзяўчынка, а не хлопчык, па-другое, па старой звычцы ўсё яшчэ лічыцца, што ў сямейных неладах вінаваты мужчына, а па-трэцяе, ён, канечне, яшчэ трохі паважаў сябе і не стаў агаляць усю жончыну легкадумнасць, калі трэба было б гаварыць і пра такія рэчы, якія проста не рабілі б яму гонару і па-чалавечы не былі б зразуметыя суддзямі.

Было б кашчунна пасля таго, як дачку пакінулі пры маці, удавацца ў дробязі, дзяліць усякае пакіддзе, маёмасць, як гэта зрабіў адзін начальнік на кінастудыі, абясцэньваць сябе, сваю душу да кошту нейкага дывана ці халадзільніка. Душа нематэрыяльная, на яе не павесіш бірку «рубель дваццаць» ці «дзве тысячы сорак», уся цана ёй зусім сціплая і ў той жа час залатая: дабрата.

Жонка, трымаючы ў дрыготкіх вытанчаных пальцах пералік рэчаў, з апантанаю асалодаю, як здалося Валодзьку, называла, што яму, што ёй. З дзяцінства ўспомнілася Валодзьку сцэнка, як дзялілі яны, хлапчукі, налоўленых у сажалцы ўюноў, кідалі іх на траву і прыгаворвалі «табе-мне».

Суддзя — немаладая, з сівою высокаю прычоскаю жанчына, вельмі падобная на герцагіню дэ Бафор з партрэта Гейсбаро, глядзела на яе з такім страшэнным спачуваннем і мацярынскім болем, што Валодзьку аж не па сабе стала, ледзь скруціў у душы жаданне сказануць: «Няўжо вы не бачыце?»

І ўсё-такі ён разумеў, адчуваў, што пацярпеў крах. Жонцы, ёй усё роўна, як жыць, з кім жыць, адна ў яе сям'я была ці заўсёды другую, галоўнае, выйсці пераможцаю, і ўжо адно гэта не тое што засмучала яе, наўпярок, надавала такой упэўненасці, якой яна не адчувала нават у першыя шчаслівыя два гады шлюбу.

А ён — страціў сям'ю. Гэта не забудзеш і ніколі не змыеш. Так да канца жыцця і застанецца ў сэрцы скру-

ха, і не мае розніцы, па тваёй віне сям'я распалася ці не па тваёй, свеціць табе наперадзе шчасце ці яшчэ большае няшчасце. Нейк раўнадушна думалася цяпер і пра тое, што яго чакае ў Маліпаўцы абнадзеяная Ленка Пруцікава, што абудзіліся ў ёй і ў ім юначыя пачуцці, з неймавернаю хуткасцю сталі расці, прабіваючыся скрозь шкарлупу ўмоўнасцей і абавязкаў.

А свет, горад быў шчаслівы, светлы, яркі, і што яму да адной нейкай бяды, свет будуецца на шчасці, поспехах, заваёвах, а гора і бяда калі ў яго прыходзяць, то як бязглуздая недарэчнасць, выпадковасць, якую чым хутчэй забудзеш, сатрэш са свайго твару, тым лепей. Яны і сціраюцца хутка і непрыкметна для ўсіх, толькі адзін ці два чалавекі ходзяць у цемры нуды і, можа, толькі вочы іх скажуць разумнаму ды чуламу назіральніку, што не вельмі ўтульна ў гэтых на душы. Але ж і ён не ўсё зразумее, хутчэй падумае, што нуда ў вачах ад зайздрасці, сквапнасці, незычлівасці ці, можа, яшчэ якой заганы. О, тайна чалавечай душы, ці адкрыешся ты калі-небудзь якому-небудзь Дастаеўскаму з трыццатага стагоддзя?

— Памый пасуду,— як толькі зайшлі ў кватэру, Валодзька яшчэ нават туфель не зняў, сказала жонка, ужо — былая жонка. Валодзька паглядзеў на яе бы на дзівачку, яе і развод не пахіснуў! А здавалася б, ну калі, як не цяпер, даказаць сваю прынцыповасць, застацца са сваёю справядлівасцю, назіраючы, як нягеглы і недастойны муж, выпаўшы з-пад апекі, лёгенька і шпарка паслізгае з алмазнай горкі жончыных вартасцей у парахню сваёй заганнасці.

— Не хочаш пасуду, ідзі памый што ў ванне ў тазіку замочана,— сказала жонка як ні ў чым не бывала, прычэсваючы перад люстрам валасы; расчоску з заблытанымі ў ёй валасамі палажыла на столік для прасавання.

— Ведаеш, не нахабнічай! — сказаў Валодзька строгім голасам.

— А што «не нахабнічай»? Абавязкі бацькоўскія ў цябе ніхто не адымаў.

«Бач, тут яна ўсё разумее!..»

— Не паважаеш мяне, паважай хоць сябе,— сказаў Валодзька, мяркуючы, але мала спадзеючыся прысароміць жонку.

— Я пахаць на цябе не намерана.

— А я ніколі і не прасіў цябе, гэта знявага для мяне — чакаць ад такіх, як ты, дапамогі.

— Калі ты дываны выбіваў?

Проста жах адзін з гэтай жанчынаю! Гаворыць, як ваду ў торбу лье, ніякай адказнасці перад сваім словам, ніякай логікі ў паводзінах, у тым, чаго дабіваецца. Проста нейкая псіхічная заскарузласць. Ну, бывае, што чалавек ідзе проці разумнага сэнсу, дзеля сваёй годнасці ці нейкіх там не зусім прыстойных ды асэнсаваных меркаванняў, але каб увесь час хадзіць у тумане бязглуздасці, які не развейвае сонца сумлення, не з'ядае холад цвярозай разважлівасці, тут ужо трэба гаварыць пра звычайную тупасць. Дык хто павінен саступаць?

Валодзька разумеў, што жонка за гэты час, пакуль раздзеляць кватэру, дапячэ яго, не дасць спакою ні на хвіліну. Ён даражыць праўдаю, яе трэба адстойваць, бо бяда таму, хто дае з яе здзекавацца, а жонка будзе раз за разам ліпнуць да яго. Гэта разаб'е яго ўшчэнт, яму трэба, як кажуць, «выходзіць з гульні». Горад не схавае яго на ўвесь час, начаваць трэба ўсё роўна прыходзіць. Пісаць сцэнарый ён хадзіў у бібліятэку, сядзеў у ёй да закрыцця, потым яшчэ гадзіны паўтары бадзяўся па раўнадушных вячэрніх вуліцах. Жонка ведала, што ён не гуляе, піша сцэнарый, за які заплоцяць грошы, і ўсё роўна не апраўдвала яго, не хацела разумець, не спачувала яму. Сустракала моўчкі.

Дзіва было ў тым, што і пасля разводу ў жыцці нічога не змянілася, дні ішлі, плылі — аднастайныя, шэрыя, як частаколіны ў плоце. Дык, можа, і прычын ніякіх для разводу не было, можа, ён проста не вытрымаў звычайны сямейны цяжар, абавязковы для ўсіх, і паспяшаўся яго скінуць на паўдарозе? Ці толькі ён адзін такі — развод на разводзе едзе і разводам паганяе. Валодзька разгубіўся. Ратунак бачыўся толькі ў вёсцы, у Ленцы. Толькі яна, толькі вяртанне ў свет тых пачуццяў, што трапяткою, тонкаю цеплынёю апаноўвалі яго ў юнацтве, змогуць зноў наструніць душу. І што тут доўга думаць, балазе ён член Саюза кінематаграфістаў, мае права на творчую працу. А ён не з тых, хто будзе лайдачыць, абы чым-небудзь прыкрыцца, нічога не рабіць. Будзе пісаць дакументальныя сцэнарыі, рэцэнзіі на фільмы, а калі натхненне дасць волю і прастор думкам, ён можа напісаць нават

сцэнарый мастацкага фільма. Галоўнае для творцы — спакой, разуменне, павага, цяпер і Валодзька, не сумняваючыся, можа сказаць: шчаслівыя тыя мужчыны, з якімі жонкі заадно, якія сустрэнуць, суцешаць, прыгалубяць... І тады любая няўдача, любая подласць, інтрыга незычліўца адскочаць ад цябе, як мяч ад сцяны.

Мабыць, Валодзька не вельмі быў даспадобы дырэктару кінастудыі (задумаўся толькі цяпер), бо той не прымусіў яго адпрацоўваць месячны тэрмін, а зразу падпісаў заяву. А можа, гэты вопытны, сталы, бітыперабіты жыццём чалавек без усякіх патуг на сваё высакародства, без навязлівага павучання, моўчкі, але з годнасцю пайшоў насустрач маладому хлопцу, неприкаянасць якога, канечне ж, не магла не кінуцца яму ў вока.

* * *

...Валодзька прыехаў у вёску надвечар. Сосны абапал дарогі сустрэлі яго ціхім, густым шумам, на сухой вершаліне адной з іх нудна стукаў дзяцел-гарахвянік — чорная, у белыя плямы птушка: тук-тук — цішыня, тук-тук — цішыня... Неба на захадзе закрылася цёмна-сінім полагам, і толькі ў адным месцы, як размытая, свяцілася аранжавая пляма. Валодзька ішоў па дарозе, несучы ў руцэ цяжкі чамадан, глядзеў на гэтую пляму і думаў: недзе там за полагам столькі залітага сонцам чыстага прастору. Успомніў і тое неба, на якое любаваўся з дачкою,— стала моташна, пагана на душы. Не хацелася з такім настроем заходзіць у хату, перад вёскаю ўскрай могілак ён пастаяў і выкурыў цыгарэту.

Прыезд яго для бацькоў быў нечаканы. Нечаканы іменна сам прыезд, а не тое, што за ім стаяла. Можа б, хто іншы стаў бы Валодзьку дакараць, маўляў, і сам вінаваты, добрая цаца, толькі не Іван Лукіч. Вопытны педагог, а значыць — і псіхолаг, ён разумеў: не час і не час чытаць сыну натацыі. Тады, як усё ўляжацца, як сын скіне з сябе здранцвеласць, можна будзе пагаварыць — і па-бацькоўску, і па-настаўніцку, і па-чалавечы,— нешта параіць. Цяпер жа трэба паводзіцца так, каб сын адчуваў падтрымку з боку іх, бацькоў.

А Валодзьку карцела, так карцела расхінуць на-

сцеж душу, адным махам, дужым рыўком, як у кіно раздзіраюць матросы цяльняшкі перад катаваннем,— каб відаць было ўсім, колькі ён нацярпеўся, колькі рубцоў на сэрцы, якое закарэлае ад загуслага болю яго нутро. Але ўтрываў, нешта здаровае, моцнае, што заўсёды застаецца ў чалавеку нават у жудаснай бядзе, невыносным адчаі, перамагло, толькі і сказаў: «Колькі мог, цярпеў... Патрабуе як ад мужа, а адносіцца, як да ворага».— «Відаць, што пякла яна цябе, сын, так пякла...— Іван Лукіч палажыў сыну руку на плячо і паціснуў.— А на волю, на душу пасягаць нельга».

Спаць Валодзька палез на сена — у сянніцу: яму ўсё яшчэ хацелася адзіноты, волі і суму. Паслаў старое, выцвілае пакрывала, лёг і накрыўся мяккаю байкаваю коўдраю — маці загадзя занесла туды па яго просьбе. Сена пад ім спачатку трашчала густа, потым радзей і радзей, а як стала толькі пахруствацць, ён пачуў, што ўверсе ў латах скрыгочуць шашалі. Здалося нават, што на твар яму сыплецца пылок. Ён правёў рукою па твары — не, сяніна.

Ляжаў з заплюшчанымі вачыма, а калі адплюшчыў, то здзівіўся: развеяўся ў сянніцы змрок — у даху, асабліва ў вільчыку, было шмат дзірак, шчылін, з якіх сачылася месячнае святло, і ў ім пакалыхвалася шмаццём белая павучына.

Засынаючы, пачуў на канцы вёскі галёканне, траскатню матацыклаў. Колісь яны на веліках фарсілі, і то не ва ўсіх былі, да дзевак ездзілі, а цяпер на машынах ды матацыклах. Успомнілася Ленка, і сон зноў адляцеў ад яго, схаваўся недзе глыбока ў сене, сядзеў там разам з мышамі на самым дне. Ён доўга варочаўся і заснуў, мабыць, толькі пад раніцу.

Прачнуўся — было светла. Паветра густа пахла сенам, вільгаццю з ледзь адчувальным дамешкам ляснога (можа, грыбнога?) водару.

«Схаджу ў грыбы...»

Паснедаўшы, Валодзька ўзяў плеценую капронавую сетку і пайшоў у лес. Арганізм сам як бы дыктаваў яму: ідзі, табе трэба расслабіцца, зноў адчуць смак жыцця.

Грыбоў было мала, часцей пракідаліся лісічкі і сыраежкі. Каля Шарыпкавай дзялянкі ў бярэзніку падняў некалькі рудых абабачкаў, а калі збочыў у малады сасняк, аж но вочы разбегліся: аранжавымі гірляндамі

рассяліся па мху свінушкі — хоць касою касі. Задуменны, Валодзька быў ужо і зрэзаў некалькі штук, але як нос улавіў іх гаркаваты пах, успомніў, што ў свінушцы нядаўна выявілі (чытаў у газеце) таксічнае рэчыва — мускарын, і калі раней яе лічылі ўмоўна ядомым грыбам, то цяпер забаранілі збіраць зусім. А ці ведае пра гэта дзядзька Грышка? Валодзька выкінуў свінушкі з сеткі, выцер аб чубок сіўцу пальцы, бо пасля свінушак на іх засталіся рудаватыя плямкі. Здаваць дзядзьку Грышку ў грыбаварню ён цяпер, канечне, не панясе, і настрою няма таго летуценнага, як пазалетась, дый сорамна будзе перад Ленкаю, а на смажанку ён набярэ і добрых грыбоў, надзейных.

Думкі пра Ленку лезуць і лезуць яму ў галаву. Мабыць, і праўда, круціся не круціся, ім адно без аднаго нідзе не дзецца. Толькі ж як перамагчы сябе, устаяць перад людскім «судом», калі разнясецца іх намер сысціся да пары. Смешна? Грэшна? Бязглузда? Як людзям здасца іхні крок?

Стома хутка накацілася на Валодзьку, адчуў: трэба прысесці, перадыхнуць. Ён выбраў гарбячок, шчытна атулены бліскучым залаціста-жоўтым мохам, і сеў на яго. Гарбячок спадаў у глыбакаваты акоп, з якога рос куст жаўтазелю — рабрыстыя, пруткія сцяблы яго падымаліся вышэй Валодзькавай галавы. Валодзька прыцягнуў адзін да сябе, адарваў чорны вузенькі, як шнурок, струк і тады ўбачыў, што за сцяблiну зачэплена таўстая белая павучына, і далей на кусце цэлае сіло, у якім ужо засохлі мухі. Сам павук, вялізны, з прадаўгаватым пярэстым брушкам, сядзеў пад лісцінаю, палажыўшы на тонкія павучынкі белыя ногі. Патрывожаны, ён падняў адну нагу і, мабыць, слухаў сігнал, які надаў яму хутчэй страху, а не паляўнічага азарту. Валодзька з нейкім незразумелым, ярым атупеннем даў павуку пстрычку, і той адляцеў метры за два ў траву.

Раней ён толькі думаў, цяпер адчуў усю жахлівасць свайго становішча, жыць у няпэўнасці такой было пакутліва і цяжка, як чакаць смерці ўсё роўна. Ён павінен, зараз жа павінен знайсці сэнс свайму існаванню. Усё страчана: сям'я, работа, прывычны асяродак. У галаве пуста, пра сцэнарый не хочацца і думаць. Можа, і дарэмна. Можа, з болю за сябе, за людзей, за працу і нараджаецца талент, адкрываюцца

глыбокія таямніцы чалавечай душы? Забыцца на ўсё, запіць? Так, гэта выйсце на час, а потым? А потым як вырвацца з дурману і змроку? Будзе вельмі цяжка, калі наогул магчыма. Доктар навук, прафесар піша ў газету артыкул «Пасля зацьмення» — пра сябе, алкаголіка... Не! Трэба зараз, зараз, пакуль не позна, ісці да святла. Заплюшчыць вочы, сцяць зубы і ісці. Святло, яно як быццам блізка — Ленка. Яна таксама вярнулася ў вёску, як кажуць, не ад дабра. Два няўдачнікі, зведзеныя ў адно, не двояць няўдачу, а, як ні дзіўна, ствараюць шчасце. І яшчэ радасць — дачка, яна, канечне, чакае яго, сумуе, ліпне да маці: «Калі тата прыедзе?»

Але пакуль прыйшло да яго святло іншае — святло ад сонца, што паніжэла і ліло свае промні скрозь галіны сосен адтуль, з-за лесу, дзе была Малінаўка. Ён устаў, адчуваючы, як заспакоенасць неахвотна, але ўжо, здаецца, настойліва бярэ яго душу. Пайшоў не лесам, напрасткі, а так, каб выйсці на шашу — чуў, дзе гулі машыны. Дапаўшы да шашы, ён убачыў, што яму тупаць да павароткі каля двух кіламетраў. Але па шашы — не па лесе, ісці лёгка, і машыны, што абганяюць, акурат клічуць за сабою: давай наперагонкі!

Раптам трывожна загудзеў лес, глуха зашумелі сосны, захадзілі-загайдаліся галіны, бы ў якой трасучцы, і на стралах ад верху і да нізу затрапяталі цэлафанава-гнуткія і бліскучыя абрывачкі кары. Прыгнуўся ягаднік, трава раскінулася ў бакі, агаліўшы мясцінку — як у футры, калі на яго моцна дзьмеш. І Валодзька пачуў ужо за спінаю шум; аглянуўшыся, убачыў пыл, ён слупом, закручваючыся, падымаўся ўгору.

«Віхор!»

Віхор набліжаўся, пагражаючы наляцець на Валодзьку, укруціць яго ў сябе і панесці разам з пылам, смеццем, паперою, сухой травою, скурчаным лісцем, усім лёгкім, непрыліплым і непрырослым да зямлі. Валодзька ажно сцяўся, прыпыніўся і да болю заплюшчыў вочы.

Віхор пранёсся краем, па незаасфальтаваным акрайку, падмёўшы яго бы венікам, не крануўшы, пакінуўшы на ім толькі ўплішчаныя ў зямлю каменьчыкі і палкі. Насустрач віхру грузна ішоў «ЗІЛ»-цэментавоз, яны сутыкнуліся, і віхор яшчэ пагусцеў, закруціўся, як падбіты сабака, на месцы, і Валодзька ўбачыў у ім

белаваты, як ствол бярозы, стрыжань, вакол якога ў няроўным, імклівым танцы кружылася ўсё паднятае з зямлі — яго то падхоплівала ўверх, то звіліста-мітусліва кідала ледзь не да самай зямлі, адкуль яно лёгка, як на нітцы, узлятала на самую вяршыню пылавога слупа і там замірала на нейкі міг як бы здранцвеўшы ад ашалелага гойсання. Куды яго знясе, прыб'е, спрасуе віхор?

Віхор... Жыццё — віхор, падхоплівае людзей і кідае, носіць кругамі: на старыя і новыя месцы, далей і бліжэй... І ён, Валодзька, сярод іх. А ці толькі ён? І Міша, і Ленка... Але не, Міша ці не асеў, не знясло яго, уплішчыўся ў зямлю, як той каменьчык на акрайку. Мабыць, ніякі віхор, ніякі вецер, нават шалёная бура не зрушаць яго, застанецца, цвёрда, трывала, грунтоўна.

Валодзьку абдало смуродам: сіні «Запарожац», абагнаўшы, раптам перад самым носам з'ехаў на абочыну і спыніўся. З яго вылез вадзіцель, ішоў насустрач і ўсміхаўся. Валодзька пазнаў Івана Жыганюка. Ён быў рыжы, скалазубы, як і ў дзяцінстве,— мала змяніўся. На ім ёмка сядзела чорная дэрмацінавая куртачка і ногі быццам уліліся ў джынсы.

— Што падэшвы сціраеш? Сядай, падкіну,— сказаў ён, падаючы Валодзьку руку. Валодзька, яшчэ пад уражаннем віхру, не абрадаваўся запрашэнню, але сеў, сетку з грыбамі паставіў між ног.— Ездзіў піва купляць... Лазню баця надумаў выпаліць... Як жытуха?

— Хваліць сябе і задаволены ўсім можа толькі дурань,— няпэўна адказаў Валодзька: абрыдлі гэтыя размовы пра жыццё, у пячонках сядзяць на самым дне.

— Не перажывай,— сказаў бадзёрым голасам Іван: выходзіць, і ён ужо ведае, што Валодзька развёўся.— Я ў тваёй шкуры таксама быў. Гэта адно зразу здаецца, што гамон, жытуха кончылася. Ерунда! Слова кабальера даю. Жыццё ў мужчыны пачынаецца толькі тады, калі бабу сабе харошую знойдзе. Я не паглядзеў, што двое дзяцей, узяў сабе кабету... во з Рэмідоўшчыны, адкуль і Мішы Пруцікава жонка. Ну дык, я табе скажу, гэта ж люба-дарага — і прылашчыць, і пацалуе, і ногі памые...

Валодзька моўчкі слухаў. Яму не верылася, што такою можа быць жонка, яму цяпер здавалася, што

ўсе сучасныя жанчыны — чэрствыя, сварлівыя, няўступчывыя, і няма ў іх той пяшчоты і жаноцкасці, перад якімі стала на калені ўся сусветная літаратура XIX стагоддзя.

— А было! — Іван адчайна махнуў рукою.— Кожны дзень грызня, гвалт. Ні чарта не рабіла дома... ды яшчэ ў гулі ўдарылася. Прыйдзе — гарэлкаю, цыгарэтамі ад яе патыхае... («Дык што, перад такою на калені станавіцца?» — мільгнула ў Валодзькі ў галаве.) Я ад прыроды не бітлівы, а то б па сапатцы надаваў... Слова кабальера даю! Цярпеў, цярпеў, а тады рашыўся... Што я, сантэхнікам у Гомелі рабіў, губляць нечага.

«Сантэхнік ты, я кіношнік, а гісторыя — адна,— падумаў Валодзька.— Гаруюць, гаруюць мужчыны!..»

— І табе не пашанцавала? — павярнуў галаву Іван.

— Так яно так, але гляджу во, мабыць, і мы, мужчыны, у нечым вінаваты, што жонкі нам на галаву садзяцца.

— Правоў у іх многа,— не раздумваючы, зазначыў Іван.

— Гэта ад таго, што мужчына скампраметаваў сябе, яму не вераць ні суды, ні міліцыя, ні прафсаюзы.

— А я ўсё роўна не здаўся. Пайшло яно да фені! Усю жытуху мый, гатуй, дзяцей вучы?

— Дык жа без гэтага нельга.

— Хм, нельга,— хмыкнуў Іван, быццам Валодзька і праўда быў наіўны і нічога не разумеў.— Кожны павінен знаць у сям'і сваё месца, скажу табе, тады і толк будзе. Во як у мяне зараз. Давай заглянем, паглядзіш? — Іван сцішыў ход, на панелі, заклеенай перадымкамі Алы Пугачовай і Валерыя Лявонцьева, заміргала зялёнае вочка — звярнуў з шашы на дарогу.

— Што глядзець, і так ясна. Другім разам калі...— Машына зыбалася, і пад Валодзькам парыпвала спружына ў сядзенні.

— А ты не перажывай,— зноў падбадзёрыў Валодзьку Іван.— Жаніся другі раз. Толькі развядзёнак не бяры, сярод удоў, няўдачніц-адзіночак шукай — жонкі закачайся! Слова кабальера даю. У маёй пальцыараспухлі, патрэскаліся, а яна гумавыя напалечнікі нацягне — і на ферму: «Сваіх каровак нікому не давеpу...» Даярка яна ў мяне. Во Пруцікаву Ленку бяры —

шкадаваць не будеш!..— Скасіў, затаіўшы ўсмешку, вока.

«Няўжо ўсе здагадваюцца?» — пахаладзела ў Валодзькі ўсярэдку.

— Дзядзька Грышка купіць машыну — будзеш кум каралю і сват міністру. Я во на бацькавай ганяю. А неўзабаве і на сваю назбіраем, на чаргу ўжо стаў. Мая ж мае чатырыста рублёў у месяц, ды пенсія на дзяцей... Муж яе першы ў Афганістане загінуў, прапаршчыкам быў...

— Страшна другі раз жаніцца,— шчыра прызнаўся Валодзька, хоць і быў упэўнены, што ажаніцца з Ленкаю яму ўжо нічога не перашкодзіць.

— А што баяцца? Без іх жа, баб, стымул жытухі прападае! — Іван адной рукою трымаў руль, другою махаў, дапамагаючы сабе — каб словы лепш даходзілі і ўражвалі Валодзьку. Ён і праўда быў задаволены жыццём — настолькі, што ў Валодзькі закрадвалася сумненне, ці можа наогул быць звычайны чалавек такім шчаслівым; разумны чалавек калі і бывае шчаслівы, дык усё роўна па ім не скажаш, толькі легкадумнасць вясёлая — ні трывог, ні незадаволенасці. Іван, наколькі помніць яго ў дзяцінстве Валодзька, быў трохі пуставаты, і вучоба ў яго туга ішла, але з узростам людзі як бы ўроўніваюцца ў інтэлекце, ва ўсякім разе, любую выхадку можна аднесці да дзівацтва, а не тупасці; а чалавек з дзіўнасцямі часам здаецца нават разумным, не кажучы ўжо, што загадкавым і цікавым. Але адна з асаблівасцей разумнага чалавека — стрымліваць сябе, калі самаўхвала пачынае заўважацца іншымі, а недалёкі, наўпярок, распаляецца яшчэ больш.

«Стымул жытухі, стымул жыцця...» — заскакала ў галаве ў Валодзькі. Няма ў яго стымулу — прапаў, як абрэзала. Скажы Івану ці каму іншаму тут у Малінаўцы — не паверуць: столькі было надзей, прароцтваў... А ў выніку — нуль. Шчаслівыя ёсць, але не ён. Як мутарна, невыносна гэта ўсведамляць! Як скрозь вату, даходзілі да яго свядомасці Іванавы словы.

— ...і калгасная машына ў руках! Каму дроў, каму сена прывезці, цялёнка падкінуць на пункт... Заўсёды жывая капейка ў кішэні. А то неяк хлопцы райцэнтраўскія на дзікоў з'ездзіць падбілі... Але ўсё, баста! Слова кабальера даю. Больш не паеду. Наездзіўся!

— А што такое? — спытаў Валодзька: паляўнічая тэма яго цікавіла заўсёды, хоць сам паляўнічым яшчэ не стаў, усё збіраўся, ды ў няўмольным кругавароце дзён не выбраў часу аддацца гэтаму клопату, афарміцца ў таварыства.

— Ды ўз'ехалі на аўсянае поле, паставілі машыну пад дубком — нявідна. Недзе ў гадзіну ночы выходзіць табуняга на поле — авёс саскубваюць, чаўкаюць, на дуб ідуць, жалудоў шукаць. Ну і рванулі мы за імі! Аднаму пярэзімку як даў пярэднім колам у зад — ён і сунуўся, грабе пярэднімі капытамі зямлю пад сябе, вішчыць на ўсю акругу... А тлусты, аж леляўціць.

— А калі б хто заспеў... ляснік?

— А што баяцца? З намі міліцыянер быў... знаеш хто? Васіль Муранкоў! Ён і саскочыў першы з кузава ды абухом між вушэй... Наглядзеўся, больш не паеду, ну іх! Не магу я на такое глядзець, перажываю тады.

Асфальт перад могілкамі скончыўся, пад коламі і зднішчам дробненька, імглістa зашасцеў пясок — «Запарожац» уязджаў у вёску. Якраз на дарозе, на ўсю вуліцу, ад частакола да частакола, стаяла цэлае возера — лужына, у ёй плавалі каля берагоў трэскі, кара і белая пена. Іван павёў «Запарожац» краем, дзе відненуся жоўценькі намыты пясок.

— Я праскочыў бы і сярэдзінаю, але баюся, што кола на якую патарчаку прасаджу... Між вёскамі Ягорыч навёў магістралі, а да вуліц не дабраўся.

— Не ўсё адразу,— сказаў Валодзька раўнадушна-ганарлівым голасам мудраца.— І так вялікую справу зрабіў. Помніш, што было, ад шашы ўпоцемку не дабрацца?

— Зажылі мы!..— Іван сказаў з такою пыхаю, што кірпаты нос яго, шызы і аблуплены, задраўся яшчэ болей.— Свет пра нас загаварыў... З Магілёва сям'я просіцца ў наш калгас, але Ягорыч хітры...— Не дагаварыў Іван, пад'ехалі да Валодзькавай хаты. Піснулі тармазы, і пыл абагнаў «Запарожца» і паплыў па вуліцы, бяліў і без таго белае лісце лапухоў на старых, занядбаных часам і людзьмі селішчах. Старых селішчаў было шмат, трохі менш, чым хат,— столькі слядоў пакінула бязлітасная, няўмольная хада урбанізацыі.

— Дзякуй табе! — Валодзька падаў Івану руку, вылез з машыны. Нахіліўся да адчыненага акна.— А з табою мы яшчэ пасядзім, я думаю — час будзе...

Памыляўся Валодзька, бо не ведаў, не мог ведаць, што не асядзе ён у Маліпаўцы, не прыжывецца, не выратуе і Ленка. Будзе ён нудзіцца, стагнаць, бы нямоглае парасё, адлучанае ад маткі, ад яе даверлівых, набрынялых жыватворнаю вільгаццю саскоў. Але пакуль радасць жыцця, неўсвядомленая яшчэ надзея цёплымі хвалямі абмывалі, лашчылі яго душу.

* * *

Разнеслася чутка, яе пусціў Чубатчышын Ляксей, што ў райцэнтры ў гаспадарчым магазіне прадаюць бензапілы, і малінаўскія мужчыны хлынулі туды. Раней казалі: той не гаспадар дома, хто ў лесе не злодзей, цяпер іначай: той не гаспадар, хто не мае бензапілы. Паехалі і Грышка з Мішам.

Надвечар яны прынеслі ў двор новенькую «Дружбу», зялёненькую, бліскучую, з двухлітровым бачком між выгнутых ручак. Пілу купіў Міша, нашто яна Грышку, яго рукі ўжо не ўтрымаюць яе; калі трэба будзе што парэзаць, Мішу папросіць.

Вычытаў Міша ў паперах, што нельга адразу пускаць пілу ў работу, трэба каб яна гадзінкі дзве папрацавала ўхаластую. І Міша, старанна выцершы яе анучаю, даводзіў, як кажуць, да ладу. Роўненька, спакойна, на малым газу хуркаў матор, піла трэслася, вібравала. Міша хадзіў вакол яе, бы кот каля закрытага гладыша, станавіўся, важна трымаючы рукі ў бокі.

— Звычайнай пілою прычэп дроў колькі будзеш скрыгаць? — задаваўся, пытаў ён вясёлым голасам у бацькі, які таксама, здаецца, неабыякава глядзеў на пілу.— Дні два без адпачынку. А гэтай — паўдня, і гатова.

Любая новая пакупка заўсёды напачатку прыносіць радасць, з ёю звязваюць самыя шчаслівыя надзеі, а ўжо праз нейкі час усё становіцца звычайным, раствараецца ў будзённай мітусні.

Ляпнулі дзверы. Выйшла Ленка з Сярожам. Люба глянуць на малога — ружовыя, адвіслыя шчокі, адкрыты вільготны роцік. Ленка пусціла яго на зямлю. Малы з насцярогаю і палахліваю засяроджанасцю глядзеў на бензапілу і раз за разам паказваў на яе пальчыкам: «Кусь!»

Грышка падышоў, пагладзіў унука па галоўцы, той узяў дзеда за палец і пацягнуў бліжэй да бензапілы.

— Не пускай блізка, а то яшчэ цапне! — сказала Лісаветка, яна толькі што прыйшла з вуліцы. Усе Прудцікавы збіраліся да кучы, як колісь раней на свежаванне кабана. Яна, Лісаветка, была незразумела ўзрушаная і хавала ў сабе нейкую таямніцу, якою карцела падзяліцца, але, мабыць, перашкаджала піла сваім тарахценнем.

— Выключы ты ету тарахцелку! — не ўтрывала, сказала яна Мішу.— Галава раскалваецца...

— Абкатку, мама, трэба зрабіць,— адказаў Міша, не ўспрыняўшы ўсур'ёз мацерынай просьбы. Вочы ў Лісаветкі ажно лезлі спадылба, столькі ў іх было жадання здзівіць навіною свет. Нарэшце яна набрала ў грудзі паветра і гучна сказала:

— Кажуць, Валодзька Шапялёў насаўсім прыехаў...

Як ні дзіўна, усе пачулі, што сказала Лісаветка. Але ніхто не ўбачыў, як пыхнулі макавым цветам шчокі ў Ленкі, яна адвярнула твар, потым сагнулася, нібыта зашпіліць басаножку. Можа, пасля хвіліны маўчання азваўся Грышка.

— Ты глядзі, як яно! — пакруціў ён сівой галавою.— Адно такія во і вяртаюцца да бацькоў. Жэнька Локуць развёўся з жонкаю — прыехаў... Летась Іван Жыганюк... Старому Жыганюку так пашанцавала! Не давалі «Запарожца» яму, чарапнік... у галаву ранены, проціпаказана... Цяпер сын прыпісаны ў яго — бяры, аблсабес машыну выдзеліў.

— Зачасціў нешта гэты Валодзька,— кінуў як бы між іншым Міша, мабыць, толкам не пачуўшы.

— Дык жа кажуць, з жонкаю ўжо ўсё... развёўся.— Цяпер Лісаветка вопрама глядзела на дачку.

— Во, брат, свет які! — бязрадасна ўсміхнуўся Грышка.— Дагары нагамі ўсё ляціць...

«О, госпадзі!..— Ленка пабялела.— Усё праўда! Праўдачку ён тады гаварыў на дровах...» Яна зняверылася пасля Трышчанкі, таму і ў Валодзькавых словах сумнявалася. І радасць, і страх, і расчараванне, і горыч, і яшчэ нейкія незразумелыя пачуцці — усё разам імгненна абваліліся на яе, і яна баялася, каб не ўпасці зараз тут, ва ўсіх на вачах, не аганьбавацца перад усімі і не злякнуць Сярожу.

— Мама, паглядзі малога, я зараз...— сказала яна і шпаркімі крокамі, упрыбежку пайшла ў хату. Легла там жыватом на ложак, і перад вачыма ў яе закруціўся віхор успамінаў: дзяцінства, Валодзька, Іван Лукіч, БАМ, Трышчанка, Сярожа, маленькі, спавіты і абвязаны стужкаю, яе прыезд у Малінаўку, і зноў Валодзька, сустрэчы з ім... Божа, яна, мабыць, звар'яцела, з такою шалёнаю хуткасцю, зменлівасцю ляцелі перад ёю людзі, сцэны, абрыўкі фраз... Гэта ўсё змянялася страхатлівымі малюнкамі, у якіх не было ні сэнсу, ні логікі, ні якіх-небудзь пэўных абрысаў, каб можна было вызначыць, што гэта.

Яна ўсхапілася, стала на ногі. Усё вакол было знаёмае, нерухомае, выразнае, ніякага жаху не наганяла, і прыемная ўсмешка растуліла ёй вусны: стала лёгка-лёгка, быццам яе падняў віхор і панёс у паветры...

Тым часам у хаце Шапялёвых таксама вялася размова. Іван Лукіч сядзеў на канапе, што стаяла пры акне на вуліцу, а Марыя Піліпаўна ляжала на ложку за шырмаю стомленая: палола і матычыла з раніцы калгасныя буракі; ім, настаўнікам, таксама выдзяляюць пляц, яны яго павінны ўходжваць, даглядаць. Валодзька сядзеў у крэсле каля печы, быццам збіраўся глядзець тэлевізар.

— Яна мне падабалася яшчэ ў школе, і я дасюль не магу яе забыць...— Валодзька, бачачы, што бацька і маці не вельмі пярэчаць, гаварыў шчыра, адкрыта, як гавораць людзі, якім няма чаго губляць і ў якіх ёсць свая незразуметая нікім праўда.

— Ды дзеўка яна харошая...— Іван Лукіч як быццам не выгаворваўся да канца, нешта з таго, што не давала яму ісці на поўную згоду, заставалася ў душы.— Не нахабніца, хоць і несарамлівая...

— І працаваць, дык не ляніцца,— чуўся з-за шырмы голас Марыі Піліпаўны.

— Без яе я зараз не змагу,— у Валодзькавым голасе была непахіснасць.

— Мы што, нам ладна, як людзі,— не падымаючы вачэй, гаварыў Іван Лукіч.

— Надта ж хутка, не паспеў прыехаць...— падтакнула Марыя Піліпаўна.

— Пляваць мне, што хто скажа! — разышоўся Ва-

лодзька, каб развеяць апошнія сумненні ў бацькоў.— Я дасюль глядзеў, усё баяўся, каб не здацца непрыстойным... Думаеце, людзі аціанілі? Жонка, начальнік, калегі па рабоце?..— Відаць, што ён быў змарнаваны апошнімі падзеямі.— Начальнік без аўтарытэту ніколі не зробіць апоры на таго, хто аўтарытэт мае.

— Дык што, матка,— Іван Лукіч тузануў за шырму,— даставай свае ручнікі, у сваты пойдзем.

— Якія тут сваты!— не ўсё, яшчэ далёка не ўсё сказала Марыя Піліпаўна, не ўсё з глыбокага жаночага сэрца свайго дастала — адсюль і незадаволенасць.— Няхай сыходзяцца, раз думна, і жывуць. Месца ў нас хапае.

Але Іван Лукіч быў у жартаўлівым настроі.

— Зажывём цяпер, матка! Думалі, адны век векаваць будзем, а тут такі род вялікі адразу стаў. Толькі камандуй, хвацяць усе тыя ж буракі — і мігам гатова.

— Ага, чакай, Лісаветкай пакамандуеш! — засмяялася Марыя Піліпаўна яхідным смяшком.— Якая даха, такая і ўзяха.

І ўсё роўна Валодзька адчуў, што пераадолеў самую цяжкую ўнутраную перашкоду: думка, каб вярнуцца да былой жонкі, адпала назусім. Маленькае сумненне ўсё ж такі свідравала: можа, Ленка перадумала ўжо, можа, нешта забрала, адбіла ў яе жаданне выходзіць за яго. Але ж, мабыць, і не бывае з чалавекам такога, каб нават у вялікай радасці нешта не псавала яму настрою, нітачка, чорная, ды будзе на светлым палатне.

Пра людскі «суд» недарэмна думалі і Валодзька з Ленкаю, калі сядзелі да раніцы на дровах, і потым Валодзька адзін у лесе, і цяпер Іван Лукіч. Яго і праўда трэба было вынесці, перажыць, перацярпець. Калісь і Грышка Пруцікаў паспытаў на сабе вострыя ўколы гэтага «суду», тады як прывёз з-за свету Лісаветку.

Івану Лукічу не пашанцавала яшчэ і таму, што падкруціўся да ўсіх гэтых «судаў-перасудаў» выпадак. Адкошваў ён трусам на ўзмежку травы — чуе нейкі гул. Глянуў: на яблыню рой асеў — клубок на развілцы і вакол яго хмара пчол. Разгубіўся, пакуль шукаў у што стрэсці, ваду, прасціну, рукавіцы, пчолы зняліся і паляцелі. Ён пагнаўся за імі: ведаў, іх можна збіць пяском. Пчолы ляцяць над сядзібамі, а ён бяжыць, хапае зямлю і кідае ў іх. Дзе там! Камякі

рассыпаюцца, а хіба пылам саб'еш. Нехта ўбачыў яго і пусціў пагалоску, нібыта Іван Шапялёў крануўся з розуму ад таго, што яго сын сышоўся з Пруцікавай Ленкаю.

Людзі часта становяцца ахвярамі недарэчнасцей, на якія жыццё геніяльны выдумшчык. Тое, што Ленка расцвіла, у Валодзькі сышла з твару нахмуранасць, сам Іван Лукіч яшчэ болей да жартаў ахвочы стаў,— людзей мала займала: у гэтай праснаце мала цікавага знойдзеш, ім салёненькага, «ізюмінку» падавай, такое, каб уражвала, каб кожны ў меру сваёй здольнасці да няшчырасці плёткі пускаў, і зло ў тым, што можна цкаваць чалавека чалавекам, нават забіваць.

...Першыя дні, тыдні Валодзька пачуваўся нябла-га, нават радасць тады-сяды прытульвалася да яго душы, а потым зноў гарчэчаю патыхнула. Выходзіць, не можа чалавек жыць адным каханнем. Калі яго няма, і праўда здаецца, шчасце толькі ў ім. А калі ёсць, колькі чаго іншага не хапае, хочацца: працы, натхнення, грошай, здароўя, славы. Дай усё гэта чалавеку, інакш у яго не будзе задаволенасці. А ці будзе яна? І ці трэба?

Гуляў з Сярожам; кахаўся з Ленкаю, гладзіў яе маладое, пругкае гарачае цела, адчуваючы, як парывы неймавернай асалоды змяняюцца цяжкім, ледзь не дэпрэсіўным упадкам; калі надакучвала займацца толькі сабою, прыслухоўвацца да ўнутраных пера-ўтварэнняў, ішоў і дапамагаў дзядзьку Грышку, цесцю свайму, грыбыварыць,— і тады здавалася Валодзьку, што не з ім гэта ўсё адбываецца, а калі з ім, то ў сне; а ён там, у Мінску, з Наташаю, жонкаю-язваю, на кінастудыі ў спрэчцы з «геніяльнымі» аўтарамі сцэнарыяў, ходзіць па прыцемненых гарадскіх вуліцах, думае, як жыць далей...

Іван Жыганюк вунь вярнуўся, Жэнька Локуць, той жа Міша Пруцікаў... Дык яны гаспадарамі сталі, на трактары, машыны паселі, працуюць. Самі і бацькі іх на сёмым небе. А ён, Валодзька, вярнуўся... Блудным сынам, няйнакш, і ад зямлі адарваўся, і на неба не ўзляцеў; не абмінуў яго той віхор на шашы, падняў і круціць на сваёй арбіце. Куды занясе, дзе апусціць? Жарты жартамі, а можа, і праўда ісці да цесця кру-

ціць ягоную машыну-грыбаварню? Колькі такога: педагог сядзіць у кіёску і прадае газеты, урач — за стойкаю бара, архітэктар — у таксі, інжынер — за станком... Божа, што за дзівосы? Пагоня за дыпломам? Памылка ў выбары прафесіі? Ці грошы? Няўжо Дастаеўскі меў рацыю, калі пісаў пра вечную («до скончания мира») уладу грошай над людзьмі, «подлых и ненавистных» грошай, якія «даже таланты дают»? Яны ламаюць лёсы, калечаць душы... Адна маладая жанчына, інтэлектуалка, выкладчыца музыкі, развялася з мужам, бо не магла мець дзяцей. І ў чым яна знайшла сэнс? Жыла ў цесным пакойчыку на кватэры ў старой яўрэйкі. Сціпла апраналася, эканоміла на ядзе. Уладкавалася ў фірму «Радуга» і ў вольны ад заняткаў час мыла людзям вокны: за акно шэсць рублёў. Яўрэйка дзівілася: адна жыве, так працуе, не гуляе, не п'е, не курыць, колькі ж у яе грошай? Аднаго разу не вытрымала: калі кватарантка палезла ў ванную — зайшла да яе ў пакойчык і ўзяла блакнот, куды — бачыла — лажыла ашчадкніжку. Рукі яе дрыжалі — блакнот выпаў, і з яго пасыпаліся, бы лісты, ашчадкніжкі. Разгарнула адну — восем тысяч! Другую — адзінаццаць!.. Госпадзі, нашто чалавеку столькі грошай?..

Сум зноў засціў Валодзьку вочы. Ленка бачыла гэта і так яму дагаджала, думаючы, што, можа, яна вінавата ва ўсім, няма ж у яе вопыту быць жонкаю, быць жанчынаю.

Іван Кузьміч з Марыяй Піліпаўнай таксама насцярожыліся: можа, ужо не падзялілі што маладыя?

Валодзька хадзіў як непрыкаяны. Браўся і бульбу матычыць, і буракі калгасныя разам з маці палоць, стараўся запоўніць нечым дні, забыцца на ўсё — не, не адступалася думка: упустую ідзе жыццё, ніякага за ім, Валодзькам, следу не застаецца. Не для таго з'явіўся Валодзька на свет, каб толькі час марнаваць, абы дзень да вечара, не тая ў яго закваска.

Аднаго разу да аўталаўкі пайшоў ён, курыць купіць — шмат апошнім часам курыў, хаваючыся ад Ленкі, ад Сярожы, якога вельмі цікавілі недакуркі: дзе толькі якія, усе пазбірае ў ручку і трымае, бы палачкі лічыльныя. Не быў бы мужчына! У магазін далёка, цераз усю вёску плесціся, а аўталаўка блізка, з акна відаць, на «пятачку» каля фермы. Там Валодзь-

ка і цесця сустрэў. Назад ішлі разам. Грышка, крутнуўшы галавою так, што нос задзёрся на неба, нечакана сказаў:

— Мая заслуга!

— Што? — не зразумеў Валодзька.

— Што аўталаўка кожную суботу прыязджае... Дабіўся! Бабам што ўжо радасці: сіцец на падушкі, коўдры, шыла-мыла, нам во курыва, нават ету... як яе? Ну як газіроўка... дзецям, толькі цёмная.

— «Пепсі-кола»?

— Во, яе! А то ж было ні запалі ні трэсні. Адна гарэлка. Пачмурэлі ўжо ад яе людзі. Во нядаўна, у раёне... Мужык-мужык быў, Забенін такі... Галава, красавец! А дапіўся да таго, што пачаў гуталін, пасты, лакі ўсякія глытаць. Прасіў у жонкі... яна ўрач, грошы на пахмелку — не дала. Дык ён хапіў мялкашку, жонку застрэліў, сыну... семнаццаць гадоў, школу кончыў, кулю ў жывот усадзіў. Пакуль прыехала міліцыя, абрэзаў нажоўкаю ствол — і сабе ў скроню. Во што... Я — каб ні грама, сухі закон!

— Строгі вы, дзядзька Грышка!

— А яно ў любым дзеле папуску толькі дай, ці сабе, ці каму, толку не будзе. Я Мішу пакуль прыструніў... Цяпер, бачыш, сам у кіно здымаеш...— Грышка пільна паглядзеў на Валодзьку, як бы хацеў нешта прачытаць у таго на твары.— А ты... ета, думаеш дзе працаваць?

Наспела гэтае пытанне ў Грышкавай галаве даўно, але баяўся яго, аніяк не асмельваўся задаць Валодзьку. Чужы чалавек, лічы, Валодзька, якое права мае Грышка лезці да яго, у таго свае бацька з маткаю ёсць, і не абы-якія людзі, а вучаныя. Падумаюць яшчэ: во турбуецца сват, каб зяця раптам не давялося на сваім карку трымаць. Яно што праўда, то праўда, цяпер і такія зяці ёсць, на гатовенькім сядзяць, кармі іх, паі, адзявай... А скажы што не па ім — яшчэ і ў вуха заклеіць.

— Ну я вольны мастак! — хацеў аджартавацца Валодзька, але ўбачыў, што цесць не прыняў гэты яго адказ.— Магу стала нідзе не працаваць і дармаедам не буду лічыцца...

Грышка, канечне, не мог дабраць толку: як гэта так, нідзе не рабіць — і ўсё па правілах. Не калека ж, не інвалід, а малады здаровы хлопец — і не праца-

ваць? Такога быць не можа. Што чалавек без працы? Нішто! Навошта ён тады, толькі неба капціць?

Яны не разышліся па хатах, а селі ў цяньку пад клёнам на лавачцы. Само неяк селася, не дамаўляліся, мабыць, разам адчулі, што ёсць пра што пагаварыць, трэба думкі давесці да ладу.

— Ета Локуцеў ды Жыганюкоў... адзін на трактарыста, другі на шафёра...

— Я ведаю,— сказаў Валодзька з абыякавасцю ў голасе: было відаць, што ён чакаў такога павароту, бо сам задумаўся пасля размовы з Іванам Жыганюком.— Але ж у мяне правоў нават няма.

— Інжынерам, можа...— сказаў Грышка, неяк асцярожна, каб не здалося, быццам ён навязвае свае думкі.

— Ці возьмуць? Дыплом у мяне не тэхнарскі.

— Клопату! Родчанка... можа, помніш? Сваю жонку інжынерам па тэхніцы бяспекі паставіў... у яе восем класаў было.

— Хазяін-барын, як кажуць.

— Хочаш, я з Ягорычам пагавару?

— Ды не трэба! Смешна ўсё гэта.

— Во, табе смешачкі! — разгубіўся Грышка.— Ты глядзі, як другія... Міротнікавы ўсякія трымаюцца. Сябе ачарнілі, на людзей абазліліся, душы ім топчуць, сумятню ўносяць, а трымаюцца... зубамі і рукамі, як адтхор той, калі яго цягнуць за хвост з нары... Босы аднаго разу. Ды саступі ты! Дай чалавеку ўзяцца ды дзела павесці. Не-е, ведае: з аднаго крэсла згоняць, на другое пасадзяць, яшчэ вышэйшае.

Наколькі Грышку ўся гэтая размова здавалася сур'ёзнаю: «Азалаці мяне ў далёкім краі — нікуды не паеду!» — настолькі Валодзьку — смехатворнаю. Куды, куды яму ў калгас? Во, пажыў колькі тут — і ўсё, хоць каравул крычы, быццам не ён, толькі яго цень у вёсцы, а душа... Тыя хлопцы, што паварочаліся, на вагу золата тут, зразумелі нарэшце, што зямля — гэта адзінае, чаго не выб'еш з-пад ног. Любое крэсла, самую высокую пасаду вазьмі — кожную хвіліну пахіснуцца можаш ці выб'юць іх з-пад цябе, як фігурку ў гарадках змятуць. І ты ўжо ў адчаі, страх апанаваў, а страх не памочнік на жыццёвай дарозе, ён і няўпэўненасць адбіваюць у чалавеку ахвоту тварыць, працаваць.

— Я не смяюся, дзядзька Грышка! Мне плакаць хочацца...

Грышка падумаў, што ў Валодзькі іншая прычына для слёз, так разгуляўся, што не можа ні за што ўзяцца.

— Палкаю на працу гнаць, канечне, дурное дзела...— расчараваўся зусім Грышка.— Працуеш тады, як мокрае гарыць.

Ведаў, ведаў Валодзька, можа, лепш за Грышку, што значыць працаваць без радасці, без натхнення; не, ён павінен, павінен паставіць сябе ў такія ўмовы, каб радасць, душа звалі яго на працу. Як гудок: гу-у, гу-у-у...

А можа, усё-ткі паспрабаваць у калгас? Часам жа не ведаеш, дзе цябе ўдача чакае. Не атрымаецца, дык хоць цесць не будзе скоса пазіраць. Настрой адразу палепшаў у Валодзькі: ёсць зачэпка, ёсць!

Не марудзячы, каб не кроіць сябе сумненнямі, Валодзька ў той жа дзень і пайшоў да старшыні. Ні Ленцы, ні бацьку з маці не прызнаўся, куды пойдзе,— сказаў, што адлучыцца на гадзіну якую, прагуляецца.

Ужо вечар быў блізка, сонца пабарвовела. У кантоgры Ягорыча Валодзька не застаў, у бухгалтэрыі сказалі: толькі што паехаў на абед. Валодзька здзівіўся: «Які абед увечары?» — але не стаў удакладняць, ведаючы, што вясковыя людзі часам на любую яду кажуць — абед. Затое спытаў, дзе Ягорыч жыве; вёску Валодзька збольшага ведаў: тут была бальніца, размінуцца з якою ў дзяцінстве не заўсёды выпадала. Яму сказалі: «У Доктаркі»,— і Валодзька абрадаваўся, што пачынае свой візіт удала. Доктаркаю называлі старую Дарку, у якой калісь кватаравала доктарка Рыта Іосіфаўна — на шчацэ ў яе пад вокам была маленькая радзімка і з яе тырчаў кусцік валасоў; доктарка была далікатная, ветлівая, з лагодным голасам, і ўколы рабіла небалючыя, да яе ішлі людзі па дапамогу і ўначы. Ужо даўно паехала адсюль Рыта Іосіфаўна, але Дарку і цяпер называюць — Доктаркаю, балазе словы сугучныя, трэба мала што мяняць.

Каля Дарчынай хаты стаяла высокая бяроза, на ёй калісь вяліся буслы, а цяпер чарнела на верхавіне адна ступіца з кола — і спіцы, і галлё струхлелі, асыпаліся. Буслы абралі сабе новы «фундамент», сучасны, энтээраўскі — апору высакавольтнай лініі.

Валодзька адчыніў весніцы, і рыпнулі яны, здалося, гэтак, як і пятнаццаць гадоў назад. На ганку сядзеў мужчына. Ветрык матляў на галаве даўгія рэдкія валасы, яны рассыпаліся — бліскала, як дно міскі, лысіна; у руках мужчына трымаў даўжэзную палку, шкрэбаў па ёй асколачкам шкла.

— Ці дазволіце? — спытаў Валодзька, перш чым павітацца.

— Зайшоў, а пасля просіш дазволу,— усміхнуўся мужчына, кінуўшы на Валодзьку кароткі пагляд.— Хаця... карэспандэнты — народ смелы.

— Я не карэспандэнт.

— Не можа быць.

— А чаму «не можа быць»?

— Ды ў цябе, салдат, на лбе напісана, што ты карэспандэнт.— Мужчына перастаў шкрэбаць шкельцам, упяў на Валодзьку позірк.

— Усё-ткі вы памыліліся! Хаця...— Валодзька адчуў, што з мужчынам размаўляць лёгка, ніякага недаверу між імі ці насцярожанасці няма.— Салдат не салдат, а з пяром я справу маю, дакладней, меў. А цяпер хачу вашаму калгасу карысць прынесці,— Валодзька вырашыў не цягнуць ката за хвост, адразу расказаць пра ўсё старшыні (ён зразумеў, хто перад ім).

— Пісарчукоў у нас сваіх хапае! Зямлю араць няма каму. Рэсурсу няма!

— Я — на любую работу,— з надрывам сказаў Валодзька, адчуваючы, што ў яго не хопіць сілы на доўгія дэбаты.

— Сядай, салдат. Хто такі, скуль?

Валодзька расказаў, імкнучыся гаварыць як карацей, але пераскокваў з аднаго эпізода на другі — і ўвесь аповяд яго заняў хвілін дваццаць.

Ягорыч пакруціў галавою, падтуліў ніжнюю губу пад верхнюю, дужа выпусціў з грудзей паветра.

— Швах твае справы, Уладзімір Іванавіч!..

У Валодзькі пахаладзела ў грудзях.

Ягорыч прыжмурыў левае вока — выверыў, ці роўная палка ў яго руках.

— Вілашнік раблю,— нечакана сказаў ён зусім не суровым, як толькі што, а дзіцяча-непасрэдным голасам.— Боршч у абед стаў вымаць з печы, і вілашнік крохнуў. Мая гаспадыня кажа, «туды яму і дарога», дарэвалюцыйны яшчэ вілашнік.

Валодзька злаваўся ў душы: такая сур'ёзная размова, а ён пра вілашнік. Дзівак старшыня!

— Ведаеш, салдат, мне трэба рэсурс,— як ні ў чым не бывала, зноў на строгі тон перайшоў Ягорыч.— Рэсурс моцны, мэтанакіраваны, надзейны! А ты — баласт. Не крыўдуй толькі за гэта слова. Я ў дачыненні да нашых калгасных спраў гавару. Бо ты сам па сабе, канечне ж, нечага варты... Любы чалавек шмат можа зрабіць, калі яго на месца паставіць. Вунь Мішка Пруцікаў! Таксама да мяне прыйшоў, незадаволены жыццём, усім светам. Дзёрзкая натура! А я бачу: рэсурс! Адразу і ўхапіў яго за рогі. Іншыя хлопцы... А з цябе, салдат, толку тут аніякага. Не буду ж я падбіраць усё, што вецер прынясе. Мне трэба калгас на ногі паставіць. Да ручкі дабіты! Дзіўна, скажу табе, мы бярэм у калгасе такія абавязацельствы, як і пасля вайны. Во табе і рух наперад! А кожны ж год рапартавалі... з нагоды і без нагоды: «перавыканалі», «значныя поспехі», «норму — за дзве», «вышэй леташняга»... А дзе ўсё дзявалася? Фікцыя была! З паперы жыта не настрыжэш, салдат. Хіба што старшыні на асабняк, га? — Ягорыч засмяяўся.— Зямельцы гаспадары патрэбны, лекары. Папілі з яе крыві, пацягнулі сокаў гультаі, да анеміі зямлю давялі... лячыць трэба!

Валодзька сумнымі вачыма глядзеў на Ягорыча і дзівіўся: гаворыць, быццам яны сто гадоў знаёмыя, праўду гаворыць, але ўсё роўна нешта ўпарцілася ў душы: непатрэбны ён, не ўразіў ён нічым, каб закрыць вочы на ўсё заганнае ў ім ды ўзяць на працу. Жах! Проста дзіва, жыццё гэтае. Што за людзі? Кожны круціць па-свойму, на свой капыл прымярае чалавечую душу... Ратаваць, ратаваць яе трэба. Сябе ў сабе захаваць.

Выйшла з сенцаў на ганак старая Доктарка, абаперлася дзвюма рукамі на кіёк.

— Ягорыч, ты дужа заняты? Чайнік астывае...

Ледзь пазнаў Валодзька старую Дарку: зусім згорбілася, шчокі запалі, адзін нос тырчыць, як нераспелая дуля.

— Заві і таварышка свайго...— прашамкала яна бяззубым, вялым ротам.

— Дзякуй! — Валодзька ўстаў.— Мне яшчэ далёка ісці, а ўжо сцямнела.

— Я шафёру скажу — падкіне,— сказаў Ягорыч,

ляпаючы далонямі па каленях, страсаў дробныя стружкі, пацяруху. Быў ён няўклюдны, цяжкі, як складзены з палявых валуноў.

— Ды, можа, дайду...— няўпэўнена прамовіў Валодзька, нешта трымала яго, не было жадання развітацца з Ягорычам — відаць, назаўсёды,— але яшчэ мацнейшае было жаданне пабыць аднаму, у адзіноце абдумаць сваё становішча, наколькі можна — разабрацца і разарваць путы безвыходнасці.

Ягорыч моцна пацісну́ў яму руку, правёў за вясніцы і на расстанне моцна ляпнуў па плячы: трымайся! Цёмна-сіні, ясны парасон неба ўжо быў густавата засеяны залатымі зярнятамі зорак. Зусім чорная, як тарфяная куча, стаяла бяроза, і толькі на абрысах яе было відаць, як варушацца ад ветрыку лісты, цьмяна паблісквающь. Каля балотца, што ўклінілася проста ў вёску, лёгкай белаватай хусцінкаю павіс туман. Пад ёю, крэкаючы, вяла чараду сваіх дзяцей тлустая нізканогая качка, спынялася, і тады качаняты, хуценька перабягаючы, абганялі яе.

Валодзька, адчуваючы вільготную свежасць паветра і што спружына ўнутранай напружанасці яшчэ не расслабілася, ішоў лёгка і хутка, і толькі, можа, праз кіламетр цяжар з галавы пераліўся ў ногі; ён запаволіў хаду, радуючыся той яснасці, з якой палезлі ў галаву думкі.

Дзіўна, можа, але не шкадаваў ён, што не даў яму работы Ягорыч, што дарма схадзіў: была ўпэўненасць, і расла яна, не меншала, што нічога ён не страціў, не зачапіўшыся ў калгасе; наадварот, дзесьці з глыбіні падсвядомасці, як крынічка з-пад зямлі, біла задаволенасць: «Правільна, усё правільна! Што шукаць там, дзе нічога для цябе не пакладзена?» Ужо каторы раз толькі за сённяшні дзень ён прыслухоўваўся да сваёй душы, ці адгукнецца, ці заспявае хоць якой струною; не, маўчала душа, быццам памерла яна зусім, згібела, і нічога ён не мог з сабою зрабіць. І сіла волі ў яго ёсць, і розум, а душу нішто не прымусіла пацягнуцца ні да трактара, ні да машыны, ні да інжынернай пасады. Невінаваты, выходзіць, ён, нейкая непадуладная яму ўжо сіла навечна адсекла яго ад вёскі, яе стыхіі. Дзіўна, дзіўна гэта было Валодзьку яшчэ і таму, што ў дзяцінстве ён упіваўся кожным лісцікам, кветачкаю, кожным жучком-павучком ды і цяпер з ахвотаю ма-

тычыў бульбу, палоў з маці буракі. Але чаму гэта ўсё не прыцягне яго да сябе так, каб нельга было адарвацца? І што цяпер рабіць? Думаў, сцэнарыі будзе пісаць — не пішуцца! Думаў, жаніцьба з Ленкаю, вяртанне да першага кахання падкажуць выйсце — не падказалі! Не пад-ка-за-лі!!! Ён з такою горыччу выдыхнуў гэтае слова, што схамянуўся — і раптам убачыў сябе сярод высокіх дрымучых ялін, што стаялі ў вышыні нерухома, як здані,— у гэты дзябёлы ельнік перарасло балотца, і цяпер тут ішла дарога. Тугі і белы, як блін, месяц каціўся з галіны на галіну паперадзе Валодзькі. Як ні забаўляўся ён, але на душы ў Валодзькі не дужа весялела. Прашастала мяккімі, як венікі, крыламі вялікая начная птушка, і Валодзьку здалося, што ад цікаўнасці яна аж выцягнула шыю, схіліўшы ўніз круглую вушастую галаву. Ён перасмыкнуў плячыма. У траве пад ялінамі, па сухім лісці, ігліцы нехта прашамацеў — быццам пацягнулі вяроўку. Жаданым гукам у гэтай стоенай вусцішнасці, які расслабляў і падвясельваў, чулася сабачае гаўканне ў тым баку, дзе была Малінаўка і дзе ўжо танцаваў месяц.

«Чорт з ім! Затое не будзе думацца, усё выпрабаваў, усе варыянты прамацаў... Глуха! Няма сюды звароту. Нешта ва мне ўжо зрушылася, адпала, сатлела, а на месцы яго нарадзілася і вырасла новае. І без гэтага новага я ўжо — не я, тут я — дачнік, курортнік, а не работнік...» Чуў, колькі начуўся ў горадзе — некаторыя стогнуць: «Работа цяжкая... Працаваць цяжка...» Так хацелася яму на ўвесь лес, на ўсё поле, на ўвесь свет закрычаць: «Людзі! Радуйцеся, калі ёсць любімая работа, значна цяжэй, калі няма чаго рабіць...» І заўсёды так: у нейкі міг пачынаеш разумець, што тое, на што ўскладваў вялікія надзеі, нічога не вартае і ёсць не што іншае, як дзіцячы наіў, няведанне сябе і жыцця.

Ленка чакала яго, сядзела на лавачцы, галава і грудзі былі ў цяні ад куста бэзу, ногі — у святле месяца. Убачыла яго і пайшла насустрач.

— Што здарылася, Вова? — Яна абняла яго за спіну па таліі.

— Усё нармальна! — не любіў, не ўмеў і не хацеў скардзіцца, усё непрыемнае насіў у сабе. Мабыць, лічыў: а што гаварыць, калі ўсё роўна шчыра ніхто не

паспачувае. Слухаць фальшывыя словы — было яму пакутаю.

— Бачу, нейкі ты заклапочаны...— Ленка трывожылася нездарма. Ён адчуваў — не адстане.

— Не ведаю, што рабіць,— сказаў ён рашуча.— Ты паедзеш са мною?

— Куды?

— Назад у Мінск.

— Калі? — Падобна, яна абрадавалася, ва ўсякім разе, на расчараванне нават намёку не было.

— Не ведаю... Паедзеш?

— Хоць на край свету! — Цяпер ужо Ленка не магла схаваць радасці, пацалавала Валодзьку ў шчаку.

Валодзька разгубіўся: яна і праўда не ўяўляе сябе, не можа без яго ці такая легкадумная? Але ўсё роўна было прыемна. І перашкоды ніякай яму не будзе. Збяруцца і паедуць. Але дзе жыць? І праўда, дзе жыць? Калі там жонка размяняе кватэру, двухпакаёўку не так проста...

Невядома, колькі б яшчэ дзён, тыдняў, а можа, і месяцаў вярэдзіў бы сваю душу Валодзька, калі б не тэлеграма ад былой жонкі — толькі два словы: «Разняняла кватэру». Ён незвычайна абрадаваўся ёй: там, у Мінску, у яго ёсць свой куток, няхай зусім маленькі, адзін пакойчык.

* * *

На падсаду ў калгасны сад прывезлі цэлае кузава маладзенькіх яблынь і груш. Ажно з Мсціслаўскага раёна — з гадавальніка. Колькі трэба калгасу, адлічылі, астатнія пачалі прадаваць людзям — грэблі, як перад вайною соль. І Грышка з Мішам пабеглі на пагон, дзе стаяла машына. Саджанцы былі звязаны ў пукі. Карэньчыкі тонкія, густыя, бы махры, і аж белыя, быццам іх цэментам абсыпалі; а верхавіны як тыя мяцёлкі — густыя, і лісце ядранае, яшчэ не пасохла, адно там-сям парудзела. Слаўныя саджанцы!

— Лезь, Міша, на кузава, глядзі там! — падштурхнуў сына Грышка.

— От ты! — заступіў дарогу Ляксей Чубатчышын.— Вечна табе ўгамону няма... Я тож у чарзе стаю — дзесяць, дзевяць, восем, сем... пяць... тры, два, адзін!

— Стой, стой, першым за цябе ніхто не ўрвеш,— засмяяўся Грышка. Пажартавалі мужчыны — здаравей на сэрцы стала.

Падышла чарга, Міша палез на кузава; выбіраў саджанцы, глядзеў, каб і ствол прамейшы быў, і карэньчыкаў гусцей, і пупышак на чарапках як больш ды буйнейшых. Падаваў Грышку, той лічыў, гладзіў пальцамі пяшчотную кару. Узялі дзесяць штучак: сем яблынь і тры грушыны.

— Цяпер садзіць трэба,— сказаў Грышка дарогаю, як ішлі дахаты, неслі на плячах саджанцы. Міша ўсміхнуўся: бацька хацеў праверыць, ці па нутры яму, Мішу, задума новы сад пасадзіць. Таго не ведае, што ў Мішы ў самога такая мара зарадзілася, яшчэ ў той дзень, як старыя яблыні ды грушы карчавалі. І ён выгукнуў бацьку ледзь не ў самае вуха: «Канечне!» Грышка ажно здрыгануўся, але сказаў спакойна:

— Але не проста ў зямлю ўторкнуў, ды няхай сядзіць. Па закону трэба, як дзед і бацька мой садзілі. Яны і сакрэт мне свой перадалі... Як дрэва садзіць, каб яно расло і расло...

Мішу гэтая бацькава турбота здалася не тое што дробязнаю, а проста лішняй, і ён не даў ёй увагі. І дарэмна. Надвечар бацька прыгнаў запрэжанага ў калёсы каня.

— Паехалі ў гліну,— сказаў ён. Калёсы заслаў цэлафанам. Узялі дзве лапаты, тапор. Успомнілася Мішу: і на Глубку яны ехалі тады ўдвух на калёсах, адно каня звалі Белазоры ды самі былі маладзейшыя.

Глінішча было за калгасным садам. Ехалі той дарогаю, якою ўлетку ўсёй сям'ёю ішлі ў маліну. Толькі поле цяпер ужо голае — узаранае, на ім стаялі яшчэ непарыжэлыя, даўгія, бы гумны, сцірты саломы. Удалечыні цямнелася празрыстаю купкаю лазы Глінішча.

— Ленка пісьмо прыслала,— сказаў Грышка, убачыўшы, што ў сына задуменны твар. Паслабіў лейцы і пусціў каня самаходам.

— Што яна піша? — абыякавым голасам спытаў Міша.

— Валодзьку ў газету нейкую ўзялі працаваць, а яна з дзіцём... садзіка пакуль няма.

— Ленка ў хаце доўга не ўседзіць.

— Была б хата... Пакойчык адзін... канурка нейкая, кухня яшчэ на адных.

— Рваліся ж...

— Як не ў людзей,— згадзіўся Грышка.

Яма была вялікая і глыбокая: адвеку бралі з яе гліну, нават немец нейкі Шая-Яхнін кафлю з яе вырабляў і адпраўляў у свой край. На дне стаяла аранжавая вада, ручайкі-крывуліны пустымі жыламі збягалі з бакоў ямы. Трымаючыся за куст лазы, Міша першы палез у яму, ногі слізгалі, як па мыле, іх падсякала ў паветра, хоць падай на спіну. Удзяўбнуў у бакавіну ямы лапату, налёг усім целам на цаўё. Грышка стаў на цаўё, абапёрся на Мішаву галаву, саскочыў — свіснула з-пад ботаў жоўтая жыжка.

Гліна бралася лёгка, была мяккая, акурат цеста, на зрэзе чырванаватая, з сінімі і белымі плямкамі.

— Тлустая гліна,— сказаў Грышка.

Накідалі цэлую кучу, мала не ў рост чалавека. Ледзь вылезлі з ямы — глыбокая, ногі абскаўзаліся.

— А ты хочаш, каб той дзічок выкараскаўся з яе...— Грышка пучком белага сіўцу, бы квачом, счышчаў з ботаў гліну.— Што Васіль Муранкоў дазволіў нам спажыць...

— Чаму ён?

— Пазванілі ў міліцыю, якраз на яго натрапілі... свой чалавек. А яму што, ён гэтых дзікоў, можа, не адзін дзесятак угэхаў...

— Ты глядзі! — крутнуў галавою Міша.— А мяне настаўляў на пуць ісцінны.

— Даскачацца,— зусім пэўна сказаў Грышка, быццам лёс Васіля Муранкова быў у яго руках.

Ускінулі гліну на калёсы, захінулі цэлафанам, канцы якога звязалі — каб гліна не рассыпалася. Завезлі на гарод. Ссыпалі ў некалькі кучак. Грышка нічога Мішу не гаварыў, адно хітра пасміхаўся. І Міша не ўцярпеў, бо думаў, што гліна на грубку трэба, спытаў:

— Што ты надумаўся, бацька?

— Яблынькі садзіць будзем.

— А гліна нашто?

— Убачыш... Капай ямкі.

Пакуль Міша капаў ямы, Грышка ў акенца выкінуў з пуні на гарод гною.

— Ямка гатова? — падышоў да ямы, якую Міша выкапаў каля град.— Во цяпер сып на дно гліну... Сып-сып. Так дзед мой садзіў, Пятрок...

Міша шухнуў у яму некалькі лапат гліны, разраўняў.

— Во! — сказаў Грышка.— Трохі таптані... І вада нідзе не дзенецца. А то яна тута на супесі як праз сіта... свісь.

Міша пачасаў за вухам: не дадумаўся, халера.

— Цяпер гною кінь наверх,— камандаваў Грышка, бачачы, з якою ахвотаю і запалам Міша арудуе каля ямкі. У акно глядзела Ліда, і ў яе вачах свяцілася ўсмешка. Міша падміргнуў ёй, і яна заўсміхалася на ўсе зубы.

Грышка трымаў яблыньку, каб яна роўна стаяла, а Міша засыпаў яму зямлёю.

— Дос! — сказаў Грышка.— Зноў гною трухні... Во, так! І зямелькаю, зямелькаю...— У Грышкі дрыжалі рукі: ад нейкай незразумелай узрушанасці. Сады патрэбны... Трэба садзіць, садзіць. Гэта свята душы — сады садзіць. Колькі іх ні садзі — усё роўна мала. Дабра заўсёды мала.

На ліпу каля лазні апусцілася чарада шпакоў, запаланіла гарод сваім бязладным і сумным восеньскім пярэгаласам.

# ЗАМАХ

## I

Фашыст цэліўся ў яго...

Залога толькі што сышоў з крутога берага Дняпра да вады, сагнуўся, каб чарпануць кацялком, як востра адчуў, што закалола пад левую лапатку. Якраз туды нацэліўся фашыст — і шкельца аптычнага прыцэла нібыта свідравала сваім праменьчыкам яго спіну, шукала, дзе сэрца. Залогу стала холадна, яму скавала рухі — ён не мог паварушыцца і радаваўся гэтаму, бо разумеў, што жыць засталося мала, столькі, колькі ён прастаіць нерухома; а як толькі павернецца — фашыст націсне на курок, і ён, Залога, упадзе тварам у пясок ці, наўпярок, наўзмах плюхнецца спінаю ў раку...

Ён стаяў сагнуты і думаў, што яму рабіць,— перад вачыма была толькі вада — маленькае паўкружжа, якое ахопліваў зрок з магутнага, шырокага прастору Дняпра.

Залога стаяў доўга, і гэта яго выратавала: фашысту, мабыць, надакучыла чакаць, пакуль павернецца ягоная ахвяра, і ён націснуў на курок якраз у той міг, калі Залога варухнуўся... Левую руку тузанула да ракі, быццам ён трымаў на лесцы дужую рыбіну, і тая, сабраўшы рэшткі сіл, ірванула ўглыбіню. Ён зануры́ўся тварам у пясок, руцэ стала горача-горача, акурат апусціў яе ў варатак, па ёй пабеглі дробныя колікі. «Усё, жывы!..» — зусім радасна падумаў ён, адчуваючы левай шчакою сыры халодны пясок. «Уставай, уставай!» — раптам пачуў ён і ўвесь сцяўся, заплюшчыў вочы, але ў наступнае імгненне дайшло да свядомасці, што голас — знаёмы. «Чый жа гэта?» Ён павольна, як чакаючы другога стрэлу, прыпадняў галаву і ўбачыў на беразе Пятра Клімаўскога. Той стаяў рукі ў бокі, усміхаўся, і вочы яго калолі дакорам: «Што ты, дзядзька Серафім, разлёгся? Напіўся, ці што?»

І праўда, сораму не абрацца, заваліўся, як свіння,

у гразь і ляжыць. Трэба ўставаць. Няма ж вайны. І фашыста няма. І шпіталю няма. Чаго баяцца? З цяжкасцю, з вялізным высілкам, як з-пад тоўшчы зямлі, ён падняўся...

. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

Уначы дажджу не было. Залога зразумеў гэта адразу, як толькі прачнуўся. Ціха было на двары, не барабанілі па шыферы кроплі, не хлюпала пад акном са страхі. Мерна цікалі ходзікі. Занямела левая рука, стала цяжкая, бы налілася свінцом. Хацеў паварушыць ёю, але не адчуў, яна падпарадкавалася ці не. «Адлежаў, чорт...» — падумаў ён і пачаў расціраць правай левую, параненую, руку.

— Прачнуўся? — спыталася жонка. Яна спала на суседнім ложку, перавярнулася, уздыхнула: — Уставаць будзеш?

— Ды ўжо ж! — сказаў Залога, адчуваючы, што душа яшчэ пад гнётам цяжкага сну. І так заўсёды. У той міг, як прачынаецца і да яго прыходзіць разуменне, што было з ім у сне, а не ў сапраўднасці, становіцца лёгка-лёгка... Але толькі на міг, а потым успаміны пра той верасень 43-га, калі войскі Варонежскага фронту выйшлі да Дняпра каля Пераяслаўля-Хмяльніцкага і яго параніла, сціскаюць тугімі балючымі жгутамі па ўсім целе. Цяпер во да ўспамінаў ваенных падключыліся перажыванні за гэтую Чарнобыльскую аварыю.

— Не забудзь жа вяроўку,— папярэдзіла жонка і зноў глыбока, з надрывам уздыхнула. Сама яна не збіралася ехаць па сена — балелі ногі, апухлі ў шчыкалатцы, наліваліся сінюшнасцю,— адчувала сябе трохі вінаватаю перад мужам і хоць неяк прычынялася да гэтага нялёгкага вясковага клопату. Ім цяпер усё нялёгка даецца. Што бульбу садзіць, капаць яе, што дровы секчы, што кароў гнаць...

— Не забуду.— Залога ўсё яшчэ ніяк не мог ачомацца ад сну, і жонка сваім прыстасаваннем толькі вярэдзіла душу, якая жыла ў няяснай трывозе ўжо другі месяц. З канца красавіка, як аб'явілі, што на Украіне ў нейкім Чарнобыле стрэслася бяда. На атамнай станцыі рванула. Ды так, што з блізкіх да Чарнобыля раёнаў высяляюць людзей. Застаюцца адно сабакі і каты. Водзека ліха! Толькі і гаворкі: што есці,

што піць, як ратавацца. Гэты выбух, хоць і не чулі яго, страсянуў душы і залівонаўцаў. Залогу штоноч, лічы, пачала сніцца вайна...

Залога ўстаў з ложка і пайшоў са спальні.

Ён уключыў у пярэдняй хаце святло. На табурэтцы ляжала яго адзенне — штаны і кашуля, пінжак вісеў на ласіным рагу каля дзвярэй у веранду. Кірзавыя боты з палатнянымі анучамі на халявах стаялі ў парозе — наўмысна ўчора прынёс з кладоўкі.

Адзеўшыся, Залога выйшаў на двор. На небе не было ніводнай хмаркі, усе зоркі на ім як правеяныя спелыя зерняткі — чыстыя, жоўценькія, і кожная сама па сабе. Зямля, набрынялая вільгаццю зацяжных дажджоў, была чорная, як бы распараная і цёплая. На градах і буракі, і морква, і цыбуля, і боб вышугнулі за адну ноч сваім крамяным, зялёначубым параснікам, на якім халоднымі шклянымі пацеркамі ляжала раса. Залога асцярожна прайшоў мяжою за пуню, каб не абрасяніцца вышэй халяваў.

У Нямільні, суседняй вёсцы за балотам, каля якога шчыльнаю тонкаю льдзінаю прыціснуўся да зямлі туман, затрасkатаў трактар. Мабыць, на ферме ці на якім стане. Да Нямільні кіламетры два, а чуваць, як усё роўна ў цябе на гародзе, каля лазні. Залога нават схамянуўся, бо перш мільгнула думка, што Клімаўскі завёў свайго «беларуса». Але не, Клімаўскі не разгоніцца і раней, чымся дамовіліся, нават на мінуту не пад'едзе. Добра, калі б у час, а то яшчэ заспіць. Тады скажа: «Прабач, дзядзька, не паспеем сёння да нарада, другім разам калі...» А раптам зноў задажджыцца, тады чакай таго другога разу. Што казаць, Залогу ўжо абрыдла тое сянцо, столькі нерваў вытрапала. А іх і так, мабыць, не вельмі засталося: ледзь што зняцяйкі бзыкне, авадзень які,— ажно кальне пад грудзінаю. Касіў, можна сказаць, украднём, сушыў — скідаў стажок, цяпер душа баліць, каб хто не забраў. Ці які зламыснік разверне пад макрэдзь — згніе сена, гной будзе.

Раней, як былі маладзейшыя, хадзілі з Марусяю ў калгас касіць. З гектар на «працэнты» зараблялі за лета. Калі шанцавала з паласою — на карову і накошвалі. Ды яшчэ бульбоўнік з сядзібы, у садзе пад яблынямі нажне Маруся ношкі тры. Цяпер гэтае сена — праблема з праблем, хоць ты карову, хвост гэты, цягні

на базар, збывай. Па ім хоць заўтра, але Маруся ўпарціцца, бурчыць: «Летам унукі прыедуць — чым ты іх карміць будзеш? Кансервінай з крамы, як Чачорка тая...»

Чачорка — суседка, якая нядаўна вярнулася з Казахстана, куды з'ехала яшчэ перад вайной. Вярнулася не адна, а з «пяцерыком» дзяцей — тры сыны і дзве дачкі. Муж нібыта спіўся і памёр, не дацягнуўшы да пенсіі. Чачорка не трымае ні каровы, ні свіней, ні курэй. Жыве з усяго магазіннага, хоць і не скажаш, што яна гультайка. Кабета працавітая, але п'е. Пенсію атрымае — і ўжо дні тры чуваць з двара песні. Ды як зацягне-зацягне, такую тужлівую, горкую:

Ой, каб я ста-ла сі-вай зя-зю-ляй,
Каб я ўме-ла ля-та-ці...
Па-ля-це-ла б я ў чу-жу ста-ра-ну
Свай-го мі-ла-га шу-ка-ці-і, гох!..

Было б дзе накасіць сена — яшчэ б паўбяды. Не зломак жа сам ды, можа, калі б і Юрка з Магілёва падскочыў, тут жа недалёка. Але ў тым і загваздка, што няма дзе. У калгасе не даюць — Туземчык, старшыня, кажа: «Няма членам калгаса, не тое што прыхлябацелям». Вось і даводзіцца то купляць гатовае ў людзей, са стога ці ўжо з сянніцы, то на корані — так намнога дзешавей, але касіць і парадчыць трэба самому. І гойсаеш па навакольных вёсках, прапытваеш, хто прадаў бы сена. У Лютаўцах ляснік Федзька Кундзічаў, далёкі Марусін сваяк, зміласціўіўся: «Табе, Серафім, нічога не пашкадую... Выкошвай паляны каля Гарэльніка. Толькі хуценька ўбірай, а то яшчэ ляснічы прыдзярэцца...» Залога абрадаваўся: і блізка, за шашою Гарэльнік той, і «на свабодзе», як кажуць, не трэба па балоце суваццa, вочы выпорваць рагаззём. Пайшлі яны з Марусяю і паціху выбілі дзвюма косамі тыя прамежжы баразнаў, дзе былі пасаджаны сасоначкі. Акуратна, асцярожненька стараліся, каб не зачапіць касою ці не стаптаць тыя кволыя, мяккія, як хвошч, сасоначкі. Сушыць і грэбці Залога хадзіў ужо адзін, у Марусі разбалеліся ногі — чулі непагадзь.

Дажджы заляглі на цэлы тыдзень. Лілі бесперастанку. І цэлы тыдзень нерваваўся Залога, перажываў за сена — не столькі за тое, што прападзе яно, колькі за тое, што падводзіць Кундзюка — так Маруся па-сваяц-

ку называла Федзьку. Ужо дамовіўся і прывезці — з Пятром Клімаўскім.

Астуджаны цвярозлівым ранішнім халадком, Залога вярнуўся ў хату.

— Укусі чаго-небудзь,— пачуў ён жончын голас з-за перагародкі.— У халадзільніку студзень у місачцы...

— Укушу,— буркнуў у адказ. Але перш чым сесці за стол, ён закурыў. Любіў курыць на кухні, асабліва ўначы, калі не спіцца. І цяпер смачна зацягваўся, тоненька выпускаў з сябе дым. Ну і зараза, гэтае курэнне! Ведаеш, шкодзіць здароўю, якога і так мала, а кінуць не можаш. Ды што яму, здароўю гэтаму, не шкодзіць? Чытаеш, чуеш: хімія шкодзіць, дымы ўсякія шкодзяць, цяпер радыяцыя гэтая... Адны кажуць, шкодная, другія кажуць, доза малая. Граматныя, можа, і ведаюць, а ён, Залога, адкуль разбіраецца ў тых рэнтгенах ды мілірэнтгенах, пра якія ў газетах пішуць. Чорта ці зразумееш! Ходзіць чутка, што ў іх тут радыяцыя не перавышае норму, «адпавядае фону». Якая яна, тая норма, які той фон? Хто іх устанаўліваў? Электрыку калгаснаму далі спецыяльны прыбор, сундучок такі зялёненькі ў рудым скураным футарале. Ён і замярае кожны дзень гэтую радыяцыю, дакладвае ў сельсавет Лашкову, а той ужо звоніць у раён. Адтуль парады даюць. Во нібыта па некалькі кропель ёду трэба з вадою піць. Раз ці два і яны з Марусяю выпілі, пасмяяліся... Усё як бы не верыцца, што небяспека ёсць. Калі што сур'ёзнае завяжацца, навісне, то так не пакінуць людзей, і пра яго, Серафіма Залогу, паклапоцяцца... Улада ж народная — народу і служыць.

Дакурыўшы папяросу, Залога ўкінуў яе ў памыйнае вядро. Спаласнуў пад умывальнікам рукі, твар, выцерся мяккім махровым ручніком.

«Цяпер можна і кусануць»,— падумаў ён павесялелы.

## II

Як лёг Пятро Клімаўскі, позна вярнуўшыся з пасяджэння сельсавета, так і праспаў усю ноч. І, мабыць, праспаў бы гадзіну, на якую дамовіліся з Залогам, калі б не Насця. Яна ведала пра гэтую дамову,

тармаснула мужа за плячо: «Уставай, чалавек жа чакае!» Пятро спрасонку не ўцяміў, што хоча ад яго жонка, павярнуўся, абняў яе ніжэй грудзей. Насця не адкінула яго рукі, хоць і мружыў сон вочы. І так раўнуе яе мужык ледзь не да кожнага слупа. І нават, смех сказаць, да Серафіма Залогі. Пацеха, дый толькі. Серафім любіць зайсці ў хату, пагаварыць, жартам перакінуцца і падміргнуць. Жывы чалавек! Пятро неяк і ўбачыў, вызверыўся: «Што, другога захацела?» Сам нябось маладзіцца — на пятнаццаць гадоў ён старэйшы ад яе, Насці. Цяпер гэтая розніца, канечне, відаць, а тады, як жаніліся, мала хто сказаў бы, што яны не аднагодкі. Яна толькі што закончыла адзінаццаць класаў, была дзяўчына станаўкая, спелая. Яму было трыццаць два, і ажаніцца ды развесціся паспеў ужо, пакінуўшы двое дзяцей, але выглядаў ён молада — не піў, не курыў, з пшанічным густым чубам, чарнабровы, з твару не сыходзіла ўсмешка, зубы як часнок.

Прыглянулася Насця яму, улёг за ёю — затлуміў, угаварыў яе, нявопытную, маладую. Згадзілася стаць трэцяй жонкаю. Дзіцё нарадзілася, затым другое, трэцяе... І ўвесь яе форс. А вучылася ж добра, марыла ў медыцынскі інстытут паступіць. У бяссонныя ночы над калыскаю няраз журылася, нават адчай ахопліваў, дакарала сябе, што паспяшалася з гэтым замужжам. Але, не пабачыўшы свету, ніякіх спакус, лёгка і сумненні, сваё незадаволенне пераадольваць. Балазе такога мужыка, як яе Пятро, не ў кожнай вёсцы знойдзеш. На гулянках гарэлцы меру ведае. Грошы беражэ, капейку да капейкі складае — на машыну збірае. Выбралі вось дэпутатам у сельскі Савет. Носа тычкаю не дастанеш. І ёй гонар, і дзецям. Чым кепска за такім мужыком?

Толькі сэрца сваё, бабскае, не заўсёды разумела. Тады-сяды брала ўсё ж туга. Па мужчыну, невядомаму казаку тужыла. Можа, таму, што і нагуляцца не паспела яна, волю адчуць. Прыязджалі яе сяброўкі, што пасля школы ў горад падаліся: у модных туфельках, кароценькіх спаднічках, на мочках завушніцы, толькі і чуеш «чё» ды «чіво». А як пачнуць апавядаць, якія там у горадзе канцэрты, танцы, рэстараны — хоць плач, жыццё нямілае становіцца... «Абабілася ты, Настулька, у гэтай дзярэўні»,— так проста ў вочы ёй і гаварылі. Хто ведае, можа, гэтыя іх нараканні і давалі

ёй часам волю ў размове з мужчынамі, асабліва незнаёмымі, якія заходзілі на танцы ў клуб (яна тады працавала загадчыцаю). Не, яна сама не лезла сляпіцаю ў вочы, не скаліла зубы лішне, але ж які мужчына не зачэпіць позіркам ці словам такую мажную маладзіцу — падфарбуе вейкі, губы, кароткую сукенку з белым каўнерыкам апране, прычоску нафуфырыць. А былі такія нахабныя, што і прапаноўвалі сесці ў машыну, «праехаць у кусцікі». Яна не абуралася, не зневажала іх (такая работа!), а ўсё адсмейвалася. Але ж не з вока на вока такая перакідка слоўцамі ішла, а пры людзях, сваіх жа залівонаўцах. Вось, можа, які зламыснік і ўвёў Пятру ў вушы: «Ты глядзі, Пецька, а то твая Наста на чужых мужыкоў зырыцца...» Аднаго разу, нечага раззлаваны, прыскочыў проста ў клуб: «Марш, дурніца, дахаты, каб тут і нагі тваёй не было!» Яна, нядоўга думаючы, бац заяву ў аддзел культуры: «Па ўласным жаданні... дзеці малыя...» Папраўдзе, яно клопатна быць у вёсцы загадчыцаю клуба: то кіно, то канцэрт, то танцулькі... А дзяцей адных кідаць увесь час не будзеш — чуеш: там у разетку цвіком пырнулі, там хату падпалілі, там «аперацыю» зрабілі...

Пасля Пятро, мабыць, ужо і раскайваўся, што сарваў яе з «аўтарыцетнай» работы, да яго самога ўвагі паменшала, але ні разу не папракнуў, што сядзіць дома, нідзе не працуе. Другія мужыкі загрызаюць сваіх жонак, каторыя не працуюць, выпіраюць з хаты: «Ідзі зарабляй, я на цябе гарбіну гнуць не буду!»

Прачнуўшыся ад жончынага штурхання, Пятро адчуў, што на душы халадком ляжыць асадак ад учарашняга пасяджэння. Непрыемны, непажаданы. Рашэнне прынялі... Лясні громам гэтае рашэнне! Ён быў заікнуўся супраць, але яго ніхто не захацеў слухаць, «большасцю галасоў» пастанавілі: знесці помнік у вёсцы Залівонаўка. А каму баліць чужое? З дэпутатаў толькі ён залівонавец. Не старшыні Лашкову, не сакратару, дзяўчынцы той зялёнай, глядзець штодзень залівонаўцам у вочы, а яму... Мала гэтага. Знайдзі чалавека, які зрушыў бы помнік. Пяцьдзесят рублёў выдзелілі. Паспрабуйце, таварышы, знайдзіце. На словах дужа ўсё лёгенька.

Учора звечара турбота так не ела, толькі непрыемна было, што не па яго выйшла, не даказаў сваёй

праўды. Асадак цяжэў, і калі не перастаць думаць пра ўчарашні дзень, то зусім затопіць душу, абязволіць цела і сапсуе ўшчэнт настрой. А на сёння клопату даі божа. Во трэба ўставаць, ехаць Залогу па сена. За нос і так павадзіў чалавека, мабыць, ужо хопіць, даказаў, што не такі ён лёгенькі на падхват. А як ад іх атрэсціся, гэтых непрыемных думак?

Ён палажыў галаву жонцы на плячо, адчуў дзюбачкаю носа, як пульсуе ў яе на шыі кроў. Валасы яе пахлі канюшынаю і яблыкамі — учора насекла ў балоце рагазюлін і падперла галіны яблынь, каб, цяжэючы, не ададраліся. Малайчына! Насціна цела цёплае, пульхнае і падатлівае ад начной млявасці. Пятру прыемна, што ў яго такая маладая, налітая вабнасцю кабета, што не камусьці іншаму, а яму яна слугуе, належыць. Ён грабянуў жонку да сябе...

...Пакуль Пятро адзяваўся, мыўся, Насця сабрала на стол — такая ў іх сям'і завядзёнка: у якую б рань ні ўставаў гаспадар, гаспадыня павінна яго накарміць.

— Як чайнік закіпіць — зальеш у заварніцу,— сказала яна, захінаючы на пукатых грудзях халат,— а я пайду яшчэ прылягу... Хутка ўжо кароў будуць гнаць.— Яна глядзела на мужа, спрабуючы адгадаць, ці не злуецца ён, што яна пакідае яго аднаго.

— Ідзі лажыся,— дазволіў ён, стаяў перад люстрам, галіўся, задзіраючы галаву — праз каўнер сарочкі брыльком навісала складка скуры. Ён правёў па шчоках далонню — ці чыста пагаліўся.

— Ну, я пайшла...

Пятро глянуў жонцы ўслед, позірк зачапіўся за рудую плямку пад левым каленам — закарэлую балячку. Стала шкада жонку, учора ў балоце, мабыць, нечым паранула. Другая заела б, што за гаспадара робіць, а яна нават не сказала.

Еў Пятро з апетытам, падмёў усё на стале: і салату з зялёнай цыбулі, і яешню на сале, і місачку смятаны. Наверх выпіў вялікі кубак чаю.

Вокны з цёмна-фіялетавых сталі шэрыя — вачавідкі світала. Чэрвеньскія ночы зусім кароткія і пралятаюць хутка, толькі месяц ды зоркі яшчэ доўга не хочуць развітвацца.

Калі Пятро падышоў да трактара, там-сям у дварах ужо пакрыквалі на кароў бабы, звінелі вёдры. Гаспадыні, выганяючы на пашу, дояць кароў — толькі

тых, каторыя малочныя, са слабым вымем. Ідзе такая двору, а малако на зямлю цырк ды цырк.

Ён завёў трактар, даў матору прагрэцца і скрануўся з месца. З прычэпа тырчаў, як хвост стракозы, гладкі сасновы рубель, качаўся па заднім, абабітым жалезам борце.

Каля Залогавай хаты Пятро спыніў трактар, адчыніў дзверцы кабіны. Залога трымаў у руках двое вілак і скрутак белай тоўстай вяроўкі.

— Кідай усё ў прычэп! — крыкнуў Пятро.

Залога залез у кабіну, падаў руку.

— Дзе такую хвацкую вяроўку прыдбаў? — спытаў Пятро.

— А гэта мне сын, старэйшы, каторы геолагам, прывёз... з цягача яна ці адкуль. Гады ўжо два ў мяне.

— Такой вяроўкаю цэлае гумно сена ўвяжаш.

— Добра во, што дажджу няма,— абрадавана сказаў Залога.

— А колькі яму ўжо быць! І так радыяцыі насыпаў...— Пятро ямчэй ухапіў руль, прыціснуўся спінаю да мяккай падушкі сядзення.— Сена не дае ўбраць. Латва, хоць сілас навучыліся таптаць. Жыта ўсё палягло... Я гараж сабе ўсё ніяк не пачну... Як выхадны, так дождж.

— Купіў машыну хіба?

— Яшчэ не купіў, але думаю... Хутка чарга падыдзе. Трэці я...

— Табе як дэпутату можна без чаргі,— усміхнуўся Залога.

— Гэта вам, ветэранам, усё без чаргі,— незалюбіў чамусьці, з'яхіднічаў Пятро,— а мы простыя смертныя.

— Колькі нас, гэтых калек, засталося... Можа, чалавек якіх пяць на сельсавет.

— Шэсць,— удакладніў Пятро, і ў голасе пачуўся гонар, што ён ведае, мае дачыненне да інвалідаў.— Учора якраз засядалі ў сельсавеце... Што ды як, гадавіна Перамогі надыходзіць.

Залога ўздыхнуў. І дагэтуль не вельмі вясёлы, ён зусім замаркоціўся. Сон успомніў. Часта яму сніцца, як у яго снайпер цэліць, а потым санітары пад пахі бяруць...

— А я цябе сніў сёння,— сказаў ён, павярнуўшы твар да Пятра.

— Мяне? — здзівіўся той.— Што гэта ты, дзядзька? Калі б маю Насцю, дык яно б зразумела,— сказаў як быдта з жартам, але відаць было, што на душы ў яго набалела. Адчуў гэта Залога, але не паказаў выгляду, незадаволена кіўнуў:

— А мабыць, думаю шмога... Ці будзе дождж ды ці паедзеш... раптам трактар не завядзецца,— з'ехіднічаў Залога, бо ведаў завядзёнку мясцовых трактарыстаў: не хоча ехаць — кажа, трактар не завёўся.

— У мяне таксама клопату хапае! — сказаў Пятро такім тонам, каб паказаць Залогу, што не трэба яму ныць і не толькі яму цяжка жывецца.— Цэглы ніяк не магу дастаць...

— З цэглаю таксама праблема,— згадзіўся Залога.— У мяне ў лазні печачка асела, і во некалькі цаглін не знайду. А ў вас жа транспарт у руках — паехаў ды прывёз.

— Ажно ў Гомельскую вобласць? Цяпер не так проста... Там жа зона...

— Дык жа, мусіць, Карма не ўваходзіць, не?

— Хто ведае...

Яны ўжо праехалі вёску, мінулі могільнік і дарогаю праз густы сасоннік пад'язджалі да шашы. Галіны сцябалі па кабіне, набліжаліся так блізка, што Залогу здавалася — зараз каторая хвосне па вачах. Пятро быў спакойны, пільна сачыў за дарогаю — не такая яна і шырокая, камлі ў сасонках вунь спрэс абскубленыя, паабдзіраныя. У святле ад фар, быццам папяросны дым, плыў туман.

Перад уз'ездам на шашу, акурат у вялізнай лужыне, Пятро спыніў трактар — хоць і рана, але мала якая машына будзе бегчы,— святло левай фары выхапіла з туману помнік — шыракаватую сцяну з конусным вяршком. Туман быў рэдкі, і помнік добра вырысоўваўся. Залога правёў позіркам па яго абрысах — востра, як бы лобзікам рэзаў. Здаецца, кожная шчарбінка знаёмая на ім, кожная цаглінка помніцца...

Гэты помнік гадоў дваццаць таму мураваў ён, Серафім Залога.

— Стой-ка! — Залога крануўся Пятровай рукі.

— Што такое? — павярнуўся той.

— Спыніся, Пецька...

— Кепска стала ці, можа... прыпёрла?

Залога не зводзіў вачэй з помніка.

— Я спазнюся на нарад! — упарціўся Пятро.

— Мне на хвілінку.

— Дай жа хоць шашу пераехаць,— незадаволена сказаў Пятро, але відаць было, што паслухае Залогу, спыніцца.

Залога вылез з кабіны, патрухаў да помніка. Даўнавата ўжо не хадзіў сюды, гэтай дарогаю, дык і не бачыў помніка.. А не бачыш, то здаецца, усё добра. Нават жа на больку забываеш, пакуль не зачэпіш.

— Гаспадары, ліха матары!..— вылаяўся ён, азіраючы помнік.— Ты хочаш, каб ураджаі, надоі паднялі, тут во...

Фарба на помніку аблушчылася, там-сям адпала шатроўка, агаліўшы цагліны, і распаўзліся, бы язвы, цьмяна-рудыя плямы. Каля помніка валяўся даўнішні ссохлы чорны вянок, праўдзівей, ягоны шкілет, абвязаны алюмініевым дротам.

У Залогі нервова заварушыліся пашчэнкі. Ногі ў самога ўжо не ходзяць — няма калі глядзець. Яшчэ гады два назад ён гаварыў дырэктару школы, Грыню: «Прывядзіце ў парадак помнік».— «А што мне? Указанне школе будзе — будзем даглядаць»,— адказаў той, спакойна падгрэбваючы пяцярнёй навісь густых чорных валасоў. Усе, бач, указанняў чакаюць ад некага! А самі? Што, у самога галавы няма ці рукі адсохлі б? Гэта новы дырэктар такі, Грынь, прыезджы чалавек... Ранейшы, Вілюхін, не чакаў, пакуль яму нехта загадае. Вучняў змабілізуе, настаўніка працы за камандзіра — і пайшлі. Абгародку падфарбуюць, дарожку пяском пасыплюць, узімку ад снегу ачысцяць, вясною кветкі пасадзяць... Люба-дарага глянуць! І перад чужым чалавекам не сорамна, людзі спыняліся, чыталі прозвішчы, успаміналі... Папраўдзе, бадай, Вілюхін першы і падняў трывогу. Падсеў аднаго разу да Залогі на лавачку і гэтак заклапочана гаворыць: «Што гэта, Серафім Данілавіч, мы рабіць будзем?» — «А нашчот чаго?» — «Ды помнік наш у запусценні. Столькі гадоў глядзелі, а цяпер...» — «Гэта не парадак, няможна так...» Дзіва, але Залога не даў тады вілюхінскім словам строгай увагі, не хацелася верыць ім. Але недзе ў глыбіні душы засела балючая стрэмка, якая вярэдзіла, не давала спакою, іншы раз гнала да помніка глянуць, што там з ім, пустазеліну каля яго вырваць хоць бы. Але ж клопату яму, інваліду, хапала

ўсякага, любая макуліна давалася з натугаю, і на нейкі час ён забываўся пра помнік. Не на вачах жа ён, помнік, а наводдаль ад вёскі, каля шашы; адно калі ў лес выправішся ці кароў на луг пагоніш, бывае, што ў грыбы на Шахты пойдзеш,— тады і ўбачыш, сэрца абальецца крывёю. Але спакваля большая турбота выцясняла з думак меншую.

І вось зноў... Як магнітам, прыцягнуў помнік Залогаў позірк да сябе. Залога не чуў, як падышоў Пятро, стаў поплеч, як у ганаровую варту.

— Што молішся, дзядзька? — спытаўся ён заліхвацкім голасам ды, глянуўшы на Залогу, зразумеў, што не да жартаў. Але ж і плакаць, здаецца, не было з-за чаго — помнік сваё адстаяў, службу сваю саслужыў.

Залога неяк асцярожна правёў далонню па вільготнай каструбаватай сцяне, памацаў шчарбіны на канціку стэлы. Каляны ком падкаціў яму да горла, ажно нясцерпна забалела ў ямачцы пад кадыком. Залога каўтнуў — і раптам бліснула ў вачах, як гарачаю спіцаю праняло галаву са скроні ў скроню, і ён пачаў задыхацца. Хáваў ротам, як стары певень ад спякоты,— удыхаць, здаецца, можна было, а выдыхаць не даваў пракляты ком.

— Э-эй, дзядзька!..— Пятро хапіў яго за плечы, страсянуў.

Залога не мог прамовіць слова, вочы лезлі на лоб, ад напругі з іх пасыпаліся слёзы. Пятро грымнуў кулаком яму між лапатак.— Што, слінаю падавіўся, не ў тое горла пайшла?..

Добра, што падтрымаў Пятро — Залога не ўпаў. Пракаўтнуў ком і адчуў, што ён не выскачыў, а нібыта як распёкся па грудзях.

— Чор-р-рт, горла... здушыла,— прахрыпеў ён, выціраючы костачкамі кулака слёзы.

Калі селі ў трактар і ад'ехалі, Пятро, глянуўшы колькі разоў на Залогу, сказаў:

— Дарма перажываеш, дзядзька, помніку ўжо ўсё роўна капцы.

— Якія капцы? — Залога як застыў, баяўся варухнуцца, каб нешта важнае не прапусціць.

— Рашано зліквідаваць,— сказаў Пятро ўпэўненым голасам, быццам ён і праўда быў усемагутны бог.

— Кім рашано? — Навіна была такая нечаканая, што Залога падумаў, быццам Пятро з ім жартуе.

— Намі... учора.

— Вы што там, здурнелі ўсе? — Залога, усё яшчэ не верачы Пятру, на ўсякі выпадак пярэчыў яму, ліхаманкава прыпамінаючы тую даўнюю размову з Вілюхіным.

— Я быў супраць, але... Адзін. А ратоў многа, перакрычалі.

— Лухту пляцеш,— сказаў Залога павесялелым голасам.— Такую дурноту ніхто не дазволіць.

Пераязджалі Майдан — топкае, гразкае месца, і Пятро паддаў газу. Матор зароў, трактар закідала ў бакі, як на шалях, і Залога ўчапіўся за ручку дзвярэй.

— Назад ці праскочым? — спытаў, але без трывогі ў голасе: думаў пра помнік.

— А дзе мы дзенемся! — зухавата адказаў Пятро. Залога заўсёды дзівіўся з такіх людзей, якія ніколі ні ў чым не сумняваюцца, ва ўсім упэўнены, на ўсіх даплююць і не шманаюць. Ні табе перажыванняў, ні дакору, ні маркоты.

Трактар папоўз угару, натужна выючы,— адразу за Майданам дарога пайшла пясчаная — вясною і летам у дождж вада намывала сюды пяску — чысценькага, жоўценькага, хоць лажыся і загарай. Каровы не дурні, пратапталі сабе сцежкі збоч — глыбокімі канаўкамі-шнурамі яны віднеліся ў траве. Узгробшыся на пагорак, трактар лёгенька, як бы ўпадскок, пакаціў па цвёрдай, гладкай, бы асфальт, дарозе, на якую з бакоў навісалі шырокія лісты трыпутніку.

На сэрцы ў Залогі скраблі кошкі.

— Дык вы гэта... праўда?

— Ну, канечне, дзядзька, праўда! — трохі незадаволена адказаў Пятро.— Вось табе гавары, а ты дагары.

Залога вопрама глянуў на Пятра: вочы ў таго строгія, нават — як і голас — незадаволеныя. Факт, не хлусіць чалавек, не разыгрывае. Пятро быў здольны на такія фокусы, але атрымлівалася ў яго гэта бязглузда, а то і зняважліва.

— А калі? — спытаў Залога шорхлым голасам — такі бывае ў чалавека, які стаіць перад безвыходнасцю.

— Ото! І грошы выдзелены, як паложана... За работу!

— Гэты нумар вам, хлопцы, не прайдзёць!..— зацятым шэптам, пагрозліва вымавіліся ў Залогі словы, адрасаваныя невядома каму.

— Табе, канечне, шкада помніка, разумею... Мураваў жа, як-ніяк, пацеў, руку трудзіў,— шчыра паспачуваў Пятро, але не расчуліў Залогу, а наўпярок, развярэдзіў ушчэнт.

— Пры чым тут мураваў? Я... пяты ці дзесяты! Куры ж нас засмяюць... Стой, стой! — раптам замахаў рукою Залога: прагледзеў ледзь прыметную ў траве дарогу, на якую трэба было зварочваць у лес. Пятро рэзка затармазіў, і ў Залогі зляцеў з галавы картуз. Пятро даваў назад рыўкамі, і трактар трэсла; не перастала трэсці і тады, калі ён пакаціў па лясной дарозе-просецы, на якой вузлаватымі гарбякамі павыткнуліся з зямлі карэнні сосен. Між каляінамі стаялі зусім маленькія бярозкі з шырокім чырванаватым ліс-цем, трактар прыгінаў іх, ззаду яны тут жа выпростваліся; абапал густа раслі жоўтыя ад цвету кусты казяльцу. Лёгкая белаватая парнасць стаяла ў лесе, а праз якую хвіліну-другую яе праніжуць сонечныя промні, і яна ўміг раз'ясніцца, счэзне. Калі б не ехаў, а ішоў такой парою па лесе — колькі чаго наслухаўся б: і птушынага спеву на ўсе лады, і дзятлавага барабаннага стукату, і цвыркання конікаў, і нават лісінага цяўкання... А трактар заглушае ўсё, толькі яго і чуеш, а да ўсяго астатняга ты — глухі.

Высокі лес скончыўся, пабегла сасновая маларось — Гарэльнік. Сасонкі знізу чорныя, як галавешкі, там-сям засохлыя —ігліца аранжавая, быццам вавёрчына футра, а на каторых бледна-зялёная. Гады чатыры назад тут быў пажар. Полымя гуло, стагнала, жэрла, падмятала начыстую — і дрэвы, і кусты, і траву, і пні... Людзі з навакольных вёсак, пажарныя з двух раёнаў тушылі яго, а яно ўзяло сабе ў хаўруснікі і полымя ваеннае — у зямлі з вайны засталося шмат патронаў і нават мін, яны рваліся, нагрэўшыся, свісталі над галавою кулі і асколкі. Аднаго пажарнага параніла ў плячо.

Полымя збілі, абмежавалі, як тады казалі многія, «лакалізавалі», але вялікая плаха лесу аказалася мёртвая, і цяпер яна пакрысе ажывала. Над густым

слоем жоўтай сухой іглiцы зазеляняслі чубчыкі травы, няспечанае ў зямлі карэнне пусціла кволыя, празрыстыя адросткі з мяккімі калмаценькімі лісцікамі.

Як на абгарэлага чалавека, так і на лес сумна, балюча глядзець.

Усё сплялося ў адзін клубок — чэпка, як шышкі лапухоў: помнік, пажар, вайна... Залога затлуміўся і не ведаў, пра што цяпер думаць. З ім бывалі такія хвіліны разгубленасці і раней.

За Гарэльнікам раскінулася ляда — сядзелі, як дзяды, шырокія чорныя пні. На ім і была Залогава пожня. Стажок ён паставіў ускрай у маладым асінніч-ку, каб не надта кідаўся ў вока. Стажок, дзякуй богу, стаяў — злёгся, прысеў, акурат схаваўся. Але Залога ўбачыў яго з акна кабіны. Нездарма наймаў чалавека, ехалі. На барознах трактар падкідвала так, што Залога даставаў галавою верхнюю абшыўку кабіны, баяўся разбіць плафон.

Пятро спрытна аб'ехаў стажок і спыніў трактар — прычэп апынуўся акурат насупраць стажка. Прафесіянал, нічога не скажаш. Другі тузаецца, тузаецца, і стажок разваліць, тады скубі тое сена, не бяшчэ і стажок разваліць, тады скубі тое сена, не бярэцца на вілкі.

Залога, пакуль Пятро ляскаў нечым у кабіне, узгробся на прычэп, скінуў рубель, вілкі і вяроўку. Злезшы, узяў адны вілкі, другія ўдзяўбнуў у зямлю крыху воддаль, там жа кінуў і вяроўку. Стажок і сапраўды быў пласкаваты, як ляпёха. Залога, ускінуўшы высока ўгару вілкі, лёгка, як у ваду, усадзіў іх у стажок. Напяўшыся, сарваў вяршок і кінуў яго ў прычэп.

Сена добра, пластамі, бралася на вілкі — адна любата яго грузіць. Пятро поркаўся ўжо каля трактара, тузаў шлангі гідраўлікі. Залога не-не дый пазіраў на яго. Не цяжка грузіць, але не парваўся б і Пятро, калі б ускінуў пару якіх ахапкаў. Па краі сена абмылася даждам, белаватае, а ўсярэдзіне зялёненькае, пахучае, як чай, адным словам — ядкое, як у іх кажуць.

Паўстажка адабраў Залога і адчуў, што аслабелі рукі — не жалезныя, аказваецца, ён, ды і гады не тыя. Зняў пінжак, кінуў на зямлю каля вяроўкі. На плячах кашуля да цела прыліпла — упарыўся.

Пятро адышоў ад трактара, сеў на пень. Відаць, не ведае чалавек, да чаго рукі прычаліць, чым заняцца.

Не ўцярпсў Залога, не то жартам, не то ўсур'ёз сказаў Пятру:

— Вазьмі-ка, Пеця, вілкі.

— Ану іх к бесу! — адказаў той з надрывам у голасе, бо ўжо сам нямала перадумаў за гэты час, падсабляць чалавеку ці не, і ўсё-такі намерыўся не падсабляць і цяпер адным махам, як вострай сякерай, хацеў адсекчы ўсякія спробы ўпрасіць яго. Але Залога не збіраўся яго ўпрошваць — не ўмеў, не той быў натуры. Прывык цягнуць сам, браць на сябе.

— Ну глядзі, як сабе хочаш...— сказаў спакойна, каб і намёку не было на крыўду. Такое слова, як «крыўда» яму было не зразумелае.

— Усім не нападсабляешся,— апраўдваўся Пятро. Устаў, адламаў гнуткі асінавы атожылак, сашмаргнуў лісце і засцёбаў ім па халяве бота.— На тым тыдні Чачорцы дровы прывозіў дык грузіў... во рука баліць, сагнуць не магу.

Залога нічога не адказаў, адно картуз з галавы сарваў, гарэзна шпурнуў яго высока ў паветры, мяркуючы, што ён (бы ў фокусніка), завісне на вілачніку; але картуз толькі брыльком ударыў па вілачніку і чмякнуўся ў траву, шэра гарбаціўся там, быццам вожык. Валасы ў Залогі прыліплі да лба, але неўзабаве, падсушаныя сонцам, матляліся ўжо ад лёгкага ветрыку. Сена шуршэла, разлівалася ў паветры апойным водарам мяты і чабору.

«Не дурні былі старыя людзі, калі заварвалі і пілі ўсякія зёлкі... маці мая»,— падумаў Залога з нутраною радасцю, што ўкасіў добрага сянца.

Калі браў на вілкі апошні, самы ніжні пласт, з-пад яго вышмыгнула вялікая бурая мышка, пашылася, як вуж, па траве. Пятро ўбачыў яе і пагнаўся за ёю, б'ючы па зямлі асінавым дубчыкам. Нарэшце лучыў па мышцы — яна запішчала, і піск яе шкадобаю адазваўся ў Залогавай душы.

Калі Пятро вярнуўся, зашпільваючы на штанах папругу, Залога падграбаў ужо вакол прычэпа сяніны, браў у жмут і засоўваў за борт. Пятро падняў рубель і ззаду ўссунуў яго на прычэп.

— Не так і многа сена, без рубля абышліся б,— сказаў ён тонам знаўца,— вяроўкаю поперак перахвацілі б разы тры...

— Табе відней,— не стаў пярэчыць, згадзіўся За-

лога. Ці ад таго, што прытаміўся, ці што работу скончыў, яго агарнуў сум. Дзіўна, нейк адразу апала ўсё ўсяродку, счарсцвела. Не радавала і прыгожасць асветленага мяккім сонцам ранішняга лесу — бялюткія кроплі расы на зубчыках лісця, бліскучае зялёнае палатно папаратніку, духмяны водар жывіцы, у які ледзь-ледзь — толькі на чуйны нюх — дамешваўся пах забурэлых каля пнёў суніц, жоўтыя мятлушкі, якіх невядома адкуль наляцела на паляну столькі, што ажно мільгацела ў вачах,— дык вось, нішто не радавала Залогу, нічога ўжо не прымала душа, быццам у ёй не было ніколі месца ўсяму гэтаму. А было ж, ведаў ён — было, і было б сёння, калі б не гэтая Пятрова навіна пра помнік. Ну, так, канечне... А чаго яшчэ? Ах, можа, і радыяцыя? Але яна трывожыла пакуль зрэдку і нядоўга. Сена ўхапіў, дзякуй богу, дажджу непрадбачыцца, укіне ў сянніцу сухенькае.

Залога, з крэктам сагнуўшыся, узяў вяроўку, развязаў — асталася ў кальцы, як аркан; падлез пад прычэп спераду і прывязаў канец за прыбіты на дніпчы крук. Пятро тым часам заматаў вяроўку на камель рубля, і Залога, перайшоўшы на другі бок, накінуў вяроўку на другі крук; устаў і, ухапіўшыся дзвюма рукамі за вяроўку, шмаргануў яе ўніз, а Пятро пацягнуў на сябе, каб не сарвалася з крука. Рубель уціснуўся ў сена — паніжэла спераду. Потым прапусцілі вяроўку пад дніпічам і такую аперацыю правялі ззаду прычэпа.

— А ў цябе, Данілавіч, жывічка яшчэ ёсць! — падахвоціў Залогу Пятро, калі той вылез з-пад прычэпа,— на галаве і на плячах у яго густа наліпла сянная пацяруха, за сівыя валасы на скроні зачапілася тонкая былінка, матлялася. Залога прамаўчаў, не да жартаў было, дый Пятро сказаў гэта не ад весялосці, а каб апраўдаць сябе. Усё-ткі, мабыць, тачыў душу чарвячок — не прычыніўся, не падсобіў чалавеку грузіць.

У кабіне сядзелі моўчкі. Пятро, мабыць, прымеркаваў, што Залога пакрыўдзіўся, а на самай справе Залога перажываў за помнік, толькі пра яго і думаў. І чымся бліжэй яны пад'язджалі да шашы, тым большы неспакой агортваў Залогу, нейкая хваравітая боязь глянуць на помнік ледзь не трэсла яго. Ён сядзеў разгублены і нацяты. У нейкае імгненне яму здавалася, што помніка ўжо няма, на яго месцы свежая шэрая

пляма, пагурак, як ад магілкі. Ехаў бы гэты Клімаўскі другой дарогаю! Кружна, затое і на Майдане не рызыкаваў бы.

Але — помнік стаяў. Сонца, прабіваючыся скрозь густую вяршаліну сасны, цьмянымі водбліскамі гуляла па ім. З начы ён быў сыры, нейкі ацяжэлы і маркотны.

Трактар тузануўся, скалануў Залогу і як бы абудзіў яго. Ён кашлянуў — у горле пяршыла.

— Што, дзядзька, зноў раскіс? Усё пра помнік свой думаеш? — падобна, Пятро разумеў, што турбуе, гняце Залогу.— Не перажывай, новы паставяць...

«Новы няхай ставяць,— падумаў Залога,— але і гэты навошта разбураць...»

На пясчанай дарозе за трактарам аставаўся чорны, стракаты след — адліпала гразь, што набралася на колы, калі пераязджалі Майдан. Зялёненькія, абмытыя з начы расою, стаялі маладыя сасонкі з сінява-матавай ігліцаю. Белымі, як марля, лапікамі на іх наклеілася павуціна, там-сям на галінах, што вольнічалі над дарогаю, віселі сяніны.

Каля двара Залога скамандаваў, куды пад'язджаць. Вылез з кабіны і стаў наводдалі. Прычэп здрыгануўся, пачаў спераду падымацца.

Выйшла з хаты Маруся, прыхінулася плячом да частаколу. Твар у яе белы, з прыкметнымі ліловымі жылкамі, даўгаваты нос дзюбачкаю ледзь не дастае верхнюю губу. Маруся паглядвала то на мужа, то на кабіну.

Лёгенька газуючы, Пятро скрануў з месца трактар, і сена папаўзло з прычэпа, шухнула — і вялізнаю буханкаю асела на зямлю. Калі б заплюшчыў вочы, магло б здацца, што ты на лузе — так запахла...

Белая, бы рука, утулка падпірала прычэп. Яна пачала меншаць, карацець, і прычэп займаў сваё звычайнае становішча. Вылез з кабіны Пятро, ляпаў на грудзях па куртачцы, быццам атрэпваўся ад пылу.

Залога, сустрэўшы жончын позірк, кіўнуў на Пятра. Маруся зразумела гэты мужаў намёк. Хуценька падышла да Пятра і дала яму пяцёрку. Ён узяў, засунуў у нагрудную кішэню і заплікнуў борцік.

— Можа, у хату зайдзеш? — няўпэўнена запрасіла Маруся, хоць і ведала, што Пятро Клімаўскі ад пачосткі адмаўляецца. Але ж і пакрыўдзіцца можа, што ма-

ла заплацілі: неяк дужа спакойна, як курэц папяросу, узяў ён грошы.

— А не трэба! — адрэзаў Пятро, быццам яму абрыдлі ўсякія такія запросіны. Шырокімі крокамі пайшоў да трактара, лёгка скочыў у кабіну, быццам яго спружына падкінула, і, развярнуўшыся, пакаціў у напрамку фермы.

— Чорт ім уладзіць,— прабурчаў сабе пад нос Залога.— Абрыдзелі гэтыя трактарысты-матарысты... Гаспадары!

Ён акуратна скруціў вяроўку, зачапіў яе пятлёю за частаколіну.

— Куды будзем складаць? — спытаў у жонкі.

— У сянніцу. Я старое з дна адабрала... з ношкі дзве было, ускінула на вышкі.

— Ці ёсць што папіць? — Адчуў, у горле перасохла, ажно балюча глытаць.

— Бярозавіку слоік дастала з пограба... ледзь не забілася, абшаснулася з лёсак.

— Трэба табе.. Сам бы злазіў.

Залога любіў бярозавік, і Маруся хацела яму ўладзіць. Яны кожную вясну ставілі бярозавік, у Шарыпчынай Грыве. Далекавата. Але ці шмат ім трэба таго бярозавіку? Вёдраў дзесяць якіх. Памаленьку наносяць у бочку. Усыплюць туды падсмажанага на патэльні аўса, скарынак хлеба накідаюць. А як закісне бярозавік, пераліваюць яго ў трохлітровыя слоікі — даўжэй стаіць, лічы, цэлае лета. Рэзкі, халодненькі. Вып'еш — і амалодзішся гадоў на пяць. Што застаецца ў старасці — адно суцяшаць сябе?

Залога цяжкаю хадою пасунуўся ў сенцы. Там на лаўцы стаяў вільготны слоік з бярозавікам. Ён узяў слоік і, баючыся, каб не выкаўзнуўся з рук, стаў піць набгом, аддзімаючы белыя крупінкі бросні. Цурочак праліўся яму на грудзі. Аддыхаўшыся, Залога павесялеў: «От, брат, напу́гаўся!»

Маруся на вуліцы з некім гаманіла. Прыйшла Чачорка. У руках яна трымала вілкі з крывым доўгім вілачнікам.

— Ці прымеш, Данілавіч, у падзёншчыкі? — заўсміхалася Чачорка яму. Яна невысокая, паўнаватая, але твар маршчыністы, сухі, як спечаны. Між парэпаных вуснаў жаўцізною свецяць шчарбатыя зубы, і такі рот больш за ўсё старыць Чачорку. Сапраўднае яе

прозвішча Чачора, але за пранырлівасць атрымала мянушку — Чачорка.

— Падсоб, падсоб,— лагодна сказаў Залога, не першы раз прымаючы дапамогу ад суседкі.

— Ну ў Марусі ж, жаліцца, ногі баляць...

— Я палезу таптаць,— сказала Маруся: не магла ўявіць, што сена ўпарадкуюць без яе.

Гледзячы, як Чачорка ёмка падчэплівала вілкамі сена, брала на плячо і несла амаль не згінаючыся, Залога дзівіўся: «Якая яна працавітая, гэта выпетраная маленькая жанчынка!.. Глянеш — здаецца, вецер садзьме, а па сіле не кожны мужчына справіцца з ёй».

У сянніцы, мабыць, было душна і пыльна, бо Маруся раз за разам гучна чхала: «Аа-а... эсь! А-а... эсь!»

Чачорка пасмейвалася сама сабе.

Набегла курэй, грэбліся каля сена, шукалі абцярушанае насенне, жучкоў і кузурак. Чорны з агністым хвастом певень клахтаў, знайшоўшы спажыву,— падбягала кура, і ён чарціў вакол яе пруткім рыфленым крылом. Курэй на гарод не пускалі, і тут, на пахучай сянной трасянцы, ім была вольніца. Яны таўкліся пад нагамі, і Залога замахваўся на іх вілачнікам. Яны адскоквалі, узмахам крылаў паднімаючы пацяруху.

— Глядзі, каб хмара вунь не зашчучыла,— сказала Чачорка і кіўнула на неба — за гароды.

— Цяпер няхай...— усміхнуўся, але без радасці ў голасе сказаў Залога.— Сена ўкрылі. Табе дзякуй, што падсобіла...

— Неблагая я суседка, Данілавіч, праўда? — прыкрыла далонню шчарбаты рот Чачорка, радая, што Залога ацаніў яе старанне.

— Лепшай і не знойдзеш! — падахвоціў яшчэ больш Чачорку Залога. Умеў ён гэта рабіць і ведаў, што трэба чалавеку за яго ласку гаварыць добрае слова.— У мяне захавалася калінавая настоечка... Такой суседцы не грэх і наліць.

— Не трэба мне, Данілавіч.— Чачорка засяроджана падграбала граблямі рэшткі сена — на зямлі асталіся роўныя палоскі, якія куры тут жа забэрсвалі.

— Я думаю пасля абеду ў раён пад'ехаць, дык...

— Ну мы ж тут блізка, суседзі, нідзе не дзенемся,— сказаў Залога, намякаючы Чачорцы, што на адплату ён не забудзе, калі-небудзь і ёй падсобіць.— А што ты ў горад? — Лезці з роспытамі да людзей За-

лога звычайна не любіў, але ён тонка адчуваў, калі чалавеку якраз прыемна будзе выспавядацца, нечым пахваліцца.

— Ціплят паеду купляць, інкубатарных...

— І ты гаспадарку заводзіш?

— Ай, Данілавіч, жыць жа трэба... Во Люся мая кажа, хлопца знайшла, можа, замуж пойдзе... А так бы...

Прызнацца, Залога і сам няраз лавіў сябе на думцы, што ў яго менш і менш жадання на тузаніну з гэтай гаспадаркаю. Ні сена, ні камбікорму. І карову, і свіней, і курэй — усіх трэба хлебам карміць. Хоць каравул крычы — шкада кідаць буханку хлеба ў чорны, завэдзганы чыгун. Быццам што жывое на пагібель у пельку кідаеш. І так кожны раз... Праз сілу, пакуты, заплюшчваючы вочы, але кідаеш... А што рабіць? Кінуць-рынуць усё ды падацца ў горад, можа, у Магілёў да Юркі? Месца хопіць, трохпакаёвая кватэра ў яго... Што гэта такое стала? Раней жа прывозілі ў краму муку — і прастамолку, і белую... Белую на бліны, а прастамолку — свінням, карове ў пойла падсыпалі. Няўжо выгадна стала буханкі жыўнасці скормліваць? Дзе які дурань сядзіць, што дазваляе такую нягегласць?

Пакуль сена насіў ды з Чачоркаю перакідваўся словамі, Залога забыўся на помнік. А ў хату зайшоў — і завіхурылі думкі... Як жа гэта так, ні з кім не параіўшыся, не спытаўшы ні ў кога — узяць і шах-мах? Колькі ўжо такімі бойкамі, дурнымі замахамі дроў наламалі на яго вяку? Абразуміцца калі-небудзь люд ці будзе ўвесь час шарахацца з боку ў бок? Можа, плёткі, лухта ўсё гэта, што Пятро Клімаўскі сказаў? Можа, разыграць яго, старога, захацеў?

— Кажуць, помнік наш зносіць будуць,— сумным голасам сказаў ён жонцы.

— Я не чула.

— Клімаўскі во сказаў...

— А што ён, еты помнік?

— Ды чорт іх ведае каму ён замінае! — выдыхнуў Залога, адчуваючы, што грудзі распірае злосць.

— Нехта ж во дадумаўся...— ціхім голасам сказала Маруся.

— Каўзануся я да Вілюхіна, можа, ён што ведае.— Залога траціў цярплівасць.

— Сядзі ты ўжо! — асадзіла яго Маруся.— Лэхаеш па дварах. Хіба паможаш?

— Ну ведаць жа трэба!

## III

Хмара, якая была ўстрывожыла Чачорку, прайшла бокам, і здалася яна страшнай, цёмна-сіняй толькі таму, што ішла насупраць сонца. Цяпер неба было яснае, дзе-нідзе падбеленае лёгкімі празрыстымі, як ільдзінкі, воблачкамі. Высока ў сіні маленькімі чорнымі кропкамі мільгалі ластаўкі. У Шарыпчынай Грыве тужліва кукавала зязюля.

Вілюхін быў дома — калоў на двары дровы. Ляжала пры пуні цэлая гара тоўстых чырвоных на зрэзе альховых цурбакоў.

— Залога так не ходзіць, значыць хоча нешта ўзяць ці даць у залог! —абрадаваўся ён госцю. Удзяўбнуў у калодку сякеру, падаў Залогу руку. Яны ніколі не лічыліся блізкімі сябрамі, але адносіны між імі былі шчырыя, прыязныя. Калі працавалі ў школе — Вілюхін дырэктарам, Залога гаспадарнікам — бралі нярэдка чарку. Тады-сяды да іх далучалася і повар школьнай сталоўкі Зоя Кухцік. Яе прыпісвалі Вілюхіну ў палюбоўніцы. Залога няраз бачыў дырэктара ў школе і позна вечарам, і зусім рана, калі Кухцік рыхтавала дзецям сняданак, але гэта яшчэ нічога не значыла. Наўпярок, рабіла Вілюхіну гонар: вось гэта дырэктар, днюе і начуе ў школе. Залога нідзе не абмовіўся нават словам, хоць здаўна варагаваў з Зойчыным мужыком, Мішкам Кухцікам, не мог яму дараваць аднаго выступлення, яшчэ ў пару, калі ён, Залога, быў за брыгадзіра трактарнай брыгады.

Вілюхін пра гэта ведаў і шанаваў свайго гаспадарніка. Не прымушаў, каб той «ад званка да званка» сядзеў у школе ці туляўся па двары. І Залогу гэта было нáруку — у маладзейшыя гады ён многа каму ляпіў печы, рабіў рамы і ліштвы, зарабляў лішнюю капейку. Сыны вучыліся, жылі на прыватных кватэрах, і грошы былі край патрэбны.

Дырэктарства сваё Вілюхін скончыў няўдала — яго знялі. Не школа была ў гэтым вінаватая, якраз пры ім яна мела добрую славу. Прычына другая. Выбіралі дэпутатаў у сельскі Савет, і Вілюхін быў старшынёю

выбарнай камісіі. Калі камісія пайшла абедаць, нехта пранік у пакой, дзе стаяла урна з бюлетэнямі, і павыкрэсліваў вылучаную ў дэпутаты жонку шафёра, які вазіў старшыню калгаса і быў на прывілеяваным становішчы. Гэта многім не падабалася, і так бязглузда яны здзейснілі сваю справядлівасць. Экспертыза даказала, што выкрэслівала адна рука.

Вілюхіну аб'явілі суровую партыйную вымову і з дырэктараў перавялі ў калгасныя брыгадзіры. Але неўзабаве ён перанёс інфаркт, і яму далі групу. Здаецца, ён не вельмі сумаваў на гэтай вымушанай пенсіі.

— Ці чуў ты, Казіміравіч, што помніку нашаму нібыта каюк?

Вілюхін засунуў у кішэню штаноў руку, пачаў часаць сцягно — была ў яго такая прывычка, засталася ад вайны, з часоў нямецкага палону, калі галодная рука шукала ў кішэні (часта ўжо бясцямна) крошкі хлеба.

— Я ўжо казаў і на праўленні, і на партыйным сходзе: «Таварышы дарагія, давайце не дадзім змарнавацца помніку...» Кхы, кхы...

— Дык а што за прычына?

— Прычына такая... Кхы! — што ў цэнтры калгаса... у Нямільні, будуць ставіць новы помнік, і на яго перанясуць нібыта нашы гэтыя прозвішчы... Кхы! Ляжаць яны тыя новыя стэлы гады ўжо два на складзе... я іх бачыў — мармуровыя і прозвішчы высечаны... пылам забіліся.

— Ну дык і што, калі новы? — Залога быццам спрачаўся з Вілюхіным, акурат той быў вінаваты.

— І да Грыня я колькі разоў падступаўся...

— Канечне, глядзелі б, дык бы і ў галаву не стукнула нікому, каб бурыць...

— Вось іменна! — згадзіўся Вілюхін.— Самі ж і давялі да такога... З-за грошы гэтых свету белага не бачаць. Кожны лічыць: не мая справа. Помніш, колькі мы нерваў і сіл улажылі ў гэты помнік? А пасля? На кожнае свята асвяжалі фарбаю там-сям, кветачкі і ўсё такое...

— Ну мы пахварэлі, пастарэлі, дык няўжо няма каму цяпер гэта рабіць? — Залога пацісну ў плячыма і здзіўленымі вачыма глядзеў на Вілюхіна; гэтым сваім неўразуменнем ён хацеў яшчэ больш распаліць Вілюхіна і паказаць сваё абурэнне.

— Вось такую наш Грынь пазіцыю заняў...

Трохі, мабыць, у душы раўнаваў сваё месца Вілюхін, балюча было думаць і ўспамінаць, што калісь і ён меў нейкую ўладу. Спіхваў усё на дырэктара школы, гэтага чужака. А можа, і праўда ён тут ні пры чым? Быў жа ў яго і Залога, але той выкруціўся, маўляў, ад яго мала залежыць: «Мая справа выконваць, а не вырашаць...»

— Раз не трэба дырэктару, дык, мабыць, і яшчэ некаму не трэба,— сумняваўся Залога.— Да мяне яшчэ не даходзіць, што такое можа быць...

— Не, гэта ўжо... кхы... дакладна,— сказаў Вілюхін, сеў на цурбак, перакінуў нагу на нагу — худыя, яны перапляліся так, што далёка выступала з-пад верхняга ніжняе калена.— Нават месца намецілі, дзе новы паставяць... Кхы! Кхы!

— А дзе?

— У цэнтры Нямільні... За мосцікам, каля пагона.

— Няўжо там? Ну і выбралі месцейка! — Залога ўхмыльнуўся.— Каровы рагамі развалакуць і абгародку, і помнік той абгадзяць. Хто гэта такі спрытны пастараўся?

— Архітэктары.

— А дзе яны, тыя архітэктары?

— З раёна прыязджаў... Грэк яго прозвішча.

— Толькі што Грэх...— Залога палез у кішэню, выняў папяросы. І Вілюхін папрасіў закурыць. Залога здзівіўся: у чалавека хворае сэрца, а курыць, смокча суслу гэтую.

— Ты не кідаеш во і курыць,— паківаў галавою Залога.— Мабыць жа, табе шкодна.

— А табе не шкодна? Усім яна карысць аднолькавая. Я смерці не баюся... Во крычаць: радыяцыя, радыяцыя... А мне хоць бы што, хоць бы валасінка варухнулася на галаве. Палон перажыў, цяпер не падохну — дактары не дадуць. Толькі за дзяцей во душа баліць...

«Што за чалавек? — зайздросціў у душы Вілюхіну Залога.— Высах, бледны, аж свіціцца, а не шманае...» Ён і праўда зайздросціў тым, хто не думаў пра смерць, жыў і радаваўся, нягледзячы на хваробы, злыбеды. Сам жа з гадамі адчуваў, як неадчэпна, бы ваўчкі ў лузе на лагчыне, ліпнуць, чапляюцца думкі пра смерць, пра блізкі канец... Цяжка было ўявіць, што цябе не стане, усё вакол застанецца, а цябе не будзе.

Так не хацелася, каб цябе не было, каб не асталося і следу ад цябе. Нечага ж ты жыў, нешта рабіў — і раптам з усяго «нуль», які растане, бясследна знікне, як гэты во дымок ад папяросы. Горка пра гэта думаць. Трохі іншы раз на душы і святлей рабілася, калі ўспамінаў, што нямала ён пастараўся для людзей: і печы, і грубкі, і ліштвы, і вароты. Але ж яно не вечнае, перажыве яго на колькі там гадоў і рассыплецца, спрахне. Новае паставяць, пабудуюць і ўжо пра тых гаварыць будуць.

Чаму, чаму так хацелася астацца Залогу ў памяці людзей, што будуць жыць пасля яго, ён не ведаў. Але жаданне гэтае грызла яго ўсё часцей і часцей, атручвала душу.

— А я на тваім бы месцы не браў у рот гэтую заразу,— зусім сур'ёзным голасам, спачуваючы Вілюхіну, сказаў Залога.

— Колькі іншай заразы мы праз рот удыхаем,— аджартаваўся Вілюхін. Усё на гэтым чалавеку, у сэрцы яго сыходзілася, як на скрыжаванні дарог,— злыбяда і радасць, каханне і хвароба, чорны сум і светлы жарт... І ён жыве і нават сівінкі ў валасах няма, толькі рэдкія сталі, залысіны запаўзлі далёка на цемя ды макушка ўжо свіціцца.— Ды лепш удыхаць яе, чым выдахаць...— заключыў ён, але Залога не зразумеў яго. Ён заўсёды трохі ніякавата пачуваў сябе з вучонымі людзьмі і каб не здавацца дурнем — не перапытваў, не ўдакладняў таго, чаго не разумеў. Лічыў, талковае само ў мазгі залезе і там праясніцца.

— Я табе скажу, колькі зла мы выпульваем з сябе праз гэтае наша зяўло,— нечакана сказаў Залога, і Вілюхін усміхнуўся сам сабе, бо яны гаварылі пра адно і тое ж. Гэта яго падбадзёрыла, і ён падхапіў Залогаву думку:

— Калі б хто замераў, чаго больш: добрага ці злога. Злое — гэта ж не толькі словы, гэта і тое, што стаіць за нармальнымі, харошымі словамі, шчырымі ўчынкамі. Можа, нехта во лічыць, што такую добрую справу робіць з гэтым помнікам.

— Ды гэта самы што ні на ёсць шкоднік! Бандыт! Бюракрат! Чынуша бессардэчны! Як яго яшчэ назваць? Пад'ехаў, падбухторыў, падаслаў... Умеюць жа. Я гэта не кіну так. Пастаўлю на ногі ўвесь раён!

— Нічога, Данілавіч, ты не зробіш,— спакойным



*За ветрам у вёсцы сачылі з адным намерам: прынясе ён дождж ці не. У касавіцу, падчас жніва гэта было край важна, але не так страшна. Цяпер накірунак ветру людзей трывожыў куды больш.*

(«Замах»)

голасам сказаў Вілюхін і заківаў нагою — ад перажывання, што, можа, дарэмна разнявервае Залогу.

— Я заўтра пайду да Лашкова, і няхай мне адчытаецца... як на духу! Урэшце, я мураваў помнік і маю права спытаць! — У Залогі выступіў на носе пот, перасохлі губы, пакрыліся белым налётам.

— Я ўжо даказваў... Усім!

— Не ўсім! Калі на тое пайшло, у Маскву паеду. Сяду пад сцяною і буду сядзець, пакуль свайго не даб'юся!

— Не ведаў, Серафім Данілавіч, што ў цябе столькі задору,— пакруціў галавою Вілюхін, з удзячнасцю гледзячы на Залогу.

— Мне губляць няма чаго! — У Залогі нарастала рашучасць.— Пенсію не адбяруць... А адбяруць — на Марусіну жыць будзем.

— Не прапрэ з двара? — У Вілюхіна на маршчыністым твары шырока разлілася бяскрыўдная ўсмешка.

— Пайду да Чачоркі... Прыме!

— А што? — падтрымаў жарт Вілюхін.— Вып'еце разам і песню зацягнеце...

— Лягчэй жыць будзе! — Залога ўжо не мог стаяць на месцы, хадзіў туды-сюды па двары. Двор быў вузкі ды яшчэ завалены дровамі, і здавалася, толькі абмежаваная прастора не давала Залогу разгарнуцца, забуяніць на ўсю моц, як маладому жарэбчыку, якога ўшчамілі ў цесную цёмную стайню. Столькі спрыту адчуў у сабе гэты пажылы, сутулаваты, пакручаны ў жорнах часу, пакрамсаны мячамі нядолі, але так і нязломлены чалавек.

## IV

Сельсавет размяшчаўся ў белацаглянным, нізкім і прадаўгаватым будынку, другая палова якога была адведзена пад лясніцтва. Над ім узвышаўся вялізны разгаты дуб, у кроне якога чарнела некалькі скручаных дротам гнілых дошак — засталіся ад борці, якую мясцовыя жыхары называлі яшчэ гізонам. Кара на дубе парэпалася, патрэскалася і пазадзіралася з двух канцоў. Светлы, лёгенька-ружаваты на скругленых зубцах, ляжаў на траве ссохлы ліст.

Залога стаяў пад дубам і чакаў старшыню сельсавета — сакратар, худзенькая, з кароткаю, «пад хлоп-

чыка», стрыжкаю, сказала, што хутка будзе, але папярэдзіла: «Калі вы па пытанні паліва ці будматэрыялаў, то сёння Лашкоў не прымае».— «Мяне прыме»,— адказаў не вельмі ласкава ёй Залога, і яна пакасілася на планку ўзнагарод, якую ён прышпіліў на пінжак наўмысна — каб надаць сабе важнасці. Залога нерваваўся. І ў маладыя гады не любіў чакаць, а цяпер і пагатоў.

Было каля дванаццаці гадзін дня. Прайшоў статак кароў — пагналі з ранак — і па вуліцы плыў густы пыл. За каровамі брыло з тузін авечак, яны круцілі галовамі і чмыхалі. Непрыемна глядзець, як пыл асядае на прыгожыя, адштукаваныя дамы-церамы, слепіць вокны. Здаецца, ён пляміць і чысціню чалавечых душ, якія жывуць у гэтых дамах. Залога быццам адчуў, як ён трашчыць і ў яго на зубах. Зноў успомнілася вайна, Варонежскі фронт, раненне — як ён упаў на беразе ў лукавіне Дняпра тварам у пясок і пасля, ужо ў шпіталі, можа, з месяц у яго хрусцела на зубах. Але ён хуценька адагнаў гэты ўспамін, бо і цішыня, і гукі, якія яе парушалі, былі прыемныя, мірныя, яны не трывожылі вушэй, а знаёма лашчылі іх,— рыкалі каровы, спяшаючыся да цёплага пойла, плаксіва бляялі змардаваныя заеддзю авечкі, са шпакоўняў чуўся дзярката-малады, нахабнаваты голас апераных ужо шпачкоў; і раптам над усім гэтым у некага ў двары затарахцела бензапіла — быццам грызла не дрэва, а камень. Праз гэтую пілу Залога і не пачуў, як да сельсавета падкаціў на матацыкле Лашкоў. У нос патыхнула едкім пахам дыму, і тады Залога павярнуўся.

Лашкоў злез з матацыкла, і той, здалося, павышэў, выпрастаўся ўсімі сваімі спружынкамі. Лашкоў мужык магутны — рост два метры, шырокія плечы, чэрава напінае кашулю так, што гузікі трашчаць, а пінжак, мабыць, не зашпільваецца зусім. Зняў з галавы шлем, кінуў яго ў люльку, а з яе ўзяў белы саламяны капялюш, памахаў ім каля твару. Мабыць, убачыў, што каля дуба стаіць Залога, бо не спяшаўся ісці ў сельсавет. А Залога перш думаў пачакаць, каб той зайшоў да сябе ў кабінет, і тады ўжо — ён. Такая стратэгія, на яго розум, давала болей шанцаў на ўдалы зыход: у кабінеце начальнік і да слова стражэй, і адмахнуцца яму не так проста, як на хаду, і з нейкаю пэўнасцю павінен выпусціць чалавека — адным сло-

вам, афіцыйная асоба, то і адказвай па ўсіх правілах.

Але Лашкоў марудзіў, і Залога падышоў. Яны ведалі адзін аднаго яшчэ з хлапечых гадоў. Хадзілі ў адны і тыя ж вёскі да дзевак, гулялі вечарынкі, нават да мардабойства даходзіла — і тады яны былі заадно. З тых часоў акурат і насіў Лашкоў знак — пераламаны ў бойцы, скрыўлены, як у баксёра, нос.

— З раніцы адзін ветэран падпёрся, каб яго паставіў на чаргу на швейную машыну, а ты чаго, брат? — Лашкоў, пацісцуўшы Залогу руку, ляпнуў таго па-заліхвацку па плячы.

— А што так напалохаўся, я ж табе не назаляю? — Залога прыняў старшынёўскі жартаўлівы тон.— Ні сена, ні дроў не прашу...

— Шыфер, брыкет? — Лашкоў, прыгарнуўшы да сябе Залогу, павёў у сельсавет.

— Адгадай! — Нейк нязвыкла, нязмушана пачалася іх размова, і Залога перастаў хвалявацца.

— Няма часу на адгадкі, брат! — пасур'ёзнеў Лашкоў.— Сацкультбыт заеў... Пашалелі людзі! Самі калодзеж выкапаць не могуць. Прывязі ім кольцы, дубу на шулы, дошак на стрэшку, калаўрот загні ў кузні... Абляніліся! Вуліцу і тую падмесці ніхто не хоча. Нічога нікому не баліць! — Лашкоў павесіў, так і не надзеўшы, на стаячую вешалку капялюш, прамакнуў насавіком на лбе і пад вачыма пот.

— А вот мне баліць! — трохі сутаргавым голасам выгукнуў Залога, і Лашкоў, сядаючы за стол, глядзеў на яго, не зводзячы вачэй: ці то здзіўляўся, ці спрабаваў усё яшчэ зразумець, з чым жа такім балючым прыйшоў да яго інвалід вайны, пенсіянер Серафім Залога. Зрэшты, наўрад ці можна было яго чым здзівіць, бо ўжо трэці дзесятак гадоў ён займаў пасаду старшыні сельсавета і за гэты час чаго ні наслухаўся, у якія таямніцы яго ні пасвяцілі людзі. Заўчора, смех сказаць, прыйшла маладзіца: «Прыміце меры — мужык не хоча спаць са мною...» Цьфу ты, бес пляшывы!

— Што, рука параненая? — прыкінуўся, што не разумее, Лашкоў.

— Сэрца...— сказаў важка Залога і апусціў вочы, а тады, прыжмурыўшыся, пільна-пільна паглядзеў на Лашкова.

— Арытмія, кардэасклероз? Што ў цябе? У мяне ціск...— Лашкоў устаў з-за стала, адчыніў фортачку

і астаўся стаяць каля акна, асцярожна дакранаючыся пальцамі да шыпоў альясу.

— Табе ўсё жарты,— сказаў Залога, адчуваючы, што голас перасядае ў горле, зноў падступае ком і становіцца цяжка гаварыць.— Мне за помнік баліць...

— За які помнік? — Лашкоў крута павярнуўся, і здзіўленне на яго твары, здаецца, было шчырае.

— Ну як жа — «які»? Залівонаўскі, наш... Што каля шашы, на адзінаццатым кіламетры ад райцэнтра.

— А-а! — усклікнуў Лашкоў, рашуча адсунуў крэсла і зноў сеў за стол. Перакідваў з месца на месца разлінеяныя жоўтыя паперыны, пагартаў настольны календар,— чыркануў на нейкім дні.— А што па ім плакаць? Рашано ўбраць.

— А нашто яго ўбіраць?

— Так рашано! — стукнуў кулаком па стале Лашкоў, быццам вынесены некім прысуд не падлягае аспрэчванню. На стале пад кулаком, убачыў Залога, была выбіта ямка, лаку не было — жоўтае, з рудымі ніткамі гадавых кольцаў дрэва. Дзіва што: такая даўбешка, кулак.

— Кім рашано? — Цвёрды ком заціскаў Залогу горла.

— Ёсць думка.

— У каго? — дабіваўся Залога, хоць яму было цяжка гаварыць.

— Не наша справа.

— А чыя справа?

— Мы выконваем волю народа.

— А я што, не народ? А залівонаўцы ўсе — не народ?

— З вашай Залівонаўкі быў дэпутат.

— Ну і што?

— Галасаваў «за».

— А пытаўся ён у каго?

— У нас тут свая палітыка...

— Якая, чорт, палітыка! Вы хоць думаеце, што вы робіце? — раз'ярыўся, закрычаў Залога і адчуў, як праваліўся некуды ў грудзі ком і стала лягчэй гаварыць.— Гэта ж... пом-нік,— прамовіў ён з таемнаю ноткаю ў голасе.— Землякам, якія галовы свае злажылі...

Лашкоў устаў.

— Правільна ўсё. Мы шануем іх памяць. Я асабіста не шкадаваў ні часу, ні здароўя... помніш? — калі

гэты ваш помнік ставілі... І не толькі гэты! Мы тады, у шасцідзесятыя гады, многа ўзвялі. Толькі на тэрыторыі вашага калгаса... Колькі? Тры! А што? Правільна! Заслужылі, перамаглі...— Лашкоў размахваў здаравенным кулаком.— Няхай маладыя глядзяць, вучацца ў сваіх дзядоў і бацькоў, як трэба любіць і абараняць сваю зямлю... І я як удзельнік вайны буду, пакуль сэрца б'ецца, аддаваць усе свае сілы справе ўвекавечання подзвігу народа!

Залога глядзеў на Лашкова шырока адкрытымі вачыма: «Ён што, не зразумеў, чаго я прыйшоў да яго?»

— Дык гэта... Мікітавіч,— хацеў перапыніць Лашкова Залога, каб сказаць, што якраз і ён так думае, але той ажно захлёбваўся словамі і, мабыць, не пачуў. Ён гаварыў яшчэ хвілін пяць і скончыў сваю прамову словамі: «Ніхто не забыты, нішто не забыта!»

— Як ты ўмееш гаварыць, Мікітавіч,— сказаў Залога, мяркуючы, што ад ягонай пахвалы ў Лашкова зусім размякчыцца сэрца і між імі прападзе ўсякае непаразуменне.— Акурат па пісаным...

Лашкоў задаволена паківаў галавою, вочы яго неспакойна бегалі.

— Дык ён будзе стаяць, помнік? — асцярожна спытаў Залога.

— Усе прозвішчы будуць перанесены на новы, во сюды ў Няміньню... Хіба не ясна? — выразна, як адсякаючы кожнае слова, адчаканіў Лашкоў.

— Новы — гэта добра... І наш няхай стаіць.

— А які ён стаіць, ты бачыў? Сорам, да чаго давялі! — пайшоў у наступ Лашкоў, буравячы вачыма Залогу.

— А што я даводзіў яго? Вы ж улада, трэба было даць указанне...

— Ты на ўладу, Данілавіч, не ківай. Яна цябе не крыўдзіць.

— А хіба я гавару, што крыўдзіць?

— Ты і за электрычнасць палову плоціш, і за газ...— Лашкоў пачаў загінаць на левай руцэ кароткія і тоўстыя, як калодачкі, пальцы.

— Так, але ж я...

— Вам і машыны, матацыклы, дываны ў першую чаргу...

— Ды я...— Залога хацеў сказаць, што ён жа не

скардзіцца за няўвагу прыйшоў, але Лашкоў не даваў яму вымавіць слова.

— І праезд раз у год бясплатны... у любы пункт Саюза...

— Добра, усё добра...

— І лякарствы бясплатна выдаюць... Хіба мала?

— Ды я ж не пра гэта! — разгубіўся зусім Залога.— Я нашчот помніка...

— Ну во з табою і гавары,— апусціў неяк расслаблена на стол кулакі Лашкоў, акурат на выбітую ямку.— Пра вас, інвалідаў, такі клопат, а вы ўсё нечым незадаволены.

— А як спакойна глядзець, калі такое замыслілі? — Залога паціснуў плячыма, не разумеючы, чаму не перадаецца Лашкову яго трывога.

— Зрэшты, з табою ўсё ясна,— усміхнуўся зычліва Лашкоў.— Ты ж яго клаў, помнік той...

— Дзела не ў гэтым! — з адчаем сказаў Залога, хоць ён і не быў упэўнены, ці пайшоў бы змагацца за помнік, калі б не прычыняўся да яго.— Не даходзіць да мяне, каб помнік, святыню...

— Ды ка́пне хто вышэй, дык за такі помнік нам галовы скруцяць,— шчыра, з болем у голасе сказаў Лашкоў.

— А што вы не можаце сказаць Грыню, каб пасылаў школьнікаў глядзець?

— Вось і трэба было глядзець! А цяпер што...

— Раней там, каля помніка, і ў піянеры прымалі...

— Цяпер няма каго прымаць... Колькі ў вашую школу ў першы клас пайшло? Адзін чалавек? Здаецца, Клімаўскога сын...

— Во-во! Вёска вырадзіцца, а помнік будзе стаяць... як памяць, як сведка,— аж павесялеў Залога, што знайшоў яшчэ адзін довад.

— Помнік даглядаць трэба.

— Ну давайце я пакуль займуся ім... Пафарбую, шклом прозвішчы застаўлю, падмажу...

— Позна! Трэба раней было. Ён сваю функцыю ўжо іспоўніў, аджыў...

— Што гэта, Мікітавіч, ты гаворыш? — як не падскочыў з крэсла Залога.

Адчыніліся дзверы — зазірнула дзяўчына-сакратар.

— Якаў Мікітавіч, вам званяць.

Лашкоў узяў трубку, прыціснуў да левага вуха, а потым, нахмурыўшыся, перанёс на правае.

— Во бачыш, паступіла каманда дзяцей эвакуіраваць,— сказаў, кінуўшы на тэлефон трубку.— А ты з помнікам... Ці да яго цяпер? Адымаеш толькі час у людзей.

Залога бачыў, што Лашкоў гаварыў запаволена, як бы ў сне, бо думкі яго былі ўжо заняты тым, што пачуў па тэлефоне. Гэты званок, здаецца, узрушыў і яго, хоць ні дзяцей, ні ўнукаў пры ім не было. Заплывала ў сэрца, калола трывога: знаць, добра сыпанула радыяцыя і тут, раз вывозяць дзяцей. А можа, на ўсякі выпадак, каб перастрахавацца вывозяць? Во, чорт! І праўда апусцее вёска... Але ж пакуль жывуць людзі, і ён, Залога, жыве. А раз жыве, то і за помнік стаяць будзе, хоць гром, хоць маланка. Залівонаўку хай сабе не ўдасца захаваць, а помнік трэба захаваць. І Лашкоў тым, што сказаў, быццам цяпер не да помніка, падаў яму хоць нейкую спадзёўку: а раптам усё пераломіцца, зменіцца?

— Тады я не буду замінаць, пайду...— сказаў Залога.— А куды вывозіць будуць, не гаварылі?

— Пад Магілёў, у піянерскі лагер.— У вачах у Лашкова з'явілася не то жорсткасць, не то рашучасць.— Скажы там Клімаўскому, каб прыехаў ці пазваніў мне... як штык!

— Добра, перадам,— сказаў Залога і, павесялелы ў душы, выйшаў з сельсавета.

Густа, неяк тужліва шумеў лісцем дуб, ад яго цераз дарогу шырокаю чорнаю посцілкаю ляжаў цень. У лужыне, берагі якой акаймавала зялёная бросня, купаліся вераб'і. Калі Залога наблізіўся, яны падняліся і, галасна цвыркаючы, паляцелі. Заклапочаны, але з лёгкім сэрцам, што недарэмна схадзіў, ляцеў у Залівонаўку Залога. Не птушка ён, канечне, не верабейчык, але памаладзеў быццам. І тры кіламетры дарогі не здаліся пакутлівымі, як здаваліся тады, калі ішоў у сельсавет.

Час быў абедзенны. І Залога падумаў, што якраз дома павінен быць Клімаўскі. Трэба адразу перадаць яму просьбу Лашкова.

На двары Клімаўскіх, схіліўшыся над белай цынкавай балеяй, Насця мыла бялізну. Яна была ў сіняй сукенцы, стаяла спінаю да вуліцы ў лужынцы сівой

мыльнай вады. Залога замарудзіў крок. Насця яго не бачыла. Ці то ад стомы, ці ад гарачага сонца, што пякло ўсю дарогу ў твар, да скроняў прыхлынула кроў, затухкала. Ён сумеўся. А можа, і Насця таму віною і якраз недарэмна раўнуе яго Пятро? Можа, ён нешта заўважае, чаго не бачыць сам Залога? А што, калі і праўда яго старое сэрца адгукаецца як-небудзь на жанчыну, ды ён не можа, чарвівы пень, яго зразумець...

Залога кашлянуў. Насця разагнулася, кончыкамі пальцаў абцягнула з клубоў сукенку. Заўсміхалася. Шчокі расчырванелыя, гарыць, як памідоры, і зубы такія белыя, што ў Залогі вочы самі зажмурыліся.

— Добры дзень, Даніламвіч! — Яна не збянтэжылася ад нечаканасці, падобна, абрадавалася яму.

— Ці дома Пецька? — спытаў Залога.

— Якраз няма!..— Насця гулліва цыўкнула позіркам, і ён разгубіўся. Яна глядзела на яго вясёлымі, крыху прымружанымі вачыма.

— А я з сельсавета...— іншым разам Залога так адразу не сказаў бы, чаго зайшоў, пацвяліўся б, пакрыўляўся б. Старому ж, як дзіцяці, абы пазабаўляцца.

— Перадаць што? — Усмешка зляцела з Насціных вуснаў.

— Лашкоў прасіў, каб Пецька пад'ехаў ці пазваніў...

— Кожны дзень то туды, то сюды... Зацягалі ўжо яго.

— Важнае дзела...— Адразу, а цяпер яшчэ больш здзівіла Насцю, што Залога нейкі сёння дужа строгі, заклапочаны, і ёй кальнула ў сэрца: «Ці не стрэслася зноў якая бяда?» Гарэзлівасць з твару ў яе прапала, каля вачэй сабраліся маршчынкі.

— Якое? — як бы наперахапкі спытала яна.

— Я і кажу — важнае... Дзяцей будуць эвакуіраваць,— сказаў Залога наўмысна гэтае груваcткае слова, каб па-сур'ёзнаму ўсё было.

— А божачка!..— Насця хапілася выціраць фартухом рукі.— Што ж рабіць? А з Лютаўцоў будуць?

У Насці ў Лютаўцах жылі бацькі, у іх быў вялізны сад, пчолы, і яна часта аддавала туды дзяцей. І цяпер яны былі там.

— Не ведаю. Скажуць...

З твару ў Насці вобміг схлынула чырвань, ён стаў белы.

— У мяне гэтыя дні галава проста раскалвалася...

— Не панікуй.— Залога дакрануўся да яе пляча.— Не вайна ж...— Ён затрымаў руку, а тады паволі адняў яе, быццам пагладзіў Насціна плячо. Яму хацелася суцешыць Насцю, проста па-чалавечы пашкадаваць. Яму ўжо нічога не страшнае, адно пекла перажыў, кроў бачыў... А Насця ж вайны не помніць, зусім маленькая была. Злякнуцца можа. А ёй раджаць яшчэ трэба, кабета маладая. А яго песенька спета. Колькі тых гадоў асталося паліпець... Жыць, канечне, усё роўна хочацца. Надта тужліва становіцца, калі бачыш, як жыццё вакол цябе кіпіць-бяжыць, маладое, ненасытнае, імклівае... А ты ўжо адцвіў, асыпаўся, ссівеў, як лунь. Адным і цешыш, што застанецца нешта пасля цябе — як кажуць, можа, добрая трава, а можа, атрутная. Пакуль за дзяцей нібыта не сорамна. Канечне, прыязджаюць рэдка... Юрка з Магілёва калі-нікалі пакажа вочы, а Колю носіць па свеце, сёння тут, а заўтра там... Толькі двух сыноў і прыстараліся з Марусяю. Малавата... У яго бацькі было семера дзяцей: два хлопчыкі памерлі, дзяўчынка ў вайну загінула, астатнія жывуць.

— Не вайна ж,— паўтарыў Залога,— туды-сюды, і ўсё на месца стане.

— Добра, што сказалі...— Насця з удзячнасцю глянула на Залогу.

— Не забудзь жа, перадай Пецьку. Прашу цябе...— хацеў сказаць нейкае ласкавае слова, але яно не ўскочыла ў гэтую хвіліну на язык, перасела ў горле.

— Перадам, перадам,— спахапілася, як ад сну ачнулася Насця: відаць, забыла ўжо на Залогаву просьбу, так аглушыла яе навіна. Не выйшла ў іх сёння з Залогам вясёлай гаворкі — столькі турбот звалілася.

І Залога пайшоў з двара трохі зняверany, з роспачлівымі думкамі ў галаве.

## V

Пятро, возячы лубін, нагледзеў ускрай поля ў Шарыпчынай Грыве ладную крушню камення. Мабыць, школьнікі назносілі ўвосень, ды ніхто не забраў. І ён падумаў, што трэба забраць каменне, спатрэбіцца на

падмурак пад гараж. У час абеду ён, скінуўшы на ферме лубін, паехаў па каменне. Крушня ляжала пад маладой каржакаватай ігрушаю-дзічкаю, зарасла метлюгом, яе апляла бярозка, расцвіўшы талерачкамі белых і ружаватых кветак.

Беручы камяні, Пятро чамусьці пабойваўся, каб у крушні не ляжала якая-небудзь вужака. Гэта ж як цэрам ёй, шмат хадоў-выхадаў, нягорача, халадок. Кончыкамі пальцаў, абломваючы пазногці, выкочваў з крушні камень, тады ўжо браў аберуч халодны, знізу вільготны, і кідаў у прычэп. Ніякай вужакі пад камнямі не было, дарэмна асцерагаўся, толькі бегалі, тачыліся ў зямлю чорныя бліскучыя жукі, падобныя на дрывасека, але не ціхаходы, жвавыя.

«Усё-ткі мілае дзела ў вёсцы трактар,— жмурыў ад задаволенасці вочы Пятро, седзячы за рулём,— ці там што падхопіш, ці там... Цяпер бы цэглы разжыцца!»

З двара на вуліцу, калі ён пад'ехаў, выйшла Насця. Глядзела ў яго бок, чакала, вецер матляў яе валасы. Звычайна яна ніколі яго не сустракала. Праўда, калісь у першыя гады, калі ён вартаваў луг, і яго часта падвозілі да хаты, яна мела звычку яго сустракаць. Ён тады нярэдка меў навар — свінныя кумпякі, каўбасу, тушонку, масла. Гарэлкі не піў, пра гэта ведалі нават на Украіне, адкуль прыязджалі па сена, і расплочваліся з ім ці то грашыма, ці прадуктамі, а аднойчы... Нават успамінаць не хочацца. Адным словам, жыў як кароль, пакуль не выгналі. Ды, слава богу, паспеў тоесёе нажыць, пабудаваў хату, а старую прадаў аднаму пісьменніку з Магілёва на дачу. З тых часоў, як памяць, засталася бярданка, з крывою руляю — яна яму была не патрэбна, «зайцы» самі беглі ў каморку.

Убачыўшы Насцю, ён занепакоіўся: можа, што з дзецьмі? Там жа яны каля рэчкі, што хочаш можа здарыцца. Нядаўна вунь два пацаны, браты, утапіліся. Заглушыў трактар і выкуліўся з кабіны. Твар у жонкі сапраўды быў усхваляваны, валасы не расчасаныя і не сашчэмленыя грабянцом.

— Дзяцей трэба забіраць,— сказала яна.— Эвакуацыя...

— На рабоце я нічога не чуў.

— Залога заходзіў, у сельсавеце быў... Лашкоў наказваў, каб ты пазваніў у сельсавет... ці з'ездзіў.

— Ехаць далёка. Пазваню.

Тэлефон быў адзін на вёску і стаяў на ферме, у чырвоным кутку. Каб ведаў, то мімаходам спыніўся б, пазваніў. Нешта Лашкоў важнае, неадкладнае мае, раз прасіў праз Залогу... А чаго там быў Залога? Можа, наконт гэтага помніка насіўся, ажно затросся ўранні, калі пачуў. Яшчэ не хапала клопату з помнікам гэтым!

Ён скінуў каменне, сеў на веласіпед і пакруціў на ферму. Знайшоў там Чачорчыну Зінку, загадчыцу фермы, і яна адамкнула яму чырвоны куток. Ён пазваніў у сельсавет. Па голасе пазнаў, што Лашкоў не ў гуморы.

— Што там у цябе з тым помнікам? — адразу спытаў ён.

— Стаіць.

— Як, стаіць?

— Як і стаяў...

— Ты што сабе думаеш, Клімаўскі! — крычаў Лашкоў.— Трэба эвакуіраваць дзяцей. Ведаеш, колькі сюды наедзе чужых людзей, а мы будзем выстаўляць напаказ свае балячкі!

— Не так проста...— няўпэўнена запярэчыў Пятро, косячыся на Зінку, якая, выціраючы анучкаю пыл з падаконніка, пільна прыслухоўвалася.

— Шукай чалавека... І зараз жа!

Лашкову, відаць, і сапраўды прыпякло, надта быў ён узрушаны, не слухаў пярэчанняў, насядаў, настойваў.

«Яму там добра з кабінета камандаваць,— выйшаўшы з чырвонага кутка, падумаў са злосцю Пятро,— а паспрабуй тут...» Здаецца, такую перагародку жыццё перад ім даўнавата не ставіла, хіба што тады, як разводзіўся... Але там з бабаю, паслаў к бесу, і будзь здароў. Ад прагулу ці падазрэння якога выкруціцца — таксама не праблема. А тут...

Пятро ехаў з фермы паніклы і засмучаны. Можа, заглянуць усё-ткі да Залогі ды параіцца, як яго зліквідаваць, помнік гэты,— ён жа мураваў, ведае, што ды як. Але не варта, прапрэ палкаю з двара, толькі шуму наробіш. Трэба на гэтую справу папрасіць каго-небудзь іншага, хто не вельмі задумваецца, што робіць. Ёсць жа такія зухі, урвіцелі, родную матку прадаць могуць. Але ў іх Залівонаўцы наўрад ці знойдзеш такога, усе людзі як людзі. Ён пачаў перабіраць у памяці двары. І адлік яго спыніўся ўжо на чацвёртай хаце. Мымко!

Павінен без лішніх слоў згадзіцца... Гады два назад у помніку, які стаяў у бярозавым гаі (салдат з аўтаматам у руках), завяліся пчолы — знайшлі пад пахаю ў салдата шчыліну і недзе ўнутры зляпілі соты. І нехта пакапіўся на дармовы мёд, праламаў на спіне ў салдата дзірку. Падазравалі Мымка — ён часта, бачылі, хадзіў вакол помніка, нешта ўсё «мымкаў», прынюхваўся, прыглядаўся. Прыязджала нават міліцыя, але што ў нямога дапытаешся.

У Мымка былі імя і прозвішча — Жэнька Хрушч. Але яшчэ хлапчуком ён упаў з ліпы, стукнуўся патыліцаю аб калоду і страціў голас і слых. На гэтае чорнае няшчасце ўпала яшчэ адна чорная смылючая кропля — падсунуў у цыркулярку левую руку, і яна падраўняла яму ўсе чатыры пальцы, у холад яны стылі, і ён ад снегу да снегу насіў футравую рукавіцу. Мымко не быў дурань, шмат хто спрабаваў, але нікому не ўдалося яго абкруціць, пад'юдзіць, насміхнуцца, часцей ён сам каго-небудзь «купляў» і тады доўга смяяўся і круціў каля скроні пальцам. Але на яго ніхто не крыўдаваў. Да яго ставіліся як да дзіцяці. А быў ён мужчына як мужчына, у час ажаніўся, прывёў сабе жонку — маленькую з дробным замшэлым тварыкам жанчынку з раённага цэнтра. Нажыў з ёю двух сыноў — старэйшы служыў у арміі, у Афганістане, трывожачы бацькоў пісьмамі, а малодшы хадзіў у восьмы клас. З ім жыла і яго маці, бацьку ў вайну расстралялі немцы за сувязь з партызанамі. Настойліва хадзіла чутка, што яго выдаў Язэп Касіла, хоць у сапраўднасці ён, наадварот, імкнуўся выручыць.

Нягледзячы што адна была «дэфектовая», рукі ў Мымка былі залатыя: ён прышчэпліваў садавіны, шыў боты, сталярнічаў, як і Залога, ляпіў печы... І рыбак ён быў адменны, без шчупака з Сажа не вяртаўся. Рыбакі, асабліва прыезджыя, дзівіліся, ім не спрыялі ні самыя адмысловыя снасці, ні па навуковых рэцэптах зробленая падкормка. У Мымка былі дзве вудачкі, адзін жывец і вялізная кірзавая торба для рыбы. Туды ішоў рукі ў кішэні, назад — угнуўшыся ад рыбы. Факт, былі ў Мымка свае сакрэты. Ён іх не ўтойваў, паказваў, чарціў на зямлі, як ловіць, на якую насадку, дзе ставіць жыўца, як чапляць кручок...

Паабедаўшы, Пятро пайшоў да Мымка. Той якраз быў на двары, сядзеў на новай нефарбаванай табурэт-

цы і нашываў латку на стаптаны чаравік. Маленькі чорны сабачка гуляў каля яго ног з палавінкаю ад гумавага мячыка.

Мымко падняў галаву, калі цень ад Пятровага пляча ўпаў яму на калені. Даўно няголены твар зарос белай густой шчацінаю, яна тырчыць і на падбароддзі, і на шыі. З-пад прыпухлых павек Мымко глянуў на Пятра жаўтлявымі пранізлівымі вочкамі. Толькі вачыма ён мог чытаць і разумець чалавека. Пятро неяк яшчэ раней, калі служыў у горадзе, дзе была фабрыка глуханямых, звярнуў увагу, што ў глуханямых людзей вельмі востры, цікаўны позірк, укручваецца ў цябе, як бураўчык.

«Мым-м?» — Мымко тузануў падбародкам уверх — гэта азначала, што ён пытае: «Чаго да мяне?» Пятро агледзеўся вакол сябе, падняў востранькую, падобную на літару «с», рыбіну косць (мабыць, з ляшча), далонню расчысціў на зямлі мясцінку і напісаў: «50 руб». Мымко наструніўся, на яго найшла лёгкая ўзбуджанасць, як на лісу, калі яна зачуе блізка мышынае гняздо. Ён любіў разавыя заробкі — «калымы» — калі нехта папросіць, некуды пазаве, каб у той жа дзень і расплаціцца. Мымко любіў грошы, ашчадна іх траціў, у кампаніі абавязкова ў каго-небудзь сшыбне закурыць.

Пятро накрэсліў у сябе перад ілбом зорку і махнуў рукою ў напрамку шашы, а потым яшчэ намаляваў у паветры абрысы помніка. Мымко заківаў галавою — зразумеў. Цяпер як бы ўталкаваць Мымку, што помнік у заняпадзе і яго трэба разбурыць. Ён зноў закруціў галавою па баках. З хаты да шыбы прынік Мымкоў сын — канапаценькі, драбнатвары, вельмі падобны на маці хлопчык з беленькімі валасамі. Пятру стала трохі не па сабе, што хлопчык уважліва глядзіць на іх. Яго, мабыць, прымалі каля помніка ў піянеры.

Пятро грабянуў на зямлі смецце, скрывіўся і пачаў сыпаць, малюючы рукою помнік,— маўляў, занядбаны, запакінуты. У Мымка сталі сур'ёзныя вочы, ён як Ванька-ўстанька, паківаў галавою — зразумеў, паспачуваў. І тут жа абрадаваўся, бо падумаў, што трэба падладзіць помнік, прыбраць каля яго. Пятро яшчэ больш скрывіўся і махнуў рукою, маўляў, не трэба ўжо гэты помнік, трэба яго... чык-чырык. Ён узяў прыслоненую да сцяны яловую палку, мабыць, высечаную

Мымком у балоце на граблі, і пачаў махаць ёю, як бы некага біць. Мымко заўзята засмяяўся, агаліўшы жоўтыя, але моцныя зубы,— жывот яго закалыхаўся і захрыпела ў грудзях, быццам у астматыка. «Цьфу ты!..» — ледзь не вылаяўся Пятро: стараўся-стараўся, а Мымко, «нямоцце гэтае», усё на смех пусціў. Не паверыў, ці што? «Ну як?» — І Пятро, як і Мымко, тузануў уверх падбародкам. Мымко ўсё яшчэ не мог адысці ад смеху і цяпер мармытаў.

Хлопчык так прынік тварам да акна, што ён стаў плоскі і жоўты, як вокладка сшытка.

Пятро зноў махнуў палкаю, быццам дабіваў вужаку, і тыцнуў ёю ў намаляваныя ім «50 рублёў» — узрыхленая зямля падсыхала, і лічбы-літары як бы засвечваліся.

Мымко зноў паківаў галавою, а потым абрубкам пальца пакруціў каля скроні. Цяжка засоп. Пятро разгубіўся. На лбе ў яго выступіў пот. Мымко ўстаў з крэсла, адвярнуўся, засунуўшы глыбока рукі ў кішэні сініх замасленых галіфэ.

«Во нямы чорт!» — прашаптаў Пятро і глянуў на акно — у вачах у хлопчыка была не то трывога, не то радасць. Навучаны размаўляць з бацькам, ён, канечне, зразумеў, чаго прыйшоў ён, Пятро. Кветка бягоніі закрывала яму адну шчаку.

Пятро палічыў, што Мымко, мабыць, вырашае, ці згаджацца яму, трохі пачакаў і дакрануўся да Мымковага пляча. Мымко скрывіўся так, што вочы ў складках скуры зусім схаваліся, акурат запухлі, плюнуў убок і рэзка махнуў рукою, «мымкнуўшы» злосна і адчайна: не буду!

Пятро, ціха вылаяўшыся, пайшоў з двара. Мымко доўга стаяў не паварочваючыся, а потым зыгнуўся азадкам на табурэтку. Узяўся дашываць латку. Але не моўчкі, нешта ўсё «мымкаў», пляваўся, пакуль не ўкалоў шылам палец. «Мым! Мым!..» — зароў ён дзіка, як звер, і кінуў на зямлю чаравік. Ён упаў акурат на тую мясцінку, дзе Клімаўскі намаляваў лічбу «50».

Увечары Пятру нечакана пашанцавала. Каля калодзежа яго перастрэла Чачорчына Зінка, сказала: «Схадзіў бы ты да майго Вадзімкі, папрасіў...» Яна чула тады ў чырвоным кутку яго размову з Лашковым і

ўсё зразумела. Падумала: «Чымся лынды біць, няхай бы Вадзімка карысць зрабіў...»

Пятро аднёс вёдры з вадою і хуценька да Вадзімкі. А раптам і праўда: на лаўца і звер бяжыць?

Вадзімка сядзеў на ганку ў майцы і курыў. Майка была белая, добра адцяняла смуглае, загарэлае цела. Вадзімка дужа сціснуў Пятрову руку, запрасіў сесці.

Вадзімка на работу не вельмі падкі, хоць здаровы, як конь, а выпіць можа столькі, што не пад сілу і каню. І цяпер твар у Вадзімкі лагодны, чорненькія маленькія вочы блішчаць, як у масле, выяўляючы душэўную лагоду і ціхамірнасць. Надвечар Вадзімка «падзаправіўся» і адчуваў сябе бясконца шчаслівым.

— Как жизнь, Федорович, расскажи-ка ты мне? Не пьешь, не куришь — никакого интереса!

Вадзімка чалавек не залівонаўскі, казах, яго прывезла Зінка, вярнуўшыся разам з маці ў Залівонаўку. Купілі старую хату і жылі асобна. Дзяўчынаю Зінка была тоўстая «сланіха», ніяк не паверыш гледзячы на яе цяпер — танюткую, бы саломінка. Але што дзіўна: іх абаіх, яе і мужа, адразу празвалі ў вёсцы ласкавымі імёнамі — Зіначка і Вадзімка. Колькі яны жылі разам у тым Казахстане — невядома, але і за гэтыя пяць залівонаўскіх гадоў яны не прыжылі дзяцей. Нехта з іх быў нямоглы на дзяцей, хутчэй за ўсё Зінка. Вадзімка бязбожна, кожны дзень піў «квас», як ён называў пладова-ягаднае віно. Мабыць, каля яго ды маці прызвычылася да чаркі і Зінка — часценька расчырванелая і вясёлая ішла на ферму.

— Жыццё не маліна,— сказаў Пятро.— Чуў жа пра эвакуацыю?

— Не только пра неё,— састроіў шматзначную ўхмылку Вадзімка. Ён размаўляў не па-тутэйшаму, «па-гарадскому», і не толькі таму, што, мабыць, рос у горадзе; вясковыя інтэлігенты падазравалі, што Вадзімка чалавек не просты, адукаваны, у свой час ці не быў начальнікам, а тады «пагарэў», ці што... Ва ўсякім разе, неяк на моцным падпітку Вадзімка прагаварыўся, што яго першая жонка — галоўны ўрач бальніцы і ён рана ці позна вернецца да яе.

І Пятро зразумеў, што Зінка падслухала яго тэлефонную размову з Лашковым і перадала Вадзімку. Можа, гэта якраз і добра, не трэба доўга, як Мымку, тлумачыць, што да чаго.

— Помнік маеш на ўвазе? — сказаў Пятро.

— Не скажу! — Вадзімка лісліва, дабрадушна ўсміхаўся. Раздушыў абцасам чаравіка недакурак, прысмаліў яшчэ адну «прыміну». У двары Вадзімка нічога не хацеў рабіць, а на людскія просьбы адгукаўся ахвотна і нават з радасцю. За бутэльку таго ж «квасу» ён мог і гной з пуні выкінуць, і дровы пагрузіць, і па сена з'ездзіць. Грошы ў яго ніколі не вадзіліся, усе прапіваў ды і зарабляў мала — працаваў у будаўнічым упраўленні сантэхнікам. Аднойчы ўзімку п'яны забыўся закруціць кран — заліло ўсю кантору. На яго паківалі пальцам, але не выгналі, бо ўзяў на парукі напарнік, такі ж забулдыга, як і ён, ды і знайсці замену было няпроста. Запіўшы, Вадзімка мог днямі не выходзіць на працу. Калі цярпенне ў начальнікаў лопала, яны прысылалі «тэхдапамогу», якая везла яго ў райцэнтр.

Чачорцы не падабалася, што яе зяць, «вузкавокі чорт», усім робіць, а ў двары не хоча, нават зганяць кароў не ўпрасіць, давай яму з сабою сумку віна. Зінка ўмервала мацерын пыл, не хацела ўгняўляць Вадзімку: мабыць, баялася, каб не кінуў яе. Многія здзіўляліся, чаму так трымаецца Зінка за бяспутнага мужа, але ў кожным жаночым сэрцы свая таямніца, якая змушае і цярпець, і нават пакутаваць, але зміріцца. Цярплівасць жаночага сэрца — найвялікшая таямніца чалавечай прыроды.

— Уліп я з гэтым помнікам,— з сумам у голасе сказаў Пятро.

— Тебе, Федорович, надо выпивать — проще на мир смотреть будешь! — рагатнуў Вадзімка.— У меня есть — хочешь, налью?

— Не да гэтага...— У Пятра і праўда пасля няўдалага паходу да Мымка было тужліва на душы. Ён не хаваў гэтага, бо хацеў выклікаць у Вадзімкі спагаду да сябе. Што, калі не спагада, прымушае чалавека ісці на дапамогу іншаму?

— А чего ты зажурился? Давай я в два счета! Сколько заплатишь? — дурасліва лыбіўся Вадзімка. Пятро пільна прыглядаўся да яго, спрабуючы зразумець, ён жартуе ці гаворыць усур'ёз. Так хацелася знайсці нейкую зачэпку на спадзяванне, падтрымку.

Ён пачуў у хаце крык: здаецца, Чачорка лаялася з дачкою. «Не лезь, не твае дзела!» — крычала Зінка.

— Завелись бабы! — сказаў Вадзімка, звесіўшы з калена кісць рукі, у якой была папяроса.

«Ды ён жа, вузкавокі чорт, зараз пойдзе!..» — нямоцны, глухаваты, пачуўся і голас Чачоркі. Здаецца, і жанчыны вялі пра тое ж спрэчку. Пятру не хацелася яе далей слухаць, і ён знарок бадзёрым голасам сказаў:

— Ды ледзь не месяц табе трэба нюхаць усякую брыду,— як цвіком у сцяну, ударыў Пятро, мяркуючы разагрэць у Вадзімкі спакусу на вялікія грошы — аплату.

— А мне деньги не нужны!

— Як «не нужны»? — сумеўся Пятро.

— Очень просто. Больше денег — больше пью. Это вредно для здоровья.

«Ты глядзі, няўжо і гэты пусташтанік дбае пра здароўе?» — здзівіўся Пятро, але ў той жа момант зразумеў, што Вадзімка проста пацвельваецца з яго. Не пойдзе ён ні за якія грошы рушыць помнік. Надта вясёленькі ён, несур'ёзны, і блізка не грызе яго думка, ісці ці не ісці.

— Усё-ткі пяцьдзесят рублёў на дарозе не валяюцца,— сказаў Пятро, адчуваючы, як мізарнее ў душы спадзяванне на Вадзімку.

— Да меня же с деревни сгонят! — Здаецца, упершыню Вадзімкаў твар зацямніла нахмуранасць.— А мне еще нужно здесь поболтаться...

Ляснулі дзверы, з хаты на ганак выскачыла Чачорка. У руцэ ў яе быў кіёк.

— І не падумай! А то во як ламасну па галаве цапком!..— Яна замахнулася кійком, зачапіла ім за страху.— Мне тут паміраць, а ты прыехаў і паехаў... Бадзялы чорт!

— Вот видишь, вот видишь...— Вадзімка ўстаў, выйшаў на сярэдзіну двара.— Теща изобьет меня.— Ён стаяў шыракаплечы, грудзі, зарослыя кучаравымі сіваватымі валаскамі, загарэлыя рукі з чорнымі, як у пальчатках, лапамі былі цяжка наліты сілаю. Танк, а не чалавек, скрышыць любую скалу. Няўжо ён і праўда баяўся старэнькай цешчы? Пятро з недаверам глядзеў на Вадзімку, няёмка было сябе адчуваць пад позіркам старой, якой нядаўна прывозіў дровы, дапамагаў грузіць, хоць яна нічога і не гаварыла яму.

— Ладна, што ж...— сказаў ён замест развітання.

Чэрвеньскія вечары доўгія, і цяжка было ўлавіць

тую мяжу, калі вечар пераходзіў у ноч. Сонца ўжо даўно апусцілася за лес, а па вуліцы яшчэ хадзілі людзі. Нінка Касіліха вяла на повадзе цёлку. Рохкаў каля балотца кабан, які залёг удзень у канаве і толькі цяпер успароўся. Дзеці праляцелі на веласіпедах на скрут галавы, ажно забожкалі старэнькія бабулі, што зюкалі на лавачцы пад клёнам. На пагоне ў стаўку дружна, не перастаючы, вялі канцэрт жабы.

Скрозь па вёсцы ў вокнах гарэла святло.

Доўга не мог заснуць у гэтую ноч Пятро Клімаўскі. Жыў спакойна сам сабе, гора не ведаў. І раптам абваліліся на яго гэтыя дэпутацкія клопаты. Гонар вялікі, канечне. Пятро хадзіў з задзёртым носам, але бачыў ён, што павага да яго ў людзей не вырасла. У хвіліны душэўнага прасвятлення, якія находзілі на яго падчас незадаволенасці ўсімі і сабою, ён пачынаў стражэй прыцэньвацца да сябе, і тады выяўлялася, што не за нейкія там заслугі, асабліваe старанне, вылучылі яго ў дэпутаты, а толькі за тое, што ён не п'е, не трымаецца сумніцельных кампаній, а знаць — нідзе не зганьбіць сваю рэпутацыю. Але для дэпутата гэтага мала, адчуваў Пятро, што галоўнае, да чаго ён прызваны,— клапаціцца пра людзей, жыць іх турботамі, бедамі, ахвяраваць сабою. А яму балела за сваё, ён быў з самых багатых у вёсцы, але зайздрасць не пакідала яго, віла з душы вяроўкі. Ён не мог сабе ўявіць, што павінен дбаць пра некага, у каго ёсць нават машына, а не пра сябе. Можа, вось набудзе і ён машыну, тады пазбавіцца і ад зайздрасці. Пакуль жа яго не пакідала імкненне грэбці пад сябе. Зрэшты, дурная курыца толькі грабе ад-сябе, а чалавек кожны хоча жыць як лепш. Што ж у гэтым дрэннага? Бацькі жылі-гаравалі, ім жа выпала іншая доля.

Заўсёды ў канцы сваіх развагаў Пятро знаходзіў сабе апраўданне, якое яго супакойвала, падлівала ў сэрца весялосці, якая пачынала разгарацца, як кнот у лямпе, калі яго падкруціш.

У гэты вечар весялей яму не стала. Была б Насця, можа, лягчэй і на душы было б, але няма: падаіўшы карову, паехала да дзяцей. Трэба ж нешта з імі рабіць, збіраць у дарогу, угаварыць, заспакоіць. Можа, сесці на трактар ды самому катануць у Лютаўцы?

Пятро не знаходзіў сабе месца, выйшаў з хаты на двор; стаяў, глядзеў на зорнае неба, на развешаную

на вяроўцы бялізну, на якую падала з кухоннага акна святло,— гэтае святло раз-пораз пранізвалі белыя начныя матылі.

Што ехаць у тыя Лютаўцы? Трэба ж неяк разабрацца з гэтым помнікам... Лашкоў сем шкур злупіць, калі не зробіш, як ён распарадзіўся. А як зробіш, калі не ўпрасіць нікога, не купіць? Залога, той адно пачуў, дык у слупкі стаў. Мабыць, не змірыцца, не спусціць гэтую справу, будзе абіваць парогі начальству, свайго дабівацца.

Абрынуўся, наваліўся на яго клопат — як прывязаў, не кінуцца, не ўцячы — куды ўцячэш? — так і да роспачы недалёка. Ну і жыццё, ліха матары! Як тая ануча брудная, якую трэба мыць, паласкаць, выціскаць... Пятро баяўся ісці ў хату — там, у яе цемнаце, яму здавалася, ён задыхнецца. Сеў на ўслончык, на які звычайна ставіць балею Насця, абхапіў рукамі галаву.

## VI

— Ідзі паглядзі траву на сядзібе,— сказала Залогу незадаволеным голасам Маруся. Ёй здавалася, што няма чалавеку чым заняцца, дык ён носіцца з гэтым помнікам, труціць сабе і другім душу.— Можа, і яе трэба скасіць, пакуль пагода...

— Што касіць, калі радыяцыя? Можа, скажуць, нічога не касіць, не ўбіраць... Малако ж не дазваляюць есці. І дзяцей не так сабе вывозяць.

— Дзе яна, тая радыяцыя?

— А што ты яе ўбачыш ці знюхаеш?

— Ну, мусіць жа, неяк яе знаходзяць...

— Прыбор такі ёсць.

— Прыбор — хварабор... Табе абы нічога не рабіць. І сама во злягла, не магу, а ты бегаеш, як закілзаны...

Не любіў Залога, калі жонка чаплялася да яго, бурчала, клібніла. Зразумееш ты бабу ці ўладзіш ёй! Як і колькі ні рабі — усё роўна гультаём абзаве. А на душы і так моташна. Свет дагары нагамі стаў. Прыйшло ж некаму ў башку дурную — помнік бурыць... Ды не бурыць, а каля кожнай хаты яго ставіць трэба. Няма той сям'і ў вёсцы, каб не чаплянула сваім кіпцюром вайна... Во ў яго два браты зляжылі галовы — Раман на Одэры, Міцька зусім без вестак прапаў... Яго самога калекам зрабіла вайна. У жонкі бацька загінуў, ся-

стра на міне падарвалася — немцы прымусілі цягаць па шашы барану, выскароджваць партызанскія міны. У Беларусі кожнага чацвёртага не стала... Чацвёртага... А магло б і трэцяга...

Нешта быццам кальнула Залогу ў сэрца, зазвінела ў вушах. Ён насупіў бровы, і на лбе зверху ўніз глыбока прарэзаліся дзве баразёнкі, успамінаў... Намагаўся нешта ўспомніць. Нешта важнае, патрэбнае акурат на гэты момант. Кожны трэці... Магло б не стаць кожнага трэцяга... Хто яму пра гэта гаварыў? Дай бог памяць... Так, так, нехта свой, залівонаўскі. З мужчын. Пад чаркаю, п'янаваты. Было, зрэшты, дзіўна, што чалавек падпіў... Дзе гэта, калі? Стой, выпіць усім, малому і старому, дазваляецца на радаўніцу. Такі закон: кожны павінен памянуць продкаў. Хто з іх залівонаўцаў мала п'е?

Клімаўскі!

Залога адчуў, як з твару адхлынула кроў, у скронях зацокалі малаточкі...

Ён успомніў радаўніцу шматгадовай даўніны. Яна была незвычайная, супала з Днём Перамогі.

...Дождж пачаў ісці звечара, ліў усю ноч, і пад раніцу з неба сыпалася дробная, як пыл, імжа, ці, па-іхняму, рось. Мяккі, спасцярожліва-ціхі ветрык калыхаў гэтую мутную, ліпкую, як павучына, пялёнку. Можна перанесці вяселле, радзіны, улазіны, але не радаўніцу.

Акрыўшыся хто цэлафанам, хто цыратаю (у вёсцы парасонаў не купляюць), людзі ішлі на могільнік. Зграбалі з магіл леташнюю траву, ігліцу, шышкі, сухія галінкі, зносілі ў кучы і падпальвалі. Мокрае гарэла неахвотна, пускала зялёны, бы з порхавак, дым, які нізка плыў над зямлёю, зліваўся з пялёнкаю імжы.

І Залога прыйшоў на могільнік з граблямі ў руках. Ён засяроджана здымаў з магіл зляжалы цвёрды слой ігліцы, расчэсваў маладую, кволую траву, баючыся пашкодзіць тугія, сакавітыя зялёна-ружаватыя скочкі. Яны раслі сямейкамі, як грыбы,— вялікая і вакол меншыя, зусім маленечкія пупсікі. Гэтыя расліны валодалі нейкай таямнічасцю, быццам яны былі прышэльцамі з таго замагільнага жыцця. І хадзіла прымха, што рваць гэтыя скочкі, глуміцца з іх — вялікі грэх.

Нагробшы кучачку ігліцы, Залога прыціснуў яе скалечанай рукою да зуб'я грабель і панёс за агароджу. Там гарэла некалькі вогнішчаў, патрэсквалі, вылёта-

ючы з агню, вугельчыкі, дыміліся, як незатушаныя недакуркі, на ігліцы.

Пятро Клімаўскі таксама прыбіраў магілы. Залога іпоў міма.

— Салют ветэранам! — махнуў рукою Пятро.

— Здароў табе! — адказаў Залога.

— З Перамогаю, дзядзька!

— Ага, дзякую...

Між імі, хоць іх бацькі сваякавалі, ніколі не было поўнай шчырасці, даверу. Мабыць, усё-ткі адзін аднаго яны недалюблівалі, можа, у нечым не разумелі, нешта не прымалі. Варыянт не новы, часта сярод чужых людзей больш паразумеласці, чым сярод сваіх.

— Ехаў учора каля твайго помніка... Нешта стаіць ён як сіротка,— сказаў Пятро, аблёгшыся на граблі.— Ніхто не прыбірае...

— Вілюхін калісь пасылаў школьнікаў.

— Інтарэс нейкі быў, цяпер забылі. Нікому нічога не трэба.

— Трэба схадзіць глянуць, што там...

— Дождж...

— Невялікі, а мы не цукар, не растанем.

Яны з могільніка сцежкаю цераз сасоннік пайшлі да помніка. Па гэтай сцежцы Залога вясной насіў бярозавік. На ігліцы віселі вялікія белыя кроплі. Зрываліся, выбівалі на сцежцы на пяску ямачкі.

Старанна падгрэблі вакол помніка смецце. Наламаўшы з яліны лапак, падмялі. У нішку, дзе заўсёды стаялі ў глечыку кветкі, палажылі пучок сасновых галінак.

Адразу вокуў мілей стаў глядзецца помнік.

Гэты сумесны паход зблізіў іх. І ўжо тады, калі прыйшлі на могільнік абедаць, былі яны ледзь не сябрамі, ва ўсякім разе, лёгка паварочвалі адзін да аднаго галовы.

Абедалі звычайна родамі — свае, блізкія. Выбіралі шырэйшыя магілы, рассцілалі абрусы. Ставілі, як на стол, міскі і талеркі з ядою, бутэлькі з віном і гарэлкаю.

На кожнай магіле стаяла налітая чарка са скібкаю хлеба наверсе, ляжала чырвонае яйка.

Ціха шапталі малітву старыя. Жанчыны раз-пораз прыцяскалі да вачэй хустачкі. Дзеці глядзелі на дарослых са здзіўленнем і разгубленасцю.

Залога бачыў, як у яго маці квёла варушацца бяскроўныя запалыя ў рот вусны. Болем адгукнулася ў сэрцы: яна ўжо зусім слабая, мабыць, хутка сустрэнецца з бацькам у тым невядомым магільным раі. Бацькі не стала даўно, неяк ускорасці пасля вайны. Як патрэбны былі тады мужчынскія рукі, але недарэчны выпадак... Касавіца была, пераплывалі ў лодцы Сож. Бацька абвешаўся вяроўкамі. Людзей у лодку села шмат, борт узвышаўся над вадою толькі пальцы на два. На сярэдзіне нехта нялоўка варухнуўся — лодка чарпанула вады. Бацька заблытаўся ў вяроўках і не выплыў, астатнія выратаваліся. Быў ён мужык працавіты, не меў спакою сам і жонцы ды дзецям не даваў паслабкі. Цяжар пасляваеннай нядолі пасля смерці бацькі ўзваліўся на яго, Серафіма... А які з яго быў работнік, калі яшчэ балела рука. Але і адной рукою, сціснаючы зубы і абліваючыся потам, зрубіў хату, а зямлянку ператрос на лазню.

Старыя, памаліўшыся, першыя селі да абруса. Зямля была мокрая, кожны нешта падсцілаў пад сябе — то хустку, то цырату, то проста газеціну. Над могільнікам павісла журботная знямеласць, толькі сосны шумелі глуха і нудна, спявалі сваю жалобную калыханку нябожчыкам.

Але неўзабаве разварушыліся і людзі, пачуліся смялейшыя і гучнейшыя галасы.

— Ты, дзядзька, тады-сяды ў газету пішаш,— павярнуўся да Залогі Пятро — твар яго, чыста пагалены, ружаваты, blішчаў, акурат абцягнуты празрыстай плёначкай.— Напішы пра мяне, га? — Пятро гаварыў гучна, раскавана — не таіўся і не сароме ўся.

— А што пра цябе пісаць? — з доляю жарту, але і з раздражненнем сказаў Залога.— Фельетон хіба?

— Я вайну бачыў...

«Бачыў ты яе! У маці пад спадніцаю, смаркач, сядзеў...» — падумаў Залога; ён сам не любіў гаварыць пра вайну, пра свой удзел у ёй, успамінаць раненне і шпіталь, і заўсёды злаваўся, калі хто-небудзь, не маючы ніякіх заслуг, выстаўляў сябе ледзь не героем. Але цяпер, на могільніку, не было як абурацца, дый не хацелася зноў заядацца з Клімаўскім, і ён стрымана сказаў:

— Дзе ж ты яе бачыў?

— Так і напішы: ён быў бы трэцім. У мяне ж во! —

Ён сашмаргнуў да калена калашыну — нага была знявечана, у шрамах, скура на ёй блішчала, была голая, без ніводнага валаска.

Насця камканула мужыка ў плячо.

— Сядзі ты, герой!

Пятро апусціў калашыну.

— «Рама» вёску бамбіла, і асколкі секанулі... А калі б па чарапку? — Пятро ляпнуў далонню па кучаравай галаве і глянуў на Залогу з важкай саманадзейнасцю, маўляў, і я маю вось рахунак з вайною.— І мяне няма... А ці толькі я адзін такі, на каго смерць замахнулася ды абмінула?

«Чорт, падкруціў!..— падумаў захмялелай галавою Залога.— І не падумаў бы...»

Людзям, мабыць, не падабалася, што яны завялі такую гаману, не месца тут усякім дамовам ды выхваленням, і Залога змоўк, але яшчэ доўга думалася яму над гэтымі Пятровымі словамі: «Ён быў бы трэцім...»

І цяпер, успомніўшы, дзе, калі і кім яны былі сказаныя, ён абрадаваўся. Вайна і на Клімаўскім пакінула след, абпаліла... Рана, яна шчыміць, любому шчыміць, і ён, Клімаўскі, канечне, будзе стаяць за помнік. Мала што пацыкаўся тады, як па сена ездзілі, гэта ўжо ў яго натуры кабырзіцца. Вось толькі навошта ён так спешна патрэбен Лашкову? Мабыць, пра эвакуацыю дзяцей будзе нешта гаварыць... Дзела такое незвычайнае, няпроста ўсё гэта.

Як ніколі, было складанае жыццё.

Трохі супакоіўшыся, Залога ўжо як бы і з ахвотаю, не такі прыгнечаны пайшоў глядзець тую траву на сядзібе. Сеяў ён траву ўжо некалькі гадоў запар, на гэта былі свае прычыны. Пастарэлі яны з Марусяю, здабываць цяжэй стала сена — старшыня калгаса Туземчык нос адварочвае ад іх, пенсіянераў; а па-другое, лічы, кожны год вымакала на нізіне бульба — з вясны на тым, што ад пагону, краі мокра, а пасля яшчэ дажджы залягуць — мора цэлае стаіць, рабізну вецер ганяе, бульба гніе, а калі якая і прарасце, дык толку з яе няма, тоненькая, кволая цявінка. Не толькі Залогі, многія ў вёсцы пад сена паўсядзібы аддаюць.

Нешта ў гэтым годзе, прымеціў Залога, спрыяла росту: і на градах усё падурэла, як кажуць, цыбуля, буракі, морква, боб; яблыкі і грушы ў маі так цвілі, што лісця не відаць, адно белае воблака — гіганцкія

адуванчыкі выраслі над зямлёю. Праўда, многа пустацвету было, асыпаўся — пчолы ды чмялі пераваліся, рэдка бзыкне каторы ці каторая. А калісь у яго бацькі, Данілы, было каля трох дзесяткаў вуллёў. З хаты ў спякоту не выйдзеш, раззлаваныя пчолы так і пякаюць то ў шыю, то ў шчаку, то ў валасы заблытаюцца,— страху не столькі ад укусу, колькі ад шалёнага бзыкання.

Ён стаяў каля прасла; абапёрся на верхнюю жардзіну, і яна хруснула.

«Во ліха! Згніло ўжо прасла... І калі? Здаецца ж, нядаўна гарадзіў...» — Ён тужліва глядзеў на сядзібу: бульба і за ёю цімафееўка стаялі ядранай зялёнай сцяною, цямнейшая — бульба, святлейшая — цімафееўка. Ураджайны год, падумаў ён, адчуваючы, што замест радасці грудзі запаўняе гарчэча: ці ўдасца спатрэбіць, пусціць у толк? Нешта ўсё ідзе да таго, што не пра гэта трэба будзе думаць, а пра тое, як самому размінуцца з бядою. Ды пра сябе ўжо ён не турбуецца — пажыў, пабачыў, укусіў і салодкага і горкага,— думаецца пра тых, хто яшчэ, як кажуць, напроць жыцця, чыё шчасце толькі ў зародку, у бутоне, які яшчэ не раскрыўся...

Залога ўздыхнуў. Твар яму абвяваў лёгкі ветрык, ён браўся недзе каля балотца — прыносіў водар ажыны, такі густы і выразны, што Залога, здаецца, адчуў у роце смак чорных з шызым налётам ягад.

«Можна касіць... Заадно гляну і жукоў»,— падумаў Залога; сагнуўшыся, пралез пад верхнюю жардзіну. Ён прайшоў мяжою метраў дзесяць, кідаючы позіркі налева і направа,— як і чым ні труці гэтых «каларадаў», нічога не памагае, вісяць гронкамі на кожным каліве. Але бульба ўжо набрала сілу, убуціла, як кажа Маруся, і цяпер яны не страшныя ёй. Можа, іншым разам Залога пачаў бы збіраць жукоў у бляшанку з саляркаю, якая з вясны стаіць тут каля кутавога слупа, але цяпер гэты занятак здаваўся яму пустым і непатрэбным. Трэба з помнікам разабрацца да канца. Гром ужо, як кажуць, грымнуў, але пакуль не пайшоў дождж. Што пасля каму дакажаш? Сцёрлі, змялі... Пад гарачую руку чалавек шмат чаго бязглуздага робіць, а потым за локці сябе кусае, раскайваецца — сам ці ўжо іншыя за яго раскайваюцца. Сляпы чалавек у злосці, у прыступе пыхлівасці, у яго розуму хапае толькі сябе абараніць, а як астатнім, што далей будзе — яму

начхаць, яму важна сілу сваю паказаць, зламаць супраціўленне. Р-раз — і скрышыў!

«Дайшлі, дажыліся, чорт! — плюнуў пад ногі Залога.— Можа, я дурны зусім і нічога не петру? Адстаў, затлуміўся, а калясніца ўжо далёка ўперадзе...»

Ну павінны ж быць людзі, якія і яго зразумеюць? Свет жа вялікі, у адным баку дурні, у другім разумныя... Пахадзіўшы, можа, прыб'ешся і да такіх, як сам, і тады лягчэй стане? Як яму, Залогу, здаецца — усё нішто ў параўнанні з гэтым помнікам. Усё прыйшло і пайшло, а ён павінен стаяць вечна. Вось так — вечна... Хто не згодны? Пакажыце яго. Дайце глянуць, што ў яго за вочы, рукі, твар, валасы?

Ды што тут чыкацца, чорт бы пабраў! Зараз сядзе і настрочыць пісьмо ў газету. Балазе занятак не новы для яго. Колісь, як маладзейшы быў ды галава святлейшая была, пісаў часцяком — пра ўдарнікаў, старых людзей, ветэранаў... Нават граматай узнагародзілі як актыўнага селькора, яна і цяпер на дне чамадана ляжыць, разам з іншымі каштоўнымі паперамі, з патрэпанымі пасведчаннямі на медалі.

Не-е, недарма Серафім Залога зямлю таптаў, паветрам дыхаў, хлеб еў — заўважалі яго, нейкая карысць ад яго была. А раз была раней — не можа быць, каб і цяпер ужо зусім нікчэмным стаў. Даастатку сябе паложыць, сэрца аддасць, але дакажа, што нешта яшчэ значыць у гэтым свеце.

Залога так распаліў сваё нутро, што ў разгневанасці не мог ціха ісці, бег, акурат нехта гнаўся за ім. Ён як звар'яцелы ўхапіўся ў хату. Вырваў з сярэдзіны сшытка, які купіў на пісьмы, двайны аркуш. Сеў за стол. Грамацей, вось і пішы. Напісанае — гэта ўжо дакумант, яго не перакруціш.

— Што ты там надумаўся? — спытала Маруся. Седзячы на мяккім нізкім крэсле, забінтоўвала нагу.— Можа, Колю пісьмо... даўно не чутно.

Ён нічога не адказаў, толькі кашлянуў, быццам яму трэба было гаварыць, выступаць з трыбуны, а не пісаць.

«Пакуль тое ды сёе, напішу... Няхай параяць нешта. Ці ж гэта парадак, што помнік без догляду? А цяпер некаму ўзбрыло зносіць яго. Кожны абураецца і кожны чакае, пакуль нехта нешта зробіць. Дырэктар

Грынь і той заяўляе: «А што мне...» Свята прыходзіць — кветкі ніхто не ўскіне...»

Гэтыя думкі Залога і пераплёў у свае каракулі на паперу. Заклеіў канверт, падпісаў адрас раённай газеты і аднёс у паштовую скрыню.

Думаў, трывогі на душы паменшае, а яе, наўпярок, пабольшала. Ляжаў уночы з расплюшчанымі вачыма, думаў. У грудзях быццам стыў халодны ком.

## VII

Пятро адчуў, што ззяблі плечы, быццам пад кашулю засунулі тоненькую льдзінку. Здавалася, устане ён з услончыка і пачуе, як затрашчыць, пачне калоцца і звінець лёд. Халера... Ён доўга сядзеў, баючыся ісці ў хату, мудраваў, як выкруціцца, што рабіць... Зваліўся ж на галаву гэты клопат з помнікам. Дурня знайшлі! Вечна яму не шанцуе. Людзям чорт дзяцей калыша, а тут... Мымко замымкаў-запымкаў. Вадзімка жарцікі падпускаў, а глядзеў на яго, Пятра, як на дзіця гарэзнае.

Па спіне пабеглі мурашкі, бо здалося, што ён заціснуты між дзвюма бетоннымі сценамі і застаецца ісці толькі наперад, па вузенькім, бы траншэя, калідорчыку. Ён баяўся цеснаты, у якой яшчэ ніколі не бываў, але якую не раз уяўляў.

Ён ссунуўся з услончыка, паварушыў плячамі, выгінаючы іх ззаду так, каб дакрануліся лапаткі. Кроў не хацела грэць яго — здавалася, што і яна халодная, як у рыбы, і пульсуе па халодных, як шкляныя трубкі, жылах. Дзіўнае было адчуванне, як і думкі дзіўныя, і ён спалохаўся, што можа здурнець.

Раптам пачуў лёгкі гуд, і па белай шыфернай страсе хлява слізганула святло, на краі абарвалася, акурат адрэзаная шкліна ўпала ў цемру на зямлю.

Міма двара па вуліцы праехаў на сваім «гарбылі» Язэп Касіла. «Гарбылём» называлі стары «Масквіч» — з чырвоным выгнутым, падобным на горб, кузавам. Калі глядзець здалёку, здаецца — паўзе божая кароўка. Такі нягеглы выгляд «Масквіча» яшчэ больш распальваў у Пятра жаданне займець зграбную, лёгкую, бы дзікая каза, машыну, якою ён лічыў «Жыгулі» — такія, як у Грыня.

І цяпер, убачыўшы Касілу, Пятро перш і падумаў

пра сваю блізкую ўжо мэту — «Жыгулі»,— але ў сэрца не прыліла, як заўсёды раней, асалода, і не ў радасці яно забілася, а ў нейкім трывожным прадчуванні. Заўтра Касілам гнаць кароў, і Язэп, мабыць, паехаў, каб дапамагчы сястры Нінцы адпасвіць. Ён жыў у райцэнтры, памяняў некалькі работ, так ці інакш звязаных з тэхнікай, і на пенсію пайшоў з «Сельгасхіміі», дзе тры апошнія гады запраўляў ядахімікатамі цыстэрны. Стары Касіла мінулай зімою памёр, а Касіліха яшчэ перад вайною, у хаце засталася дачка Нінка — адна, бо яе адзіны сын, ужо дарослы, сямейны, якога яна прыжыла, казалі, ад дырэктара лясгаса якраз у той час, калі Язэп працаваў там столярам, жыў у Мінску, тады-сяды наязджаў падсобіць маці. Цяпер нібыта завербаваўся на два гады на Поўнач.

І ў Язэпа сям'я не склалася. Ажаніўшыся з інтэлігентнай, прыгожай жанчынай, выкладчыцай музычнай школы, і пражыўшы з ёю каля дзесяці гадоў, у рэшце рэшт развёўся. Дачка засталася пры маці. Язэп, нягледзячы на ўзрост і падарванае сібірскімі маразамі здароўе, запіваў, асабліва калі выйшаў на пенсію. Не грэбаваў нічым, піў адэкалон, настойкі, эстракты, абы пахла спіртам.

Пятровы думкі, як мурашы сваю ахвяру, аплялі Язэпа, і тое трывожнае прадчуванне ў сэрцы пачало праясняцца: Язэп Касіла — гэта апошні шанец. Калі не ён, то ўжо ніхто. Пятра ахапіла трасучка: і ад таго, што целу было холадна, і ад таго, што выйсце адкрылася нечакана і ў той момант, калі душа, уся істота былі сціснуты цяжарам, здавалася, нязноснага адчаю, які ахапіў яго, разгубленага, на адзіноце.

Ён пайшоў у хату, але заснуць не мог, ужо не ад трывогі, што зводзіла, спапяляла душу, а ад навязлівага імкнення думак у заўтрашні дзень, калі ён пойдзе на размову да Язэпа. Колькі разоў за ноч думкі кінжальным выпадам успорвалі яго затуманеную свядомасць, выкідвалі з ложка, але халодны, прыкры страх астуджваў яго перад самымі дзвярыма: «Не, лепш заўтра, раненька...» Але і гэты парыў, і рашэнне схадзіць заўтра ранічкаю, былі аднолькава бязглуздыя, выкрасаныя запалёнымі ад бессані і перажыванняў мазгамі.

Ледзь перакачаўся ноч. Устаў на золаку, сядзеў, як статуй, на ложку, тупа глядзеў у падлогу. «Халера, ну

і закляніла!..— скрыпеў ён зубамі. Чамусьці пра ход назад не думаў, быццам ніякіх варыянтаў там не было, а ўсё, што дапамагла яму вышкрабціся, толькі наперадзе.— Калі б не гэта эвакуацыя, можа б, і ўдалося пераперці Лашкова, а так...»

Кружылася, цягнула ўніз галава, перасохла ў роце — было млява.

Кукарэкнуў не свой, а суседскі певень — густы бас. Што, свой не хоча будзіць гаспадара? Разумны певень...

Пятро пайшоў у кладоўку. Там у шкапчыку стаялі гарлачы з малаком. Пахітаў іх — выбраў той, дзе малако скісла. Памяшаў вялікай лыжкаю і выпіў ледзь не паўгарлача сыракваншы. І адно тады спалохаўся, што малако заражанае — у раёнцы пісалі, раілі не піць.

Праяснялася ў галаве, але на душы не палягчэла, і ён на вялых нагах, няцвёрдаю паходкаю выйшаў з хаты.

На сцежцы ўпрыцемку белаю ніткаю свяціўся след ад веласіпеда. Мабыць, паехаў на ферму конюх, Пімен Кунцэвіч. На небе над лесам квола і толькі на імгненне ўспыхвалі зарніцы, быццам там нехта асцярожна прыкурваў, хаваючы ў далоні запалку. «Няўжо зноў пальюць дажджы?» — з жахам падумаў Пятро, але паспрабаваў сябе супакоіць — не хацелася замаркочаным з'яўляцца перад Язэпам.

У Касілаў акно ў прыдзелку свяцілася, і гэтая пляміна святла ў цішы, халаднаватай ранішняй прыцьмеласці неяк па-асабліваму ўзрадавала Пятра. Не могучы саўладаць з сэрцам, якое грукатала ў грудзях, ён баступіў у хату, прыцінаючы страх: «Нешта матор барахліць...»

Ягонаму прыходу здзівіліся — і Нінка, нізенькая, худая, бы трэска, з хваравіта-белым тварам кабета, і Язэп, такі ж высокі, худы, толькі з цёмным, учарнелым тварам, правую шчаку якога перасякаў глыбокі шрам. Язэп сядзеў за сталом, на якім стаялі дзве цёмныя пустыя бутэлькі. Нінка, стоячы, наразала на драўляным кружку сала.

— Добрай раніцы ў хату! — павітаўся Пятро.

— Здароў, кораш! — бадзёра адказаў Язэп, але голас у яго сарваўся — быў хрыпаты.— Куды затарабаніць? — так растлумачыў ён ранні Пятроў прыход.

— Не... Ета ж ён, мусіць, хоча радоўку перапрасіць... дзяцей жа трэба вывозіць,— прашамкала шчарбатым ротам Нінка.

— Чуў я, чуў,— падняў галаву Язэп.— У раёне пра гэта два дні гундосяць.

— Усё правільна, людзі, але не таму я, Нінка, прыйшоў,— нейкім дужа сур'ёзным, нават з трагічнымі ноткамі голасам сказаў Пятро.

— А што ж тады?

— Ёсць дзела,— сказаў важка, але ціха, і глянуў на Язэпа.

— Такое важнае, што сярэдначы забурыў! — пажартаваў Язэп, хоць, відаць, у яго і было змрочна на душы пасля ўчарашняй выпіўкі, сведчаннем якой былі дзве пустыя бутэлькі на стале.

— Пайшлі пашэпчамся,— кіўнуў Клімаўскі на дзверы, запрашаючы Язэпа на двор.

— Што ўжо вы! Я сама выйду...

— Ты давай чалавеку яешню смаж,— сказаў Пятро, наўмысна з такім разлікам, каб палесціць Язэпу ўжо цяпер.

Яны выйшлі на двор, і з высокага ганка Пятро ўбачыў, што неба на ўсходзе за алешнікам — дзе звычайна святлела — было цёмнае.

— Можа не пашанцаваць табе сёння — паказвае на дождж... бліскае,— сказаў ён.

— Дык давай і праўда мен устроім, га? — засмяяўся Язэп.— Ты нашу радоўку, мы — вашу.

— Не да кароў мне! — Пятро з адчаем плюнуў.

— А што такое, Пеця? — Язэп узяў Пятра за локаць і з цікаўнасцю глянуў у вочы.

— Дудкі здагадаешся! — Пятро куражыўся, падстрайваўся пад Язэпа, выстаўляў сябе гэтакім несусветным зухам.

— Нешта смажанае кораш прыдумаў,— крутнуў галавою Язэп.

— Не я прыдумаў, іншыя прыдумалі, а на мяне ўзвалілі,— сказаў Пятро з адчаем і крыўдаю ў голасе.

— Ну ты ж у нас начальнік, прызваны аддувацца за ўсіх,— з доляю жарту, але не дзеля смешачак сказаў Язэп.

— За ўсіх вас, але не за начальства,— сказаў злосліва Пятро, ды Язэп яго не зразумеў.

Нейкі час — пакуль Язэп закурваў — маўчалі.

— Дык што ў цябе, Пеця? — спытаў ён, зрабіўшы зацяжку.

— Я і кажу, сітуёвіна не дай бог!

— Цяжэй, чым у мяне, не будзе,— сказаў Язэп і з крыўдаю за сябе, і з жаданнем падбадзёрыць Пятра.

— У цябе ўжо прайшло, быллём парасло...

— А не, карашок, кожны жук і жаба стараецца ў вочы пырнуць!..— У Язэпавым голасе ўжо была не крыўда, а злосць. Ён так рэзка апусціў руку, што з папяросы выбілася іскрынка, упала на зямлю.

— І мне во... Трэба помнік убраць.

— Які? Што каля шашы?

— Ён самы.

— Нешта апошнім часам яго кінулі на праізвол судзьбы, не глядзяць... езджу міма — бачу.— Язэпа Пятрова вестка мала ўстрывожыла, бо ён і блізка не здагадваўся, дзеля чаго той загаварыў пра помнік.

— А хто глядзець павінен? Мы і павінны! — Пятро ўзяў і на сябе віну наўмысна, каб Язэпу лягчэй было згадзіцца, выручаючы іменна яго, а не некага.

— Неяк жа дзеці раней... шэфствавалі.

— А цяпер дзяцей колькі... Дый тых во будуць вывозіць. Прыедуць камісіі ўсякія, чужыя людзі, а помнік наш бедны.

— Ты ж улада, гаспадзін начальнік, ты і прымусь прыбраць,— падкалоў Язэп.

— Не прыбіраць, а, я ж сказаў, убраць трэба,— сказаў Пятро, надаючы голасу рашучасці, каб не выклікаць у Язэпа сумненняў.— Хацеў бы я цябе прасіць, Язэп...

— А не-е, карашок! Дудкі, Мар'я Іванна, як кажуць...— Язэп заўхмыляўся, рухі яго сталі больш рэзкія і нервовыя.

— А што табе? Не бясплатна ж...

— Колькі адвалілі?

— Паўсотні пакуль... Можна і больш...— затараторыў Пятро, думаючы: раз Язэп зацікавіўся грашыма, то і згоду дасць.— Цэгла дармавая...

— На чорта мне твая цэгла! Грабніца мне не трэба — я не фараон.

— Я забяру на гараж, а табе пляшку пастаўлю.

— Ты ўжо думаеш, што Язэп Касіла прапашчы фрукт? — раптам захрыпеў Язэп.— Чалавек ляпіў, а я разбураць буду?

Пятро адчуў, што Язэп пакрыўдзіўся. Нават ударыць можа. Яго ўпрошваць не трэба — і ў вайну, і пасля ў такіх пераплётах быў, што доўга не думаў.

— Я цябе як чалавека прашу, а ты...— размяклым голасам сказаў Пятро.

— Не-е, гаспадзін начальнік, ты мяне за чалавека не лічыш, калі прыйшоў з такіх тухлым дзелам... Я цябе, хлюпік, за такое і падрэзаць магу.

— Ну, канчай ты, канчай, Язэп!..— Пятро не вельмі ўжо і баяўся Язэпа з голымі рукамі, але і крыку, валтузні не хацелася.— Не сам, дык, можа, каго параіш, хто б... На прымеце, можа, хто ёсць...— Пятро адчуваў, як выслізгвае апошняя надзея.

— А хто на гэтае тухлае дзела пойдзе? У цябе што, кораш, зрух па фазе?

Халера, дзіўна неяк закручваецца: людзям адразу ўсё зразумела, як двойчы два, а ён на нешта яшчэ спадзяецца, шукае пралому ў сцяне людской нязгоды. Няўжо ён і праўда такі дурны і не бачыць тое, на што ў людзей адкрыты вочы і душа? Ну так, ну канечне, гэта ўсё няпроста і нялёгка, але каб так адмахвацца... Не чакаў такога і ўсё яшчэ знаходзіўся ў недаўменні Пятро. Ну, няхай гэты Залога, тут, як той казаў, усё ясна, чалавек помнік, калекуючы, ляпіў, насіўся з ім, як ляльку песціў.

Ледзяны жах ахапіў Пятра. Хоць наперадзе быў дзень, яму здавалася, што — беспрасветная цемра, у якой, колькі не ідзі, няма канца, як і ў тым вузкім калідоры з бетонных сцен, што ўявіўся яму ўчора ўвечары.

— Ну я прашу цябе, Язэпка, выручы! — агаломшаны, апанаваны адчаем, наважыў не саступаць Пятро, і ў голасе была такая мальба, што здавалася, ён зараз упадзе перад Язэпам на калені. У яго зводзіла сутаргаю губы, яму было цяжка вымаўляць словы.

— Яшчэ слова пікні, і я цябе падрэжу, яй-богу, падрэжу! — раўнуў хрыпатым горлам Язэп, і Пятро ажно адступіў на крок, баючыся, каб не дастаў яго моцны кашчавы Язэпаў кулак.

Ціха, як здань, выплыла на ганак Нінка, у цемры і ў цёмнай сукенцы яна здавалася зусім маленькай, як кошка.

— Ета вы так шэпчацеся? — спытала яна.— Не

трэба і крычаць пад акно — усіх гаспадынь разбудзіце... Што ты, Язэпка, раскрычаўся?

— Згінь у хату, а то зараз сяду ў машыну і ўкачу к ядронай матушкі! — злосна кінуў ёй Язэп.

Нінка гэтак жа нячутна, як і выйшла, схавалася ў цемнаце сенцаў.

— Я ж не хацеў цябе крыўдзіць,— пачаў апраўдвацца Пятро вінаватым голасам.

Язэп расхадзіўся і не мог супакоіцца.

— Запомні: Язэп Касіла не хлюпік! Усёк? Дарэмна пыл ганяеш, гаспадзін начальнік!

Прайшла мінута, другая ў пакутлівым маўчанні. Было чуваць, як дыхае Язэп, хрыпіць у яго ў грудзях.

— Дайце мне спакойна дажыць да смерці! — раптам засіпеў Язэпаў голас і пасля задрыжаў.— Я за сваё расплаціўся! Дзесяць гадоў на Калыме адцягнуў дзень у дзень...

— Ды пры чым тут гэта? — Пятро ведаў усё пра Касілу, пра яго зламаны лёс і не хацеў зноў вяртацца да гаворанага-перагаворанага.

— Як жа — пры чым? Ты ж ішоў, думаў, што Язэп Касіла паліцаем быў, дык на любое тухлае дзела пойдзе... Ага, трымай кішэню шырэй! Ану валі адсюль! — Язэп спружыўся.

— Язэпка! — пачуўся з цемнаты Нінчын голас.— Яешня гатова...

— Ідзі снедай,— сказаў Пятро, як бы даючы Язэпу дазвол на яду і так, каб паказаць, што ён не затрымаў на сэрцы крыўды, абы толькі Язэп на яго не пакрыўдзіўся: маўляў, ну што ж, пагаварылі і не зразумелі адзін аднаго.

— Пайду хáваць,— сказаў Язэп ціхім голасам, а можа, проста сарваў яго і гучней сказаць не мог.

Пятро ішоў па вуліцы, і на яго крокі ў дварах адзываліся сабакі. Каля двара на лавачцы сядзела Чачорчына Зінка: мабыць, чакала даярак ісці на ферму.

— Што, можа, Пецька, ты кароў сёння пагоніш? — спытала яна.

— Не,— не паварочваючы галавы, адказаў ён.

— Ну тады, мусіць, да дзевак бегаў! — засмяялася Зінка.— Пасты нямаш...

«Нешта Касілы позна выганяюць...» — пачуў, ужо адышоўшы. Гэтаму баб'ю ніяк не ўладзіш, падумаў ён з раздражненнем, быццам яго была сёння радоўка,—



*І такі, незразумелы, panікла-засяроджаны, ён пайшоў з двара. На плячы паблісквала, як шкельца, сякера.*

(«Замах»)

на мінуту пазней выгнаў: «У абед папёр кароў»,— на мінуту раней: «Сярод ночы ўспароў». Ён стараўся думаць абы пра што, толькі не пра помнік. У яго шумела ў галаве, нешта пазвоньвала, бы вітамінка ў бутэлечцы. Было жаданне бухнуцца, не раздзяваючыся, на ложак, праваліцца ў мёртвы сон і так праспаць цэлую вечнасць. А тады прачнуцца і ўбачыць, што ўсё добра, ніякіх праблем няма, жыццё радаснае і бесклапотнае, дзеці вялікія — дочкі маюць мужоў, а сын — жонку.

Але ў хату не пайшоў, стаяў на вуліцы — чакаў, калі выганяць кароў. І як толькі ў тым канцы вёскі пачулася: «Эй, ганіце кароў!» (крычала піскліва-прарэзліва Нінка), ён пайшоў адчыняць хлеў. Карова ляжала — хрыбціна, выпертыя бакі і рагатая галава. Павярнула да яго мызу, шумна пацягнула ў сябе паветра.

— Ану ўставай! Пайшла на́пале! — стрымана, але крыкам загадаў ён карове. Яна не ўставала. Тады ён махнуў рукою — і яна падхапілася, спачатку на заднія ногі, потым на адну пярэднюю, паставіла другую. Згарбацілася, загнуўшы над крыжам хвост, і калі ён махнуў яшчэ раз рукою, выйшла з хлява. Ён, пляскаючы далонню па баку, хуценька пагнаў яе з двара, баючыся, што яна налёпае.

Чарада была ўжо блізка, і ён, пакінуўшы карову на вуліцы, пайшоў у хату.

Дзіўна, не спаў, але не пачуў, як прагналі міма хаты кароў, і, успомніўшы пра іх, тузануўся, падумаўшы, што не выгнаў каровы. Заскрыпеў зубамі: «Амбец! Здалі нервы...» Яму стала тужліва і непрытульна, як ніколі, і некаму было яго пашкадаваць, не было Насцінага пляча, каб прытуліцца... Ён успомніў пра сваю бярданку-крывуліну. Можа, узяць з шафы ды ўставіць рулю ў падбародак? Спалохаўся, так падумаўшы. Ён не хацеў згаджацца, што жыццё ў яго невыноснае, пакутлівае. Не і не! Іншыя былі б на сёмым небе ад такога жыцця.

І ён зразумеў, што нешта трэба яму з сабою рабіць, браць у рукі, цвяроза глядзець на рэчы, на людзей. Час не такі, каб нюні распускаць. Не мардаваць сябе трэба, а дзейнічаць — цвёрда, развалжліва, ісці, раіцца з Лашковым. Людзям цяпер не да помніка, не ім яны заклапочаны, жыццё ратаваць трэба...

Трохі супакоіўшы сябе, ён заснуў на гадзіну, але сон быў глыбокі і здаровы, як у маладыя гады, як у мінулую ноч, калі ён вярнуўся з пасяджэння сельсавета.

## VIII

Залога прачнуўся і ўспомніў, як выганяў на ранкі карову. Звычайна выганяла Маруся, але ў яе разбалеліся ногі, і ён паспачуваў жонцы.

На вуліцы галёкала Нінка Касіла, крычала пад акно ў кожны двор. Час ад часу пакрыкваў і мужчына: «Э-эй!...» — і біў кіем па частаколе — сухі трэск, як аўтаматная чарга, сатрасаў вуліцу.

«Ці не Язэпаў голас?» — падумаў Залога, прыпыніўся каля лавачкі і чакаў. Сон вобміг зляцеў з яго, быццам ужо даўно на нагах.

Было пахмурна, плаваў туман, на траве ляжала раса. Знаць, дажджу не будзе. Выблісне сонца і разгоніць хмары, праясніцца неба, і будзе, як у іх кажуць, матыльковая пагодка.

Язэп, ідучы па тым баку вуліцы, зглядзеў Залогу — крута павярнуў.

— Сёння за камандзіра? — сказаў Залога, паціснуўшы Язэпаву руку.

— У грабу я відзеў гэтае камандзірства! — вылаяўся Язэп.— Не ў нашы, Серафімка, гады бегаць за каровамі. Гізануць — хіба за імі ўгонішся?

— Аваднёў будзе мала, машка толькі...

— Заесць сволач! — Язэп пачасаў патыліцу.— Не бярэ яе ні радыяцыя, нічога!..

— Адкуль ты ведаеш? — засмяяўся Залога.

— Дык жа апетыт у яе! Ну, пабягу, а то...— Адышоўшы, раптам павярнуўся і спытаў: — Дома будзеш да абеду?

— Буду... Цімафееўку хачу скасіць,— адказаў Залога і здзівіўся, навошта ён спатрэбіўся Касілу. Ды мала чаго! Аднагодкі, раслі разам. Даводзілася і чарчыну браць, і ў адной талацэ рабіць, перад тым як Язэпа судзілі, цяслярылі разам у калгаснай брыгадзе.

Але спакою ўсё роўна не было, і Залога, прылёгшы яшчэ дасыпаць, так і не заснуў. Ляжаў ціха, не варочаўся, і Маруся, мабыць, палічыўшы, што ён спіць, заснула.

Усталі яны, калі развіднела. І самім было дзіўна: ці састарэлі, ці распанелі, ці ліхаведама што, але раней не было такога, каб давідна ў ложку валяцца. Нешта рупіла, нейкі клопат звечара намячаўся. Людзі спяшаліся, спяшаліся і яны. На машыну паспець, каня запрэгчы, у дровы схадзіць, сена зграбці, па ягады ці ў грыбы збегаць — хоць разарвіся было, а ўсё роўна ўсюды не ўхопіш. Дзеці былі пры іх — трэба ж накарміць, у школу адправіць.

Цяпер жа, здаецца, ні людзям, ні ім нічога не трэба. Як вараныя ўсе. Дзень пражыў — і ладна. Нейкая жылка быццам лопнула ўсяродку, тая жылка, якая накручвалася, накручвалася і не давала драмаць душы, вярэдзіла, падварушвала.

— Залежаліся мы, матка,— сказаў Залога, яму было няёмка і нават сорамна.

— А што табе, ляжы,— супакоіла Маруся голасам, якім звычайна апраўдвалася перад мужам.

— На тым свеце ляжаць будзем, а тут рабіць трэба,— не згадзіўся з ёю Залога.— Ідзі дранікі пячы. Я ў печы падпалю...

— Што, вымерхаўся? Дык ужо і бульбы наскаблі,— вясёлым голасам сказала Маруся.

Калі Залога заказваў на снеданне дранікі — значыць, яго чакала цяжкая праца, трэба, як ён кажа, «добра натаптацца». Маруся пра гэта ведала, і таму настрой у яе адразу палепшаўся.

Дровы ляжалі пад загнетам — унёс звечара. Залога, беручы па адной палцы, склаў іх у печы акуратнаю клеткаю. Падсунуў скамечаную газету і падпаліў.

Маруся прыйшла на кухню ў аранжава-чорным мультановым халаце. Ступала асцярожна і нагіналася павольна, калі трэба было нешта ўзяць у судніку.

Залога сядзеў на ўслончыку з нажом у руках. Перад ім стаяла міса з вадою і кошык бульбы. Ён браў бульбіну, абіраў яе і апускаў у місу. Там ужо ляжала некалькі ababраных жоўценькіх бульбін.

Маруся перамыла бульбу і, стоячы каля судніка, таркавала яе ў алюмініевую каструлю. Месіва зверху пачырванела. Маруся ўсыпала туды пару лыжак мукі, шчопаць солі, разбіла яйка і перамяшала. Можна пячы дранікі.

Залога перасеў да стала і чакаў першую патэльню

дранікаў. Маруся арудавала чапялою ў печы. На ўслончыку сядзеў рыжы кот і мыў лапаю мордачку.

— Трэба чакаць гасцей, кот во мыецца,— сказаў Залога жартаўліва.

— Хто да цябе паедзе! — усміхнулася Маруся.— Каму ты патрэбен.

— Можа, Юрка...

— Юрка-мурка... Што цяпер яму ездзіць? Ведаюць жа, што ў нас тут...

— Ён не паглядзіць.

— Ага, не паглядзіць...— насцярожылася Маруся.— А Дзімка? Ён жа яго з сабою заўсёды бярэ.

— А мне ўсё не верыцца, што гэта радыяцыя ёсць,— крутнуў галавою Залога.

— У мяне дык неяк у роце нясмачна, бытта апілкі жалезныя тама...— Маруся выняла з печы патэльню, узяла яе анучкаю і высыпала дранікі на талерку, якую Залога паставіў перад сабою. Дранікі гарачыя, дымяцца параю — здаецца, дыхаюць.

Залога адкалупнуў нажом масла, пачаў мазаць па драніках. Масла плавілася, расцякалася залацістаю плёнкаю.

Залога любіў, як кажа Маруся, «вазколіцца» з дранікамі. Раней мазаў іх здорам, еў са шкваркамі, асабліва любіў есці з мочанымі брусніцамі. Брусніц тых было дзе-небудзь каля балацявіны, на сухіх пагорачках,— ажно чырвана, як хто насыпаў на зямлю! Набярэш пару вёдраў за раз — куды іх дзенеш? Ссыпалі ў бочку і мачылі. На цэлую зіму смакаты — за вушы не адцягнеш.

Цяпер брусніцы вырадзіліся, там-сям ягадзіна сарамліва вочкам блісне. Сала не хочацца, а каровіна масла — дзякуй богу, балазе і ў магазін пачалі завозіць.

— Гэта зубы ў цябе такія, жалезныя, усё жыццё грызлі мяне,— засмяяўся Залога, дзюбачкаю нажа торкаючы ў дранік, каб упітвалася масла,— знаходзіў у гэтым дзіцячае задавальненне.

— Ваша парода жывучая — не загрызеш,— перайшла на жарт і Маруся.— Колькі-та дзед твой, Спірыдон, працягнуў?

— Сто шэсць! — з гонарам сказаў Залога, скручваючы ў трубачку дранік.— А на выгляд хілы быў, здавалася, ледзь кеўляе... Бацька, помню, расказваў,

як яго ў рэкруты бралі, дзеда майго...— Залога прыжмурыў вочы — смяецца, нячутна, толькі ў душы.— Прыйшла ў вёску разнарадка: даць аднаго рэкрута. Гэта ж дваццаць пяць гадкоў трэба адбахаць! Парáдзіліся старыя дзяды... Ну каго? Спірыдона, кажуць... Нежанаты, гадамі акурат. У Залівонаўцы звычай такі быў: каго, значыць, у рэкруты, таго кожны двор павінен прывеціць... Абышоў Спірыдонка ўсе хаты... месяца паўтара баляваў.— Залога адкусіў дранік і нейкі час яго моўчкі, са смакам жаваў.— У Магілёў на камісію паслалі. Дактары, прафесары ўсякія з акулярамі на носе сядзяць. «Раздзявайся»,— кажуць. Спірыдонка скінуў з сябе транты — стаіць сіні, худзюшчы, адны рэбры... Глянулі на яго, і галоўны з іх кажа: «Якія яму рэкруты? Ён к заўтраму памрэ...» Забракавалі.

На наступны год зноў тая ж карціна... Каго? Зноў — Спірыдона... Пайшоў па другім крузе па хатах. А пасля паглядзелі тыя магілёўскія дактары, і галоўны, не на жарт раззлаваўшыся, заяўляе: «Вы што, здзекаваецеся? Ён жа, гэты рэкрут, к вечару канькі адкіне!» Ужо, бачыш, «к вечару». А Спірыдонка пасля гэтага больш васьмі дзесяткаў яшчэ неба капціў...

— А не выдумвай ты... што так было,— ведаючы, што муж часта любіць трохі перабольшыць, прыхарашыць, не згадзілася Маруся.

— Ну што — «не выдумвай»? — ускінуўся Залога.— Так і было.

Яны доўга маўчалі, кожны думаў пра сваё. Маруся падносіла гарачыя, трохі падсушаныя — аж патрэскваюць! — духмяныя дранікі мужыку, ён няспешна, з засяроджанасцю ў вачах намазваў іх маслам і еў.

— Дзякуй, гаспадыня, натаптаўся! — нарэшце сказаў ён і ўстаў з-за стала. Зачэрпнуў з вядра кружку вады, прагна — ажно сутаргава падрыгвалі вусны — выпіў.— Ну во, цяпер я работнік! Хоць у плуг.

Ён выйшаў з хаты, узяў у кладоўцы на палічцы малаток і бабку. Бабку апусціў у кішэню пінжака, малаток трымаў у руцэ.

На дварэ раз'яснівалася, хутка ў хмарнай каламуці сонца прамые сабе палонку, выбліснe — і засмяецца дзень. За сядзібамі, недзе, мабыць, ускрай жытнёвага поля перапёлка заводзіла «піць-пібіць», у якое ціха падмешвалася ручайковае «рру-рру».

У Залогі з раніцы сцеплілася на душы, і яму хацелася як даўжэй пабыць у такой лагодзе. Ён упарта не пускаў свае думкі ва ўчарашні дзень, адчуваў — там яны пазмрачнеюць, закруцяцца вакол непрыемнага. Ну, хіба не дзіва: перад чалавекам ніколі не стаіць праблема, куды дзець радасць, ён вечна думае, як пазбавіцца згрызот, няўвязак, абмінуць злых людзей? Залога як бы сцяўся ўнутрана, засяродзіўся на сваім клопаце, які кіраваў яго розумам зараз, у гэтую хвіліну.

З-пад сталюгі ён выкаціў ладны тоўсты бярозавы кругляк, прыкаціў нагою на сярэдзіну двара, паставіў. Зверху ў ім відаць рудая ад іржы квадратная дзірка, па краях глыбокія крыж-накрыж умяціны — застаціся ад цвікоў, якія праміў Залога, апошні раз яны спатрэбіліся на стрэшку калодзежа (было загадана над усімі калодзежамі парабіць стрэшкі).

Ножкаю бабкі Залога пацэліў у ржавую дзірку, лёгенька стукнуў па бабцы малатком. Каля дзвярэй хлява ўзяў нізенькі прадаўгаваты ўслончык з растапыранымі тоўстымі ножкамі — на ім Маруся заўсёды даіла карову. Залога зрабіў яго тады, калі жонка пачала кволіцца на нозі, гады два назад. І яму самому цяпер не трэба шукаць, на што сесці, калі выйдзе на двор пакурыць ці во пакляпаць касу.

Залога падставіў услончык да калодкі. Абматаная анучкаю каса тырчала за крокваю ў павеці. Скасіўшы ў Гарэльніку траву, Залога яе туды падторкнуў. З ніжняга, злізанага, боку каса пабралася рудаватымі крапінкамі, быццам нехта абсыпаў яе чырвоным молатым перцам. Гэтая ржа не страшная — разы два кашануў, і яе змыла.

Цок! Цок! Цок! — заскакаў у Залогавай руцэ малаток. Ад пяткі і да сярэдзіны касы кляпаць Залогу лёгтока, а чым бліжэй да мысіка, тым каса больш пераважкае, і трымаць яе скалечанай рукою няпроста. Звычайна ён гукае жонку — каб патрымала.

Раз за разам Залога браў касу ў рукі, правяраў вялікім пальцам клёп — скура чапляецца, адчувае вастрыню.

Рыкнула, як затрубіла ў трубу, карова.

«Во, ужо з ранак гоняць!..» — схамянуўся Залога, і малаток весялей затанцаваў у ягонай руцэ. Рэха расплёсквалася, разбівалася аб сцены хаты і пуні і, мя-

няючы напрамкі, ляцела далей, адгукалася круглым, як мячык, гукам ажно за вёскаю, у Шарыпчынай Грыве.

Трэба ж! Залога стукаў малатком у бабку, а бачыў у руцэ кельму, калодачкаю якой пастуквае ў цагліну — муруе помнік...

Ляпнулі за спінаю весніцы. Залога павярнуў галаву і ўбачыў Язэпа Касілу.

— Касу клепіш? — спытаў ён. На плячы ў яго вісела аблытаная павуцінаю сухая альховая лісціна.

— Самае цяжкае, ранкі, адбыў? — Залога паклаў на калена малаток. На яго пытанне, як і на Язэпава, адказваць не трэба — у іх саміх адказ.

— Дай закурыць, Серафімка, свае ўсе скурыў.— Язэп ляпае па пустой кішэні шэрага, прапаленага на правым крысе пінжака. На нагах у яго кірзавыя боты — халявы сухія, а ступакі мокрыя, у гразі. Язэп збіў на макушку руды выпалены сонцам брыль — валасы прыліплі да лба, блішчаць у тым месцы, дзе іх прыціскаў скураны акраек.— Фу-у-у!..— выдыхнуў з грудзей паветра і дым.

— Набегаўся?

— Ды не сказаць... Добра хадзілі... Мы за Майданам, каля Гарэльніка пасвілі, там травы многа... Нехта касіў нават.

— Гэта я,— прызнаўся Залога.

— Нядаўна прывёз? Сяніны вунь па двары, бачу...

— Учора Пецька Клімаўскі прывёз.

— Скажы ты мне, Серафімка...— Язэп пашморгаў носам, строс мезенцам з папяросы попел.— Што гэты Клімаўскі замысліў? Забурыў да мяне на цёмнай зары і просіць, каб я гэта... помнік чыкнуў.

У Залогі зваліўся з калена малаток, але ён не падніма́ў яго. У гэтае імгненне выбліснула з-за хмар сонца, усё наўкола пасвятлела, зальсніўся ў Язэпа лоб, і толькі вочы ў Залогі пацямнелі, наліліся густым сумам. «Значыць... Значыць...— з цяжкасцю праясніўся розум.— Усё-ткі зносіць... Ніхто не ўступіўся, не запярэчыў...»

— Гэта ж дадумаліся! — з адчаем выкрыкнуў ён.— Ёсць у людзей мазгі ці не? Нейкаму ёлупню стукнула ж — помнік убраць! Сёння помнік, заўтра — вёску, а там яшчэ што-небудзь камусьці не спадабаецца. Дык тады ўжо і зямлю ўбірайце к чортавай матары!

Навошта яна? Во радыяцыі напусціце — і канцы ў ваду!..

— Не кіпяціся, Серафімка... Уталкуй мне папулярна.

— Ды што талкаваць! — І праўда, быццам чайнік кіпеў Залога.— Да мяне самога, да майго дурнога кацялка,— ён пастукаў кулаком па галаве зверху,— не даходзіць!

— Я такі ўраз скумекаў: тухлае дзела прапаноўвае мне Клімаўскі.— Язэп, было відаць, у душы радаваўся, што не паслухаўся Клімаўскога, разабраўся, што да чаго,— і асабліва гэта прыемна было выставіць перад Залогам.— Нехта ж яго наштурхнуў...

— У сельсавеце рашано...

— Ды гэтымі саветамі начальнікі сваю лень прыкрываюць. Рукі не даходзяць — пастанавілі... Няма калі займацца — пастанавілі... Можна абысціся — зноў пастанавілі...

— Вот і я не веру, каб раптам ні з таго ні з сяго помнік не патрэбен...

— Нячыстым пахне! — зазначыў Язэп і, палажыўшы на лоб далонь, націснуў пальцамі на скроні.— Шуміць у башцэ, ціск падняўся... Дый кірнуў я ўчора крыхулю. Радыяцыю выганяю...

— Кажуць, у зоне там нават шафёрам дазволілі па сто грам.

— Сто грам нават для смеласці мала! — рагатнуў Язэп і зноў пацёр скроні.— Можа, у Марусі таблеткі якія імеюцца... клафелін?

— Табе не таблеткі пасля ўчарашняга трэба... Горла во хрыпіць — прамачыць трэба.

— А ёсць чым? — абрадаваўся Язэп.

— Настойка. Пайдзёць?

— Любую заразу ўжываю.

— Маруся! — гукнуў Залога.

Рыпнулі дзверы, выйшла з хаты Маруся. На нагах у яе былі валёнкі.

— Налі чалавеку,— сказаў ён, паднімаючы з зямлі малаток, і звярнуўся да Язэпа: — Патрымай касу.

Язэп прысеў на кукарэчкі, узяўся абедзвюма рукамі за касу — за сярэдзіну і за пятку. Залога пачаў кляпаць. Язэп раз за разам касіўся на дзверы. Нарэшце Маруся вынесла пунсовую шклянку. Мужыку яна часам не давала выпіць, а чужым мужчынам налівала

ахвотна, і калі яна прасіла іх што-небудзь памагчы, яны адгукаліся на яе просьбы.

— Во, цэлы стаканец лекаў! — усклікнуў Язэп.

Ён выпіў. Аблізнуў вусны. Зноў папрасіў у Залогі закурыць.

— Ён мяне купіць захацеў — думаў, клюну! — Голас у Язэпа адразу падужэў.— А я з ходу ад вінта яму даў. Я, Серафімка, з табою заўсёды шчыры быў... Не хлусіў і хлусіць не збіраюся. Мне ўжо ўсё роўна. Мая песенька спета... І не было ў мяне жызні. Аб адным шкадую: сына не нарадзіў... Дачка не той каленкор. У цябе двое сыноў, Серафімка... Значыць, Залога жыць будзе, корань атожылкі будзе пускаць. А я як сабака бадзялы падохну, усю жызню торкалі ў вочы: паліцай, Язэп Касіла паліцай... А які я паліцай? Верыш, Серафімка?..— Стомленая Язэпава душа расслабілася зусім ад настойкі.— Нават жа формы не было ў мяне, толькі павязка... Семнаццаці гадоў не было... Прыйшлі гады, прыпёрлі да печы аўтаматамі і бах-бах абапал галавы — гліна па мордзе сячэ... Бацька стары на калені цуп: «Сыночак, яны цябе заб'юць!..» Калі б ведаў, што так пасля нацярплюся, няхай бы стралялі — і мяне, і Нінку, і бацьку... Усіх!..— Язэп выцер кулаком бабіны слёз.

— Ну, што ўжо так раскіс? — Залога глянуў на Язэпа са спачуваннем.

— Крыўдна, Серафімка... Навязалі мне злачынства... Чачорка старая — зямля ёй колам! — прыдумала: кажух у яе здзіраў... Я тады, як вярнуўся з Калымы, сустрэў яе ў магазіне і кажу: «Я кажух твой забраў? Хадзем я табе дзесяць зараз куплю!» Хрушча, Мымкова бацьку, выручаў, а прыпісалі, што я ўдаў яго немцам... Ды не я, павер, Серафімка! Быў адзін там паскуда, падонак, здраднік, старлей у нашай арміі быў, ён і правярнуў гэтую афёру. Хадзіў да Хрушчовай дачкі, на любоў схіляў, а тая не хацела... Бацька заступаўся, вось ён і ўбраў яго акуратна.

— Нашто старое варушыш...— Не падабалася Залогу, што Язэп спавядацца перад ім пачаў, як бы апраўдвацца. Заднім чыслом, як гаворыцца, усе разумныя, бо вядома ўжо, што яно ды як, усё расстаўлена па палічках. Адразу відаць, што чым абярнулася. А наперад прадугледзь, прадугадай, жыццё набела не перапісваецца. Малы, малалетка быў... Можна і так

паглядзець, а можна і з другога боку: чаму адразу ў партызаны не збег, на фронт?

Язэп акурат пачуў Залогавы развагі.

— Думаеш, я нюні матаю? Трываць не магу! Усе як на здрадніка глядзяць. І гэты Клімаўскі прышпандоліў! Хто на тухлае дзела пойдзе? Канечне, Язэп-паліцай. А накась выкусі! — Язэп выскаліў, як вар'ят, зубы і скруціў дулю.— Я крывёю скупіў сваю віну...во! — ірвануў на грудзях кашулю і ў выразе замасленай майкі паказаў шрамы.— З сорак чацвёртага на фронце... Дзесятку на зоне адцягнуў... Толькі таму і выжыў, што брыгадзірам паставілі, а так бы з голаду скурчыўся б. Ты, Серафімка, слухаеш, слухаеш, а зараз скажаш: валі ты адсюль, праведнік! А куды мне валіць? Каму мне расказаць пра гора сваё? Хто мяне выслухае? Жонка родная... Дзесяць гадоў у адным ложку праспалі, не зразумела, толькі і чуў: паліцай, такі-гэткі...— Вочы ў Язэпа заплылі слязамі, як лінзамі закрыліся.

Калі шчыра, не хацеў разумець Язэпа і Залога. Гэта штуковіна такая, што, уліпшы, не адмыешся за ўсё жыццё, хоць якім залатым мылам трыся. Розум яшчэ не развіўся, каб зразумець чалавека, які супроць пайшоў. Іншая рэч, што цяпер Касіла чалавекам стаў, у доўгіх муках ачысціў сваю душу, перахварэў, і адкрылася ў ёй такое бяздонне, пра якое чалавек звычайна можа і не здагадвацца. Не схацеў жа во паслухаць Клімаўскога, абурыўся яго прапановаю. За гэта малайцом! А Клімаўскі таксама хіцёр, бач, да каго пад'ехаў: чалавек жыве не ў вёсцы, грашок за сабою мае... Як жа добра, што ён, Залога, напісаў у раёнку заметку. Быццам адчуваў. Не стаў чакаць. Пакуль будуць рассусольваць — заметку і надрукуюць.

Язэп кінуў на зямлю недакурак, плюнуў на яго і раздушыў абцасам ярасна, са злосцю.

— І з галавешкамі лухту навешалі! Нібыта я палонным партызанам галавешкамі пяткі падсмальваў... Аднавокага Лашка падгаварылі... Ён прызнаўся мне пасля: «Нічога, Язэп, я не бачыў, сказалі мне: пасведчы так і так...» Калі б не прызнаўся, я чыкнуў бы яго... мне ўжо ўсё роўна! — Язэп скрыпнуў зубамі і моцна зажмурыў вочы — вейкі трэсліся, і з іх выплывалі, як сок з бярозы, вялікія мутныя слязіны.— Эх, жызня! У грабу я відзеў такую! — адчайна махнуў рукою.—

Не было ў мяне жызні! Я не знаю, Серафімка, што такое радасць... Бацьку раскулачылі — млынок быў, людзям жыта малоў... Ледзь што: сын кулака. Паступаць на вучобу хацеў — не ўзялі... соцпраісхаждзенне. Вайна пачалася...— Ён высмаркаўся.— Падрэзалі маю радасць. Няма яе во тут...— Язэп паторкаў пальцам сабе ў грудзі.— Каб знаў, што так будзе, махануў бы з немцамі, як некаторыя, ужо якім-небудзь фермерам быў бы...

— Ну ўжо, ну ўжо! — як на дзіця, нукнуў Залога.— Патрымай касу яшчэ.

Рукі ў Язэпа дрыжалі, і джала касы скакала па бабцы. Залога прыціснуў яго пяткаю малатка, паказваючы, што трэба, каб не варушылася.

— Не магу! — сказаў Язэп.— Можа, Серафімка, забацаеш мне яшчэ клафеліціну? Чырвоненькую.

Залога, крутнуўшы галавой, зноў гукнуў Марусю.

Глыкнуўшы другую шклянку, Язэп супакоіўся.

— А гэтаму Клімаўскому трэба па лапах даць,— сказаў ён ужо дзелавым тонам.— На ражон чалавек лезе.

— Я ў газету напісаў,— нечакана прызнаўся Залога.

— У нашу?

— Ага...— Залога ўзяў касу, правёў пальцам па джале.— Няхай разбяруцца...— Нацэліўся касою ў неба, правяраючы, ці няма лапатухі.

— Не здавайся, Серафімка! — падбадзёрыў Язэп.— Гэта твой манумент. Я зайду ў рэдакцыю... у мяне там знакаман ёсць, папрашу, каб прапячаталі хутчэй.— Язэпу здалося, што Залога недаверліва глянуў на яго, і ён пацвердзіў: — Я паражнякі не ганяю, фатограф — кораш мой. У быткамбінаце разам сака давілі...

— Зайдзі скажы...— згадзіўся Залога, хоць не сумняваўся, што і так надрукуюць яго заметку, бо невыпадковы ён чалавек, у рэдакцыі яго ведалі. Праўда, часам так перакруцяць-перакрояць яго заметку і загаловак памяняюць, што па прозвішчы толькі і пазнаваў. Але тут ужо факт важны, а не тое, як напісана, яго рукою ці нечай з рэдакцыі.

Залога дакляпаў касу, падзякаваў Язэпу.

— Табе маё пачцение, Серафімка, за лекі! — рас-

кланіўся Язэп.— Пайду кімарну трохі, а то кастылёў не пацягну пасля абеду...

— Што ета ён гаварыў? — выйшла, пацікавілася Маруся, калі за Язэпам зачыніліся весніцы,— яна, відаць, з хаты прыслухоўвалася да іх гаворкі.

— Вось цябе толькі не хапала, твайго языка! — незадаволена буркнуў Залога. Пастукваючы малатком у бабку з бакоў, выбіў яе з кругляка, панёс у кладоўку; праходзячы міма жонкі, глянуў ёй у вочы мяккім позіркам.

Выйшаўшы зноў на двор, пачаў наснуджваць касу. На абшыты бляшанкаю канец касільна надзеў баньку, уставіў ражок касы, лучыўшы вусікам у адтуліну, і забіў клін. Пахітаў касу — сядзіць як улітая, надзейна. Махнуў над зямлёю раз, другі — здаецца, каса «не проста», але на ўсякі выпадак вырашыў праверыць: з яго ўжо здароўем любая непаладка ў касе томіць.

Узяў кавалак шпагату (вісеў на скабе пад страхою пуні), канец прыціснуў каля «пупка», нацягнуў да пяткі касы, а потым перанёс на мыс — адлегласць была аднолькавая. Знаць, вочы яшчэ мае, «прыцэл» не збіўся. Касец у поўным узбраенні. Мянташку яшчэ ў кішэню ўткнуць, наліць у бітончык бярозавіку — і можна ісці касіць.

Вох жа і негулявая гэтая работа — касьба, нацягваць усе жылы трэба,— ды любіў яе Залога, нутром любіў. Настрой міжволі свяжэў, калі касу ў рукі браў. Маладзейшы быў — то ніводзін мужчына з ім не спраўляўся: паперадзе стане — Залога пяткі яму падразае, ззаду — адстане ад Залогі на кіламетр, тады толькі лае, бо сорамна ж — лянуецца, падумаюць. І гэта — нягледзячы на раненне.

Залога не ведаў дый не шукаў тлумачэння, скуль у яго такі спрыт у касьбе. Дзед яго, Спірыдон, рэкрут, казалі, быў адмысловы касец, махаў касою як пужкаю сцёбаў: ужык, ужык, ужык... Ён во, мабыць, у дзеда ўдаўся. І цяпер, рыхтуючыся да касьбы, ён адчуваў у душы радасць, але дзівіўся, што ўсё-такі не спяшаецца, марудзіць нешта, аддаляе гэты момант, калі з хрустам каса ўвойдзе ў сакавітую гушчыню травы, ці што; а можа, яму рупіць нешта іншае тут, дома.

## IX

Раніцаю, перакусіўшы, Пятро Клімаўскі паехаў у праўленне на нарад. Там ужо стаялі машыны і трактары. Мужчыны, збіўшыся кучкаю каля ганка, курылі. Пятро, праходзячы міма, павітаўся — кіўнуў усім: «Добрай раніцы!» Ён ведаў, што Туземчык, старшыня, ужо на месцы, і хацеў да нарада пагаварыць з ім.

Туземчык сядзеў за сталом, нешта пісаў — ручка нервова тузалася ў руцэ. Ён быў у цёмным світэры. Пятро падышоў, і старшыня падаў яму пульхную, мяккую руку. Шчокі і падбароддзе ў старшыні адвісалі, і апушчаныя ўніз куточкі рота надавалі твару сумны выраз. Але светла-шэрыя вочы былі жывыя, глядзелі порстка. Старшыня Пятра Клімаўскога шанаваў, у думках, сам сабе, называў яго Белай Воронаю, бо за гэтыя два гады, якія старшынюе, ні разу не бачыў яго п'янага. Ніколі ні ў чым не адмаўляў, ішоў заўсёды насустрач. І цяпер Туземчык уторкнуў у прыбор ручку, нарыхтаваўся слухаць.

— Трапіў я, Іванавіч, як кажуць, у нерат...— пачаў Пятро, сеўшы на крэсла і палажыўшы на стол руку.

— Ні ўзад ні ўперад? — падхапіў, усміхнуўся Туземчык. Па ім у размове ніколі не скажаш, што ён строгі кіраўнік — заўсёды выслухае, унікне ў справу, падкажа,— але апраўданняў, што тое ці другое перашкодзіла зрабіць, не прымаў.

— Ну эвакуацыя ж гэтая... Дзеці мае ў цешчы ў Лютаўцах. Трэба ехаць забіраць... Калі тут іх вывозіць будуць?

— Не гавары ты, клопату падкінулі нам,— уздыхнуў старшыня.

— А па-другое, справа гэтая з помнікам завязалася...— Пятро падняў сумныя вочы, а праўдзівей, зрабіў іх сумнымі, каб расчуліць старшыню.

— Што, гарыць? — Туземчык падумаў, што Клімаўскі мае на ўвазе новы помнік — «бабу», як яго называлі мясцовыя.

— Лашкоў настойвае.

— Ці да помніка цяпер? Трэба дзяцей ратаваць.

— Хлынуць чужыя, усякія камісіі — не хоча ганьбы.

— Каму якое дзела да помніка да вашага? — Ту-

земчык забарабаніў кароткімі пальцамі па стале. Кароткія пальцы рабілі падобнай руку на крацінуую лапу.

— На віду ж стаіць...

— Як стаіць? — напружыўся, падняў плечы Туземчык.

— Стаіць занядбаны. Убіраць трэба.

— Ах дык ты пра стары! — здагадаўся Туземчык.— Пра той, што каля шашы... Ну, ды што вы хочаце з ім рабіць?

— Я ж сказаў — убіраць. Можа б, каму нарад выпісалі?

Старшыня адкінуўся на спінку крэсла, зноў забарабаніў кароткімі пальцамі па стале. Ён адразу зразумеў, што справа, з якою прыйшоў Клімаўскі, няпроста. Ён чалавек нетутэйшы, выпадковы, можна сказаць, і калі напракудзіць — людзі не даруюць. Непрыкметна, цішком будуць шкодзіць, соваць палку ў колы. І ён тады сябе не зарэкамендуе, не пакажа перад вышэйшым начальствам, і кар'ера на гэтым скончыцца.

Чужак, ды яшчэ настроіць супраць сябе людзей... Хіба паднімеш калгас? Іншая рэч — свой чалавек. Ён жыве заслугамі роду, памяццю аб дзядах, бацьках... Даруючы памяці — даруеш і яму, бо чалавек вывяраецца і правяраецца памяццю. А яго памяць, карані далёка, на Смаленшчыне. Там ён нарадзіўся, там жыве яго маці, дзве сястры і брат. А яго, бы тую крыгу ў паводку, адарвала ад берага і нясе ўдалеч, якая невядома дзе і які рыхтуе яму канец.

— Не, Фёдаравіч! — раптам сказаў Туземчык цвёрда.— На гэтую афёру я не пайду. Як хочаце, што хочаце рабіце самі, а я бурыць помнік чалавека пасылаць не буду. Не ўцягвайце мяне, калі ласка, у гэтую справу. У мяне сваіх па глытаўку. Вы — улада, вы і разбірайцеся. А я чалавек тут часовы: прыйшоў, пасядзеў і пайшоў.

Туземчык з Лашковым не ладзілі: не было вялікіх спрэчак, але і дружбай не пахваліўся. Неяк адразу між імі праляцеў скразнячок адчужанасці. Лашкоў, мабыць, лічыў, што ён улада, гаспадар тут, старажыл, і паводзіўся незалежна, але не меў на сваёй пасадзе нічога такога, за чым старшыні калгаса было ісці на паклон. Якраз у душы Туземчык чакаў, што Лашкоў будзе прасіць у яго і машыну, і лес, і сена, і таму па-

вінен запабягаць. Гэтыя іх незалежнасць і фанабэрыя пераразсталі ў непрыязнасць. Туземчык будзе ехаць на легкавіку, а Лашкоў стаяць на прыпынку — адвернуць морды, як бы і не бачаць адзін аднаго. Так і пазбягалі абодва, каб не сутыкнуцца, не вырашаць адну справу.

«Дык што ж гэта такое?!.— ледзь не гвазданўў кулаком па стале Пятро.— Куды ні паткніся — адбой. Чаму гэта на мне ўсё заштопарылася? Кожны мае права адмовіцца, а я не маю. Я што, гаспадар таго помніка, ці што? Пайшло яно ўсё!..»

Пятро зноў быў блізкі да адчаю, але паколькі адзін раз яго перажыў, то цяпер было лягчэй закілзаць сябе. Ён толькі пабялеў і адчуў, як у грудзях часта б'ецца сэрца.

— А што да дзяцей, то можаш ехаць па іх,— гледзячы на танец сваіх пальцаў, сказаў Туземчык сухаватым голасам. Трэба было канчаць гэтую непрыемную гаворку і пачынаць нарад. Ужо зазірнуў у дзверы галоўны заатэхнік, потым аграном — хлопцы маладыя, нецярплівыя: рэдкі раз не спазніліся, у час прыйшлі, і то не будуць ацэнены, заўважаны старшынёю. Хлопцы хлопцамі, але і спраў хапае: касіць, акучваць, будаваць, даіць, пасвіць... Здаецца, знаёмая, звыклая векожная работа ў вёсцы, людзі выраслі на зямлі і ведаюць яе як свае пяць пальцаў, але — дзіўная рэч — з дробязей раптам намотваўся такі клубок праблем, вырашыць якія не заўсёды было пад сілу нават яму, кіраўніку з немалым стажам і дзвюма вышэйшымі адукацыямі. Тая зямля, тыя ж людзі, але кожны іх новы крок не паўтарае ранейшы.

Засмучаны, Пятро выйшаў з праўлення, і ў дзверы да старшыні падаліся адразу ўсе мужчыны, несучы з сабою востры пах тытуню і прамасленых, прапітаных потам камбінезонаў.

Ён зганяў у Лютаўцы, забраў дзяцей з жонкаю, на твары якіх убачыў трывогу і нейкую журботную засяроджанасць. Не вельмі іх суцяшаў, бо ў самога на душы было пагана: марнуе час, тады як астатнія зарабляюць грошы, а над ім вісіць яшчэ як бомба, як пятля і гэтая справа з помнікам.

«Чорт бы іх пабраў!..» — не мог астыць, нерваваўся Пятро, едучы па дарозе ў Нямільню, у сельсавет.

Была другая палова дня. Сонца, неахвотна з раніцы выдзіраючыся з хмар, цяпер свяціла ярка, адбі-

ваючыся ад капота трактара, сляпіла вочы. Пятро апусціў кардонны брылёк над лабавым шклом — і адразу спала напружанне з вачэй, яны расшырыліся, стала лёгка глядзець. Калі сам у цяні, то асветленая сонцам прастора выдае яркаю, празрыста праяўленаю, відаць кожны лісцік, кожная іголачка, кожная рыска на сасновай кары. Янтарнымі фартушкамі застыла на падсочаных соснах жывіца, а тыя кропелькі, што яшчэ не паспелі застыць, калюча бліскалі сінімі ўспышкамі.

«Трасянуў людзей гэты Чарнобыль,— пераключыў свае думкі з адной бяды на другую Пятро.— І колькі-та часу пройдзе, пакуль гэтая зараза знішчыцца? Дзяцей нібыта аж да верасня вывезуць. Няхай адпачнуць, у лагеры пабудуць...»

Цяжка было згадзіцца, што не вайна, не землятрус, не паводка, а над людзьмі навісла пагроза, смерць падкрадваецца да іх без шуму, стрэлаў, выцця, рову, непрыметна і невядома праз што ўсяляецца ў чалавека, разбурае і забівае яго. А не забівае, дык робіць калекам — без ран, без крыві, без болю. Чортведама што такое!

Лашкова ў сельсавеце не было. Сакратар Пятра ведала, яна была далёкая Насціна сваячка; сказала, што «Якаў Мікітавіч пайшлі дахаты». Пятро паехаў яго шукаць.

Лашкоў насіў у лазню ваду. Лазня стаяла на двары — між ёю і хлявом была фортка на гарод. Лашкоў быў у пінжаку і ў шляпе, знемагаў ад поту — твар блішчаў, валасы на скронях змоклі, пазакруціліся ў кольцы.

— У лазні паліш? — спытаў Пятро, не гаворачы адразу, чаго прыехаў,— хацеў выведаць, які ў Лашкова настрой.

— Трэба ж. Раяць мыцца кожны дзень пад душам...— У голасе чулася заклапочанасць.— Ну, чым абрадуеш? — Ён паставіў вёдры на лавачку — вада выпліхвалася, збіралася на зямлі, у пыле ў шарыкі.

— Гіблае дзела! — сказаў Пятро з адчаем.

Лашкоў адразу насцярожыўся, хоць і дасюль не быў да канца даверлівы, і непрыязна паглядзеў на Пятра. Што за дурань? Ці то і праўда сутыкнуўся з цяжкасцямі, ці за нос водзіць? Не пройдзе! Што ён, старшыня сельсавета, будзе ім парадак наводзіць — на вуліцах, у дварах, каля помнікаў? Самі запусцілі, а

цяпер... Сказана — выконвайце! Вёсцы патрэбна культура, чысціня. Няхай не пяць, адзін будзе помнік, але дагледжаны, ахайны, прыбраны.

— Я думаў, што ты, Клімаўскі, чалавек кемлівы, рашучы, а ты мямля, баба... Ходзіш, стогнеш! Што, людзей мала? Ты ў Туземчыка быў? — Лашкоў апусціў вочы, махаў каля твару сваёй лапішчай. Закралася падазрэнне: можа, гэта ён, Туземчык, працівіцца ўсяму?

— Быў і ў Туземчыка...— панік зусім голас у Пятра.

— Ну і што? — У Лашкова застылі на твары і вочы, і вейкі, і губы — не варушыліся. Край важна было ведаць, ці працягвае Туземчык знарок пагарджаць ім.

— Ясна — што... калі прыехаў сюды. «Не ўцягвайце мяне, калі ласка, у гэтую справу».

Лашкоў мармытнуў, крутнуў разы два галавою. Чарціў наском чаравіка па зямлі, нешта думаў.

— Ты, чэснае слова, як маленькі, Клімаўскі! — выбухнуў ён, аж затросся падбародак, і больш не мог нічога сказаць. Тупа глядзеў на Пятра. Калі па шчырасці, ён і сам не бачыў выйсця, не мог падказаць, як, якім чынам разматаць гэты клубок з помнікам. Ён пакутліва моршчыў лоб, шукаючы ў галаве якія-небудзь новыя думкі, але яна была пустая, не хацела варыць, у ёй сядзела, як цвік, адно рашэнне — убраць. Не прывучана была ягоная галава пускаць думкі па шырокім крузе, яны круціліся па лініі ражкоў інструкцый і распараджэнняў, якія спускалі зверху, а на гэты раз іх не было, і мазгі яго забуксавалі.— Прыдумай ты нарэшце што-небудзь! — наліваючыся чырванню, хрыпеў Лашкоў.— На ўвесь Саюз прагрымець хочаш? Мы ж сабе месца тады не знойдзем!

Нападаючы на Клімаўскага, Лашкоў, аднак, трымаў на засцерагальніку адну-адзіную думку — каб не ляпнуць у запале, што раз няма чалавека, няхай ён сам, Клімаўскі, разбурыць помнік. Хоць быў не супраць і, зрэшты, да гэтага падводзіў. Не дурны ж ён, Лашкоў, асцярожны, вопытны: не дрэва старое ўбірае, а — помнік. Раптам пасля ўсё павернецца зусім іншым бокам і столькі грахоў прыпішуць. Колькі чаго пачыналі і потым каяліся! Грамілі цэрквы і старыя пабудовы... Сеялі кукурузу і рабілі торфа-перагнойныя гаршчэчкі... Спрамлялі рэкі і асушалі балоты... Аб'яў-

лялі неперспектыўнымі вёскі і секлі галінкі на корм... І столькі ў кожным парыве было захопленасці, перакanання, безагляднасці: вось, здавалася, узялі бога за бараду! І праз нейкі час энтузіязм згасаў і выяўлялася, што на асядланым коніку ў рай не заедзеш, вяла дарога з гары (мэта здавалася ўжо блізка) — і раптам крута брала ўгару, кожны крок даваўся цяжэй і цяжэй, адале і зусім конік прыставаў, падаў на калені і выцягваў ногі... Парвалі каня. Па ім нават ніхто не плакаў, таму што ўнізе, на прыгожым лужку, іржаў, падбрыкваў ужо малады, свежы, аксамітны ў бліках сонца жарэбчык. Яму ўжо неслі сядло і залатую збрую пад урачысты, барабанны пошчак.

— Я прыдумаю, у бога мацы!..— раптам скрыпнуў зубамі Пятро.— Во пайду і развярну яго ломам! Я ўжо звёўся з гэтым помнікам, цярпення няма... Адурыў і азяліў! Глядзі, што ў псіхбальніцу завязуць.

Лашкоў бачыў, што Клімаўскі сапраўды сутыкнуўся з цяжкасцю, мясцовыя людзі не зразумелі яго, мабыць, адвярнуліся, хай паднялі, асудзілі. Во і яму ўчора з рэдакцыі званілі: пісьмо прыйшло, што помнік залівонаўскі ў дрэнным стане, занядбаны. Хто напісаў, не сказалі. Ды ясна і так — Залога. Той усё піша... Лашкоў перш хацеў сказаць Клімаўскому пра гэты званок з рэдакцыі, але перадумаў. Чаго добрага, не разабраўшыся, напалохаецца і за вушы не прыцягнеш яго да гэтага помніка. Што тады рабіць?

— Ты не кіпяціся, брат,— супакоіў Пятра Лашкоў,— усё можна зрабіць спакойна, і будзе шыта-крыта.

Пятро не зразумеў, што Лашкоў меў на ўвазе пад гэтым «усё можна зрабіць спакойна», але распытваць не стаў, бо не сумняваўся: ніхто яму ні ў чым не дапаможа, не вызваліць яго, а толькі больш затлуміць.

— Ладна! — сказаў ён і пайшоў рашучым крокам. Лашкоў з неспакоем глядзеў яму ўслед: каб гэты Клімаўскі часам не нарабіў якой бяды. Яе, бяды, і так хоць адбаўляй. «Не было печали, так черти накачали»,— праспяваў ён сабе пад нос, узяў з лавачкі вёдры і панёс іх у лазню, з коміна якой віўся чорны дымок.

## X

Перад тым як ісці на сядзібу касіць, Залога дачакаўся пошту. Адразу разгарнуў раёнку. На другой старонцы вялікімі літарамі было напісана: «Пісьмы чытачоў». Пад імі ён і адшукаў сваю заметку. Яе скарацілі, перапісалі, але «соль» засталася яго — трывога за помнік. Ніжэй маленькімі чорнымі літаркамі быў набраны каментарый ад рэдакцыі. Залога прабег яго вачыма. Іці твае пяты! Тое ж самае, што яму гаварыў Лашкоў. І атрымліваецца, што помнік у Залівонаўцы сапраўды непатрэбны. Дык што ж рабіць і куды кінуцца?

Залога сеў пад хатаю на ўслончык, закурыў. Ён разгубіўся ўшчэнт. Але ніякай макулінкі сумнення, што памыляецца, нечага не разумее, у яго ўжо і блізка не было. Апошнім часам ён толькі і думаў, што свайго дабіўся, помнік выратаваў. Няўжо ён так закарэў душою, выпетрылі яго мазгі, што не разумее простых рэчаў?

Яму ўспомнілася, як мураваў гэты помнік. Недзе напрыканцы вясны і летам 65-га. Пра задуму ўстанавіць помнік першы яму сказаў Вілюхін, дырэктар школы. У Залогі нават думкі не ўзнікла, патрэбен помнік у іх Залівонаўцы ці не,— тады неяк шмат пачалі ставіць паўсюдна комплексаў, стэл, манументаў. Яму, удзельніку вайны, гэта вельмі падабалася, уяўлялася зусім правільным і неабходным.

Ён, не раздумваючы, згадзіўся змураваць помнік, хоць вопыту і навыкаў у гэтай справе ў яго зусім не было. Ён хадзіў у адмысловых печніках, мог яшчэ заліць падмурак пад хату, зацэментаваць двор, выкласці пограб ці яму пад бульбу.

За праектам ездзіў аж пад Бабруйск; там у адной вёсцы зняў чарцёж з помніка, распытаў, колькі трэба цэглы, цэменту. Сказаў Вілюхіну, той паклапаціўся, каб прывезлі; дырэктар таксама не сядзеў злажыўшы рукі — за саджанцамі (кустамі ружаў і язміну) злётаў на калгаснай машыне ажно ў Мінск, у нейкі там шыкоўны гадавальнік. Са сшыткам у руках удвух абышлі ўсе вёскі калгаса, запісалі, хто ў каго загінуў, зверылі звесткі ў ваенкамаце.

Іх Залівонаўка тады проста расцвітала. Ён мура-

ваў помнік, а электрамантажнікі цягнулі лінію. Весела жылося!

Неяк падпітыя электрамантажнікі падышлі да Залогі.

— Ты, дзядзька, нам ужо помнік за асаблівыя заслугі ставіш? — пажартаваў адзін з іх, высокі, смуглы і тым адметны, што чорныя бровы зрасліся на пераноссі, як у цыгана. Ён ці не заляцаўся да Таңькі Клімаўской.

— Вы самі сабе помнікаў наставіце! — Залога намякаў на тое, што хлопцы пазаводзілі ўжо сабе дзевак, адзін ці не прыстаў нават у прымы.

— Ты, дзядзька, я бачу, усё ведаеш,— не пераставаў куражыцца смуглаваты электрамантажнік.— А вось скажы-ка ты мне, дзе цяпер Гітраль?

Ці наўмысна, ці ад таго, што язык заплятаўся, не вымавіў правільна слова электрамантажнік, чым і задомніўся Залогу, і няраз ён успамінаў пасля гэты выпадак з усмешкаю.

Залога не захацеў здацца нязнайкам, цёмным, таму і адказаў на поўным сур'ёзе:

— У зямлі — дзе ж ён... Апазналі ж труп недалёка ад рэйхканцылярыі...

— Ха! Вось ты і не знаеш,— усклікнуў радасна электрамантажнік,— ён — у Амерыцы!

Залога разгубіўся. Астатнія хлопцы зарагаталі, і Залога не зразумеў, яго падкузьмілі ці, можа, і праўда новыя звесткі ёсць пра смерць Гітлера. Заняўся ён гэтым помнікам, ні газет не чытаў, ні радыё не слухаў.

Помнік ён адштукаваў хутка. Яму дапамагалі сыны — капалі пясок, насілі ваду, мяшалі раствор. Ён толькі гаварыў, у якіх прапорцыях сыпаць пясок і цэмент. Сыны, Коля і Юрка, стараліся, і яму было радасна; яны нават і не падазравалі, што праз нейкія пару гадоў лавачка каля помніка стане ўлюбёным месцам іх зборні — гулялі, спявалі, расказвалі, марылі...

Тады і думкі не магло паявіцца, што помнік гэты ў яго, Залогі, на вачах будуць рушыць, што ён стане непатрэбны. Ну, добра, калісь крышылі, ламалі цэрквы, капліччкі, старыя мануфактуры і заводзікі. Недалёчка, каля Сажа, была цагельня нейкага Шая-Яхніна, ці то немца, ці то чэха,— як бы яна прыдалася і цяпер, калі разгарнулі будоўлю і на кожным кроку патрэбна цэгла, але зруйнавалі перад вайною, расцяг-

нулі па кафельцы. Застаўся адно падмурак ды некалькі здзічэлых ігрушын.

І цяпер, пракручваючы ў памяці ўсю гэтую даўніну, Залога чуў у грудзях боль — прыемны і востры адначасна.

Ён не знаходзіў сабе месца.

Рукі не хацелі трымаць касы, пакосчык пройдзе, і — замлелі. Такога з ім яшчэ ніколі не было. Ён спалохаўся гэтай сваёй слабасці. Садзіўся на траву, адпачываў. У грудзях торгалася сэрца, ад поту прамокла кашуля, ліпла да спіны. Даўгахвостая пустальга завісла ў сінім небе, трапятала, як жаваранак, на адным месцы, час ад часу падаючы прарэзлівае «кі-ліii», і ён уздрыгваў.

Маруся разбівала граблямі пакосы, з трывогаю паглядваючы на мужа: ці не захварэў, ці не «радзіяцыя» падкасіла. Ён не прызнаваўся, што ў яго ў галаве: не хацеў лішняга гвалту.

Ледзь скасіў тыя васемнаццаць сотак. Скасіў без радасці і смаку, якія заўсёды спадарожнічалі яму на касьбе.

І не толькі ў яго, ва ўсіх людзей не было на душы радасці. Збіралі на адпраўку дзяцей. Прыязджала з раёна «хуткая дапамога» — правяралі ў дзяцей скуру, валасы. Наўрад ці быў хто з залівонаўскіх дзяцей у піянерскім лагеры, дык во гора прымусіла паехаць. Каторыя сем'і, праўда, не далі згоды — маўляў, паедуць да сваякоў у бяспечныя мясціны. На гэта забароны не было.

Складзеную ў некалькі столак (як колісь на цыгаркі), Залога насіў раёнку ў сподняй кішэні пінжака. Тады-сяды вымаў яе, перачытваў заметку: можа, не ўчытаўся, нешта прапусціў, не зразумеў. І калі ён, седзячы на пакосе (сушыў сена), можа, пяты раз чытаў раёнку, да яго прыбег задыханы, белы Вілюхін. Ён не мог вымавіць слова, толькі кырхаў і каўтаў.

— Д-данілавіч... Кхы-кхы... Клімаўскі-кы п-помнік... Кхы! — р-рушыць...

Залога падхапіўся, быццам пад ім у пакосе заварушылася гадзюка.

— Ж-жонка ў гы-горад сэ-здзіла, іш-шла ад шашы...

— Ды бляха ж муха!..— мацюкнуўся Залога і,

згамтаўшы газету, кінуў на зямлю.— Пайшлі! — сказаў ён рашуча.— Я за сябе не ручаюся...

— Я-я, Д-данілавіч, не мы-магу... Пр-рабач, ледзь д-дабег...

Залога бачыў, што і праўда Вілюхіну цяжка дыхаць, ён ледзь стаіць на нагах — таго і глядзі, рухне на пожню. Хворы чалавек, што яго цягнуць за сабою, падумаў Залога, і спешнай хадою, а потым утрух падаўся па дарозе. Ён не азіраўся. Мінуў свой двор і ўзяў кірунак на шашу. Калі б у акно яго ўбачыла Маруся, яна, нягледзячы на хворыя ногі, пабегла б за ім услед. Відаць жа было, што чалавека пацягнула калі не на нейкую згубу, то на няшчасце пэўна.

Перад шашою Залога прыслухаўся, ці чуваць стукат. Але ў вушах шугала кроў, і ён нічога не чуў. Раптам згледзеў «беларуса» — сінеў каля помніка. «Сабака, на тэхніцы прыкаціў!»

А потым убачыў і Клімаўскога. Ён стаяў на левым «плячы» помніка і махаў ломам — біў па вярхушцы. «Ну, ці не гад жа!» — заскрыпеў, ледзь не ашалеўшы, Залога. Ногі ў яго адняліся, і ён не адчуваў, ідзе ці стаіць на месцы. Позірк упіўся ў Клімаўскога, быццам уліп.

Клімаўскі, здаецца, таксама ўбачыў Залогу, паплюваў на рукі і стаў ямчэй гохаць ломам.

Трактар стаяў заглушаны, увесь запудраны пылам, як прыдарожны валун.

— Ты што робіш?!.— закрычаў Залога.

— Культуру наводжу,— ухмыльнуўся Клімаўскі і, падкалупнуўшы адбітую спайку цаглін, скінуў яе на зямлю.

— А цябе хто прасіў?

— Не ты ж, канечне...

— Злазь, сабака, а то за нагу сцягну! — Залога падступіўся ўшчыльную да помніка.

— Цішэй, цішэй, дзядзька, а то ўбрыкнуць магу,— пачырванеў Клімаўскі, ці ад натугі (падважваў ломам), ці ад прыліву злосці.

«Морда што цагліна і цагліны просіць»,— падумаў з'едліва Залога і зашнарыў каля сябе вачыма, шукаючы якое-небудзь уручышча, каб з ім кінуцца на Клімаўскога. Непадалёк, у канцы насыпу, дзе стаяла тоўстая з раскідзістымі крывымі галінамі сасна, ён нечакана заўважыў маладую парачку — хлопца і дзяў-

чыну. Там жа стаяў матацыкл — чырвоная «Ява». Дзяўчына прысела на сядзенне матацыкла, а хлопец, палажыўшы рукі ёй на плечы, стаяў і глядзеў ёй у твар. Гэта былі, мусіць, закаханыя, прыехалі аднекуль сюды, у зацішнае і асвоенае месца, далей ад людскіх вачэй.

Залога абрадаваўся, што яны з Клімаўскім тут не адны. Гэта надало яму смеласці, а можа, і не смеласці, смеласці ў яго і так хапала, хутчэй за ўсё — упэўненасці, што па-зверску гэта, бурыць помнік, ды яшчэ на вачах у людзей. Што яны падумаюць? Як пасля гэтага будуць сябе паводзіць?

Залогу захліснула абурэнне, і ён пачуў, як звіняць у яго косці — звон прашывае ад пятак і да самага цемя. Быццам сам ён увесь — звон, гудзе, звініць на ўвесь свет.

А Клімаўскі біў ломам і касіўся на Залогу: раптам і праўда той хопіць цагліну ды пекане ў плечы. Вунь як твар пабялеў і вочы проста кіпяць ад злосці. Так ён, канечне, нічога яму не зробіць, слабак стары, выпетраны, а знячэўку можа стукнуць.

— Пецька, па-добраму прашу: не чапай! — узмаліўся Залога, сцяўшы ад бяссілля кулакі.

— Позна! — Клімаўскі з-за вуха гахнуў ломам. Адкалоў ад цагліны толькі ражок — чырвоным матыльком пстрыкнуў у траву.

На сподзе душы, скрозь навалач гневу абазваўся ў Залогі гонар: яго работка, намёртва спаяў цагліны; сама цэгла крышыцца, а шво застаецца, як у тых старажытных кладках, што паказвалі па тэлевізары.

Клімаўскі біў ужо дзюбкаю лома, стараўся адкалваць блокамі і скідваць іх. Разы два яму гэта ўдалося — вяршка, лічы, не было ўжо.

— Што, позна? Хто сказаў — позна? — сарваўся на прарэзлівы крык Залога.— Ты мне пыл у вочы не пускай!.. Я табе не хлапчук...

Клімаўскі перастаў махаць ломам, выцер з твару пот; на руцэ ў яго ўздуліся жылы, пруткія, цёмныя, як гумавыя шлангачкі. Павярнуўся, глянуў на маладых.

— Ты, дзядзька, памяшаўся на гэтым помніку... А ён усё роўна ўжо нікому непатрэбны...— Клімаўскі гаварыў разважліва, спакойна, каб не закранаць Зало-

гі і надаць важкасці сваім словам.— Радыяцыя... Не жартачкі гэта, і надоўга...

— Мне патрэбны! Разумееш? — Залога вырачыў вочы — не мог спакойна слухаць і гаварыць: разрасталася, распірала цвёрдым комам у грудзях абурэнне.— Што мне хто? Я хачу яго бачыць... Я!

— Марокі колькі з ім. Усім трэба, а ніхто ў гэты бок глядзець не хоча... Мы з табою калісь прыбралі каля яго. Хто яшчэ? Гаварыць усе мастакі: памяць... святыня... гісторыя... Якая памяць, якая святыня, якая гісторыя, калі да лямпачкі ўсім? Думаць забылі пра помнік!

— Спахопяцца...

— Хто спахопіцца? Чачорка? Вадзімка з Зіначкаю? А можа, Туземчык? Грынь і той заплюшчыў вочы...— Асекся, назваўшы Грыня, падумаў, што лішняе ляпнуў. З Грынем ён вадзіўся, ладзіў дружбу, возіў яму дровы, сена, падсабляў садзіць і капаць бульбу. Не так сабе, канечне,— праз гэта дзецям яго ў школе будзе большая ўвага, а то і прывілея на ацэнкі. Прынамсі, старэйшы сын скончыў восем класаў з граматай, цяпер «цягнулі» на яе і дачку.

— Во яны,— Залога кіўнуў на маладую парачку, якая, здаецца, прыслухоўвалася да іх крыку.— Ім патрэбны гэты помнік.

— Рассмяшыў! — зарагатаў Клімаўскі, ажно затросся чуб.— Ім толькі джынсы, магнітафоны, пярсцёнкі, матацыклы падавай... Балдуямі растуць дзеці.

— Можа, не ўсе такія...— усумніўся Залога.

Клімаўскі ямчэй усеўся на «плячы» помніка, звесіў ногі ў кірзавых забруджаных гноем ботах.

— Кажаш, не ўсе... Мой Гена як купіў магнітафон, адразу стыпендыя паляцела... З'ездзіў я да яго ў тэхнікум, у інтэрнаце пабыў і сказаў: вось так, хлопец, грошы колькі высылаў... семдзесят рублёў, столькі і буду, ні капейкі больш. Як хочаш, так і жыві. Нябось адразу падцягнуўся, зноў даюць стыпендыю.

— Я сваіх не балаваў,— уздыхнуў Залога,— не так багата раней жылі, не гналіся як здурнелыя за шмаццём усякім.

— А я зусім у нішчымніцы рос,— сказаў Клімаўскі, быццам выпрошваў спагаду да сябе,— і цяпер не хочацца, каб твае дзеці былі горшыя за людскіх.

— Во так, во так...— пакруціў галавою Залога.—

Самі і даём ім прыклад, а з некага пытаем, на некага віну ўскласці хочам.

Яны як быццам мірна размаўлялі, і збоку кожны сказаў бы, што між гэтымі двума мужчынамі згода і ўзаемаразуменне. Але гэта толькі здавалася, у душы ў іх не ачахала ні на секунду непрыязь, бо і адзін і другі былі ўпэўненыя, што кожны з іх пасля гэтай размовы будзе стаяць на сваім, працягваць рабіць сваё.

Так яно і здарылася. Пагаварылі, і Клімаўскі спачатку паціхеньку пакляваў ломам у цагліну, як бы чакаючы, што скажа Залога, а потым дзеўбануў з усёй сілы.

У грудзях у Залогі па-ранейшаму бурліла, ён, ні слова не гаворачы, падскочыў і ўхапіў Клімаўскога за нагу.

— Злазь, кажу!..— Глядзеў на яго з нянавісцю.

— Ды пайшоў ты! — Клімаўскі дрыгнуў, як конь, нагою — лучыў Залогу ў плячо. Дзвюма рукамі Залога ўхапіў Клімаўскога за падол кашулі і тузануў на сябе. Кашуля затрашчала, і на спіне ў дзірцы забялелася пацямнелая ад поту майка.

— Цябе што, ломам гваздануць? — Клімаўскі плюнуў на зямлю, сціснуў лом, аж пабялелі пальцы.

— Гвездзі, а рушыць помнік я табе не дам! — цвёрда сказаў Залога, не зводзячы вачэй з твару Клімаўскога.

— Ну і зануда ж ты, дзядзька Серафім! Чэснае слова, давядзецца ўзяць на душу грэх...

— Ты ўжо ўзяў гэты грэх... такі грэх, што... На тым свеце адгукнецца!

Клімаўскога быццам хвоснуў бізун, ажно перакрывіла твар, і ён, саскочыўшы на зямлю, штурхануў Залогу ў грудзі. Залога падаўся задам і, не ўстояўшы на нагах, захрабусцеў у засохлы куст язміну. Абадраў шчаку — пайшла кроў.

— Яшчэ хочаш? — падскочыў да яго Клімаўскі і набычана глядзеў у вочы.— Паўтарыць?

— Р-рукі распускаць, гад!..— Залога спрытна падхапіўся і, злаўчыўшыся, садануў кулаком Клімаўскому ў сківіцу. Той не чакаў, таму і не паспеў абараніцца; ён не ўпаў, але і не рухаўся, мабыць, пацямнела ў вачах. Залога з маладым спрытам хапіў яго загрудкі, і яны пакаціліся па зямлі — на мокрыя спіны іх наліпала трава, пясок, лісце. Клімаўскі нарэшце падмяў

пад сябе Залогу і сеў на яго вярхом. Твар у Залогі быў чырвоны ад крыві, і гэта, мабыць, астудзіла Клімаўскога, ён адно прыціскаў кулакі да Залогавых грудзей каля самага горла. Залога хрыпеў, вырываўся, але не мог скінуць з сябе Клімаўскога.

І тут здарылася нечаканае. Да іх падляцеў малады хлопец і, хапіўшы Клімаўскога за плечы, зваліў яго на зямлю, прыдушыў каленам.

— Ты што, малакасос?!.— Клімаўскі забіўся, як у трасучцы, сілячыся стаць на ногі. Але хлопец моцна трымаў яго: быў дужы, кароткія рукавы тэніскі напіналіся ад накачаных біцэпсаў.

— А ты што робіш? — спакойным, адно дрыготкім ад натугі голасам сказаў хлопец.

— Якое тваё дзела?

— Гэта што, твой? — кінуў хлопец на помнік.

— А твой? — уступіў у перапалку Клімаўскі, трохі абмяклы перад упэўненасцю хлопца, вочы ў яго бегалі.

— Ён гісторыі належыць...

— Ідзі ты адсюль, гісторык паршывы! — не здаваўся Клімаўскі...— Ты ведаеш, хто я? — зрабіў пагрозлівым голас.

— А мне пляваць, хто ты, уразумеў? А тронеш — закіну на сасну...

Залога аніяк не чакаў, што ў яго аб'явіцца заступнік, хоць і абрадаваўся ўпачатку гэтай маладой парачцы. Ён устаў, пачаў атрэпвацца ад смецця. Хлопец, прыціскаючы каленам і рукою Клімаўскога, выняў з кішэні хусцінку, даў яму: «Вытры юху, баця...»

— У цябе не спыталі! — агрызаўся Клімаўскі, але не з такім нахабствам, як з Залогам, зніякавеласць у голасе чулася.

— Не спыталі. І ў цябе не пыталі, калі ўзрывалі саборы, замкі, помнікі драўлянага дойлідства... Што, добра табе ад гэтага? Ні табе, ні мне не добра.

«От шпарыць! — глядзеў са здзіўленнем Залога на хлапца, прамакаючы хусцінкаю кроў на шчацэ.— Як па пісаным... Думаў, шалапут нейкі, а ён, мабыць, вучаны, з музея якога-небудзь...»

— Ты глянь вакол сябе, на Магілёўшчыну глянь... Пуста! — хлапец гаварыў са злосцю, хоць Клімаўскі ўжо не трапятаўся.— Дзе гісторыя? Дзе спадчына?

Што, толькі дурні тут жылі? Калі дурні жылі, то скуль мы такія разумныя?

— Асабліва ты...— Клімаўскі адвярнуў твар.

— Я хачу ведаць, як жыў мої прадзед, куды хадзіў маліцца, што шанаваў, чаму пакланяўся... І твой праўнук захоча ведаць. Ні Марс, ні Месяц яму не скажуць, скажа толькі Зямля. І скажа ў тым выпадку, калі захавае сваю памяць... Чалавек, які страчвае памяць, перастае быць чалавекам. І народ, які страчвае памяць, перастае быць народам...

— Ты мне натацыі не чытай... Малы яшчэ! — буркнуў Клімаўскі.

— Малы, ды во паслухаць люба,— азваўся Залога, ужо з захапленнем сочачы за хлапцом. Ён, можа, і не ўсё разумеў, але душою адчуваў: той гаворыць праўду.

— Якая ж бязглуздасць — лічыць, што ў памяці павінна захоўвацца толькі добрае. Памяць якраз і павінна фіксаваць усё — светлае і цёмнае, балючае і раднае... Іначай чалавецтва толькі і будзе тым займацца, што рабіць ды выпраўляць памылкі.

Падышла дзяўчына — у вельветавых светла-карычневых штанах, тонкай ружовай блузачцы, у белых плеценых вузенькімі пасачкамі басаножках.

— Ну хопіць, Эдзік... Завёўся як на сваёй зборні. Надакучыла слухаць...

— Пачакай, Светка... Бачыш, не перавяліся ахвотнікі крышыць і ламаць. Няхай маленькае... Ды не маленькае! Якое маленькае... Гэта помнік каму? — звярнуўся да Залогі.

— Нашым землякам... якія ў вайну палі.

— Ах, праўда!..— схапіўся, быццам успомніў хлапец.— Балбес я... А чаго ён палез разбураць? — ціскануў на Клімаўскога. Той паварушыўся: «Пусці».

Хлапец адпусціў Клімаўскога, стаў рукі ў бокі.

— Халера яго ведае чаго! — незадаволена, з крыўдаю ў голасе сказаў Залога.— Нібыта непатрэбен ён тут, гэты помнік. І сельсавет прыняў рашэнне...— Ён і праўда, нават цяпер не мог толкам уразумець, чаму трэба зносіць помнік, каму і чым ён перашкаджае. Ён цвёрда, непахісна верыў: помнік павінен стаяць вечна — і пры ім, і пасля яго... На тое ён і помнік, каб помніць. Як жа добра, што бог паслаў сюды гэтага хлапца. Адзін бы не саўладаў з Клімаўскім, бугаём

гэтым. Але хіба што прыбіў бы, а так — лез бы нагрудкі, драпаўся б, ірваў зубамі, не даваў бы помніка.

— А гэты шустрак, хто? — зноў кіўнуў хлапец на Клімаўскога.

— Ды наш...

— Свой? — здзівіўся хлапец.

— Адзін знайшоўся...— уздыхнуў Залога.

— Дык, можа, гэта... я дарэмна ўлез,— паціснуў плячыма хлапец.

— Хто цябе прасіў! — вызверыўся Клімаўскі. Ён стаяў убаку як пабіты цюцька, дзе падзеліся ягоныя гонар і пыха. Ён быў змізарнелы і няшчасны, многае перажыў, на многае заплюшчыла вочы яго самалюбівая натура, і фінал быў для яго нечаканы. Ганьба несусветная. Далі па храпе. Цяпер і яму самому проста жахліва, неверагодна было ўяўляць, што забярэ цэглу, якую дабудзе з помніка. Няўжо і праўда ён такі правасты, недалёкі і сквапны ці дурны, як бот? Розумам не дапяў, а душа не падказала. Лашкоў, ён што, ён — начальнік, яму нічога не будзе. Ды яшчэ пад гэты шум-гам з радыяцыяй. Начальнікі, яны заўсёды выкручваюцца, калі што робяць, дык упэўнены ў сваёй беспакаранасці, непрыступнасці. Вакол іх заўсёды абарона. А ты куды лез, балбес, дрэнь няшчасная? Думаў, ты — аўтарытэт? Сам яго для сябе стварыў, сам і цешыўся. Хадзіў што ты, што ты, а людзі з цябе, можа, смяяліся. Трактар — вось твой аўтарытэт! Забяры яго ў цябе — і ў твой бок ніхто не гляне. Будзеш зноў ляжаць на печы, і ў хату ніхто не ступіць. Так было ўжо тады, калі з вартаўнікоў пагналі. Навучаны ж, не, зноў пачаў зарывацца. Які з яго дэпутат? Ды заткала ён, а не дэпутат!

Ён быў у такім стане, што не мог улавіць, ці толькі думае, ці гаворыць, шэпча ўсё гэта. Таму і не заўважыў, калі да іх пад'ехалі белыя «Жыгулі».

З іх вылез дырэктар школы Грынь. Чырвоную тэніску адпіраў круглы і нейкі востры, як гарбузок, жывот. Твар белы, акурат век не бачыў сонца. Грынь прыгроб свае чорныя валасы і абвёў усіх уважлівым позіркам.

— Што ў вас тут за Мамаева пабоішча?

Усе маўчалі. Але ён і так усё зразумеў.

— Надумаліся калі... Быў у райцэнтра, заўтра пры-

язджае аўтобус па дзяцей. Можа, пасля і дарослых будуць эвакуіраваць.

Клімаўскі, ні слова не гаворачы, раптам крутнуў да трактара, заскочыў у кабіну і газануў так, што з трубы паваліў чорны, як сажа, дым, паплыў у крону сасны.

— Чаго ён... як шалёны? — спытаў Грынь.

— Разбуральнік,— сказаў хлапец. Грынь мелькам глянуў на яго, падышоў да помніка. Глянуў угару.— Да-а, сорам, да чаго давялі... Давыхоўваліся.

«Хто ж давёў?» — хацеў выкрыкнуць Залога, але стрымаўся: дырэктару на вёсцы мала хто асмельваўся пярэчыць, пры ім нават менш лаяліся.

Грынь абышоў помнік, пацмокаў незадаволена, уздыхнуў.

— Падкінуць дахаты? — спытаў у Залогі.

— Не,— адмовіўся той,— сам дайду.

Грынь сеў у «Жыгулі» і паехаў, узнімаючы на дарозе лёгкі пылок.

— Што цяпер? — хлапец кіўнуў на помнік галавою так, быццам паказваў на неба.

— Што, папраўляць трэба...

— Ну, шчасліва вам! — выгукнуў бадзёра хлапец, абняў за стан дзяўчыну, якая цярпліва чакала яго, і павёў да матацыкла.

— Гэта... дзякуй,— разгубіўся, кінуў ім услед Залога. І калі ўжо матацыкл ад'ехаў, ён схамянуўся, убачыўшы ў сваіх руках чужую хусцінку. Ступіў два крокі да шашы, спыніўся.

Ногі не хацелі весці, але наблізіўся да помніка, паляпаў па ім далонню: «Нічога, выстаялі... брат». Прыкра, балюча — хоць вый — было на душы. Незразумела. Чутка разнясецца, канечне, пра сутычку. Не ведаў, як будзе, як паставяцца да гэтага людзі, начальства. Ён ведаў адно: што без помніка яму не жыць. Сэнсу няма. Вось так: няма сэнсу. Хоць і дзяцей нарадзіў, хоць і не прагуляў сваё жыццё... Чамусьці іменна так уявілася, стала перад ім уся гэтая баталія з помнікам. Уцягнуты ў яе, як кажуць, з нагамі і рагамі, ён мала і не так востра думаў пра радыяцыю. Калі і прыходзілі думкі пра яе, то ўрыўкамі, як пра нешта нязначнае, не галоўнае на дадзены момант.

Аслабелы, стомлены, але цвёрды ў душы, быццам з кавалачкам стрыжня якога, ён пайшоў па дарозе ў

вёску, потым звярнуў у сасоннік і падзёўбся па каровіных сцежках, засыпаных ігліцаю і старымі патрэсканымі шышкамі, якія трывожна хрупалі пад нагамі.

## XI

Гэта была — эвакуацыя, забытае ад вайны слова. У яго не верылася, думалася, што нейкі спектакль разыгрываецца. Нічога ж не пагражала і не чакалася ні рову самалётаў, ні выцця снарадаў, ні прыходу чужынцаў.

Прыехаў аўтобус — звычайны, якія бегаюць штодзень па шашы; стаяў пасярод вёскі — на «пятачку». Каля яго камандавала бойкая чарнявая маладзіца з высокаю куксаю на галаве і з вучнёўскім сшыткам у руках.

Жанчыны вялі дзяцей, неслі ў руках клункі, чамаданы, сумкі. Нейчае дзіцё плакала. А Чачорка ў сваім двары тужліва цягнула:

Прывыкайце, чорны вочы,
Адны начава-а-аці...
Няма майго мі-і-іленькага,
Не з кім размаўля-я-яці... Эх!

Залога сядзеў на лавачцы, слухаў песню і назіраў за мітуснёю. Спачуваў дзецям, надта малым, будуць сумаваць, тужыць у новым месцы, без бацькоў. Не зразумеюць яны, колькі ні талкуй, што так трэба, што над імі навісла пагроза. Нават жа дарослы, пакуль, як кажуць, не празвініць, не думае пра тое здароўе.

Аўтобус — гэтая шчабятлівая клетка — развярнуўся і пакаціў. Услед віхурыўся густы белаваты пыл. Дзеці прыліплі да вокнаў, маці махалі рукамі, выціралі на вачах слёзы.

— Адправіла...— сказаў Залога Насці, калі яна параўнялася з ім. Яна была ў сіняй хусцінцы, і ўсе бабы былі ў хустках — аб'явілі: не хадзіць з голай галавою. Ён думаў, што яна спыніцца, як звычайна, а то і прысядзе на лавачку пагаманіць, але Насця прайшла міма, толькі і паўтарыла яго ж слова: «Адправіла». Ён збянтэжана паглядзеў ёй услед, на яе мажны стан і засаромеўся, бы хлапчук, якому дзяўчына адмовіла ў шлюбе. Невясёлая. Канечне, Пятро нацкаваў. Пасля стычкі каля помніка. Як бы мужык ні быў вінаваты, несправядлівы, вясковая кабета заўсёды стане

на яго бок. І на людзях будзе заступацца за яго, крычаць, абараняючы, «сячыся» да пасінення. І толькі дома ўжо, з вока на вока, можа накінуцца на мужыка, абазваць яго, абвінаваціць ва ўсіх грахах.

Такая была яго Маруся. Такая і Насця, можа, нават яшчэ ўедлівей. Ён дакрануўся да наклеенага на шчаку пластыра і ў душы абрадаваўся, што не запынілася Насця. А можа, таму і не запынілася, што драпіна ў яго на шчацэ?

Ён выкурыў папяросу і ўстаў — нацяты, рэзкі ў рухах. Пайшоў у двор. Марусі дома не было, яна падварушвала на сядзібе сена. Уранні ён сказаў ёй, што пойдзе да помніка. Маруся ўчора на яго пакрыўдзілася, калі ён вярнуўся абадраны, і не адказвала на яго да яе словы яшчэ і сёння. Яго нават цешыла, што жонка так перажывае за яго.

Ад таза, у якім Маруся выносіць парасятам, фыркнулі вераб'і, селі на страху пуні, зашкрэбалі дзюбкамі па шыферы. Падалі Залогу сігнал, напомніўшы, што трэба рыхтаваць карове пойла.

На загнеце ў чыгуну-вядзерніку стаялі параныя буракі і бульбяное шалупінне. Узяўшы анучу, ён аблапіў чыгун і вынес яго на двор. Паставіў каля ражкі. Выліваць не стаў — расцягнуць куры.

Ён чакаў з ранак карову, таму і бавіўся, хоць яму рупіла работа. Прыпякала сонца. На акне ў сенцах біліся ў шкло авадні і дробныя, як мухі, зялёненькія сляпні. Пах кіслай капусты казытаў у носе.

Пакуль тая карова, ён знайшоў у кладоўцы масцярок — жалезную лапатачку, падобную на ліпавы ліст,— завостраны з двух канцоў малаток; у старое вядро, угнездаваўшы туды цэлафан, насыпаў цэменту. Гады тры назад, калі бетаніраваў двор, яму шухнуў у сасонніку каля шашы цэментавоз з паўтоны цэменту, дык ён і вядзецца. Дзе што падмазаць, шчарбіну ў падмурку ці ў падушцы на двары. Чачорцы даў з мяшок на пограб. Праўду кажуць, што ў гаспадарцы і кулямёт прыдасца.

Карова ўбегла ў двор задыханая, наструненая, быццам яе гналі ад шашы дубцом. Мыкнула і кінулася да ражкі. Залога выліў чыгун. Карова ўтапіла ў ражку мызу да самага дна, ажно выплюхнулася на зямлю пойла. Было відаць, як пойла асядала — карова піла вялікімі глыткамі. Конь так не п'е, конь цэдзіць

скрозь зубы, як няўмелы п'е гарэлку, а карова глытае прагна.

За мінуту карова выпіла пойла; стаяла, аблізвала языком мызу і глядзела сіняватымі вачыма на гаспадара. Залога загнаў яе ў пуню, зачыніў на завалу.

Тады засунуў усё сваё пячное прычындалле ў палатняны мяшок, узяў яго на плячо. На вуліцы каля двара стыкнуўся з Чачоркаю. Твар у яе быў заклапочаны, маркотны.

— Што-та мне рабіць, Данілавіч?

— А што такое, суседка? — Залога паставіў каля ног мяшок.

— Ета варыла ціплятам яйкі, крышыла і сама жаўток з'ела, дык во пячэ пад грудзямі...— Яна са страхам у вачах глядзела на Залогу.

— Ад аднаго жаўтка наўрад... Можа, так чаго...— Хацеў дадаць: «Ад гарэлкі», але змаўчаў.

— Па радзіву ж перадавалі, каб не елі цяперашніх яек... а я ўзяла ды з'ела.

— Не пяражывай. Пройдзе! — бадзёрым голасам сказаў Залога і ляпнуў Чачорку па азадку.

— Каб праверыцца...

— З'ездзі ў раён, там, кажуць, правяраюць радыяцыю на нейкім японскім апараце... Яны, гэтыя японцы, даўно сутыкнуліся з такой напасцю.

— Водзека праўдачка, трэба з'ездзіць! — ураз павесялела Чачорка.— А ты куда ета сабраўся? Не на базар жа?

— Ды не! — засмяяўся Залога.— Помнік той хачу прывесці ў парадак...

— Во, ты не зробіш, Данілавіч, дык ніхто не зробіць,— шчыра, але каб пахваліць суседа, сказала Чачорка. Залога не адказаў, падняў мяшок і пасунуўся. Чачорка ціхай, задумлівай хадою пацюпала да свае хаты.

У сасонніку пахла жывіцаю, стракацела ў вачах ад лішайніку. Цыльгікаў дзяцел, скачучы па сасне пры дарозе, і ўсё нараві ў апынуцца на той бок ствала, асцярожна выглядваў, хаваўся. Дзьмуў вецер, тапырыў у дзятла на спіне пер'е. Тоўстыя сасонкі стаялі, а тонкія сярод іх ківаліся, акурат спявалі ў хоры. Плыў уверсе роўны густы шум. Прыслухоўваючыся да яго, Залога забываўся, куды і чаго ішоў,— непрыемна было зноў апынуцца там, дзе два дні назад столькі напераўжываў-

ся. Як і з чалавекам, з якім пасварыўся, не хочацца сустракацца, міжволі псуецца настрой, калі ўбачыш яго.

Помнік стаяў быццам паранены баец, а Залога ішоў яму на падмогу.

Ён з хвіліну патаптаўся каля яго, а потым, выцягнуўшы з вядра цэлафан з цэментам і ўкінуўшы туды масцярок, скіраваў да ямы. Яна была каля Майдана. З ямы гэтай бралі раней гліну і выбралі да мяккага дробненькага пяску-сіпаку. Асцярожна, чапляючыся за кусцікі лазы і маладыя бярозкі, Залога спусціўся на дно ямы.

Яма была глыбокая, можа, метраў дзесяць, і яму стала неяк не па сабе, глядзець уверх, на сіні лапік неба было вусцішна і холадна, быццам пад ільдзінаю. Аднекуль навязалася дурная думка: а раптам адсюль, з-пад яе, гэтай ільдзіны, ён ужо не выберацца?

Ён накапаў пяску па рубчыкі, уторкнуў масцярок і пагробся ўверх. Ішоў марудна. Доўга выбіраў, куды ступіць — то на камень, то на чубок травы,— баяўся абскаўзнуцца, паехаць на спіне ці на пузе ўніз.

Высыпаўшы каля помніка пясок, схадзіў у Майдан па ваду. Ручэй — глядзіш — чорны, як дзёгаць, а вада ў вядры такая светлая, што відаць, як плаваюць у ёй чырвоныя «мікробы».

Прытаміўся.

Сеў на адколатую спайку цаглін; гледзячы задумлівым позіркам у зямлю, выкурыў папяросу. Ціха стала ў вёсцы, яна быццам вымерла без дзяцей. Які гэта жудасны сум, калі няма дзяцей, не чуваць іх шчабятання і смеху. Вераб'і шчабечуць — гэта добра, але не тое, душа не трымціць.

Ніхто не думаў і не гадаў...

І раптам яго апякла думка, аж праняло потам, што паміж лёсам помніка гэтага і той чарнобыльскай бядою ёсць сувязь: і тут, і, мабыць жа, там вінаватыя людзі, іх абыякавасць, іх халоднае сэрца. І што іх чакае, калі далей так пойдзе? Але, здаецца, не пойдзе. Апошнім часам нават паветра было наэлектрызавана, не тое што душы людзей, адчуваннем перамен, крутога пералому ў жыцці.

Залога чытаў газеты, слухаў радыё, глядзеў тэлевізар і дзівіўся: раней такога не было. І кожны хоць на

макулінку талковы чалавек, не п'яніца, гаварыў, што судна нарэшце ўзяло правільны курс.

Залога зацягнуўся і выдыхнуў дым, быццам дзьмухнуў у парус гэтага судна. Радасней сябе адчуў, таму і на дзіцячыя мроі пацягнула. Ён бадзёра ўстаў, замяшаў у вядры раствор; узяў на кончык масцярка крыху і строс сабе пад ногі. Можа, хвіліны праз дзве дакрануўся пальцам да кучачкі раствору — яна не асела, зацвярдзела як камень, вяршынькаю ўкалола шыпушку пальца.

У левай руцэ вядро, у правай масцярок — ён рашуча падышоў да помніка; пачаў замазваць на ім трэшчыны, дзе на кантах былі сколіны, шчарбіны — наро-чваў, рабіў прамую лінію без выемак і вуглоў.

Тыя спайкі, якія адкалоў Клімаўскі, падняў, палажыў на «плечы» помніка; паставіў вядро, узграбся сам.

Найшло дзіўнае адчуванне, быццам ён муруе новы помнік, прынамсі, хваляваўся не менш, а больш, чым-ся першы раз.

Міма па шашы ішлі машыны, тады-сяды гарэзліва піпікалі яму. Водзека, брат, занятак — яшчэ і шафёраў весяліць! Ніхто з іх і блізка не здагадваецца, чаму і праз каго сядзіць на помніку гэты мужчына з засяроджаным тварам.

Залога дбайна замазваў кожную выемку, няроўнасць; калі нязручна было масцярком, пускаў у ход пальцы — самы надзейны інструмент. І на свежых замазках засталіся адбіткі яго пальцаў — ім жыць столькі, колькі будзе стаяць гэты помнік. А колькі ж яму стаяць? Па кладцы ён стаяў бы вельмі доўга — вечна. Залога ўпэўнены. Толькі не ўпэўнены цяпер, што людзі дадуць яму гэтулькі пастаяць. Выходзіць, паставілі яго проста так, як цацку, якую, калі яна паслужыць дзіцяці, выкідваюць на сметнік. Здавалася б, усё іначай павінна быць: чымся больш прастаяў помнік, тым даражэйшы становіцца, тым з большаю ўзрушанасцю на яго трэба глядзець, шанаваць. Як, каму, калі, у якім душэўным вэрхале можа ўбіцца ў галаву думка разбурыць, знесці помнік. Гісторыя — лесвіца крутая, з ненадзейнымі прыступкамі, а значыць, не ўсім і не заўсёды зручная, і такой павінна яна заставацца, нечакана небяспечнай, такой яе павінны ведаць. Яна не можа быць кепскай ці добрай, яна — сведчан-

не. А сведчанне трэба захоўваць — спатрэбіцца. Няма ж ніводнага чалавека без сведчання — метрыкі, пашпарта. А гісторыя?

Сядзсў ветэран, Серафім Залога, на помніку, сам — як помнік, і калі б раптам з-за кустоў выйшаў фатограф і шчоўкнуў яго, а пасля зрабіў чорны здымак-сілуэт, то атрымаўся б мanумент, і ніхто не сказаў бы, што ён скамбінаваны з жывой і мёртвай пароды.

Ад помніка адвальваўся чорны трохвугольнік ценю, ламаўся на пліце, якая падымалася на пядзю над зямлёю, а вяршынькаю сваёй як бы прыціскаў траву на броўцы насыпу. Залога сеў у гэты трохвугольнік ценю — на пліту. Выпраставўшы правую нагу, выняў з кішэні штаноў папяросы. Зноў закурыў: супакойваўся, сунімаў дрыжыкі ў грудзях — падступаўся ком.

Яму не хацелася ісці адсюль. Здаецца, сядзеў бы і сядзеў тут вечна. Можа, скоўвала пачуццё страху, што Клімаўскі зноў вернецца да свайго намеру. А можа, проста даражэйшага месца, чым гэта, у яго на зямлі цяпер не было.

Свежыя мясціны на помніку падсыхалі, па краях пабялелі. Дні праз два можна фарбаваць. Фарбаваць не праблема, абы фарба была, трэба нешта рабіць з агародкаю. Ну, дубкоў на слупы, зрэшты, ён зваліць сам, а дошчак на штыкетнік толькі на пілараме можна нарэзаць. Не будзе ён чакаць, пакуль Лашкоў ці Тураземчык некаму загадаюць, возьме Вілюхіна ў падручныя, ды ўдвух і абцяпаюць гэтую справу. І трэба адразу ж брацца, бо невядома, як і што будзе з гэтай радыяцыяй. Во закамандуюць усім выбірацца — і нідзе не дзенешся, мусіш вязаць хатулі.

Дасмаліўшы папяросу, Залога адышоўся і зводдалі глянуў на помнік: стаіць маналітам, як і раней, толькі плямісты — і ад свежай замазкі, і ад ценю, што адкідвае сасна; гэты цень ад сасны рухомы, і здаецца, што на помніку дрыжыць палотнішча.

Залога падступіўся да сасны, каля якой тады стаяла маладая парачка. Ліха ведае што творыцца! Асмеліўся ж Клімаўскі разбіваць помнік, не паглядзеў, што чужыя людзі, што могуць здзівіцца, не зразумець, у міліцыю заявіць. А можа, яны пад'ехалі пасля, наўмысна тут спыніліся, убачыўшы Клімаўскога з ломам?

Залога дакрануўся пальцамі да кары, у шчыліне ўбачыў божую кароўку — яна то замірала, то паўзла.

Хацеў ён, як калісь у дзяцінстве, узяць яе на палец і, сказаўшы: «Божая кароўка, ляці на небка, там тваe дзеткі ядуць канфеткі», пусціць на лёт. Але душа пасля згадкі пра той чорны дзень чулася брыдкавата і было не да забаў.

Ён доўга, бы самлелы, стаяў прыхінуўшыся да сасны.

## XII

Неяк прыціхла, журботная стала вёска. І не восень жа на дварэ, калі льюць халодныя дажджы, дыхаючы стынню на людзей і заганяючы іх у хаты, а чэрвень — самая пара росквіту. Аццяжэла зелень — і стаячая, і ляжачая: спела, налівалася, пладаносіла. У гародах ужо шчыпалі б кроп, пёркі цыбулі, бралі б агрэст і парэчкі, вырывалі б з зямлі моркву, з бацвіння варылі б баршчы, а з лесу неслі б бітончыкі ярка-чырвоных, цемнавата-пераспелых суніц, у кошыках — першыя грыбы: рудагаловыя крамяныя каласавікі і вясёлыя матылькова-жоўтыя лісічкі.

Але ўпершыню за гісторыю зямлі на гэтыя дары лясоў і палёў была накладзена забарона: не браць, не есці! Усё, здаецца, выпрабаваў на сабе чалавек: войны, голад, хваробы. Што яму новае адкрыеш, чым напалохаеш? Ад усяго ён знаходзіў паратунак, усё пераматаў і заставаўся жыць. Перад новым ворагам-невідзімкаю ён разгубіўся...

За ветрам у вёсцы сачылі з адным намерам: прынясе ён дождж ці не. У касавіцу, падчас жніва гэта было край важна, але не так страшна. Цяпер накірунак ветру людзей трывожыў куды больш.

Пятро Клімаўскі, стоячы на двары, глядзеў на неба — адкуль плывуць хмары. Яны плылі з-пад Шабырпчынай Грывы, а значыць — адтуль. Сум на душы пагусцеў. Вось жа не бывае так, каб жыць, жыць і не тужыць. Адбіўшыся ад адной непрыемнасці, упіраешся ў другую. Цяпер жа гэтыя непрыемнасці быццам выбралі сабе адну хату ў Залівонаўцы — яго, Клімаўскога. Такога цяжару ён ніколі ў жыцці не адчуваў, і раз яшчэ трывае, як кажуць, не палез у пятлю, значыць, чалавек ён моцны. Моцны-то моцны, а Залогу, хіляку, саступіў, паддаўся. Калі папраўдзе, не хацеў звязвацца, не хацеў крыку, разбораў, абгавораў-нагавораў, бо

яшчэ і сам да канца не быў упэўнены ў сваёй задуме. А цяпер хіба толькі бог і ведае, што ды як будзе. Лашкову скажа прама: сталі грудзямі залівонаўцы — Залога там ці хто іншы, называць не будзе. Не далі, і ўсё. Няхай сам разбіраецца, даводзіць сваю афёру да канца. Пайшоў ён да фені, дзяяч такі. Дзяцей забралі, усё ціха — каму гэты помнік у галаве? Хто каму што будзе гаварыць? Самім трэба глядзець. Што толку, што некаму вочы замажаш: табе не трэба, дык чужому і пагатоў. Каму баліць, той і крычыць.

Выйшла з хаты Насця, пастаяла на ганку, пацягнулася, выпнуўшы грудзі, а тады падышла да яго.

— Дык што рабіць будзем? — спытала.

— Ну што, дзяцей адправілі, цяпер самім і паміраць можна...

— На сэрцы цяжка... без дзяцей.

— Што зробіш...

— Можа, па сто грам вып'ем — тугу развеем. Раяць...

— Не дуры ты галавы!

У яе голасе ён улавіў раздражненне. Зрэшты, ужо даўнавата яму пачало здавацца, што жонка да яго пахаладзела, няма трапятання ў яе перад ім. Задуменнасць, ці што, у вачах паявілася. Сям'я, дзеці — гэта зразумела. Ды яшчэ не можа ніяк дараваць, што ён тады сарваў яе з загадчыцы клуба. Калі толькі ў гэтым прычына, то не бяды. А раптам ён нямілы ёй стаў, можа, сохне баба па кім-небудзь, чужой ласкі ёй захацелася. У таго ж Залогі вочы гараць, не праміне, каб не зачапіць. Мала што гавораць, нібыта Залога на жарцікі адно і здольны, далей яго намеры не ідуць. Хто яго ведае, а можа, ён такі хітры, і гэта яго манеўр. Такія падазрэнні абражалі яго, Пятра, шкада было сябе, але нічога і зрабіць з сабою не мог: тады-сяды настойліва тачылася ў галаву думка, што Насця, халера, не супраць фліртануць. Трэба калі-небудзь узяць дзягу ды краянуць разы два каля сядзёлкі, прыструніць. Не трымай бабу ў лейцах — распусціцца, факт.

Сам ён да жанчын не быў падкі, не цёрся каля чужых спадніц, не лавіў моманту. А калі не ловіш, то і ніхто не бяжыць табе на шыю вешацца.

Ён толькі раз здрадзіў жонцы, тады як вартаўніком быў. Паспрабуй было не здрадзь, дый, мабыць, няма ў свеце ніводнага мужчыны, каб жонцы не здра-

дзіў, прынамсі, як збяруцца мужыкі ў кампанію, дык толькі і чуеш: я тую, я гэтую... Бог яе ведае, можа, выдумляюць.

Гэта было, здаецца, на другім годзе яго вартаўніцтва. З Украіны прыйшло дзве машыны — пяць мужчын і баба сярод іх. Ды баба, як кажуць, усім бабам баба. Высокая, белая, валасы ніжэй пояса, сукенка на ёй лёгкая ці, можа, нават халацік, расшпільваецца з верху да нізу, і куды ні глянь — усё з яе выпірае. Станіслава звалі яе, сама падышла да яго і назвалася.

Селі абедаць на ўзлобку гары ў лесе — чарка, закусь, жартачкі. Станіслава сядзіць каля яго, ногі пад сябе, і калені белыя, моцныя, як свежы зрэз на бярозе, на мху ямкі выціскаюць; на другое сцягно пераваліцца — у каленях шыгаллё ўплішчынае. І дакранаецца да яго — то каленьмі гэтымі, то локцем, то валасамі. Не будзеш жа адсоўвацца ды чырванець — не хлапчук, а ў нейкія імгненні ён чуў, як сэрца ў грудзях пачынала мацней стукаць: тых-тых-тых... Ад чаго? Не піў жа ён зусім, толькі прыгубіў.

Мужчыны неяк неўпрыкмет разышліся на другую машыну сена грузіць, а яны ўдваіх засталіся. Станіслава травінку на палец накручвае і валасы ўсё кіўком галавы адкідвае з твару. Ён сядзіць, і мову яму адняло. Каб добрую чарку ўзяў, то за язык не трэба было б цягнуць.

Тады яна пытае: «А суніцы ў гэтым лесе ёсць?» Ён абрадаваўся, падумаўшы, што нарэшце яна пакіне яго: «Ёсць-ёсць! Многа тут...» А яна: «Пакажы мне, калі ласка, дзе яны растуць».— «Ды на палянах суніцы скрозь...» Ён убачыў на яе твары з'едлівую ўхмылку, апусціў ажно вочы. «Я адна заблуджуся, я — гарадская, зусім не ўмею арыентавацца ў лесе...» Яна ўзяла з кабіны алюмініевы бітончык, накінула наапашкі кофту, і яны пайшлі...

А Насця? Хто ведае, ці быў у яе ўжо пры ім чужы мужчына? Баба яна ў яго, канечне, відная — і тварам, і паставаю. Любому мужчыну кінецца ў вока. Іншая рэч, што тут, у вёсцы, няма дзе разгарнуцца. Але ж ездзіла яна, тады як у клубе працавала, на ўсякія нарады, у раён і ў вобласць. Адзін год была нават у Доме адпачынку пад Бабруйскам. Ды хіба ўсочыш за бабаю, калі яна ў збродлівую кошку ператворыцца?

Пятру не спадабалася, што жонка не прыняла яго

прапановы выпіць. Ды не выпіць, проста па душах пагаварыць. Раней жа, бывала, сядуць вечарам за стол, пагамоняць, і любоў тады была ў іх гарачэйшая, акурат палюбоўнікі яны. Праўда, цяпер не да любові, але гаркоту на сэрцы трохі прытушыць не шкодзіла б.

Ён раззлаваўся.

— Я — «не дуры», а другія няхай дураць!

Яна глянула на яго пранізліва.

— Чаго ты прыліп да гэтых «другіх»?

— Выкручваешся?

— Мне ніхто нічога благога не зрабіў...

— А харошага? Скажы, хто табе што харошага зрабіў? — Пятро, як вар'ят, вырачыў вочы, наблізіў твар да жонкі.

— А ты?

— Ах, сука!..— Пятро пляснуў жонцы па шчацэ. Адхапіў руку, быццам дакрануўся да распаленага жалеза. Глядзеў на жонку і сам не разумеў, за што яе ўдарыў,— дурная рэўнасць ці проста нервы здалі. Даўно ўжо здалі, не можа сябе трымаць у лейцах. Дзе не здадуць, калі раптам усё рухнула: аўтарытэт, надзея, мэта, хоць не жыві, кладзіся ў магілу і памірай. Лепшы ў вёсцы двор, гараж, машына — усё страціла сваю вагу, абясцэнілася. Быццам ён аджыў свой век і цяпер трэба паміраць. Якраз такое было адчуванне. І з жонкаю во яшчэ пасварыўся — нідзе ніякай падтрымкі, затрашчаў па ўсіх швах. Былі б дзеці — з імі забаўляўся б, каб хоць на час забыць, што ён такі няшчасны.

Насця хапілася за шчаку і адвярнулася да частаколу — нечым напомніла яму першую жонку: тая часта вось так стаяла, адвярнуўшыся, і плакала. Ён спалохаўся, што яна зараз залямантуе, закрычыць, пачне сыпаць праклёны.

Але — яна маўчала, нават не хліпала. Нешта яе стрымлівала. Што? Віна? Га? Усё-ткі віна? А можа, тое адзінае ў сваім родзе жаночае пачуццё, якое не дазваляе пераступіць мяжу, за якою рушыцца сям'я. Канечне, яна, Насця, нідзе не працуе, дзяцей куча — трэба думаць, як іх расціць, карміць, апранаць. Гэтая думка сядзела ў ёй з самага пачатку, бы стрэмка, якая нарывае. І ён, Пятро, імкнуўся дзецьмі прывязаць яе да сябе, адабраць права на незалежнасць.

Ён дамогся свайго. І Насця саступіла яму зноў, як ужо саступала няраз, заганяючы глыбока ў душу жа-

ночы гонар. Ды яна адчувала, ведала, што цярпенне яе не бясконцае. Калісьці яно можа лопнуць, і тады ад яе можна чакаць самага бязглуздага выбрыку.

Ляпнулі весніцы — зайшоў паштальён, кульгавы Броня. Веласіпед свой паставіў каля лавачкі. Многія здзіўляліся, як ён ездзіць на веласіпедзе, бо левая нага ў яго прыметна карацейшая за правую. А Броня сапраўды налаўчыўся — правай ціснe з сілаю, а левай ловіць педаль толькі ўверсе, бо ўнізе не дастас, і так-сама націскае з усёй сілы. Цяжкі ў Броні лёс, нарадзіўся ў вайну, нібыта ад афіцэра-акружэнца, татарына; маці ў канцы вайны, калі немцы, адступаючы, палілі вёску, загінула. У Броні і сапраўды шыракаваты твар, вузенькія чорныя вочы, але валасы светлыя, як у маці. І такая ж светлая ў Броні душа — усім ён спачувае, чым можа, дапамагае, купляе і раздае дзецям цукеркі. Быў памочнікам кінамеханіка, цяпер, калі ўжо не круцяць у Залівонаўцы кіно, разносіць пошту.

— Вам пісьмо...— гаворыць Броня і зніякавела паглядвае то на Пятра, то на Насцю: адразу адчуў, што нешта між імі няладнае.

Пятро ўзяў у яго з рук газеты і пісьмо. Броня сказаў «дзякуй» і пакульгаў з двара.

Пісьмо прыслала яго сястра, Танька. Яна жыве ў Віцебскай вобласці, туды завёз яе адзін з электрамантажнікаў. Даўно не пісала. Што гэта яна надумалася? Пятро гучна сказаў, каб чула Насця, ад каго пісьмо, бо яна магла падумаць, што ад сына, Гены. Насця крутанулася і пайшла, каб паказаць, што крыўда на яго ў яе не прапала.

Пятро разарваў канверт і, заціснуўшы яго між пальцаў, стаў чытаць ліст. Сястра пыталася, як жывуць, як здароўе... «Чула, у вас там радыяцыя... Многія сем'і з Гомельскай вобласці прыехалі да нас. Можа, і ў вас там будзе кепска, дык прыязджайце — месца знойдзем...»

Не чакаў Пятро, што сястра ўспомніць, падумае пра яго. Не забыла, што ён дапамагаў ёй, калі вартаўніком быў, усуне ўкрадне ад Насці то пяцёрку, то дзесятку.

Але сестрына пісьмо не супакоіла яго, а яшчэ больш падсыпала клопату і перажыванняў. Нарадзіла новую, зусім нечаканую для яго ідэю. Яна перш нясмела закрадвалася ў сэрца, а потым завалодала ім так.

што ён не ведаў спакою і ўначы. Не спаў, глядзеў у асвечанае месяцам акно, на якім цень ад яблыні маляваў мудрагелістыя прывіды.

З Насцяю яны не пагадзіліся, і яму не было з кім параіцца, суняць сваю трывогу. Ад гэтага яна цяжэла, а галаву быццам нехта ўзяў у ціскі і ўвесь час падкручваў гайку. Ён схадзіў нават у ФАП, доктар змераў ціск, сказаў — «норма, як у касманаўта». І яму сапраўды палягчэла, ці не ўпершыню за апошнія дні ён усміхнуўся сам сабе. Прыехаўшы на абед, ён першы абмовіўся да жонкі.

— Што дуцца, калі разам жывём,— голас у яго быў лагодны.— Не ведаю, што во рабіць...

Насця не адказала, хоць і кальнула ёй у сэрца: штосьці важнае мужык замысліў. Яна маўчала, ліхаманкава перабірала думкі. І тады ўспомніла пра Таньчына пісьмо, яна яго прачытала таксама, бо Пятро яго не схаваў, палажыў на швейную машыну. Можа, што з ім звязана? Яна не памылілася. Ён сказаў:

— Сястра запрашае да сябе...

Насці абрыдла гульня ў маўчанку, і яна не вытрымала: калі б дзеці, яна не загаварыла б, гэта пэўна.

— Назаўсёды?

Пятро абрадаваўся.

— Хто ведае, як яно складзецца!..— Ён не тлумачыў жонцы, што мае на ўвазе, хоць думаў і пра гэтую заваруху з помнікам, і пра радыяцыю, і нават пра бойку з Залогам. Гэтыя дні ён заглянуў у самыя патаемныя куткі сваёй душы. Не хацелася ставіць на сабе крыж, цяжка было нават уявіць, што жыццё адрыне яго як нягоднага, а астатнія, менш вартыя, будуць піць насалоду поўнымі келіхамі. Няўжо яму век гніць тут, у гэтай радыяцыі? Ходзяць чуткі, што яна — надоўга, можа, нават не на адну сотню гадоў. Жах падумаць! Нават дзеці яе не перажывуць. Ну, да школы пабудуць у лагеры, а тады?

Ад тужлівых думак трашчала галава, нехта няўмольны падкручваў гайку.

— Неяк у чужое месца ехаць...— У вачах у Насці плавала задуменнасць.

— А што рабіць? — наступаў ён, адчуўшы, што жонка ў душы ўпарціцца, не згодна з тым, на што ён яе змушаў.— Саміх ужо халера бяры, а дзеці?

Дзяцей і ёй было шкада, не менш, а больш, чым яму.

— Паглядзім, як людзі...— усё яшчэ сумнявалася Насця. Калі б не было той сутычкі на двары, можа б, яна і не падумала пярэчыць мужыку. А так пярэчыла не столькі яго думкам, колькі яму самому.

— Што людзі? — Голас яго зноў павысіўся да крыку.— На людзей глядзець...— Ён хацеў сказаць, што няма тут, у Залівонаўцы задрыпанай, на каго глядзець, раўняцца, з яго павінны браць прыклад загляды ўсякія. Ды, зрэшты, толькі кончаны ідыёт жыве адным днём, не думае пра заўтрашняе. Дэпутацтва трымае? Гонар гонарам, а справа гэта такая: сёння дэпутат, а заўтра не выбралі. Панасіў ён ношку, няхай хто другі паносіць. А калі на тое, ён і ў новым месцы заслужыць. Такіх людзей, які не падвядзе, усюды прымячаюць. Упэўненасць яго мацнела, а жончына слабела. Ён гэта бачыў па яе твары. Здаецца, у яго пачалі вырастаць крылы, у целе чулася лёгкасць. Цягнік набіраў хуткасць, вывозіў яго з тупіка. Часта ж гавораць, што з любой пасткі ёсць выйсце.

— А што спяшацца? — Сумняваючыся, Насця пакутліва думала. У яе ўжо не было той безагляднасці, з якою раней яна давяралася мужу.

— Ну і спаць у шапку не трэба! — З Пятра перла рашучасць.— У мяне ёсць адгулы, вазьму адскочу да сястры, прапытаю, што ды як. Можа, яны там нешта параяць. А ты да дзяцей з'ездзі...

Яна ўжо збіралася ў гэтую паездку сама і яшчэ сёння меркавала паехаць ціхачом, нічога не гаворачы Пятру, каб паскакаў, пахваляваўся, думаючы, што яна ўпрочках. Яму, канечне, нічым не сагразіш, і трэці раз жэніцца, знойдзе сабе ўдаву ці нават дзеўку, але і паказаць, што без яго ў яе свет рушыцца, таксама нельга.

— Што толку... Нічога ж ім не завязеш,— пашкадавала.

— А навошта везці? Ім хапае ўсяго там! Нават жа ў нашу во краму... чаго век не было, нейкіх югаслаўскіх кансерваў, паштэтаў навезлі. Ты ім даражэй усякіх прысмакаў будзеш.

Яны разышліся пасмірнелыя, кожны ўзяўшыся нешта рабіць па гаспадарцы. Управіліся хутка і рана леглі спаць.

## XIII

Серафім Залога сабраўся ў лес. Маруся пайшла ў краму, і ён чакаў яе. Сядзеў на ўслончыку і курыў.

Яна прынесла ў сетцы хлеб і чырвоныя бляшанкі, пакет мукі і пачак солі.

— Зноў? — спытала яна, убачыўшы ўдзяўбнутую ў калодку сякеру. Гэты помнік так неспадзявана ўварваўся ў іх жыццё і парушыў звыклыя парадкі, што размовы можна было весці на адных недамоўках.

— Пайду пару дубкоў падвалю... А што гэта ў цябе ў сетцы?

Яна і тут зразумела, што ён пытае пра бляшаначкі.

— Ета кансервы такія... не нашы яны, нейкія заграпічныя. Усе грабуць...

— Водзека ўжо наядзімся! — засмяяўся Залога.

— Грынь вазіў у раён малако і ягады, праверылі — заражаныя...— Яна глянула на мужа, ці ўразіць яго навіна. Ён толькі нахмурыўся: маўляў, што тут дзіўнага, даўно ўжо абвешчана? Проста чалавеку не сядзіцца, карціць.— А яшчэ бабы казалі, што Клімаўскі нібыта выбірацца будзе...

Вось тут Залогу тарганула, ажно бровы падскочылі.

— Які Клімаўскі? — перапытаў ён, быццам іх у вёсцы было некалькі.

— Ну які ж...— Маруся, нечакана для сябе, убачыла, што апошняя навіна акурат стрэсла мужа. Ён як бы не верыў, ці дужа збянтэжыўся.

І такі, незразумелы, панікла-засяроджаны, ён пайшоў з двара. На плячы паблісквала, як шкельца, сякера.

Дубкі раслі ў падлужжы, і ён кіраваў туды. Напрасткі кіламетры два будзе. Ён не любіў дарог — пыл, пясок, лужыны. Нават калі не трэба было зразаць шлях, ён ішоў лесам паўз дарогу.

У лесе было свежавата, сонца паслалася на траву і мох доўгімі палоскамі. Чарнічнік аблёг на зямлю ад ягад, на палянках чырвонымі вочкамі гарэлі суніцы, прасіліся самі ў рот. Залога сагнуўся і падняў пару штучак — мятная густая духмянасць расцяклася па роце. Цяжка прывыкнуць, што ягады гэтыя ўжо не лекар твой, а — вораг. Можа, выдумалі, сумняваўся Залога. Яго сялянскі розум быў прывучаны верыць прыродзе, а не людзям, якія ўмеюць пляткарыць і хлусіць

і чые памылкі не раз за жыццё білі яго па карку. Білі так, што цямнела ў вачах, кроў з вушэй ішла. І вось апошні ўдар — гэты помнік. Часам Залога дзівіўся, што жывіць яго сілы, што трымае, не дае зламацца хрыбетніку. Як і помніць сябе, увесь час ішоў, лез, поўз, гробся на гару — здавалася, на ёй звіла гняздо птушка шчасця. Але як толькі ўзбіраўся на вяршыню, яму гаварылі, што гняздо не на гэтай, а на суседняй гары. І з такою ж вераю ды ўпэўненасцю ён лез на другую гару. Грэбціся цяжка, а ўніз каціцца заўсёды лёгка.

І яшчэ адно пытанне заўсёды перад ім стаяла: толькі яму так цяжка ці ўсім? Можа, ён чаго не разумеў, але тады-сяды, гледзячы на людзей, ён дзівіўся: той нешта сказаў — забыўся, нешта зрабіў — махнуў рукою і спіць як забіты. Быццам душы ў яго няма, быццам не баліць яна. Вось і Клімаўскога ўзяць... Бач, ужо лыжы навастрыў з Залівонаўкі. Назбродаваў — і ў кусты. А тое, што пасля сябе пакінуў, якую славу, яго не цікавіць, яму да фені, як цяпер маладыя кажуць. Ды ён, Залога, на яго б месцы зямлю носам бы рыў, але загладзіў бы свае чорныя сляды. Дэпутат... Які ён дэпутат? Тарбахват, а не дэпутат! Нейкая ж цвёрдасць павінна быць у чалавека. Што, яму, Залогу, лёгка было, надта пасля вайны... Са шпіталя вярнуўся — скура ды косці, паўгода адлежваўся. На вёску адна карова засталася — дзецям малако трэба, і яму выдзялялі шклянку. Ніхто не папракнуў яго той шклянкаю. Ачуняў... Хату зладаваў, ажаніўся. Нешта сястра яго з Марусяю не заладзілі. Вымушаны быў новую хату зачынаць. І ў калгас хадзіў, не адлыньваў, стараўся. Прымецілі, брыгадзірам трактарнай брыгады паставілі. Падаў заяву ў партыю. На сходзе яе зачытваюць, біяграфію... «Якія пытанні будуць да Залогі?» — пытае парторг. І тут устае Мішка Кухцік, у ваеннай гімнасцёрцы, падпяразаны афіцэрскім рэменем: «І-і, таварышы... і-і чалавек быў на вайне не да канца. І-і мала што магло і-і быць... І-і пакуль нашы рады з'яднаныя, прапаную і-і ўстрымацца...» Як варам яго, Залогу, абдало: «А заіка ты чортаў, я рады яго раз'ядналю!» Крэпенька, балюча пакрыўдзілі яго тады гэтай падазронасцю, засадзілі ў сэрца ржавы штыр, ён і цяпер там сядзіць. Пасля ўгаворвалі яго няраз: давай, Данілавіч, уступай у партыю, маўляў, гады былі такія,

недавер да тых, хто ў палоне быў, хто не даваяваў. Але ён, як вол, зацяўся, на прынцып пайшоў: раз я рады вашы раз'ядцнаю — навошта? Як не камуніста яго незабаве папрасілі з кіраўнічай пасады, і ён прыткнуўся да школы.

Залога не заўважыў, як падышоў да падлужжа. На гары, перад спускам на луг, да Сажа, сярод слак, бяроз і кустоў ляшчыны раслі дубкі. На беразе звычайна дубы раскідзістыя, каржакаватыя, з тоўстымі крывымі галінамі, а тут стройныя, з гладкай карою, і галін мала, толькі на вярхушцы. Адзін ссек — і два ці нават тры слупкі будзе.

Кожнае лета сюды прыязджалі адпачываць людзі ажно з Масквы, Ленінграда, Кіева... Не прайсці было з-за легкавікоў і палатак. Цяпер — тут было пуста. Толькі чарнелі, як патэльні, кругі леташніх цяплішчаў, і веяла ад іх не дымком, а сумам. Нізенька пры зямлі ружавеў чабор, над імляталі чорныя чмялі.

«Хутка празналі, што радыяцыя...» — падумаў Залога весела пра дачнікаў. Ён глядзеў ужо не пад ногі, а ўгару — выглядаў дубок. Аж здрыгануўся, калі ледзь не з-пад ног з тугім свістам вырвалася вялікая шэрая птушка. Гэта была перапёлка. Яна спікіравала, як забітая, на зямлю і, вяла апусціўшы крылы, пабегла. Услед за ёю з-пад елкі ўпадлёт кінуліся кароткахвостыя тлустыя перапеляняткі. Іх было каля дзесятка. Яны цяжка, як камяні, упалі ў зараснік іван-чаю. І як растварыліся, толькі хісталіся ліловыя мяцёлкі кветак, асыпаючы падсохлыя пялёсткі. Дарослая перапёлка, нязграбна куляючыся, пабегла, «павяла след» убок.

«Не старайся, не старайся, не буду я чапаць тваё патомства...» — пакпіў з перапёлкі Залога і тут жа ўспомніў Клімаўскога і падумаў, што ён таксама выязджае, мабыць, з-за дзяцей. Гэта правільна, разважаў Залога, што прырода так змудравала, каб бацькі клапаціліся пра дзяцей, аберагалі іх, вучылі. І ён з сынамі, як у школе яны вучыліся, колькі папахадзіў у лес, у рыбу. Тут во якраз, у гэтых дубках, начавалі няраз. Ноч каля цяпла. Можа, воз дроў папаляць, пакуль пераначуюць. Дробны пасушнік колькі ні кладзі — гарыць як порах. Холад холадам, а без цяпла, дыму камарэча з'есць. Яны загадзя, яшчэ звечара, падсякалі адзін дубок, і дровы з яго цьмелі праз усю ноч, сілкую-

чы цяпло. Сыны спалі мёртвым сном, а ён дзяжурыў каля іх, аднойчы ўжо напалоханы: Коля ўсунуў ногі ў цяпло, што адгарэлі ў ботах падэшвы; прыпякло — падхапіўся, пячэ, небараку, у ногі, а ён сонны разабрацца не можа, што і чаму. Ён, Залога, паваліў яго ды сарваў боты. І смех і грэх, канечне, быў і слёзы...

Гэта былі лепшыя гады, іх не вярнуць ужо. Не вярнуць добрае, каб ім яшчэ раз парадавацца, як і не вярнуць кепскае, каб яго пералапаціць.

Ён выбраў зграбны высокі дубок, таўшчынёю з гарлач, лёгенька цюкнуў па ім. Дубок — не алешына і не бяроза нават, падсеч яго не проста. Але затое і застаіцца гадамі, абалонь згніе, а стрыжань трымае. Залога скінуў пінжак, папляваў на далоні. Паўстала ў вачах: Клімаўскі на помніку з ломам плюе на далоні... Ліха чортава!

Сякера адскоквала ад дубка, як ад гумы, выскепвала маленькія трэскі, яны далёка адляталі ў траву, бялелі там; а стрыжань зусім шэры і цвёрды, як крэмень.

З перадыхамі зваліў Залога дубка, абцерабіў. Прыкінуў: тры слупкі будзе. Яшчэ адзін дубок спляжыць — і дос. Лішні будзе слуп — сабе на сядзібу ўкапае, падгніло ўжо прасла.

Ён думаў, як возьме ў конюха Пімена Кунцэвіча каня, прыедзе па гэтыя слупкі. Дробязь, а ўсё нейкія рагаткі. Вось і з канём гэтым. Дае яму Пімен каня, але заўсёды крывіцца, як скрозь зубы цэдзіць: «Бяры...» А ўсё праз тое, што пенсія ў яго не калгасная, а па лініі райана. Адчуваеш сябе ніякавата, жабраком, які просіць міласціну. З такім пачуццём пакуль прыйдзеш да конюха, усе духі выматаеш.

«Трэба перакурыць...» — падумаў ён і глянуў на пінжак.

На пінжаку сядзела чорная з блакітнымі «вочкамі» мятлушка, зводзіла і разводзіла крылы. Пырхнула, калі ён нагнуўся лезці ў кішэню па папяросы.

Ён сядзеў на зямлі, курыў, а мятлушка-назола кружылася вакол яго. І толькі як трапіла ў воблачка дыму, некуды знікла.

Дакурыўшы папяросу, ён яшчэ доўга сядзеў і глядзеў у зямлю. Не хацелася ўставаць: душа яго ссумавалася па цішыні, спакоі.

Ён ужо меў за каркам такія гады, калі можна і

было на што аглянуцца. Часта чуў па радыё, бачыў па тэлевізары, чытаў у газетах, як людзі гаварылі: нягледзячы ні на што, ні на якія злыбеды, не хацеў бы сабе іншай долі. Ён не верыў гэтым людзям, лічыў, што яны або няшчырыя, або не паспыталі сапраўднага жыцця, так недзе з боку ад яго прайшлі. Як жа быць задаволеным сабою і жыццём, калі толькі і ведаў, што змагаўся, да знясілення працаваў, перамагаў страх смерці, адстойваў справядлівасць, на якую іншым было напляваць, ва ўсякім разе, з лёгкасцю закрывалі на яе вочы.

Не быў жа яго бацька ні кулаком, ні нават серадняком, але і яго котлішча разбамбілі ў трыццатым годзе тарбахваты ўсякія, распалася дружная сямейка, разляцеліся хто куды, як тыя чмялі, калі выкасіш іх гняздо на лузе. Сталінскі хапун колькі людзей, чыстых і сумленных, зусім невінаватых, вынішчыў, адправіў на той свет... Адну толькі вайну перажыць — значыць, ужо ніколі і ні пры якіх абставінах не жадаць паўтарэння свайго лёсу. А ён жа, Залога, быў цяжка паранены, ледзь выкачаўся, гніў у сырых шпіталях-зямлянках, самаручна чарвякоў выкалупваў з ран — сабе і другім... Навошта? Так, але гэта праўда. Праўда і тое, што за кроў пралітую не славу меў пасля вайны, а недавер, абразу... Можна падумаць, Мішка Кухцік вінаваты. Не стукнула б яму ў галаву, калі б час не такі быў. Усе на час прывыклі звальваць, а не на людзей. Людзі і ёсць час. Якія людзі, такі і час. У 65-м электрыку ў Залівонаўку правялі, і тут старшыня знайшоў, як паздзекавацца. Не ў калгасе — знаць, плаці за выпас, а не плоціш — адключым электраправодку. Так і зрабілі: залез на слуп калгасны манцёр і абрэзаў перамычкі. Залогу што, не прывыкаць, а дзецям якая траўма. Ва ўсіх на вёсцы ў хатах вокны белыя, а ў Залогі — цьмяна-чырвоныя, як вочы ў заплаканага чалавека...

І далей з вёскі гэтай глуміліся ўсе, каму хацелася. Так і чэзла яна ў яго на вачах: дзе толькі падзеліся святы, абрады, песні, скокі, маёўкі, гульні... Ужо каторы год сумна, ціха, як у старой запакінутай хаце. А цяпер увогуле канец свету. Дажыліся... У Залогі было такое адчуванне — прыйшло іменна цяпер, сумнаму, адзінокаму, калі перабраў у памяці перажытае,— што застаўся ён адзін са сваёй Марусяю на бязлюдным востраве. Выручыць хто ці не — адзін бог ведае. Мала-

дзейшыя, канечне, чакаць не будуць, ірвануць куды вочы глядзяць, яны і без радыяцыі не вельмі-ткі чапляліся за зямлю, за вёску... А цяпер і пагатоў. Мала, што газеты ды радыё суцяшаюць, бытта доза ў Залівацаўцы нястрашная. Можа, зноў хлусяць, як не раз было, каб панікі не наводзіць. Заўсёды ж так: няхай чалавек церпіць, абы панікі не было. Паніка на вайне небяспечная, праз яе можна бой прайграць. А тут з кім бой?

«Эха-хо!..» — цяжка ўздыхнуў Залога і з крэктам падняўся.

Ён неахвотна, цяжка ступаючы, ішоў з лесу.

Каля хаты Вілюхіна стаялі сцішана купкаю людзі, твары ў іх былі зажураныя. Трывожны халадок прабег у яго па спіне. Ён падышоў. Мымко павярнуўся да яго, скрыжаваў на грудзях рукі і, заплюшчыўшы вочы, схіліў галаву. Залога ўсё зразумеў — памёр Вілюхін. У вачах закружылася зямля, пахіснулася, і ён пахіснуўся, як бы стаяў у лодцы. Але галава была ясная. Залога прыставіў да частаколіны сякеру: навошта несці яе дахаты, спатрэбіцца рабіць труну.

Як жа мала на зямлі спакою. Толькі на хвіліну дае жыццё перадыхнуць, а тады зноў упрагайся, цягні воз турбот, злыбяды і гора. Адзіны, здаецца, быў у Залівонаўцы чалавек, з якім Залога мог шчыра пагаварыць, і таго не стала. Раптоўна не стала. Гора, канечне ж, гора... Збіраліся разам дошчачкі на абгародку рэзаць.

Залога набраўся духу і ступіў на падворак. Праход быў вузкі: каля сцяны хаты і насупраць каля частаколу былі складзены свежыя клеткі дроў.

За сядзібамі ў Шарыпчынай Грыве тужліва кукавала зязюля.

# ...І БЕРАГІ



# СВЕТЛЫ РУЧАЙ ЛЮБВІ

## Частка першая

### I

У чалавечым жыцці ёсць прамежкі, якія сеюць у душы ілюзію шчасця: быццам з дасягненнем той ці іншай мэты канчаюцца ўсе беды-нястачы — і перад табою прамая дарога ў рай.

Так здавалася і нам з жонкаю, калі мы, нарэшце, надыбалі сабе кватэру. Амаль у цэнтры горада, але ў глыбіні квартала, далей ад шумных вуліц і вірлівых тратуараў, якія, здаецца, мала каго лагодзяць.

Удача завітала да нас не адразу, не праз выпадковасць, якой многія людзі, і нават такія, як вядомы лячнік Сяргей Абразцоў, надаюць ледзь не боскую ўсемагутнасць. Выпадковасць, канечне, свае папраўкі ўносіць, але тут варта гаварыць пра шчаслівае супадзенне абставін, а не пра заканамернасці і логіку жыцця.

Дык вось на кватэры я спакойна жыў да жаніцьбы. А толькі ажаніўся, мая паважаная гаспадыня Паліна Рыгораўна, выкладчыца тэхналагічнага інстытута, былы муж якой, вядомы вучоны-геадэзіст, жыў цяпер з другою жанчынай ажно ў Іркуцку, а сын ад яго служыў у арміі, культурна і ветліва, але бескампрамісным голасам прапанавала пашукаць новую кватэру.

Нашы пошукі аблегчыў тэлефон. Яго не так даўно займела гаспадыня, дастукаўшыся аж да самога міністра сувязі. Назвала сотню прычын (і адна з іх — хвароба сэрца), і міністр не змог адмовіць абаяльнай, што не замінала ёй быць адначасна і настойлівай, нашто не замінала ёй быць адначасна і настойлівай, наведніцы. Мы далі ў рэкламную газету аб'яву — некалькі звычайных слоў, за якімі чыталіся кожнаму і адчай, і трывога.

З суботы — з дня, калі выйшла газета,— мы з жонкаю напераменку дзяжурылі каля тэлефона і запісвалі адрасы. Пасля разам ездзілі на агледзіны — хто ды што, у якіх умовах. Цяпер ужо з радасцю думаецца,

як жа добра, што не спынілі свой выбар на першых трох кватэрах: у маладых вучоных, якія вырашылі сабраць грошай для паездкі на поўдзень і ў якіх, канечне ж, адчуваў бы сябе лішнім чалавекам; у адзінокага, яшчэ не вельмі старога яўрэя, з кватэры якога патыхнула нейкай нежывою занядбанасцю; у прыгажуні жанчыны, што ўжо развялася з мужам і чакала, калі ён выселіцца, і спакою ў якой гады два не магло быць.

Гэтая гаспадыня, што нам прыглянулася, была таксама і маладая, і прыгожая, можа, нават трохі страгаватай для сваіх трыццаці прыгажосцю. Яна сустрэла нас у барвовым фланелевым халаце, які, вольна атуліўшы стан, рабіў яе дамашняй і простай. Яна глядзела на нас не так, як зазвычай глядзяць незнаёмыя людзі, у якіх яшчэ няма адно да аднаго даверу і вочы поўняцца насцярожанасцю. Яна глядзела блакітнымі вачыма адкрыта, мякка, акурат мы ўжо даўно зналіся і вось наведаліся ў госці. Мне спадабалася такая шчырасць маладой гаспадыні, яна абяцала наперадзе цікавае — хоць і невядома, чым цікавае,— жыццё. На жончыным твары, як і ў кватэры той разведзенай жанчыны, захаплення, здаецца, не было. Жонка чамусьці зніякавела, калі гаспадыня пачала падрабязна распытваць, хто мы такія,— і кінула на мяне позірк, пасля якога ў душы ў яе як бы нешта зламалася. Яна раптам стала гаваркой і вольнай у рухах, якой была заўсёды. Мабыць, яе ўразіла мая рашучасць, што нарэшце заявіла пра сябе ў вачах.

Гаспадыню звалі Люба — імя гэтае мне так падабаецца, калі называюць ім жанчын узросту пушкінскай Людмілы; яна расказала, што жыве адна ў двухпакаёвай кватэры; сын — хворы, у спецінтэрнаце і прыязджае толькі на выхадныя. Калі не зважаць на маленькую тайну, якую не раскрыла адразу гаспадыня і якая не магла не турбаваць — чым жа хворы сын? — то недамовак між намі не засталося.

Дасюль мы стаялі ў пярэдняй, даволі прасторнай, засланай старэнькім дыванчыкам і застаўленай шафкамі з кухоннага гарнітура, а пасля прайшлі ў пакой. У ім стаяла шырокая канапа, падазрона пахіленая на бок, пры сцяне туліўся невялікі квадратны столік, накрыты зжаўцелай газетаю.

— Тут жылі ў мяне кватаранты, але нядаўна выбраліся, пабудавалі кааператыў,— сказала Люба, каб

мы не дзівіліся з няўтульнасці пакоя.— Мэблю, якую хочаце, можаце набываць. Я — не супраць.

Я пакратаў канапу. Яна рыпела, быццам была сабрана з адных іржавых спружын, і «кульгала» — пад нізам вісела металічная ножка і хісталася, не кранаючыся падлогі, як перабітая лапа ў сабакі. Яе можна падладзіць, падумаў я, і канапка яшчэ паслужыць. Апошняя ўмова, якую паставіла нам гаспадыня,— аддаць за паўгода наперад квартплату, бо патрэбны грошы на каляровы тэлевізар.

Калі мы, развітаўшыся, пайшлі, каб неўзабаве перавезці свае рэчы, я адчуў, што паміж мной і жонкаю зноў залегла незразумелая напятасць. Мы ішлі моўчкі, кожны заняты сваім. А можа, такая наша стрыманасць была натуральная, бо чалавек заўсёды спачатку перажывае ўражанні ў сабе, а потым ужо дзеліцца з людзьмі. Я сіліўся ўспомніць, на каго падобная тварам наша новая гаспадыня. Дужа знаёмыя рысы прасвечваліся ў ім. Выпуклы ясны лоб, апраўлены з бакоў гладка расчэсанымі на прабор русымі валасамі, прамы тонкі нос з шыракаватай і як бы трохі выпуклай пераносіцаю, акуратныя дужкі броваў і маленькі з патоўшчанай ніжняй губою рот. Што за класічны твар? Мой позірк бяздумна слізгаў па лісці, чыстым і жоўтым, што ссыпалася з клёнаў на тратуар за сённяшнюю ноч — ноч першых замаразкаў. З раніцы іней тоненька ляжаў на асфальце і ў паветры вісела такая ж тонкая, блакітнаватая смуга, і ад усяго гэтага веяла шчымлівай урачыстасцю і спакоем, якім хацелася паіць і лагодзіць душу вечна. Але розум падказваў, што так не будзе, што заўтра возьмецца паўночны вецер і прынясе з сабою холад, аголяцца дрэвы, ляжа на зямлю снег — і хочаш ці не хочаш, а сустракай зіму.

Ну, канечне ж! Калі б я быў мастак, то не мучыўся б, а зразу прыгадаў, што гаспадынін твар напомніў мне рафаэлеўскую мадонну Канестабіле. І нават халат у гаспадыні такога ж барвовага колеру, як мадоннiна сукенка. А вось гэтыя голыя клёны мне якраз і намалявалі пейзаж, на фоне якога стаіць мадонна: дрэвы, панылае восеньскае возера і яшчэ — двое людзей у лодцы.

І я сказаў радасным голасам жонцы — што гаспадыня, відаць, някепскі чалавек, ва ўсякім разе, горш,

чым тая прафесарша, у якой жыву, не будзе. Жонка нехаця адказала:

— Усё можа быць. Пажывём — пабачым.

Гэты яе спакой і неўласцівае ёй старэчае пабуркванне ўшчэнт збянтэжылі мяне, і я ўжо быў спалохаўся, што, мабыць, паспяшаўся спыніць свой выбар іменна на гэтай кватэры. Можа, інтуіцыя, якая, пераконваюся, у жанчын больш тонкая, чым у нас, мужчын, падказвала жонцы тое, схаванае і небяспечнае, што можа замуціць чысты і роўны ручаёк сямейнага жыцця. Але яна не захацела мне пярэчыць, ужо ўпачатку разумеючы, што трэба пакладацца і на мужа, слухаць і яго меркаванні.

Але як бы там ні было, я прывык верыць людзям і разумець іх шчырасць, у якой заўсёды знаходзіў цяпло і радасць для душы; таму не стаў больш гаварыць пра гаспадыню, а ўзяў жонку пад руку ды зірнуў на яе так, каб яна ацаніла мой жэст. І ўсмешка, якую я чакаў ад яе, зноў вярнула нас да той прыязнасці і спагады, што панавалі між намі вось ужо цэлы месяц пасля вяселля.

Я пазнаёміўся з Галяю ў майго сябра, інструктара абкома камсамола. Ён запрасіў мяне ўвечары да сябе на кватэру — паглядзець футбол: матч мінчан з тбілісцамі. Я акурат меў час. Матэрыял, які збіраў у камандзіроўцы цэлага паўтыдня, ужо быў напісаны, перачытаны і выпраўлены. Мы абодва былі заядлыя балельшчыкі. Гульня ў нашых не клеілася, не выручала на гэты раз і магія «чужога поля». Мы добра такі разнерваваліся. Гэта відаць было па нашых адчайных воклічах і па тым, як гарэлі вочы ды сутаргава ўскідваліся ўверх рукі. Каб супакоіцца, сябра прапанаваў «па грамульцы». Жонка яго, дзябёлая, усмешлівая маладзіца, відаць, аматарка кампаній, падкінула ідэю: запрасіць сваю знаёмую, студэнтку наргаса, «з якой ніколі не бывае сумна». Я чуў, як яна доўга ўпрошвала сваю знаёмую па тэлефоне, абзываючы яе «тлёй», але тая ўпарцілася, маўляў, сабралася ў лазню. Нарэшце згадзілася, мабыць, зацікавіла яе мая «характарыстыка», якую выдала мне сябрава жонка.

Зазваніў званок, і я пайшоў адчыняць дзверы — папрасіла сябрава жонка, якая, зразумеў я, за ўсмешлівасцю ўмела хаваць пранікліваснь сваёй натуры. Першае, што падумаў, убачыўшы дзяўчыну,— якая яна

прыгожая, такіх дзяўчат ніколі вось так проста, звычайна, адчыняючы ім дзверы, я не сустракаў. Яна была ў белых джынсах, лёгкай стракатай кофтачцы, што туга абліпала яе, і ў белых басаножках. І ўся гэтая светлая экіпіроўка крыкліва адцяняла яе твар — смуглы, як у метыскі, і чысты-чысты, дагледжаны, бы ў модніц, што рэкламуюць адзенне, усякія духі і пасты. Яна апусціла вочы і, суха павітаўшыся, размінулася са мною, і як мне было не ўсумніцца ў словах сябравай жонкі, што з ёй ніколі не бывае сумна. Але падазрэнні мае развеяліся, як толькі селі за стол. Галя, так звалі дзяўчыну, здзівіла мяне сваёй эрудыцыяй. І я, не задумваючыся, тут жа залічыў яе да тых гарадскіх інтэлектуалак, якіх нарадзіла апошняя чвэртка нашага стагоддзя і ад якіх лепш, чым з газет ды часопісаў, можна даведацца, які рок-гурт зараз самы папулярны ў свеце, хто з замежных пісьменнікаў вылучаецца арыгінальнасцю мыслення і тонкім, глыбокім псіхалагізмам, які стыль характэрны для французскіх авангардыстаў, не кажуы ўжо пра моду на фасоны, прычоскі, касметыку.

Мы засядзеліся да позняй ночы, і я, каб яшчэ трохі пабыць з Галяю нязмушана, а не па волі абставін, прапанаваў пракаціцца на таксі. Галя прамаўчала, але мяне падтрымалі гаспадары.

Адразу таксі паехала на вуліцу, дзе жыла Галя, і не толькі таму, што так было бліжэй, проста джэнтльменскі гонар вымушаў рабіць іменна так: спачатку адвезці даму, тады ўжо ехаць да сябе.

Галя спыніла таксі каля вышыннага, на дванаццаць паверхаў, дома, і я таксама вылез, каб адчыніць ёй дзверцы. Галя лёгка і неяк пругка, бы птушка, выбавілася з таксі, нечакана цмокнула мяне ў шчаку і пабегла ў пад'езд, адкідваючы за спіну сумку, якая матлялася спераду. Гэты пацалунак, да якога я аніяк не быў падрыхтаваны, вырашыў усё.

Цяпер Галя была мая жонка, і мы чакалі дзіця, жылі радасцю, якой упіваліся разам і цешыліся паасобку.

Я, трымаючы жонку пад руку і час ад часу зазіраючы ў твар, мала знаходзіў падабенства між ёй, цяперашняй, і той, што ўбачыў на кватэры ў сябра. Вочы ў яе пакруглелі і страцілі вострае святло, у іх як бы засела засмучанасць, насцярога, ці што, скура на шчо-

ках пабялела, стала пърыстаю, калі не сказаць — азызлаю. Галя ведала гэта і сама, але настрой у яе не псаваўся, як і ў кожнай жанчыны, якая выношвае дзіця і спакойна, нават з гонарам ставіцца да ўсякіх фізічных і псіхічных змен у сабе.

## II

Перабраліся на новую кватэру мы праз два дні. З гэтай нагоды наладзілі вячэру. Люба піла віно маленькімі глыткамі, смакавала яго і амаль не закусвала, зрэдку брала кружочак лімона ці лустачку сухога пашахонскага сыру, які надта хутка выгнуўся бліскучымі палазкамі. Пазней яна прызналася, што захоўвае англійскую дыету, бо ўжо не ўлазіць ні ў адну сукенку. Хмель заўсёды выклікае на шчырасць, за якою абавязкова стаіць споведзь жыцця, і зблізкае людзей. Былі амаль незнаёмыя, а ўжо як быццам парадніліся. Люба — украінка, нарадзілася ў Вінніцы. У Мінск прывяла яе вучоба ў архітэктурным тэхнікуме, скончыўшы які, яна не засталася ў сталіцы, як многія яе сяброўкі, а паехала працаваць у Слуцк,— на той час, як і ў школе, рамантыка ўсё яшчэ кружыла ёй галаву і штурхала на рызыку. Дачка ваеннага, яна прывыкла да вандровак, навучылася лёгка заводзіць сяброў і гэтак жа лёгка з імі расставацца, зусім не пакутуючы і не вярэдзячы сябе ўспамінамі.

Яна яшчэ ў школе выспела ў даволі вабную дзяўчыну, можа, нават залішне для свайго ўзросту. У яе былі поўныя грудзі, а штаны, якія тады толькі-толькі ўваходзілі ў моду, як не трашчалі ад улітых у іх моцных, шырокіх клубоў. На яе зырыліся старэйшыя хлопцы, а потым і мужчыны. Люба распавядала пра гэта з несхаваным гонарам, быццам у свеце мала да яе падобных, як і пра тое, што была палюбоўніцаю галоўнага архітэктара горада. Яна жыла ў невялікім пакойчыку ў драўляным доме барачнага тыпу — адна, без нагляду бацькоў; падагрэтай салодкім адчуваннем самастойнасці, ёй было проста прычасціцца да віна, цыгарэты, пусціць да сябе мужчыну, у сябраванні з якім бачыла пакуль адно цікавасць. Але ў тым, як адбівалася ад яго рук, што наравілі абняць яе, у густым бляску яго вачэй і ў ціхім, нейкім пакорна-дзіцячым шэп-

це знаходзіла яна хвалюючую, трапяткую радасць. Гэтая радасць тут жа прападала, калі мужчына, пакрыўджаны, зачыняў за сабою дзверы. Тады ёй хацелася ўсхапіцца, вярнуць яго і пакінуць у сябе да раніцы, але страх, яшчэ толкам не ўсвядомлены, але няраз так блізка адчуты, стрымліваў яе. І яна ўсю ноч тамілася адна ў халоднай і такой няўтульнай пасцелі, якая глыбока, бы гамак, прагіналася і непрыемна пахла, пахла, пахла.

У Слуцку яна і пазнаёмілася са сваім мужам Міколам — мастаком, які прыязджаў туды афармляць раённы Дом культуры. Яна першая яго ўбачыла: высокі, чорнавалосы, з густой акладзістай барадою, якая больш чым што рабіла Міколу падобным на творцу, і з мяккімі, аксамітнымі вачыма. Дом культуры быў недалёка ад барака, і калі Люба вярталася з работы дамоў, заўсёды бачыла, як чорнабароды мастак, стоячы на вузкай хісткай лесвіцы, маляваў гіганцкага рабочага-малатабойца на фасадзе будынка. Аднаго разу, нялоўка крутнуўшыся, ён упусціў пэндзаль якраз у той момант, калі міма праходзіла Люба. Можа, на яе зазяваўся? Яна мітульгою падляцела да пэндзля і падала мастаку. Ён доўга глядзеў на яе з добрай усмешлівасцю ў вачах. Потым саступіў на зямлю і сказаў: «Дзякуй!» Яна павярнулася, каб ісці, але адчула ці проста ёй здалося, што ён прытрымаў яе за плячо...

Выйшаўшы замуж з легкадумнай хуткасцю, але, як пасля выявілася, удала, яна зноў вярнулася ў сталіцу, дзе Мікола працаваў у адным з райвыканкомаў. Ім хутка далі кватэру — прычым Мікола, маючы прывілеі, мог выбіраць любы раён; і яны аблюбавалі сабе дом блізка ад Камароўскага рынку, які планавалі ўжо (Мікола ведаў) пашыраць і абнаўляць.

Мікола быў прыстойны, клапатлівы муж, умеў добра гатаваць стравы, мыў сабе кашулі і шкарпэткі — гэтыя ягоныя якасці, як цяпер Любе думаецца, і парушылі той адвечны лад жыцця, які рабіў сям'ю трывалай, ставячы кожнага — мужа і жонку — на сваё, адведзенае ў гаспадарцы месца.

У Любы было шмат вольнага часу. Яна не цуралася сяброўак, а яны не забывалі пра яе, спакушалі на гулянкі, пікнікі, і жыццё яе амаль не розгілася ад таго, што было да замужжа. Яно мала ў чым змянілася і тады, калі Люба зацяжарала. Кладучыся спаць, Мі-

кола чуў з яе рота пах цыгарэты — прасіў-маліў не курыць.

Роды ў Любы, надзіва тым жанчынам, хто яе бачыў і захапляўся шырынёю клубоў, былі цяжкія, пакутлівыя. Яна доўга ляжала на сталe, абсыпаная потам, на яе жывот ціснулі прасцінаю — галоўка дзіцяці ніяк не выходзіла. Потым на яго лобіку цэлы месяц чырванелася паска-намуліна, якая і наводзіла Любу на думку, што яе сын, назвалі Андрэй, перанёс родавую траўму. Адсюль нібыта і страшнае — алегафрэнія ў стадыі дэбільнасці. Але яна, гэтая хвароба, выявілася не адразу, а пазней, калі сыну ўжо было каля пяці год. Тое, што ён адставаў у псіхічным развіцці ад сваіх равеснікаў, нейкі час не турбавала бацькоў: мала якія адхіленні могуць быць. Упершыню ўсур'ёз устрывожылася бабуля — Любіна маці, у якой Андрэйка, лічы, гадаваўся і рос. Пяцігадовы малы быў надзіва някемлівы: скажаш яму прынесці сандалікі — ён падае цацку, якая трапіла на вочы; спытаеш, ці хоча есці, паказвае на акно — на вуліцу. Аналізы энцэфалаграмы, паўтораныя па некалькі разоў, кансультацыі ў слынных прафесараў-псіхіятраў, сваіх, украінскіх, і маскоўскіх, вынеслі бязлітасны, як стрэл, прысуд.

Міколу ён глыбока сакануў па душы, але не выбіў з прывычнага рытму жыцця, ён па-ранейшаму заставаўся ўзорным сем'янінам і мужам. У нядзелю, калі жонка адмаўлялася наведаць тэатр ці схадзіць на выстаўку, браў мальберт ды ішоў на недалёкую ўскраіну горада. Там была вада ў стаўку з барoдамі аеру на берагах, раслі бярозы, даверліва і роўна мірачыся ў шчыльнай купцы, важна разгульвалі вароны, пагардліва косячыся на чалавека. Назад вяртаўся ўзбуджаны, рухавы, кідаў на стол цэлы стос эскізаў.

На Любе, як на маці, сынава хвароба вонкава адбілася больш прыкметна: яна ўчарнела з твару, наліліся тугою вочы, стала замкнутай, недаверлівай і нервовай. Калі першы стрэс мінуў, сілы, якія дыктавалі ёй сваю волю і былі згаслі, заявілі з двайной настойлівасцю і голадам. Цяпер у Любы было ўжо як бы і апраўданне — трэба заглушыць гора. І яна пачала гуляць без ранейшай стрыманасці і дакору, што тады-сяды закочваўся ў яе душу, прыходзіла позна дахаты. Як заўсёды, яе чакалі на пліце ўпадабаныя ёй у Слуцку хрумсткія, падсмажаныя на алеі дранікі, радавала вока

чысціня ў кватэры. Муж быў ураўнаважаны, добразычлівы. І ноч яна спала спакойна і бестурботна, як старая лянівая кошка.

Толькі аднойчы, калі яна доўга не выходзіла з ваннай, у якой шумным напорам пляскалася вада, а потым убачыў яе збялелую, з чырвонымі вачыма, з якіх не перасталі сыпацца слёзы натугі, ён строга сказаў ёй: «Люба, пара брацца за розум!» — «Даруй, даруй, Коля...» — Яна абняла яго, прыхінулася мякка і даверліва ўсім целам, цяпло і блізкасць якога заўсёды хвалявала і разганяла самыя цяжкія хмары непрыемнасці.

А трохі спагадзя ён першы раз падняў на яе руку. Але, хоць і не быў вінаваты, доўга сябе дакараў, хадзіў як апушчаны ў ваду. На Новы год яны сабралі застолле ў сябе на кватэры. Гарэлі свечкі — парафін плавіўся і спаўзаў у чорныя сподачкі падсвечніка светлымі, як раса, кроплямі; магнітафон голасам Джо Дасэна чулліва нашэптваў мелодыю кахання, якую міжволі хацелася слухаць з грымасаю болю і пакут на твары. І ў гэтым паўзмроку лёгка, ледзь пахістваючыся, танцавалі тры пары. Здавалася, гэта не сапраўднае жыццё, а нейкі міраж, геніяльна адмастачаны малюнак гармоніі святла, гукаў і людзей, гармоніі, якую ніхто ніколі не парушыць. Але чалавек — усемагутны, а тут і сілы ніякай не трэба было,— раптам суха, як ледакі, што падаюць увесну са стрэх, зазвінелі цацкі на ёлцы, і толькі цяпер дзве пары заўважылі, што трэцяя непрыкметна аддалілася ў кут, за ёлку, і цалавалася. Гэта была Люба з Міколавым знаёмым, таксама мастаком, даўгалыгім вясёлым хлюсцікам у пацёртых джынсах і чорнай скуранай куртцы, ён увесь вечар забаўляў усіх эратычнымі анекдотамі. Мікола парывіста вызваліўся ад рук сваёй партнёршы, якая, здаецца, пачынала ўжо засынаць у яго на плячы, і, падышоўшы, урэзаў жонцы аплявуху. Яна схапілася за шчаку, а потым закрыла рукамі твар.

Свята было сапсавана. І настрой — на многія дні. Мікола выявіў у сабе дзіўнае пачуццё: здавалася б, ён павінен быў раззлавацца ці зусім узненавідзець жонку, пазбягаць, каб яе не бачыць, але — на працы ён не знаходзіў месца, не мог дачакацца, калі скончыцца дзень, каб тут жа, ні секунды не марудзячы, бегчы дамоў, да Любы, быць з ёю калі не блізка,

дык хоць бы побач у адной кватэры, нават праз сцяну.

Люба была надзіва вытрыманая, хмурылася: маўляў, дужа пакрыўдзілася і цяпер наўрад ці зможа ўлагодзіцца. Мікола нават памкнуўся разы два з ёю загаварыць, што яму дорага каштавала, ды Люба пасля гэтага яшчэ больш насупіла бровы і так, з дзвюма тонкімі складачкамі на пераносіцы, хадзіла з пакоя на кухню, з балкона — у ванную. Ён шчыра здзіўляўся, як гэта можна з такім спакоем і зацятасцю кроіць сваю душу і чужую.

Здаецца, іх сямейны падмурак здорава страсянула, ён даў шырокую расколіну, якую не так проста будзе замазаць, бо адна палова нібыта ўвесь час аддалялася ад другой, як крыга ад берага: ці то па якой інерцыі, набранай яшчэ да замужжа, ці то з-за паслабкі, якую дала сабе з самага пачатку, Люба адплывала далей і далей. А можа, гэта было не што іншае, як сумны помнік іх хуткаспеламу намыслу пажаніцца. Так думалася Міколу, і ён гатовы ўжо быў узяць добрую долю віны на сябе, як мужчына, што не праявіў цвярозасці ў такой няпростай справе, як жаніцьба.

Але... у іх быў сын — хворы Андрэй. І калі Мікола ўсё ж такі мог уявіць сваё жыццё без Любы, то на месцы Любы ён не разумеў, што яна думае і на што разлічвае. У яе адной застаецца на руках дзіця. Ну, няхай бы здаровае, нармальнае дзіця, радасці ад якога жанчыне магло б хапіць, а то ж хворае... Такія пакуты на ўсё жыццё. Відаць, Люба, мала бываючы ў апошнія гады з сынам, ужо адвыкла ад яго і ён, мабыць, не так балюча вярэдзіў сэрца, а то, можа, уяўляўся зусім чужым. Але ж гэта было не так, толькі ад адной думкі, што сын жыве, што ў яго, як і ва ўсіх дзяцей, павінны быць маці і бацька, становіцца страшна.

«Што мы будзем рабіць?» — спытаў ён неяк,налучыўшы момант, калі жонка сядзела на кухні каля прачыненага акна і курыла, стрэсваючы попел на падлогу. «Дзіўны ты!..— Яна хмыкнула з такою годнасцю, акурат была царыца, а ён, плебей, на каленях падпоўз да яе па міласціну.— Я падала заяву на развод». Яна чакала, што гэта ашаломіць мужа, і таму з апошнімі словамі крута павярнулася да яго і нахабна глядзела ў вочы, чакаючы, што ён зараз напраўду ўкленчыць і будзе прасіць памілавання. «Ты пра ўсё добра паду-

мала?» — адно спытаў ён. «Не дурней жа мая галава за тваю»,— здаецца, голас у яе задрыжаў, як заўсёды перад тым, калі яна збіралася плакаць.

...На твары ў Любы ляжаў намёк суму і раскайвання. Яна некалькі разоў абмакнула ў віно вусны і паставіла шклянку; схадзіла да сябе ў пакой і прынесла дамскую сумачку, з якой пры нас выняла пачак цыгарэт «Арбіта»; закурыла — мяне заўсёды здзіўляла жаночае ўменне далікатна, неяк нават артыстычна трымаць двума пальцамі цыгарэту,— пусціўшы тоненькі струменьчык дыму на верхнюю шыбку акна, дзе была фортачка.

— Я яго не вінавачу, няма за што... Сама ва ўсім вінавата,— сказала Люба, і было відаць, што гэта не бравада, не жаданне зарыгінальнічаць, маўляў, глядзіце, якая я — адна з тысячы жанчын прызнаю сваю віну; так падсумавала яна свае выкрунтасы пасля доўгага пакутлівага роздуму; ёй шмат чаго падказала само жыццё, што акунала яе ў свае не самыя чыстыя нетры бязлітасна і шалёна.

## III

Дык вось, гэта адно нам здавалася, што, напытаўшы кватэру, мы зацарствуем ад бестурботнасці, у лёгкай, ружовай ціхамірнасці, фантан якой, як бы ні біў з маладога ўяўлення, заўсёды прывідны і слабы. Наперадзе чакалі новыя, не менш заблытаныя, клопаты і трывогі. Іх бы магло быць і менш, калі б мы распісаліся з Галяю да яе размеркавання. Але нам проста не выпала раней пазнаёміцца, хоць мы і жылі ў адным горадзе, хадзілі па адных тратуарах і ездзілі адным тралейбусам — яе інстытут і мая кватэра былі на адной вуліцы; ды вось размяналіся, не прыкмячаючы адно аднаго, як гэта робяць і тысячы іншых людзей, якіх некалі выпадак зводзіць і ім нават у галаву не прыходзіць, што яны ўжо прымільгаліся, а здаецца, быццам яны спусціліся аднекуль з розных планет і нарэшце сышліся. Усе мы, дзякуй богу, жывём на адной зямлі і звязаны нябачнымі ніцямі, як рацыі, наладжаныя на адну хвалю.

На руках у жонкі было накіраванне ў далёкую Белгародскую вобласць. Ехаць ёй туды адной, каб адпра-

цаваць тры гады і вярнуцца назад, было неверагодна. Адна цяжарнасць ужо гаворыць сама за сябе, дый наўрад ці спрыяла б маладой сям'і, якая не паспела ўстаяцца, тое, што муж і жонка апынуліся б на розных полюсах.

Сабраўшы дакументы, мы паслалі іх на перагляд у Маскву, ва ўпраўленне мікрабіялагічнай прамысловасці; адтуль праз месяц, пасля нашых настойлівых званкоў-напамінкаў, прыйшла папера — вольнае размеркаванне. Радасці было мала, бо кожны з нас добра ведаў, як цяжка знайсці працу ў Мінску, ды яшчэ — без праніскі. Калі б у жонкі было накіраванне ў Мінск, яе маглі б прапісаць абы-дзе, на любой плошчы, а так — толькі з мужам. Супрацоўніца з маёй работы, Івашчэня, якая зжалілася і прапісала мяне, калі я пераехаў з райцэнтра ў Мінск, жонцы ў гэтай ласцы адмовіла. Маўляў, сын хутка прывядзе нявесту, і ёй таксама патрэбна плошча; відаць, яна проста не рызыкнула даваць права, хоць і субкватаранцкае, на сваё жыллё чужой сям'і, у якой, давер даверам, могуць з'явіцца і свае карыслівыя намеры.

І мы пачалі шукаць кватэру, дзе змаглі б прапісацца ўдваіх. Родзічаў у сталіцы ні ў мяне, ні ў жонкі, здаецца, не было. Былі толькі сябры, знаёмыя, і мы пачалі іх успамінаць ды прыкідваць, да каго варта звяртацца, а да каго — не; жонка тут аказалася больш увішная, назвала з паўдзесятка людзей, якія, лічыла, маглі выручыць. Але, з'ездзіўшы да іх, вярнулася засмучаная, што не вельмі мяне здзівіла: каму цяпер хочацца, у наш мітуслівы век, браць на сябе лішні клопат, калі сваіх столькі, што не справіцца з імі да смерці. Ды адчай і ў такіх выпадках усё роўна не лепшы сябар, чым самыя чэрствыя людзі.

І мы спадзяваліся на лепшае. На прыкмеце ў жонкі была яшчэ адна, не вельмі ўладкаваная, сям'я: бацька, горкі п'яніца, ад якога адрынулася жонка, забраўшы з сабой малую, і яго старэйшая дачка, Рытка, якая не пайшла на павадку ў маці; Рытка вучылася з жонкаю ў адным інстытуце, толькі на два курсы ніжэй, але яны сябравалі, пазнаёміўшыся на вечары самадзейнасці. У госці мы паехалі на пару, прыхапіўшы з сабою бутэльку,— так скамандавала жонка. Была якраз нядзельная раніца. Уначы выпаў снег, але растаў, і на тратуарах стаяла вада — яе сюды выплюхвалі яшчэ і

тралейбусы ды аўтобусы, калі прыціраліся блізка да бардзюра, што раздзяляў шашу і пешаходны тратуар; імжэў дробны дождж, людзі ішлі пад парасонамі і ў плашчах, якія бліпічалі, і ў гэтым іх бляску як бы чуўся ледзяны хруст... бр-р-р, зябка дакрануцца! Я баяўся, каб не застудзілася жонка, і падладжваўся да яе, пакуль уподбег трухалі ад прыпынку; браўся парывамі вецер, прыклейваў да кіёскаў, да плота мокрае лісце.

Я спадзяваўся ўбачыць пакамечанага, нехлямяжага чалавека, заспанага, з апухлым тварам, а перада мною стаяў, адчыніўшы дзверы, даволі прыстойнага выгляду мужчына з газетаю ў руцэ; адале ўжо, расправнуўшыся і зайшоўшы ў пакой, я добра разглядзеў яго. З-за крыху зацемненых акуляраў стомлена свяцілі цёмныя вочы, пад якімі зморшчанымі жалудамі сабралася скура; твар дні два не галіўся, і шчаціна, зусім белая, быццам інеем укрыла падбародак і шчокі да самых скроняў; адвіслы, тоўсты жывот пераваліваўся праз рэмень, акурат быў наліты вадою.

— О, пані Багданская! — усклікнуў ён, неяк па-роднаму ўзрадаваўшыся, акурат дачцэ.— Даўно цябе не бачыў. Ужо замужам?

Жонка, якая не любіла маракаваць і завязвала размову без нудных інтэлігенцкіх штучак, выведаць, скажам, настрой у сумоўніка, ці падрыхтаваны ён да навіны, спытаць пасля выпіўкі ці перад ёю, адразу выклала гаспадару, з чым і чаго прыйшлі. Ён ні на макуліну не збянтэжыўся, а з прыткасцю, якой мы нават не чакалі, адказаў: «Калі ласка». І нават шчыра пашкадаваў, што могуць і не прапісаць, бо — падлічыў — не хапае па шэсць метраў на чалавека. Ён успомніў, і гэта мяне здзівіла ды ўразіла, што маёй жонцы абавязаны жыццём, а не тое што нейкай прапіскаю. Колісь ён, згубіўшы ключы, п'яны парываўся пералезці (перакінуў ужо праз парэнчу нагу) з суседскага балкона на свой, і добра, што ў гэты момант якраз падышла дачка з ёй, маёй жонкаю; тады лёгкая і спрытная, як вавёрка, першаразрадніца па гандболе, жонка вобміг перашмыгнула з балкона на балкон (восьмы паверх!) і адчыніла кватэру.

Мы селі за стол, на які гаспадар паставіў талерку студзеня з ласінай губы. Гэтая экзатычная страва мяне не здзівіла, бо гаспадар працаваў інжынерам у зе-

лянгасе, які прымыкаў да лясной гаспадаркі, і часта прыносіў дзічыну: кавалак мяса з дзіка, тушку зайца або глушца. У пярэдняй і тут, у зале, са сцен тырчалі рогі — вялікія, на сем какатоў, з лася і маленькія, востранькія, як шыльцы, з казулі.

Гаспадара звалі Мікалай Анісімавіч. Жонка спытала, дзе Рытка; аказваецца, яе няма дома ўжо цэлы месяц, паехала ў калгас выбіраць бульбу. Жонка паспачувала ёй, гараджанцы, маўляў, цяжка такой золлю корпацца ў зямлі, на што Мікалай Анісімавіч з усмешкаю адказаў: «Няхай прывучае сябе да работы, а то будзе даміцэляй, як маці». У яго словах не было і намёку на з'едлівасць ці пакепліванне, а толькі шчырая бацькоўская турбота за дачку. Зрэшты, не было б вялікай бяды, калі б Мікалай Анісімавіч і нядобра адазваўся пра сваю былую жонку. Яна збаламуціла яму жыццё, і гэта не было звычайнае апраўданне п'яніцы ці няўдачніка, які пнецца ў вярхі, ды не хапае розуму, стараннасці, і яму ўсюды даюць ад варот паварот. Мікалай Анісімавіч напраўду стаў ахвяраю жончынага каварства. Знайшоўшы маладога палюбоўніка, з кватэрай і машынаю, і каб займець права на афіцыйнае з ім сужыццё, яна стала чарніць мужа, пісала на яго ў Саўмін, дзе ён працаваў тады начальнікам упраўлення, абвінавачваючы ва ўсіх грахах — і ў здрадзе, і ў п'янцы, і ў дэбошы... А падазронасць, недавер варта адно пасеяць, як усе, здавалася б, звычайныя рэчы паварочваюцца да чалавека цёмным бокам і кідаюць на яго цень. Мікалая Анісімавіча вымусілі змяніць пасаду, і ён пачаў заліваць душу гарэліцай; часам здавалася, што ён можа дайсці і да крайняй мяжы — да самагубства.

Я слухаў гэтага чалавека, і мне чамусьці думалася, што адчай у яго мінецца, бо яшчэ не ўсё ў ім з таго, што давала яму пасаду і аўтарытэт, загублена. І Рытка, мусіць, таксама разумее гэта, інакш ужо даўно перабегла б да мамачкі, якая па-ранейшаму не магла дараваць дачцэ здраду. У Мікалая Анісімавіча было шмат сяброў, сярод іх ён назваў нават вядомага паэта, і калі я здзівіўся, ён, каб даказаць, што не выдумляе, тут жа пазваніў па тэлефоне гэтаму паэту, спытаў, як здароўе, як пішацца. Мабыць, каб адвесці падазрэнне, быццам звяла іх адна бяда — гарэлка, растлумачыў, што паэт ужо даўнавата не бярэ ў рот нават кроплі —

адпіў сваё маладым, ледзь не згарэў ад гэтых п'янак. Я чытаў няраз вершы гэтага паэта, выпісваў з іх думкі, і мне даўно карцела пабачыць яго, хоць бы адным вокам, а тут вось чалавек, які сябруе з маім кумірам. Тая магія, якую несла ў сабе прозвішча паэта, ахутала раптам і Мікалая Анісімавіча, і я глядзеў ужо на яго як на бога. І думаў пра тое, што часта буду прыходзіць сюды ў госці.

## IV

Гэта нават не назавеш цікаўнасцю — маё жаданне ўбачыць Андрэя. Я быў акурат на кухні, калі Люба сказала: «А вунь і сынок мой ідзе». Яна стаяла каля акна, твар яе імгненна змяніўся — замест засяроджанасці, з якой яна смажыла гуляш, з'явілася радасць; гэта была не простая грымаса радасці, калі твар яснее і ўсё на ім, да кожнай кропачкі, свеціцца,— да яе прымешваўся не то сум, не то застарэлы і прыглушаны даўнасцю боль. Любіны вочы пачалі хутка напаўняцца слязамі, але яна іх не адчувала. Толькі тады, калі скаціліся па шчоках два празрыстыя ланцужкі, яна схамянулася і стала да пліты, дзе пачало ўжо дыміцца мяса.

Я не мог пераадолець жадання зірнуць у акно. Гледзячы на дом, здаецца, акурат на маё акно, па асфальтавай дарожцы бег хлапчук, апрануты ў сіні плашчык, з ранцам за плячыма. Як быццам нават пасміхаўся, а ў нейкі момант прыветліва махнуў рукою.

Хоць дзверы ў кватэру Люба загадзя прачыніла, Андрэй дзынкнуў званком — і тут жа ўляцеў на кухню.

— Мамачка!..— Ён быў зусім разгублены, узрушаны, акурат за ім нехта гнаўся ці, прынамсі, ён некага злавіў. Заўважыўшы незнаёмца, хуценька суняўся, зрабіў пару нясмелых крокаў, не спускаючы з мяне насцярожаных вачэй; на вуснах, яшчэ не праявіўшыся як след, пачынала зараджацца ўсмешка.

— Здрасце! — сказаў ён і адно тады заўсміхаўся, неяк шчыра, прыязна.— А я ведаю, як вас завуць... Дзядзя Алесь і цёця Галя.

Я зразумеў, што Люба, наведваючы Андрэя (звычайна ў сераду), ужо завочна пазнаёміла яго з намі. Андрэй сачыў за мною, не саромеючыся і не адводзя-



*Акно — самы просты тэлевізар у свеце.*

(«Светлы ручай любві»)

чы вачэй; яго вочы мяне ўразілі — вялікія, блакітныя, з нейкім цнатліва-чыстым бляскам, яны іскрыліся, быццам крышталінкі. Вонкава Андрэй нічым не розніўся ад звычайнага хлапчука; у яго была тонкая доўгая шыя з глыбокаю канаўкаю на патыліцы, іранічна адтапыраныя тоўстыя вушы, якія зусім не прыкрываліся коратка падстрыжанымі валасамі, і вельмі ўжо выразна напаміналі грыбы-губкі на гнілым бярозавым пні. Сам высокі і худы, ён быў падобны, мусіць, на бацьку, што раней у гаворцы пацвярджала і Люба. Але ж, бачыў я, у твары нешта ёсць і ад маці, асабліва гэта было відаць тады, калі Андрэй смяяўся. Усмешка, здаецца, выпраменьваецца не з глыбіні вачэй, а застывае ў бляску, які нібы атульвае вочы. Так смяялася і Люба, але яна яшчэ моршчыла і нос. У Андрэя нос быў таксама прамы, як і ў маці, толькі самы кончык прыплюснуты ўверх, як бы надломлены, і таму высока адкрываўся ружовы храсток, што раздзяляў ноздры,— ён востра кідаўся ў вочы.

— Прывітанне, Андрэй! — сказаў я з усёй непасрэднасцю, на якую быў здольны: хацеў адразу заваяваць сімпатыю ў Андрэя. Але такі мой зварот, здаецца, насцярожыў яго яшчэ болей. Ён глядзеў на мяне вопрама, не ведаючы, як зрэагаваць. Вусны яго варушыліся, ён меўся нешта спытаць, але чакаў, што яшчэ скажу я.

Любе, мабыць, надакучыла гэтае наша прыдзірлівае ўгляданне, якое відочна зацягнулася, і яна ўладным голасам загадала Андрэю пераапранацца, мыць рукі ды садзіцца есці. Ён адразу быццам не пачуў яе слоў, але яна паўтарыла свой загад стражэй і гучней, і ён пайшоў да сябе ў пакой не азіраючыся. Зграбны, высокі хлопчык.

Я таксама завярнуў у свой кут і пашкадаваў, што якраз цяпер няма жонкі (паехала ў НДІ мікрабіялогіі прапытваць работу) і няма з кім падзяліцца ўражаннямі. Але ж гэта быў толькі пачатак, першая сустрэча з Андрэем, пасля якой мы пасябравалі, ды так шчыра і цёпла, што нам не ўяўлялася разрозненае жыццё, якое ўсё-ткі павінна некалі наступіць і ў якое пакуль што неахвотна верылася.

Андрэй, прыязджаючы на выхадныя, адразу ж стукаў у нашыя дзверы. Стаяў, не адчыняючы дзвярэй, пакуль нехта з нас не падаваў голас — дазволена. Зай-

шоўшы, першае, што ён рабіў,— мэтанакіравана, хвацка паказваў пальцам на любую новую рэч (проста здзіўляла, як ён адразу яе вылучаў) і пытаўся сваім нязменным: «Што гэта?» Мы з жонкаю цярпліва тлумачылі: гэта будзільнік, гэта радыёпрыёмнік, гэта этажэрка для газет, гэта пішучая машынка — зрэшты, яна зацікавіла яго больш за ўсё астатняе, ён доўга на яе ўглядаўся, пакуль асмеліўся спытаць, ці можна да яе дакрануцца і ці не ўдарыць яна токам; дакрануўшыся, ён шустрым кацянём вышмыгнуў з пакоя і, пакінуўшы расчыненымі дзверы, праз якія тут жа ўварваўся скразняк і з трэскам захліснуў фортачку, пабег да маці з радасным, захопленым крыкам: «Мамачка, мне дзядзя Алесь даў пакратаць машынку!» Ён хацеў не столькі пахваліцца, колькі ўпэўніцца, што нічога такога недазволенага не зрабіў, каб яго караць. «Ну добра, добра,— незадаволена гаварыла Люба і дадавала, павышаючы голас: — Не перашкаджай людзям!» Гэтым яна, ведаючы, што мы чуем, як бы праводзіла мяжу між ім і намі, памылкова (асабліва напачатку) лічачы, што Андрэй нам замінае. І наогул, як я прыкмеціў, Андрэй раздражняў яе, і яна сцінала ўсю сваю волю, стрымліваючы сябе, каб не ўзарвацца, хоць у голасе часта і пазвоньвала пагроза. Андрэй тады сунуўся паніклы ў свой пакой і гуляў там на падлозе з кубікамі.

Забыўшыся на забарону маці, засумаваўшы, ён праз нейкі час зноў ціхенька стукаў у нашыя дзверы. Жонка звычайна давала яму цукерку ці яблык, і такой увагі было даволі, каб бегчы да маці хваліцца. Я, баючыся, што пачнецца сварка, ішоў услед за ім да Любы і прасіў яе не крычаць на Андрэя, маўляў, няхай пабудзе з намі, яму ж цікава з новымі людзьмі. Яна, думаючы, што мы ахвяруем сваім спакоем адно таму, каб аблегчыць яе долю, замаўкала, але, відаць было, сэрцам не прымала чужой шкадобы. Аднаго разу яна ўсё ж сарвалася, і я зразумеў: у размовах пра Андрэя трэба быць вельмі асцярожным, бо ў жанчыны, у якой «дэфектовае» дзіця, да хваравітасці абвострана пачуццё рэўнасці і самалюбства.

Андрэй прывёў тады з сабою дзяўчынку, такую ж, як сам, дванаццацігадовую. Яна была бледная і замурзаная, з напалоханымі вачыма. Стаяла каля парога, а ён цягнуў яе за руку на кухню. «Глядзі, глядзі!..— усклікнуў Андрэй да маці, якая, пачуўшы валтузню,

выскачыла з ваннай.— Глядзі, каго я прывёў!» У ягоным голасе было столькі ўзрушанасці, а ў вачах — захаплення, што здавалася, гэта не ён прывёў дзяўчынку і паказвае яе маці, а наадварот, хтосьці іншы прывёў яе і паказвае яму: «Андрэй, што гэта за фокусы?» — пайшла ў наступ Люба. Рукі ў Андрэя ўраз абвялі, ён не ведаў, што рабіць: зусім не чакаў такога павароту. Стаў лепятаць, што Тоня яго сяброўка, да яе ніколі не прыязджае маці, яна адна, безабаронная, ёй крыўдна і яна хоча есці; і ў гэтым яго дзіцячым лепятанні было ўсё — і клопат, і трывога, і просьба, і шкадаванне.

На шум выйшаў і я з пакоя. «Ты паглядзі, Алесь, каго ідыёт гэты прыцягнуў.— Люба звярнулася да мяне так, быццам у мяне была ці магла быць пагарда да Андрэя, і гэта мне не спадабалася, але я не паказаў выгляду.— Хіба ў яго ёсць розум?» Яна была так расчаравана, акурат у яе на вачах толькі што выбухнула жудасная трагедыя і ёй так хацелася зараз пачуць словы суцехі. Я, шчыра кажучы, не бачыў ніякай бяды ў тым, што Андрэй прывёў дзяўчынку, і з лёгкасцю пажартаваў: «Няхай пагуляе з нявестай сваёй». Люба глянула на мяне з неўразуменнем, жартую ці кажу праўду, і паківала галавою, маўляў, што і гаварыць: адкалоў сынок нумар дык адкалоў. «Пераначуе, а ў панядзелак разам адправіш у інтэрнат»,— параіў я. «Ну ты што, Алесь?..— абурылася Люба, стрымліваючы сябе вялікім намаганнем. Яна стаяла станістая, моцная, рукі ў бокі, як грозны экзекутар, якому не хапае бізуна.— Яны, гэтыя ідыёты, могуць тут і спаць легчы... па-дарослаunion, тады разбірайся з імі. Выганяць з інтэрната». І яна са слязамі на вачах расказала, з якою цяжкасцю ёй удалося ўладкаваць Андрэя ў спецінтэрнат — дапамагла знаёмая з раёна. Разнерваваўшыся, загадала Андрэю адвезці дзяўчынку назад, але адумалася — куды пашлеш іх дваіх, няцямлівых. Вырашыла везці сама. Вось тут я і не стрываў, крыху павысіў голас: маўляў, што ты робіш, навошта траўміраваць і так скалечаныя душы дзяцей. Любу гэта закранула, і яна, відочна кідаючы мне выклік і вымяшчаючы затоенае раней, сказала, што для «пануквання» ў мяне ёсць жонка. Але я і блізка не пакрыўдзіўся на на Любу, і мы па-ранейшаму не саромеліся адкрыта глядзець адно аднаму ў вочы.

## V

Зіма той год запазнілася. Снежань адлічваў апошнія дні, а снегу не было. Надараліся дні, калі браўся халодны паўночны вецер, выганяў сонечнае цяпло з зацішкаў. Здавалася, вось-вось замітусяцца ў паветры сняжынкі. Але не, холад адступаў, зямля, падсушаная начнымі замаразкамі, зноў цямнела, зноў мякка, як расплаўлены сонцам асфальт, асядала пад абцасам, і нават там-сям пачалі прабівацца з яе тонкія зялёныя нітачкі травы.

І раптам, як бы раззлаваўшыся, што цяпло не давала ёй ходу, зіма наскочыла напорыста і ўладна. Вывалаў вохкі, пушысты снег, гаспадарліва ўхутаўшы дамы і дрэвы, ціскануў мароз, ураз пераапрануўшы людзей у тоўстыя кажухі. Уначы, як раз'ятраная ваўчыца, скуголіла за акном завея.

Я, канечне, зіму чакаў, але захапіла яна знянацку, ды дзе — у камандзіроўцы, лёгка апранутага, з голай галавою, у дэмісезонных туфлях. Вецер прадзімаў мяне да касцей, калі я ішоў на аўтастанцыю. На ўледзянелым і прысыпаным снегам тратуары вытаяў круг ад вечка каналізацыйнага калодзежа, на ім стаяў голуб і піў ваду, амаль не задзіраючы ўверх галавы. У мяне быў яшчэ дзень у запасе, але факты, дзеля якіх я ехаў у Бялыніцкі раён, былі сабраныя, і я вымушаны быў вярнуцца раней.

Гэты дзень мне быў як знаходка: выпісаўшыся ад Івашчэні, я ўсё яшчэ не змог ёй аддзячыць, хоць думка гэтая ўвесь час свідравала мне мазгі, непакоіла. Купіўшы каробку цукерак «асарці», бутэльку каньяку, аўтаручку з залатым пяром і, ведаючы, што Івашчэня павінна быць дома, я пазваніў ёй. Пачуў яе голас — нейкі адчужана-далёкі, разгублены. Ён збянтэжыў мяне, а тое, што яна суха сказала, каб я сёння не прыязджаў, зусім разбіла мяне, і я, засмучаны, перажываў, што, мабыць, пакрыўдзіў чалавека. Назаўтра, прыйшоўшы на працу, я даведаўся, што ў Івашчэні памерла маці. Грошы на вянок даручылі збіраць мне, і я з ахвотаю ўзяўся, як бы скупляючы сваю віну, хоць і не разумеў, у чым яна.

У доме, дзе ляжыць нябожчык, мяне ўражвала заўсёды цішыня, гнятлівая і такая чуйная, што здаецца, нават ад камара тут будзе гул, як ад турбіны самалёта.

Дасюль я толькі два разы быў на пахаванні. Помню, як памерла баба — мацерына маці. Гэта было ў лютым, настолькі снежным, што машыны не маглі прабіцца шашою, і нам, школьнікам, даводзілася кватараваць у самім райцэнтры, дзе была дзесяцігодка. У суботу надвечар мы вярталіся дамоў, грэбліся па сумётах міма могільніку, і там на белым снезе між сосен убачылі свежую гурбу жаўцяку. Я не ведаю, што мне тады падказала, але ёкнула сэрца: памерла мая баба Надзя. Я шкадаваў яе, яна столькі ведала казак, песень, небыліц усякіх, любіла ўсё жывое, траву і кветкі, умела збіраць грыбы і ягады. І мяне вучыла гэтаму з трох ці чатырох гадоў.

Я ўжо не ішоў, а бег у вёску, аб'інелы, растрэпаны, і калі ўбачыў, як да нас у двор зварочваюць нейкія прыгорбленыя людзі, зразумеў, што не памыліўся.

Другі раз пахаванне бачыў тры гады назад, калі працаваў у раённай газеце, зрэшты, нябожчыка не бачыў, а толькі агаломшаных, растрывожаных людзей: у авіяцыйнай катастрофе загінула маці майго сябра, які тады працаваў загадчыкам аргаддзела райкома камсамола і ў якога ўжо тут, у Мінску, пазнаёміўся са сваёй жонкаю. Гэта, мабыць, страшна для блізкіх людзей — хаваць пустое месца.

І вось цяпер — трэцяе... Івашчэня сустрэла нас маўклівая, з чорнымі кругамі пад вачыма, але да ўсіх міласэрна-ласкавая, уважлівая.

Мне давялося выносіць труну з нябожчыцай — адчуванне, быццам ты закуты ў празрысты цвёрды скафандр, што не дае табе паварушыцца. Іменна ў жалобныя моманты, бадай, найглыбей адчуваеш і разумееш, як гэта добра — жыць, і якое ж бясконца дарагое жыццё, дадзенае табе для дабра, кахання, працы. Дзеля яго, жыцця, дзеля таго, каб прыгожа жыць, і трэба пісаць.

На могільнік была чарга — стаялі куртатыя аўтобусікі, апяразаныя шырокімі чорнымі палосамі. Сыпаўся рэдкі снег. Трактар, апёршыся на прымацаваныя ззаду суножкі з пляскатымі дыскамі на канцы, каўшом капаў магілы — акуратныя, роўныя, блізка адна каля аднае. За намі прыстроілася незвычайная працэсія — труна стаяла адкрытая на катафалку, і ў ёй ляжала маладзенькая дзяўчына — як спала, пужліва прымружыўшы вейкі, з чырвонымі кругамі румян на

ўсю шчаку і ярка напамаджанымі вуснамі, між якімі запалі сняжынкі і не раставалі, недарэчна бялелі, як зубы, акурат дзяўчына смяялася. Адразу пайшоў шумок, пачуў і я,— дзяўчыну згвалцілі і забілі ў яе ж пад'ездзе.

Дамоў прыйшоў прыгнечаны, зусім адрынуты. Жонка таксама была не ў гуморы, бо не чакала, што затрымаюся ў першы пасля камандзіроўкі дзень. Не спытаўшы, дзе быў, яна адразу заявіла, здзівіўшы мяне сваёй катэгарычнасцю,— што ёй ужо абрыдла лётаць па Мінску і шукаць работу; тут жа папрок і ў мой адрас: журналіст, прыкметная пасада, называецца,— не можа ўладкаваць родную жонку. Я паўтарыў тое, што ўжо гаварыў, калі неслі заяву на шлюб: чалавек я зусім не практычны, не прабіўны, ва ўсякіх афёрах — круглы нулік. Тады яна, помніцца, адпарыравала — не ў гэтым, маўляў, бачыць вартасць мужчыны. Цяпер, здаецца, яна пярэчыла сабе, падмацоўваючы ўва мне думку, што шчасце з жанчынай салодкае толькі ў марах. І ўсё-такі я разумеў жонку і дарэмна на яе крыўдаваў: яна ўжо хадзіла цяжарная на пятым месяцы, і гэта было прыкметна нават не вельмі дасведчанаму воку, не кажучы ўжо пра начальніцкае.

Я ўзяўся даваць ёй парады, але, мабыць, зусім наіўныя, бо яна тут жа іх адмятала. Мы размаўлялі, мусіць, нястрыманымі галасамі, бо да нас заглянуў Андрэй — ён прыхварэў, хадзіў з абвязанай шыяй і шморгаў носам.

— Можна? — спытаў ён, асцярожна падступаючыся да канапы, на якой ляжала жонка. Я ўсё яшчэ даказваў ёй, што не варта хаваць цяжарнасць, бо па закону цяжарных жанчын павінны браць на працу ў першую чаргу. Жонка, захінуўшыся газетаю, адно пасміхвалася — яна саступала, і гэта мне падабалася.

— Не клычце на цёцю Галю. Дзядзя Алесь, не клычце на цёцю Галю. Яна класівая, безабалонная, бедненькая, я не дам яе ў клыўду...— Андрэй сеў на канапу і з асуджэннем, якое дзіўна межавалася з рашучасцю і страхам, утаропіўся на мяне.— Я люблю цёцю Галю, яна базабалонная...— Ён падсунуўся да жонкі ўшчыльную і глядзеў ёй у твар бліскучымі вачыма, дзёрзка і пяшчотна адначасова, мабыць, не асмельваючыся пацалаваць. Жонка, я бачыў, адчувала

сябе няёмка, яна, бедная, аж пачырванела, бо няцяжка было ўявіць у гэты момант, што да яе лашчыцца не хворае дзіця, а чужы мужчына. Гэтая нечаканая сцэнка і памірыла нас, падліўшы ў сэрцы абаіх чуллівасці і пяшчоты. Андрэй выйшаў, і я зачыніў дзверы.

Мы ўключылі таршэр, які падараваў я жонцы на дзень нараджэння. Блакітна-зеленаватае святло ад яго запоўніла ўвесь пакой, і ён стаў падобны на вялікі акварыум. Я сказаў пра гэта жонцы і, прытварыўшыся марскім богам Пасейдонам, жартаўліва прапанаваў ёй пабыць у ролі жанчыны-русалкі, што выходзіць з вады ў штармавыя ночы.

Яна згадзілася.

...Я з'ехаў вуснамі з яе вуснаў на шчаку, потым на шыю і плячо, не перастаючы лёгенька цалаваць, пакуль не адчуў у роце цёплую шурпаценькую ягаду саска.

У нас была ноч надзіва спакойнага, глыбокага сну.

Раніцаю жонка, выпраўляючы мяне на працу, сказала, што сёння ў свой паход адзене штаны: маўляў, раз у штанах — не падумаюць, што цяжарная. І я зразумеў: учарашняя наша размова ёй не забылася і не ад згоды са мной яна замаўчала. Мусіць, чым больш чалавек кахае, тым больш у яго душы знаходзіш супярэчнасцей.

У абед, не дачакаўшыся вечара, жонка пазваніла мне ў рэдакцыю і сказала, што ўладкавалася на завод медпрэпаратаў. З мяне акурат звалілася гара, хоць жончыны словы і гучалі папрокам.

Я ішоў дахаты радасны, нягледзячы на непагадзь. Нечакана пацяплела, такія перапады ў апошнія дні бывалі часта. Снег стаў вадзяны, раскіслы, і ногі скрозь прамоклыя чаравікі адчувалі сырасць; устрывожыўся, каб, чаго добрага, не захварэць — пайшлі чуткі, што па Мінску ходзіць нейкі трохвірусны грып. Можа, во і Андрэй падхапіў яго — бедны, мала яму пакут.

Я завярнуў у гаспадарчы магазін і купіў спецыяльнай паперы для аклейкі вокнаў — скручаныя ў рулончык вузкія паскі. Клейстар мы зрабілі самі з мукі і ўвечары аклеілі акно. Прапанавалі сваю паслугу і гаспадыні, ды яна адмовілася: маўляў, усё роўна дзверы на балкон аклейваць не будзеш. Я турбаваўся не за сябе, а за жонку: ёй хварэць, ды яшчэ небяспечнымі інфекцыйнымі захворваннямі, ні ў якім разе нельга.

## VI

Пасля таго як жонка ўладкавалася на працу, нам весялей стала жыць. У выхадныя, а то і ў будні вечар, мы спакойна маглі схадзіць у кіно, тэатр,— над намі не вісеў той ранейшы груз няпэўнасці, які ўтрымліваў ад усякіх пагулянак: жыццё не наладзілі, а па кіно расхаджваеце.

А тыдзень таму я прачытаў на рэкламнай тумбе аб'яву: у тэлестудыі адбудзецца сустрэча з маім любімым паэтам. Здаецца, мары суджана было спраўдзіцца. А як жонка? Я амаль не сумняваўся, што і яна захоча пайсці на сустрэчу. Нізашто яна не ўпусціць гэты шанец пабачыць славутага чалавека, каб потым дзе-небудзь у кампаніі казырнуць. Яна не хацела звадзіць сваё жыццё да быту і кухні, яна цікавілася навінамі культуры, літаратуры, нават эканомікі. Пры вонкавай усяеднасці яна мела добры густ і з патоку інфармацыі, кніг, відовішчаў умела выбіраць карыснае і сапраўднае. На танныя прыёмчыкі яна, здаецца, не клявала.

Паэт аказаўся весялейшы і рухавейшы, чым я ўяўляў яго па фотаздымках. Яго засыпалі пытаннямі, самымі рознымі, ад сямейна-бытавых да палітычных, і ён амаль не чытаў сваіх вершаў. Жонка таксама падала запіску з пытаннем: «Якое, на Вашу думку, уздзеянне твораў Томаса Мана на моладзь?» Адказ яго быў звычайны: толькі станоўчае, геній не можа інакш уплываць, нават сваімі памылкамі.

Паэта здымалі трыма камерамі, адна з якіх увесь час паварочвалася на гледачоў — яны сядзелі паўкругам, у некалькі радоў і на рознай вышыні. Жонка шчыра, па-дзіцячы радавалася, што трапіла ў камеру і яе пакажуць па тэлевізары. Можна ўявіць, з якім нецярпеннем яна чакала гэтай перадачы, якая мела назву «Ліра».

Чалавек можа стаць і пастаяць на месцы, тады як жыццё не мае супынкаў, падсоўвае кожны дзень нечаканасці. Мяне выклікалі ў ваенкамат — спярша ў раённы, затым у абласны. У раённым гутарка была кароткая: прапаноўваем вас на афіцэрскую пасаду ў радах Савецкай Арміі. Ну і давер! Я не стаў нічога тлумачыць, разумеючы, што ўсё вырашае абласны ваенкамат.

Я прыйшоў да ваенкамата раней дзевяці гадзін. На вуліцы сыпаўся лёгкі снег, паветра было сухое, падфарбаванае пяшчотнай жаўтаватай імглою. На старой ліпе каля будынка ваенкамата сядзелі, натапыраўшыся, маркотныя чорныя, як бы толькі што вылецелі з коміна, галкі. Недзе ў снегавой белізне адзінока ф'юкаў снягір.

У кабінеце начальніка палітаддзела сядзела група людзей — падпалкоўнік, два маёры і тры дабрадушныя сівагаловыя ветэраны. Я адно адказваў на пытанні, за мною запісвалі без усякіх агаворак, а калі сказаў, што ў мяне бацька інвалід вайны другой групы, а старэйшы брат маёр Савецкай Арміі, усе з камісіі, як адзін, красамоўна хітнулі галовамі, і я зразумеў, што мая кандыдатура адпадае. Шчыра кажучы, гэта мяне засмуціла, бо я наладзіўся ўжо на службу, абмеркаваў з жонкаю, як і што мы будзем рабіць. Цяпер, выходзіла, трэба зноў вяртацца да ранейшага рытму жыцця. Такія скачкі я заўсёды пераносіў пакутліва, а жонка, напрыклад, любіла вострыя адчуванні і з ахвотаю сама сябе на іх наводзіла. Інакш я і не расцэньваў яе смеласць паехаць у камандзіроўку. Спачатку я быў катэгарычны: «Цяжарную, цябе не маюць права пасылаць без тваёй згоды!» — «А хто табе сказаў, што я не згодна?» — Жонка бясклапотна ўсміхалася: маўляў, ты ўвесь час ездзіш, а мне і разу нельга. Я не разумеў яе: хіба тут месца жарцікам? І тады жонка ўжо зусім сур'ёзна паясніла, у чым справа,— ёй даверылі, узялі на працу, і яна не хоча быць «свінтусам грандыёзусам», адразу станавіцца ў позу, навязваць свае ўмовы, сумленне пакуль яшчэ не згубіла. Мне нічога не заставалася, як згадзіцца з ёю — яшчэ і таму, што тут заявіў пра сябе нядрэмны эгаізм чалавечай натуры: аднаму, без жонкі, увечары мне лепш працавалася.

Першы ж дзень, як толькі жонка паехала, Люба, тоячы ў вачах усмешку, шматзначна спытала ў мяне: «Адправіў Галку ў камандзіроўку, так?» Я зразумеў, на што яна намякае: маўляў, адпраўляй-адпраўляй, толькі потым не здзіўляйся, чаму жонка стала халодная да цябе. Люба, як жанчына, мела вопыт вялікі, яе можна было слухаць. Але ж яе меркаванні не маглі быць праўдзівымі ў кожным канкрэтным выпадку, і не маглі пераносіцца на нашы з Галяю адносіны, у

шчырасці якіх я ні разу не засумняваўся, бо пажаніліся мы без усякага разліку, які так раз'еў душы цяперашніх маладых людзей. Мне заўсёды з усмешкаю прыгадваецца тралейбуснае знаёмства адной парачкі. Ён — у дублёнцы, андатравай шапцы, з вусамі, самазадаволены, пытае ў дзяўчыны з тонкімі рысамі твару, пяшчотнай скураю і наўмысна падвышаным галаскам: «Дача, машына ёсць?» — «А як жа!» — «Кватэра — плошча?» — «Асабняк».— «Дываны, золата?» — «Без іх цяпер нельга».— «Колькі грошай на кніжцы?» — «Бацькі трымаюць у тайне».— «Чым харчуецеся?» — «Асятровай ікрою».— «Дзе працуюць бацькі?» — «Тата ў рэстаране «Космас» бармэнам, мама прыёмшчыцай шклатары...» — Яна адказвала дзе жартам, дзе ўсур'ёз, але заўсёды — відаць было — ганарылася сваім сямейным становішчам і ведала сабе цану.

Дык вось, я верыў сваёй жонцы і нават на каліва не сумняваўся ў яе прыстойнасці, але... Вось гэтае «але» пасля Любіных слоў прымусіла мяне задумацца. У чалавечым жыцці бывае такое: куфэрачак ісціны раптам адкрываецца ключыкам зусім далёкай ад яе, ісціны, дробязі. Не, ніякіх падазрэнняў у мяне не было, я нічога новага ні ў сабе, ні ў жонцы не адкрыў. Але ж павінен я быў задумацца, чаму жонка паехала ў камандзіроўку не абы-куды, а ў Салігорск, дзе — расказала мне яшчэ да жаніцьбы — жыве хлопец, якога яна кахала, пазнаёміўшыся з ім на практыцы пасля першага курса. Выпадкова яна выбрала гэты горад ці не? Для нас настолькі важная была сама паездка, што зусім выпала з-пад увагі не менш важнае, як цяпер здаецца,— куды паездка.

І Люба, сама таго не жадаючы, мабыць, без усякага намеру, растрывожыла мяне, і не столькі тым, што абвінавачвала сучасных жанчын у легкадумнасці, колькі сваімі млявымі, мяккімі позіркамі, акурат імі хацела пацвердзіць, што жанчына вельмі спрытная на спакусу чужога мужчыны. Здаецца, Люба ўпершыню так бесцырымонна, як бы з патаемнаю думкаю вывучала мяне, што я ледзь не разгубіўся і стараўся не прыкмячаць яе зацікаўленых позіркаў, каб не адказаць прыязнасцю. Любу гэтая мая закаванасць, бачыў, памалу пачынала раздражняць, голас яе становіўся чужым і цвёрдым.

Жонка вярнулася праз тыдзень сумная і расчара-

ваная. Стамілася. Без ахвоты, але расказала пра калійны камбінат, дзе правяла ўсю сваю камандзіроўку і дзе сустрэла многіх знаёмых. «Ну а?..» — Я, ведаючы, што і яе былы каханы працуе там, недамоўкаю надаваў пытанню таямнічасці і як бы загадзя адчыняў варотцы для жончынай шчырасці. Яна абыякава махнула рукою, маўляў, усё даўно мінулася, забыта; і я да канца ўверыўся, што жонка не хлусіць, калі яна спакойным голасам сказала: «Ён ажаніўся ўжо і паехаў з жонкаю ў Калінінград...» Не скажы яна гэтага, і я не паверыў бы, што яна не пацікавілася лёсам чалавека, якога кахала. І справа тут не ў жаданні вярнуцца да старога, а ў бяссіллі перад поклічам таго, што калісь хвалявала, забірала пачуцці, крэмзала душу. Мы часта ламаем сабе жыццё тым, што не хочам разумець асаблівасці жывой чалавечай натуры, напрыклад, жаданне жанчыны падабацца мужчынам і наадварот; у ім, гэтым жаданні, заўсёды больш чысціні, чым у вонкавай стрыманасці, ганарыстасці таго ці іншага.

З суботы, калі прыйшла праграма ТБ на тыдзень, жонка не ведала спакою, чакала пятніцу, на якую была заяўлена перадача з удзелам вядомага паэта. Ёй так хацелася ўбачыць сябе з экрана, што, здаецца, яна ці не залішне мітусілася. Можа, дзесяць разоў, асабліва ўвечары, за чаем, пахвалілася Любе. І, мабыць, закранула ў ёй тую ранку самалюбства, якая не балела адно таму, што Люба гаіла яе ўвесь час цвярозай думкаю — трымацца з годнасцю. Ні чым іншым, а толькі гэтым, я растлумачыў сабе Любіну выхадку: яна не дазволіла нам паглядзець перадачу пра паэта. Спаслалася на тое, што па першай праграме ідзе опера Чайкоўскага «Яўгеній Анегін», у якой партыю Анегіна спявае Барыс Штокалаў — яе любімы артыст. Хоць было ўкусі сябе за вуха! Жонка плакала, утапіўшы твар у падушку. Я суцяшаў яе, як мог, турбуючыся ўжо і за здароўе будучага дзіцяці. Жонка абуралася: «Цяжарнай адмовіла? Такі грэх!..» Канечне, мала прыемнага ў Любіным учынку, але ў кожнага свой нораў, а ў гаспадыні кватэры — і пагатоў.

Андрэй — чуваць было — выкрыкваў нешта за сцяною, потым, здаецца, пляскалі далоні, і ён плакаў. Мабыць, абараняў нас з жонкаю.

Мне цяжка было сказаць, што падбіла жонку — ці

то гэтае непаразуменне з гаспадыняю, ці мой намер з'ездзіць у вёску, крыху адпачыць, праведаць бацькоў,— але яна неўзабаве заявіла, што, як толькі пойдзе ў дэкрэтны водпуск, адразу ж з'едзе да сваёй маці ў райцэнтр і там будзе раджаць. Нават калі не зважаць на капрызы, то варыянт быў якраз не горшы, бо трывог і хваляванняў перад родамі хапала, і слова маці, сталай жанчыны, было зусім не лішняе, гэта мы абое разумелі.

Люба, мабыць, не вельмі перажывала за свой учынак і нават — відаць было — не старалася шукаць яму апраўдання. Па-ранейшаму, як ні ў чым не бывала, вольна звярталася да мяне і нават да жонкі. Не, яна і блізка не паказвала, што запабягае перад намі. Проста паводзілася так, быццам у яе ўчынку не было нічога незвычайнага, яго трэба прымаць як само сабою зразумелае, як уладнае слова гаспадыні. Бо ніводзін чалавек, беручы кватарантаў, і блізка не хоча мірыцца з думкаю, што трэба ў нечым абмяжоўваць сябе дзеля іх. Ён адно рыхтуецца да барацьбы, што будуць весці ў яго душы самалюбства і тыя светлыя парывы, на якія задумана богам чалавечая душа. Гэтая барацьба, канечне, ішла ў Любінай душы. Люба скаралася, пакуль усё было ціха і прыстойна, а як толькі між ёй і намі ўзнік бар'ерчык, тут жа разняволілася. Не было ўжо чаго хаваць, яна сябе выдала, пэцнула па сваім аўтарытэце і цяпер не баялася, што пра яе падумаюць горш, чым яна ёсць.

І таму я не вельмі здзівіўся, калі Люба прывяла сабе мужчыну. Я пачуў голас: ён быў грубаваты, густы, як у заядлага курыльшчыка і выпівохі. Жонка не магла ўтрываць, каб не глянуць на яго. Знайшла прычыну схадзіць на кухню, дзе Люба гаманіла з кавалерам. Вярнуўшыся, акругліла вочы: «Божа, каго яна прывяла!..» Па яе словах, гэта быў не мужчына, а шымпанзэ. Стары, маршчыністы, з выпуклым тварам і буйнымі жоўтымі зубамі. Праз гэтыя рысы пасля Люба параўнала яго з вядомым італьянскім акцёрам.

Цяпер кожны дзень Любу з работы прывозіў чырвоны «Масквіч». Мужчына ставіў яго так, каб ён быў відаць з акна, замыкаў дзверцы ды ішоў разам з Любаю. Яна болей стала таптацца на кухні — зрэшты, была добрая гаспадыня, умела кулінарыць. Прыемныя, апетытныя пахі часта прыплывалі да нас у пакойчык.

І ў шафках у Любы быў ідэальны парадак: слоік да слоіка, бляшаначка да бляшаначкі, крупы, цукар, перац у спецыяльных пластмасавых формах. Вазьмі белы насавічок, як гэта робіць дбайны старшына ў салдацкіх казармах, правядзі па любой палічцы — не ўбачыш ані пылінкі. Люба прызналася неяк, што гэтая ахайнасць ёй перадалася ад маці, і паказала цэлыя альбомы выразак з газет і часопісаў, усякія наклейкі з маляўніча афармленымі стравамі замежнай кухні. Але, не ўтаіла, ёй шкодзіць адна загана — лянота, праўда, не прыроджаная, а быццам справакаваная былым мужам, Міколам, які браў на сябе занадта шмат бытавой драбязы.

Андрэй, убачыўшы незнаёмага мужчыну, прымчаўся да нас у пакой, узяў мяне за руку.

— Паглядзі, дзядзя Алесь! Да мамы дзядзя плыйшоў, на масыне...— Ён гаварыў так, акурат хацеў, каб я гэтую ж мінуту падняўся і калі не выгнаў з кватэры «дзядзю», то хоць бы паказаўся яму на вочы. Андрэй, мусіць, бачыў ува мне абаронцу і хацеў заручыцца маёю падтрымкай — на выпадак, калі незнаёмец захоча пакрыўдзіць яго. У той вечар Андрэй доўгі час бавіўся са мною. Я ўжо быў падумаў, ці не Люба адпрэчыла яго, каб не назаляў, але потым упэўніўся, што Андрэй проста ігнараваў незнаёмага мужчыну. Мне гэта нават лесціла. Я заўсёды з цікавасцю размаўляў з Андрэем. Столькі ў ім было непасрэднасці, незвычайнай, нелагічнай фантазіі, што мая душа ўвесь час трымцела ў чуйнай балючасці, на ўсё тонка рэагавала, і мне здавалася, што на свеце жывуць толькі шчырыя і даверлівыя людзі.

— Дзядзя Алесь, а вы любіце цёцю Галю?

— А як жа. Яна ж мая жонка.

— Зонка ваша? — Ён глядзеў на мяне так, быццам я адкрыў яму нейкі цуд.— Я яе таксама люблю, дык яна і мая зонка? Праўда, цёця Галя, вы мая зонка?

Жонка палажыла на столік кнігу — аповесці і апавяданні Андрэя Платонава,— і ўсміхнулася мне. Андрэй падышоў да яе, і яна пагладзіла яго па галаве.

За сцяною выразна чуўся юрлівы Любін смяшок. Я ці не ўпершыню адчуў у сабе пачуццё рэўнасці да таго мужчыны, што быў з Любаю. І Андрэй уважліва прыслухоўваўся да гукаў за сцяною — пераканаўшыся,

што не зблытаў смех з плачам, зноў хінуўся да маёй жонкі.

Я і праўда быў у дзіўным становішчы.

## VII

Канфліктаваць я не любіў і не ўмеў. Мяне заўсёды абуралі сцэны ў тралейбусе, магазіне, проста на тратуары, калі зусім незнаёмыя людзі праз нейкую драбязу ўсчыналі такі гвалт, што хоць затыкай вушы. Адкуль у іх браліся словы — пякучыя, колкія, рэзкія, што цалялі ў самае сэрца? Не цяжка было ўявіць, як такія людзі паводзяць сябе дома, на працы.

Загадчыкам аддзела інфармацыі, у якім я працаваў, быў Хрышчанок — як журналіст, зусім бездапаможны. У рэдакцыі да яго з павагаю ставіліся толькі вонкава, праз тое, што ён меў у вярхах уплывовага сваяка, а ў душы ўсе насілі затоеную непрыязнасць. Хрышчанок не мог цярпець людзей з уласнай думкаю. А што ж за журналіст без уласнай думкі? Дык вось: іх шмат, такіх журналістаў, хоць сябе, меў ці не меў такое права, я з гэтай кагорты выключаў. Хрышчанок ніколі не раіўся з супрацоўнікамі, які матэрыял хутчэй ставіць у нумар, не ўзгадняў з аўтарам свае праўкі, да якіх у яго быў нястрымны сверб, не дзяліўся навінамі пасля рэдактарскіх «лятучак». Гэта быў — чалавек-сцяна.

У адзін з апошніх дней зусім не зімовага, мокрага лютага я і падышоў да гэтай «сцяны», каб адпрасіцца на некалькі дзён у вёску. Хрышчанок доўга маўчаў, унурыўшыся ў паперу змрочным позіркам,— паказваў, што вельмі заняты.

— Нешта вы ўсе раз’ездзіліся,— нарэшце падняў ён галаву.— Учора Лебедзева, сёння ты...

Я ўжо добра вывучыў Хрышчанка і па такой яго рэакцыі зразумеў, што адпусціць, але павінен, як зазвычай, пацвяліць нервы, тым самым як бы лішні раз напомніць, якое няпростае жыццё. Жыццё якраз простае, прыгожае, даецца чалавеку ў радасць, няпростым яго робяць самі людзі.

Канечне, не ведаючы свайго загадчыка, я мог бы і абурыцца: як гэта так, трэба праведаць старых бацькоў, а ён яшчэ мудруе? Ды якраз у такія імгненні мне на падмогу прыходзіла вытрымка, і я заўсёды аста-

ваўся ў выйгрышы. Мала гэтага, яшчэ заручаўся авансам добрых адносін да сябе і надалей.

Выйшаўшы ад Хрышчанка, я думаў: адкуль бярэцца ў людзей гэтае жаданне атручваць жыццё іншым? Няўжо толькі таму, што кожнаму слава, пасада, грошы даюцца з цяжкасцю і ён думае: няхай і табе не на падносіку іх пададуць? А можа, усё прасцей, можа, у самой прыродзе чалавека закладзена вось гэтае імкненне да першынства, пакідаць астатніх ззаду, і тут нічога не зробіш? Толькі ж няма сакрэту, кожнаму зразумела: за табою ёсць і будуць людзі, якія абгоняць цябе, падскочаць вышэй, і смех іх над тваімі патугамі будзе іранічны ці нават паблажлівы.

Жонка дапамагла мне сабрацца ў дарогу, купіла на гасцінец каўбасы, бляшанку селядцоў, акуратна ўпакавала ў цэлафан.

У родную Малінаўку я заўсёды ездзіў з хваляваннем, з пачуццём да канца не зразумелай вінаватасці. І, мусіць, не толькі перад бацькамі (яны заўсёды зразумеюць), а перад самой зямлёю, на якой вырас, на якой прыйшла да мяне сталасць і якую, быў упэўнены, пакінуў назаўжды. Мае рэдкія наведванні бацькоў не супакойвалі; дарослы чалавек, я вымушаны быў прызнаць бязлітаснае і непазбежнае — рана ці позна бацькі памруць, і шлях у Малінаўку мне абрэжацца. Можа, у гэтым нічога благога і няма, іншы раз думаў я, як няма нічога благога ў тым, што ў народжанага дзіцяці адцінаюць пупавіну, якая злучала яго з маці.

Прысыпаныя снегам сосны сустрэлі мяне на паваротцы маўчаннем, і ў гэтым іх магільным маўчанні я адчуў дакор сабе. Я спыніўся і з зачараванаю ўтрапёнасцю глядзеў на нерухомыя сосны, як бы вінуючыся перад імі. Прыляцеў аднекуль дзяцел, сеў на чорны сук, забарабаніў. Пацяруха пасыпалася на белы пад сасною снег.

Маці, убачыўшы мяне ў акно, выйшла на двор. Яна была ў цёплай пуховай хусце, якую калісь я купіў ёй з першай зарплаты. І мацерына шчака, і хустка былі аднолькава мяккія.

— Думалі пазней кабана біць, а раз ты ўжо прыехаў, то заб'ём цяпер,— сказала маці, ставячы на стол мападрыхтаваныя загадзя міскі з ядою: жоўценькія марынаваныя казлячкі з фіялетавымі шляпкамі, ядраную квашаную капусту з кружкамі цыбулі наверсе,

тварог, замешаны на смятане, і парэзанае роўнымі брусочкамі беленькае сала.

Гэта ўжо быў закон нашай сям'і: свежаваць кабана тады, калі прыязджаў хто-небудзь з сыноў. Часцей, канечне, наварочваўся я, бо старэйшы брат, забраўшыся на Далёкі Усход, не заўсёды мог выклапатаць сабе такую прыхамаць. У мацярэй адвечнае пачуццё — накарміць дзіця. Свежаванне кабана ў вёсцы здаўна лічыцца вялікай сямейнай урачыстасцю, і кожная маці хоча, каб на ёй абавязкова былі дзеці.

Я шмат паездзіў па Беларусі, і ўсюды адносіны да гэтай падзеі аднолькавыя, хоць свяжуюць кабаноў па-рознаму. Я нідзе не бачыў і ні ад кога не чуў, каб кабаноў стралялі з ружжа, як у нас на Слаўгарадчыне. Усюды калолі швайкаю, нажом ці аглушвалі даўбешкай. Гэтая адмета здзіўляла і зусім уразіла мяне, калі я прачытаў апавяданне свайго земляка пісьменніка, у якім вельмі падрабязна і тонка выпісана, абмалявана сцэна свежавання кабана.

З усіх маіх аповядаў бацькоў проста ашаламіла тое, што ў гаспадыні, дзе мы з жонкаю кватаруем, «ненармальны» хлопчык. Бацька тут жа падвёў сваю выснову: «Піць памногу сталі, адкуль жа дзеці будуць здаровыя...» Маці, падсміхнуўшыся, упікнула:

— Не пляўкай хаця! Многа ты глядзеў, п'яны ці не, як дзяцей замышлялі?

— Я? — Бацька напусціў на твар такую сур'ёзную міну, быццам чуў неверагодны папрок у свой адрас.— Ды я п'яны цябе за кіламетр абыходзіў!

На палюбоўныя тэмы ў нашай сям'і размовы паміж бацькамі і дзецьмі не вяліся ніколі, нават блізка да іх не падступаліся. Гэта адно цяпер, калі я ўжо сам збіраўся стаць бацькам, зачапілі, і тут жа маці перакруціла на сваё:

— Ета ж во ў бальніцу ездзіла, дык чула... Колькі-та дзяцей нараджаецца сапсутых? Казалі, на сотню адзін... У нас жа во тож п'юць, але, дзякуй богу, ні ў кога ненармальных няма.

— А ці далёка вунь Вербіж,— сказаў бацька.— У Івана Пытлячонка дачка ж дэбільная...

— Ага. Ета ж нібыта яе некуды здалі, у спецыяльны інтэрнат...

— Канечне! Усё адно ж чалавек. Гэта толькі Гітлер, каб зрабіць сваю нацыю моцнай, такіх знішчаў.

— Войкі, не ведаю, якая ета матка аддасць на загубу свайго дзіцёнка, які б ён ні быў,— захітала галавою маці, устаючы з табурэта.

За гаманою не заўважылі, як сцямнела. Сінімі сталі шыбы. Запалілі ў хаце святло, і шыбы ўраз пачарнелі, было відаць, як блізка каля шкла мільгалі белыя сняжынкі. Маці захінула акно фіранкаю. У гэтым вячэрнім часе, калі сядзіш пры выпадковым стале з бацькамі, не раз думалася мне, ёсць нейкае глыбокае таінства, якое не разгадваецца, але напаўняе душу спакоем і светлай, як бы з дзяцінства, радасцю; уночы масоладка спіцца, а раніцаю прачынаешся ад голасу маці, і такое адчуванне, быццам нанова нарадзіўся на белы свет і жыццё тваё пойдзе прамою ды гладкай дарогаю, без няўдач і засмучэнняў.

Усталі раненька, цёмнай гадзінаю. Маці паліла ў печы, была рухавая, гаваркая.

— Во, двое мужчын у хаце, а трэба ісці прасіць чужога чалавека, каб забіў кабана,— пабедавала яна.

— Фашыстаў, гадаў, браў на мушку,— апраўдваўся бацька,— а кабана не магу застрэліць. Хоць ты што...— разводзіў ён рукамі.— Трасучка б'е.

Я таксама трымаў у руках зброю, страляў па мішэнях (на ваеннай падрыхтоўцы, ва універсітэце, пазней на ваенкаматаўскіх зборах), здаецца, усё проста, умею сунуць хваляванне, але не мог уявіць, як гэта страляць у жывое. Мяне заўсёды здзіўляў спакой, з якім хадзіў услед за кабаном, выбіраючы зручны момант, дзядзька Сцяпан — муж мацерынай сястры Аксюты.

Вось і цяпер ён зайшоў у хату з дубальтоўкаю ў руцэ і доўгім нажом за халяваю катанка. Маці адразу кінулася за печ, на ложак, абклала галаву падушкамі, каб так ляжаць, пакуль хто-небудзь не падыдзе і не скажа: усё.

Бацька наліў дзядзьку Сцяпану чарку, той выпіў і, не закусваючы, выйшаў на двор. Там каля таза з учарашняй мешанкаю рохкаў кабан.

Бацька застаўся ў сенцах, крышачку прачыніўшы дзверы, цікаваў за дзядзькам Сцяпанам.

Я быў у кладоўцы, вышукваў у цёмным куце паяльную лямпу, калі грымнуў стрэл. Потым чуў, як востра шоргалі аб сцяну хлява капыты заваленага кабана, доўга сакаталі ўстрывожаныя куры.

— Ну, а смаліць... як-небудзь ужо пасмаліце і без

мяне,— сказаў дзядзька Сцяпан, выціраючы анучай запэцканыя крывёю рукі. Твар яго быў задаволены, правая шчака крывілася ад усмешкі, скакаў выгнуты серпікам глыбокі шрам — падчас службы ў арміі дзядзька скінуўся з даху вагона і рассек шчаку.— А я пайду заводзіць свайго «беларуса»... Мне сяння нарад торф вазіць.

— Дык жа надвечар загляні,— папярэдзіў яго бацька.

Дзядзька Сцяпан агледзеўся ўжо каля варот, адны- мі вачамі сказаў: дзіва што, з ахвотаю. Дзядзьку Сцяпана і цётку Аксюту лёс пакрыўдзіў — у іх не было дзяцей; ужо дарослы я здагадаўся — чаму: аказваецца, цётка Аксюта раджала, і ёй рабілі кесарава сячэнне, каб хоць выратаваць яе самую, бо дзіця ўжо было мёртвае. І як людзі, пазбаўленыя клопатаў пра дзяцей, яны любілі кампаніі, гаману, прынамсі, сярод сваякоў гэта заўсёды прыкмячалася.

Дзядзька Сцяпан заявіўся позна ўвечары — мы з бацькам садзіліся глядзець праграму «Час».

— Ну вось, у вас папелі, а ў нас паелі! — засмяяўся бацька.

Дзядзька Сцяпан прымасціўся на сваё ўлюбёнае месца — на высокі парожак каля дзвярэй, што вялі ў веранду. Цяжка палажыў на калені натруджаныя рукі; яны былі вялікія і чорныя, як у качагара, набрынялыя свінцовай стомаю. І твар у дзядзькі Сцяпана быў сцямнелы, як бы выціснуты,— не дзіўна, дзень на марозе.

Маці замітусілася частаваць. Падсунула да дзядзькі Сцяпана табурэтку і паставіла на яе шырокую пакі Сцяпана табурэтку і паставіла на яе шырокую паtэльню са свежынаю, зверху накрытую стосам драні- каў: вынятая з напаленай печы, свежына адразу пусціла па хаце салодкі духмяны пах.

Дзядзька Сцяпан сядзеў утупіўшыся ў тэлевізар і як бы не прыкмячаў, што з'яўлялася перад ім на табурэтцы. А там ужо і бутэлька стаяла — матавая з марозу і ад таго нейкая калючая.

Унізе экрана пабег радок «Інфармацыйная праграма «Час».

— Ну што яны мне паказваюць? — раптам развёў рукамі дзядзька Сцяпан.— Я ж во толькі з гэтага поля...— Ён патрос сваімі рукамі — растапыранымі, чорнымі, як асмаленымі. Капачы, а не рукі.

На экране трактары ланцужком везлі торф, а ў верхнім куце — кружок і ў ім лічба, колькі тон тарфакрошкі вывезлі. Я засмяяўся ад такога наіўнага дзядзькавага абурэння, паясніў, што гэта ж перадача не толькі для вёскі, а для ўсіх людзей; і якому-небудзь гарадскому чыноўніку-пісаку цікава ўведаць, што зараз робіцца на палях ды фермах, а тое, што хацелася б яму, дзядзьку Сцяпану, чыноўніку абрыдла — усякія там канцэрты і танцулькі.

— Не, пляміш, што ні гавары, а мне ўсё ж цікавей пра паліціку паслухаць... што там ды як у свеце, кіно якое красівае...— Ён хітнуў галавою.— От лепш, чымся «Лёс чалавека», кіна я не бачыў... Так і стаіць у вачах, як паўзе салдат, рыючы тварам зямлю.

Я ведаў: змушаць на іншае дзядзьку Сцяпана — усё роўна што шлёгаць пугаю па вадзе. У ім гэтая няўступчывасць, зрэшты, як і ў цёткі Аксюты, мабыць, сядзіць у самых пячонках. Колькі і помню сябе, дзядзька Сцяпан, асабліва пад хмелем, спрачаўся заўзята, да ахрыпласці ў голасе і, зусім небагата ведаючы, кожны раз аставаўся на сваім. І нельга сказаць, што гэтая ўпартасць ішла ад нейкай тупасці ці абмежаванасці. Ад прыроды дзядзька быў якраз чалавек недурны, адно што не меў магчымасці далей трох класаў вучыцца; яго брат і сястра, што нарадзіліся пазней, пазаканчылі інстытуты і цяпер у гарадах відныя людзі. Проста, мусіць, дзядзьку Сцяпану трэба было яшчэ нечым, апроч працы, сцвярджаць сябе — прынамсі, мне так часта здавалася.

Маці запрасіла ўсіх вячэраць, і дзядзька Сцяпан пайшоў у качарэжнік, дзе быў мыцельнік, мыць рукі. Мы з бацькам падсунуліся бліжэй да табурэткі, адно дзеля кампаніі, бо ўжо адведалі свежыны. Дзядзька Сцяпан, і гэта было ў яго натуры, усё аніяк не мог астудзіцца: у яго, маўляў, вунь два тэлевізары — стары «Нёман», і цяпер купілі новы, каляровы «Гарызонт»,— а перадачы ён, па сваёй зацятасці, не глядзіць, чаго не скажаш пра цётку Аксюту. Ёй цікава ўсё: ад мартэнаўскіх печаў да «клубкоў нітак» — так назвала яна парашуты, першы раз убачыўшы іх на экране.

Я здзівіўся, што дзядзька Сцяпан такі багатыр, а той, не задумваючыся, прапанаваў:

— Забірай сабе «Нёман», вязі ў Мінск... А што?

Паставіш увязаны ў багажнік і — цю-цю! — Ён прысвіснуў.

Я ажно ўздрыгнуў ад нечаканасці: дзядзька Сцяпан акурат адгадаў, што ў нас з жонкаю праблема з тэлевізарам, праз яго была ўжо сутычка з гаспадыняй. Залежнасць, нават дробязная, заўсёды кепская тым, што змушае чалавека прыстасоўвацца і заглушаць у сабе пачуццё годнасці, і я згадзіўся забраць тэлевізар, спадзеючыся бясконца абрадаваць жонку.

Гамана разрасталася і ўжо закранула палітыку — пакушэнне на прэзідэнта Рэйгана,— перакінулася на быт, зарплату і прадукты; нарэшце зноў вярнулася да таго, што ўразіла ўчора бацьку і маці,— да гаспадынінага хворага хлопчыка. Лягчэй за ўсё раіць чужой сям'і таму, хто яе сам ніколі не меў, гэтак жа сама як меркаваць пра дзяцей, не нарадзіўшы іх. Дзядзька Сцяпан, узяўшы за губу пару чарак, быў і тут непахісны: маўляў, чым такія дзеці, як гэты Андрэй, дык лепш ніякія. І нават быў заікнуўся, што ён вось бяздзетны і хіба яму кепска. Але, мусіць, адчуў, што перагнуў палку, і, каб не вярэдзіць балючую рану, хуценька перавёў размову на кабана: як падбіраўся, як цэліўся і зваліў кабана з першага стрэлу, а мог бы і прамазаць — тады бегай-кідайся за ім, параненым, па двары. Прыпомніў з далёкай бытнасці, як уссадзіў яго падстрэлены кабан на карак і, выламаўшы весніцы, папёр у поле; ён учапіўся за кабанову шчэць, апомніўшыся, выхапіў з халявы нож і стаў шмуляваць ім кабану па гарлавіне.

Я, прызнацца, шмат чуў падобных здарэнняў, і цікавасць да дзядзькі Сцяпана паволі слабела — яшчэ і таму, што неадчэпнай асою прыбілася да мяне думка, якая ўсё глыбей і глыбей апускалася ў душу: чаму (у любой справе) адны могуць, другія — не? І тыя, што не могуць, перашкаджаюць тым, хто можа, і чалавецтва праз гэты тормаз праходзіць шлях удвая карацейшы. Дзе можна спыніцца і ўсур'ёз над гэтым задумацца? Я асабіста — толькі ў вёсцы.

Вёска і яе людзі як бы сціралі з жыцця размытасць і паказвалі яго ў канкрэтнай выяве, якая давала мне, журналісту, і праблемы, і характары, і вобразы, і жывыя народныя слоўцы... Гэта мяне вабіла, лагодзіла душу, напаўняла яе святлом.

# Частка другая

## I

Вясна, як і зіма, таксама не спяшалася. На дварэ ўжо быў красавік, а снег і не думаў сыходзіць, толькі ў самы поўдзень, калі сонца ярчэй выяўлялася пад суцэльнай каламуццю хмар, ён неяк вачавідкі сінеў, шчыльней сцінаўся і не рассыпаўся ў далоні, а камячыўся як пластылін; чорныя галінкі, наабламаныя за зіму з вербаў, тырчалі з яго сіратліва і надзейна, быццам закаваныя ў смалу дагістарычныя рэлікты. Дзьмуў вецер — такі моцны, што вераб'ёў, якія выляталі з аддушын, кідала ў бакі, як паперкі.

Такой парою я адпраўляў жонку да яе маці. Андрэй усё дапытваўся, куды яна едзе і ці хутка вернецца. Мабыць, жончыны адказы яго не задавольвалі, і ён не адступаўся ад яе — хітра жмурыўся і як бы хаваў на вуснах усмешку. Хацеў пачуць ад жонкі праўду, якую пачуў ужо ад маці і якую, не ўтрываўшы, сказаў: «А я знаю, куды вы едзеце... Ладжаць лебёначка!» Ён сказаў так, быццам адкрываў вялікую таямніцу, да канца не цямячы, што ў ёй незвычайнага, але адчуваючы, што тут ёсць нешта ад дарослых сакрэтаў, а значыць — недазволеных яму, малому, і калі лезці ў іх назойліва, можна паплаціцца.

Жонка таксама (і, відаць, шчыра) бедавала: як цяжка ёй будзе без Андрэя, так прывыкла да яго, што жыццё цяпер страціць цікавасць і звычайную прыўзнятасць. Ды Люба тут як тут прызналася, што на канікулы «сплаўляе» Андрэя да бацькоў былога мужа: маўляў, не толькі з яе боку павінен быць клопат, ёсць яшчэ і бацька з такою ж радавою вілкаю, як і ў яе. І гэта, здаецца, жонку крыху ўсцешыла, бо ўсё роўна трэба было б адвыкаць ад Андрэя.

Можа, праз тыдзень я застаўся ў кватэры толькі з Любаю. Спачатку абрадаваўся — будзе магчымасць добра, у цішыні ды спакоі, працаваць, але праз два дні зразумеў: плёну з маіх старанняў аніякага, на душы было пуста і панyла. Я сумаваў па жонцы. Не выратоўваў і прывезены з вёскі старэнькі «Нёман». Я садзіўся за пішучую машынку і кляваў адным пальцам. Карэтка тады-сяды пераскоквала, рабіла непа-

трэбны прабел, і я злаваўся. Відаць, без майстра не абысціся.

Такое адчуванне, што жыццё разладзілася. Сапраўды: неабходнасць жонкі да канца пачынаеш разумець тады, калі разлучышся з ёю; іменна тады яскрава высвечваецца, якое важнае месца яна займала ў тваёй душы і клопатах.

Я не хацеў гвалтаваць сябе; трэба пачакаць, супакоіцца і толькі потым брацца пісаць. Хадзіў на працу, аддаваў сябе газеце з ранейшым стараннем і зацікаўленасцю, але дахаты не спяшаўся. І не толькі таму, што сядзець аднаму ў пакойчыку тужліва і прападае ўсякі творчы настрой, а яшчэ і таму, што замінаў гаспадыні ў яе амурных камбінацыях. Я проста яшчэ не ведаў, што з першага дня, як паехала мая жонка, Люба забараніла палюбоўніку прыходзіць на кватэру; сувязі з ім, аднак, не парвала.

Штовечар я знаходзіў сабе занятак. Адзін раз хадзіў у кіно — на англійскі фільм, які спадабаўся мне тым, што тонка, неназойліва выкрываў норавы буржуазнага грамадства і не падмяняў псіхалогію герояў голымі, прасталінейнымі разважаннямі, як гэта часта бывае ў замежных фільмах.

Другі раз гадзіны паўтары праседзеў на паштамце, падпісваючы віншавальныя паштоўкі сваім і жончыным родзічам; стараўся пісаць не банальныя слоўцы, як звычай, а прыдумваў мудрагелістыя, вершаваныя пажаданні.

У нядзелю ўспомніў пра сваю даўнюю звычку хадзіць на рынкі — балазе днямі адкрылі новы Камароўскі рынак. Не купляць я хадзіў, а проста так, назіраць за вясковымі людзьмі — хоць і незнаёмымі, але блізкімі мне; я забываў тады пра ўсё на свеце, акурат на футбольным матчы, і толькі за варотамі рынку пачынаў востра, з неаслабнай сілаю адчуваць, што ў мяне на душы незвычайна лёгка, быццам жыву сярод людзей, між якімі ніколі не бывае ні спрэчак, ні звадак, ні зайздрасці.

Тупаючы між радоў, я ўбачыў мужчыну ў сінім галіфэ і вайсковым кіцелі, на месцы пагонаў у якім свежа зелянелі прастакутнікі і тырчалі спружынкі нітак; мужчына трымаў на руках рабога шчанючка з тупой, па-старэчы маршчыністай мордачкай і бездапаможна-сумнымі вочкамі, з якіх яшчэ не сплыў перша-

родны туманок. Як жа добра было б, падумалася мне, калі б мужчына прадаваў шчанючка не дзеля нажывы, а таму, што не хацеў яго тапіць ці выкідваць у незнаёмым месцы на вуліцу. Да мужчыны падыходзілі людзі, пыталіся, што за парода, колькі каштуе,— мужчына ахвотна адказваў, гладзячы цяжкой шырокай далоняю шчанючка па мяккіх вушках, ажно ў таго шырэлі вочкі, адкрываючы цёмныя, вішнёвыя бялкі.

А ў панядзелак на працу мне пазваніла ранейшая гаспадыня, незабыўная Паліна Рыгораўна, і сказала, каб прыйшоў да яе. Я занепакоіўся — што за прычына? Пасля работы паехаў да Паліны Рыгораўны. Яна, у новай блакітнай сукенцы, з абведзенымі рыскаю вуснамі, сустрэла мяне ветліва, заўсміхалася, не хаваючы, што радая бачыць былога кватаранта; я, не ўмеючы фальшывіць у такія імгненні, застаўся абыякава-спакойны.

Гаспадыня аддала мне два нумары часопіса «Родная прырода», які я не перавёў на новы адрас. Потым, ужо за чаем, зусім недарэчы, здалося мне, сказала, каб я заплаціў пятнаццаць рублёў за фарбоўку пакоя, у якім жыў. Ад здзіўлення я ўцягнуў галаву ў плечы, але, не маючы пры сабе грошай, сказаў, што прывязу заўтра.

Назаўтра я адвёз гаспадыні пятнаццаць рублёў, а потым бязмэтна хадзіў па вуліцах, ездзіў у тралейбусе. Нечаканая гаспадынiна выхадка сапсавала настрой. Раней уяўляў, а цяпер востра адчуваў: як цяжка, як усё-ткі цяжка жыць без мэты. І той англійскі фільм сцвярджаў, што якраз бязмэтнае жыццё нараджае злачынцаў, п'яніц, наркаманаў. А як навучыць усіх людзей жыць прыгожа?

Я стараўся прыходзіць на кватэру позна, таму і марнаваў час у такой чужой мне бяздзейнасці.

Люба першыя дні таксама як быццам не знаходзіла, чым заняцца. Знарок гучна стукала дзвярыма, працяжна шоргала скуранымі пантофлямі, напявала. Я разумеў: сумна і ёй, няма з кім словам перакінуцца — ні Андрэя, ні жонкі маёй, ні палюбоўніка. Нашта яна яго адшыла? Я не настолькі быў наіўны, каб не разумець: Люба не магла не думаць і не браць пад увагу тое, што з ёй у адной кватэры жыве, спіць праз сцяну малады мужчына, расцвелены жаночаю ласкаю, а цяпер яе пазбаўлены. Зусім небязгрэшная,

яна ведала, канечне, і такую асаблівасць мужчын — патаемна любавацца кожнай вабнай жанчынаю.

Я заўважыў, што Люба пачала ўважліва сачыць за сваёй знешнасцю: на павекі і пад вачыма лажыла лёгкія цені, заўсёды вымытыя, напушчаныя нізка на твар валасы надавалі ёй загадкавасць. Шчырасць і адкрытасць у людзях мне падабалася, але не наўмыснасць. А Люба дазволіла сабе няйнакш наўмыснасць.

Адным вечарам яна прыйшла да мяне ў пакой у ружовым цесным, з глыбокім выразам пеньюары, каб сказаць, што прыходзіў майстар пішучых машынак. Майстар сапраўды павінен быў прыйсці, але не сёння, а заўтра — так мы дамовіліся ўранні, калі ён заявіўся па маім выкліку. Хоць і клопату з тою машынкаю было хвілін на дзесяць, не болей, майстар, кучаравы, з чорнай густой шчэццю і тоўстымі, як у ляшча, губамі, доўга мармытаў, уздыхаў каля яе; потым разабраў па частках, расчыніў барабанчык са спружынаю, якую гнуў, пляскаў малаточкам на маленькім, як цацачным, станочку, аж пакуль яна не лопнула; тады ён сказаў, што прыйдзе заўтра і прынясе новы барабанчык. І вось, аказваецца, не ўтрываў — прыджгаў раней. Канечне, Любе выпала латва загаварыць са мною, але пры чым тут непрыхаванае жаданне спадабацца, прывабіць сваёй жаноцкасцю. Пеньюар задужа шчыльна аблягаў Любу, і ўся яна ў ім здавалася мяккай, паветрана-лёгкай і цёплай, вочы яе блішчалі. Я падзякаваў Любе такім голасам, каб было зразумела, што не да заляцанняў мне, ды яна не адразу завярнулася ісці. Нейкі момант стаяла перада мною, акурат выпрошвала камплімент, але якраз гэта яе настырнасць і стрымала мяне.

Назаўтра я ўстаў раней, чым зазвычай, схадзіў у ванную — пачысціў зубы і прыняў душ, які абудзіў у целе бадзёрасць і свежасць. Люба, мабыць, яшчэ спала: за сцяною была цішыня. Папіўшы чаю, я ўзяў з этажэркі часопіс «Полымя», у якім была надрукавана аповесць Васіля Быкава «Знак бяды». Зачытаўшыся, не пачуў, як выйшла са свайго пакоя Люба, хоць дзверы туды грукаюць гучна. Схамянуўся адно тады, калі на кухні заляскаў посуд, зазвінела шкло, і я здагадаўся, што Люба збіраецца несці здаваць бутэлькі.

І мне нешта зарупіла, як бывае, калі ў распланаваным дні на нейкі клопат забудзеш і тады ходзіш з адчуваннем няпэўнасці і трывожнасці на душы,— дык

вось я адчуў, што мне не проста рупіць, а і баліць, тоненька гэтак сочыцца ў сэрца боль віны. Перад кім жа? Во! Успомніў толькі цяпер пра жончын наказ прынесці з балкона плашч, які яна перад ад'ездам памыла і павесіла на вяроўку сушыць. Чорт, захандрыў, замітусіўся, дык і з галавы ўсё вылецела.

На балкон хадзілі праз Любін пакой. І я зайшоў у яго, не зачыняючы за сабою дзвярэй. Побач з ложкам, нізкім, скураным, шырокім, мабыць, замежнай вытворчасці, стаяў часопісны столік. На ім — паспеў заўважыць, пакуль адчыняў балкон,— недапітая бутэлька «Ркацытэлі» і высокая блакітная шклянка з выгравіраванай на баку белай кветкаю; на сподачку ляжалі тонкія скрылькі лімона і цукеркі «Беларуская бульба». Выходзіць, учарашнюю Любіну смеласць трэба напрамую звязваць з гэтым столікам — віно, мабыць, піла яна для таго, каб адагнаць рэшткі стрыманасці і сораму. А навошта? Няўжо даваў нейкі намёк на флірт? Працяглы позірк там ці мімалётная ўсмешка — звычайнае ў людзей, між якімі няма варожасці.

Плашч даўно высах і матляўся на паветры з мёртвай лёгкасцю, і я падумаў, што яго будзе цяжка адпрасаваць і што жонка за гэтую маю бяспамятнасць не пахваліла б. Як яна там? Расстанне наша было невыразнае — без нечага вельмі істотнага, што пасля дазволіла б нам жыць са спакойнаю душою, упэўнена. Жонка адно спытала, чаму я без слёз яе праводжу, на што я адказаў: «Таму што гэты ад'езд абяцае нам шчасце сустрэчы — шчасце, якога мы зараз пазбаўлены». Яна бязрадасна ўсміхнулася, з трывогаю доўга глядзела на мяне. Што яе турбавала ў той момант? Ну, вядома, свае, чыста жаночыя, меркаванні і падазрэнні, а найперш, мусіць, тое, што там ёй, адной, без мужа, трэба браць на сябе ўсю адказнасць за роды і дзіця. Гэта — зразумела любой жанчыне, што аднойчы адчула ў сабе новы... чужы штуршок,— вялікая адказнасць.

## II

Я адчуваў у сабе незразумелыя пачуцці, праўдзівей — пачуцці зразумелыя; незразумела было, чаму яны так назойліва пачалі бунтаваць маю душу, тлуміць галаву. Ночы былі неспакойныя ад сноў, што змяняліся то прыемнымі (іх хацелася даўжэй бачыць), то

жахлівымі малюнкамі, якія я навучыўся абрываць, намагаючыся прачнуцца, і якія ўсё роўна рабілі сваё — увесь дзень хадзіў разбіты і стомлены.

Я пачаў часцей ездзіць у камандзіроўкі, знаходзячы ў іх збавенне, але — часовае. Як толькі жыццё выплывала на ціхі плёс, мне зноў чагосьці не ставала. Я баяўся прызнацца сабе, што вінавата ў гэтым вясна, якая здаўна, можа, з дзяцінства, была для мяне пара неспакойных роздумаў.

Здаецца, зіма знемагала разам са мною. Пяшчотна, нясмела бралася зелянець на пагурках трава. Уначы прайшоў дождж, і свежа, сыра было ў паветры і на зямлі. Тонка люстранелі на асфальце лужыны, вабячы да сябе першых шпакоў. З акна свайго пакоя я бачыў, як жанчына з мужчынам выбівалі ад пылу дыван; стары ў лыжным касцюме шкрэбаў граблямі па клумбе, і яна на вачах чарнела. Уверсе пад дахам заўзята і ўзбуджана чырыкалі вераб'і— мабыць, ладзілі гнёзды, збіраючыся выводзіць патомства. Па дарожцы, на якой я ўпершыню ўбачыў Андрэя, прабегла, неяк запаволена і мякка пераставуляючы ногі, чорная сучка з белымі, бы кавалачкі крэйды, вачыма і з адвіслым ды распёртым у бакі жыватом.

Мая туга была вялікая, цяжкая і святая, я не мог адрынуць ад сябе назойлівыя думкі пра любоў да людзей, прыроды, жанчыны, і ад таго многія радасці жыцця праходзілі міма мяне, не прыносячы асалоды, а толькі — хваляванне, ад якога ў скронях нездарова шумела кроў, хваравіта білася ў грудзях сэрца.

«Што і як там будзе?» — жывасілам пераносіў я думкі да цяжарнай жонкі.

Пачуццям патрэбна воля, імі з некім трэба дзяліцца. З кім? Так блізка і проста — Люба, гаспадыня. А што, калі пачаць запісваць свае думкі, адчуванні, назіранні? Я пачаў шукаць паперу, на аркушы ўбачыў запісанае жонкай — думка А. Платонава: «Любовь и привязанность к мужу или жене,— самое беспомощное, бедное и вечное чувство».

## III

### З запісаў Алеся Акуневіча

Седзячы каля акна, чытаю «Знак бяды». У спіну, патыліцу смаліць сонца, аддаючы сочнае, маладое цяпло. Яно, дарэчы, адагравае мяне, бо ад некаторых сцэн аповесці ледзянее сэрца.

Майстар забраў машынку з сабою і яшчэ не прынёс. А ў мяне ёсць што друкаваць. Іду і скарджуся Любе. Яна слухае, засяроджана вымазваючы начэпленым на відэлец хлебам смятану са сподка. А перад гэтым сумысля са мною павіталася — пакой быў адчынены,— каб паказаць, што яна ў лагодным настроі, добрая, прыязная.

— У мяне таксама гора,— гаворыць яна,— прапаў у пральні чахол на коўдру, у гарошак.

Мабыць, наводзіць на прапанову: давай з гора вып'ем. Яна ў тонкай блузцы і цеснай джынсавай спадніцы, акуратна прычасаная, з падведзенымі вачыма.

Я не падаю выгляду, што зразумеў яе. Іду ў свой пакой.

Яна ўключыла на ўсю моц магнітафон і, ходзячы па кватэры, падпявае тужлівую мелодыю:

Так не должно быть, но снова я взгляд твой ловлю
И понимаю, что все это глупо и странно.
Так не должно быть, но сердце стучит неустанно:
«Я люблю... Я люблю... Я люблю...»

* * *

Мяккае паветра дыхае ў расчыненую фортачку — цёплае, як з рота, з пахам пупышак, якія толькі набрынялі і тояць у сабе жывую ліпкую зелень.

Чую, што прыйшоў Андрэй,— і адразу Любін голас:

— Дзе сумка?

— У школе пакінуў.

— Чаму калені, штаны такія брудныя?

— Не ведаю.

— Што?

— Не ведаю.

— Колькі на цябе можна сварыцца?

— Не знаю! — У Андрэя голас зрываецца на крык, зласлівасць.— Што ты робіш?

Люба маўчыць — чуваць, што настройвае пласцінку.

— Чаму не ўзяў сумку?

— Не ведаю.

— Дзе тваё месца? Распранайся. Зараз лупцака дам.— Маўчанне.— Дзе гэта ты ў гразь залез, дзе гэта лазіць можна было? Здымай зараз жа чаравікі.

— Што ты на мяне лаешся?

— Я яшчэ не так буду лаяцца.

— Чаму?

— Зусім ужо сумленне згубіў. Дзе твая піжама? Упісаўся? Чаму пакінуў кашулю?

— Чаму ты на мяне лаешся?

— Ідзі ў ванную чысці чаравікі. Бяры тапачкі. Здымай брудныя шкарпэткі, гольф. Чаму сумку пакінуў, пытаю?

— Не ведаю.

А магнітафон ажно разрываецца — спявае пра каханне.

— Няма сілы ўжо! — Люба моцна грукае дзвярыма, ажно нешта скідваецца на падлогу.

Яе можна зразумець: пакрыўджаная жыццём. Як тут не пашкадаваць, не прынесці ёй хвіліны радасці, калі хоць на імгненне забываецца гора і верыцца, што ласка можа быць без прынукі, не па абавязку, а па жаданні.

Мне трэба ісці ў магазін. Люба мые ў ваннай. Андрэй гуляе ў пярэдняй з кубікамі.

— Прывітанне, Андрэй!

— Здласце.

— Як жывеш?

— Халашо.—І тут жа вопрамеццю кінуўся ў ванную да маці.— Дзядзя Алесь са мной павітаўся!

— Ну і што? — пачуў я Любін голас.

Стоячы каля вешалкі, перакладваю з курткі ў плашч (на вуліцы ўжо цёпла) паперы — праязны, запісачкі, каляндарык.

Андрэй выходзіць з ваннай.

— Ад каго пісьмо? — пытае.

— Гэта не пісьмо — дакументы.

— Вашы?

— Мае.

Не хочацца ў кватэру, і я доўга блукаю па вуліцы — як цяпер модна гаварыць, займаюся эстэтатэра-

піяй. Шпакі скубуць сухую леташнюю траву і носяць у шпакоўні.

Прыйшоў — дзверы замкнуты; калі, адамкнуўшы, зачыняў іх — ірванула з рук: балкон і фортачка на кухні былі расчыненыя, па кватэры гулялі скразнякі. Любы і Андрэя няма — некуды пайшлі.

Без іх сумна, як бы трошачкі чакаю, калі яны прыйдуць, прыслухоўваюся да галасоў на двары. Раней, здаецца, такога са мною не было, хіба што ў тыя часы, калі халасцякаваў. Уражанне, што ўсе нечым занятыя, а ты сумны і непрыкаяны. Выпадала быць з жанчынаю, а потым заставаўся адзін. Так і тут: жонка далёка, і як быццам яна не жонка, а палюбоўніца, выпадковая жанчына,— чакай, калі зноў нададзіцца з ёю быць. Жонка — гэта жанчына, якая заўсёды побач і па першым жа жаданні твая.

Мужчыну, здароваму і асабліва эмацыянальна павышанаму, увесь час патрэбна жанчына.

Але я адчуваю адказнасць ужо і перад *тым*, каго яшчэ няма і хто сніцца ледзь не кожную ноч, нават уяўляю па тых шматлікіх скрутачках, што возяць у калясках і носяць на руках надта цяпер, па вясне.

Шчасце чалавечае ўвогуле і шчасце імгнення. З апошняга можа вынікнуць першае.

У «Звяздзе» чытаю Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР «Аб узнагароджанні горада Магілёва ордэнам Айчыннай вайны I ступені»: «За мужнасць і стойкасць, праяўленыя працоўнымі горада ў гады Вялікай Айчыннай вайны, і за поспехі, дасягнутыя ў гаспадарчым і культурным будаўніцтве, узнагародзіць горад Магілёў ордэнам Айчыннай вайны I ступені».

Як яшчэ і цяпер, спагадзя трыццаць пяць гадоў, на сённяшняе шчасце лье святло гераізм народа ў вайне. Як напамінак — подзвіг вялікі.

Убачыў Любу і Андрэя ў акно. Яна — у бела-жоўтай блузцы, сіняй спадніцы, трымае ў руцэ гаспадарчую сумку. Ён — у балоневай куртачцы і белай вязанай шапачцы з бубончыкам.

Я стаяў у глыбіні пакоя і бачыў, як яна пільна ўглядалася ў маё акно.

Пастукаў у мае дзверы, зайшоў Андрэй.

— Вам паштоўка.

— Дзякуй, Андрэйка!

— Няма за што.

Павіншавала з Першамаем братава сям'я. Не забываюць...

Уключаю транзістар, лаўлю музыку — бадзёры, вар'яцкі рытм. На Захадзе з'явіўся новы стыль у музыцы — цяжкі рок. Аб'яўляюць: «Лепшыя творы ансамбля «Бі-Джыс».

Наступіў час вялікіх эмоцый, разгулу цывілізацыі. А каб нараджаць здаровых дзяцей, трэба быць бліжэй да прыроды і далей ад спакус гэтай цывілізацыі.

На жаль, кароткую асалоду часта даводзіцца аплачваць намнога даўжэйшымі пакутамі.

Каб пісаць, не трэба шмат умець, а толькі навучыцца растлумачваць сваё жыццё. Я — сведчу, разбярэцца час.

* * *

У Любы і праўда зачараванасць мадонны. Калі яна смяецца, усмешка як бы аддаляецца ад твару і лунае перад ім асобна — быццам хрустальная маска.

Уночы скрозь сон пачуў тупат — нехта хадзіў. Стала ціха. Я сунуўся ў клазет — там уключана святло і дзверы шчыльна зачынены. «Люба?» Вярнуўся ў пакой. Пачакаў. Ціха. Зноў туды. І — зноў назад. Потым рашыўся — нікога няма, мабыць, Андрэй хадзіў і не выключыў святла.

Уставала мяккая нядзельная раніца. На дварэ — відаць з акна — ні душы, хоць у будзень людзі ўжо снуюць у гэтую пару, як мурашы. Адно прабег у белым спартыўным касцюме тоўсты мужчына, крыклівакідкі на цёмным шэра-зялёным фоне зямлі. І два сабачкі, абодва нізенькія, з крывымі ножкамі, пратупацелі ўпобачкі, як запрэжаныя,— руды і чорны. На пятым паверсе блізкага дома, на балконе, вісела з дзесятак бюстгальтараў рознага — найбольш светлага — колеру.

Цёплым расцёртым лімонам выпроствала з-за смугі промні сонца.

Чалавек, памятлівы на дабро,— сам добры.

Рана. Прылёг яшчэ падрамаць, праўдзівей — падумаць.

Усталі Люба і Андрэй. Андрэй бегае, ляпае дзвярыма, гучна — як заўсёды — размаўляе.

— Цішэй, Андрэй! — суцішае Люба. Раней за ёй такога не прыкмячаў.

Іду ў ванную мыцца. Там Андрэй.

— Здароў, Андрэй!

— Здласце! — І, закруціўшы кран, бяжыць да маці на кухню, крычыць урачыстым голасам:

— Мамачка, я з дзядзем Алесем паздалоўкаўся!

— Правільна, малайчына! — сказала, каб чуў і я.

Заходжу на кухню, вітаюся з Любаю.

— Прывет! — адказвае мякка, прыязна.

Як жа добра мець такую гаспадыню!

* * *

Хадзіў на фільм «Мулен Руж» — пра цяжкае становішча мастака ў буржуазным грамадстве, пра тое, як яго шчырыя, светлыя памкненні разбіваюцца аб сцены маральнай дэградацыі.

Сіціў нудны дробненькі дождж, у якім людзі хадзілі без парасонаў. Цыганкі з цыгарэтамі ў роце стрымана-таемна выгукваюць: «Каму чаравікі, пакеты!»

Дзверы ў Любін пакой адчынены. Андрэй выглянуў на мае крокі і застыў, з цікаўнасцю гледзячы на мяне, мокрага. Люба ў кароткай суконцы, якую раней не надзявала, засцілае, нахіліўшыся, ложак, і я міжволі ўбачыў яе сытыя ружаватыя сцёгны.

Махануўся ў свае дзверы, забыўшы скінуць кручок, на які зашчэпліваў, калі адыходзіў.

* * *

Дабрата — гэта не значыць, што нельга абурацца. Жанчына без дабраты настолькі жанчына, наколькі дрэва без соку можа лічыцца дрэвам.

Акно — самы просты тэлевізар у свеце.

У блізкім доме вяселле. Людзі вывалілі на двор. Музыканты ўзвалаклі свае інструменты на брылёк ганка. Граюць славутае «Вяселле». Дзве маладзенькія дзяўчынкі каля іх смаляць цыгарэты.

* * *

Сёння зноў адгукнулася туга па халасцяцкіх гадах, але не было дамешку безвыходнасці. Я адчуваў цяпер

радасць, хоць і сумную на адзіноце, што час ідзе не ўпустую, а набліжае да дзіцяці. І гэты час, як бы ні хацеў, не скароціш, яго так ці інакш трэба пражыць — у радасці або ў суме.

Люба мые у ваннай: то журчыць пральная машына, то плюскоча вада, то чувацьІ, як пішчыць бялізна — выціскаецца.

А. Платонаў: «Вся любовь происходит из нужды и тоски; если бы человек ни в чем не нуждался и не тосковал, он никогда не полюбил бы другого человека».

Люба пасылае Андрэя ў магазін. Не рызыкуе даваць яму дваццацьпятку — драбязы няма. Прыйшла да мяне ў пакой.

— Алесь, у цябе рубель ёсць ці хоць бы восемдзесят капеек? — Стаяла перада мною ў расшпіленым знізу халаце, як бы наўмысна расцвельваючы шырокімі сцёгнамі.

Рубля ў мяне не было, я сашкрабаў з кішэняў капейкі. Люба глядзела на мяне, схіліўшы галаву, какетліва мружачы вочы. Яна не саромелася так глядзець, а значыць, не саромелася паказваць, што лёгка пойдзе мне насустрач. Зрэшты, яе можна зразумець. А што рабіць мне? Я не хацеў, каб нават у думках яна абзывала мяне хлапчуком: мужчыны — ганарліўцы.

Учынкамі можна кіраваць, думкам не забароніш: «Скажу ёй: буду проста так з табою, без любві і вялікай ласкі, адно каб заспакоіць плоць. Я не магу дзяліць сваю любоў, бо не ўмею крывадушнічаць».

Мужчына без крывадушнасці не папулярны ў жанчын, нават калі ён гусар.

«А што калі зацяжарыць? Ці, можа, нават знарок захоча панесці ад мяне. Мы з жонкаю не паспеем перабрацца, што тады? Раптам дзіця будзе падобна на мяне...»

Б'е пругка ў шыбы дождж. У двары натужна вые машына.

Люба ходзіць па кватэры і напявае пад пласцінку — так, каб чуў я. Іменна дзеля гэтага стараецца: «...И понимаю, что все это глупо и странно».

Уночы я прысніў сон, за які мне сорамна,— што я быў з Любаю. Прачнуўшыся, я адчуў дзікую тугу, ранейшыя думкі здаліся нікчэмнымі і непатрэбнымі



*Маці, убачыўшы мяне ў акно, выйшла на двор. Яна была ў цёплай пуховай хусце, якую калісь я купіў ёй з першай зарплаты.*

(«Светлы ручай любві»)

і проста дзіўна было, што ад спакус жанчыны цяжка ўтрымацца.

Раніцаю доўга ляжаў у ложку. Люба хадзіла ціха, не грукаючы дзвярыма, пацыквала на Андрэя.

Жанчына — гэта ўяўленне, і не больш.

* * *

Маленькае ЧП, якое не дае мне спакою,— мыючы бутэльку з-пад кефіру, разбіў гаспадынiну талерку, якую яна мае прывычку пакідаць у ракавіне.

Прыйшла Люба з работы, пытае не адчыняючы дзвярэй:

— Алесь, да мяне ніхто не прыходзіў?

— Не.

— Ты даўно дома?

— Так.

Па голасе чую: не ў гуморы. Ці варта зараз гаварыць пра разбітую талерку. Можа, яе пачынае раздражняць мая нерашучасць?

Няма настрою і ў мяне. Як там жонка? Заўтра буду званіць.

* * *

Люба чакае свайго былога мужа, Андрэй — бацьку. Яна прыбрала ў кватэры і наўмысна сышла ў магазін. На званок Андрэй адчыніў дзверы.

— Тата!

— Што, сын? — У словах і радасць, і холад, і шкадаванне, і разгубленасць.

Шчыра кажучы, я не зайздрошчу зараз яму, гэтаму незнаёмаму мне Міколу.

— Глядзі, што ў нас!..— Андрэй цягне бацьку да сябе ў пакой.— Тэлевізар каляровы, вось машынка заводная... Дзядзя Алесь купіў.

— Вы новага бацьку знайшлі? — сухавата прагучаў Міколаў голас.

— Не. Хадзі паказу! Хадзі...

— Не трэба.

Вяртаецца з магазіна Люба. Андрэй бяжыць да яе.

— Мамацька, тата плыйшоў! Тата плыйшоў, глядзі!..

— Выдатна! Прывет!

— Думаў, што замужам ужо, таму і не прыходзіў...

— Дамовіўся наконт санаторыя?

— Дамовіўся.

— Вось даведкі, аналізы.. З якога?

— З пятнаццатага чэрвеня. Можа, яму трэба што з адзення купіць?

— Не, не трэба,— з годнасцю адказвае Люба.— Як жывеш з новай жонкаю, усё-ткі яна ў цябе дачка намесніка міністра?

— Буду хваліцца — не паверыш.

— Каву, чай будзеш?

— Не. Пайду.

— Куды? — пытае Андрэй, і ў голасе чуецца расчараванне.

— Дадому.

— А ў цябе яшчэ ёсць дом?

— Андрэй, не прыставай да чалавека! — асадзіла сына Люба.

* * *

Перад маем. Прыходжу раней з работы. Дзверы незамкнёныя. Люба — у сваім пакоі, сядзіць на крэсле-ложку разваліўшыся, нейкая ўзбуджаная. Не дае зайсці мне да сябе, спыняе пытаннем:

— Як там Галя?

— Нармальна. Днямі званіў.

— Перадавай прывітанне.

— Добра.

Яна, здаецца, упершыню спытала, як маецца жонка.

— А грошы за кватэру ты мне калі будзеш аддаваць — цяпер ці пазней?

Я зразумеў, што ёй патрэбны грошы.

— Магу цяпер...

Прыходзіць з вуліцы Андрэй.

— Адгадайце, што ў мяне ў кулаку?

— Муха? — смяюся я.

— А вось і не. Зорачка акцябрацкая! — ажно ззяе ад шчасця Андрэй.

— Хто на ёй?

— Уладзімір Ільіч Ленін.

— А хто гэта?

— Наш правадыр.

— Малайчына!

Андрэй зрываецца і імчыцца да маці.

— Мяне дзядзя Алесь пахваліў!

* * *

Ура!!! У мяне — сын! Казак! Вось толькі што вярнуўся з пошты, званіў цешчы. Ну з кім мне падзяліцца радасцю і маім шчасцем? У мяне сынок — мой! Галюха, як ты там? Я хачу быць з табою, падтрымаць. Не ведаю, як мне перажыць такую радасць. Зараз зноў пабягу на пошту, званіць сваім бацькам у вёску, брату на Далёкі Усход. Не верыцца! Здаецца, усё гэта сон. Малайчына, мая Галюха любімая. Ты старалася, ты хацела нарадзіць мне сына. Якія мы шчаслівыя з табою! Няўжо гэта мы? Так, гэта — мы. Якое шчасце!.. Я не магу стрымаць слёз. Як я хачу быць зараз з табою, кожную секунду. Ты патрываеш пакуль без мяне, праўда ж? Ты ў мяне малайчына. Не веру, што з дзецьмі становіцца цяжэй жыць. Наадварот, радасна і шчасліва. Вось каб толькі апынуцца побач. Я хачу глянуць на вас дваіх — самых родных і блізкіх мне людзей. З цяжкасцю ўяўляю, як дачакаюся гэтага моманту. Я наогул не магу чакаць, а тут — такая радасць! Усё, імчуся на пошту...

* * *

Вельмі запозненая вясна. Усё яшчэ халаднаватае надвор'е. Дрэвы амаль голыя, толькі зеленаватая мроіўка.

Бегаючы званіць на пошту, па магазінах, мабыць, прастудзіўся — кашаль, пяршыць у горле. Сярэдзіна мая, называецца.

Купіў бутэльку сухога віна, каробку цукерак. Пасядзелі з Любай за сталом: я — радасны, яна — сумная.

Раніцаю, збіраючыся на працу, чуў у кватэры тонкі пах французскіх духоў.

Свяціла ў акно сонца, яркае, якога ўжо даўно не было. Празрыстая яснасць у паветры абяцала пагодлівы дзень. Нарэшце! Цікаў, заведзены ўчора, на стале будзільнік, напамінаючы, што час ідзе і мой сын расце.

* * *

Быў некалькі дзён у сына. Такі спакойны малы, ляжыць сабе з уражліва яснымі цёмна-сінімі вочкамі. Ужо два разы купалі — не пікнуў, толькі крэхча, як стары дзед. Галюха мая зусім звялася, змарнела, у вачах, кажа, успыхваюць іскрынкі. Вочы — проста жах глядзець — нават бялкі чырвоныя, як вішні. Якія ж болі яна перацярпела! Бедненькая, яе трэба шанаваць, берагчы... Куплю папяровыя падгузнікі і перадам аўтобусам.

Прыехаў — у кватэры вэрхал і ў маім пакоі такса-ма. Пясок, недакуркі. На кухні груда бутэлек. Увесь посуд згружаны ў ракавіну, і наша драцяная падстаўка пустая. Бачыў, на дзвярах пад'езда вісела аб'ява: «У сувязі з праверкай цеплацэнтралі з 15 па 22 мая не будзе гарачай вады».

Увечары, вярнуўшыся на кватэру, каля парога ўбачыў мужчынскія туфлі і руды саквояж. На кухні гаманілі. Пачуўшы стук дзвярэй, Люба выйшла, вясёлая, ружовенькая.

— Алесь, прабач, я посудам тваім карысталася. Гарачай вады не было...

— Калі ласка, што ж тут такога.

Мабыць, яна проста хацела паказаць сябе і паглядзець на мяне.

У рэдакцыі мяне павіншавалі з сынам, падаравалі кухонны набор і на дошцы напісалі страфу англійскага паэта-рамантыка Джона Кітса:

> Я славлю мира торжество,
> Довольство и достаток.
> Приятней сделать одного,
> Чем истребить десяток.

— Як жа сынок гадуецца? — спытала ў мяне Іва-шчэня, ціхмяна-сумная пасля мацерынай смерці.

— Ды во яшчэ імя не прыдумалі.

— Давайце збяромся ўсім калектывам ды прыдумаем.

— Я згодзен: такая цяжкая рэч — імя.

— Дзе ж ваша жонка, тут?

— Не, у маці сваёй.

Пачуўшы слова «маці», Івашчэня зажурылася яшчэ больш.

Не хочацца ісці на кватэру, хоць і разумею: па-

куль ёсць магчымасць, спакой, трэба працаваць, пісаць.

Я пазваніў сваііму сябру, у абком камсамола. Мы сустрэліся. Зайшлі ў папулярнае сярод моладзі кафэ «Рамонак».

— Я ж адразу адчуў, што Галя табе падыходзіць, і раіў яе табе. Бачыш, сына нарадзіла! — трохі захмялелы ад кактэйля, выхваляўся мой сябар.— Дзеці ў вас павінны быць на ўсе сто — зграбныя, прыгожыя... О! — адставіў вялікі палец.

— Адзінае, што зараз хачу,— сказаў я,— гэта апынуцца там, каля жонкі і сына.

Я і праўда не крывіў душою.

* * *

Зноў пайшлі халодныя дні. І лісце на дрэвах ніяк не развінецца, а без іх наваколле пустое, ад прасветлін, што бачацца скрозь напаўголыя галіны, вее сумам і асуджанасцю.

Вераб'і каля кустоў язміну падбіраюць пер'е, шматкі ваты — мабыць, уцяпляюць гнёзды, у якіх ужо вывеліся птушаняты. Такая доля бацькоў — апекаваць патомства, ужо народжанае на свет, і з не меншай клапатлівасцю — толькі закладзенае: птушкамі — у яйках, людзьмі і звярамі — у мацярынскім чэраве.

Хацеў у пятніцу паехаць зноў да жонкі і сына, але аб'явілі — партсход. Добра, што якраз пазваніла мне жонка і параіла ў суботу раніцаю выехаць за горад і сесці на спадарожную.

Прыйшоў увечары стомлены. Андрэй адразу:

— Да нас плыйдзе дзядзя Міша. Ён плывозіў нас дадому на чылвоным «Масквічы»... На «Масквічы» плывозіў. Да нас плыйдзе сёння...

Люба, відаць, дамовілася са сваім палюбоўнікам, думаючы, што я сёння паеду да жонкі. Здзівіўшыся, што я прыйшоў, яна спахмурнела, стала раздражнёная, раз за разам пакрыквала на Андрэя. Пайшла з кватэры, мабыць, пазваніла з аўтамата палюбоўніку, што сустрэча адмяняецца,— хутка вярнулася.

Павячэраў — ад снедання засталіся на патэльні два кавалачкі мяса; адчыніў даўно купленую бляшанку кансерваў «Кілька ў алеі з гароднінай», запіў кефірам.

* * *

Жонцы можна здрадзіць горш і больш, не маючы нічога з жанчынаю (а толькі думаць пра яе), чым мець блізкасць. Адзін няштатны аўтар-гумарыст расказваў у рэдакцыі: «Лашчу жанчыну, але не цалую яе. «Чаму ты мяне не цалуеш?» — пытае. «А як жа будзеш цалаваць, калі жонку цалую».

Нават самая недалёкая жанчына можа праявіць кемлівасць, калі даходзіць да здрады мужу.

* * *

Паспрачаўся з цесцем і цешчаю — у якой вадзе купаць малога, якую цеплыню трымаць у пакоі. У іх — вопыт, практыка, у нас з жонкаю — ісціны з дапаможнікаў маладым бацькам.

Прыехаў на спадарожнай позна. Люба, мабыць, не чула, бо раніцаю тыцнулася ў мой пакой — я ляжаў у ложку, але не спаў.

Яна пайшла на працу, тады я ўстаў. Бачу, памыты мой кухонны ручнік і нават адпрасаваны. Што гэта — знак увагі? Звычайная дэманстрацыя жаночай дабраты? А можа, выпадкова нечым забрудзіла ручнік, і тады ўжо недзе было дзецца.

У акно льецца ясная, сонечная раніца. Люба ў чорным скураным плашчы, з карычневай сумкаю на згібе локця, трошкі наструненай паходкаю, якая бывае ў тоўстых жанчын, пайшла на прыпынак.

Увечары прыйшла раней, чым звычайна. Неўзабаве званок у дзверы — і яе голас з кухні:

— Не замкнута!

— Прывітанне! — знаёмы мужчынскі голас — «дзядзя Міша» з чырвонага «Масквіча».

Бубнелі на кухні. Потым пайшлі ў пакой — і доўгая цішыня, дзіцячы, як ад шлакоткі, Любін смех.

Без слоў, моўчкі выпусціла мужчыну — шчоўкнуў ключ.

За акном — цемра. Гурчыць, заводзіцца машына. У пакоі душнавата — з-за халадоў пачалі грэць батарэі.

* * *

Нядзеля. Прачнуўся ад мужчынскага голасу. Зноў палюбоўнік? Не падобна: ходзіць надта смела і гучна, не асцерагаючыся, размаўляе.

Схадзіў у кіёск па газеты, адчыняю дзверы — і Андрэй тут як тут:

— Плыйшоў, плыйшоў!..— І махае мне, заве на кухню. Чую, там шыпіць электрабрытва. Заглянуў. Голіцца тоўсты высокі мужчына ў сінім трыко і зялёнай афіцэрскай кашулі. Падае мне руку:

— Віктар Пятровіч.

Андрэй да мяне:

— Гэта мой дзядуля.— І ўжо да дзеда: — Бачыш, які халошы дзядзя Алесь, з вусамі... Ён з вусамі. А ў вас няма кваталантаў?

— Няма. Ты — шчаслівы...— Усміхаецца. Цяпер бачу: у Любы — ягоная ўсмешка і паўната ягоная.

Няёмка пры незнаёмым чалавеку снедаць. Але — паставіў варыцца два яйкі, дастаў з халадзільніка маянэз, масла, з хлебніцы — падчарсцвелы батон.

— Я курэй накупляў,— кажа Віктар Пятровіч.

— Па два пяцьдзесят?

— Не, па два дваццаць пяць. Але добра, яны выпатрашаныя, без галоў. У нас у Вінніцы за такімі чэргі, а ў вас ляжаць... Я пахадзіў па магазінах ужо. Жыць можна. Дываны, хрусталь свабодна. Людзі харошыя вы, беларусы...

— Усе хваляць.

— Што праўда, то праўда. Я пакуру, можна? — адчыняе фортачку, садзіцца на табурэтку.

— Калі ласка.

— Халасцякуеш?

— Напалову.

— Там у цябе нехта нарадзіўся — дачка ці сын? Дзіўна чуць гэтае пытанне, ведаючы, што Люба яму ўсё расказала.

— Казак.

— Колькі яму?

— Яшчэ месяца няма.

— Жонка дзе працуе?

— На заводзе медпрэпаратаў.

— О, можна дэфіцытнымі лякарствамі гандляваць,— засмяяўся Віктар Пятровіч і пусціў у фортачку струмень дыму.

— Забараніў! — смяюся і я.

— А ты дзе робіш?

Маўчаць жа не будзеш, і Віктар Пятровіч пытаўся — абы гаварыць. А можа, хацеў праверыць, ці тое буду я гаварыць, што ён пачуў ад Любы.

— У рэдакцыі.

— Жонка далёка, як дабірацца туды, на чым?

Я адказаў і спытаў, як ехаць да Вінніцы. Перакусваў стоячы. Віктар Пятровіч падняўся.

— Можа, я заняў табурэтку?

— Не, сядзіце-сядзіце, я па-паходнаму,— супакоіў яго. Ён пачаў распытваць, падрабязна, нетаропка, як даехаць да аэрапорта. Чалавек ён быў грунтоўны, гаваркі, просты — тыповы адстаўнік.

Андрэй убачыў свой адбітак у нікеляваным чайніку.

— Глядзіце, дзядзя Алесь, я клывы! Чаму я клывы?

— Таму што чайнік круглы,— падказвае яму Віктар Пятровіч. Яму, відаць, прыемна з унукам.— Забяру Андрэя тыдні на два якіх... пакуль той санаторый... Няхай пабудзе ў нас, мы ж яго вырасцілі.

Мне цяпер здавалася, што няма большай радасці, чым радасць вучыць дзіцяці разумець свет.

* * *

У пакойчыку. Заходзіць Андрэй, гледзячы на мяне бліскучымі вачыма, асцярожна набліжаецца да стала. Рэзка тыцкае пальцам:

— Чый гэта гадзіннік?

— Мой.

— А гэта? — паказвае на будзільнік.

— Цёцін Галін.

— А як ваш тэлевізал называецца?

— «Нёман».

Адчынена тумбачка, на якой стаіць тэлевізар. Андрэй заўважае ў ёй пачак польскага пячэння, які ўсунула мне ў сумку жонка.

— Пачастуйце мяне, дзядзя Алесь.

— Частуйся.

Андрэй бярэ пячэнне. Падыходзіць, трасе маю руку і цалуе ў шчаку.

— Дзякуй! А можна ўключыць ваш тланзістал... тланзістал ваш? Токам не ўдалыць?

Я дазваляю. Ён націскае кнопку, круціць колца — трапляе на нейкую замежную радыёстанцыю. Ставіць каля мяне транзістар.

— Слухайце.— І радасны бяжыць да сваіх.— Мяне дзядзя Алесь пачаставаў пячэннем!

— Хто цябе туды зваў? — чуецца Любін голас.

— Мне дзядзя Алесь даў пячэнне! — з яшчэ большаю радасцю гаворыць Андрэй.

— Добра, еш.

Можа, праз хвіліны дзве зноў заходзіць.

— А я вас цукелкай пачастую...— кладзе на стол дзве шакаладныя цукеркі.

Неўзабаве — стук у дзверы. Думаю — Андрэй, пытаюся трохі ўжо незадаволена:

— Што хочаш?

Адчыняюцца дзверы — Віктар Пятровіч.

— А-а, гэта вы, прабачце... Думаў, Андрэй.

— Едзем. Шчасліва заставацца! — Падае руку, моцна цісне, прыязна глядзіць у вочы, як сыну.

— А вам шчасліва даехаць!

* * *

Надвор'е крута мяняецца. Учора — халадзіна, менш дзесяці градусаў, сёння — задуха. І зеляніна ўзялася адразу свежай, радаснай фарбаю. У лужынах, з краёў, па беражках, белыя пялёсткі вішань, якія раней за астатнюю садавіну зацвітаюць і хутка адцвітаюць.

На Камароўцы неахайна апранутая жанчына прадае хвалістых папугайчыкаў — блакітных, белых і салатава-зялёных.

— Сем рублёў штука! — гаварыла з такой інтанацыяй, быццам яе тавар богведама што.

Я зайшоў на рынак купіць кветак: заўтра прыязджае да мяне — праведаць — жонка.

Вечар, а Любы не чуваць. Няўжо і яна паехала ў адпачынак (збіралася), не папярэдзіўшы мяне? Але дарэмна я турбаваўся — прыйшла. Толькі позна.

Не адчыняючы дзвярэй, вітаюся і пытаю, ці можна аддаць ёй грошы за кватэру.

— Даўно чакаю,— адказвае, хоць я зацягнуў толькі на дзень.— Пяцьдзесят адзін рубель.

— А той раз?

— Здаецца, пяцьдзесят. Але ж тады я пазычала ў цябе семдзесят дзве капейкі. Якраз за электрыку, ты ж на колькі дзён адлучаўся...

— Дробязь! Лепш скажы: ты возьмеш нас на кватэру з дзіцём?

— Калі ласка, толькі на дзесяць рублёў больш.

— Ну што зробіш...

— Гэта нядорага. У мяне сяброўка на ўскраіне жыве і бярэ столькі. Магла б і менш узяць, калі б ты не быў дурны... Я думаю, што мы ўжыліся з вамі: вы не лезеце ў мае справы, я — у вашы. Канечне, Галцы з малым там летам лепш. Але... без жанчыны табе таксама сумна...

Яна была шчырая, гаварыла мне як дарасламу чалавеку. І гэта мне лесціла: яна не стала мяне менш паважаць, паказвала, што не трымае крыўды, згаджалася, што не мае права замахвацца на маю вернасць.

Я ведаю, адкуль у чалавеку дабрата,— яна бярэцца з сэрца. Я не ведаю, адкуль бярэцца чэрствасць?

* * *

Сёння была ў мяне жонка. Каханне да яе і любоў да свайго сына я не прамяняю ні на што. Гэты прыезд — вялікая жончына самаахвярнасць, калі хто яе не ацэніць — той мярзотнік. Калі хто ці што і разваліць маю сям'ю, то толькі не я і не мною зробленае. Галюха, ашчаджай гэтыя мае пачуцці да цябе, яны — першае і апошняе, на што здольны чалавек.

Жонка аднаго майго знаёмага ў сварцы сказала, што сын — не яго. Гэты мой знаёмы падаў заяву на развод. Я, даведаўшыся, паехаў да яго на кватэру і запэўніў, што сын выліты бацька, хоць ён і быў падобны больш на маці,— хацелася захаваць сям'ю. Сям'ю не захаваў — праз год яна ўсё-такі распалася.

Успомніў, як у кафэ «Рамонак» да мяне загаворвала маладая жанчына — чарнявая абхазка. Запомнілася, бо дала мне значна больш гадоў — узрост Хрыста, і яшчэ тым, што сказала: «У жанчыны — дзве святасці: сям'я, дзеці».

У сутыкненні, размовах з людзьмі мы спазнаём жыццёвыя ісціны.

* * *

Упершыню вылез загарацъ. Мяккая халаднаватая трава на тарфяніку. Нельга спакойна ляжаць — розныя павучкі ды казюлькі так і лезуць на цела, казычуць.

Загрымела. З усходу насоўваецца цёмна-сіняя, як не чорная хмара. На яе фоне бліскаюць белыя крышталіны кропель.

Ужо калі быў у кватэры — суха ляснуў пярун. Зашумеў густы дождж.

Запісаў у загсе сына, назвалі Максімам. Назіраў, як маладыя пары падавалі заявы на шлюб. Відаць, хто каго прывёў: ён яе ці яна яго. Адна радасным галасам: «А я трапіла пад такі лівень!..» — разумей: а ўсё-такі прыйшла. Другі сумным: «Ледзь кветак разжыўся...» — разумей: бачыш, як я цябе кахаю.

Думалася: шчаслівых шлюбаў няма, уся справа ў тым, хто што знойдзе ў ім.

Уразіла адна маладзенькая, цнатліва-сарамлівая дзяўчына з букетам цюльпанаў — вочы вялікія, сінія і... сумныя. Глядзяць на выбранніка тужліва, з такім сумненнем, быццам пытаюць: «Ну, ці можна табе даверыцца?» Як не плакала, запаўняючы і за сябе, і за яго паперы. Ён — маленькі, з бародкаю-клінком і рэдзенькімі вусікамі, кучаравы; увесь час трымаў яе сумку, упусціў, рассыпаў што ў ёй было. Дзяўчына сагнулася паднімаць, але ён апярэдзіў, адсунуў крэсла.

Пайшлі ў кабінет, падружоуленыя ад хвалявання, трохі збянтэжаныя. Забылі на заплямленым чарнілам стале свае цюльпаны.

«Дай вам бог шчасця!..»

У паветры — парната. І як адразу пахуча, свежа і бучна зазелянела ўсё вакол. Надта кусты акацый з жоўценькімі зорачкамі кветак.

Асфальт падсох, толькі каля бардзюраў мокра.

* * *

«Столькі перанесла гора, пакут, а колькі яшчэ наперадзе... І чаму б хоць на момант не забыцца на іх, знайсці радасць у ласцы з мужчынам?» — думаў іншы раз я, апраўдваючы Любу.

Да мяне прыехаў сваяк, пляменнік дзядзькі Сцяпана, прывёз дакументы ў медінстытут. Замахнуўся!

На стале ў нас бутэлька сухога віна. Зваў і раз і другі Любу — не хоча. На дыеце. Калі быў яе бацька, чатыры дні не піла і не ела, пакуль не стала блага. І цяпер — яшчэ дваццаць пяць дзён. Папрасіла толькі ў сваяка пару цыгарэт.

Гляджу — яна здорава пахудзела. Навошта, кажу, так марнаваць сябе? Жанчына павінна мець цела. «Трэба ж сачыць за сабою, каб некаму спадабацца»,— выадказвае. Пайшла, наструнена трымаючы паставу. Выраз у кофце быў і на спіне, адкрываў плечы — моцныя, гладкія, што дыня.

* * *

Андрэй зноў дома. Яму хутка ў санаторый. Без яго было сумна.

Не вылазіць з майго пакоя.

— А дзе цёця Галя?

— З сынком у маці сваёй.

— А вы адны? — гладзіць мяне па галаве.— Жаніцеся на маёй мамцы... Дзядзя Алесь, жаніцеся на маёй мамцы.

Люба пачула, зайшла ў пакой. Замахнулася на Андрэя.

— Зараз лупцака дам! Што ты трындзіш?

— Не чапай ты яго, Люба,— смяюся я.— Ён у цябе такі фантазёр! — І пацяшаюся з Андрэя: — Дык мы ж і так жанатыя.

— А вы ж не спіцё лазам,— хітра, проста з дзіўнай пранікліваспю глянуў на мяне.

— А што, трэба?

— Як далослыя... Як далослыя! — смяецца Андрэй і бяжыць хавацца ад маці.

— Во і гавары, што дурны,— сказала Люба так, каб ці не папікнуць мяне, што Андрэй нашу сітуацыю разумее лепш, чым я.

— Ён не дурны, а...— я, усхваляваны, не адразу знайшоў слова, якім ахарактарызаваць Андрэя.

— Нічога, вырасце, працаваць будзе... такія працуюць,— упэўнена сказала Люба, абнадзейваючы сябе, хоць — было відаць — радасці ў сваіх словах аніякай не знаходзіла.

— Мне здаецца, душа ў яго поўная любві...

— Ад маці...— Яна ўся аж затрапятала ад усмешкі. Божа, што гэта была за ўсмешка!.. Гэта — было сон-

ца. Сонца пяшчоты, удзячнасці, мілаты. У яго промнях хацелася стаяць, купацца, лунаць, грэцца. Няўжо я чэрствы, глухі, халодны, эгаістычны?

«Эгоизм — прочная основа целомудрия» (Флабэр).

* * *

Жанчына, якая не мае сям'і, ніколі не будзе адчуваць сябе шчаслівай, хоць ніколі і не губляе спадзеўку на шчасце.

Я глядзеў на Любу, на маленькі выпуклы фужэрчык у яе вачах, да сценак якога прыліплі белыя кропачкі пузыркоў. Мне было няёмка ў гэтую мінуту чытаць яе позірк, і я свядома засяроджваў увагу на фужэрчыку, а не на зрэнках.

— Андрэй пажаніў ужо нас... Што будзем рабіць? — цьмяна гаварыў, можа, хвілін праз дваццаць я, туманістымі вачыма гледзячы на Любу.

Яна палажыла на маё плячо руку. Я ніколі не адчуваў на сваім плячы па-сапраўднаму жаночую руку — я не буду яе апісваць: кожнаму жаноцкасць бачыцца па-свойму.

— Зрабі мяне шчаслівай, Алесь...

— Хіба я маг? — усміхнуўся я.

— Хоць і не маг, а магёш...— Яна абвіла мяне за шыю, шчыльна прытулілася гарачым тварам — уся цёплая, жывая, шчодрая.

...У яе целе была тая свабода, якая бывае ў дрэва, што расце на добрай глебе адзінока, не адчуваючы напору другіх дрэў.

* * *

Шукаць апраўданне сваім слабасцям — у гэтым сэнс чалавечага існавання.

Рабіць дабро, любіць — гэта не абавязак, а ўнутраная патрэбнасць.

У выхадны, калі жонка бярэцца мыць дзіцячыя полкі, паўзуны, кашулькі, я выкочваю каляску з сынам на вуліцу. Паставіць і сядзець на лаўцы чытаць, як некаторыя, не магу. Я памалу качу яе па вуліцы Горкага, аж да самай Свіслачы.

Ніцыя вербы па-над закаванаю ў шурпаты бетон Свіслаччу бязвольна звешвалі да зямлі жаўтлявыя гірлянды вузенькага лісця, якія ласкава пакалыхваў вецер.

# НІЗКІ ТОНУС

Глуха зазваніў будзільнік — быў за сценкаю, у жончыным пакоі, дый пачуў яго Ляшчэвіч скрозь сон. І, мабыць, гэта ўжо быў не сон, а ранішняя дрымота. Ляшчэвіч прачынаўся заўсёды раней, чым зазвоніць будзільнік, але не ўставаў; чакаў іменна званка. У гэтым ранішнім ляжанні ў ложку Ляшчэвіч, колькі і помніць сябе, адчуваў асалоду, пераадольваць якую было вельмі цяжка. Ён ужо няраз спрабаваў раніцаю бегаць, ды волі ў яго хапала не больш як на два тыдні. Якаянебудзь замінка ці лёгкая прастуда, ён ужо не мог прымусіць сябе рана ўстаць і бегчы ў калючы холад вуліцы. Зразумелая рэч, ён проста «не дабег» да таго стану, калі неадольна цягнула б бегаць, як курыльшчыка курыць,— чалавечы арганізм паддаецца толькі сістэме, штодзённаму насіллю над сабой. Адзінае, куды яму часцей хацелася хадзіць,— гэта сауна з басейнам. Прафсаюз «выбіў» некалькі бясплатных абанементаў, і адзін з іх дастаўся яму.

І сёння, адплюшчыўшы вочы, Ляшчэвіч падумаў: можа, пачаць бегаць? Высунуў з-пад коўдры голае плячо — у кватэры халаднавата, праз акно чуваць, як парыпвае пад нагамі ў людзей снег, звонка ляцяць у марозным паветры галасы. Трэба пачакаць, калі пацяплее.

— Сяргей, колькі часу? — пачуў ён жончын голас.

— Дык жа ў цябе будзільнік!

— Не відаць, цёмна.

І жонка не хацела ўставаць, пыталася пра час, каб яшчэ трохі папесціцца ў цёплым ложку. Божа, чаму чалавек аніяк не прывучыць сябе з ахвотаю ўставаць уранні? Ляжы не ляжы, а на працу трэба. Ляшчэвіч адкінуў коўдру, узяў з крэсла цяжкі махровы халат, апрануў яго, завязаў пояс. Унізе і зверху — чуваць было — тупалі ногі, шчоўкалі выключальнікі, плюскалася

вада... Гэта ж так рэзаніруюць сцены — не дом, а вялізны музычны інструмент. Які ён багаты і адмысловы, колькі ў ім нот, камедый і трагедый.

Мыўся-галіўся Ляшчэвіч вобміг — з пядаўняга часу ён стаў чысціць зубы ўвечары, перад сном: лепш ачысціць рот ад мікробаў, усякіх вірусаў-папірусаў, чым даваць ім на цэлую ноч волю; галіўся электрабрытваю, звычайнай «Масквою», што было і зручна, і хутка. Нават уяўляць, што трэба ўзбіваць пену, намыльвацца халодным памазком, скрэбціся лязом, потым вымываць прыбор — было мотаїшна, дый час на гэта патрэбен. Калі яны ёсць, дык чаму не пакарыстацца паслугамі цывілізацыі?

Выйшаўшы з ваннай, Ляшчэвіч убачыў, што жонка стаіць у калідорчыку перад вялікім авальным у драўлянай разьбяной аздобе люстрам і расплятае на галаве маленькія коскі — яны, лічыла, лепш кучаравілі валасы, чым бігудзі. Ляшчэвіч трохі пасмейваўся з гэтых косак — іх апошнім часам насілі негрытоскі. Мода такая, ці што, іначай што прымусіць разабраць шчыльную, бы лямец, гушчыню пруткіх, шорсткіх валасоў на дзесяткі тоненькіх, бы наканечнікі пугі, косак?

Дзверы ў залу былі адчынены, туды падала святло з калідорчыка, даставала да канапкі, на якой спаў сын,— вольна раскінуў за галавою ручкі, схіліў да пляча галаву, і нават вейка не падрыгвала на яго твары. «Спіць, бедны, учора позна лёг...» — пашкадаваў Ляшчэвіч сына.

— Будзеш раскатурхваць Славіка ці пойдзеш гатаваць сняданак? — спытала жонка.

— Сняданак...— сказаў Ляшчэвіч і, праходзячы міма жонкі, лёгка штурхануў яе. Яна глянула на яго гулліва.

На кухні калыхаліся фіранкі — хоць і заклеілі акно, аднекуль усё роўна сачыўся скразнячок. Тоненькая чырвоная нітачка ў тэрмометры за шклом паказвала «дваццаць восем». Уначы выпаў снег, імгліўся на дрэвах, зямлі, цьмяна адсвечвалі кузавы легкавікоў на двары. Сцежкі былі ўжо добра ўтоптаны, быццам і снег на іх не падаў. У доўгім дзевяціпавярховым доме-падкове, што бачыўся з кухоннага акна, як па дамоўленасці, плікалі адно за адным вокны — жоўтыя, зялёныя, сінія, ружовыя — пад колер штор. Ляшчэвіч

падкруціў настройку радыё — нанач заўсёды выключаў, каб не разбудзіла ў шэсць гадзін.

Жонка тармасіла сына. Ён не хацеў уставаць.

— Сяргей, ідзі ты! — гукнула жонка.

Ляшчэвіч падышоў незадаволены.

— Трэба, Каця, усё-ткі раз і назаўсёды пастанавіць: пасля першай калыханкі класці яго спаць.

— Самі вінаваты: адзін кладзе спаць, другі дазваляе гуляць.

— Я, здаецца, ніколі не лезу, калі ты займаешся ім.

— Ну, і што ў гэтым правільнага? Трэба разам выхоўваць...

— Ага, ты за адну руку, я — за другую?

Даказваючы адно аднаму, як трэба выхоўваць сына, яны так-сяк паднялі яго. Ён сядзеў сонны, не мог падняць павечкі, галава яго матлялася, як агурок на мяккім хвосціку, хілілася то да левага пляча, то да правага.

— На, кашулю надзявай... во калготкі.— Жонка падала яму кашульку, калготкі, вязаную баваўняную паддзёўку.

Ляшчэвіч зноў пайшоў на кухню.

Жонка ўранні амаль нічога не ела — толькі піла каву ці чай; калі была салата з гародніны — ела; апошнім часам яе ўлюбёнай ядою стала капуста — вычытала ў аднаго вядомага акадэміка: набівайце свае страўнікі капустаю. І вітамінаў шмат, і папраўкі не дае. Жонка ледзь не стала спяцом па капусце, асабліва навучылася яе квасіць. Жончыну квашаную капусту хвалілі і госці, і суседзі, і прыезджыя сваякі, і на рабоце, куды яна яе насіла. Іншы раз Ляшчэвіч думаў, што людзі, мабыць, трохі фальшывяць: ну як тут не пахваліць гаспадыню, калі яна носіцца з гэтай капустаю, як з пісанай торбай.

— Дыета не скончылася? — усмешліва спытаў у жонкі Ляшчэвіч, калі яна зайшла на кухню з сынам.— Бо я не буду тады на тваю долю рабіць бутэрброды.

— Мне толькі каву... без цукру.

— Хачу піць,— папрасіў сын і тузануў бацьку за канец пояса.

— Што табе: грыба, бярозавіку ці каліны?

— Грыба,— не раздумваючы, адказаў сын.

Так здарылася, што на стале ў Ляшчэвічаў аказа-

лася тры шкляныя слоікі — цэлы выбар напіткаў. У адным — чайны грыб, цёмны, рэзкі напітак; у другім — таксама грыб, толькі японскі, а называлі яго бярозавікам за сіваваты колер і за смак, блізкі да бярозавага соку; у трэцім слоіку быў настой каліны — на лістападаўскія святы Ляшчэвіч ездзіў да бацькоў у вёску і прывёз адтуль цэлафанавы мяшэчак каліны — ураджай з ім жа самім калісь пасаджаных кустоў. Але сын упадабаў толькі грыб, хоць па смаку, здавалася, ён быў не лепшы. Ляшчэвіч наліў яму ў шклянку — напітак засіпеў, запырскаўся, як шыпучка.

— Дзякуй! — сказаў сын і паставіў на стол пустую шклянку. Апранаў футра і надзяваў шапку сыну заўсёды Ляшчэвіч, лёгенька выштурхоўваў за дзверы — быццам даваў гэтым малому зарад бадзёрасці і смеласці, так неабходных у жыцці ў любым узросце. Сад быў за вуглом дома, і сын гадоў з чатырох хадзіў у яго сам, гэта была палёгка — не трэба раней часу апранацца, адводзіць у сад, а потым вяртацца. Для раніцы — эканомія часу вялікая.

Радыё прапікала восем разоў. Трэба выходзіць. Жонка праз гэту сваю прычоску не зможа сёння з ім пайсці. Чакаць яе няма калі — спознішся на працу. Ляшчэвіч нікуды і ніколі не любіў спазняцца, а цяпер і пагатоў — новы загадчык аддзела Марускоў «ганяў» за дысцыпліну. Здаецца, нічога лішняга ён не патрабаваў, але ўсё роўна людзі шапталіся, асуджаючы яго і добрым словам успамінаючы ранейшага загадчыка, які так і не змог ачуцца пасля інфаркту, пайшоў на пенсію. Дзіўна, адны інфарктнікі становяцца ў строй, працуюць як ні ў чым не бывала, а другая — інваліды.

— Я пайду, не буду цябе чакаць...

— Ідзі.— Жонка за сталом, за якім толькі што пілі каву, падмалёўвала тоненька саструганай запалкаю вейкі.— Абавязкова купі ёлку.

— Забірай малога, а я пасля работы зайду на Камароўку.

Жонка хмыкнула: «Якое «забірай»?» Яна, і Ляшчэвіч гэта ведае, ідзе сёння на навагодні агеньчык — так яны вырашылі, бо сёння ж такі агеньчык і ў Ляшчэвіча. Ляшчэвічу на ім край трэба быць, бо ён старшыня культмасавай камісіі мясцкома, але яму не хацелася ісці. Спачатку шмат было жадаючых, а потым, лічы, усе адсеяліся: знайшлі сто прычын, каб не пай-

сці. Адзін пажылы мужчына сказаў: «Я не алкаголік, але не ўяўляю, што можна рабіць на вечары, што гаварыць за столікам, калі няма спіртнога. Нешта надламала ў псіхалогіі гэтая забарона спіртнога на ўрачыстасцях...»

Нават калі і было б спіртное, Ляшчэвіч усё роўна не пайшоў бы на вечар. Шкада было часу, а толку ніякага: тыя ж людзі, словы, усмешкі, размовы толькі пра работу. Нехта пажартаваў: «Можа, прыхапіць з сабою парачку стандартаў ды абмеркаваць там...» Вольныя вечары... Не так часта выпадае засяродзіцца, нешта запісаць, проста памарыць. Сын цяпер мала патрабаваў да сябе ўвагі, сам апранаўся, распранаўся, хадзіў у туалет, піў і нават еў.

Раніца была марозная, сухая — пякучае, быццам насычанае тоненькімі льдзінкамі-іголкамі паветра пекануло за шчокі, каляна, як спіцамі, палезла ў нос. Было цемнавата і яшчэ гарэлі ліхтары, іх неонавае блакітнае святло быццам сеяла яшчэ большы холад. Ляшчэвіч падняў каўнер дублёнкі, адчуў шчокамі і вушамі, як прыемна, мякка аблёг ворс. Завываючы, набіралі скорасць тралейбусы, мякка затармоджвалі на прыпынках аўтобусы, праносіліся легкавікі. Людзі расцякаліся па заводах, фабрыках, установах. А каторыя — і яны дзівілі больш за ўсё — займаліся ў гэты час сабою: прабягалі ў спартыўных куртачках і вязаных шапачках з калматымі пампонамі, выводзілі на павадку сабак, спяшаліся з венікам пад пахаю на першы дух у лазню. Хтосьці кінуў на снег недакурак, і ён свяціў яркаю калінавай жарынкаю — падзьмуў ветрык, выбіў некалькі іскрынак і панёс іх цераз дарогу, як мініяцюрныя «стопсігнальчыкі».

Людзей на прыпынку было небагата — часта падыходзілі тралейбусы і аўтобусы, але ўсё роўна яны былі напханыя людзьмі. Ляшчэвіч убіўся ў заднія дзверы, яго заціснула — не паварушыцца. Трэба пракампасціраваць талон, але як залезці рукою ў кішэню? Можна і ў чужую лучыць. «Пачакаю, пакуль разгрузіцца трохі...»

Калі ў тралейбусе павальнела, ён ужо забыўся пра талон, бо на ранейшыя месяцы браў праязны (на гэты нейк не змог, не паспеў у першыя дні, адале не было сэнсу), і прывычка ўзяла сваё. Неўзабаве, блізка да канцавога прыпынку, у тралейбусе зусім стала вольна,

нават вызвалілася пару месц. І акурат каля яго. Хацеў быў сесці, але падумаў: усё роўна давядзецца ўставаць, калі зайдзе жанчына ці пажылы чалавек. Трымаўся за нікеляваны поручань — холад яго адчуваўся далонню нават скрозь вязаную пальчатку. Людзі былі хмурныя, маўклівыя — і ад холаду, і ад таго, што не выспаліся як след, і ад таго, што некага чакалі непрыемнасці на працы, злы, дэспатычны начальнік.

— Таварышы, талончыкі! — раптам пачуў ён блізка ад сябе. Замітусіўся, шукаючы пад дублёнкаю маленькі нагрудны кішэньчык на пінжаку, але было позна.— Прад'явіце, калі ласка, ваш праязны дакумент,— звярнуўся да яго малады высокі мужчына-кантралёр з павязкаю на рукаве і бляшаным знакам у руцэ.

— Прабачце, я забыў... толькі што хацеў прабіць,— пачаў апраўдвацца Ляшчэвіч, адчуваючы, як ад халоднага поручня пабег раптам па яго руцэ гарачы ток, заліў усяго з ног да галавы.

— Усе вы забываецеся, калі трэба плаціць са сваёй кішэні, зарплату атрымаць не забудзеце... Падрыхтуйце штраф! — У мужчыны быў дзіўна нерухомы твар, спакойны позірк, якія зусім не стасаваліся з яго грубаватым голасам.

«Фу, чорт!..» — ажно скрыпнуў зубамі Ляшчэвіч, хуценька выняў з партманета два рублі і, глянуўшы вакол сябе, сунуў іх кантралёру. Не стаў чакаць, пакуль той адарве квіток. Навошта каб ён, гэты квіток, зафіксаваны ў мазгах, яшчэ нейкі час псаваў настрой.

Ён пайшоў напраскі, задворкамі — пацягнула са святла, ад людзей у зацемкі, быццам кожны мог заўважыць па ім і тыцнуць пальцам: «Глядзіце, ён — несумленны чалавек!» Тоўстая цётка ў доўгім ватнім паліто, абвязаная на паясніцы рудою шарсцяною хустаю, як у вёсцы, расчышчала дарожку шырокай фанернай лапатаю. Высока ў небе самалёт мігаў чырвонай маленькай, бы каліна, лямпачкаю. З аркі Ляшчэвіч вынырнуў на вуліцу. Па адзін бок яе (на якім быў Ляшчэвіч) стаялі каштаны — аб'інелыя, яны быццам расплавіліся ў паветры, не былі відаць; па другі бок — шчыты, усе аднолькава белыя ад інею. Мяўкаў кот — сядзеў пухнаты, натапыраны, у тэлефоннай будцы, на якой ляжала тоўстая падушка снегу. «Не надта пагрэешся ты ў гэтым сховішчы»,— пашкадаваў ката Ля-

шчэвіч і ўздыхнуў. Востра чуўся ў паветры цвярозлівы на марозе пах спаленага бензіну.

У непрыемных думак доўгі ланцужок, адны выкрасаюць другія, дробяцца, як тыя іскрынкі з недакурка, разлятаюцца ў розных кірунках, шукаюць сабе завязь у непрыемнасцях і гарчэчы. Тое, што заспелі «зайцам», сапсавала настрой, і да будынка свайго інстытута Ляшчэвіч падыходзіў без радасці. Дзіўна было бачыць, як у яго шкляныя дзверы бадзёра, лёгенька ўскоквалі людзі. Работу сваю — інжынера-канструктара аддзела тэхналогіі і механізацыі вытворчасці — Ляшчэвіч любіў, можа, нават залішне быў аддадзены ёй, але задавальнення ад яе атрымліваў не багата. Ужо каторы год ён на гэтай пасадзе, вычарпаў яе да дна, і яна не наталяла смагу натхнення: колькі ні нагінай пусты кубак, дык не нап'ешся. Стараўся, працаваў, уносіў прапановы, супрацоўнікі і жартам і ўсур'ёз сцвярджалі, што па ім сумуе месца не ніжэй дырэктара завода, але ад іх нічога не залежала, залежала ад начальства, а яно маўчала, не прыкмячала яго, і ён губляўся, як бы размываўся на аднастайным фоне дваццаці супрацоўнікаў. Ранейшы загадчык аддзела, як кажуць, браў усё на сябе, падмяняў нярэдка і проста інжынера, і старшага, і начальніка групы,— мабыць, гэтым хацеў надаць сабе аўтарытэту, паказаць, што поспех залежыць толькі ад яго,— і не вытрымала ў небаракі сэрца... Новы загадчык быў малады, каля сарака гадоў, прыйшоў сюды з Саўміна. Па натуры энергічны, халерычнага складу, але, здаецца, ці не напінаецца трошкі ён, калі ў любой дробязі выстаўляе сябе тыпам дзелавога сучаснага чалавека. Гэта не ад патрэбы душы, думаў Ляшчэвіч, гэта ад кар'ерысцкіх замашак. Ляшчэвіч аніяк не можа прынаравіцца да яго, зразумець, каб паводзіць сябе спакойна. Таму паміж імі нейкая дзіўная блытаніна: Ляшчэвіч жартуе, той робіць сур'ёзную міну, але вочы выдаюць, што душа смяецца; Ляшчэвіч прыходзіць з дзелавою прапановаю —загадчык хітра пасміхаецца, і тады Ляшчэвічу становіцца зразумела, што той не хоча нічога гаварыць, каб не выявіць сваю недасведчанасць, і прыкідваецца гэтакім глыбакадумным мэтрам. Як гэта, мабыць, цяжка ўвесь час выдаваць сябе не за таго, кім ты ёсць! Але ж калі ты дурань, дык гэтага не схаваеш, як нічога не схавае ад людзей і твайго розуму.

Каля ліфта сабраўся ўжо натоўп; Ляшчэвіч прыкінуў — больш пяці чалавек, яны зойдуць, астатнія будуць чакаць, пакуль ліфт спусціцца зноў. «Пайду пехатою, шосты паверх — не так і высока,— вырашыў ён.— Так мала рухаемся. Гіпадынамія, гіпадынамія...» Не высока і ён не стары, а сэрца забілася, заскакала ў грудзях. «Трэба ўсё-ткі пачаць бегаць,— падумаў ён з трывогаю.— Неадкладна... Заўтра ж!»

У аддзеле было ўжо некалькі чалавек, быў Косця Бірукоў, але Таня Саўкова, яго суседка па стале і па кульмане, яшчэ не прыйшла. Яна заўсёды спазняецца — двое дзяцей, пакуль адправіць у школу і сад, мужу сняданак згатуе. Ён у яе мастак, быт, «дробны бытік», як ён кажа, яго зусім не турбуе, вось і бегае жонка, цягне двайную нагрузку ды пацвярджае такім чынам свае права на эмансіпіраваную жанчыну.

Ляшчэвіч распрануўся і сеў за стол. Супрацоўнікі гаварылі пра суровую зіму, мароз, якіх даўнавата не ведала Беларусь, нехта пачуў па праграме «Час», што тэмпература цяпер на пятнаццаць градусаў ніжэй нормы.

— Лепш марозы, чым якая-небудзь слота,— уставіў ён сваіх пяць капеек. Але ахвоты дыскутаваць, спрачацца ў яго не было. На кульмане з учарашняга дня застаўся ватман з чатырма вочкамі кнопак на ражках — яго праект шкляных труб для Нясвіжскага біяхімічнага завода. Чэрціць, чэрціць, а толку мала, праўдзівей, яму самому толк бачыцца, не бачаць яго іншыя, той жа дырэктар завода... На мінулым тыдні яны з Саўковай ездзілі ў камандзіроўку ў Нясвіж. Дырэктар, сыценькі, тоўсценькі, з вузенькімі жывымі вочкамі, якія мянялі свой выраз кожнае імгненне — то станавіліся масляна-лагоднымі, добрымі, то злымі і калючымі, як не пратыкалі,— і слухаць не захацеў пра шкляныя трубы: «Добра служаць жалезныя — нашто ламаць?» Шкадаваў бы Ляшчэвіч аб гэтай сваёй камандзіроўцы, калі б не хадзілі яны з Саўковай у Радзівілаў замак. Гэтая Саўкова ведае больш, чым экскурсавод,— і пра архітэктуру, і пра іканапіс. Мабыць, наслухалася ад мужа. Столькі расказала і пра архітэктараў Бернардоні, Крыгера, Лутніцкага, і пра мастакоў Хескі, Бланка, Фульхса, і яшчэ пра многае іншае. У нейкае зачараванае імгненне ў Ляшчэвіча мільгнула думка: закахацца б у яе, гэтую рухавую, чарнавокую,

надзіва шчырую і простую ў абыходжанні з людзьмі Танечку. Здаецца, яна ўжо даўно таксама неабыякавая да яго і ў камандзіроўку, мабыць, напрасілася не так сабе — з такім мужам ды з двума дзецьмі.

Піснула ручка ў дзвярах — зайшла Саўкова, у сіванькім заношаным паліто, чорных замшавых ботах. Мабыць, не вельмі цешыць яе мастак грашыма. Расчырванелая, уся як бы накрухмаленая, вочы яркія, порсткія. Яна павесіла паліто ў шафу; ідучы да стала, усмешкаю павіталася з ім, Ляшчэвічам. Нахілілася, пачала здымаць боты, каб надзець тапкі,— і скрыганне замка-маланкі нейк незразумела, таемна хвалявала, быццам перад гэтым была між імі змова, згода на інтымнае жыццё. Яна прычасалася без люстэрка, абцягнула паласатую з шырокімі рукавамі вязаную кофту, туга напяўшы яе на грудзях.

— Што, Сярожа, задуменны? Пакутуеш усё над сваімі геніяльнымі праектамі? — спытала ў Ляшчэвіча, калі села за свой стол.

— Ці толькі над праектамі! — кісла ўсміхнуўся ён.

— Палюбоўніцу завёў? — Саўкова іншы раз проста ўражвала сваёю нязмушанасцю і ў словах, і ва ўчынках.

— Можа б, ты адказала мне на гэтае пытанне?

Саўкова зразумела намёк, засмяялася нейк даверліва, зычліва, і ад гэтай яе раскаванасці ў Ляшчэвіча адразу пахарашэла на душы. «Жанчыны! Усміхайцеся мужчынам, гэта ўплывае на прадукцыйнасць працы»,— успомніў ён словы, якія вычытаў учора ў навагодняй насценнай газеце і палічыў проста бязглуздым жартам, а сёння зразумеў, што яны і праўда маюць сэнс, а яшчэ большы сэнс набудуць, калі словы «жанчыны» і «мужчыны» памяняць месцамі. Пра што толькі не падумаецца ў перадновагоднія дні! Ляшчэвіч з алоўкам у руцэ падышоў да кульмана.

— Не, жарты жартамі, а я прарочу табе, Сярожа, вялікую будучыню,— сказала ўжо, здаецца, сур'ёзным голасам Саўкова і таксама падышла да свайго кульмана, але забыла аловак і вярнулася да стала. Калі шчыра, дык адна яна і прызнавала здольнасці Ляшчэвіча, узносіла яго да нябёс. І радасна, і крыўдна.

— Калі б ад цябе залежала мая кар'ера, то не сумняваюся,— усміхнуўся Ляшчэвіч (ён забыў ужо на не-

прыемнасць з талонам), радуючыся, што свята Новага года хоць жартамі, але ўваходзіць і ў яго душу.

— Усё роўна, ты ж цягнеш увесь наш аддзел... Ледзь што, якая замінка — ідуць да цябе. У душы ўсе прызнаюць, а на справе, афіцыйна — слова ніхто добрага не скажа.

— Гэта — праўда, нядаўна ў ваенкамат характарыстыку запатрабавалі, дык Марускоў напісаў: «працуе не горш астатніх...» І знайшоў жа фармуліровачку.

— Перабольшваеш! — шчыра, з трапятлівай працікнёнасцю ў голасе сказаў ён.

— Не скромнічай. Толькі як вырасцеш да міністра мікрабіялогіі не забудзь мяне... тую, хто першая ацаніла твае магчымасці.

— Не забуду,— паабяцаў Ляшчэвіч, зноў са шчырасцю ў голасе. Чорт, нават калі ўсё гэта і не так, дык усё роўна прыемна. Гэта адно здаецца, што чалавеку шмат трэба, што ён жыве нібыта глабальнымі памкненнямі. Проста любая дробязь — для чалавека значная. Мы думаем, што гэта дробязь, а яна ламае, мяняе чалавеку жыццё. Закаханыя вочы — можна палічыць за дробязь, а калі яны ёсць ды яшчэ глядзяць на цябе — гэта шчасце; табе начальнік сказаў добрае слова — і ты гатовы ўвесь дзень спяваць песні; ты хутка сеў на аўтобус — і табе прыемна на душы; у магазіне, у які зайшоў, няма чаргі,— і ногі твае самі нясуць... Дык што дробязі і што глабальнае?

Ледзь не да абеду Ляшчэвіч, не адыходзячы, чараваў каля кульмана; супраціўлялася, не давалася ягонай задуме злучэнне трубы з чанам; у чана былі кароткія ножкі, а трубу трэба выгінаць каля самага нізу, і гэта нязручна, яе можна разбіць, за што і ўхапіўся дырэктар завода; у любой творчасці тупіку не бывае, у гэтым упэўніваўся няраз Ляшчэвіч і таму ўпарта шукаў выйсця — ці падвышаць чан, ці намячаць іншае месца для адтуліны. Канструкцыю ж абсталявання не хацелася мяняць, яна, здаецца, была аптымальная, кампактная.

Нечакана яго выклікаў да сябе Марускоў. Калі Ляшчэвіч зайшоў, той сядзеў і размаўляў з некім па тэлефоне — іх у яго збоку на нізкаватай чорнага дрэва тумбачцы стаяла ажно тры: адзін — звычайны — унутраны, другі як сувенірны, зроблены на даўнейшы манер, і трэці кнопачны. Ляшчэвіч падышоў да стала,

не ведаў, ці то садзіцца, ці стаяць, чакаць запрашэння. Можа, хвіліны праз дзве Марускоў паказаў на крэсла.«Не ўсё адразу, Піліп Іванавіч,— адказваў ён некаму, мабыць, вышэйшаму за сябе начальніку, угодніцкім голасам,— гэты квартал... ведаеце, а той будзе выкананы». Ляшчэвіч адчуў, што пры гэтай размове яму лепш бы не прысутнічаць, нават мільгнула думка выйсці, але Марускоў палажыў трубку — няўдала, яна запікала, і ён паправіў.

— Я выклікаў цябе (ранейшы загадчык, чалавек сталага веку, называў Ляшчэвіча на «вы», ды нават калі б і не называў, то ўсё роўна, калі начальнік кажа падначаленаму «ты» — гэта непрыемна) з-за вашай справаздачы...

— «Вашай» — маёй ці нашай з Саўковай? — падкусіў Ляшчэвіч, не могучы пераадолець у сабе абурэння ад начальніцкай фанабэрыі.

— Вашай з Саўковай.— Марускоў пранікліва глянуў на Ляшчэвіча.

— А што такое? — Ляшчэвіч, наколькі ўдавалася, трымаўся спакойна.

— Выходзіць, толькі ты за прагрэс, за перабудову, а ўсе на заводзе тупачы, дагматы?

— Я канкрэтна ўказваю дырэктара.

— Хм, дырэктара...— хмыкнуў Марускоў і трохі памаўчаў.— Ты ж ведаеш, што біяхімічны завод — пераходны сцяг заваяваў за радавое прадпрыемства, вынікі мінулага года.

— Часам перадавік той, хто лепш паказчыкі падтасаваць можа, раздуць... Хіба не так? Але я ў дадзеным выпадку не пра гэта...

— Ну, слухаю, слухаю...— Марускоў як бы адхіснуўся, ямчэй усеўся ў крэсла — паказваў, што гатовы ўважліва слухаць. Калі шчыра, яму і сапраўды цікава было паслухаць чалавека, які не глядзеў у рот і стараўся сказаць нешта з асабістых меркаванняў, разваг.

— Мне здаецца...— выразна вымаўляючы кожнае слова, стрымліваючы сябе, каб не распаліцца і не нагаварыць лухты ці зблытаць свае думкі, пачаў Ляшчэвіч.— Мне здаецца, што жалезныя трубы на біяхімічных заводах пара замяніць на шкляныя.

— Якія ў цябе довады? — У кожнае слова, у тон гаворкі Марускоў намагаўся ўкласці важкасць, надаць ім недасягальную вышыню.

— Першы: больш прыстасаваныя іменна для вадкасцей...

— Мала гэтага,— захоўваючы спакойны, абыякавы тон, сказаў Марускоў.

— Эканомія металу, пра якую так шмат гавораць.

Марускоў прамаўчаў.

— І — самае галоўнае. Новы прэпарат... «Баліз-2», які прайшоў апрабацыю і даказаў сваю эфектыўнасць, як-ніяк лякарства... хоць і для жывёлы.

— Ну і што? — Марускоў ведаў, што пытанні, нават бязглуздыя, сеюць у апанента сумненні.

— Яно, гэтае лякарства, цячэ ў метале... А раптам яно ўступае з ім у рэакцыю?

— Не нам пра гэта думаць! — безапеляцыйна адрэзаў Марускоў і, выпнуўшы грудзі, паправіў пад пінжаком падцяжкі.— Перапішыце справаздачу. Заўтра далажыць!

«І гэта ж не метад кіраўніцтва...» — падумаў з горыччу Ляшчэвіч, выйшаўшы з кабінета. А падтрымаў бы яго загадчык, сказаў бы тое, што пачуў ён, Ляшчэвіч, ад Саўковай — здаецца, са скуры вылузнуўся б, а працаваў бы за дзесяцёх, не бярог сябе. Але, але, начальнікі сабе наўме: пахвалі — і праўда зазнаецца, заганарыцца, паспрабуй тады зладзь з такім. Лепей пад прэсам трымаць, скоўваць, тыцкаць носам у пралікі. Чаго іншага не даб'ешся, але пакорнасці, паслушэнства даб'ешся. А калі добра націснуць — то і падхалімажу.

Глянуў на гадзіннік: «12.45» — час абеду. У аддзеле нікога ўжо не было. Пазней ні на мінуту ніхто не засядзіцца. Работнічкі! Ён пастаяў перад акном, паглядзеў на снег, на вуліцу з ніткамі тралейбусных ліній. Здаецца, мароз адлёг — запацелі шыбы, буйныя кроплі цяклі па іх як празрыстыя божыя кароўкі. Іх сталовая, што была ўнізе, на першым паверсе, ужо другі месяц не працуе — рамонт, і абедаць хадзілі хто куды. Ляшчэвіч аблюбаваў кафетэрый — шкляны павільёнчык на старой Нямізе.

Ён апрануўся і выйшаў на вуліцу. І праўда, надвор'е памякчэла, пахла вільгаццю. Снегу на тратуары было шмат, ляжаў пухнаты, мяккі і сыры — не рассыпаўся, а збіваўся пад нагамі ў камячкі, шчыльна ляпіўся на мысы ботаў. На праезнай частцы быў ён зусім брудны, жоўты, а мясцінамі як не чорны. Лёгкія, ня-

чутныя сняжынкі ляцелі з асвечанага бляклым зімовым сонцам неба, калючымі пылінкамі ліплі да твару.

Мінуўшы тэатр оперы і балета, каля якога ў белай снежнай кепачцы стаяла на пастаменце бронзавая фігура Максіма Багдановіча, ён звярнуў улева і спусціўся па абледзянелых прыступках да Свіслачы. Каля моста ў чорнай прамыіне лёду плавалі дзве дзікія качкі. На сінім набрынялым вадою снезе былі відаць іх шырокія, як сподкі, сляды. Ляшчэвіч угледзеўся ў іх, як раптам пачуў бомканне: дзілінь-бом-м-бл, дзілінь-бом-м-бл... Гукі былі незвычайныя, новыя, нячутыя ім раней, і ён спыніўся, глянуў уперад — адкуль ляцелі гукі. Вочы яго самі спынілі свой позірк на царкве — два залацістыя шпілі, як вушы аўчаркі. Там званілі званы. Ён вырас на Магілёўшчыне, у той яе ўсходняй частцы, дзе няма і не было на яго памяці цэркваў, і ўпершыню пачуў, як звоняць званы,— нешта раней яны не званілі. Дзілінькание было нядоўгае, і Ляшчэвіч пашкадаваў, што не паспеў яго добра пачуць, наслухацца, перакласці на нейкі сучасны рытм, які запомніўся б і пры нагодзе ўваскрасаў бы. А можа, і не ўваскрэс бы ўсё роўна ніколі: памяць захоўвае адно тое, у чым будзе мець некалі патрэбу. А якая можа быць патрэба ў царкоўным звоне? Мабыць, ідзе нейкая рэпетыцыя, праверка перад калядным богаслужэннем. У Ляшчэвічу гэта было проста разуменне, а не душэўны водгук, бо не было чаму адгукацца. Ён вырас у сям'і, дзе бацька, настаўнік, быў атэіст, помніцца яшчэ з маленства, як ён чытаў на ферме, у клубе лекцыі на антырэлігійныя тэмы. У хаце ніколі не было іконы. Маці раней, калі была яшчэ жывая бабуля Прося, ведала толькі вялікдзень, радаўніцу і калі па кім угодкі. Тады яна пякла пульхныя бліны, сыпала на іх дробку солі; соль уядалася ў блін, і ён набухаў белымі папурышкамі.

І таму на яго, Ляшчэвіча, ад усяго царкоўнага, рэлігійнага патыхала нечым незразумелым, загадкавым і экзатычным, што нельга выпрабаваць, рэальна адчуць, а толькі ўявіць, як уяўляем мы гісторыю, бывалішняе па кнігах ды кіно.

Яму не пашанцавала — у кафетэрыі быў санчас — на шкляных дзвярах была прыклеена паперка. Але ён не засмуціўся: «Ліха з ім, пацярплю, не памру з голаду!..» Горад рыхтаваўся да Новага года. Ставілі ёлкі,

чаплялі на іх цацкі, «звалі ў госці» Дзеда Мароза і Снягурачку, на шыбах малявалі зайца (год зайца), развешвалі гірлянды, серпанцін... Мяцеліца бляску, колераў, ваты, фольгі завеяла ўвесь горад, пранікла ў дамы, кватэры, вестыбюлі, нават у аўтобусы, спераду якіх, за лабавым шклом, плікалі агеньчыкамі гірлянд маленькія штучныя ёлачкі.

Ціха стала ў калідорах інстытута пасля абеду, не было той ажыўленасці, галасоў, бразгату, што чуліся ў звычайныя дні. Ніхто не піў чаю, мода на які развілася ў апошнія гады. І ў «курылцы» — невялічкім пляцы каля акна, збоч пад'ёмнай лесвіцы, дзе ацяпляльныя батарэі,— нікога не было. На століку з жоўтымі кружкамі прапалін сіратліва стаяла шкляная попелка з двума недакуркамі. Ляшчэвіч тузануў дзверы суседняга аддзела — хацеў аддаць паперу з рэзалюцыяй дырэктара «азнаёміць усе падраздзяленні НДІ» — замкнуты. «Што сядзець і мне... Трэба ехаць раней на Камароўку, можа, куплю ёлку...» Але побач з іх аддзелам на сцяне павесілі святочны выпуск насценгазеты «З Новым годам, біяхімікі!», і цяпер каля яе стаяла кадравічка, якой па новым стандарце, што нядаўна зацвярджалі на камісіі па якасці, выпала сачыць за распарадкам дня (божа, колькі «жалезабетону» ў гэтых стандартах!). Жанчына яна пажылая, збіраецца на пенсію, і нораваю мяккая, з прыемнаю ўсмешкаю, але няёмка ісці міма, гэта ўжо нахабства, якое Ляшчэвіч не прымаў у іншых. Хоць на тую газету і не было чаго глядзець, кадравічка ўнурылася ў яе і паказвала сваім выглядам, што ёй цікава.

Стрэлка гадзінніка марудна набліжалася да пяці.

— Ідзі,— сказала Таня Саўкова,— я пабуду да паловы шостай... Мы дамовіліся з мужам у гэты час сустрэцца.

— Вы ёлку сабе ўжо дасталі?

— У нас штучная. Купілі штучную, дык няма праблем.

— Штучная мне не падабаецца, эфекту ад яе нуль — ні паху, ні іголак... Або ніякай, або сапраўдную, зялёную, з лесу, і абавязкова тую, пад якой сядзеў касавокі... Год зайца, як-ніяк.

— Раней прадавалі на рынку каля Юбілейнай плошчы, а сёлета нешта не прывозілі.

— Ды я ля Камароўкі блізка жыву, там заўсёды прадаюць.

Іх размову перапыніў тэлефон. Трубку падняла Саўкова.

— Цябе... Мабыць, жонка.

Ляшчэвіч узяў трубку, увесь напяты.

— Алё!

— Сяргей? Не пазнаеш?..— Дзявочы голас, да болю знаёмы — з нізкаю, мяккаю пасадкаю, быццам гукі прапускаюць скрозь марлю,— але забыты. «Хто ж гэта?..» Ён стаяў разгублены, намагаўся ўспомніць дзяўчыну.

— А як ваша Лена пажывае? Замуж выйшла?

«Родзічка якая?»

— Гэта Ніна, Леніна сяброўка.

— А-а, Ніна!..— абрадаваўся ён.— Ну прывітанне! Адкуль ты?

— Ды вось пераехала ў Мінск... з паўгода назад.

— Паўгода? Што ж ты раней не пазваніла!

— Не было калі... Знаеш... кло-о-опатаў. З мужам я развялася, гадую сына...

— Трохі нечакана, і званок твой, і развод...

— Я сама не ведаю, чаму так атрымалася... Ой, Сярожа, мне так прыемна чуць твой голас!

— Мне твой — таксама. Даўно цябе не бачыў.

— Дзе я толькі не пабывала... Каб ты ведаў! І ў Казані, і ў Прыбалтыцы, і на Далёкім Усходзе...

— Вандроўніца.

— Не кажы ты!

Іх размова — адчуў Ляшчэвіч — як гульня ў шахматы: ходзіш фігурамі, а ў галаве трымаеш стратэгічную мэту. І раптам адзін нечаканы ход — і мат!

— Я хачу з табою сустрэцца,— сказала яна, і голас у яе ніколечкі не змяніўся, не задрыжаў.

— Добра, я не супраць, але сёння часу не маю — трэба ёлку дастаць. Ты пазвані мне пасля Новага года, добра? — сказаў Ляшчэвіч, баючыся, каб не падумала Ніна, што ён не хоча з ёю сустракацца. А чаму б і не сустрэцца, не пабачыцца, не ўспомніць маладосць? Трохі «крамолаю» папахвае, канечне, бо скажы жонцы — западозрыць у здрадзе, а гэта ўжо трэшчынка. Потым другая трэшчынка — так і да расколу даходзіць: з адной дзве палавінкі.

— Добра, я пазваню...

Ляшчэвіч палажыў трубку.

— Сяброўкі звоняць? — як бы з рэўнасцю спытала Саўкова.

— Маёй сястры сяброўкі,— аджартаваўся Ляшчэвіч.

Саўкова падміргнула, але ў вачах яе Ляшчэвіч заўважыў разгубленасць.

Ён сабраўся і пайшоў. Каля кадравічкі стаялі яшчэ дзве жанчыны з бухгалтэрыі, і гэта ўжо не так кідалася ў вочы, што Ляшчэвіч пайшоў апрануты.

Ідучы на адкрытую плошчу рынку, Ляшчэвіч не заўважыў, каб хто нёс ёлку. Не прадаюць?

Але чарга стаяла: доўгая, звілістая, як вяроўка. За драцяною рашоткаю — загон, як для жывёлы,— былі навалены абмызганыя, рэдкія, абсцябаныя ялінкі. «Калі будзе прывоз?» — спытаў Ляшчэвіч у мужчыны ў пакамечанай шапцы, які стаяў на мыліцах. «Хто ведае!»

Расказваў яму адзін знаёмы, як даставаў ёлку. Стаяў з гадзіну, бачыць, нешта не тое. Аказваецца, ветэранам, іншым, хто браў пасведчанні, прадаюць. Хацеў прарвацца — дружыннікі не пусцілі. Купіў у цёткі, якой перапрадаў ветэран.

Народ тоўпіўся, нечага чакаў. Твары былі і раздражненыя, пахмурныя, а былі і вясёлыя, бестурботныя.

Падышоў высокі мужчына, у чорным паліто з каракулевым белым каўняром і ў бабровай шапцы, жоўтыя, як падпаленыя, варсіны якой тырчалі ва ўсе бакі, як іголкі ў дзікабраза.

— А што, зачынена?

І Ляшчэвіч таксама звярнуў увагу, што дзверы ў загон замкнутыя на замок. А, між іншым, чым мерзнуць на марозе, чакаць, як кажуць, з мора пагоды, можна было б выбраць хоць якую няўдаліцу з таго лам'я.

— Ды зачынена! — з незадаволенасцю азваўся Ляшчэвіч.— Навошта закрываць было? Можа б, хто і ўзяў з гэтых...

— Канечне, узяў бы! — сказаў мужчына ў бабровай шапцы і павёў вакол вачыма.— Дзе тут хто камандуе?

— Як быццам няма нікога...— Ляшчэвіч і сам

ужо, яшчэ раней, хацеў знайсці некага з афіцыйных асоб, якія займаюцца продажам ёлак,— але ніхто на вочы не трапляўся, і дзе іх шукаць — таксама ніхто не ведаў.

Мужчына пайшоў да крытых прылаўкаў, за якімі прадавалі бульбу, яблыкі, квашаную капусту, семкі, і Ляшчэвіч гадаў: ён пайшоў шукаць прадаўцоў ёлак ці яго павёў туды зусім іншы клопат. Яшчэ трохі пастаяўшы і не дачакаўшыся мужчыны, ён нават хацеў быў выцягнуць паўзверх загароды ялінку, балазе гобыя вярхушкі іх тырчалі, усё роўна ж яны прападаюць,— але сорам стрымаў яго. Падумаюць людзі, што квапіцца, шкадуе грошай на добрую ёлку, дый, чаго добрага, некаму стукне ў галаву крыкнуць, абазваць яго злодзеем, тады клопату не абярэшся, як з тым талонам. Але і чакаць не было ўжо як, трэба ісці забіраць з сада сына: і так заўсёды крыўдуе, што яго позна, амаль апошняга забіраюць.

Успомніў, што не абедаў сёння, а дома паку-у-уль згатуеш,— зайшоў у кафэ «Смажанка», што на рагу вуліц Веры Харужай і Куйбышава. Раней тут была «Блінная» — звычайная сталовая, а на ўваходзе, за стойкаю буфета прадавалі на разліў віно. Таму-сяму латва дай бог: выпіў шклянку і закусіў гарачанькім. Народу тут заўсёды таўпілася шмат, асабліва мужчын з азызлымі тварамі, і вадзіцелям з аўтастанцыі прыгарадных маршрутаў не ўдавалася нахапок перакусіць, хоць і вісела ў зале таблічка, што яны абслугоўваюцца наперад астатніх.

Ляшчэвіч не хадзіў і цяпер не зайшоў бы ў сталовую, нягледзячы што хацеў есці; у «Смажанку» яго пацягнула міжволі: вельмі ўпадабаў і любіў гэтую старажытную беларускую страву — смажань. Каторыя наведнікі называлі яе проста — блін; але ў гэтай назве чулася Ляшчэвічу зняважлівасць, хоць у смажані больш за ўсяго якраз цеста, драждкавога цеста; ды ў гэтым цесце былі запечаны і скваркі, і цыбулька, і грыбы, і яйка, і каўбаса, і бульба, а наверсе — расплаўлены ў жароўні сыр і барвяная пляма таматнага соусу. Усё гэта, падсмажанае на алеі, падпечанае да хрумсткай ружаватай скарыначкі, было надзвычай смачнае. Не дурні былі нашы продкі, выдумаўшы такую простую, хуткую на гатаванне страву: пяць-шэсць мінут — і гатова.

У «Смажанцы» было мала людзей — стаяла чарга толькі каля буфета, дзе цяпер прадавалі марожанае, сокі і вітамінныя кактэйлі.

Ляшчэвіч запрасіў сабе смажань з гавядзінай (а яшчэ былі «далікатэсны» і «з курыцай»), шклянку яблычнага соку. Узяў з паліванага рудога збанка два відэльцы — двума лягчэй увіхацца, раздзіраць тугі смажань. Есці станавіліся за высокія прылаўкі, прымацаваныя да сцяны — удоўжкі і ўпрытык, папярок залы. На прылаўках не было сурвэтак, але стаялі ў крышталёвых вазах лапчатыя зялёныя галінкі, падобныя на папараць, відаць, прывезеныя аднекуль з поўдня. Пустыя талеркі, шклянкі прыбірала з прылаўкаў пажылая сівая жанчына ў белай куртачцы і ў пакаёвых тапачках, састаўляла ў шырокенькую, як балея, алюмініевую калясачку на колцах. Цяпер прыбіральшчыцы не было відаць, Ляшчэвіч проста ведаў яе па ранейшых візітах.

Заходзіў у кафэ — здаецца, быў дзень, яшчэ было светла, а выйшаў — ужо сцямнела, густая сінька, разбаўленая дымам і туманком, заліла вуліцы, наблізіла да зямлі неба. Уражанне, што ты не ў горадзе, а ў лесе — так густа пахла елкаю, жывіцаю, набрынялым вільгаццю снегам. Задзяры галаву — зоры ўбачыш, але не на вярхушках векавых ялін, а на плоскіх дахах вышынных церамаў-камяніц. На некранутым снезе воддаль ад тратуараў былі выразна відаць сляды — толькі чалавечыя, ні звера, ні птушкі не знайшлося, каб парушыць снегавую бель,— і ад гэтага павеяла сумам.

Да дома было з паўкіламетра, два прыпынкі, і Ляшчэвіч пайшоў пехатою. Усё спяшаешся, усё не паспяваеш, а таму толькі ездзіш. А трэба ж некалі хадзіць — чытаеш, чуеш: арганізму край патрэбны рух, фізічная нагрузка. А калі «нагрузіцца», дзе ўзяць часу? Закінуць усё? Але без гэтай нагрузкі як-небудзь пражывеш, а «закінуўшы ўсё» — не, пацерпіш крах і ў сям'і, і на працы. Ён, Ляшчэвіч, не аддадзены самому сабе, пераплецены, як ніткі ў сетцы, з безліччу ўсякіх іншых узаемаадносін.

Ішлося цяжка, снег на тратуары размясілі, па ім коўзаліся ногі, і неўзабаве Ляшчэвіч адчуў, што стаміўся, упрэў. Ён пацягнуў уніз замок «маланкі» на куртцы — шыю ахапіў ледзяны свежачок. Ляшчэвіч падправіў, тужэй захінуў махеравы шалік.

З сада везлі на саначках малых — тыя, што жывуць далёка; бліжэйшыя вялі сыноў і дочак за руку, а тыя, хто спяшаўся, каму не было як прастарэкваць, зважаць на ўсякія дамаганні малышоты,— неслі на руках.

Сынава група была на другім паверсе; узышоўшы па крутой лесвіцы, адразу апынуўся перад дзвярыма з вялікай барвовай пластыкаваю лічбаю «10». «Дзесятая» група лічылася «нулёўкаю», асвойвала праграму першага класа.

— Што мне купіў? — сустрэў яго пытаннем сын, дарэчы, як і кожны дзень. Дзіўна проста, адкуль у яго бралася заўсёднае жаданне мець новую цацку. Ляшчэвіч шмат купляў яму ўсякай несур'ёзнай драбязы, але апошнім часам стаў крыху стрымліваць сябе. Бо сын, загарэўшыся жаданнем мець нейкую цацку, тут жа астываў, як толькі яна апыналася ў яго руках; ён трыстрачваў да яе цікавасць, вочы яго сумнелі, і ён трымаў цацку ў руках як нешта выпадковае, лішняе, калі не прымусовае.

— Я не заходзіў у магазін,— сказаў Ляшчэвіч.— І наогул, думай ужо болей пра вучобу, а не пра цацкі.

Пра вучобу Ляшчэвіч напомніў сыну недарма: той рана, у пяць год, навучыўся чытаць і цяпер чытаў, ліпучы, як дарослы, адно трохі расцягваў, напяваючы, гукі, але зусім кепска пісаў літары, да таго ж нахіляючы іх у левы бок, і дрэнна складаў і адымаў. Увогуле, канечне, расчараваў бацькоў, якія раннюю, часам простатакі дарослую кемлівасць сына гатовы былі прымаць за вундэркіндства.

Ляшчэвіч нецярпліва чакаў, пакуль сын адзенецца, падспешваў яго. Цяпер, калі прабыў дзень у садзе і, здавалася б, павінен ірвацца дамоў, яму раптам станавілася цікавым усё навокал. Ён, як нежывы, нацягваў штаны, світарок, круціўся па баках, разглядаў малюнкі на дзверцах шафак, вылепленыя імі ж, дзецьмі, фігуркі з пластыліну, маляўніча аформленыя стэнды; і ўжо зусім як на дзіва глядзеў на бацькоў, што прыходзілі забіраць дзяцей. Назіраючы за сынам, ён добра ўяўляў сябе такім жа малым: усё-ткі, як бы не было, дзеці найбліжэй паўтараюць бацькоў, яшчэ не сапсаваных.

— Тата, пойдзем на каньках? — спытаў сын, калі яны выйшлі на вуліцу. У мінулую нядзелю Ляшчэвіч схадзіў з сынам у спартыўны магазін і купіў канькі з



*Ляшчэвіч угледзеўся ў іх, як раптам пачуў бомканне: дзілінь-бом-м-бл, дзілінь-бом-м-бл... Гукі былі незвычайныя, новыя, нячутыя ім раней, і ён спыніўся, глянуў уперад — адкуль ляцелі гукі. Вочы яго самі спынілі позірк на царкве.*

(«Нізкі тонус»)

чаравікамі — чорныя, з чырвонымі мысамі снягуркі.

— Сёння не.

— Тата, ну я хачу...— прасіў сын умольным голасам.

— Стаміўся я, Славік...— Ляшчэвіч разумеў, што трэба вучыць сына катацца на каньках — дзякуй богу, за два разы, што яны выходзілі на лёд, яму яшчэ не надакучылі калькі,— але не мог перасіліць у сабе поўную абыякавасць да якой-небудзь дзіцячай валтузні. Не той быў настрой, віселі іншыя, больш важныя клопаты.

Сын захныкаў.

— Ты заўсёды са мною не хочаш...

— Ну, Славік, што ты гаворыш? — пачаў усур'ёз ушчуваць ён сына.— Чый тата з тваіх сяброў... Малешына, Грабцэвіча, ходзіць з імі на каток, у магазіны, на рынак, на птушыную выстаўку?

Для дзяцей тое, што было, прайшло, засталося ў мінулым,— нічога не значыць, яно не ў залік. Давай новенькае, цяперашняе — іначай: «ты дрэнны», «не хочаш са мною», «усе ходзяць...». Ляшчэвіч лічыў, у яго ёсць права адмовіць сыну: усё-ткі шмат аддаваў яму ўвагі, асабліва калі той падрос, пачаў чапляцца з уедлівым «чаму», цікавіцца звярамі, птушкамі, машынамі, мячом... Былі ў звярынцы, на выстаўцы пеўчых птушак, у цырку, у тэатры юнага гледача, нават на стадыёне «Дынама» на сапраўдным матчы каманд вышэйшай лігі. І цяпер ён не прымаў сынавай просьбы, як кажуць, з чыстым сумленнем.

— Я вазьму клюшку і пайду на стадыён,— зразумеўшы, што бацьку не ўпросіш, як у дакор, маўляў, не будзе дома сядзець, сказаў сын.

— Ідзі,— дазволіў Ляшчэвіч, абрадаваўшыся магчымасці пабыць аднаму, расслабіцца.— Толькі новае футра здымі, апрані старое...

— Добра,— сказаў сын з такою згодаю, што было відаць: ён моцна сумняваўся і ў тым, што бацька адпусціць яго на стадыён.

Сын ахвотна апрануў старое футра, падпяразаўшыся салдацкім рэменем, узяў клюшку, шайбу (сапраўдныя, дарослыя, толькі ў клюшцы Ляшчэвіч падкараціў, абрэзаў дзяржанне) і з радасцю зачыніў дзверы.

Ляшчэвіч паставіў на пліту белую алюмініевую кававарку — ваду на чай. Ён любіў пасля работы піць

чай, умеў яго заварваць і меў у запасе звычайна некалькі гатункаў: ад індыйскага (яго тады-сяды давалі ў стале заказаў ці нехта прывозіў з камандзіроўкі з Масквы) і да самага звычайнага — чорнага, байхавага, № 36, за якім, чуў, ганяюцца чыфіршчыкі. Спаласнуў гарачай вадою з-пад крана заварніцу, усыпаў туды чайную лыжку чаю і накрыў папяроваю сурвэткаю.

Неўзабаве вада ў кававарцы зашумела, Ляшчэвіч сыпнуў туды колькі крупінак солі і, пачакаўшы, пакуль вада замуцілася драбнюткімі, як пыл, белымі пузыркамі, зняў з пліты і заліў у заварніцу; зноў накрыў сурвэткаю.

Успомніў, што забыўся забраць газеты, спусціўся ўніз па іх. Разам з газетамі быў канверт з незвычайнаю — адразу кінулася ў вочы — размалёўкаю: па беразе рачулкі ці возера стаяць у чорным доўгім адзенні фігуркі і трымаюць у руках разгорнутыя кніжкі, а можа, якія псалмы; гарыць цяпельца з блакітным дымком, стаяць на пяску лодкі, на вадзе — шырокі плоцік, а ўдалечыні не то высокі шпілясты будынак, не то нейкі малітоўны дом, адно акенца якога свяцілася ў цемры ярка-пунсовым вокам. Пісьмо адрасавалася жонцы — там, у Польшчы, у яе жывуць родзічы, яны тады-сяды і падавалі вестку.

Ён сеў піць чай і разгарнуў перад сабою газету — яна пісала пра ўзброенае ўмяшанне Францыі ва ўнутраныя справы Чада, сваёй былой калоніі; пра тое, што на падтрымку неакаланіялісцкага рэжыму Хабрэ Парыж перакінуў свае войскі, баявыя самалёты «Ягуар» і «Міраж».

«Грыміць, бушуе белы свет,— падумаў са скрухаю Ляшчэвіч.— Калі сам жывеш у міры, цяжка ўявіць, што недзе ідзе вайна, льюцца слёзы, кроў...» Тым болей не хацела душа прымаць ніякай згрызоты, бо набліжаўся Новы год — свята шырокае (іменна так пра яго думалася), іскрыстае, радаснае аднолькава малым і старым; у кожным жыве спадзяванне, што ўсё горкае, злыбеднае застанецца ў мінулым, а ў будучым чакае толькі прыемнае і добрае; чалавек як бы падцягваецца, стрымлівае сябе ад абраз, крыку, у якіх пагруз свет, стараецца не рабіць другому балюча, дараваць памылкі. Прынамсі, Ляшчэвіч так разумеў і хацеў такім быць. Яму крыўдна стала, што ў кватэры няма ёлкі, што не змог яе дастаць, а заўтра ўжо апошні

дзень. Без ёлкі, яе паху, без іголак на падлозе, на адзенні, за якое яны чапляюцца,— і Новы год не Новы год. Трэба заўтра абавязкова, кроў з носа, дастаць елку, цвёрда вырашыў Ляшчэвіч,— сабе, сыну радасць, жонка не будзе журыцца. Праблема, брат, і не пытайся — для дарослага чалавека, а што гаварыць пра малога? Гэта — у горадзе, а ў вёсцы, помніць, ніякіх праблем з ёлкаю не было. Надыходзіў час, і яны з братам бралі саначкі, сякеру ды ішлі ў недалёкі лясок. Сярод бяроз і алешын аплытыя снегам стаялі кучаравыя, густыя ялінкі. Выбіралі самую прыгожую — каб галіны з усіх бакоў аднолькава раслі, вершалінка пядзі на дзве была адрослая — і ўсё гэта на конус звужалася; адсякалі ялінку і са снегам везлі на саначках дахаты; лажылі пад загнетам, каб снег растаў; а паспрабуй яго, абледзянелы, страсаць — іголкі, пяшчотныя кончыкі галін паабрываеш. Была іншая бяда — цацак не хапала, асабліва шкляных. Ды ўсё роўна елка голаю не стаяла. Рабілі з ваты, з паперы, выразалі, расфарбоўвалі ўсякіх звяроў, птушак, ліхтарыкі, сняжынкі. І ёлка — адна любата, вачэй не адвесці! Цяпер і ў вёсцы толькі магазінныя цацкі, і не так ёлка «люба-дарага» дзецям, як тады, раней,— бачыў Ляшчэвіч, калі выпадала бываць на Новы год у вёсцы ў бацькоў.

Ён задумаўся, размáрыўся — і схамянуўся, калі стукнулі дзверы. Нехта зайшоў. Сын ці жонка? Не гукнуў яго адразу — значыць, не сын. Прыйшла жонка; распрануўшы футра, заглянула на кухню — чырвоныя ад марозу шчокі, жывога бляску сінія вочы.

— Прывітанне! — Яна, калі не была ў настроі, магла пяць разоў на дні вітацца з ім па тэлефоне.— Елкі не купіў?

— Заходзіў на Камароўку — няма,— сказаў упэўненым голасам Ляшчэвіч.

— Людзі даўно дасталі.— Яна пачала ляскаць каструлямі, міскамі, састаўляць у ракавіну.

— Можа, у людзей час быў, а я пасля работы забіраю малога.

Жонка прамаўчала: што вінаваціць мужа, калі апошнія дні яна лётала па магазінах, спадзеючыся купіць у канцы года што-небудзь дэфіцытнае, імпартнае.

— Заўтра купі.— Яна гаварыла так, быццам уся

замінка не ў тым, што елак няма, а ў тым, што ён проста не хацеў яе купляць.

— Я ўжо сам паставіў сабе задачу.

— Чай цёплы? — Жонка дакранулася пальцамі да заварніцы.

— Толькі што ўскіпяціў... А што, на агеньчыку нават чаю не было?

— Пародыя на агеньчык! — Жонка была відавочна незадаволена. І зусім рана вярнулася.

— Што ж вы так далі маху? — Ён зразумеў: нехта жонку пакрыўдзіў.

— Я лімон купіла... недзе ў сумцы.— Яна схадзіла прынесла сумку, выняла не даўгаваты, а круглы, бы апельсін, лімон.— Ідзе вірус грыпа, трэба вітамінаў паболей ужываць.

— Табе пісьмо з Польшчы.— Ляшчэвіч узяў з падаконніка і аддаў ёй канверт.

— Можа, запрашэнне прыслалі? Хоць бы адзелася... На агеньчыку была самая лахудра.— Яна спешна разарвала канверт. Нейкая «бабця Геля», загадчыца аддзялення шпіталя (чамусьці гэта выдзеліла), віншавала іх з Новым годам, жадала «сто лят», святочнага настрою — у іх, у Польшчы, каляды — святочныя дні, як і Новы год; пісала пра надвор'е, што восень сёлета была доўгая і цёплая, «добжэ» думалася і чыталася: у Польшчы другую маладосць перажывае зноў Дастаеўскі — «аўтар, якім можна захапляцца ў любым узросце, як і Львом Талстым»; з гадамі становіцца сумна, і тады думкі вяртаюць у мінулае, на радзіму, «рука цягнецца да Янкі Купалы, Ясеніна і Твардоўскага».

Ляшчэвіч уважліва слухаў жонку, цікава было ведаць, як і чым жывуць людзі ў другой краіне, што іх турбуе, чым незадаволены. На любую дробязь міжволі напрошвалася параўнанне.

Яны ўсё яшчэ абмяркоўвалі пісьмо, калі зайшоў сын. Расчырванелы, увесь у снезе, калашыны штаноў былі белыя — праз нейкую хвіліну на іх заззялі кроплі.

Яны абое забегалі каля сына. Дзіця ў сучаснай сям'і бы той цэмент, якім замазваюць трэшчыны. Пра гэта кожнаму з іх ужо нераз думалася.

Ляшчэвічу раптам недарэчна ўспомнілася Ніна, яе званок, і ён астатак вечара правёў у змаганні з назойлівымі думкамі пра яе.

...Ён выйшаў з інстытута раней, не было і пяці. Але

ўсё роўна паветра насычаў змрок — у канцы снежня, хоць крыху і падаўжэла дыханне дня, яшчэ цямнела рана. Ды маленькі сігнальчык у напрамку вясны ўжо быў пушчаны, пра што з прысмнасцю Ляшчэвічу думалася. Зіму мала хто любіць, яна патрабуе лішніх клопатаў — пра адзенне, пра здароўе; узімку імкнешся скараціць час між прыпынкам і домам, тады як летам можна «ад месца да месца» прайсці пехатою, прынамсі, на тры-чатыры прыпынкі можна сысці раней, заглянуць у магазін, кнігарню, кафетэрый — дробная патрэба ўсюды знойдзецца.

Паехаў адразу на Камароўку. З акна тралейбуса яму адкрыўся вялізны выпуклы, як панцыр гіганцкай чарапахі, дах. Насупраць яго акурат быў прыпынак. Сюды людзі ішлі з елкамі ў руках. Ён не прыглядаўся, добрыя елкі ці не,— паддаў хады. Баяўся, што разбяруць. Каля ўвахода на рынак стаяў натоўпчык, там клубіўся дым. Пахла цыбуляю, воцатам і смажаным мясам — прадавалі шашлыкі. Смажылі іх два вусатыя мужчыны — ці то армяне, ці то грузіны. Адзін браў кавалкі мяса з вялізнага катла, нанізваў іх на металічны шампур і лажыў яго на доўгую металічную скрыню з дзіркамі, у якіх бліскаў агонь. Другі трос над шампурамі бутэлькаю, нечым з яе паліваў.

— Куплай, дарагой, шяшлык! Ошень вкусная шяшлык! — з каўказскім акцэнтам заклікаў той, што трос бутэлькаю. Чарга ўсё роўна была невялікая.

Затое там, каля загароды, дзе прадавалі елкі, народ, як і ўчора, проста віраваў. Калі прыгледзецца, то ўсё-ткі відаць, што гэта — чарга. Бязладная, у некалькі радоў, але чарга. Станавіцца ў канец — мала клёку, усё роўна не дастаішся.

Ляшчэвіч падышоў да варот. Сёння каля іх стаяў міліцыянер у доўгім чорным кажуху, з партупеяй праз плячо і кабурою на рэмені; апусціўшы ў шапцы вушы і наставіўшы каўнер, прытупваў нагамі, відаць, ужо даўно нёс вахту. Па той бок варот стаяла жанчына ў рудым штучным футры, пясцовай шапцы і чырвонай абсіверанай рукою трымала цэлафанавы мяшэчак з грашыма. Людзей у загародзе было мала, але туды ніхто не рваўся. Ляшчэвіч перш падумаў, што не пускаюць, адале зразумеў: людзі самі не хочуць туды ісці, бо няма чаго браць, чакаюць машыны з елкамі.

— Будзе прывоз? — спытаў ён, але ні міліцыянер,

ні жанчына не адказалі яму, мабыць, у шуме ды гаме не пачулі ці ім абрыдла ўжо адказваць. Тады Ляшчэвіч рашуча ступіў за вароты. Яго ніхто не затрымаў.

Прыткнутыя да загароды, стаялі, як і ўчора, замызганыя, чэзлыя, рэдзенькія елкі.

— Макушкі, макушкі не ламайце! — крычала жанчына, калі нехта прымерваў яліну да калена.— Елка браковая!

«А што рабіць, калі няма лепшых? І ці прывязуць?» — Ляшчэвіч пачаў перабіраць елкі: не можа быць, каб гусцейшая не трапілася. Браў адну, другую — уражанне, што елкі абгрызеныя авечкамі. Помніцца, даўно ў вёсцы была аўчарня, дык зімою каля яе валялася процьма аб'едзеных яловых і сасновых галінак.

Ён выбраў дзве ялінкі вышынёю з яго рост; прыціскаў іх адну да адной, мяркуючы звязаць і паглядзець, ці будзе густа.

— Дайце мне адну,— раптам звярнулася да яго пажылая жанчына, відочна, пенсіянерка, якую зяць ці нявестка выправілі дастаць елку.

— Дык тут жа во колькі такіх,— усміхнуўшыся, павёў рукою вакол сябе Ляшчэвіч.

— Не-а, у вас густыя...

Смех! У чужых руках і праўда ўсё лепшае. Ён аддаў жанчыне-пенсіянерцы елку. Сабе выбраў другую. Ну і елачка-прыгажунька, пабляклі твае іголкі, зморшчылася скурка, патанчэлі пальчыкі! Круціў і так і гэтак, з розных бакоў прыладжваў, прыціскаў ялінкі. Гушчыня, як кажуць, не вельмі, ды што зробіш. Ён абхапіў адной рукою пасярэдзіне яліны і павярнуў да выхаду.

— Куды ты? — Яго рашуча спыніла жанчына з мяшэчкам.

— Дахаты,— як ні ў чым не бывала, з доляю наіўнасці, яму ўласцівай у разгубленасці, адказаў Ляшчэвіч.

— А плаціць хто будзе?

— За гэта плаціць? — здзівіўся Ляшчэвіч і глянуў на міліцыянера: той прытупваў нагамі, туліў галаву ў каўнер — грэўся.

— Вас ніхто не прымушае браць. Два рублі або пакідайце елкі.— Шчокі ад марозу ў жанчыны сіне-барвовыя, бліскучыя, як бакі дзіцячых шароў.

— За што два рублі? — Ляшчэвіч наўмысна як бы дзівіўся.

— Вунь глядзі.— Яна паказала на планку, прыстаўленую да загароды каля самых варот.— Да метра вышыня — шэсцьдзесят капеек, больш метра — рубель... Стандарт!

Ляшчэвіч зноў глянуў на міліцыянера, але твар у таго быў скамянелы, спакойны — як з лёду.

— Таварышы! — гучней загалёкала жанчына да людзей, што сноўдаліся па загоне, выбіраючы елкі.— Гэта браковыя елкі, просьба не браць!

— А свежыя прывязуць? — пачулася з натоўпу.

— Не, не будзе! — адказала жанчына, не павярнуўшыся на голас.

Малады хлопец у куртцы «Аляска», у шапцы-«пеўніку» (мабыць, студэнт) паднёс да жанчыны тры такія ж, як у Ляшчэвіча, елкі і аддаў ёй траячку. І тады Ляшчэвіч, уздыхнуўшы, заплаціў за свае рагаліны. Але на душы было прыкра, не грошай шкада, вядома, а шкада, што няўдалую «двайную» елку ён купіў. З такою сорамна ў тралейбус лезці, дый у цеснаце яе абцярушаць зусім.

Несці елку таксама было пакутліва. Ледзь не кожны сустрэчны звяртаў увагу на елку і, калі не кідаў рэпліку, то абавязкова хмыкаў: «Ну і елка!» І невядома было, ці ён насміхаўся з Ляшчэвіча, выбраў, называецца, ці гаварыў у дакор прадаўцам, што гандлююць такімі недарэкамі. Ва ўсякім разе Ляшчэвічу было ад гэтага не лягчэй. Размінаючыся, ён не глядзеў людзям у вочы, баючыся падколак. Адна бабуля нават спынілася: «Гэта елка такая?» Ляшчэвіч праз сілу ўсміхнуўся: «Дайце лепшую».

Жонка, калі прыйшла з сынам, тут жа раскусіла, чаму Ляшчэвіч прыбраў адзін елку: «Схаваць заганы хацеў, так?» А раз раскусіла — значыць, ён не схаваў, ды і немагчыма было іх схаваць. Ляшчэвіч сапраўды, толькі зачыніў за сабою дзверы і распрануўся, тут жа ўзяўся прыводзіць да ладу елку. Абрэзаў зусім голыя галіны, некаторыя гусцейшыя, адрэзаўшы, перамясціў, прывязаў медным дроцікам да ствала. Злучыў абедзве і звязаў па камлях і вершалінках, паставіў у спецыяльнае прыстасаванне-пасудзіну на трынозе. Так спяшаўся, ажно спацеў. Начапіў цацкі, закідаў ватаю і абвешаў фіялетава-белым «дожджыкам». Елка, канеч-

не, папрыгажэла, але мала кідалася ў вочы зялёным. Дзе там кінешся, калі зялёных іголак амаль няма. І ўсё-такі — гэта была ёлка! Ён адышоў і залюбаваўся ёю. Бывае ж так! Зазвінеў званок — прыйшлі жонка і сын, быццам чакалі пад дзвярыма, пакуль ён скончыць сваю маскіроўку. Сын вельмі абрадаваўся ёлцы, прыбег да яе не распранаючыся,— яму ўсё роўна, абы ёлка.

— Дзве звязаў, так? — сказала жонка з такою інтанацыяй, каб адразу адмесці ўсе яго заслугі.

— Добра што хоць такая ёсць! — незалюбіў Ляшчэвіч.

— Канечне,— згадзілася жонка, можа, адчуўшы, што, калі яна яшчэ скажа слова насуперак, муж раззлуецца: столькі патраціў часу і сілы на гэтую ёлку.— Можа, пайсці да каго ў госці? — прамовіла яна, сумна гледзячы на ёлку.

— Ды ну іх, госці! Сямейнае свята — Новы год, вось і будзем яго сустракаць у вузкім коле.

— Ну добра, тады давай рыхтавацца,— надзіва лёгка згадзілася жонка.— Выбі дарожкі, сходзі ў магазін, купі селядцоў, буракоў, маянэзу... буду рабіць селядца пад шубаю.— Яна прызнавала стравы, у якія ўваходзіла гародніна.

Ляшчэвіч, ні слова не гаворачы, апрануў балоневую куртку, згроб пад паху скручаныя ў рулоны дарожкі і, узяўшы пластмасавы песцік, выйшаў з кватэры.

Чутно было, як бухаў па дарожцы песцік, гулка аддавалася недзе за дамамі рэха. Не вельмі прыемная гэта «музыка» — выбіванне дываноў, асабліва ўвечары, калі хочаш спакою, ляжаш спаць, а некаму ўзбрыдзе выбіваць. Ёсць дзівакі, што і пасля дванаццаці гадзін ночы выносяць і стукаюць.

Вярнуўся ён хвілін праз дзесяць. Жонка ў сінім трыко мыла падлогу, гэта быў яе любімы занятак, яе хобі, ці што,— мыць падлогу. Нялёгкая работка, калі брацца за яе кожны дзень. Нібыта гэтую прывычку яна пераняла ў бацькі, які служыў на флоце і прывучыўся там драіць да бляску палубу.

У магазін Ляшчэвіч ніколі не хадзіў у тым, у чым быў дома, клапаціў па гаспадарцы,— таму пераадзеўся. Што зробіш, горад ёсць горад, гэта ў вёсцы чалавек ходзіць увесь час у адным і тым жа, пераадзяваецца ў навейшае на святы ды гулянкі.

На мікрараён быў адзін магазін — універсам, і там заўсёды было людна, асабліва ўвечары. У чэргах Ляшчэвіч не любіў стаяць, не мог, перажываў. Пустая трата часу, а яго і так не хапае, вечна спяшаешся, адну справу вырашаеш — набягае дзесяць іншых. Дзе б узяць таго каня, што панёс бы ўгалоп і, абагнаўшы ўсе справы, спыніўся там, дзе жывецца без турбот і весела?

Ва універсаме было двое шкляных дзвярэй і яшчэ круцёлка, якая ўпускала ў гандлёвую залу, а ў зваротным напрамку не круцілася, і калі чалавек, нічога не купіўшы, хацеў выйсці з універсама, ён ішоў да праходу, каля якога сядзела жанчына-вартаўніца. Ляшчэвіч заўсёды хоць нешта купляў, абы толькі не ісці міма гэтай вартаўніцы, якая прыдзірліва прыглядалася, а то і зусім пытала: «У вас нічога няма?» На такую падазронасць хацелася абавязкова сказаць што-небудзь рэзкае і колкае.

З селядцоў былі івасі, іх хапае ў любым магазіне — і разважаныя, і ў драўлянай бочцы, і ў вялізных, як таз, бляшанках. Ляшчэвіч папрасіў прадаўшчыцу зважыць пяць штучак. Яна ўзяла з бочкі двухражковым відэльцам тоўстыя перламутрава-сіняватыя ў спінах рыбінкі, загарнула ў крохкую шэрую паперу, узважыла і напісала цану. Ляшчэвіч узяў яшчэ хлеба, малака, кумысу і два вялікія, з добры мужчынскі кулак, буракі.

Пустую сумку Ляшчэвіч не меў моды здаваць у гардэроб, ставіў наверх на ячэйкі — усё роўна ж пад наглядам гардэробшчыкаў. Праўда, яны былі дзіўныя, гэтыя гардэробшчыкі,— маладыя хлопцы з аднолькава сумнымі, нахмуранымі тварамі, ніколі не ўсміхнуцца, не скажуць слова; як заведзеныя робаты, рэзка хапаюць з рук сумкі, гэтак жа падаюць. Зрэдку аднаго з іх падмяняла старая з белым, бяскроўным тварам, ёй было цяжка ўвіхацца з сумкамі, яна задыхалася, і што яе прымушала працаваць, Ляшчэвіч не разумеў.

Ён пераламыў прадукты з драцяной карзінкі ў чорную цыратовую сумку «Аэрафлот», выйшаў з універсама. З вінна-гарэлачнага аддзела, які нізенькаю пабудоўкаю прытыкаўся да сцяны універсама, доўгім звілістым хвастом цягнулася чарга — чорны «змій» імкнуўся пранікнуць да «зялёнага змія». Ляшчэвіч па-

думаў, што, толькі ад смерці ратуючыся, можна вытаяць такую чаргу.

Адыходзіў стары год і набліжаўся новы, а на душы было спакойна, не трапятала яна, не трымцела, як раней, гадоў дзесяць назад, бо тады, мабыць, ёю больш і ўспрымалася ўсё, а цяпер — розумам. Душы наіўныя бываюць, а розум ніколі — недалёкі, гэта іншая рэч. Добрае свята Новы год, нават цудоўнае, але яно праходзіць, за ім пачнуцца звычайныя будні, пра якія помніш, не забываеш і ў свята, бо нешта недзе не ладзіцца, з некім канфліктуеш, нейкая справа цябе чакае... І ўсё ж такі звіні, душа, хацелася крыкнуць Ляшчэвічу, свята ёсць свята! Любое свята пачынаецца са свята душы.

Жонка размешвала ў вялікай місе цеста — збіралася пячы пірог. Дыхала цяплом электрапліта.

— Разбяры селядца,— папрасіла яна — не пераносіла селядцовы пах, працірала воцатам кружок, на якім разбіралі селядцы. Ляшчэвіч іншы раз іранізаваў: «Прывучайся, жоначка, да бытавых пахаў». Ён акурат любіў пах і селядцоў, і любой іншай рыбы, і з ахвотаю яе чысціў, разбіраў па костачках. Усё жывое мела для яго натуральны і пах, і колер, і смак, што не скажаш пра хімію, якая з кожным годам шырэй і шырэй пранікала на куханныя прасторы, нярэдка выклікала алергію. Гэта яго не бянтэжыла, наўпярок, падбадзёрвала: усё правільна, прырода не мірыцца з чужынцам. З якою грэблівасцю ён прачытаў нядаўна, што вынайдзеныя на захадзе сасіскі з нафты нічым не ўступаюць мясным. Насякомых хімія патруціла, няўжо яе ўладная сінтэтычная рука замахнецца і на чалавека? Устаяць супраць хіміі — вось такая яна, філасофія быцця.

Накрылі стол — як на ёлцы вярхоўка, так на ім серабрыстай пікаю глядзела ў стол бутэлька шампанскага. Сын скакаў ад радасці і ўсё чакаў, калі яна «выстраліць». Быў ён апрануты ў белыя джынсікі і чырвона-белую, як у клоуна, кофтачку. «Хлапушкі з сюрпрызам» яму ўжо надакучылі, бо ва ўсіх быў адзін сюрпрыз — загорнуты ў цукерачную паперу, абсыпаны белым парашком шар.

Чым бліжэй стрэлкі набліжаліся да дванаццаці, тым больш нарастала хваляванне — міжволі, падсвядома. Ляшчэвіч глянуў у акно. Недалёка ад дома на

школьным стадыёне стаяла высокая ёлка, на ёй гарэла гірлянда рознакалёрных лямпачак. Вакол стаялі размаляваныя фанерныя домікі. Каля іх бегалі дзеці. Нехта пусціў ракету, і яна павісла ў нерухомым чорным небе як іскрынка. З каміноў дзвюх хат, што засталіся ад «прыватнага сектара», віўся тоненькай стужачкаю дымок. Там хадзіў каля плота, прынюхваўся да снегу вялізны, як цялё, сабака. Такога вартаўніка любы злодзей абыдзе бокам.

— Сяргей, хадзі! — гукнула жонка.— Зараз будзе віншаванне.

Яны ўтраіх селі за стол, глядзелі ў тэлевізар. Хваляваліся. І праўда: тое, што было, мінула, і тое, што будзе, набывала ў гэтыя апошнія дзесяць мінут старога года ў душы Ляшчэвіча велічны сэнс і значнасць. Ён як бы адчуваў свет на ўсю моц уяўлення, неяк выразна ўсведамляў, што такое планета, бо ўсе ў гэты момант жылі тым, чым і ён, думалі пра адно і тое ж — пра мір, шчасце, надзеі. У гэтыя мінуты людзі рыхталіся да аднаго — да ўсмешак, віншаванняў.

На дванаццатым удары гадзінніка Спаскай вежы Ляшчэвіч даў «залп», якога так чакаў сын,— і радасць у грудзях, і ўсмешкі на вуснах заіскрыліся шчыра, вольна, ажно туга забрала, што мала, рэдка яны ўпрыгожваюць людзей у звычайныя дні — на працы, яшчэ менш — дома.

Жонка ўспомніла, што купіла серпанцін, і яны, шчаслівыя, вольныя ад трывог і клопатаў, пачалі развешваць яго ў пакоі. Чаплялі адзін канец за люстру, другі прывязвалі за што-небудзь у куце; серпанцін, скручаны ў спіралькі, пагойдваўся, надаваў усяму паскрою рухомасць і казачную таямнічасць. Такія ж рознакалёрныя стужкі кідалі і ў тэлевізары на артыстаў, удзельнікаў-шчасліўчыкаў навагодняга канцэрта.

Першы адсвяткаваў Новы год сын — усё радзей і радзей ён паднімаў галаву з падушкі, нарэшце змогся; потым лягла спаць жонка; Ляшчэвіч сядзеў адзін перад тэлевізарам. Ён любіў слухаць песні, можа, невялікі ён быў знаўца музыкі, але з аднолькавай асалодаю мог слухаць песні сучасныя, з «выкаблучваннем», і звычайныя — народныя, мяккія, задушэўныя. Слухаючы песні, ён не лічыў, што дарма траціць час, нешта ў душы застаецца, асядае, нешта там ачышчае.

Глыбокая ноч, адзінота не засмучалі, наўпярок, ці-

шыня, спакой давалі магчымасць засяроджвацца, улоўліваць тонкія пачуцці. Гэта былі рэдкія хвіліны дачынення да творчасці, душэўнай лагоды і радасці, так жаданых кожным чалавекам.

І — быццам выбух: крык на вуліцы, унізе, на зямлі: «А-а-а! Машыну крадуць!.. Лаві іх!..» Ляшчэвіча як спружынаю падкінула, ён падбег да акна. Лямантавала з балкона пятага ці шостага паверха жанчына ў белым — ці ў халаце, ці ў начной кашулі.

«Дзе міліцыя? Зладзеі!..»

Ляшчэвіч убачыў, як ад машын, што стаялі ў двары, матлянуліся дзве постаці і, прыгінаючыся, паджгалі да аркі гнутага, як падкова, дзевяціпавярховага дома, які называлі «кітайскай сцяною». Ён быў памкнуўся да тэлефона, але зразумеў, што мала толку званіць у міліцыю, хуліганаў усё роўна не зловіш. Мабыць, дзе-небудзь за вуглом стаіць іх машына — сядуць і праз пятнаццаць хвілін будуць на тым канцы горада. Іншая рэч, калі б нумар машыны ўведаць. А можа, апрануцца ды кінуцца за імі, прасачыць, куды яны пойдуць, можа, і праўда ў машыну сядуць? Не, мабыць, марна гнацца за імі, схаваліся ўжо — не аўчарка, па слядах не пойдзеш, па слядах гадкіх і мярзотных.

Ляшчэвіч, колькі ні задумваўся, не мог зразумець псіхалогію злачынцаў, бо сябе не мог паставіць, уявіць на іх месцы. Любая маленькая, нязначная непрыстойнасць лажылася грузам яму на душу, ціснула, ён не мог на яе доўга забыцца, яму было сорамна перад сабою. А нешта непамыснае, пачварнае ўтвары, адзін раз, другі — як тады ўратаваць сваю душу? Ды яе ж расцісне груз дакору. І ўжо не будзе ні душы, ні цябе самога. Можа, гэтая боязь, няздольнасць адрынуць перажыванні і супыняла яго, не давала ходу, павароту да мяжы непрыстойнасцей? А можа, у ім проста прытуплена адчуванне гэтых непрыстойнасцей, можа, нарobленае ім і ёсць самыя жахлівыя непрыстойнасці? І як ён апраўдвае свае, так астатнія знаходзяць апраўданне сваім?

Ляшчэвіч ужо не мог засяроджвацца на тым, што паказвалі па тэлевізары. Позірк у яго быў пусты, адлучаны, бо душа зараз працавала не на вочы, а на думкі, уражанні вакол і зладзеяў, і сваіх учынкаў, прыстойныя яны ці непрыстойныя і наколькі непрыстой-

ныя і ці ёсць чалавек, душа якога ідэальна чыстая, як некрануты снег, як аркуш паперы; калі такі чалавек ёсць і можа сярод людзей існаваць — трэба ламаць, гнуць, кроіць сябе, але цягнуцца да яго.

Ён на хвілінку зноў прынік да тэлевізара, калі зайграў ансамбль «Модэрн токінг» — апошняе і, можа, самае масавае пасля «Бітлз» захапленне меламанаў, моладзі. Гэтых бландзіністага і цёмнавалосага хлопцаў з асалодаю слухаў і Ляшчэвіч. Бляск, яркасць маладосці яны ўдала спалучалі з задушэўнасцю, нязмушанасцю мелодый, спявалі пра мір і каханне...

Набліжалася раніца, пасвятлела на вуліцы. Ужо тоій-сёй, хто не глядзеў канцэрта, будзе неўзабаве ўставаць, а вось такія, як ён, начнікі толькі думаюць класціся спаць. Ляшчэвіч выключыў тэлевізар — і нейкі міг на цёмным экране блішчала ядраная белая, як іртуць, кропка. І калі ён, сцішваючыся, хвілін пятнаццаць паляжаў у ложку і стаў засынаць, свядомасць яго звузілася ў такую ж маленькую вастранькую кропку, якая, мабыць, гэтак жа ставіцца і на жыцці, калі чалавек памірае. Жыццё ў выніку — умяшчаецца ў кропку?

Дзед Мароз, як і трэба, з'явіўся перад Новым годам, напалохаў сваім дыханнем і знік. Аднекуль выплыла адліга, сыпкі, сухі снег ператварыўся ў рэдзенькую кашку, а там-сям зусім растаў. З начы над зямлёю вісеў шчыльны туман, фары машын свяціліся цьмяна, як з алею. Такое гнілое надвор'е Ляшчэвіч не любіў, а калі чаго не любіш — псуецца настрой. А сапсаваны з раніцы настрой — гэта вяшчун няўдалага дня. Толькі зрэдзь часу бывае наадварот.

У адзін з такіх дзён Ляшчэвіч з жонкаю спяшаліся на прыпынак. На пераходзе з сінім знакам, на якім пешаход крочыць па белай рабрыстай дарожцы, светлафора не было. Чарадою ішлі па вуліцы машыны, прамежак між імі быў зусім маленькі, і ні адна з іх нават не прытармажвала, хоць на пераходзе сабралася ўжо багата людзей. Хто патыкаўся ступіць на шашу, тут жа падаваўся назад, баючыся трапіць пад кола.

«Ну і нахабнікі гэтыя вадзіцелі! — цярпліва стоячы, думаў Ляшчэвіч.— Па правілах жа, яны павінны

прапусціць пешахода». Правілы Ляшчэвіч ведаў з «ваенкі», там здавалі на правы, і хто хацеў, іх атрымліваў.

— Колькі можна стаяць! — абурылася маладая жанчына ў акулярах, у доўгай светлай дублёнцы з апушкаю ўнізе.

— І праўда! — падтрымала яе жонка.— Хадземце.

Ляшчэвіч першы ступіў на дарогу — і грузавічок з вялікаватаю кабінаю і маленькім кузаўком, жыгнуўшы каля самых ног, абдаў Ляшчэвіча халодным, ледзяным брудам.

— Ой! — запішчала жанчына ў дублёнцы.— Запамінайце, хутчэй запамінайце нумар!..— Яна, праціраючы акуляры, жмурачыся, глядзела ўслед грузавіку.

У Ляшчэвіча зрок таксама быў падпсаваны ды яшчэ стаў атрэпвацца ад гразі — нумар не змог убачыць, прачытала і запомніла жонка: 88—44 МИЩ.

— Трэба напісаць у газету!

— Такое нахабства!

— Пазбавіць правоў!..

Гул абурэння нарастаў, ён падбухторваў і Ляшчэвіча да адплаты, да пакарання ліхача. Ляшчэвіч ужо ведаў, калі не зробіць што адразу, па гарачых слядах, потым, астудзіўшыся, не возьмецца і пагатоў. Трохі ачысціўшыся ад бруду, сказаў жонцы, каб ехала, а сам павярнуў да тэлефонных будак. Набраў «02».

— Дежурный слушает!

Ляшчэвіч, глытаючы словы, не вельмі ўдала (хацеў быць строгім!) расказаў, чаго звоніць.

— Звоните в ГАИ Советского райотдела,— параіў дзяжурны і назваў тэлефон. Ляшчэвіч пазваніў туды, і яго пераадрасавалі гарадской ДАІ. Імпэт міжволі таяў, і Ляшчэвіч, шукаючы двушку, думаў, званіць ці не. Трэба ўсё-ткі званіць, бо колькі можна здавацца нахабству. Успомніў, як гады два назад сутыкнуўся з грубасцю таксіста. Да яго ў госці прыехала маці, ён сустрэў яе на вакзале і, каб не штурхацца па трамваях ды тралейбусах з сумкамі, зэканоміць час дый шыкануць перад маці (недзе ў падсвядомасці таілася і гэтая думка, што ён тут у горадзе свой, гаспадар, і жыве па яго законах), ён узяў таксі. Дом, дзе жыў Ляшчэвіч, стаяў далёка ад вуліцы, у глыбіні квартала, і яго рэдкі таксіст знаходзіў адразу. Пад'язджаючы, Ляшчэвіч сказаў, дзе звярнуць, але таксіст і вухам не павёў, пёр на

вуліцу, якую назваў Ляшчэвіч, калі садзіўся, і з якой да дома не было пад'езда.

Замест таго каб павініцца, таксіст пачаў лаяць Ляшчэвіча, што той «сядзеў і сапеў у дзве дзюркі» і не падказаў, куды ехаць.

— Ну што ета вы гаворыце!..— не ўцярпела і маці.— Ён жа вам... я сама чула, указаў, дзе завярнуцца.

— Маманя, не вучы мяне жыць, а то адвязу назад у дзярэўню! — Ад фанабэрыі таксіст ажно вочы закаціў пад лоб. Было яму гадоў сорак, можа, меней — рыжыя валасы, чырвоны, што цэгла, твар і нейкая дэбільная мутнаватасць у вачах. «Такіх не ў сферу абслугоўвання трэба,— падумаў Ляшчэвіч,— а ў тайгу мядзведзяў вартаваць!» Над лічыльнікам была і фотка гаспадара таксі, і прозвішча — Ляшчэвіч запомніў яго, думаючы напісаць ці ў таксапарк, ці ў «Вячэрні Мінск», але так і не напісаў — пакуль маці гасцявала, астыў.

У гарадской ДАІ маладыломкі голас сказаў Ляшчэвічу напісаць у іх адрас, на імя начальніка, заяву. І ён, прыйшоўшы на працу, адсунуў далей чарцяжы і напісаў скаргу: «Прашу прыняць меры да вадзіцеля аўтамашыны нумар 88—44 МИЩ. Коратка, у чым справа. 5 студзеня г. г. каля 8.30 раніцы я з жонкаю, ідучы на працу, спыніўся, каб перайсці вуліцу ў дазволеным месцы. Мала таго што вадзіцель не прапусціў людзей ці хоць бы прытармазіў, дык на шалёнай хуткасці газануў упрыцірку з тратуарам, абдаўшы мяне з ног да галавы граззю. І, як кажуць, нават вокам (стоп-сігналам) не маргнуўшы, панёсся далей. Ці варта гаварыць аб рабочым настроі на ўвесь дзень? І чаму з-за нядбайных вадзіцеляў-ліхачоў я павінен лішні раз хадзіць у хімчыстку?

Хацелася б, каб тэрміны адказу на пісьмы і скаргі былі захаваны.

Усяго добрага!

5 студзеня 1986 года».

На канверце Ляшчэвіч напісаў свой дамашні адрас і рабочы тэлефон. Колькі дзён ён жыў гэтым пісьмом-скаргаю, чаго толькі не перадумаў. Іншы раз здавалася, што дарэмна ён пайшоў на гэтую мітрэнгу. Пачнуць цягаць па міліцыі, удакладняць, рабіць вочную стаўку, а вадзіцель, чаго добрага, падпільнуе дзе-небудзь і адпомсціць. Нядаўна, хадзілі чуткі, быў суд

над адным тыпам, які пасля таго, як яго, «несуна», пакрытыкавалі на сходзе, вылоўліваў, мерзнучы на марозе, стоячы пад дажджом і ветрам, сваіх «нядобразычліўцаў» і... забіваў. На чацвёртым толькі спынілі.

Цяпер кожны раз, калі яго звалі да тэлефона, ён успамінаў сваё пісьмо і на канвертах, што прыходзілі, тут жа, каля скрыні, чытаў адрасы.

Але перш чым прыляціць вестка з ДАІ, яму пазваніла Ніна, зноў нізкапасаджаным голасам сваім прызнавалася ў радасці мець з ім сустрэчу. Ці трэба адмаўляць жанчыне, ды яшчэ колішняй сяброўцы, якая просіць сустрэцца, Ляшчэвіч не ведаў. Ён не мог пэўна сказаць: выходзіць гэта за рамкі прыстойнасці ці не, амаральна гэта ці, наўпярок, высакародна? Што не ўсё тут чыста, сведчыла хоць бы тое, што жонцы не скажаш, куды ідзеш, з кім сустракаешся.

З жонкаю на дні яны шмат разоў перазвоньваліся. Часцей званіла яна, часам па дробязі, а найперш таму, што, мабыць, не было чаго рабіць і хацелася проста пагаварыць. Ён пазваніў ёй і сказаў, каб забірала сына, бо ў яго... пасяджэнне мясцкома. Пасяджэнне і праўда будзе, але скончыцца яно не пазней, чым канчаецца працоўны дзень.

Ніна чакала яго каля паштамта. Гэтае месца выбіраюць для сустрэч і каханыя, і палюбоўнікі, і дзелавыя людзі, і выпадковыя знаёмыя. Колькі тут за ўвесь час завязалася адносін, з якіх узялі пачатак дарогі і ў шчасце, і ў бяду. Ніна змянілася, адразу кінулася ў вочы — пахудзела. Яна была ў чырвоным паліто, у вязанай шапачцы і рудых, з кароткімі халяўкамі ботах. Рука ў яе была халодная, чырвоная і — зноў, як і калісь, звярнуў увагу Ляшчэвіч — вялікая. Як у мужчыны. Пяшчотная дзявочая ласка вялікімі, як у мужчыны, рукамі — гэта ўразіла, запала Ляшчэвічу ў сэрца тады, як пазнаёміліся. У бацькі быў юбілей, шэсцьдзесят гадоў. Ленка, сястра, прыехала з Магілёва на ўрачыстасць з сяброўкаю. Абедзве танюткія, модныя — у штруксах, балоневых спартыўных куртачках, у красоўках. Ніна адразу выклікала ва ўсіх прыхільнасць, яна была простая, раскаваная, таварыская. Сястра падленьвалася, сачкавала, а гэта і пасуду памые, і ў талерачку падкладзе салаты, і юбіляру гальштук падправіць, брытву падасць. Да таго ж яна была ў ладзе з гумарам, што рэдка сустрэнеш сярод дзяўчат яе ўзро-

сту,— міла ўсміхалася поўнымі, прыгожа развінутымі вуснамі, адкрываючы белы радок верхніх зубоў, якія, здавалася, пазвоньвалі, бы тонкая металічная падкоўка, калі Ніна падносіла відэлец да рота. І тады першы раз Ляшчэвіч убачыў, што ў яе вялікія рукі, тоўстыя вузлаватыя пальцы. Неяк само сабою выявілася, што ў Ніны бацькі няма, рана памёр, а маці — алкагалічка. І ёй, Ніне, з малых гадоў трэба было парадчыць гаспадарку, капаць бульбу, касіць, палоць грады, карміць свіней, курэй, даіць карову, няньчыць малодшых брацікa і сястрычку. Дзіўна, проста дзіўна, як у такой сям'і яна сумела захаваць сваё жыццялюбства. Не то шкадоба, не то павага ці яшчэ нейкае іншае пачуццё з гэтай чуллівай хвалі пачало ціха плёскацца Ляшчэвічу ў сэрца. Яна была на пяць гадоў маладзейшая за яго, а ён (шапнула яму сястра) «зусім не для яе густу», але нешта іх ужо звязвала, цягнула адно да аднаго. Той вечар і ледзь не ўсю ноч яны правялі за вёскаю, у старым калгасным садзе, каля будачкі вартаўніка, на лаўцы пад яблыняю. Такой даверлівай адкрытасці, нязмушанасці ў кожным руху, кроку, слове, такога ўзаемнага парывання да чыстай ласкі, да ледзь не бясцямнага ўпівання ёю, калі баішся даць хоць маленькі намёк на нешта грубае, здаецца, Ляшчэвіч ні з кім пасля не спазнаваў. І што дзіўна: з ёй самой, Нінай, былі потым сустрэчы, але ніколі не было такога трапяткога, цнатлівага самазабыцця. Мабыць, кожнаму дадзена перажыць яго толькі раз.

І вось цяпер — праз дзесяць гадоў — зноў сустрэча. Ніна яму абрадавалася, усміхалася, міла адкрываючы зубы, толькі ўжо не беленькую падкоўку, а жоўтую — залатыя фіксы. Не, час усё-такі няўмольны да маладосці, да жанчыны асабліва.

— Ну, як ты жывеш? — спытала яна, не выпускаючы яго рукі.

— Як усе.

— Што значыць... «усе»? Усе разводзяцца.

— А-а, калі гаварыць пра гэта, то нармальна жыву.

— Дзяцей колькі ў цябе?

— Адно. Сын.

— Ну што гэтак слаба? Трэба трое, чэцвера...

— Кажуць, цяжка з дзецьмі спраўляцца ў горадзе. У вёсцы прасцей — выпусціў на вуліцу, і няхай бегаюць. Я і сам гэта назіраў.

— Я пабыла ўсюды: і ў горадзе, і ў вёсцы, і ў глухім лесе... мужа ганялі з месца на месца. Справа не ў месцы, а ў сям'і...

— У сям'і, канечне... Але што мы стаім? — спахапіўся ён.— І па вуліцы хадзіць — холадна.

— Можа, на паштамт зайдзем?

— Ды ну ты што! Няўжо я такі кепскі джэнтльмен? Там людзей ажно кішыць... Трэба некуды ў цяпло, пасядзець спакойна, прыстойна, як салідныя людзі. Што бліжэй? «Мінск»? Не люблю. Каля стадыёна «Мядуха», давай туды.

Яны завярнулі за паштамт. Вуліца кацілася ўніз — ісці было лёгка, а Ляшчэвічу, наўпярок, хацелася замаруджваць хаду, каб даўжэй ісці да кафэ. У няспешнай хадзе, у дарозе з жанчынаю прасцей ладзіць гаворку, заўсёды вальней выяўляюцца пачуцці і намеры.

Яму падабалася назва кафэ — «Мядуха», было ў ёй нешта ад грунтоўнага, народнага, веяла не толькі мядовым водарам, але і водарам гісторыі, тым нязнаным, чым жылі дасюль продкі. Над дзвярыма, дзе звычайна вісіць ліхтар, была прымацавана ёмкая бочачка чорнага колеру, абвітая чатырма жоўтымі абручамі. Накрыўка ў бочачцы была размалявана пад соты. Дзверы былі масіўныя, як у падзямеллі, з цяжкасцю адчыняліся. Усярэдзіне кафэ было цеснаватае, з нізкай столлю, стаялі прысадзістыя чорнага дрэва сталы, са сцен бліскуча пазіралі намаляваныя пэндзлем мастака жоўтыя вочкі сотаў, як і на бочачцы пры ўваходзе.

Ляшчэвіч дапамог Ніне распрануцца, здаў адзенне гардэробшчыку — бадзёраму вусатаму дзеду, які надта лісліва падаў яму два бляшаныя жэтончыкі-нумаркі. Ніна стаяла перад шырокім, на ўвесь прасценак люстрам, у якім чалавек бачыў сябе на поўны рост, і засяроджана расчэсвала грабянцом светлыя, льняна-мяккія валасы. Збоку Ляшчэвіч бачыў, што і вусаты дзед-гардэробшчык, і нейкая летуценна-палявая Ніна ў блузцы з вышытай на грудзях кветкаю так хораша ўпісваюцца ў гэты нешматфарбны, некрыкліва-сціплы асяродак. А вось ён — у строгім металёва-шэрага колеру касцюме, у блакітнаватай кашулі з чырвоным гальштукам — ці ўпісваецца, каб яму хто сказаў? Не, пра гэта ніхто яму не скажа, бо, мабыць, ніхто з рэдкіх наведнікаў, што сядзелі за сталамі, пра гэта не думаў. Неяк ціха, нават журботна было ў адсеках — як у ва-

гонах купэ — залы; спакойна, прыглушана гучалі галасы, бясшумна, як цені, снавалі афіцыянткі ў белых, вышытых заблыццю сукенках.

Яны спыніліся каля далёкага двухмеснага століка, селі ў мяккія крэслы з аплеценымі тонкаю лазою спінкамі.

— Як добра тут, праўда? — сказаў ён, адчуўшы адразу расслабленасць, цеплыню на душы.

— А я таксама люблю... можа, не паверыш? — усё простае, каб не кідкае, што напамінае мне пра вёску, маю родную васільковую Віцебшчыну...

— Трохі дзіўна, бо, здаецца, тады ты не была такая...

— Я проста не думала пра гэта... А ў Казані жыла... Туга заядала. Я і ў політэхнічны інстытут паступіла, тры курсы скончыла...

— Во! — радасна ўсклікнуў Ляшчэвіч.— І не хвалішся...

— А што хваліцца... Каб дыплом атрымала. Мужа перавялі — і давялося кінуць.

— У мяне брат стрыечны ваенны. Ужо, мабыць, шэсць месц памяняў, затое да падпалкоўніка даслужыўся.

— Мой капітан... Цяпер, мабыць, не хутка павысяць. Аскандаліўся з гэтым разводам...— Яна апусціла вочы, быццам была вінаватая.

— Сур'ёзныя прычыны былі? — спытаў Ляшчэвіч, адчуўшы, што пытанне ў яго занадта рацыянальнае, а ў такой гаворцы трэба як мага больш далікатнасці.

Ніна не магла падняць на яго вачэй — пераадольвала ў душы, скручвала нейкае пачуццё, якое, мабыць, не магло сумясціцца з самалюбствам. Ніхто ніколі не вінаваціць сябе, толькі іншых. Закон прыроды чалавечай?

Падышла афіцыянтка, стала за спінаю ў Ніны з блакноцікам і алоўкам у руках, позірк яе блукаў недзе далёка, хоць перад ёю блізка была сцяна з намаляванымі сотамі.

— Два кактэйлі, дзвесце цукерак «Мінскіх» і трохі спагадзя дзве кавы,— сказаў Ляшчэвіч, бо ўжо разы два зазірнуў у лісток-меню (можа, пяты экземпляр надрукаванага на пішучай машынцы тэксту), які ляжаў перад ім.

Не сказаўшы слова, афіцыянтка адышла. Але цу-

керкі і кактэйлі прынесла надзіва хутка. У кактэйлях наверсе ляжала шчыльная, як пенапласт, ружовая пена. Ляшчэвіч разварушыў, разбаўтаў яе саломінкаю.

— Смачны! — смактануўшы кактэйлю, пахваліла Ніна.

— Цяпер мода на кактэйлі, дык навучыліся гатаваць,— сказаў Ляшчэвіч.

— А ў Казані я прывыкла да кумысу, самы лепшы для мяне напітак.

— З каровінага малака не такі?

— Параўнаў...— усміхнулася Ніна. Усмешка ў яе, заўважыў Ляшчэвіч, была вымучаная, адно каб паказаць яму, што ёй прыемна з ім, нягледзячы ні на што. Яна сілком надавала сабе весялосці, бадзёрага настрою, але не магла схаваць ад Ляшчэвіча і заклапочанасці, і прыгнечанасці — водгулле тых пакут, што перапала ёй у жыцці.— Ты пытаў, ці сур'ёзныя прычыны? — Нарэшце яна падняла на яго вочы, але яны неяк па-дзіўнаму глядзелі, не маглі зафіксавацца на ім — такое ўражанне, што яны круціліся, як шарыкі.— На мове судовага дакумента, яна гучыць так: «Стварэнне другой сям'і». Гэта яго прычына, а мая: «супружаская нявернасць».

— Не п'янства, не працяглыя адлучкі, не вандраванні? — здзівіўся Ляшчэвіч.

— Не. У яго закахалася мая лепшая сяброўка. Яна была загадчыца дзіцячага сада, у якім я працавала поварам. Яна была разведзеная, дзіця ў маці... Ёй было сумна, і яна хінулася да мяне. Свята — у нас, дзень нараджэння — у нас, проста выхадны... Яна баба відная, канечне... Не раўня мне.

Ляшчэвіч, гледзячы са спачуваннем на Ніну, паціснуў плячыма: маўляў, ты, Ніна, дарэмна ганьбуеш сябе. Яна, мабыць, зразумела, што ён меў на ўвазе, бо тут жа пачала гаварыць больш упэўнена.

— І пачаў мой муж прападаць днямі: то камандзіроўка, то вучэнні, то стрэльбы, то дзяжурствы... нават прыдумаў раз, што ляжыцца ў шпіталь на два тыдні, нейкі сакрэтны, куды не пускаюць... Хлусіў, вядома. А потым мне выпадкова трапіла пісьмо, якое яна прыслала яму з поўдня, куды паехала адпачываць, і там былі такія словы: «Свет без цябе, каханы, аднастайны і нецікавы. Я вельмі цяжка пераношу разлуку — калі не прыедзеш хоць на дзень, пайду на дно, у палюбоўні-

цы да Нептуна...» Я ўжо трохі здагадвалася, а тут мне стала ўсё зразумела, і я сказала: «Едзь!» Ён — прыстойны... і муж добры, бацька, дапамагаў мне на кухні, гуляў з сынам. Але — каханне... Што зробіш? Выперпець такое немагчыма, гэта ўніжэнне. А я гордая. Хіба не зразумеў?

«Дзіўна, чаму яна мне даказвае, як быццам я пярэчу?» — падумаў Ляшчэвіч і не знайшоў, што адказаць, хоць зразумеў, што мела на ўвазе Ніна. Яна прыпамінала ранейшае, іх сяброўства, блізкія адносіны, якія засталіся чыстымі, неапошленымі, мабыць, толькі таму, што Ніна, жартуючы, хіхікаючы, саромела яго за смеласць і рашучасць. А цяпер, ужо сталаму, Ляшчэвічу бачыцца, што быў ён тады і нясмелы, і нерашучы, і няхай яна, Ніначка, не прыпісвае сабе заслугі, не спасылаецца ні на які гонар.

— Я гордая, Сяргей...— паўтарыла Ніна, і Ляшчэвіч падумаў, што многія жанчыны тлумачаць гонарам свае памылкі і пралікі. Нічога не застаецца рабіць? — Быў бы ён, мой муж, нейкі нягеглы там, няварты, замухрышка — я цярпела б, даравала б. А так... Вось такія пірагі. Нечакана, праўда? — Шчокі ў яе злёгку паружавелі, заблішчалі вочы — у глыбіні душы, бачыў ён, яна так імкнулася перад ім апраўдацца. Няўжо ён нешта значыў для яе? А можа, і значыць? Можа, чад першага, юнага кахання не выветрываецца з гадамі? Але чаму тады ён, такі стойкі, не закружвае галавы так, каб безаглядна, напралом, не зважаючы ні на якія перашкоды, непаразуменні, выбрыкі аднаго ці другога, кінуцца на стварэнне сям'і, звязаць сябе навечна шлюбнымі абавязкамі? Не, рэдка бывае так... Вось і яны разышліся, не пажаніліся. А можа, усё вяртаецца «на кругі своя»? Але не, што яму вяртацца, у яго сям'я, яны добра жывуць з жонкаю. Навошта паскудзіць, азмрочваць іх адносіны? Навошта ствараць пагрозу сыну? Гэта зразумела, як двойчы два. Толькі ж чаму жыве ў ім увесь час думка пра іншую жанчыну, часам зусім нерэальную, толькі нейкі вобраз, не кажучы ўжо пра Саўкову? Чаму ён павінен заглушаць у сабе цікавасць да Ніны, яе лёсу, чаму павінен цурацца сустрэчы, прыгнятаць жаданне дапамагчы, паспачуваць ёй? У кожнага мужчыны так ці толькі ў яго? Можа, ён проста амаральны, разбэшчаны тып? А можа, іншыя баяцца сабе прызнацца ў гэтым?

Падобна, Ляшчэвіч шукаў сабе апраўданне, чаму ён зараз сядзіць у кафэ з чужою жанчынаю, якая была некаму жонка, чаму не хоча здацца чэрствым і абыякавым да яе? Ён, відаць, хацеў душэўна настроіць сябе і на тое, што будзе потым, можа, нават непрыстойнае, але непазбежнае, іначай Ніна пакрыўдзіцца, яго адмова прынізіць яе, і ў яе будзе права абазваць яго цынікам, сябелюбцам, нават бабаю і хлапчуком. А ёй так патрэбна зараз цяпло, увага, нават ласка, гэта відаць па яе вачах, позірк якіх выносіць з душы тугу і боль, густа перамешаныя ў незразумелае для свядомасці пачуццё, як два сокі, злітыя ў адну шклянку, даюць незразумелы смак. Выпілі каву, Ляшчэвіч разлічыўся, і яны выйшлі з кафэ як бы засмучаныя. Цьмянае, жоўтае святло ад ліхтароў падала на брудны, растаптаны снег. Цені ад высокіх тапаляў на ім былі невыразныя, на няроўнасцях як пакамечаныя, пераламваліся каля сцяны нізенькага будынка — кас стадыёна «Дынама». З коміна над нейкім заводам ці фабрыкаю валіў дым, расплываўся па цёмна-сінім небе шырокім белым палатном. Стукалі па рэйках колы — да вакзала падыходзіў поезд, і Ляшчэвіч уявіў, як прыціскаюцца да вокнаў вагона твары — людзі ўглядаюцца, што за станцыя, ці ёсць на пероне ларок, каб што-небудзь купіць. Сам ён не любіў ездзіць, але жыццё вакзалаў яго чамусьці прываблівала, і ён нярэдка знарок акунаўся ў яго, проста каб забыцца, адключыцца ад нуднай будзённай мітусні.

— Табе куды? — спытаў ён.

— На Мележа... Я жыву ў цёткі, мамінай сястры.

— Далекавата.

— Транспарту хапае...

Яна сказала так, быццам ужо было вырашана, што ён праводзіць яе, але яго бянтэжыць адлегласць.

— Я ведаю...— Гэта было з яго боку пярэчанне, ён паказваў, што спытаў адно дзеля таго, каб ведаць, на які прыпынак ісці.

— Жонкі баішся? — бяскрыўдна ўсміхнулася Ніна.

«Яна — псіхолаг...» — таксама бяскрыўдна, але ў душы, усміхнуўся Ляшчэвіч.

...Кватэру Ніна адамкнула ключом. Ляшчэвіч адчуваў сябе не то як няпрошаны госць, не то зусім як злодзей: прыйшоў у чужую кватэру. Ніна паводзілася

вольна, толькі гаварыла шэптам — яе не бянтэжыла цётка, проста баялася, што разбудзіць дачку. З пакоя выглянула жанчына. Яна была тоўстая, у квяцістым халаце, з чорным грабянцом у сівых, коратка падстрыжаных валасах.

— Цётка, гэта брат маёй сяброўкі... Лены Ляшчэвіч.

— Я толькі што піла каву, чайнік яшчэ гарачы...— Надзіва міралюбна сказала цётка, здаецца, без цікаўнасці глянуўшы на госця.

— Леначка-дзевачка спіць?

— Ага, палажыла...

Каву яны не сталі піць, хоць і зайшлі на кухню.

— Лепш паслухаем музыку,— прапанавала Ніна,— у мяне новыя запісы... Металісты так званыя. Цяжкі рок. Любіш? Пасядзі, я зараз...— Яна выйшла лёгкай паходкаю.

Ляшчэвіч чуў, як яна прасіла цётку: «Перанясі, калі ласка, Леначку... Мы хочам паслухаць музыку».

«Навошта я пайшоў? — раскайваўся Ляшчэвіч.— Адмовіўся б праводзіць — раз перажыў, і ўсё, а цяпер...»

Ніна вярнулася ўжо апранутая ў просценькі байкавы халат, які зрабіў яе вельмі дамашняй, звычайнай. Яна пазвала за сабою Ляшчэвіча. На здранцвелых нагах ён пайшоў услед за ёю.

Пакойчык быў невялікі — тахта, тумбачка, часопісны столік, крэсла і шкляны буфет, у якім замест пасуды стаялі кнігі. На сцяне быў прыклееены вялізны партрэт Вахтанга Кікабідзе — каляндар на 1986 год.

Ніна ўключыла магнітафон зусім ціха. Музыка палілася разам з трэскам, істэрычным лямантам, яна не расслабляла, не супакойвала, а затуманьвала галаву, узбуджала. Ён хацеў быў папрасіць Ніну, каб выключыла, але пабаяўся, што падумае, быццам ён стары дзед, не любіць маладзёжнай музыкі.

Ніна выключыла лямпачку, тузанула за шнурок таршэра — слабое ружаватае святло з-пад сабранага складачкамі мацерчатага каўпака заліло пакойчык, яшчэ больш надало яму ўтульнасці.

Ляшчэвіч сядзеў на крэсле, а Ніна села на тахту, блізка ад яго. Здавалася, адно палажы ёй на плячо руку, і тое, што было ўяўленнем, марою, стане сапраўднасцю. Але як цяжка, неймаверна цяжка зрабіць

гэты рух! Чаму, няўжо толькі яму і толькі з ёй, Нінай? Здаецца, з Саўковай усё вырашылася б прасцей. Тым цяжэй, чым чысцейшае трэба парушыць — так, выходзіць? Яна гаварыла яму нешта, а ён амаль нічога не чуў, думаў, што яму рабіць. Можа, падзякаваць за музыку, падняцца і пайсці? Маўляў, свае джэнтльменскія абавязкі выканаў — правёў, і справе канец. Што яна тады падумае пра яго? О, божа, чаму мы так турбуемся — што пра нас падумаюць? Няхай думаюць, што хочуць, абы мы заставаліся самімі сабой.

Быццам у сне, не чуючы ні стуку, ні голасу, ён бачыў, як Ніна падняла матрац на тахце, выцягнула пасцель, паслала; нетаропка, як і жонка перад ім рабіла, развязала пояс халата, выняла з валасоў на галаве шпількі, кінула іх на столік і, нейкая ўся паветранaлёгкая і халодная ў светлай бліскучай камбінашцы, хуценька шмыгнула пад коўдру. Ляшчэвіч сядзеў атарапелы, як у бясцямнасці. Глядзеў на яе. Яна закінула за галаву белыя аголеныя рукі, млява пазяхнула.

Ёй цяжка, ёй патрэбна ласкавае слова, суцяшэнне, а ён сядзіць як пень, як глухі халодны абух. Яго няма за што паважаць, і сам ён сябе паважаць не будзе. Ніякай жонкаю сябе не апраўдаеш, бо ў думках ужо няраз здраджваў ёй, у той жа камандзіроўцы ў Нясвіжы.

Ён перасеў на край тахты, запусціў рукі пад коўдру, адразу натрапіўшы на маленькія, але круглыя і падатлівыя Німіны грудзі, і дзіўная пяшчота заліла яго ўсяго... Такое бывае хіба што ў сне.

...Дамоў вяртаўся ледзь не ў адчаі. Здаецца, не снег, апельсінава-жоўты, халодны, быў у яго пад нагамі, а жар ад вогнішча — так палымнелі шчокі. Пагана было на душы — пуста. Нешта важнае, патрэбнае з яе назаўсёды забрана. Ён ужо не такі, як быў, і ранейшым ніколі не стане. Страчанага было шкада. З адным у жыцці ён расставаўся з радасцю, з другім, як цяпер,— з горыччу і дакорам, шкадуючы.

Ён ухапіўся ў кватэру і глядзеў на сваю жонку, быццам бачыў яе ўпершыню. Яна была як чужая, і ён прыйшоў да яе зусім выпадкова, на нейкі кароткі час, а потым зноў пойдзе ад яе, каб ніколі не вяртацца. Такое ўражанне, што яны ўжо даўно разведзеныя.

— Чаму так позна? — спытала жонка.

— Аднакурсніка сустрэў...— Ён доўга вешаў на крук шапку.

— Нейкі дзіўны ты... Што здарылася?

— Нічога я не дзіўны,— як мага спакайней, трохі раздражнёна адказаў ён.

— Ну, нейкі не такі, як звычайна...

Ён быў згодны, што — дзіўны: не толькі ён, але, мабыць, і яна, жонка, глядзіць на яго як на чужога. Няўжо псіхалагічны стан аднаго перадаецца другому?

— Нічога, кажу, не здарылася!

Ён пайшоў на кухню, сеў на крэсла і не ведаў, што рабіць, што гаварыць,— не мог пазбавіцца думак пра Ніну, пра тое, што сталася між імі, дакор тачыў сэрца, кроіў, быццам ён учыніў жахлівае злачынства.

— Есці будзеш? — жонка пільна прыглядалася да яго.

— Не. Не хачу...— Ён раптам убачыў у сябе на рукаве доўгую белую валасіну — схамянуўся, непрыкметна сцягнуў яе на падлогу. Заўважыла ці не заўважыла жонка? Канечне, не заўважыла, бо на такую ўліку ўказала б любая, няхай самая тактоўная і выхаваная жанчына.

— Званіла Ленка... Маці блага, не перастае балець нага, распухла... Падазрэнне на тромбафлебіт.

— У бальніцы?

— Была і ў бальніцы, але што тыя ўрачы, раённыя...

Во сынок! Маці і ў бальніцы пабыла, а ён не ведаў. Дзіва што: калі раз у месяц пазвоніць, дык добра, а пісем ужо даўно не піша, бадай са студэнцтва. Паштоўку на 8 Сакавіка, праўда, пасылае штогод. Мацерына хвароба трывожыла яшчэ і таму, што ад яе гадоў пяць назад памерла яе малодшая сястра. А што, калі спадчынная, невылечная?.. Жудасна ўяўляць, што маці памрэ, яшчэ і не старая, няма шасцідзесяці, толькі два гады на пенсіі; што давядзецца яе хаваць і да канца свайго жыцця не бачыць ні яе твару, ні вачэй, ні ўсмешкі, заўсёды дабрадушна-іранічнай, не адчуваць яе шорсткіх, спрацаваных рук, у якіх і цяпло, і ласка, і лекі для душы. Адзін стрэс, другі, цяпер — трэці... За адзін дзень. Ну і нагрузачка, ну і ўдарчыкі! Праўдаткі жартуюць: што жыццё б'е — і ўсё ключом, і ўсё па галаве. Слабы стрэс выбіваецца больш моцным: усе думкі цяпер закружыліся вакол маці. Ніна і ўсё, што

было між імі, засталіся недзе далёка-далёка, быццам на тым канцы зямлі, дзе наўрад ці ўдасца яшчэ калі-небудзь апынуцца.

— Ленка гаварыла, што, можа б, сюды яе на абследаванне...

— А яна зможа прыехаць?

— Ну не цяпер, а як трохі палепшае ёй.

Гэта ён, Ляшчэвіч, сам гады два назад прапаноўваў маці паказацца сталічным дактарам, але тады хвароба яшчэ не вельмі турбавала, і яна адмовілася. А цяпер хвароба гэтая, мабыць, абвастрылася, пайшла ў чарговую атаку на сасуды. Марудзіць было небяспечна: у любы момант тромб, адарваўшыся ад сценкі сасуда, мог спыніцца і паставіць кропку на жыцці. Нядаўна ў інстытуце хавалі мужчыну, яшчэ не старога. Быў жыццярадасны, вясёлы, гумарыст, ніколі не скардзіўся на здароўе, шчокі як два буракі — і раптам: закупорка лёгачнай артэрыі.

Цяпер, хоча ці не хоча маці, трэба настойваць, каб яна прыехала, балазе ў яго знаёмы доктар — прафесар, членкор АМН СССР. Ён — бацька яго таварыша па рабоце, Косці Бірукова — хударлявага, у акулярыках з чорнай драцяной аправай хлопца. Косця ні бельмеса не петрыў у чарцяжах, здаецца, зусім быў далёкі ад іх, слыў у інстытуце дзівачком-меламанам, але быў вельмі душэўны, далікатны, проста нясмелы. Ляшчэвіч, спачуваючы хлопцу, дапамагаў яму чарціць, «кляпаць» праекты. Косця разы два запрашаў яго ў госці, на каву, паслухаць музыку з маленькага японскага магнітафончыка з навушнікамі, на якім вялікімі белымі літарамі было напісана: УНІСЭФ. У адзін з такіх візітаў Ляшчэвіч і пазнаёміўся з Косцевым бацькам. Гэта быў высокі, надзіва рухавы светлавалосы мужчына з дробным, як і ў сына, тварам, на якім дзвюма чорнымі кропкамі блішчалі глыбока схаваныя пад лоб вочы. Гаварыў ён неяк адрывіста, як адсякаў словы, быццам хацеў здавацца кожную хвіліну салідным. Даў Ляшчэвічу візітку, на адным баку якой былі напісаны па-руску, а на другім па-англійску ўсе эскулапскія званні і пасады. Такая ўвага да Ляшчэвіча была не так сабе, нездарма — Косця, канечне, сказаў бацьку, што гэты чалавек яму шмат дапамагае.

Мабыць жа, і прафесар Ляшчэвічу не адмовіць, калі ён папросіць, ці сам няхай паглядзіць маці, ці па-

спрыяе, каб паглядзелі іншыя, спецыялісты іменна па гэтай хваробе, бо хоць і не разбіраўся толкам Ляшчэвіч у дактарах, здаецца, гэты свяціла медыцыны не туды свяціў. Але ў яго аўтарытэт, сувязі, ён дамовіцца з кім трэба.

Ляшчэвіч заказаў тэлефонную размову з сястрою — у райцэнтр кода не было; дачакаўшыся званка, і цяпер задуменнасць яго ўжо не бянтэжыла жонку, ён сказаў сястры, каб маці ехала ў Мінск. Сястра жыла ў райцэнтры ў двухпакаёвай кватэры-«хрушчоўцы», мела машыну, і яны часта сям'ёю ездзілі ў вёску да маці — балазе недалёка, нейкія два дзесяткі кіламетраў,— бралі там сала, бульбу, капусту, памідоры, варэнне, усякую ўсячыну з лесу, град, пограба і кладоўкі. «Няблага жывецца»,— часам не то з дакорам, не то з зайздрасцю думаў Ляшчэвіч. Магазіны ў горадзе забіралі шмат грошай, і яны ў сям'і ледзь зводзілі канцы з канцамі; як неверагодная мара прыходзіла часам думка, што некалі можна будзе купіць машыну — хоць, расказваюць, скардзяцца, абураюцца некаторыя, і клопатная гэта справа, але вельмі неабходная ў кантора-магазінна-прыпыначным гарадскім жыцці.

— Ну пакуль...— як заўсёды, на разважліва-аптымістычнай ноце скончыла размову сястра.

У Ляшчэвіча акурат гара з плеч звалілася, быццам нанова на свет нарадзіўся, як часам бывае ў страхотлівым сне — прачнешся і так абрадуешся, што гэтага ў сапраўднасці з табою не было.

Ён спытаў у жонкі, дзе сённяшнія газеты, і ўжо больш-менш спакойны, улагоджаны пайшоў у пакой, каб там, лежачы на канапе, пачытаць іх. Газеты апошнім часам сталі цікавыя, друкавалі шмат вострых матэрыялаў пра хабарнікаў, спекулянтаў, прыстасаванцаў, бюракратаў, алкаголікаў і наркаманаў — пра ўсю тую муць, што падымаецца з дна і плыве ў светлай рацэ жыцця. Вяртаючыся з работы, Ляшчэвіч заўсёды з хапатлівасцю, прадчуваючы асалоду ад чытання, адмыкаў паштовую скрыню.

Недзе напрыканцы студзеня, вось так выняўшы са скрыні газеты, Ляшчэвіч убачыў, што з іх выткнуўся і сіні ражок канверта. З ДАІ! А ён, прызнацца, ужо рэдка пачаў успамінаць, што паслаў скаргу,— астываюць старыя пачуцці, даючы ў душы месца новым. На сіненькім бланку за подпісам начальніка ДАІ УУС Мін-

гарвыканкома Ляшчэвіч прачытаў: «Грамадзяніну Ляшчэвічу С. В. Ваша заява Дзяржаўтаінспекцыяй г. Мінска разгледжана. Паведамляю, што за дапушчанае парушэнне Правіл дарожнага руху вадзіцель аўтамашыны УАЗ д. н. 88—44 МИЩ Базута М. М. накіраваны на праверку ведаў Правіл дарожнага руху».

Ён з радасцю паказаў жонцы ліст.

— Хутка адказалі,— не беручы яго ў рукі, сказала яна.

— Трэба ведаць, як пісаць! — казырнуў Ляшчэвіч. Увогуле ён не любіў сябе хваліць, і калі гэта рабіў, дык дзеля жарту, а не так, як некаторыя — і часта, і ўсур'ёз. Але яму было прыемна, што не махнуў рукою, пастаяў за справядлівасць, што яго турбуе нядбайства, няхай сабе і нязначнае, дробнае. Праўда, ён і блізка не задумваўся, ці зрабіў бы так, калі б той шафёр апырскаў не яго, а, скажам, тую жанчыну ў акулярах. І калі — не, не зрабіў бы, то грош цана — і яму, і яго абурэнню.

— Ну, на аднаго ты напісаў, а колькі такіх...— зводзіла на нішто яго намаганні жонка.

— А калі кожны напіша? — знайшоў, што адказаць Ляшчэвіч.

— Ага, чакай — сыр з'ясі,— з'язвіла жонка.— Ніхто звязвацца не хоча.

— Ды ўсе мы разлічваем, што добры дзядзька за нас зробіць! Так і думаем: я заняты, я не дробязны, я сціплы, я высакародны... няхай хто другі. Як быццам другому і праўда няма чаго рабіць.

— Загаварыў...— хмыкнула, усміхнуўшыся, жонка.— Не дараваў адзін раз нахабніку, дык ужо нос задраў, а колькі разоў закрываў вочы...

— А можа, гэта пачатак, можа, цяпер я ніякай брыдзе саступаць не буду? — пра сур'ёзнае, але жартам сказаў Ляшчэвіч.

— Паглядзім.— У жончыным голасе была іронія.— Дарэчы, маці дакладна не перадавала, калі прыедзе?

— Не. А што?

— Білеты ў нас у тэатр на суботу. Дастала... Цікавы спектакль.

— Ну, канечне ж, у гэтую суботу яшчэ не прыедзе. Мне ж папярэдне трэба дамовіцца з людзьмі... з Біруковым.

— Няма з кім Славіка пакінуць... А пра пастаноўку «Глядзіце, хто прыйшоў» усе шумяць.

Ляшчэвічава жонка хадзіла на тыя спектаклі, фільмы, чытала тыя кнігі, артыкулы ў газетах, якія «шумелі». Яе цікавіў не столькі іх змест, колькі сам факт, што яна глядзела ці чытала, тады ў размове з сяброўкамі магла фарсануць, што далучана да самых модных павеваў. Яна раўніва сачыла за модаю, імкнулася адзявацца з шыкам, хоць, як кажуць, яе цягнік пайшоў і ёй ужо не ўгнацца за пятнаццаці-шаснаццацігадовымі дзяўчаткамі, якія імгненна мянялі пакроі, колеры, прычоскі.

Апошнім часам ажыятаж распаліўся вакол тэатра-студыі кінаакцёра, туды цяжка было трапіць, але жонка праз сакратарку дырэктара вучылішча, муж якой рабіў у тэатры электрыкам, дастала білеты.

— Пачакаем суботы.— Ляшчэвіч быў не супраць схадзіць: столькі было надзей на гэтыя тэатры, калі прыехаў з вёскі ў Мінск, ды аказалася, не так проста і час знайсці, і выбрацца.

У суботу Ляшчэвіч раптам успомніў, што ўвечары яму трэба яшчэ і ў басейн. Выбірай — калі ласка! Басейн з саунаю не хацелася прапускаць. Пачаўшы хадзіць у яго, ён адразу падужэў, адчуў бадзёрасць, палепшыўся сон, і радасна было думаць, што гэта добрая замена бегу, таксама апора ў вірлівым кругазвароце жыцця. Але і ў тэатр не заўсёды вырвешся. Праўда, жонка не настойвала, каб ён ішоў з ёю,— напрошваліся сяброўкі, а яна заўсёды імкнулася зрабіць ім прыемнае, каб лішні раз выставіць сябе, пацешыць самалюбства. Ляшчэвіч разумеў: не пойдзе на спектакль цяпер — магчыма, не зможа пайсці і год, і два. Гэта адно здаецца, што проста схадзіць у кіно, тэатр, на выстаўку. Дробная мітусня так закручвае, носіць па сваёй арбіце, што, каб вырвацца з яе, патрэбна, па-першае, воля, а па-другое — нешта абавязкова занядбаць.

— Добра, я ўсё-ткі пайду з табою,— сказаў ён жонцы,— але як са Славікам?

— Пабудзе адзін,— рашуча адказала жонка.

З год назад пакідаць сына аднаго — было гэтак жа неверагодна, як вось зараз узяць ды паляцець на Марс ці Венеру. Ён баяўся застацца адзін нават на мінуту; схадзіць па газеты — трэба ўпрошваць, пакідаць адчыненымі дзверы; цяпер жа, здаецца, ён пасмялеў, ад-

пускаў у магазін, гуляў у пакоі, не злякаючыся, ці дома хто з бацькоў — а раптам выйшлі? Ляшчэвіч прыкмеціў, адкуль гэтая сынава перамена пачалася: з таго часу, як пайшоў у «нулёўку». Напачатку вучоба здавалася яму такою пакутаю, што ён гатовы быў застацца адзін у кватэры, абы толькі не ісці ў сад. «Я не пайду ў сад»,— хныкаў ён раніцаю. «А дзе ты будзеш?» — «Дома».— «З кім? Мы ж на працу пойдзем...» — «Ну і што. Адзін буду...» Прынамсі, гэта яго смеласць не толькі здзіўляла, але і радавала: выходзіла, сын пасталеў, смакаваў самастойнасць і не так прывязваў да сябе бацькоў.

— Доўга ўсё-ткі ды вечар,— засумняваўся Ляшчэвіч.

— Нічога страшнага, мы зараз паложам яго спаць, не будзем яму гаварыць...— шэптам сказала жонка, каб не пачуў сын, які гуляў у калідоры кардоннай мазаікай, складваў з яе малюнкі жывёл.

— Ты звар'яцела, ці што? — не ўтрываў, павысіў голас Ляшчэвіч: часам жонка проста дзівіла бязглуздасцю сваіх задумаў, якія яна рабіла ўсур'ёз і безапеляцыйна.— А раптам ён прачнецца?

— Не прачнецца! Славік, хадзі, сынок, спацькі! — Яна пайшла да ложка сцяліць сыну пасцель.

— Не хачу, мама, яшчэ рана, я казку не глядзеў...

— А ты ляжаш і будзеш глядзець.

Яна ўлажыла сына, і ён, падпёршы рукамі шчочкі, глядзеў на тэлевізар. Гэты жончын намер выводзіў Ляшчэвіча з сябе: цяжка ўявіць, што пачнецца, калі дзіця, прачнуўшыся, убачыць, што няма бацькоў. Ды з ім можа прыключыцца чортведама што: і псіхіка парушыцца, і голы ды босы выскачыць на вуліцу.

— Ведаеш, Каця, або яму трэба сказаць, што мы пойдзем, або некаму з нас не ісці,— сказаў Ляшчэвіч цвёрдым голасам, бо не сумняваўся, што слушна гаворыць.

— Я суседку папярэджу... Яна будзе наглядаць.

— Ды што суседка! Яна праз мінуту думаць забудзе пра твайго сына. Не будзе ж яна сядзець каля яго і караўліць.

— Тады ты не ідзі...

Ляшчэвіч адчуваў, што разгараецца спрэчка, што здавацца трэба яму. Жонка не саступіць — жаночая ўпартасць! Ды і натуру такую мае: ніколі не робіць

паварот, каб зноў з самага пачатку перабраць па звёнцу ланцужок сваіх довадаў. Але як яму здавацца, калі спрачаліся цяпер не вакол нейкай эфемернай ідэі, а вакол ісціны яўнай: сын яшчэ малы, каб пакідаць яго аднаго. І ён ужо каторы раз падумаў, што, як добра было б, колькі праблем знялося б, калі б жыла ў іх, як у некаторых маладых сем'ях, бабуля, скажам, маці яго ці жончына. Тады і пасля работы не трэба было б, захакаўшыся, бегчы забіраць сына, і свежая страва заўсёды стаяла б на пліце, і парадак у кватэры быў бы, і ў выхадныя не сядзееў бы як прывязаны дома... Аднымі словам, вольніца! Яго маці во прыедзе падлячыцца, можа, пагаварыць з ёю, каб пажыла з год у яго. Але не, не згодзіцца яна: там, у вёсцы, куры, свінні, карова, бацька адзін не справіцца дый не захоча — ад суму памерці можна. Жончыны бацькі маладзейшыя, яшчэ працуюць; праўда, жыве з імі бабуля, але ёй за восемдзесят і яе самую трэба глядзець — толькі лішні клопат. Хоць трэсні — нянькі няма. А гады ідуць — лепшыя, маладыя, калі і можна нешта зрабіць, убачыць, паспытаць, адчуць асалоду; агледзішся — як кажуць, «ужо не да глупстваў». Адно спадзяванне і застаецца — чакаць: а раптам прыйдзе час, і тое, да чаго ты рыхтаваўся, імкнуўся, адкрыецца табе ва ўсёй паўнаце, шчодрасці і неабмежаванасці?

— Я не пайшоў у басейн, а цяпер і ў тэатр не ісці? Ну, раз так! — Ляшчэвіч рашуча падышоў да сына.— Славічак, мы з мамай зараз ідзём у тэатр... ты пабудзеш адзін.

— Гэта ў такое, што мы глядзелі... «Воўк і сямёра казлянят»?

— Ага, такое... толькі дарослае.

— Навошта ты сказаў яму? — падскочыла жонка, твар яе пабялеў.— Ідыёт жа ты!

— Правільна, татачка, што ты мяне папярэдзіў... Малайчына! — як дарослы малога, сур'ёзна пахваліў Ляшчэвіча сын.

Жонка заікнулася, зіркала то на мужа, то на сына.

— Я вось навяду будзільнік, калі зазвоніць — уключыш тэлевізар. Паглядзіш казку — выключыш.— Ляшчэвіч не хацеў, каб доўга працаваў тэлевізар — пабойваўся, што ад перагрэву, чаго добрага, загарыцца — колькі выпадкаў!

— Добра, тата,— з удзячнасцю і ліслівай згодаю

сказаў сын, перавярнуўшыся на спіну. Як яны ўсё разумеюць, дзеці! Мы, дарослыя, проста самаўпэўненыя, таму і не заўважаем, не хочам заўважаць, каб не прыніжаць сябе, што дзеці ў псіхалагічных тонкасцях калі не пераўзыходзяць нас, то на роўных з намі.

— А то бывае, што тэлевізар доўга ідзе і загараецца. І дзеці тады хаваюцца пад стол ці пад канапу... і-і згараюць.

— Што ты плявузгаеш, толькі палохаеш малога?— зноў прарэзаўся голас у жонкі.

— Кацярына, калі ласка, адыдзі,— папрасіў Ляшчэвіч, улагоджаны сынавым разуменнем.

— Як згараюць? — У вачах у сына ўспыхнула цікавасць, звычайная, дзіцячая, але, мабыць, не толькі цікавасць, яшчэ падмешваўся і страх. Дзеці баяцца часта ад няведання, падумаў Ляшчэвіч, ім трэба растлумачваць, інакш страх напластуецца ў падсвядомасці, адкуль яго потым і ў сталым узросце не заўсёды ўдаецца выбіць.

— Ну, агонь, пажар — па тэлевізары ж бачыў... Але хавацца нікуды не трэба. Трэба выскачыць на калідор ці на вуліцу і закрычаць.

— А я пазваню пажарным, яны прыедуць і затушаць,— сын гаварыў спакойна, разважліва, не разумеючы, канечне, як усё зменіцца і што зробіцца з ім, калі раптам шугане, затрашчыць, загудзе полымя, папаўзе дым.

— Лепш няхай дарослыя пазвоняць, а ты хуценька бяжы ім сказаць,— Ляшчэвіч хацеў проста ўбіць сыну ў галаву, што трэба яму рабіць на выпадак пажару ці іншай бяды. Бо пакідаць малога аднаго, няхай і на тры гадзіны,— усё ж такі рызыка.

— Добра, тата...— паабяцаў сын адданым голасам, і Ляшчэвіч не сумняваўся, што, калі трэба, той зробіць іменна так.

Але на душы, і калі ехалі ў тралейбусе, і потым ужо ў тэатры, калі, чакаючы пачатку спектакля, сядзелі за столікам і пілі каву, было трывожна, ва ўсякім разе ў Ляшчэвіча. А можа, проста на яго твары выразней, чым на жончыным, фіксуюцца душэўныя пачуцці?

Спектакль расчараваў, прынамсі, яго першая частка. Ніякага напружання, набор банальнасцей, за якімі ні сэрца, ні болю, ні пачуццяў. Калі не перажыў сам, не выпакутаваў душою, не кранеш і другога, падумаў



*Тралейбус зрабіў круты разварот і выехаў на тую вуліцу, дзе калісь, будучы студэнтам, Ляшчэвіч жыў на кватэры.*

(«Нізкі тонус»)

Ляшчэвіч. Жонцы пастаноўка якраз падабалася. Зрэдчас яны перашэптваліся, спрачаліся, пакуль на іх не засыкалі суседзі. У канцы першай часткі на сцэну выйшлі два новыя героі — забулдыжныя, ультрамодныя хлопцы з магнітафонамі ў руках. Завязалася інтрыжка, і Ляшчэвіч, які ўжо быў намерыўся ісці дахаты, вырашыў дасядзець да канца.

У перапынку ўсе кінуліся ў буфет, а ён спусціўся з другога паверха ўніз, дзе пры ўваходзе вісеў тэлефон, і пазваніў сыну. Дзіўна, але ў сына быў вясёлы голас — падобна, ён не сумаваў. «Што ты робіш?» — спытаў Ляшчэвіч. «Гуляю... гляджу тэлевізар»,— адказаў сын. Павесіўшы трубку, трохі паспакайнелы, Ляшчэвіч пайшоў у буфет. «Як Славік?» — спытала жонка. Яна ўжо сядзела за сталом і піла каву з маленькага чорнага кубачка. «Вясёлы!» Жонка апусціла хуценька вочы, мабыць, зразумела сваю памылку.

Другая частка сапраўды глядзелася — «выцягваў» артыст, які іграў ролю лазеншчыка, аднаго з тых забулдыжных хлопцаў: што ні рэпліка — то гумар (і ў зале — смех), што ні рух — дык натуральны. «А можа, усё-ткі справа не ў п'есе, а ў артыстах? — падумаў Ляшчэвіч.— Як і не ў праблемах, а ў людзях». Спектакль прымусіў разважаць, і Ляшчэвіч ужо не так перажываў, што пайшоў на яго.

Пакуль стаяў у чарзе ў гардэроб, жонка званіла дахаты,— бачыў ён: нешта не тое, набірае і набірае нумар. Падышла заклапочаная.

— Заняты і заняты тэлефон...

— Можа, трубку няправільна палажыў ці хто звоніць? — Ляшчэвіч адчуў, як пахаладзела ўсярэдку, па нагах пракацілася млявасць.

— Доўга ж...

Ляшчэвіч не помніў, як апраналіся, як выйшлі на вуліцу,— усе думкі пра сына: «Што там?»

— Давай возьмем таксі! — сказала жонка, убачыўшы, што набліжаецца свабоднае таксі — наверсе свяціўся размаляваны «шашачкамі» шкляны плафончык. Яна замахала рукою, але таксі не спынілася. Па выкліку? Але чаму тады сігнал — што незанятае? Чорт ведае што робіцца! Запамінаць нумар ды зноў пісаць скаргу, на гэты раз у таксапарк? Дзякуй богу, тэлефонная будка не ездзіць, стаіць на месцы. Ляшчэвіч кінуўся да яе, набраў нумар.

— Алё, Славік? Ты што, размаўляў з некім?

— Цёця Лена званіла... Гаварыла, што бабуля прыязджае ў наступную пятніцу. Тата, я хачу да цябе...— Сын хліпаў носам, голас дрыжаў.— Я ба-а-аюся...

— Мы ўжо едзем, сын, пачакай крышку.

— Мне ўжо надакучыла чакаць... мне страшна,— румзаў малы.

— Ну яшчэ крышку пацярпі, добра? — Павесіў трубку.— Канечне, столькі быць аднаму... гэта калі б яшчэ днём,— сказаў ён жонцы і, глыбока ўздыхнуўшы, з натугаю выпер з лёгкіх паветра.

— Трэба хоць шакаладку яму купіць за смеласць,— сказала ўзрадавана жонка.

— Дзе цяпер купіш? Усё зачынена.

— А вунь кафэ.

Свяціўся той павільёнчык, у які Ляшчэвіч апошнім часам хадзіў абедаць. Ніколі б не падумаў, што ён так позна працуе. Колькі дзівосаў адкрываеш вакол сябе і колькі іх існуе невядомых, бо з імі не сутыкаешся.

— Давай хутчэй.

Жонка зайшла ў кафэ, але хутка адтуль вылецела спахмурнелая: шакаладак не было.

— Не бяды,— супакоіў Ляшчэвіч.— Ён і так нацярпеўся, навошта яму яшчэ шкоду рабіць.

— Не зразумела.

— Здаўна лічыцца, што цукеркі, шакалад — дзецям добрыя падарункі, а на самай справе — звычачы дабра, наносіш шкоду здароўю. Лішніца салодкага — чаго толькі не парушае ў кволым дзіцячым арганізме... Нядаўна пра гэта перадачу глядзеў.

— Мне няма калі сядзець перад тэлевізарам! — папракнула жонка, адхіліўшы мужаў аргумент, і толькі таму, што раззлавалася, не купіўшы шакаладкі.

...Сын быў заплаканы, вочы стомленыя, сумныя, твар бледны. Ён кінуўся да Ляшчэвіча, абхапіў яго за ногі, быццам не бачыў сто гадоў.

— Вы больш не пойдзеце, не? — дапытваўся ён і аддана глядзеў у вочы — хоць плач.

— Не пойдзем,— паабяцаў Ляшчэвіч, адчуваючы, што гаворыць не дзеля таго, каб суцешыць сына; не хлусіць ён, цяпер сапраўды не хутка пойдзе ў тэатр. І не толькі з-за сына, а таму, што ў яго не будзе патрэбы туды ісці: тая нішка ў душы, прызначаная на тэ-

атральныя эмоцыі, запоўнена, і запоўнена надоўга. Што можа яе ачысціць, вызваліць месца новым уражаннем — Ляшчэвіч не ведаў, як і не ведаў ён, што заўтра ёй, душы, захочацца, куды скіруе яна свае жаданні і намеры. Нідзе ні ў чым яна не знайшла прарыву, каб цягнуць у сябе, як у магутнае сопла, усе інтарэсы, думкі, пачуцці. Адно перабівае другое, раздрабняецца, расплятаецца на сотні накірункаў. Вось і новы клопат — прыязджае маці. Гэта і ёсць галоўны клопат, астатняе — дробязь, дробязь, дробязь... як непазбежнае запаўненне існасці.

Назаўтра ён не знаходзіў сабе месца, не ведаў, што рабіць, за што ўзяцца. Хацеў пазваніць Бірукову-старэйшаму, але падумаў: навошта тлуміць чалавеку галаву ў выхадны дзень, пазваніць лепш у панядзелак ці аўторак на працу. Урэшце жонка, бачачы яго непрыкаянасць, сказала: «Схадзі ты ў лазню, не горш, чым твая саўна з басейнам... з венічкам выпарышся хоць». Яна сабрала яму ў сумку ручнік, вяхотку, мыла, старую фетравую шляпу, якую надзявала сама ў парылку, і Ляшчэвіч, адчуўшы палёгку, пайшоў у лазню.

Мароз быў невялікі, але падкручвала завея, дзьмуў вецер, і трывожыла Ляшчэвіча, што для лазні не лепшае гэта надвор'е. Прахопіць скразнячком — горла ці вуха забаліць, качайся ў ложку, сядзі на бюлетэні, з афармленнем якога заўсёды столькі марокі.

Каля лазні — жоўтага двухпавярховага будынка, частка сцяны якога заўсёды сырая, з яе лёгенька курыцца ў мароз пара,— стаялі ў рад легкавыя аўтамашыны, у некаторых снег заляпіў вокны — як бяльмо на воку.

«Многа народу ў лазні, мабыць...» — падумаў Ляшчэвіч.

Ён купіў у касе білет — звычайны, як і ў магазіне, чэк, на ўваходзе інтэлігентны лысаваты высокі стары ў белым халаце надарваў яго. Ляшчэвіч перш думаў, а цяпер убачыў, што народу ў лазні сапраўды шмат — столькі, здаецца, колькі і хадзіў, дык не было. Чарга, запрудзіўшы прылазнік, спускалася па лесвіцы з другога паверха аж на першы.

— Ну і народу! — сказаў Ляшчэвіч да пажылога, у шэрым світэры, мужчыны, які быў апошні ў чарзе.— Чаму-та столькі?

— Мароз вялікі быў — баяліся, а цяпер усе вылез-

лі,— засмяяўся мужчына, і Ляшчэвіча здзівіла, што, падобна, мужчыну зусім не турбуе чарга. Канечне, пенсіянер, спяшацца няма куды. Але такі мог бы і ў звычайны дзень схадзіць — гэта адно, а па-другое, вісіць жа аб'ява, што ўдзельнікаў вайны прапускаюць без чаргі. Мабыць, далікатны чалавек, не хоча звягі, бо ўсё роўна ж, хоць і дазволена, які-небудзь хамула гаўкне: «Куды прэшся?» — ды яшчэ за каўнер возьме.

Сумна было стаяць у такой вялікай чарзе, хоць і чуў то навіну, то свежы анекдот, то цікавае здарэнне. Добра-такі, што прыхапіў з сабою газеты. Ледзь не на памяць вывучыў іх, пакуль падняўся ў прылазнік. Вызвалілася месца, і ён сеў на лаўку.

— Пасядзі,— сказаў да яго сусед, чорны мужчына з каструбаватым, знявечаным воспаю тварам.— Гэта ж не воддых, а работа палучаецца...

— Увесь дзень прастаяўшы — канечне! — падтрымаў яго, засмяяўся тоўсты, з кароткай шыяй і адвіслым няголеным падбародздзем дзяцюк у засаленым пінжаку.

З лазні людзі выходзілі нячаста. Дзіва што — столькі чакалі і цяпер дарваліся да вады, да парылкі. Каторыя праныры шукалі магчымасці прарвацца без чаргі. То не супыняючыся, нахабна, прамым ходам ішлі ў дзверы, і людзі, не расшалопаўшы, іх прапускалі. То прасілі знаёмага, што стаяў бліжэй, узяць сумку, а самі потым прасілі ў чаргі дазволу нібыта ў некага ў лазні нешта спытаць — і, зайшоўшы, ужо не выходзілі. Таго-сяго праводзіў лазеншчык — сутулы, хударлявы мужчына, з белым потным тварам, нервовымі калючымі вачыма,— проста браў за руку і цягнуў у лазню. Нехта незадаволена бурчаў, але ён не звяртаў увагі.

Ляшчэвіч ужо дакараў сябе, што паслухаўся жонку і пайшоў у лазню. Задаволіўся б, ці, як кажуць, перабіўся б ваннаю, затое быў бы спакойны. Нішто яго так не муштравала, як марнатраўства, чаканне, якога магло б і не быць, уся «дурная работа», як гаварылі ў іх вёсцы на тое, без чаго можна проста абысціся, але нечая воля змушала рабіць.

Калі ён выйшаў з лазні, ужо вечарэла. Завіруха не сціхала, засыпала канаўкі на трамвайных пуцях, высцілаючы белыя стужкі. Ляшчэвіч нацягнуў на галаву башлык ад курткі. Лазня лёгкасці, радасці не прынес-

ла — не было ні венікаў, ні прасцін, і вага, якая заўсёды стаяла ў раздзявалцы, кудысьці знікла, сапсавалася, ці што. Але — бог з ёю, з вагаю, драбяза ўсё гэта, не варта па ёй пыцы. Лепш думаць, як сустрэць маці, як дамовіцца, каб паглядзеў яе класны доктар, можа, трэба палажыць і на абследаванне.

У панядзелак, спытаўшы ў Косці тэлефон, Ляшчэвіч пазваніў ягонаму бацьку, прафесару Бірукову.

— Слухаю вас,— пачуў ён у трубцы знаёмы голас, з трохі чужаватым адценнем саліднасці, таямнічасці, ці што. Ляшчэвіч растлумачыў, хто ён і чаго звоніць.

— Калі ласка, калі ласка,— адказаў прафесар, быццам ён быў гасподзь бог, якому блізкія просьбы, малітвы і беды ніжэйшых стварэнняў.— Прыводзьце сваю маму.— І на Ляшчэвічава «да пабачэння»: «Усяго добрага, мой друг!»

Ляшчэвіч, здаецца, скінуў з сябе спружыністую кальчугу, якая сціскала яго, цяжэла на плячах, хоць і не перастала тачыць сумненне, што не ўсё так лёгка будзе вырашыць. І наогул — у яго быў няпросты прамежак жыцця. Можа, вонкава і просты, для душы — няпросты. Сутнасць жыцця, складанае яно ці лёгкае, вызначаецца глыбінёю пражытага, а не колькасцю пераездаў, прафесій, жонак, дзяцей...

А тут яшчэ зноў выклікаў Марускоў. Напусціў на сябе строгі, важны выгляд, але вочы здрадліва выдавалі змесціва ягонае душы — там не было ні злосці, ні пыхі.

— Што са справаздачаю? — гартаючы паперы і як бы ўнікаючы ў тое, што ў іх было напісана, спытаў Марускоў.

— Складзена як і трэба,— адказаў Ляшчэвіч, збянтэжыўшыся і жахнуўшыся, што зусім забыў ён на заўвагу загадчыка. Затлуміўся, закруціўся — і забыў. Мабыць, не мёдам лягла яму на сэрца заўвага тая, неістотнаю здалася, неабавязковаю, няйнакш, прыдзіркаю.

— У час — гэта правільна, але ж у мяне была прапанова.— Марускоў не паднімаў вачэй. Ляшчэвіч адчуў, што яго ўпартасць загадчыку не спадабалася. Упартасць нікому не падабаецца. Усе любяць чалавека рахманага, пакладлівага.

— Ведаеце, я не бачу асаблівых прычын мяняць сутнасць сваёй справаздачы.

Марускоў прамаўчаў: мабыць, разумеў, пачні націскаць — выявіш сваю бязглуздасць. А гэта ўсё-такі свой супрацоўнік, думка якога суседзіцца да іншых дусмак, з якіх і вырастае меркаванне. Лепш напусціць на твар выраз шматзначнасці, мудрасці і маўчаць.

— Я лічу, што гэты дырэктар нічым не вылучаецца сярод іншых і не заслугоўвае, каб ішлі ў яго на падку,— Ляшчэвіч адчуваў, што гаворыць не пустыя словы, абы пярэчыць, а тое, што стала яго перакананнем. Толькі ці можа быць у падначаленага перакананне, калі яно не супадае з перакананнем начальніка?

Марускоў яго ўважліва, аж зачырваненіся кончыкі вушэй, слухаў.

— Ну-ну, далей, далей...— Марускоў, мабыць, добра завучыў, што шматзначнасці ніколі не надасі словамі, зразумелай размоваю, яна ў намёках, міміцы, у рэпліках.

Ляшчэвіч адчуваў, што загадчык трымаецца не за сваю ідэю, ён адстойвае нейчую, чужую, можа, якога ўплывовага таварыша, пярэчыць якому ён не можа. Магчыма, ужо тонка, далікатна паспрабаваў, але, як кажуць, неўпратык.

— А чаму-та я, скажыце, павінен адмаўляцца ад сваёй ідэі, калі яна здалася некаму памылковай?

— Таму што яна шкодзіць агульнай справе! — прарвала нарэшце Марускова, і ён, зыгнуўшыся ў крэсле, папраўіў пад пінжаком падцяжкі.

— А я лічу, што на карысць,— адказаў Ляшчэвіч, баючыся, каб не павысіць голасу. Ён даражыў сваёй ідэяй, але даражыў і работаю, іменна работаю, а не пасадаю. Акажыся ён зараз без работы — і што тады? Колькі чыстага сумлення закаламучана, светлых струн парвана ў душах самай рознай вышыні палёту з-за боязі страціць работу?

— Сваё «я» пакінь на потым,— Марускоў уперыў у яго вострыя, але не злыя, а нейкі смяшлівы позірк,— а зараз прэч адсюль і рабі, што табе гавораць! — Ён нават крыху пачырванеў і адчуў сябе няёмка.

Ляшчэвіч устаў рашуча, але сказаў спакойным голасам:

— Мне што, я перараблю.— Ён паказваў, што не вельмі ўступае сваім прынцыпам, нялёгка ідзе на згоду, бо не хацеў балюча раніць самалюбства. Самалюбства ён шанаваў, годнасцю памыкаў, а гонарам не да-

ражыў. Забіты гонар, замкнуты пад сямю замкамі, і рэдка калі ўсе замкі адмыкаў: два, тры, чатыры... Калі не можа нічога памяняць, настояць на сваім, то чаго лезці на ражон? Урэшце, будзь ты хоць геній, начальнік заўсёды знойдзе за што прычапіцца, аб'явіць вымову. Выб'ешся ты ў начальства, тады будзеш дыктаваць ты. Проста лёгка быць шчодрым, добранькім, ні за што не адказваючы. Ён разумеў і ў нечым нават апраўдваў Марускова, хоць адчуваў сябе прыгнечаным і пакрыўджаным.

Ён сеў і за паўгадзіны перапісаў справаздачу — так, як хацеў загадчык. Няхай радуецца, пацірае рукі ад радасці. Можа, у гэтым — дэманстраваць сваю ўладу — уся яго сутнасць? Але як бы ні ставіў сябе Ляшчэвіч у думках вышэй за Марускова, на справе даказаць гэтага не мог.

Ад бяссілля міжволі прапалі, як бы ўлятучыліся бадзёрасць і смак жыцця. Ён пазваніў свайму сябрудаднакурсніку, Івану Шэлеху, які працаваў у міністэрстве лясной гаспадаркі і з якім тады-сяды сустракаліся. Той абрадаваўся: «Сяргей? Даўно не чуў твайго голасу! Давай пасля работы састыкуемся. Я акурат са Свіцязі прыехаў, таранкі прывёз...» Такога захаплення ад Івана Ляшчэвіч аніяк не чакаў, хоць яны даўно сябравалі. Лічы, з першага курса, калі і пазнаёміліся. Цяжка сказаць, што людзі знаходзяць блізкага адно ў адным, бо чалавек усё-ткі мяняецца. Можа, тое, што яны абодва з вёскі, выраслі каля вады: Шэлех — на Свіцязі, ён, Ляшчэвіч,— на Сажы. Можа, душэўная мяккасць, няўменне на нахабства адказаць нахабствам; урэшце, няздольнасць на подласць — найдаражэйшая з людскіх якасцей. Ва ўсякім разе так думаў Ляшчэвіч, і ён жа разумеў, што і тут усё адносна, бо ніхто не думае пра сябе кепска.

Яны сустрэліся каля ўвахода ў метро з боку тэатра Янкі Купалы. Іван быў у чорным кажусе, у шапцы з бабра. Ды першае, што кідалася ў вочы,— гэта ўсмешка на твары. Здаецца, яна выбівалася адусюль: з вачэй, з маршчын, з зубоў, са шчок. Гэта рэдкія людзі, у якіх увесь твар як бы з усмешкі. Калісь, будучы на практыцы аж на Украіне, ён бачыў яшчэ і дзяўчыну з такім тварам — гуцулку. Яна працавала брыгадзірам. Тады яна ўразіла яго, і ён ледзь не закахаўся ў яе.

— Здароў! — Іван доўга не выпускаў яго рукі, гля-

дзеў у вочы, быццам пазнаваў.— Ну, дзе мы з табою пасядзім?

Гэта заўсёднае яго пытанне пры сустрэчах. Можна падумаць, што Іван вялікі аматар чаркі. Але не, ён піў зусім мала.

Яны пайшлі ў павільён, які ў народзе называлі «Ясень» — стаяў пад ясенем. Узялі па куфлю піва, селі за стол. Іван выняў з папкі газетны згортак. У ім была таранка. Яна была пахучая, залаціста-вэнджаная. На яе хацелася любавацца, як на залатую рыбку, а не есці.

Іван хвацка злупіў з таранкі луску, адламаў сухую, з пустымі вачніцамі галаву. Ружаватыя пальцы яго блішчалі ад рыбінага тлушчу, як сасіскі, ён выцер іх папяровай сурвэткаю.

— Ну, як ты жывеш? — спытаў Іван, зрабіўшы нарэшце сур'ёзныя вочы.

— Калі хто хваліцца — не веру,— адказаў Ляшчэвіч.— Той, хто нечага дабіваецца ў жыцці, толькі цяжкасці і пераадольвае.

— Ведаеш, і мне абрыдлі гэтыя паперы. Аднымі імі і займаюся. Ад званка да званка.

— Праўду кажаш. Увесь час аб'яўляецца барацьба з паператворчасцю, а папер гэтых не меншае, а большае,— згадзіўся Ляшчэвіч.

— Даведкі, справаздачы, выступленні, інфармацыі... Завіруха!

— А што рабіць? З вышэйшых інстанцый патрабуюць...

— Што рабіць? — Іван нахіліўся, аблёгся грудзямі на стол.— Кінуць усё ды з'ехаць у вёску. Стаць якім-небудзь брыгадзірам рыбалоўнай брыгады. Хоць карысць будзе. Я вось на гэтыя выхадныя ў бацькоў пабыў...— Ён пакруціў галавою, паківаў, прыплюшчыўшы вочы.— Ведаеш, адпачыў як мае быць. Адразу напружанне спала, радасць на душы праклюнулася.

Ляшчэвіч усміхнуўся.

— Гэта два дні ты пабыў... А жыць пастаянна? — Пацягнуў піва, адшчыкнуў ад рыбіны кавалачак.— Мы ўжо не зможам у вёсцы...

— Ды ты што, Сяргей! — Іван тузануў рукою, як не выпліхнуў з куфля піва, пена папаўзла па шкле.

— А вось тое,— цвёрда сказаў Ляшчэвіч. Трохі памаўчаў, смакуючы рыбу.— Мне горад ужо родным до-

мам стаў. Тут кватэра, сям'я, работа... Таксама да бацькоў тады-сяды езджу. Дзень, два пабуду — туга пачынае грызці... Прыеду ў Мінск: вакзал, сяду ў трамвай — сэрца адтае, ірвецца дахаты...

— Мабыць, жонку дужа кахаеш? — падкалоў Іван, зноў затаіўшы на ўсім твары ўсмешку.

— Справа нават не ў жонцы,— тэма была для Ляшчэвіча настолькі сур'ёзная, што ён не захацеў зводзіць яе на жарт, і прапусціў міма вушэй сябрава пад'юджванне.— Тут, у горадзе, нам больш аператыўнага прастору, ці што. Тут мы і благія — харошыя.

— Расшыфруй, нешта мой кацялок не варыць,— дзіўна, што Іван паіранізаваў з сябе. Звычайна ён хваравіта ўспрымаў любы закід у свой адрас і не хацеў сам падстаўляцца для ўколаў, нават смехам назваць нейкую загану. Зрэшты, любому трэба доўга мужнець, самасцвярджацца, пакуль ён набудзе здольнасць бачаць, насміхацца з сябе.

— Усё проста. Пад маркаю, што горад — кепска, а вёска — добра, мы выдатна сябе адчуваем з усімі сваімі недахопамі, абмежаванасцю, калі хочаш, коснасцю...

— Ну, з гэтым я не згодзен! — рашуча сказаў Іван і стукнуў дном куфля аб стол.— Што ты лічыш сябе горшым за гараджаніна?

— Ведаеш, трэба браць канкрэтна: вось грамадзянін з горада, а вось — я. У горадзе проста больш людзей, а значыць, больш знойдзецца і прайдзісветаў усякіх. Думаеш, мы з табою чысценькія?

— Ва ўсякім разе, у параўнанні...— Іван ікнуў, правёў далонню па жываце.

— Вось іменна! Вось іменна — у параўнанні з падонкамі.— Ад таго, што ўмеў і мог крытычна паглядзець і на сябе, Ляшчэвіч быў лепшы палеміст за Івана, які, канечне, з гэтым не згадзіўся б.

— А чым ты ў сабе не задаволены? — Іван пытаўся, разумеючы, што скажа пра сябе Ляшчэвіч, ён перанясе на сваю персону. Ды Ляшчэвіч і адказаў за двух, а можа, і не толькі за двух:

— Хочаш? Скажу! Прыстасаванцы мы...

— Ну дзіва што: нам трэба прыстасоўвацца да гарадскога асяроддзя.

— Не, я маю на ўвазе не адаптацыю, а так званае ўменне жыць. Дзе трэба сказаць, дзе трэба прамаў-

чаць... Дзе гаўкнуць, дзе лізнуць... Усё гэта ў нас сядзіць як іржавы цвік.

— У каго яно не сядзіць! — сказаў Іван, гледзячы некуды міма Ляшчэвіча. За спінаю ў Ляшчэвіча спрачаліся: здаецца, бармен некаму даказваў, што была траячка, а не пяцёрка.

— У нас яно неяк больш адладжанае, ці што...

— Ты вось на сябе бочкі коціш,— раззлаваўся Іван,— а капейкі чужой не ўзяў! Людзі толькі і займаюцца махінацыямі і лічаць сябе прыстойнымі! — Ці то ад піва, ці ад узрушанасці па Іванавых шчоках папайшла чырвань. Размова — гэта заўсёды спрэчкі, доказы, пярэчанні, і нават калі ў людзей блізкія характары і аднолькавыя тэмпераменты. Гэта нармальны стан чалавека падвяргаць сумненню тое, што гаворыць другі. Не сумняваючыся, не знойдзеш *сваё*; не знайшоўшы сваё, ты чалавек-тэлеграф, які перадае толькі чужыя думкі.

— Карнегі чытаў? «Нават злачынца не лічыць сябе кепскім чалавекам». Бо чалавек жа... знойдзе апраўданне любому свайму кроку — подламу, здрадніцкаму, прадажнаму... Робіць для сябе, а апраўдваецца заганамі, заблуджэннямі іншых. І калі мы спасылаемся на славутае «ўсе так», то немінуча ідзём на кампраміс з сумленнем, ідзём заўсёды на што-небудзь нячыстае. Не так хіба? Хочаш прыклады?

— Дык а што рабіць?

— Чорт яго ведае! Можа, я нясу лухту, банальшчыну, але трэба хоць па кропельцы ўдасканальвацца, а не аддаваць што ў нас ёсць харошага.

— Сапраўды, ты гаворыш як па пісаным, а жыццё, брат, піша свае законы.

— Ты, я бачу, пайшоў на дно... А я спрабую тадысяды выныраць. Вынырну, хапяну паветра — і зноў на дно. Не хапае сілы, настойлівасці, паслядоўнасці. У жыцці так: або навучышся плыць, або пойдзеш на дно.

— Я плывец дай бог! — усміхнуўся Іван.

— Па свіцязскіх хвалях. А па жыццёвых? Яны і кручэйшыя, і вышэйшыя, і небяспечныя, як міна.

— Ай! — махнуў рукою Іван.— Давай мы завяжам гэтую спрэчку. Пагаворым пра што-небудзь людскае. Дэбаты гэтыя абрыдлі на рабоце. Чэснае слова!

— Ад сябе не ўцячэш,— сказаў Ляшчэвіч.— У ча-

лавека надта шмат заган, каб не думаць, як ад іх пазбавіцца.

— Толькі не звязвай іх з вёскаю, яны набытыя тут, у горадзе. Трохі расчараваў ты мяне, канечне... Я думаў, ты патрыёт.

— Лягчэй за ўсё, прыкрываючыся патрыятызмам, заплюшчваць вочы на рэальнасць. Патрыятызм — гэта нераўнадушша, а мы раўнадушныя, у нас нізкі тонус.

— У медыцыну ўдарыўся?

— Я пра нізкі тонус нашага з табою жыцця. У лепшым выпадку мы не робім шкоды, а карысці ад нас аніякай.

— Слухай, давай яшчэ па піву... і рыбка ёсць. Нешта сёння я не зусім цябе разумею.— Іван устаў, прысунуў да стала крэсла і пайшоў да стойкі, за якою стаяў бармен. Ён быў вусаты, пры гальштуку-бабачцы, рухі ў яго былі адточаныя, дасканалыя.

Іван вярнуўся з двума куфлямі піва. Ляшчэвіч згарнуў у кучачку рыбіны косці, луску.

— Мы як бывалыя заўсёднікі выглядаем...

— А дзе пагаворыш? Дзе ў горадзе пагаворыш? У парку на лавачцы? Міліцыянеры падазрона пагляд-ваюць... У тралейбусе, аўтобусе? Трэба крычаць, надрывацца. Толькі ў кафэ ды рэстаране і пагаворыш. Дома перашкаджаюць дзеці.

Іван гаварыў праўду. Ляшчэвіч нядаўна сам сутыкнуўся з гэтай праблемаю, калі сустракаўся з Нінаю. Яму цяпер не хацелася пра тую сустрэчу ўспамінаць, лепш бы яе не было. Ён так і не зразумеў, правільна ён зрабіў ці не, што пайшоў на спатканне з Нінай; але ў душы насіў цяпер не радасць, а — дакор. Тады-сяды ён накочваўся на сэрца, азмрочваў жыццё. Цяпер, за куфлем піва і ў размове з Іванам, Ляшчэвіч адчуў сябе чалавекам, разняволіўся, ён не сядзеў панурана, маўкліва, хацелася гаварыць. У нейкае ж імгненне яму наогул здавалася, што ён пакарыў жыццё, наверсе яго, валадар, усё яму належыць, падпарадкавана, а недзе нехта ўнізе і пакутуе, і адчайваецца. Дзіўны чалавек! Ён чамусьці хоча толькі радасці, жыць без тугі, тады як душа, псіхіка — гэта набор і станоўчых, і адмоўных пачуццяў.

— Вось тут, канечне, я згодзен з табою, вёска — ідылія: агарод, ваколіца, лес, рэчка, проста дарога з ценямі бяроз... Хадзі, размаўляй, летуценнь...— І тут, у

горадзе, калі яму трэба было нешта абдумаць, вырашыць, знайсці адказ, Ляшчэвіч пасля работы не спяшаўся дамоў, ішоў пехатою, выбіраючы цішэйшую вуліцу, скверыкі. Ад таго, што ніхто цябе не зачэпіць, не спыніць, што спакойна глядзіш на дамы, на дрэвы, на галубоў на тратуары, што чытаеш шыльды, заглядваеш у кіёскі, робіцца лёгка ў грудзях і ўсцешна думаецца.

— Слухай, давай ірванём у наступныя выхадныя за горад, куды-небудзь на прыроду. У лес, у снег, у глушэчу. Сем'ямі. Раскладзём касцёр, напячэм на лаўцы сала...— Іван закаціў вочы, мабыць, уяўляючы смачны пах печанага на кастры сала.

— Я не супраць, але маці да мяне прыязджае... у бальніцу.

— Што з ёю?

— Вены... тромбафлебіт.

— У майго знаёмага... кампазітар малады, маці ад гэтай хваробы нядаўна памерла. Гаварыў, тромбы па цэлай пядзі загусалі.

— У мяне цётка памерла...

Успамін пра хворую маці і гэтая Іванава навіна імгненна нагналі на Ляшчэвіча смутак. Думка пра смерць блізкага чалавека заўсёды цяжкім каменем лажылася яму на душу, адбівала ахвоту жыць і працаваць. Перад ёю, усемагутнай смерцю, усё блякне, здаецца дробязным і нікчэмным. І сэнс чалавечых намаганняў просты — аддаленне смерці.

Ляшчэвіч развітаўся з Іванам Шэлехам у паганым настроі. Той, праўда, рабіў выгляд, быццам не прыкмячае, што ён, Ляшчэвіч, вельмі заклапочаны. І ў яго самога твар замаркоціўся, не так свяціўся ўсмешкаю, як у першыя хвіліны сустрэчы.

Вечар быў жоўты: і снег, і паветра, і неба, і дамы, і машыны. І думкі ў Ляшчэвіча былі жоўтыя. Аднойчы ён зрабіў гэтае дзіўнае адкрыццё, што думкі маюць колер: непрыемныя — чорны, радасныя — сіні, думкі пра смерць — жоўты, пра каханне — ружовы... Жыццё чалавечай душы, выходзіць,— вясёлка колераў. Вось так, вясёлка, хоць і ёсць у ёй колер смерці.

...Калі Ляшчэвіч прыйшоў на працу, думкі яго афарбаваліся ў чорны колер: ён пакутаваў, не мог адрынуць дакору — што здаўся Марускову, што выканаў яго загад. Дурань! Слімак! Цюхцяй! Ён бэсціў сябе

бязлітасна брыдкімі словамі і той жа час разумеў, што інакай не мог зрабіць. Не меў бы маці, бацькі, сястры, не было б сям'і — пайшоў бы на *ўсё*, але стаяў бы на сваім; а так ёсць каму перажываць, ёсць у яго і адказнасць перад сынам: трэба расціць, пекалі трэба сыну гаварыць, пісаць, хто яго бацька. Вось маці хворая сёння прыязджае... Здарыся што-небудзь з ім, хіба ён скажа ёй, паскардзіцца? Ніколі! Ён шкадаваў людзей, спачуваў ім і не хацеў прыносіць ім пакуты, перажыванні.

Стоячы перад кульманам, ён думаў, як вырвацца і сустрэць маці. Вясковай жанчыне ў незнаёмым вялікім горадзе цяжка арыентавацца. Адпрасіцца ў Марускова? А раптам не адпусціць? Тады ўжо і няма іншых варыянтаў пайсці раней з работы? Хоць такая прычына, што ён не паглядзіць ні на што. Калі не маці, то хто і што важней?

Але яму, можна сказаць, пашанцавала. Зайшла кадравічка і сказала, што ў тры гадзіны прафвучоба і яму, Ляшчэвічу, на ёй трэба быць. Якраз добра, Палац шашак і шахмат, дзе намячалася вучоба, у тым баку, блізка каля вакзала.

Часу хапала, і Ляшчэвіч з «дыпламатам» у руцэ пайшоў да Палаца пехатою. Мароз адлёг. Паветра было чыстае, мяккае. Хоць бы ветрык калыхнуў галінку. Штыкецíны ўвенчвалі высокія стугаркі снегу. Усё неяк сцішылася, быццам наталялася асалодаю цяпла. І галкі, пасеўшы на аснежаныя галіны явару, соладка драмалі, схаваўшы дзюбы ў глыбокае пер'е валлякоў.

Ляшчэвіч пасядзеў толькі адну лекцыю. Аўтобусы магілёўскага напрамку прыбывалі на вакзал «Усходні», і ён паехаў туды. З нізкага неба сіратліва падалі рэдкія сняжынкі. Як цяпло, так адразу і снег. Горад ужо запаліў ліхтары, у іх святле мільтусіліся сняжынкі, як быццам толькі там яны і ляцелі.

Ляшчэвіч стаяў на пероне, жмурачыся, углядаўся ў маршрутныя «візіткі» аўтобусаў. З-за павароту паказаўся чырвоны «Ікарус» з белымі замураванымі вокнамі. У Ляшчэвіча ёкнула сэрца. У першым акне аўтобуса нехта пачаў праціраць дзірачку. «Маці! Яна непакоіцца, ці сустракаю яе...» Ляшчэвіч не памыліўся: да дзіркі прынікла мацерына вока, ад кончыка носа збоку растала мясцінка.

Ляшчэвіч падышоў да расчыненых дзвярэй. Маці

асцярожна ступала на прыступку адной нагою, тады другой. Была яна ў рабой штучнай футры-зімовіне, валёнках, абвязаная пуховай арэнбургскай хустаю. Ён падаў маці руку, падхапіў з яе рук сумку — цяжкую, як падняць. Маці стала браць у яго «дыпламат» і спахапілася:

— Вой, вязёнкі забыла!..— Няўклюдна пакараскалася зноў у аўтобус, замінаючы людзям.

На таксі выстраілася чарга — раней не было, вырасла за гэты час, пакуль Ляшчэвіч чакаў свой аўтобус, і ён пашкадаваў, што не заняў чаргі.

Стаялі доўга, пасоўваліся марудна. У таксістаў якраз была перасменка (у шэсць гадзін) — высадзіць каторы пасажыра і не бярэ нікога, міргае: «Я сваё, шэф, адбарабаніў!» Той-сёй лез без чаргі. Прыскочыў малады дзяцюк, у джынсіках, лёгкай балоневай куртачцы, радасны, узбуджаны: «Жонка сына нарадзіла! Чатыры трыста! Дазвольце мне...» — «Гэта ж не забіраць...» — прабурчала цётка ў сялянскім кажусе, яна стаяла з боку чаргі.

Снег пагусцеў, валіў ужо хлапякамі, шэрымі ў вячэрнім сутонні, і Ляшчэвіч згрэбваў з плячэй маці яго далонню.

— Во які сын! — пахваліла цётка ў кажусе.— А мая дачка мяне нават не сустрэла... А сала ёй цягні во тры хатулі.

Маці дабрадушна засмяялася, спачуваючы ў душы цётцы і радуючыся, што яе сын сустрэў.

Нарэшце яны — першыя. Пад'ехала жоўтае таксі, Ляшчэвіч адчыніў заднія дзверцы, і маці ледзь загнялася ў яго, сам сеў на пярэдняе сядзенне.

— Войкі, галёша скінулася! — гучна сказала маці.— На-ка, Сярожа, адзень...— Яна высунула між пярэдніх сядзенняў нагу.

Заваліла снегам дарогу, і да самага дома таксіст не павёз. Маці ішла ўслед за Ляшчэвічам маленькімі крокамі — баялася пакаўзнуцца. Якая яна тут, у горадзе, зблажэлая і разгубленая, думаў, спачуваючы маці, ён.

Жонка з сынам чакалі іх, сустрэлі каля парога.

— Дзед Мароз ці Баба Яга, хто... да вас прыехаў? — Маці нахілілася да Славіка. Дала яму шакаладку і цацку — пад'ёмны кран.

— Што трэба сказаць? — падказала жонка сыну.

— Дзякуй! — кіўнуў той, павярнуўшыся ад бабулі і разглядаючы пад'ёмны кран.

— Ну, распранайцеся ў нас.— Жонка дапамагла свекрыві зняць футра. Правяла яе ў залу. Маці села на краі крэсла з мяккімі падлакотнікамі; сядзела, апёршыся рукамі на калені, акурат баялася прыхінуцца плячыма да спінкі, каб крэсла не перакулілася.

Назаўтра з раніцы, адправіўшы сына ў сад, Ляшчэвіч паехаў на працу, каб папярэдзіць Марускова, што яму трэба пакласці хворую маці ў бальніцу. Марускоў часам быў прыткі на жэсты, асабліва калі ў кабінеце яшчэ з супрацоўнікаў нехта быў. І цяпер ні словам не запярэчыў Ляшчэвічу, і ён з лёгкім настроем паехаў дамоў.

У маці на твары ляжала пячатка не то трывогі, не то разгубленасці, і ён зразумеў, што нешта здарылася.

— Войкі і напужалася я, аж сэрца адвалілася!..— сказала яна адразу.— Расказаць табе? Пайшла ў туалет... Ну, трэба ж ваду зліць. А як? У Ленкі тузануў за пачопку... і ўсё. А тут няма такога нічога. Бачу пупсік гэты чорны... Я і за яго пакруціла — нічога, а тады неяк цісканула на яго — вада і хлынула... Адале пачала налівацца ў бачок... накрыўка адбіта — я і бачу. Так шуміць вада, так шуміць... Думаю, сапсавала нешта, налье збрэсь і затопіць усю хату... Я і слоік збегала на кухню ўзяла. Як ужо, думаю, стане праз верх пералівацца, буду адчэрпваць. А тады як напужалася, што не спраўлюся, кінулася суседзяў зваць. У адны дзверы званю, у другія — ніхто не адчыняе... Праўда, у самай далёкай кватэры адчыніла жанчына. Я ёю балабоню, а яна спакойна гэтак: «Нічога, цётка... Пашуміць дый перастане».

— Ну, сапраўды як дзіця...

— Ага, дык жа страшна...— Маці адчувала сябе няёмка, саромеючыся, што падвяла сына, паказала, якая яна цёмная і забітая. Ляшчэвіч паводзіўся так, быццам нічога не здарылася, не кпіў з маці, што пабегла па кватэрах, аганьбавала яго. Маўляў, дробязь, і няма чаго надаваць увагі, перажываць.

З учарашняга дворнікі яшчэ не паспелі расчысціць ад снегу тратуары, і Ляшчэвіч з маці ледзьве дзяўбліся па вузенькай утаптанай сцежцы. Маці ў шырокіх валёнках цяжка было ступаць след у след, і яна разпораз брала Ляшчэвіча за локаць. Ён знарок ішоў па-

ціху, бачыў, маці зусім слабая, запыхалася і на рэдкіх валасках у яе каля рота павіслі маленькія кропелькі.

— З перасадкаю ехаць? — спытала яна — хвалявалася, ужо думала, дзе тая бальніца.

— Ага.

— Ці далёка? А то я, такая цюпа, пакуль дабяруся...

— Далекавата.

— Ці быў ты там? — Яна, мабыць, трывожылася, як знайсці бальніцу, ці доўга шукаць.

На прыпынку яна кінулася да дзвярэй тралейбуса, адграбаючы людзей, быццам баялася астацца ці не ўлезці. Не ў свой асяродак трапіла бедная, лагодна пасміхаючыся, падумаў Ляшчэвіч, зусім не саромеючыся. Ну і што, калі яна вясковая і калі ён нарадзіўся ў вёсцы? Галоўнае ж, не адкуль, а які. А ён быў усё-ткі не апошні вінцік у складаным механізме горада: меў вышэйшую адукацыю, работу, кватэру, сям'ю, сяброў, увогуле прыстойна жыў, бо ніхто яшчэ пэўна не сказаў, што такое прыстойнасць. Кар'еры пакуль што, праўда, не зрабіў, але шанцы ў яго на яе, калі верыць Тані Саўковай (пасміхнуўся), былі. Ды бог з ёй, з пасадаю, многія яе не дабіваюцца, і адно праз тое, што нехта займае не сваё месца. Замацавацца б на гэтай, адчуць трываласць, унутраную ўпэўненасць, а тады і стымул, і бадзёрасць, і парыванне самі сабою прыляцяць.

У бальніцы на прахадной іх запыніла вахцёрка — шызашчокая жанчына ў белым халаце.

— Вы куды?

— Я да Генадзя Пятровіча Бірукова,— упэўнена адказаў Ляшчэвіч.

— Да каго?

— Да прафесара, на кафедру.

Вахцёрка, па ўсім, так і не разабралася, куды яны ідуць, і нават прозвішча было ёй, мабыць, незнаёмае, але паколькі чалавек назваў яго — знаць, невыпадковы, яму можна давяраць, і яна дазволіла:

— Ідзіце.

Ляшчэвіч падняўся на трэці паверх, выглядзеў на дзвярах кабінет Бірукова. Пастукаў. Не пачуўшы адказу, зайшоў. Прафесар быў не адзін, за вялікім круглым сталом сядзеў кучаравы цемнаскуры малады чалавек, мабыць, чужаземец.

— Заходзь, мой друг! — сказаў бадзёра прафесар, калі Ляшчэвіч назваў сваё прозвішча, і, устаўшы, падаў яму тонкую, лёгкую руку. Яго порсткія вочы працізвалі Ляшчэвіча наскрозь.— Дзе ваша мама?

— На калідоры.

— Вядзіце вашу маму.— Вярнуўся да стала, зноў загаварыў з чарнамазым.

Кабінет у прафесара быў шыкоўны. Паліцы з кнігамі, кутавая сафа, абітая кафейнага колеру варсанітам, тэлевізар, магнітафон, на падлозе дыван. І крэслы, крэслы... Вакол круглага стала, каля сцен.

— Знаёмы яўрэй. Прыехаў з Ізраіля, расказваў, як там соладка,— чамусьці адчытаўся Ляшчэвічу прафесар, калі чарнамазы выйшаў.— Ну, паказвайце вашы ногі,— ветліва звярнуўся ён да маці.

Ляшчэвіч адышоў да паліцы і пачаў чытаць за шклом назвы на спінках кніг.

— Нічога страшнага! — пачуў ён голас прафесара.— Зараз вас паглядзіць спецыяліст.— Ён націснуў кнопку званка. Праз хвіліну зайшла маладая высокая, як і прафесар, статная жанчына з белым тварам і яркімі вуснамі. Паклікала маці за сабою.

— Ну, як жыццё, мой друг? — спытаў Бірукоў у Ляшчэвіча, калі той павярнуўся ад паліцы з кнігамі. Пачуццё гаспадара, упэўненасць проста фантанілі з прафесара. Можа, ён не так сябе добра адчуваў тут, колькі ўмеў і хацеў паказаць, асабліва перад маладзёнам, які таго-сяго варты (чуў ад сына) і нечага дабівaецца. Ніхто не пачне адразу скардзіцца, нават у вялікай бядзе, і Ляшчэвіч адказаў:

— Памалу-паціху. Вось за маці трывожуся...

— Зараз скажуць.

Пакуль яны вялі дробязную гаворку малазнаёмых людзей, жанчына прывяла маці. З усмешкаю, даверліва гледзячы Ляшчэвічу ў вочы, сказала:

— Варыкознае расшырэнне вен. Вынік тромбафлебіту...

— Што гэта значыць?

— Ледзь не палова жанчын пакутуе ад гэтай хваробы. Нічога страшнага! — паўтарыла яна словы Бірукова.

— Дык можна і не апасацца? — дабіваўся яснасці Ляшчэвіч, каб рассеяць трывогу, перажыванні.

— Наогул-такі трэба лячыць,— сказала маладзіца і глянула на прафесара.

— Як?

— Можна абмулаторна, можна і ў стацыянары.

«Што амбулаторна...— падумаў Ляшчэвіч.— Ці варта ў такую далеч было ехаць?» Ён вырашыў не адступаць, давесці справу да канца.

— Я хацеў бы, каб у стацыянары,— сказаў ён і таксама глянуў на прафесара.

— Гэта не па нашай часці,— сказала маладзіца чамусьці з радасцю.

— Вы свабодны,— сказаў Бірукоў да яе, і яна выйшла.

— Можа б, як...— Ляшчэвіч адчуў, што ў голасе прыкра загучалі ноткі мальбы. Няёмка будзе перад маці, калі яе так і адправяць. Ды што няёмка! Крыўдна, горка будзе! Але ж і ўніжацца, заводзіць сувязі таксама брыдка. Асуджаў, не прымаў гэта ў іншых. Але тут... Асаблівы выпадак — маці. Няўжо і здароўе маці не дае яму права забыць хоць на нейкі час на прыстойнасць, чысціню? Яна ж без мінскай прапіскі, без накіравання, яе нідзе не возьмуць у бальніцу. А калі яна памрэ? Што тады яму рабіць? Уся віна ляжа на яго: не давёў, не настоіў, не дабіўся. Уяўляць гэта было жахліва.

— Добра! — сказаў рашуча прафесар і зноў націснуў кнопку. Пакуль чакаў адказу, звярнуўся да маці — строгім, сухім, як папера, голасам: — Майце на ўвазе, што я раблю вам месца з-за павагі да яго.— І красамоўна кіўнуў на яго, Ляшчэвіча.

— Ну, гэта ясна...— неяк паспешліва, вінавата адказала маці.

— Ал-лё! — працяжна праспяваў у трубку Бірукоў.— Фёдар Дзянісавіч? Гэта вас турбуе прафесар Бірукоў. Фёдар Дзянісавіч, такая справа да вас. Тут у мяне ў кабінеце сядзіць жанчына, у яе варыкознае расшырэнне вен. Ці не маглі б вы аказаць мне ўзаемную паслугу, паклаўшы яе ў сваім аддзяленні?..— Ён слухаў і ківаў маленькай сівой галавою.— Дзякуй вам, Фёдар Дзянісавіч! Вялікае дзякуй!

Бірукоў, згаварыўшыся з нейкім Фёдарам Дзянісавічам, бачыў Ляшчэвіч, быў бязмежна шчаслівы. Ён шыкануў — што ўсё можа, што мае сувязі, уплыў, аўтарытэт. Нягледзячы на свае званні, ён, мабыць,

таксама не быў задаволены сабою і жыццём. І ці ёсць наогул мяжа ў чалавечых дамаганнях?

— Адвядзі маці ў дваццаты кабінет на другі паверх, а сам вярніся сюды,— сказаў Бірукоў. Голас яго, здаецца, стаў яшчэ больш напеўным, важным.

— Як бы ні асуджалі блат, знаёмствы, узаемадапамогу, яны застануцца між людзей,— сказаў упэўнена Бірукоў, калі Ляшчэвіч вярнуўся ў кабінет. Ляшчэвіч, хоць і рады, што ўладкаваў маці, адчуваў сябе прыніжаным і разгубленым. Ён бачыў, што пайшоў насуперак сабе, сваім перакананням, і нічога не мог зрабіць. Сіла, якая брала яго ў залежнасць, аказвалася мацнейшая, яна перамагала. Ён расчышчаў сабе дарогу ад пакут, перажыванняў, дакору адных і выходзіў на дарогу другіх, яшчэ больш глыбокіх і балючых.

— Канечне, людзі павінны рабіць дабро...— сказаў усхвалявана Ляшчэвіч.— І дабро — толькі тады дабро, калі ад нас адрасавана іншаму.

— Вось іменна! Я зрабіў табе дабро, так? І калі ты мне не зробіш, я больш табе таксама не зраблю.

Бірукоў намякаў, што Ляшчэвіч павінен ацаніць яго старанні, адплаціць тым жа, іначай... Ніякай дружбы вадзіць не будзе, на самым пачатку паставіць крыж. Чым мог адплаціць Ляшчэвіч прафесару? Нічым. Гэта ім абодвум было зразумела. Але ў прафесара ёсць сын — Косця, які працаваў разам з Ляшчэвічам. Косцю праекты даваліся туга, пры ўсёй сваёй бяскрыўднасці ён мог выклікаць незадавальненне ў Марускова, звесці на нішто сваю рэпутацыю як інжынера сярод калег, стаць мішэнню для насмешак і кпінаў.

Зайшла ў кабінет белатварая высокая маладзіца, прынесла на лёгкім алюмініевым падносіку два кубачкі кавы. Паставіла на стол перад Біруковым. Ён манерна кіўнуў ёй галавою.

— Сядай, друг мой! — запрасіў Ляшчэвіча.

Ляшчэвіч трымаў двума пальцамі кубачак і засяроджана, маленькімі глыткамі піў каву. Жыццё падняло яго на той паверх грамадства, дзе людзі адчувалі сябе калі не боскімі выбраннікамі, то, прынамсі, і непакрыўджанымі; а бачачы, што суседзі паверхам вышэй даюць волю чалавечым слабасцям з нястрымнай фантазіяй, маглі і сабе дазволіць пэўныя спакусы, адкінуць умоўнасці, пераступіць мяжу маральных забарон. Божа, да чаго так можна дайсці, куды падняцца

ці куды скаціцца? Дзе сцяна, якую б не пераскочыў, дзе тормаз?

— Не перажывай, друг мой! — сказаў Бірукоў, мабыць, убачыўшы, што ў Ляшчэвіча дрыжыць у пальцах кубачак, вочы глядзяць засяроджана і нацята.— Жыццё доўгае, ад памылак не ўберажэшся... і не трэба! Не будзеш памыляцца — не будзеш шкадаваць чалавека.

«У гэтай думцы нешта ёсць...» — Ляшчэвіч адчуў, як наклюнулася ў грудзях радасць.

— Памылка — гэта заўсёды адчай, дакор, боль... Павер мне, як чалавеку, які мае адносіны да нерваў, псіхікі. Ведаючы, што боль — гэта кепска, нармальны чалавек, які перанёс боль, не будзе яго прычыняць іншым. Чалавек, які, сам перажыўшы, прымушае перажываць іншых, гэта чалавек хворы. Яго трэба лячыць. Не бойся ў жыцці памыляцца, бойся заставацца аднолькавым. Сёння, заўтра, паслязаўтра... Камень — і той мяняецца, расце. Камень і чалавек — гэта мікра- і макрасвет, такая між імі розніца.

Ляшчэвіч не заўважыў, як апусцеў кубачак, быў рады, што слухае чалавека вядомага, прафесара. Гэта яму, які вырас сярод даярак, пастухоў, простага люду, лесціла, цешыла самалюбства. Ён паважаў іх аднолькава, сваіх вясковых і эліту, можа, нават сваіх больш, таму што каля іх было цяплей, але сумна, а з гэтымі — халаднавата, цвярозліва і — цікава. Ён не мог праясніць, адкуль яны, гэтыя адчуванні, браліся, але яны былі, ён не мог ад іх атрэсціся. Няхай ён дурань, ідыёт, абывацель, але ён вымушаны прызнаць: яны — ёсць. А раз ёсць — значыць, пра іх трэба гаварыць. І ён сказаў Бірукову пра гэты свой самааналіз, ад якога не мог адвязацца.

— Кожны больш-менш інтэлектуальны чалавек аналізуе свае ўчынкі, свой стан,— сказаў прафесар.— Можа, толькі дэбіл не здольны на гэта. У цябе фактар спрыяння ёсць — ты памяняў асяроддзе, трэба ламаць псіхалогію. Гэта часам выклікае мітусню, адчай, разгубленасць...

Ляшчэвіч успомніў маці: на ёй гэта вунь як відаць. Яму стала лягчэй, як бы развяяліся сумненні. Толькі ці надоўга? Было ўжо так: нешта трывожыла, потым праяснялася, ахутваў халадок палёгкі, а праз нейкі час зноў тое ж, часам з большаю сілаю, завалод-

вала розумам і сэрцам. І такое адчуванне, што ты як быццам разбэрсаны, рассыпаны на частачкі, бы тыя кубікі. Ты і не ты.

Яму трэба сабраць сябе ў адно, ачарціць душу нейкім кругам, каб пэўна выявілася, што за яна, што прымае і што не прымае, што трэба ў яе ўпускаць, а што зусім не павінна да яе прарывацца. Ёсць жа — і колькі такіх! — рэчы, якім душа ніколі не павінна даваць прытулак. Бо душа — не склад, куды можна скідваць усю непатрэбшчыну, смецце, мярзоту і цвіль.

Апанаваны думкамі, узбуджаны, ён развітаўся з Біруковым, паабяцаў аддзячыць за ласку і клопат. І толькі ўжо на вуліцы, астуджаны сырым, ледзяністым ветрам, абласканы марозікам, падумаў: а ці мае доктар права чакаць адплаты за тое, што лечыць людзей? І ці доктар ён тады наогул? І тут жа падакараў сябе: «Чаго чапляюся да Бірукова? Ён, можа, рады, што дапамог, і нават не думае ні пра якую адплату, і меў зусім іншае на ўвазе, калі гаварыў пра ўзаемнае дабро. Можа, гэта проста была споведзь, давер стомленага жыццём чалавека...»

Свет быў складаны, толькі таму, што людзі замкнулі сваю душу на замок, і ключ ад яго — гэта адзіны ключ, які не можа пабываць у руках іншага. Ляшчэвіч іншы раз думаў, што ён усё-такі імкнецца замок гэты сарваць, не трымаць на ім сваю душу. Няхай туды, як у госці, заходзіць душа каго другога; але калі яна заходзіла, то рабіла яму балюча, і душа, бы тая ўлітка, зноў хавалася ў панцыр пад замок.

...З ёлкі асыпалася ігліца, услала стол абрусам, вышытым бліскучымі зялёнымі ніткамі. Ёлка зусім стала голая, мёртвая, цацкі віселі як бы ў паветры.

Ляшчэвіч з сынам здымалі цацкі, клалі іх у кардонную каробку на вату.

Сын выпусціў вялікі зялёны шар, ён разбіўся. Ляшчэвіч не стаў ушчуваць сына. Шар не вернеш, дый дробязь гэта — шар, а ў сына адаб'еш ахвоту дапамагаць. Шмат чаго карыснага не зроблена і дарослымі адно таму, што нехта несвядома, а часцей свядома псаваў настрой, не ацэньваў як след.

— Трэба маці адведаць,— сказаў ён жонцы, вынесшы елку на вуліцу, на сметнік.

— Кожны дзень хадзіць? — Жонка рэзала на

кружку чырвоны бурак, і пальцы яе былі чырвоныя, як струкі перцу.

— Дзе ж мы кожны дзень ходзім, ажно пазаўчора былі,— сказаў Ляшчэвіч міралюбна, бо ў жончыным голасе ён не ўлавіў незадаволенасці, проста ёй праз тое, што не кожны дзень успамінала пра свякроў, так здавалася.

— Давай сходзім... Малако, кефір ёсць.

— Трэба на Камароўку зайсці купіць яблык і інжыру... казала маці, ён паказаны пры тромбафлебіце.

— Дарагі, мабыць?

— Дзесяць рублёў кілаграм нібыта. З Грузіі прывозяць.

— Дарагавата,— сказала жонка, не пярэчачы, аднак, што трэба купіць.

— Маці грошы дала.

Калі яны ўтраіх выйшлі з-пад вялізнага панцыра Камароўскага рынку, жонка нечакана прапанавала:

— Давайце на таксі.

— А які сэнс спяшацца? — запярэчыў Ляшчэвіч.— Надвор'е добрае, сонца... Можна і на тралейбусе.

— І я хачу на таксі! — заныў, тузануў бацьку за руку сын.

— Ты яшчэ не зарабіў грошы, каб раскатвацца! — сказаў строгім голасам Ляшчэвіч. Ну і моду паймеў гэты малы: што ні заманецца — хачу, хоць у лоб страляй. Ляшчэвіч прыпамінаў сваё дзяцінства: прадраныя на каленях штаны, на нагах чаравікі, на стале не заўсёды кавалак хлеба знойдзеш; цукеркі-падушачкі — як свята; цацак ніхто, лічы, не купляў, майстравалі самі: лыжы, канькі, аўтаматы, машыны, каляскі. І бач, нічога, выдзюжыў, за жыццё чапляецца кіпцямі.

Ён разумеў, што час не той, усё змянілася і дзяцей акружае іншы свет, але патураць ім, не даваць зразумець, што ёсць і абмежаванні, словы «нельга», «не трэба», «не варта» — значыць, расціць спажыўца, хлюпіка, бязвольнага чалавека. Наколькі мог, Ляшчэвіч супрацьўляўся сынавым прыхамацям, няраз спрачаўся з жонкаю, якая расла ва ўмовах лепшых, чым ён, і, здаецца, не заўсёды разумела яго.

Маці чакала іх, хадзіла па першым паверсе ў шкляным холе, дзе было поўна наведнікаў. Яна памкнулася неяк нялоўка, аж хіснулася, і пацалавала нявестку, тады ўнука.

Яны селі на абабітую цыратай мяккую лаўку.

— Ну, як ты, мама? — спытаў Ляшчэвіч.

Маці была ў сінім вылінялым халаце, і твар у яе быў бляклаваты, з сінім адценнем. Яна хавала вочы, была як вінаватая — не прывыкла назаляць іншым, надаваць ім клопату, забіраць час, а тут во зваліласяна галаву... сыну хай сабе, сын не папікне — чужым людзям, нявестцы, гэтым знаёмым сыну дактарам.

— Ай!..— махнула яна рукою, мабыць, расчаравалася ў мінскіх дактарах, спадзявалася на іх, а яны нічым яе не ўразілі, нічога новага ёй не прапанавалі, не параілі.— Уколы даюць, парафінам ногі грэюць...

— Не ўсё адразу. Падлечаць! — падбадзёрваў Ляшчэвіч маці. І сын уважліва глядзеў на яе, акурат не верыў, што перад ім сапраўдная, яго родная бабуля. Ён падышоў і абхінуўся на яе плячо, мабыць, угледзеў на твары нешта такое, што варта жалю. Ён быў вельмі чуйным да ўнутранага болю блізкіх яму людзей. Ляшчэвіч гэта заўважыў.

— Прывяжы-ка мне гэты во... бінт, што на нагу...

— Эластычны?

— Ага, ага! — абрадавалася маці, што сын акурат успомніў тое, што патрэбна.

— Добра. Я спытаю ў аптэцы.— Сам Ляшчэвіч, можа, не заўсёды здагадваўся, што трэба маці ў бальніцу, і калі яна яму падказвала, радаваўся.

З бальніцы чалавек заўсёды выносіць смутак. І Ляшчэвіч ішоў на прыпынак зажураны. Снег іскрыўся ад сонца, сляпіў вочы, быў настолькі пругкі, прылізаны, што адчувалася, якая цвёрдая, настылая пад ім зямля. Дарога была, як лёд, слізкая, і калі тралейбус тармазіў, метры чатыры ён слізгаў з нерухомымі коламі. З даху высознага дома мужчына ў шапцы з апушчанымі вушамі скідваў шуфлем снег; спачатку снег спадаў густой барадою, а каля зямлі вецер зносіў ужо драбнюткі пыл. І раптам Ляшчэвічу падумалася, што час гэтак жа зносіць іх дробную гарадскую мітусню, з якой нічога не нараджаецца важкага, каб застацца, каштоўнага, каб радаваць. А што ён мог зрабіць? Ён быў падключаны да яе безліччу нябачных нітак, з якіх не мог выблытацца, як муха не можа выблытацца з павучыны. Але тое, што ён так яскрава ўсвядоміў сваё становішча, зразумеў, што і адкуль яму пагражае, давала яму магутную зброю. Ён ведаў ворага, ведаў яго пазі-

цыі, цяпер трэба шукаць тактыку, якая б дапамагла яму перасіліць гэтага ворага. Ці зможа? Бо і вораг няпросты, і ён не крэмень, і спадзяванне на дапамогу збоку няма. Каму ва ўсім, безаглядна адкрыешся? Ні жонцы, ні маці, ні Шэлеху, ні Саўковай, ні сыну — горкаму дзіцяці...

Ён зіркнуў на жонку, якая сядзела з сынам наперадзе. Яна лушчыла семкі, шалупінне апускала ў раскрытую сумачку на каленях. Яна — яго плячо, але плячо, на якое не абапрэшся, а якому патрэбна падпорка. Сын глядзеў у акно — з цікавасцю. Дзеці — бестурботныя... І як хочацца ім хутчэй стаць дарослымі. Незразумелае гэта імкненне, бо гэта імкненне з ружовага, блакітнага святла ў цемень; тыя спакусы, якія адкрыты дарослым, не вартыя і аднаго дня бясхмарнай дзіцячай летуценнасці.

Жыццё дарослага — вартае спачування. Любому чалавеку, нават, на першы погляд, шчасліваму, спачувай — і не памылішся. А што гаварыць пра нешчаслівага... Гэтая думка прыйшла Ляшчэвічу пасля аднаго выпадку. Тады ён з сынам таксама ехаў — на аўтобусе да бацькоў у вёску ў адпачынак. Дарога была доўгая, стамляла. Цвілі вішні, грушы, вабіла вока маладая зелень, яркія жоўценькія талерачкі дзьмухаўцоў у радасна-густой траве, і Ляшчэвіч ахвотна, нават з вымушанай настойлівасцю выходзіў з аўтобуса на кожным прыпынку.

Вось аўтобус спыніўся на чарговай аўтастанцыі ў крайнім трохкутніку — на выкладзенай цэглаю пляцоўчацы.

— Рагачоў. Стаянка аўтобуса пятнаццаць мінут,— аб'явіў вадзіцель у мікрафон: Ляшчэвіч ужо прывык да мяккага, дабрадушнага голасу.

Трымаючы сына за руку і прапускаючы яго паперад сябе, Ляшчэвіч саступіў з крутых падножак аўтобуса і адразу скрозь звычныя вуху станцыйныя гукі пачуў песню. Недзе глыбока ў падсвядомасці як бы мімаходзь мільгнула думка: адпраўляюць прызыўніка ў армію. Мелодыя была бравурная, маршавая, выводзілася высокім голасам.

Тое, што ён убачыў у наступнае імгненне, прымусіла яго здзівіцца і застыць ад нечаканасці: на бетонных прыступках перад уваходам у аўтастанцыю сядзеў сівагаловы чалавек у шэрым пінжаку і спяваў. У гняз-

дзечку між пакладзеных адна на адну ног ляжала чорная шапка з абтрэпаным брылькам, якую чалавек прытрымліваў правай рукою, калі можна назваць рукою бяспалую куцку з адным-адзіным адросткам — жоўты, тонкі, бы цвік, ён нагадаў Ляшчэвічу курыны палец з кіпцюром; гэтым адросткам-кіпцюром чалавек утыкаўся ў шапку — не таму, каб трымаць яе, а проста каб адчуваць, што яна ляжыць у яго на каленях... Чалавек быў сляпы: пустыя, адсутныя белавата-сінія вочы яго стаялі пад ілбом нерухома, як у масцы, вейкі няўцямна міргалі, а з вывернутых балючых ніжніх павек каціліся на шчокі міжвольныя слёзы.

Голас у чалавека быў моцны, чысты. Адчувалася, чалавек спяваў не проста абы спяваць, а старанна, з нейкім апраметным натхненнем, бадзёра, як у страі. Ляшчэвіч нават падумаў: мабыць, калісь у арміі чалавек быў запявалам.

Песня, нягледзячы на свой бравурна-бадзёры матыў, была жаласная, чуллівая, прынамсі, сэрца ў Ляшчэвіча сціснулася, застукала ў грудзях. І не самі словы, да якіх ён стаў прыслухоўвацца, усхвалявалі яго, а сэнс песні: танкіст, які «первый в атаку шел», «грудью землю защищал», скалечаны, зранены, абпалены, вяртаецца дахаты і перажывае, як сустрэне яго «жена молодая».

Ляшчэвіча калісь уразіла апавяданне А. Талстога «Рускі характар», дзе апісвалася падобная сітуацыя. Да чаго ж моцны духам рускі чалавек, помніцца, захапляўся ён тады.

Нямоглыя людзі, калекі, інваліды заўсёды выклікалі ў Ляшчэвіча востры жаль і шчырае спачуванне. Яшчэ студэнтам ён кватараваў у інваліда вайны, бязрукага чалавека, і наглядзеўся на такое гора, што зараду чуласці, так іншы раз думалася, набраўся на ўсё астатняе жыццё.

Ляшчэвіч міжволі пацягнуўся рукою да кішэні. Сын таксама ўбачыў дзядзьку, такога дзіўнага і незвычайнага, і колькі хвілін глядзеў на яго сур'ёзнымі, як бы трывожнымі вачыма, а потым пачаў штурхаць у ногі Ляшчэвіча да латка з марожаным. Ляшчэвіч ішоў неахвотна, азіраючыся. І ў чарзе яму не стаялася, карцела павярнуцца да інваліда. А сын адбегся і цікаваў ужо за галубамі, якіх тут было шмат. Шызыя, пярэстыя, чорныя, яны не баяліся людзей, хадзілі паваж-

на, грацыёзна ставячы на асфальт барвовыя лапкі.

Ляшчэвіч купіў вафельны кубачак марожанага і гукнуў сына. Рэшту грошай з траячкі заціснуў у кулаку. Яны падышлі да сівагаловага чалавека на прыступках, і Ляшчэвіч высыпаў у шапку грошы. Пачуў: «Дзякуй...» — чалавек ужо не спяваў, сядзеў нерухома, як статуэтка, адно па-ранейшаму сутаргава міргалі кароценькія белыя вейкі.

Адышоўшы нацятаю, ломкаю паходкаю да аўтобуса, зноў павярнуўся... Убачыў: чалавека ахапіла хваляванне, ён патузваў плячыма, шморгаў носам, моршчыўся і кашляў. Потым левай рукою, якой дасюль не было відаць з-за тулава, стаў браць з шапкі грошы і рассоўваць на кішэнях пінжака. Было дзіўна: чалавек вопрама, не нахіляючы галавы, глядзеў перад сабою, а рука яго нешта «бачыла»: яна намацвала ў шапцы капейкі і хавалася то ў правай, то ў левай кішэні. І Ляшчэвіч падумаў, што чалавек сартуе медзякі, «белыя» капейкі і рублі.

Калі шапка апусцела, ён паправіў яе левай, здаровай, рукою і зноў уткнуў у яе «кіпцюр». Ён не пераставаў кашляць і гмыкаць, мусіць, прачышчаў горла, шукаў голас, але — знаць было — нешта яго не задавольвала, нешта не ладзілася. І ён зноў палез левай рукою ў правую кішэню (нязграбна перакасілася тулава), выняў адтуль разарваны на ражку пачак «Беламору» і карабок з запалкамі. Усё гэтак жа не мяняючы паставы, вытрас папяросіну, узяў у зубы, пачак засунуў назад у кішэню. Вышчалукнуўшы з карабка запалку, заціснуў яго падбародкам і, захінуўшыся ад ветру локцем, усчыркнуў запалку з першага разу, прыпаліў папяросіну.

Ён прагна глытаў дым, і Ляшчэвіч бачыў, што курэнне для яго — асалода неймаверная. Ён не мог без курыва, як, відаць, і без песні, якая гнала яго да людзей, у натоўп, на шматлюдную аўтастанцыю, і той сціплы ганарар людской спагады наўрад ці быў нейкай матэрыяльнай выгадай. Чалавек, пазбаўлены зроку, не мог пазбавіць сябе адзінае магчымасці ісці да людзей — праз песню.

Да аўтобуса ішоў вадзіцель з паперамі ў руках, а Ляшчэвіч стаяў нерухома, бо чалавек раптам падаў голас, некага гукнуў. І той жа час з натоўпу людзей, што стаялі і хадзілі, сядзелі на лаўках, на чамаданах,

выбавілася невысокая маладжавая жанчына ў гумавых боціках з падкасанымі халявамі і цёмнай хусткай на галаве. Чалавек нешта ёй шапнуў, і яна, сашчапіўшы за спінаю рукі, прыслапілася да слупа-апоры. Але неўзабаве зноў некуды пакіравалася, чалавек ціха аклікнуў яе, ды яна, мабыць, не пачула — не павярнулася. «Што гэта за жанчына, хто яна інваліду?» — зацупіла Ляшчэвічу.

Піпікнуў аўтобус — сігналіў пасажырам — і Ляшчэвіч схамянуўся: яму так хацелася, каб чалавек зноў заспяваў, і тады можна было б, спакойна ды ўважліва, паслухаць песню, адчуць усю яе глыбіню і трагізм, можа, нават здагадацца, якую ролю ва ўсім гэтым адыгрывае жанчына ў гумавых боціках.

Захныкаў сын, баючыся, што аўтобус паедзе, а яны застануцца.

Ужо ў аўтобусе праз акно Ляшчэвіч убачыў, што мужчына-інвалід спявае, іменна ўбачыў — па шырока адкрытым роце,— а не пачуў: гурчаў матор. Аўтобус аб'ехаў аўтастанцыю, і сонца зноў, як усю дарогу, засвяціла Ляшчэвічу ў твар, але ён ужо спачуваў не сабе, а таму чалавеку, што прыйшоў на аўтастанцыю, каб распавесці людзям пра свой лёс, а можа, толькі і з адзінаю мэтаю — неяк пражыць. Чым больш разважаў Ляшчэвіч, тым часцей і часцей дакараў сябе: «Спачуваць адно, а што я зрабіў, каб аблегчыць долю гэтага чалавека, каб яму лягчэй жылося? І не толькі я, а ўсё маё пакаленне. І не толькі яму, а й астатнім...»

Задумаўшыся, Ляшчэвіч прыплюшчыў вочы, і свет, што быў за акном тралейбуса, быццам сабраўся ў адну кропку, як на экране выключанага тэлевізара. І ён раптам схамянуўся, спалохаўшыся гэтай кропкі, якая напомніла яму смерць. Няўжо ён і далей будзе плыць, вяла махаючы вёсламі і чакаючы, пакуль лодка яго жыцця тыцнецца ў бераг і паставіць кропку? Тады навошта плыць?

Яго апанаваў жах, ён спружыўся — і кропка разарвалася, зноў адкрыўшы свет шырокім і бясконцым, як акіян.

Свет гэты быў — *горад*. Ён ляжаў на зямлі грунтоўна, надзейна, на вякі, як гіганцкая груда камянёў. Гэта была планета, створаная розумам людзей, яна ляцела ў прасторы разам з зямлёю. Такіх планет на зямлі было шмат, і кожная ведала сваё месца, якое не

мянялася, затое пашыралася, выцясняючы лясы, лугі, палі.

Не-не дый аб'яўляўся ў Ляшчэвіча гонар, што і ён насельнік гэтай планеты, мае права на яе і забяспечыў гэтае права свайму сыну. І яму цяпер трэба жыць — пара ўжо! — з грунтоўнасцю горада, яго маштабамі і яго дыханнем.

Тралейбус зрабіў круты паварот і выехаў на тую вуліцу, дзе калісь, будучы студэнтам, Ляшчэвіч жыў на кватэры. Той жа рад высокіх, квадратных у аснове жылых дамоў з вузкімі і паўкруглымі, як пенал, балконамі, жоўты кіёск «Спортлато», шырокі скверык з шэра-сталёвымі лаўкамі, на якіх ён любіў чытаць газеты, канспекты, кнігі. І — о, дзіва дзіўнае! — цёплае замілаванне ўскалыхнула Ляшчэвічу грудзі, стала прыемна, светла на душы. Такое, помніцца, пачуццё запалоньвала яго заўсёды, калі прыязджаў у вёску і сыходзіў на паваротцы з аўтобуса. І тады ён думаў, што так і павінна быць, бо сустракаецца з родным і блізкім, з чым было звязана яго дзяцінства, а зямля цвярдзела і ад яго пятак.

Ляшчэвіч прынік да акна, адчуўшы тварам марозны халадок шкла, і жывымі вачыма лавіў знаёмыя рыскі, чамусьці спадзеючыся ўбачыць і каго-небудзь з людзей, што запомніліся яму тады падчас студэнцтва.

Жонка і сын размаўлялі, смяяліся, і неўпрыцям ім было, чым ён, Ляшчэвіч, зараз узрушаны.

# ЗМЕСТ

## КРЫНІЦА...

ВІХОР *(аповесць)* . . . . . . . . . . . 4
ЗАМАХ *(аповесць)* . . . . . . . . . . . 168

## ...І БЕРАГІ

СВЕТЛЫ РУЧАЙ ЛЮБВІ *(аповесць)* . . 274
НІЗКІ ТОНУС *(аповесць)* . . . . . . . 334

*Литературно-художественное издание*

Рубанов Владислав Яковлевич

СВЕТЛЫЙ РУЧЕЙ ЛЮБВИ

Повести

Минск, издательство «Мастацкая літаратура»
На белорусском языке

*Літаратурна-мастацкае выданне*

Рубанаў Уладзіслаў Якаўлевіч

СВЕТЛЫ РУЧАЙ ЛЮБВІ

Аповесці

Рэдактар Е. А. Пяршай. Мастацкі рэдактар М. Я. Шкурпіт. Тэхнічны рэдактар Г. П. Тарасевіч. Карэктар Т. В. Трубач.

ІБ № 3233

Здадзена ў набор 29.03.89. Падп. да друку 24.11.89. АТ 06915. Фармат 84×108¹/₃₂. Папера друк № 1. Гарнітура школьная. Высокі друк. Ум. друк. арк. 21,84+0,84 укл. Ум. фарб.-адб. 25,41. Ул.-выд. арк. 23,41. Тыраж 13 000 экз. Зак. 2364. Цана 1 р. 90 к.

Выдавецтва «Мастацкая літаратура» Дзяржаўнага камітэта БССР па друку. 220600, Мінск, праспект Машэрава, 11.

Мінскі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга паліграфкамбінат МВПА імя Я. Коласа. 220005, Мінск, Чырвоная, 23.

Рубанаў У.

Р 82 Светлы ручай любві: Аповесці/Маст. М. С. Будавей.— Мн.: Маст. літ., 1990.— 413 с., [8] л. іл.

ISBN 5-340-00439-2.

Рубанов В. Светлый ручей любви: Повести.

Герой аповесці «Віхор» Міхась аступіўся — і суд вынес яму пакаранне. Людзям, нават роднаму бацьку, каханай дзяўчыне, цяжка паверыць, што хлопец не злачынца, а толькі ахвяра выпадку... Любоў, гонар, справядлівасць — іменна гэтыя светлыя пачуцці ў самых цяжкіх выпрабаваннях выпраставалі чалавечую душу, імі жывуць і героі аповесцей Уладзіслава Рубанава.

Р $\frac{4702120201—027}{М 302(03)—90}$ 25—90 ББК84 Бел7